# 轉法輪

# ДЖЎАНЬ ФАЛУНЬ

## Вярчэнне Фалунь

**Лі Хунджы**

Беларускі пераклад
2018 год

Гэтая выява Фалунь з'яўляецца ўвасабленнем Сусвету ў мініяцюры. У кожнай з іншых прастораў Фалунь таксама мае свае формы існавання ды працэс эвалюцыі, таму я лічу яго светам.

Лі Хунджы

## Змест


**ЛУНЬ ЮЙ** .......... **6**

**ЛЕКЦЫЯ ПЕРШАЯ** .......... **8**

САПРАЎДЫ ВЕСЦІ ЛЮДЗЕЙ НА ВЫСОКІЯ ЎЗРОЎНІ .......... 8

НА РОЗНЫХ УЗРОЎНЯХ — РОЗНЫЯ ЗАКОНЫ .......... 12

ІСЦІНА-ДАБРЫНЯ-ЦЯРПЕННЕ — ГЭТА АДЗІНЫ КРЫТЭР АЦЭНКІ ДОБРАГА І БЛАГОГА ЧАЛАВЕКА .......... 15

ЦІҐУН ПРЫНАЛЕЖЫЦЬ ДА ДАГІСТАРЫЧНАЕ КУЛЬТУРЫ .......... 17

ЦІҐУН — ГЭТА САМАЎДАСКАНАЛЬВАННЕ .......... 21

ЧАМУ ҐУН НЕ ЎЗРАСТАЕ АД ПРАКТЫКІ .......... 23

АДМЕТНЫЯ РЫСЫ ФАЛУНЬ ДАФА .......... 30

**ЛЕКЦЫЯ ДРУГАЯ** .......... **36**

ПРА НЯБЕСНАЕ ВОКА .......... 36

ЗДОЛЬНАСЦЬ ДЫСТАНЦЫЙНАГА БАЧАННЯ .......... 46

ЗДОЛЬНАСЦЬ ВЕДАЦЬ ЛЁС .......... 48

БЫЦЬ ПА-ЗА ПЯЦЦЮ ЭЛЕМЕНТАМІ І ВЫЙСЦІ ЗА МЕЖЫ ТРОХ СФЕР .......... 52

ІМКНЕННЕ ЧАГОСЬЦІ ДАСЯГНУЦЬ .......... 56

**ЛЕКЦЫЯ ТРЭЦЯЯ** .......... **64**

Я ЛІЧУ ЎСІХ, ХТО Ў НАС НАВУЧАЕЦЦА, СВАІМІ ПАСЛЯДОЎНІКАМІ .......... 64

ЦІҐУН ШКОЛЫ БУДЫ І БУДЫЗМ .......... 65

ВА ЎДАСКАНАЛЬВАННІ ТРЭБА ЗАСЯРОДЗІЦЦА НА АДНОЙ ШКОЛЕ .......... 69

ЗВЫШЗДОЛЬНАСЦІ ДЫ СІЛА ҐУН .......... 71

АДВАРОТНАЕ ЎДАСКАНАЛЬВАННЕ І ПАЗЫЧАННЕ ҐУН .......... 72

АПАНТАНАСЦЬ НЯЧЫСТЫМ ДУХАМ .......... 78

«КАСМІЧНАЯ МОВА» .......... 84

ШТО НАСТАЎНІК ДАЕ ВУЧНЯМ .......... 85

ПОЛЕ ЭНЕРГІІ ..... 92
ЯК ТЫМ, ХТО ВУЧЫЦЦА ФАЛУНЬ ДАФА, ПЕРАДАВАЦЬ ПРАКТЫКУ ..... 93
**ЛЕКЦЫЯ ЧАЦВЁРТАЯ ..... 96**
СТРАТА І НАБЫЦЦЁ ..... 96
ПЕРАЎТВАРЭННЕ КАРМЫ ..... 98
ПАДВЫШЭННЕ СІНЬСІН ..... 106
УЛІВАННЕ ЭНЕРГІІ Ў МАКАЎКУ ..... 111
УСТАЛЯВАННЕ СЮЭНЬҐУАНЬ НА МЕСЦА ..... 114
**ЛЕКЦЫЯ ПЯТАЯ ..... 121**
ВЫЯВА ФАЛУНЬ ..... 121
МЕТАД ПРАКТЫКІ ЦІМЭНЬ ..... 123
ПРАКТЫКА ПА НЯПРАВЕДНЫХ МЕТАДАХ ..... 125
ПАРНАЕ ЎДАСКАНАЛЬВАННЕ МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ ..... 127
УДАСКАНАЛЬВАННЕ СІНЬСІН І ДАЎГАЛЕЦЦЯ ..... 129
ЦЕЛА ЗАКОНУ ..... 130
АСВЯЧЭННЕ ..... 131
ЗАГАВОРЫ ..... 137
**ЛЕКЦЫЯ ШОСТАЯ ..... 139**
«ВЫБЛІСК ДЫ ВАР'ЯЦТВА» ..... 139
ПРАКТЫКА ПРЫВАБЛІВАЕ ДЭМАНАЎ ..... 147
УЛАСНЫЯ ІДЭІ СПАРАДЖАЮЦЬ ДЭМАНАЎ ..... 152
ГАЛОЎНАЯ СВЯДОМАСЦЬ ПАВІННА БЫЦЬ МОЦНАЙ ..... 157
АБАВЯЗКОВА ТРЭБА БЫЦЬ СЭРЦАМ ПРАВЕДНЫМ ..... 157
ЦІҐУН БАЯВЫХ МАСТАЦТВАЎ ..... 163
СХІЛЬНАСЦЬ ПАКАЗВАЦЬ СЯБЕ ..... 167
**ЛЕКЦЫЯ СЁМАЯ ..... 170**
ПРА ЗАБОЙСТВА ЖЫВЫХ ІСТОТ ..... 170
ПРА ЎЖЫВАННЕ МЯСА ..... 174
ЗАЙЗДРАСЦЬ ..... 179
ПРА ЛЕКАВАННЕ ХВАРОБАЎ ..... 184
КЛІНІЧНАЕ ЛЕКАВАННЕ І ЦІҐУНТЭРАПІЯ ..... 188
**ЛЕКЦЫЯ ВОСЬМАЯ ..... 193**
БІҐУ ..... 193
КРАДЗЕЖ ЦІ ..... 195
ЗБОР ЦІ ..... 197
ХТО ПРАКТЫКУЕ, ТОЙ І АТРЫМЛІВАЕ ҐУН ..... 199
КРУГ НЕБА ..... 205

РАДАСЦЬ ....................................................................................................213
УДАСКАНАЛЬВАННЕ ГАВОРКІ ................................................................................215
**ЛЕКЦЫЯ ДЗЯВЯТАЯ ..............................................................................217**
ЦІЃУН І СПОРТ .........................................................................................................217
ДУМКІ .......................................................................................................................219
СПАКОЙНАЕ І ЧЫСТАЕ СЭРЦА ............................................................................225
МАРАЛЬНАЯ АСНОВА...............................................................................................229
УСВЕДАМЛЕННЕ ......................................................................................................231
ЧАЛАВЕК З ВЫДАТНЫМІ ПРЫРОДЖАНЫМІ ЯКАСЦЯМІ ..........................................237

Знешне тэкст «Джўань Фалунь»[1] не адрозніваецца вытанчанасцю, нават не адпавядае сучаснай граматыцы. Але калі б я адрэдагаваў гэты Да́фа ў адпаведнасці з сучаснай граматыкай, тады ўзнікла б сур'ёзная праблема: моўныя канструкцыі твора былі б нарматыўнымі ды прыгожымі, але ён бы не меў больш глыбокага, больш высокага зместу. І так сталася б таму, што сучаснай нарматыўнай лексікай абсалютна немагчыма выказаць настаўленні Дафа на розных больш высокіх узроўнях і праявы Закону[2] на кожным узроўні, а таксама выклікаць у вучняў такія істотныя змены, як эвалюцыя і падвышэнне ўласнага цела[3] і Ґун.

Лі Хунджы

5 студзеня 1996 года

# ЛУНЬ ЮЙ

Вялікі Закон[4] — гэта мудрасць Творцы. Ён з'яўляецца асновай стварэння Неба і Зямлі, стварэння Сусвету. Яго змест да краю макраскапічны і мікраскапічны і на розных узроўнях Нябеснага Цела раскрываецца па-featureзнаму. Ад найвялікшае мікраскапічнасці Нябеснага Цела да ўзнікнення найбольш мікраскапічных часцінак, слой за слоем бязмерныя і незлічоныя часцінкі, ад меншага да большага, далей да паверхневых вядомых чалавецтву атамаў, малекул, зорак, галактык да яшчэ большага — часцінкі розных памераў утварылі жывых істотаў розных памераў ды светы розных памераў, якія[5] распаўсюджаныя паўсюль у Нябесным Целе Сусвету. Для істотаў, якія жывуць на гэтых касмічных целах з часцінак розных узроўняў, часцінкі, якія з'яўляюцца большымі за іх узровень часцінак, — гэта зоркі ў іх небе. І так адбываецца ўзровень за ўзроўнем. Для жывых істотаў кожнага ўзроўню Сусвету гэта з’яўляецца бясконцым. Вялікі Закон таксама стварыў часы, прасторы, шматлікія разнавіднасці жыцця ды ўсё існае, і гэта ахапляе ўсё, не прапусціўшы нічога. Гэта канкрэтныя ўвасабленні на розных узроўнях уласцівасці Вялікага Закону — Ісціна-Дабрыня-Цярпенне[6].

Якімі б развітымі ні былі спосабы даследавання чалавецтвам Сусвету і жыцця, яно ясна бачыць толькі частку цэлага — прастору нізкага ўзроўню Сусвету, у якой існуюць людзі. У дагістарычную эпоху, калі ўзнікалі шматлікія цывілізацыі, чалавецтва ўжо даследавала іншыя планеты. Аднак, як бы высока, як бы далёка людзі ні лёталі, яны так і не выйшлі з прасторы, у якой існуе чалавецтва. Чалавецтва ніколі не зможа сапраўды спазнаць рэальную карціну Сусвету. Для чалавека адзіны спосаб зразумець таямніцы Сусвету, прасторы-часу і чалавечага цела — гэта самаўдасканальвацца па праведным метадзе, дасягнуць сапраўднага Прабуджэння, падвысіць узровень жывой істоты. У самаўдасканальванні ты таксама падвышаеш свае маральныя якасці. Калі ты адрозніваеш сапраўднае дабро ад зла, добрае ад благога і выходзіш за межы ўзроўню чалавецтва, дык толькі тады можаш убачыць, толькі тады можаш увайсці ў кантакт з сапраўдным Сусветам і жывымі істотамі розных узроўняў і розных прастораў.

Чалавецтва даследуе, каб спаборнічаць у тэхналогіях, — пад выглядам таго, каб змяніць умовы свайго існавання. У большасці выпадкаў у аснове гэтага ляжыць атэізм і паслабленне маральнага самастрымлівання чалавецтва. Вось чаму цывілізацыі, якія з'яўляліся ў чалавецтва ў мінулым, шматкроць зведвалі знішчэнне. У даследаваннях зноў-такі можна абмяжоўвацца толькі рамкамі матэрыяльнага свету. Метад такі: нешта вывучаюць толькі тады, калі гэта спазналі. Аднак пад уплывам атэізму ніколі не адважваюцца закранаць з'явы, якія ў прасторы чалавецтва нельга памацаць або ўбачыць, але якія аб'ектыўна існуюць і могуць цалкам яўна адлюстроўвацца ў рэальнасці чалавецтва, у прыватнасці дух[7], веру, прароцтвы і цуды.

Калі чалавецтва зможа палепшыць свае паводзіны ды ўяўленні, узяўшы за аснову маральнасць, дык толькі тады цывілізацыя чалавечага грамадства

зможа быць даўгавечнай, і ў ім ізноў з’явяцца цуды. У чалавечых грамадствах мінулага шматкроць з'яўляліся напаўбоскія-напаўчалавечыя культуры, і гэта прыводзіла да таго, што чалавецтва падвышала сваё сапраўднае спазнанне жыцця і Сусвету. Калі чалавецтва зможа праявіць належную шчырасць і павагу да праявы Вялікага Закону ў чалавечым свеце, тады гэта прынясе чалавеку, нацыі або краіне шчасце ці славу. Нябесныя Целы, сусветы, жыццё і ўсё і ўся стварыў Вялікі Закон Сусвету. Калі жывыя істоты адхіляюцца ад яго, тады гэта іх сапраўднае псаванне; калі простыя людзі могуць адпавядаць яму, тады яны з’яўляюцца сапраўднымі добрымі людзьмі, і ў той жа час гэта прынясе ім добрую адплату, шчасце і даўгалецце; з’яўляючыся ўдасканальвальнікам, асімілюйся з ім і станеш тым, хто спасціг Даа, — Богам.

Лі Хунджы

24 траўня 2015 года

# ЛЕКЦЫЯ ПЕРШАЯ

## САПРАЎДЫ ВЕСЦІ ЛЮДЗЕЙ НА ВЫСОКІЯ ЎЗРОЎНІ

Ва ўсім працэсе выкладання Закону і навучання практыцы ціґун, дзейнічаючы адказна перад грамадствам і тымі, хто ў мяне навучаецца, я дасягаю добрых вынікаў. І ўплыў на ўсё грамадства падчас гэтага таксама дастаткова добры. Некалькі гадоў таму нямала майстроў ціґун вучыла людзей, аднак усё тое, пра што яны распавядалі, прыналежала да ўзроўню ацалення ды аздараўлення. Вядома, я не кажу, што метады практыкі[8], якія яны перадаюць, дрэнныя, я толькі кажу, што рэчам высокіх узроўняў яны не навучалі. Я добра ведаю цяперашняе становішча ціґун ва ўсёй краіне. У дадзены час у нашай краіне і за мяжой толькі я адзін па-сапраўднаму навучаю практыцы ціґун на высокім узроўні. Чаму гэтым не займаюцца іншыя? Таму што гэта звязана з велізарнымі праблемамі, з тым, што мае вельмі глыбокае гістарычнае паходжанне, тычыцца вельмі шырокіх сфераў і закранае вельмі вострыя тэмы. Апроч таго, навучаць гэтаму звычайны чалавек не здольны, бо гэта звязана з неабходнасцю закранаць рэчы многіх школаў ціґун. Тым больш сярод нас ёсць практыкоўцы, якія сёння вывучаюць адзін метад практыкі, а заўтра — іншы, прыводзячы свой арганізм у хаатычны стан, чым прадвызначаюць немагчымасць удасканаліцца. У іншых удасканальванне ідзе адным шырокім шляхам, а перад імі — усюды ростані. Калі яны практыкуюць другое, ім замінае першае; а практыкуюць першае — замінае другое. І першае, і другое становіцца ім перашкодай. Яны ўжо не могуць удасканальвацца.

Мы прывядзем усё гэта да ладу — добрае пакінем, а благое адкінем, гарантуючы, што ў далейшым ты зможаш удасканальвацца. Аднак гэта тычыцца толькі тых, хто сапраўды прыйшоў вучыцца Дафа. Калі ты прыйшоў з усялякімі навязлівымі ідэямі[9], прыйшоў сюды з настойлівай мэтай здабыць звышздольнасці, лекаваць свае хваробы, паслухаць тэарэтычныя развагі альбо з нейкай нізкай мэтай, тады гэта ўсё не гадзіцца. Я ж ужо казаў, што гэтай справай займаюся толькі я адзін. Шанец стаць сведкам такое падзеі выпадае нячаста — я не буду і далей пастаянна так вучыць. Думаю, што тыя, хто зможа на ўласныя вушы пачуць, як я навучаю практыцы ціґун і выкладаю Закон, я сказаў бы, сапраўды… у будучыні ты даведаешся. Ты адчуеш, што гэты час быў неверагодна радасны. Вядома, мы верым у лёс. Нам усім было наканавана тут сядзець.

Падумайце, што значыць навучаць метаду практыкі на высокім узроўні? Хіба гэта не выратаванне людзей? Выратаванне. Гэта значыць, што ты будзеш сапраўды ўдасканальвацца, а не толькі ацаляцца ды аздараўляцца. Такім чынам, у сапраўдным самаўдасканальванні патрабаванні да Сіньсін навучэнцаў будуць таксама высокімі. Прысутныя тут з намі прыйшлі вучыцца Дафа. Тады, седзячы тут, ты павінен прымаць сябе за шчырага ўдасканальвальніка ды адкінуць свае навязлівыя ідэі. Калі ты прыйшоў вучыцца практыцы і Вялікаму Закону дзеля разнастайных імкненняў, якія ты маеш, тады нічому не

навучышся. Скажу табе такую ісціну: увесь працэс самаўдасканальвання чалавека — гэта працэс няспыннага адкідвання навязлівых ідэяў. Паміж людзьмі ў грамадстве звычайных людзей узаемная барацьба ды падман, дзеля мізэрных асабістых інтарэсаў яны шкодзяць іншым. Ад усіх такіх імкненняў трэба пазбавіцца. Асабліва тым, хто з намі сёння вучыцца практыцы ціґун, — ім тым больш трэба гэта адкінуць.

Тут я не кажу пра лекаванне хваробаў, і мы не лекуем захворванні. Аднак, як сапраўдны самаўдасканальвальнік, маючы хворы арганізм, ты не зможаш удасканальвацца. Я ачышчу тваё цела. Ачышчэнне цела распаўсюджваецца толькі на тых, хто прыйшоў сапраўды вучыцца практыцы, сапраўды вучыцца Закону. Мы акцэнтуем вось на чым: калі ты не адкінеш усе заганныя намеры, не адкінеш думкі пра хваробы, мы нічога не зможам зрабіць і не зможам табе дапамагчы. А чаму? Таму, што ў гэтым Сусвеце існуе такі прынцып: усе дзеянні звычайных людзей, як кажуць у школе Буды, маюць прычынныя сувязі. Нараджэнне-старасць-хваробы-смерць — у звычайных людзей усё менавіта так і адбываецца. Хваробы альбо няшчасці чалавека абумоўленыя тым, што раней ён, здзейсніўшы благія ўчынкі, стварыў карму. Зведваючы пакуты, чалавек вяртае кармічныя даўгі. Таму ніхто не павінен адвольна гэта змяняць, інакш атрымаецца, што можна будзе не вяртаць даўгі. Нікому нельга самавольна рабіць што заўгодна, інакш гэта было б раўназначна здзяйсненню благога ўчынку.

Некаторыя людзі думаюць, што калі лекуеш іншых і дапамагаеш ім ацаляцца ды аздараўляцца, дык робіш добра. А на мой погляд насамрэч хваробу не вылекавалі, яе толькі часова адсунулі на будучыню альбо пераўтварылі, але зусім не знялі з чалавека. Каб сапраўды пазбавіцца ад гэтага бедства, неабходна знішчыць карму. Калі б нехта сапраўды быў здольны вылекаваць хваробу ды канчаткова знішчыць карму, калі б ён сапраўды мог дасягнуць гэтага, гэта азначала б, што ўзровень гэтага чалавека ўжо не нізкі. Ён бы ўжо ўбачыў такую ісціну: нельга адвольна парушаць прынцыпы звычайных людзей. Падчас удасканальвання практыкоўцы з міласэрнасці здзяйсняюць добрыя справы: дапамагаюць іншым лекавацца, ацаляцца ды аздараўляцца. Гэта дазволена. Але яны не могуць цалкам вылекаваць людзей. Дапусцім, сапраўды можна было б выкараніць хваробы ў звычайнага чалавека. Тады гэты просты чалавек, які не ўдасканальваецца, выйшаў бы адсюль зусім без хваробаў. Але, выйшаўшы за дзверы, ён застаўся б звычайным чалавекам, які і далей змагаецца за свае інтарэсы гэтак жа, як робяць звычайныя людзі. Як жа можна адвольна знішчаць яго карму? Гэта катэгарычна забаронена.

Тады чаму ж гэта можна рабіць для самаўдасканальвальнікаў? Ды таму, што такія людзі найкаштоўнейшыя. Яны жадаюць удасканальвацца, таму гэтая думка, якая з'явілася ў іх, самая каштоўная. У будызме надаюць вялікую ўвагу прыродзе Буды, і, калі ў чалавека праяўляецца прырода Буды, Прабуджаныя[10] могуць яму дапамагчы. Што гэта значыць? Вось як бы я гэта патлумачыў. З

прычыны таго, што я навучаю практыцы ціґун на высокім узроўні, гэта закранае прынцыпы высокіх узроўняў ды вельмі сур’ёзныя тэмы. Мы лічым, што ў гэтым Сусвеце жыццё чалавека нарадзілася не ў грамадстве звычайных людзей. Сапраўднае чалавечае жыццё пачалося ў Космасе, бо ў гэтым Сусвеце існуе мноства разнастайных рэчываў, якія ствараюць жыццё. Гэтыя матэрыі пры ўзаемадзеянні могуць ствараць жыццё — гэта значыць, што першаснае жыццё чалавека бярэ свой пачатак у Сусвеце. Космас з самага пачатку быў добрым і меў уласцівасць Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Калі чалавек з'явіўся на свет, ён быў аднолькавае з Сусветам прыроды. Аднак з размнажэннем жывых істотаў з’явіліся пэўныя групавыя сацыяльныя адносіны. У выніку ў некаторых з іх, магчыма, развіўся эгаізм, іх узровень паступова знізіўся. Яны больш не маглі заставацца на тым узроўні і былі вымушаныя ўпасці ўніз. Але і на іншым узроўні гэтыя істоты зноў сталі не вельмі добрымі, зноў не маглі там заставацца і далей падалі ўніз. Так урэшце яны ўпалі на гэты ўзровень — узровень чалавецтва.

Усё чалавечае грамадства знаходзіцца на адным узроўні. З пункту гледжання звышздольнасцяў альбо Вялікіх Прабуджаных, калі гэтыя істоты дайшлі ў сваім падзенні да гэтага этапу, насамрэч іх ужо трэба было знішчыць. Але Вялікія Прабуджаныя з міласэрнасці далі людзям яшчэ адзін шанец: стварылі ім асаблівае асяроддзе, адмысловую прастору. Жывыя істоты гэтае прасторы адрозніваюцца ад істот усіх іншых прастораў Сусвету. Яны не бачаць істот іншых прастораў, не бачаць сапраўднага выгляду Сусвету. Гэта раўназначна таму, што гэтыя людзі ўпалі ў свет зману. Калі яны хочуць вылекавацца ад хваробаў, пазбавіцца ад няшчасцяў ды ліквідаваць карму, тады павінны самаўдасканальвацца, вярнуцца туды, адкуль яны паходзяць[11]. Такога меркавання прытрымліваюцца ва ўсялякіх відах самаўдасканальвання. Чалавек павінен вярнуцца туды, адкуль паходзіць, — толькі гэта з'яўляецца сапраўднай мэтай чалавечага быцця. Таму як толькі чалавек захоча самаўдасканальвацца, тады лічыцца, што ў яго праявілася прырода Буды. Такая думка — найкаштоўнейшая, бо чалавек жадае вярнуцца да сваіх вытокаў, жадае пакінуць узровень звычайных людзей.

Магчыма, вы чулі будыйскае выслоўе: «Калі праяўляецца прырода Буды, скаланаецца дзесяцібаковы свет». Кожны, хто гэта ўбачыць, безумоўна дапаможа яму. У Школе Буды ў выратаванні людзей не ставяць умоў і не просяць кампенсацыі, ім могуць безумоўна дапамагчы. Таму і мы можам шмат чаго зрабіць для людзей, якія прыходзяць да нас вучыцца. А для звычайнага чалавека, таго, хто хоча толькі заставацца звычайным чалавекам, хоча толькі вылекавацца, так рабіць ужо нельга. Хтосьці з вас думае: «Калі ачуняю, буду ўдасканальвацца і практыкаваць». У самаўдасканальванні не можа быць аніякіх умоў. Калі хочаш удасканальвацца — удасканальвайся. Аднак некаторыя з вас маюць хворы арганізм, а ў іншых яшчэ і вельмі хаатычная інфармацыя ў целе; адны наогул ніколі не займаліся ціґун, а ёсць і такія, хто рабіў практыкаванні ціґун некалькі дзясяткаў гадоў, і ўсё яшчэ блукае на ўзроўні ці[12], так і не ўдасканаліўшыся.

Што ж рабіць? Мы ачысцім ім целы, каб яны змаглі самаўдасканальвацца на высокія ўзроўні. Калі ўдасканальваешся на найніжэйшым узроўні, існуе такі працэс: твой арганізм найбольш бездакорным чынам ачышчаюць, цалкам забраўшы ўсё дрэннае, што існуе ў тваіх думках, поле кармы вакол твайго цела і чыннікі, якія выклікаюць нездароўе. Калі гэта не прыбраць, тады як жа можна з такім каламутным, счарнелым целам і нячыстымі думкамі дасягнуць стану ўдасканальвання на высокія ўзроўні? Мы тут не робім практыкаванняў з ці, больш не патрэбна, каб ты займаўся такімі рэчамі нізкага ўзроўню. Мы прасоўваем цябе наперад, робім так, каб тваё цела дасягнула стану, калі няма хваробаў. Разам з тым далей мы ўкладзем у цябе гатовы набор рэчаў, неабходных для закладкі падмурка на нізкім узроўні. Такім чынам, мы будзем практыкаваць ціґун ужо на вельмі высокім узроўні.

Па вызначэнню, самаўдасканальванне, калі мець на ўвазе ці, мае тры ўзроўні. Аднак наогул у сапраўдным удасканальванні (не прымаючы да ўвагі практыкаванні з ці) ёсць два вялікія ўзроўні: удасканальванне па Законе чалавечага свету і ўдасканальванне па Законе за межамі чалавечага свету. Гэтыя Закон чалавечага свету і Закон за межамі чалавечага свету цалкам адрозніваюцца ад манастырскіх выказванняў «выхад са свету» ды «ўваход у свет». Апошнія з’яўляюцца чымсьці тэарэтычным. У нас жа гэта змены, якія адбываюцца на двух вялікіх узроўнях сапраўднага ўдасканальвання чалавечага цела. Раз у ходзе самаўдасканальвання па Законе чалавечага свету цела чалавека зноў ды зноў няспынна ачышчаецца, тады пры дасягненні найвышэйшае формы Закону чалавечага свету яно ўжо цалкам заменена рэчывамі высокай энергіі. А ўдасканальванне па Законе за межамі чалавечага свету — гэта ўжо па-сутнасці ўдасканальванне цела Буды, — цела, якое ўжо складаецца з рэчываў высокай энергіі, і ўсе здольнасці якога ўзнікаюць зноўку. Тое, што маем на ўвазе мы — гэтыя два вялікія ўзроўні.

Мы верым у лёс. Вы сядзіце тут, і я магу для вас гэта зрабіць. Нас тут зараз усяго больш за дзве тысячы чалавек. Я таксама магу гэта здзейсніць, калі будзе і некалькі тысяч або нават яшчэ больш — больш за дзесяць тысяч чалавек. Гэта значыць, больш не патрэбна, каб ты рабіў практыкаванні на нізкім узроўні. Пасля таго як ачышчу тваё цела ды прасуну цябе наперад, я ўкладу ў цябе поўную сістэму самаўдасканальвання. І ты з самага пачатку ўжо будзеш удасканальвацца на высокім узроўні. Аднак гэта распаўсюджваецца толькі на тых слухачоў курсаў, якія прыйшлі сапраўды для ўдасканальвання. Адна толькі твая прысутнасць тут яшчэ не робіць цябе ўдасканальвальнікам. Калі ў тваім мысленні адбудуцца карэнныя змены, тады мы зможам зрабіць гэта і нават больш. Потым вы зразумееце, што я вам даў. Мы тут не лекуем, але ўсебакова наладжваем здароўе тым, хто ў нас вучыцца. Гэта дасць табе магчымасць практыкаваць ціґун. Калі ты маеш хворае цела, тады ў цябе наогул не можа ўзнікнуць Ґун[13]. Таму не звяртайцеся да мяне з просьбай вылекаваць. Я гэтага не раблю. Галоўная мэта майго выхаду ў свет — весці людзей на высокія ўзроўні, сапраўды весці людзей на высокія ўзроўні.

## НА РОЗНЫХ УЗРОЎНЯХ — РОЗНЫЯ ЗАКОНЫ

У мінулым многія майстры ціґун тлумачылі, што ціґун складаецца з пачатковае, сярэдняе ды вышэйшае ступеняў. Гэта ўсё — ці, гэта ўсё прыналежыць да ўзроўню практыкаванняў з ці, а яго яшчэ і падзяляюць на пачатковую, сярэднюю ды вышэйшую ступені. Навошта ж тады дзяліць яго на гэтыя стадыі? Велізарная колькасць нашых ціґунскіх самаўдасканальвальнікаў не маюць і ўяўлення пра сапраўдныя рэчы высокіх узроўняў. Абсалютна нічога не ведаюць. Надалей мы будзем выкладаць Закон выключна высокіх узроўняў. Апроч таго я хачу вярнуць самаўдасканальванню яго добрае імя. На маіх лекцыях я яшчэ закрану заганныя з'явы, якія існуюць у колах удасканальвальнікаў, распавяду, як ставіцца да гэтых з'яў і як глядзець на іх. Апроч таго, навучанне ціґун ды выкладанне Закону высокіх узроўняў закранае даволі важныя і нават вельмі вострыя аспекты і пытанні — іх я таксама хачу патлумачыць. Хачу звярнуць увагу і на перашкоды з іншых прастораў нашаму грамадству звычайных людзей, асабліва на перашкоды ўдасканальвальнікам. І адначасова вырашу гэтыя праблемы тым, хто ў нас навучаецца. Калі іх не вырашыць, ты не зможаш практыкаваць ціґун. Каб карэнным чынам вырашыць гэтыя праблемы, мы павінны прыняць усіх вас за сапраўдных практыкоўцаў. Вядома, няпроста адразу змяніць тваё мысленне. Ты зменіш яго паступова, слухаючы лекцыі далей. Таксама, спадзяюся, вы будзеце слухаць уважліва. Я навучаю ціґун не так, як іншыя. Некаторыя людзі, навучаючы, толькі спрошчана пагавораць пра асноўныя палажэнні свайго ціґун, потым усталююць з вамі інфармацыйную сувязь, навучаць комплексу рухаў — і ўсё. І людзі ўжо звыкліся з такім навучаннем.

У сапраўдным навучанні ціґун неабходна выкладаць Закон і Даа. Цягам дзесяці лекцыяў я растлумачу вам прынцыпы высокіх узроўняў, і толькі тады вы зможаце ўдасканальвацца, інакш удасканальвацца абсалютна немагчыма. Іншыя перадаюць толькі спосабы ацалення ды аздараўлення. Калі ты хочаш дасягнуць высокага ўзроўню ў сваім удасканальванні, але не маеш Закону высокага ўзроўню, які быў бы табе настаўленнем, тады ты не зможаш удасканальвацца. Параўнаем гэта з асветай: калі ты ходзіш ва ўніверсітэт з падручнікамі пачатковае школы, тады ты ўсё адно застаешся вучнем пачатковае школы. Некаторыя людзі лічаць, што авалодалі вельмі многімі разнавіднасцямі ціґун: і такі ґун, і сякі ґун[14]... У іх гэткая куча сертыфікатаў аб заканчэнні курсаў, аднак іх Ґун так і не ўзрос. Яны лічаць, што гэта сутнасць ціґун, што гэта ён увесь. Не, гэта толькі павярхоўныя веды пра ціґун, якія прыналежаць да найніжэйшага ўзроўню. Ціґун на гэтым не скончваецца, ціґун — гэта самаўдасканальванне, рэч шырокая ды глыбокая; апроч таго на розных узроўнях ёсць розныя Законы. Таму гэта не падобна да таго, што прыналежыць да вядомых нам цяпер практыкаванняў з ці. Колькі б ты іх ні вывучаў, усё будзе аднолькава. Прывяду прыклад: ты вывучыў брытанскія, амерыканскія, японскія ды кітайскія падручнікі пачатковае школы, але ты так і застаешся вучнем

пачатковае школы. Колькі б урокаў ціґун нізкага ўзроўню ні вывучаў, колькі б сябе гэтым ні запаўняў, наадварот, тым больш шкодным для цябе гэта будзе — тваё цела ўжо будзе ў стане поўнае блытаніны.

Хачу яшчэ раз падкрэсліць, што ў нашым самаўдасканальванні неабходныя навучанне практыцы ціґун і выкладанне Закону. Манахі з некаторых будыйскіх манастыроў, асабліва дзэн-будызму[15], магчыма, прытрымліваюцца сваіх меркаванняў. Як толькі яны пачуюць фразу «выкладанне Закону», дык ім ужо не падабаецца далей слухаць. Чаму? У дзэн-будызме лічыцца так: «Закон нельга выкласці. Як толькі яго выкладзеш, дык гэта ўжо не Закон. Няма Закону, які можна было б выказаць словамі. Закон можна толькі зразумець сэрцам». Таму дзэн-будызм, дайшоўшы да нашых дзён, не можа гаварыць ні пра які Закон. Усё, што перадаваў Бадгідгарма[16], засноўвалася на выказванні Шак'ямуні[17]. Шак'ямуні казаў: «Закон не мае вызначанае фармулёўкі». На падставе гэтага выказвання Шак'ямуні ён і стварыў школу Дзэн. На нашую думку, гэтая школа «лезе ў кончык бычынага рога»[18]. Што значыць «лезці ў кончык бычынага рога»? Калі Бадгідгарма пачаў «залазіць у кончык бычынага рога», яму здавалася дастаткова прасторна; калі дайшло да другога патрыярха, стала ўжо не вельмі прасторна; у трэцяга справы былі яшчэ так-сяк; чацвёртаму стала ўжо вельмі цесна; пятаму ўжо не было куды лезці; а калі дайшло да шостага патрыярха Хўэйнэна, гэта ўжо быў кончык рога — далей залезці немагчыма. Калі сёння ты пойдзеш у школу Дзэн вучыцца Закону, тады нічога не пытай. Будзеш пытацца — атрымаеш палкай па галаве, як кажуць, «палкай ды крыкам». Гэта значыць, не пытайся, усведамляй сам. Ты кажаш: «Я нічога не ведаю, менавіта таму і прыйшоў вучыцца, дык што ж мне ўсведамляць? А вы мяне яшчэ б'яце палкай?» Гэта сведчыць пра тое, што яны ўжо да канца «ўлезлі ў кончык бычынага рога», ужо больш няма пра што і гаварыць. Нават Бадгідгарма казаў, што яго школа зможа перадавацца толькі цягам шасці патрыярхаў, пасля чаго ўжо не будзе эфектыўнай. Даўно прайшлі сотні гадоў, але і цяпер усё яшчэ ёсць людзі, якія, не адпускаючы, намёртва трымаюцца прынцыпаў Дзэн. А які ж сапраўдны сэнс слоў Шак'ямуні «Закон не мае вызначанае фармулёўкі»? Шак'ямуні знаходзіўся на ўзроўні Татгаґаты[19]. З многіх манахаў, якія былі пасля яго, ніхто не дайшоў ва ўсведамленні да таго ўзроўню, на якім знаходзіўся Шак'ямуні, не ўсвядоміў душэўны стан, уласцівы ўзроўню мыслення Шак'ямуні, сапраўдны сэнс выкладзенага ім Закону і сапраўдны сэнс сказаных ім слоў. Такім чынам, пераемнікі тлумачылі гэта і так і сяк, тлумачылі вельмі блытана, лічачы, што «Закон не мае вызначанае фармулёўкі» азначае: не выкладайце Закон; калі яго выкажыце, тады гэта ўжо не Закон. Насамрэч фраза азначае не гэта. Пасля таго як у Шак'ямуні пад дрэвам бодгі адкрыліся Ґун і ўсведамленне, ён дасягнуў узроўню Татгаґаты не адразу. Усе 49 гадоў, якія Шак'ямуні прапаведаваў Закон, ён таксама ўвесь час падвышаўся. Кожны раз, падняўшыся на адзін узровень, ён азіраўся назад і бачыў, што Закон, які ён толькі што выкладаў, быў памылковым. Падвысіўшыся яшчэ, ён выяўляў, што Закон, які прапаведаваўся раней, зноўку аказваўся памылковым. Калі Шак'ямуні падвышаўся зноў, тады заўважаў, што Закон, пра які ён толькі што распавёў, зноўку аказваўся памылковым. Усе 49 гадоў ён вось

такім чынам пастаянна падвышаўся. Штораз, падняўшыся на адзін узровень, ён адкрываў, што Закон, які ён да гэтага прапаведаваў, быў вельмі нізкім па ўзроўні разумення. Шак'ямуні таксама адкрываў, што Закон кожнага ўзроўню з'яўляецца ўвасабленнем Закону на тым узроўні. Кожны ўзровень мае свой Закон, але аніводны з іх не з'яўляецца абсалютнай ісцінай Сусвету. Аднак Законы больш высокага ўзроўню бліжэй да ўласцівасці Сусвету, чым Законы больш нізкага. Вось чаму ён і сказаў: «Закон не мае вызначанае фармулёўкі».

Напрыканцы Шак'ямуні яшчэ сказаў: «За ўсё сваё жыццё я не выкладаў аніякага Закону». А ў Дзэн ізноў зразумелі гэта так: няма такога Закону, які б можна было выкладаць. Напрыканцы жыцця Шак'ямуні ўжо дасягнуў узроўню Татгаґаты, але чаму ён сказаў, што не выкладаў аніякага Закону? Што ён насамрэч меў на ўвазе? Ён меў на ўвазе вось што: нават я, дасягнуўшы ўзроўню Татгаґаты, усё адно так і не ўбачыў, што такое ісціна Сусвету ў апошняй інстанцыі ды канчатковы Закон Сусвету. Таму ён загадаў сваім пераемнікам не прымаць сказаныя ім словы за абсалютную ісціну, нязменную ісціну, інакш гэта абмежавала б іх узроўнем Татгаґаты або ўзроўнямі ніжэйшымі за Татгаґату, і яны не змаглі б ажыццявіць прарыў у напрамку больш высокіх узроўняў. Пераемнікі ж не змаглі зразумець сапраўдны сэнс гэтае фразы ды ўспрынялі яе так, нібы Закон, калі яго выказаць, перастае быць Законам. Вось як зразумелі. Фактычна Шак'ямуні сказаў пра тое, што ў розных узроўнях — розныя Законы, Закон кожнага ўзроўню не з'яўляецца абсалютнай ісцінай Сусвету, аднак Закон таго ўзроўню адыгрывае на тым узроўні ролю настаўлення. Вось які прынцып ён насамрэч выказаў.

У мінулым многія, асабліва ў школе Дзэн, увесь час прытрымліваліся перадузятага погляду і надта памылковага разумення. Але калі цябе не вучыць, тады як цябе весці ў практыцы? Як практыкаваць, як удасканальвацца? Будыйская рэлігія змяшчае ў сабе мноства будыйскіх сюжэтаў. Магчыма, некаторыя чыталі, як хтосьці патрапіў на Неба ды апынуўся ў Нябесным царстве. Тады ён выявіў, што ў «Дыяментавай сутры»[20] наверсе кожнае слова цалкам адрознае ад словаў «Дыяментавае сутры» ўнізе, і сэнс неаднолькавы. Чаму гэтая «Дыяментавая сутра» неаднолькавая з «Дыяментавай сутрай» у свеце звычайных людзей? Яшчэ нехта сказаў, што каноны ў Свеце Найвышэйшага Шчасця, у параўнанні з тымі, што ўнізе, проста-такі зусім іншыя і наогул ужо больш не з'яўляюцца з імі адным і тым самым; не толькі словы неаднолькавыя, змест і значэнне цалкам адрозніваюцца — змяніліся. Насамрэч гэта таму, што адзін і той жа Закон на розных узроўнях змяняецца па-рознаму і мае розныя формы праявы, а таксама можа на розных узроўнях адыгрываць розную настаўляльную ролю для ўдасканальвальнікаў.

Як вам вядома, у будыйскай рэлігіі ёсць брашура пад назвай «Успаміны з вандроўкі па заходняй краіне — Свеце Найвышэйшага Шчасця». У ёй гаворыцца, як адзін манах сядзеў у медытацыі. Яго душа[21] паднялася ў Свет Найвышэйшага Шчасця ды ўбачыла некалькі карцін. Прабыў ён там адзін дзень

і вярнуўся, а на Зямлі ўжо прайшло шэсць гадоў. Ён сапраўды штосьці пабачыў ці не? Пабачыў. Але ўбачанае ім не было сапраўднай карцінай. Чаму? Таму што яго ўзровень недастатковы. Магло быць толькі так: яму паказалі ўвасабленне Закону Буды, якое яму належала бачыць на яго ўзроўні. Бо такі свет акурат з'яўляецца ўвасабленнем структуры Закону. Таму ён не мог убачыць сапраўднае карціны. Менавіта такім, на маю думку, і з’яўляецца сэнс фразы «Закон не мае вызначанае фармулёўкі».

## ІСЦІНА-ДАБРЫНЯ-ЦЯРПЕННЕ — ГЭТА АДЗІНЫ КРЫТЭР АЦЭНКІ ДОБРАГА І БЛАГОГА ЧАЛАВЕКА

У будызме людзі заўсёды дашукваліся, што ж такое Закон Буды. Ёсць і такія, хто лічыць, нібыта Закон, пра які гаворыцца ў будызме, і з'яўляецца Законам Буды ў яго паўнаце. Насамрэч гэта не так. Закон, які прапаведаваў Шак’ямуні — гэта толькі Закон, які ён выкладаў 2500 гадоў таму звычайным людзям вельмі нізкага ўзроўню, гэта значыць такім, якія толькі выйшлі з першабытнага грамадства і мелі даволі простае мысленне. Канцавы перыяд Закону, пра які ён казаў — гэта сучаснасць. Цяперашнія людзі ўжо не ў стане ўдасканальвацца па тым Законе. У Канцавы перыяд Закону манахам з манастыроў цяжка выратаваць нават саміх сябе, а пра выратаванне іншых няма чаго і казаць. У свой час Шак’ямуні прапаведаваў Закон, улічваючы тагачасныя абставіны. Але ён не выказаў увесь Закон Буды, які ведаў, знаходзячыся на сваім узроўні. І калі б хтосьці захацеў, каб ён заставаўся вечна нязменным, гэта таксама было б немагчыма.

Грамадства развіваецца, мысленне людзей таксама становіцца ўсё больш складаным, таму людзям ужо цяжка далей удасканальвацца такім чынам. Закон будызму не ахапляе Закон Буды ў цэлым, ён з'яўляецца толькі вельмі нязначнай часткай Закону Буды. У школе Буды існуе яшчэ шмат Вялікіх Законаў, якія распаўсюджваюцца ў народзе. Яны здаўна перадаюцца вуснай пропаведдзю толькі аднаму пераемніку. Розныя Законы і ў розных узроўнях, і ў розных прасторах. Гэта розныя ўвасабленні Закону Буды ў кожнай прасторы і на кожным узроўні. Шак’ямуні казаў, што для самаўдасканальвання ў Буду існуе 84 000 школ. А ў будызме ёсць толькі Дзэн, Чыстая зямля, Т’еньтай, Хўаень, Тантра ды іншыя — усяго больш за дзесяць школ, якія не могуць ахапіць увесь Закон Буды. Сам Шак’ямуні прапаведаваў не ўвесь свой Закон цалкам, а ўсяго толькі тую яго частку, якая адпавядала здольнасці ўспрымання тагачасных людзей.

Дык што ж уяўляе сабой Закон Буды? Самая карэнная ўласцівасць гэтага Сусвету — Ісціна-Дабрыня-Цярпенне, яна і з'яўляецца найвышэйшым увасабленнем Закону Буды, яна і з'яўляецца найбольш грунтоўным Законам Буды. Закон Буды на розных узроўнях мае розныя формы праявы, на розных узроўнях адыгрывае розную настаўляльную ролю; чым ніжэй узровень, тым

больш складаная яго праява. У часцінках паветра, у камені, дрэве, зямлі, жалезе, у чалавечым целе і ва ўсёй матэрыі існуе гэтая ўласцівасць Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. У сівую даўніну казалі, што ўсе істоты і з'явы ў Сусвеце ўтвараюцца з «пяці элементаў»[22], і ва ўсіх іх таксама змяшчаецца ўласцівасць Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Практыкоўцы, якія дасягнулі вызначанага ўзроўню, могуць спазнаць толькі канкрэтную праяву Закону Буды гэтага ўзроўню. Гэта і ёсць Ранг дасягнення[23] ў самаўдасканальванні ды яго[24] ўзровень. Калі апісваць Закон разгорнута, тады ён будзе велічэзным. Калі мець на ўвазе толькі яго найвышэйшы пункт, тады становіцца вельмі проста, бо Закон нагадвае піраміду[25]. Калі ён дасягае найвышэйшага ўзроўню, для яго абагульнення дастаткова трох слоў — Ісціна, Дабрыня, Цярпенне. Калі ж ён праяўляецца на кожным узроўні, тады становіцца надзвычай складаным. Возьмем у якасці аналогіі чалавека. Школа Даа лічыць чалавечае цела малым сусветам. Чалавек мае фізічнае цела. Але толькі само фізічнае цела яшчэ не можа стварыць паўнавартаснага чалавека. Яшчэ неабходны тэмперамент, прыроджаныя схільнасці, характар і душа[26]. Толькі такім чынам будзе створаны цэльны, самастойны, які мае сваю індывідуальнасць, чалавек. Гэтак жа і з нашым Сусветам: існуе Млечны Шлях, іншыя галактыкі, існуе жыццё і вада, а таксама ўсё існае ў Сусвеце — гэта матэрыяльны бок існавання; але адначасова ён мае і ўласцівасць Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Часцінкі любое матэрыі змяшчаюць у сабе такую ўласцівасць, яе змяшчаюць нават найменшыя часцінкі.

Крытэрам ацэнкі добрага і дрэннага ў Сусвеце з'яўляецца ўласцівасць Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Што добра, а што дрэнна? Усё вызначаецца менавіта ёй. Падобным крытэрам з’яўляецца і Дэ[27], пра які мы казалі ў мінулым. Вядома, сёння маральны ўзровень чалавечага грамадства ўжо змяніўся, і нормы маралі скажоныя. Калі сёння нехта бярэ за прыклад Лэй Фэна[28], тады, магчыма, скажуць, што ён псіхічнахворы. Але ў пяцідзясятых, шасцідзясятых гадах хто б назваў яго псіхічнахворым? Ва ўзроўні маралі чалавецтва адбываецца вялікі абвал, маральнасць грамадства штодня падае, людзі гоняцца толькі за нажывай, шкодзяць іншым дзеля ўласнае мізэрнае выгады, змагаюцца адзін з адным, робяць так, не грэбуючы аніякімі сродкамі. Падумайце, ці можна дазволіць, каб усё гэта працягвалася і надалей? Калі чалавек займаецца дрэннай справай, і ты скажаш яму пра гэта, дык ён нават не паверыць. Ён сапраўды не паверыць, што робіць нешта кепскае. Некаторыя ацэньваюць свае ўчынкі паводле нормаў сучаснае маралі, якія ўпалі, ды лічаць сябе лепшымі за іншых, бо змяніўся крытэр ацэнкі, на які арыентуюцца людзі. Як бы ні змяняліся нормы маралі чалавецтва, уласцівасць Сусвету застаецца нязменнай. Яна ж і з'яўляецца адзіным крытэрам ацэнкі добрага і благога чалавека. Такім чынам, самаўдасканальвальніку трэба прад'яўляць да сябе патрабаванні ў адпаведнасці з уласцівасцю Сусвету — нельга патрабаваць ад сябе па крытэрах звычайных людзей. Калі ты хочаш вярнуцца туды, адкуль паходзіш, калі хочаш удасканаліцца, тады ты павінен паводзіцца згодна з гэтым крытэрам. Толькі той, хто паводзіцца ў адпаведнасці з уласцівасцю Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне — добры чалавек. А той, хто адыходзіць ад гэтае ўласцівасці — сапраўды благі чалавек. На працы або ў грамадстве, магчыма,

нехта скажа, што ты благі, але ты наўрад ці насамрэч благі; нехта скажа, што ты добры, але ты зусім неабавязкова сапраўды добры. Займаючыся ўдасканальваннем, калі ты зможаш зліцца з гэтай уласцівасцю, тады станеш тым, хто спасціг Даа. Вось такі просты прынцып.

Школа Даа ў самаўдасканальванні па Ісціне-Дабрыні-Цярпенні робіць акцэнт на ўдасканальванні Ісціны[29]. Таму ў Школе Даа песцяць сваю сапраўдную прыроду, кажуць праўдзівыя словы, робяць шчырыя ўчынкі, з'яўляюцца праведнікамі, вяртаюцца да свайго сапраўднага выгляду і ўрэшце становяцца Дасканалым Чалавекам. Аднак у іх ёсць і Цярпенне, і Дабрыня, толькі акцэнт робіцца на ўдасканальванні Ісціны. Школа Буды з уласцівасці Ісціна-Дабрыня-Цярпенне робіць акцэнт на ўдасканальванні Дабрыні[30]. Паколькі ўдасканальванне Дабрыні можа развіць у чалавека вялікую міласэрнасць, а з узнікненнем міласэрнасці ён бачыць, што ўсе жывыя істоты пакутуюць, тады ў яго ўзнікае жаданне[31] выратаваць усіх жывых істот. Але ў іх ёсць і Ісціна, і Цярпенне[32], толькі акцэнт робіцца на ўдасканальванні Дабрыні. У нашай школе Фалунь Дафа[33] ўдасканальваюцца раўназначна па найвышэйшым эталоне Сусвету — Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Тое, што мы практыкуем, з'яўляецца грандыёзным.

### ЦІҐУН ПРЫНАЛЕЖЫЦЬ ДА ДАГІСТАРЫЧНАЕ КУЛЬТУРЫ

Што такое ціґун? Многія майстры ціґун пра гэта гавораць. Але тое, што кажу я, адрозніваецца ад іх слоў. Многія з іх распавядаюць пра ціґун, знаходзячыся на адным узроўні. Я выкажу разуменне ціґун з пункту гледжання больш высокага ўзроўню, і гэта рэзка разыходзіцца з іх разуменнем. Некаторыя майстры ціґун лічаць, што ціґун у нашай краіне мае двухтысячагадовую гісторыю; другія сцвярджаюць, што трохтысячагадовую; а трэція мяркуюць, што ён мае пяцітысячагадовую гісторыю, амаль такую ж старажытную, як гісторыя нашае кітайскае цывілізацыі; чацвёртыя кажуць, што, мяркуючы па археалагічных знаходках, ціґун ужо сем тысяч гадоў, што далёка-далёка перавышае гісторыю нашае кітайскае цывілізацыі. Але, якім бы ні было іх разуменне, згодна з ім, ціґун не нашмат перавышае гісторыю цывілізацыі чалавецтва. Паводле эвалюцыйнае тэорыі Дарвіна, чалавецтва з водных раслінаў эвалюцыянавала ў водных жывёлаў; потым выпаўзла на сушу, пасля ўскараскалася на дрэвы, далей спусцілася на зямлю ды ператварылася ў малпалюдзей; урэшце, згодна з такімі падлікамі, яны эвалюцыянавалі ў сучаснае чалавецтва, якое мае культуру і мысленне, і сапраўднае ўзнікненне цывілізацыі чалавецтва не перавышае дзесяці тысяч гадоў. Калі глядзець далей у мінулае, тады і вузельчыкавага пісьма яшчэ не існавала. Людзі проста захіналіся лісцем дрэў, елі сырое мяса; а яшчэ раней яны, магчыма, нават і агнём не ўмелі карыстацца. Яны былі поўнымі дзікунамі, першабытнымі людзьмі.

Аднак мы выявілі такую праблему: у многіх месцах свету захоўваецца вялікая колькасць помнікаў культуры, якія далёка выходзяць за гісторыю нашае цывілізацыі. З пункту гледжання тэхналогіяў усе гэтыя помнікі маюць вельмі высокі ўзровень, і з пункту гледжання мастацтва яны з'яўляюцца надзвычай выбітнымі творамі. Сучасныя людзі проста пераймаюць мастацтва старажытных людзей. Яно мае вельмі высокую эстэтычную каштоўнасць. Аднак гэтыя помнікі пакінутыя ўжо вельмі даўно: 100 з лішкам тысяч, сотні тысяч, некалькі мільёнаў, нават больш за 100 мільёнаў гадоў таму. Задумайцеся, ці не з'яўляецца гэта жартам з сучаснае гісторыі? Насамрэч, тут няма з чаго смяяцца, бо грамадства развіваецца ў такіх умовах, калі чалавецтва няспынна ўдасканальвае сябе, наноў спазнае сябе. Пачатковае спазнанне неабавязкова з'яўляецца цалкам правільным.

Многія, магчыма, чулі пра «дагістарычную культуру» альбо пра «дагістарычную цывілізацыю». Вось мы і пагаворым пра тую «дагістарычную цывілізацыю». На Зямлі ёсць Азія, Еўропа, Паўднёвая Амерыка, Паўночная Амерыка, Акіянія, Афрыка ды Антарктыда. Геолагі абагульнена называюць іх мацерыковымі плітамі. З тае пары, як утварыліся мацерыковыя пліты, прайшлі дзясяткі мільёнаў гадоў. Іншымі словамі, значная частка акіянічнага дна падымалася з-пад вады, утвараючы сушу. Значная частка сушы, у сваю чаргу, асядала на акіянічнае дно. І з тых часоў, як зямная паверхня стабілізавалася, да сённяшніх дзён прайшлі дзясяткі мільёнаў гадоў. Аднак на дне многіх акіянаў былі знойдзеныя найстаражытнейшыя цыклапічныя збудаванні. Скульптуры ў гэтых збудаваннях выкананыя вельмі вытанчана, але не прыналежаць да культурнае спадчыны нашага сучаснага чалавецтва. Такім чынам іх, несумненна, стварылі да асядання сушы на акіянічнае дно. У такім разе хто ж стварыў гэтую цывілізацыю дзясяткі мільёнаў гадоў таму? Нашае чалавецтва тады нават і малпамі яшчэ не стала. Як жа яно магло стварыць тое, што патрабуе такога высокага інтэлекту? Археолагі выявілі ў свеце арганізм, які называецца трылабітам і які існаваў 600-260 мільёнаў гадоў таму, пасля чаго знік. Амерыканскі навуковец знайшоў скамянеласць трылабіта, на якой быў адбітак чалавечае нагі. Яго пакінуў чалавек у абутку, і гэта вельмі выразна адбілася на скамянеласці. Хіба гэта не высмейвае гісторыкаў? Паводле эвалюцыйнае тэорыі Дарвіна, як маглі 260 мільёнаў гадоў таму быць людзі?

У музеі Нацыянальнага ўніверсітэта Перу захоўваецца камень, на якім выразана постаць чалавека. Даследаванне паказала, што яна была выразаная 30 тысяч гадоў таму. Але гэтая постаць у адзенні, у капелюшы ды абутку, трымае ў руках тэлескоп і назірае за нябеснымі целамі. Як людзі, якія жылі 30 тысяч гадоў таму, маглі ткаць і насіць адзенне? Зусім неспасціжна тое, што чалавек трымае ў руках тэлескоп і назірае за нябеснымі целамі. Значыць, ён яшчэ мае пэўныя астранамічныя веды. Нам даўно вядома, што еўрапеец Галілей вынайшаў тэлескоп усяго толькі 300 з лішкам гадоў таму. Хто ж вынайшаў гэты тэлескоп 30 тысяч гадоў таму? Існуе яшчэ вельмі шмат неразгаданых загадак. Напрыклад, у пячорах Францыі, ПАР ды Альпаў на каменных плітах выяўлена вельмі шмат насценных малюнкаў, якія

выгравіраваныя цалкам рэалістычна, яны быццам жывыя. Постаці выгравіраваныя вельмі вытанчана ды яшчэ афарбаваныя пэўнай мінеральнай фарбай. Але ўсе яны адзетыя ва ўбранне сучасных людзей, у нешта падобнае да заходняга касцюму, у абліпальных нагавіцах. Некаторыя трымаюць у руцэ штосьці накшталт курыльнае люлькі. Нехта з тых людзей трымае ў руцэ кій, на галаве — капялюш. Як маглі мець такі высокі ўзровень мастацтва малпы некалькі сотняў тысяч гадоў таму?

Далей пагаворым пра яшчэ больш далёкае мінулае. У Рэспубліцы Габон, якая знаходзіцца ў Афрыцы, залягаюць багатыя ўранавыя руды. Гэтая дзяржава даволі адсталая і сама не здольная ўзбагачаць уран. Яна была змушаная экспартаваць руду ў развітыя краіны. У 1972 годзе завод у Францыі імпартаваў гэтую ўранавую руду. Пры дапамозе лабараторнага аналізу было выяўлена, што руду ўжо раней узбагачалі ды выкарыстоўвалі. Гэта ім падалося вельмі дзіўным, і яны адправілі навукова-тэхнічных супрацоўнікаў для даследавання на месцы. Туды паехалі навукоўцы з многіх краін. Урэшце было даказана, што гэтая ўранавая капальня была вялікім ядзерным рэактарам, і ў дадатак надзвычай рацыянальна спланаваным — нават нам, сучасным людзям, было б немагчыма яго пабудаваць. Дык калі ж ён быў пабудаваны? Ён быў пабудаваны два мільярды гадоў таму і працаваў 500 тысяч гадоў. Гэта проста астранамічныя лічбы. Эвалюцыйнай тэорыяй Дарвіна гэтага наогул немагчыма патлумачыць. Такіх выпадкаў вельмі шмат. Адкрытага ў навукова-тэхнічнай сферы цяпер ужо дастаткова для таго, каб перапісаць нашыя сённяшнія падручнікі. Але пасля таго як чалавецтва сфармавала жорстка вызначаны метад працы і лад мыслення пад уплывам уласцівых яму старых уяўленняў, новыя ідэі ўспрымаць вельмі цяжка. Нават калі ісціна праяўляецца, яе ўсё адно не вырашаюцца прызнаць ды інстынктыўна ігнаруюць. З-за ўплыву традыцыйных уяўленняў цяпер ніхто сістэматычна гэтыя рэчы не ўпарадкоўвае, таму ўяўленні людзей заўжды адстаюць ад развіцця. Як толькі ты завядзеш гаворку пра гэтыя рэчы, хоць яны яшчэ не атрымалі ўсеагульнага распаўсюду, але ўжо былі адкрытыя, знойдуцца тыя, хто назаве гэта забабонамі ды не зможа гэтага прыняць.

Цэлы шэраг смелых замежных навукоўцаў ужо публічна прызнаў, што гэта дагістарычныя цывілізацыі — цывілізацыі, якія былі да нашае цывілізацыі чалавецтва. Гэта значыць, да цяперашняе нашае цывілізацыі існаваў яшчэ іншы перыяд цывілізацыі, і не адзін. І археалагічныя знаходкі кажуць пра тое, што ўсё знойдзенае прыналежыць да розных перыядаў цывілізацыі. Таму лічыцца, што з чалавецтвам шматкроць паўтаралася сітуацыя, калі, пасля таго як цывілізацыя зведвала зруйнавальныя ўдары, выжывала толькі малая колькасць людзей ды вярталася да першапачатковага ладу жыцця; паступова зноў размнажалася новае чалавецтва ды ўваходзіла ў новую цывілізацыю. Далей чалавецтва зноў ішло да свайго знішчэння, і зноў размнажалася новае чалавецтва. Раз-пораз яно праходзіла праз розныя такога роду паслядоўныя перыядычныя змены. Паводле слоў фізікаў, рух матэрыі заканамерны. Змены ўсяго нашага Сусвету таксама заканамерныя.

Рух нашае Зямлі ў неабсяжным Сусвеце падчас вярчэння Млечнага шляху не можа заўсёды быць спакойным і бяспечным[34]. Цалкам магчыма сутыкненне з нейкім нябесным целам альбо ўзнікненне іншых праблемаў, што выклікала б каласальную катастрофу. З пункту гледжання нашых здольнасцяў гэта з’яўляецца запланаваным. Аднойчы я дасканала высвятляў ды выявіў, што чалавецтва было ў стане поўнага знішчэння 81 раз. Выжывала толькі меншасць людзей, а ад папярэдняе дагістарычнае цывілізацыі заставалася толькі мізэрная па колькасці спадчына. Ацалелыя пераходзілі да наступнага перыяду і жылі першабытным жыццём. Калі чалавецтва размнажалася, і людзей станавілася шмат, урэшце ізноў узнікала цывілізацыя. Чалавецтва прайшло праз 81 цыкл такіх перыядычных зменаў, і гэта я, высвятляючы, яшчэ не дайшоў да канца. Кітайцы вераць у Нябесны час, спрыяльнасць Зямлі ды згоду паміж людзьмі[35]. Розныя змены астранамічных з'яў, розныя нябесныя часы прыносяць грамадству звычайных людзей розныя грамадскія станы. Як кажуць у фізіцы, рух матэрыі заканамерны. Гэтак жа і з рухам Сусвету.

Распавёўшы вышэй пра дагістарычныя цывілізацыі, я перадусім хацеў сказаць вам наступнае: ціґун таксама не з'яўляецца вынаходствам нашага сённяшняга чалавецтва, ён таксама застаўся з неймаверна далёкіх эпох і адносіцца да дагістарычных цывілізацыяў. Развагі пра гэта можна знайсці і ў кананічных тэкстах. Шак’ямуні ў свой час сказаў, што мільярды кальпаў таму ён ужо дасягаў поспеху ва ўдасканальванні ды прабуджэння. Чаму роўная адна кальпа? Яна роўная мільярдам гадоў. Такія каласальныя лічбы, проста-такі немагчыма сабе ўявіць. Калі гэта праўда, тады ці не супадае гэта па часе з гісторыяй чалавецтва, са зменамі на ўсім зямным шары? Прычым Шак’ямуні таксама казаў, што да яго яшчэ было шэсць першасных Будаў, у яго таксама былі настаўнікі і да таго падобнае. І ўсе яны мільярды кальпаў таму дасягнулі прабуджэння ў самаўдасканальванні. Калі гэта праўда, тады ці не значыць, што сярод артадаксальных метадаў практык і ґунфа сапраўднае перадачы, якія распаўсюджваюцца сёння ў грамадстве, існуюць менавіта такія метады? Калі б мяне пра гэта спыталі, тады, вядома, мой адказ быў бы станоўчым. Але яны трапляюцца рэдка. Зараз фальшывыя ціґуністы, псеўдаціґуністы ды людзі, апантаныя нячыстым духам, бязладна нешта фабрыкуюць і падманваюць людзей. Іх колькасць у шмат разоў перавышае сапраўдны ціґун. Цяжка адрозніць аўтэнтычнае ад фальшывага. Сапраўдны ціґун не так проста распазнаць і не так проста знайсці.

Насамрэч ад сівое даўніны застаўся не толькі адзін ціґун. Тайдзі, Хэ́ту і Ло́шу[36], Джоў-і[37], Баґўа[38] і г.д. — усё гэта засталося з дагістарычных часоў. Таму, калі мы сёння вывучаем і спазнаем іх з пункту гледжання звычайных людзей, тады, як бы мы гэта ні рабілі, вывучыць як след не атрымліваецца. Той, хто стаіць на пазіцыі ўзроўню звычайнага чалавека, з гэтага пункту гледжання і разумовага ўзроўню не здольны зразумець сапраўднае.

## ЦІҐУН — ГЭТА САМАЎДАСКАНАЛЬВАННЕ

Раз ціґун мае такую працяглую гісторыю, дык якое ж, урэшце, яго прызначэнне? Я вам скажу, што наш Дафа прыналежыць да школы Буды; вядома, ён прызначаны для ўдасканальвання ў Буду. А ў Школе Даа — вядома, для ўдасканальвання ў Даоса ды спасціжэння Даа. Скажу вам, што слова «Буда» — гэта не забабоны. Слова «Буда» паходзіць з санскрыту, старажытнаіндыйскае мовы. Калі ў свой час яно пранікла ў Кітай, тады ў транскрыпцыі пазначалася двума кітайскімі іерогліфамі: «фо-тó»[39]. А часам як «фу-тý»[40]. Гэтае слова распаўсюджвалася, распаўсюджвалася, і пасля мы, кітайцы, выпусцілі з яго адзін іерогліф і пачалі гаварыць проста «фо»[41]. Што ж слова «Буда» азначае ў перакладзе на кітайскую? «Прабуджаны», «той, хто прабудзіўся шляхам самаўдасканальвання». Дзе тут забабоны?

Падумайце, у самаўдасканальванні ў чалавека могуць праявіцца экстрасэнсорныя здольнасці. Сёння ў свеце налічваецца ўжо шэсць агульнапрызнаных відаў звышздольнасцяў. Але я лічу, што такіх здольнасцяў існуе больш за дзесяць тысяч відаў. Нехта, седзячы на месцы, не паварухнуўшы ані рукамі, ані нагамі, здольны зрабіць тое, што звычайныя людзі не могуць зрабіць нават пры дапамозе рук і ног. Ён здольны бачыць сапраўдныя прынцыпы кожнае прасторы Сусвету, бачыць сапраўдныя карціны Сусвету, бачыць тое, чаго звычайныя людзі не бачаць. Хіба такі чалавек ужо не з'яўляецца тым, хто спасціг Даа ва ўдасканальванні? Хіба ён ужо не з'яўляецца Вялікім Прабуджаным? Хіба можна сказаць, што ён такі ж, як звычайныя людзі? Хіба ён ужо не стаў тым, хто дасягнуў прабуджэння ва ўдасканальванні? Хіба не будзе правільна называць яго Прабуджаным? У перакладзе на старажытнаіндыйскую мову гэта «Буда». Насамрэч так яно і ёсць, ціґун патрэбны менавіта для гэтага.

Як толькі гаворка заходзіць пра ціґун, дык некаторыя кажуць: «Хто ж будзе займацца ціґун, калі ён здаровы?». Падтэкст такі, што ціґун — гэта толькі ацаленне ад хваробаў, што з’яўляецца вельмі павярхоўным разуменнем. За гэта я вас не буду папракаць, бо многія майстры ціґун акурат і робяць справу лекавання ды аздараўлення, усе яны кажуць пра лекаванне ды аздараўленне, і ніхто не распавядаў з пункту гледжання высокіх узроўняў. Гэтым я не намагаюся сказаць, што ў іншых дрэнныя метады практыкі. Іх місія — вучыць таму, што прыналежыць да ўзроўню лекавання ды падтрымання цела ў форме, распаўсюджваць ціґун. Вельмі шмат людзей хоча ўдасканальвацца на высокія ўзроўні, мае такія думкі, мае такое жаданне, але ў самаўдасканальванні не атрымалі Закону, што ў выніку выклікала велізарныя цяжкасці, і ад гэтага нават узнікла шмат праблем. Натуральна, сапраўднае навучанне ціґун на высокім узроўні звязана з вельмі высокімі тэмамі. Таму, дзякуючы нашаму адказнаму стаўленню да грамадства і людзей, эфект ад усяго навучання практыцы ціґун у нас добры. Некаторыя рэчы сапраўды вельмі высокія і гучаць як забабоны. Аднак мы паспрабуем як мага глыбей растлумачыць іх з пункту гледжання сучаснае навукі.

Пра пэўныя рэчы варта нам толькі загаварыць, як некаторыя людзі адразу ж кажуць, што гэта забабоны. Чаму? Іх крытэр такі: усё пакуль неспазнанае навукай або з чым яны асабіста не сутыкаліся, чаго на іх думку не можа быць, яны лічаць забабонамі, ідэалізмам. Вось якое ў іх уяўленне. Ці правільнае такое ўяўленне? Тое, чаго навука не спазнала, яшчэ не дайшоўшы ў сваім развіцці да адпаведнага этапу, можна проста назваць забабонамі ды ідэалізмам? А ці не прыдумляюць забабоны самі гэтыя людзі? Хіба яны самі не схільныя да ідэалістычнага светагляду? Калі прытрымлівацца такога ўяўлення, хіба зможа навука развівацца, хіба зможа прагрэсаваць? Прасоўванне наперад чалавечага грамадства стане немагчымым. Нічога з вынайдзенага намі ў навукова-тэхнічнай сферы папярэднія пакаленні не мелі. Калі б усё лічылася забабонамі, тады, вядома, не варта было б і казаць пра развіццё. Ціґун таксама не з'яўляецца аніякім ідэалізмам. Многія людзі незнаёмыя з ціґун, таму пастаянна прымаюць яго за ідэалізм. З дапамогай прыбораў на целе майстроў ціґун зафіксавана наяўнасць інфрагукавых, ультрагукавых, электрамагнітных хваляў, інфрачырвоных, ультрафіялетавых і гама-прамянёў, выяўлены таксама нейтроны, атамы, мікраэлементы металаў ды іншыя кампаненты. Хіба ўсё гэта не матэрыяльная рэальнасць? Гэта матэрыя. Хіба любы прадмет не складаецца з матэрыі? Хіба іншыя прасторы-часы не складаюцца таксама з матэрыі? Як жа можна казаць, што гэта забабоны? Калі з дапамогай ціґун удасканальваюцца ў Буду, дык непазбежна закранаецца вялікая колькасць высокіх ды глыбокіх пытанняў, кожнае з якіх мы растлумачым.

Калі ў ціґун такое прызначэнне, тады чаму ж мы называем яго ціґун? Насамрэч ён так не называецца. А як жа тады? Ён называецца самаўдасканальваннем. Гэта, уласна, самаўдасканальванне. Вядома, ціґун мае таксама іншыя спецыфічныя назвы, але ў цэлым называецца ўдасканальваннем. Тады чаму ж яго называюць ціґун? Як вам вядома, ціґун распаўсюджваецца ў грамадстве ўжо больш за 20 гадоў. Гэта пачалося ў сярэдні перыяд «Вялікае культурнае рэвалюцыі»[42], а ў позні яе перыяд наступіў пік яго папулярнасці. Падумайце: у тыя часы вельмі лютаваў ультралевы рух. Не будзем згадваць назваў, якія ціґун меў у дагістарычных цывілізацыях. У ходзе развіцця нашае цывілізацыі чалавецтва ціґун прайшоў праз перыяд феадальнага грамадства. Таму яго назвы часта мелі выразную феадальную афарбоўку. А ціґун, які быў звязаны з рэлігіямі, часта меў назвы з відавочна рэлігійнай афарбоўкай. Напрыклад, «Вялікі Закон самаўдасканальвання па Даа», «Ваджра-медытацыя», «Закон Аргата», «Вялікі Закон удасканальвання ў Буду», «Тэхніка вырабу дзевяціразова перагнанага эліксіру несмяротнасці» — такімі былі ўсе. Калі б ты прыняў такую назву ў часы «Вялікае культурнае рэвалюцыі», тады хіба не зведаў бы ўсеагульнага асуджэння? Хоць жаданне майстроў распаўсюджваць ціґун было добрым: лекаваць ды аздараўляць насельніцтва, паляпшаць фізічную форму людзей, — гэта ж выдатна! — але ўсё адно нельга было, людзі проста не вырашаліся так яго называць. Таму многія майстры ціґун дзеля яго распаўсюду вырвалі з кантэксту «Унутранае алхіміі»[43] ды «Даоскага скарбу»[44] два іерогліфы — «ці-ґун»[45]. Некаторыя ж людзі нават паглыбіліся ў вывучэнне тэрміна «ціґун», але вывучаць тут няма чаго, бо раней ён проста называўся

ўдасканальваннем. Новы тэрмін прыйшлося ўвесці толькі для таго, каб ён адпавядаў ідэалогіі сучасных людзей, і ўсё.

## ЧАМУ ҐУН НЕ ЎЗРАСТАЕ АД ПРАКТЫКІ

Чаму Ґун не ўзрастае ад практыкі? Многія думаюць так: «Я выконваю практыкаванні ціґун, але не атрымаў сапраўдных настаўленняў. Калі б які-небудзь настаўнік навучыў мяне хітрамудраму спосабу, першакласным прыёмам, тады б мой Ґун узрос». Зараз так думаюць 95 адсоткаў людзей. А мне вельмі смешна. Чаму смешна? Бо ціґун не з'яўляецца майстэрствам звычайных людзей. Гэта нешта цалкам надзвычайнае. Трэба ацэньваць яго з пункту гледжання прынцыпаў высокіх узроўняў. Я скажу вам, што карэнная прычына неўзрастання Ґун у тым, што з двух іерогліфаў «сю-лень»[46] звычайна людзі звяртаюць вялікую ўвагу толькі на «лень», а не на «сю». Ты шукаеш звонку, і як бы ты ні шукаў, усё адно не знойдзеш. У цябе цела звычайнага чалавека, рукі звычайнага чалавека, думкі звычайнага чалавека. І ты хочаш дамагчыся, каб рэчывы высокай энергіі эвалюцыянавалі ў Ґун? І ён проста вось так і ўзрасце? Гэта лёгка толькі на словах! На маю думку, гэта проста смешна. Гэта раўнасільна таму, што ты гонішся за чымсьці звонку, шукаеш звонку. Так ты ніколі не знойдзеш.

Гэта не падобна да якога-небудзь майстэрства звычайных людзей або тэхнікі, якой ты змог бы авалодаць, патраціўшы трохі грошай. Гэта абсалютна не той выпадак. Гэта тое, што перавышае ўзровень звычайных людзей, таму трэба прад’яўляць да цябе патрабаванні па звышнатуральных прынцыпах. Якія патрабаванні? Табе трэба ўдасканальвацца ўнутры — нельга шукаць звонку. Колькі людзей шукае звонку! Сёння яны імкнуцца да аднаго, заўтра — да іншага, прычым, маючы навязлівыя ідэі, гоняцца за экстрасэнсорнымі здольнасцямі — якіх толькі мэтаў яны не маюць. Нехта нават хоча стаць майстрам ціґун, хоча разбагацець лекаваннем хворых! У сапраўдным самаўдасканальванні трэба выпраўляць і загартоўваць свае думкі. Гэта называецца ўдасканальваннем Сіньсін[47]. Напрыклад, знаходзячыся ў супярэчнасцях з людзьмі, мы ставімся да сямі пачуццяў ды шасці жаданняў[48], усялякіх жаданняў больш абыякава. Ты змагаешся дзеля ўласнае выгады і пасля гэтага хочаш развіць Ґун. Гэта толькі сказаць проста! Хіба ты не стаў тады такім жа, як звычайныя людзі? Як жа ты можаш развіць Ґун? Такім чынам, трэба надаваць вялікае значэнне ўдасканальванню Сіньсін, толькі тады твой Ґун можа ўзрасці, а ўзровень — падвысіцца.

Што такое Сіньсін? Сіньсін уключае ў сябе: Дэ (Дэ — адна з матэрыяў); цярпенне; усведамленне; адмову — адкіданне разнастайных жаданняў звычайнага чалавека, разнастайных навязлівых ідэяў; таксама трэба быць здольным зносіць пакуты і да таго падобнае. Ён уключае шматбаковыя рэчы. Сіньсін чалавека павінен дасягнуць падвышэння ў кожным аспекце, толькі так

ты зможаш сапраўды падвысіцца. Гэта адна з найважнейшых прычын узрастання сілы Ґун.

Некаторыя думаюць: «Вы закранулі пытанне Сіньсін, але гэта ж тое, што прыналежыць да ідэалогіі, гэта нешта са сферы мыслення чалавека. Ён не з'яўляецца адным і тым самым з Ґун, які мы выпрацоўваем». Як гэта, не з'яўляецца адным і тым самым? У нашых колах мысляроў заўсёды існавала пытанне пра тое, што з'яўляецца першасным: матэрыя альбо дух, — увесь час ішлі абмеркаванні і дыскусіі на гэтую тэму. Насамрэч, скажу я вам, матэрыя і дух — гэта адно і тое ж. Цяпер навукоўцы, якія праводзяць навуковыя даследаванні чалавечага цела, лічаць, што думкі, якія пасылае галаўны мозг чалавека, і з'яўляюцца матэрыяй. Такім чынам, яны з'яўляюцца тым, што існуе матэрыяльна, дык хіба яны не з'яўляюцца і духоўнымі рэчамі чалавека? Хіба яны не адно і тое ж? Гэта як з Сусветам, пра што я ўжо распавядаў, — у Сусвеце ёсць матэрыя, і адначасова ён мае ўласцівасць. Звычайныя людзі не адчуваюць існавання ўласцівасці Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне, бо яны цалкам і поўнасцю знаходзяцца на паверхні гэтага ўзроўню. Калі ты перавышаеш узровень звычайных людзей, тады ўжо можаш гэта адчуць. Як адчуць? Любыя рэчывы ў Сусвеце, уключна з усёй матэрыяй, якая запаўняе цэлы Сусвет, з'яўляюцца духамі, маюць мысленне і з'яўляюцца формамі існавання Закону Сусвету на розных узроўнях. Яны не даюць табе ўзвысіцца. Ты хочаш падвысіцца, але не можаш. Яны проста не даюць табе гэтага зрабіць. Чаму ж яны не даюць табе магчымасці падняцца? Таму што не падвысіўся твой Сіньсін. У кожнага ўзроўню — розныя стандарты. Калі хочаш падвысіць узровень, ты павінен адкінуць свае дрэнныя думкі, выкінуць з сябе бруд ды адпавядаць крытэрам таго ўзроўню. Толькі так ты зможаш падняцца.

З падвышэннем Сіньсін тваё цела моцна зменіцца; з яго падвышэннем гарантавана зменяцца рэчывы твайго арганізма. Як зменяцца? Ты адкінеш тое дрэннае, за чым гнаўся і за што моцна трымаўся. Прывядзем прыклад. Ёсць бутэлька, запоўненая брудам. Калі вельмі туга закруціць вечка ды кінуць бутэльку ў ваду, дык яна адразу ж затоне да самага дна. Цяпер ты высыпаеш знутры бруд. Чым больш высыпаеш, тым вышэй бутэлька ўсплывае. Калі ты высыпеш усё, тады яна цалкам усплыве. Нам падчас самаўдасканальвання акурат і трэба адкідваць разнастайныя дрэнныя рэчы, якія існуюць у чалавечым целе. Толькі гэта можа дазволіць табе ўзвысіцца. Вось якую ролю адыгрывае ўласцівасць Сусвету. Калі ты не ўдасканальваеш свой Сіньсін, калі твой маральны ўзровень не падвышаецца, калі ты не пазбаўляешся ад дрэнных думак і рэчываў, тады ўласцівасць Сусвету проста не дазваляе табе ўзвысіцца. Скажы, хіба матэрыя і дух — не адно і тое ж? Скажам жартам, няхай нехта, знаходзячыся сярод звычайных людзей, мае ўсе сем пачуццяў і шэсць жаданняў, і яму дадуць падняцца ды стаць Будам. Задумайцеся: хіба такое магчыма? Як толькі ён убачыць, наколькі прыгожая Вялікая Бадгісатва, дык у яго, мабыць, народзіцца заганная думка. З-за не ўстаранёнае зайздрасці ён уступіць у супярэчнасці з Будамі. Хіба можна дапусціць, каб такое здарылася?

Дык што ж рабіць? Ты павінен, знаходзячыся сярод звычайных людзей, цалкам пазбавіцца ад усялякіх дрэнных думак. Толькі тады ты зможаш падвысіцца.

Гэта значыць, табе трэба звяртаць вялікую ўвагу на ўдасканальванне Сіньсін, удасканальвацца згодна з уласцівасцю Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне, пазбаўляцца ад жаданняў звычайных людзей, благіх намераў і думак пра здзяйсненне злых учынкаў. Варта толькі твайму ўзроўню мыслення трохі падвысіцца, як ты выдаліш трохі дрэннага са свайго цела. Разам з тым табе трэба і трохі папакутаваць, трохі зведаць ліха, трохі знішчыць уласную карму, тады ты і зможаш трохі ўзвысіцца, тады стрымальная сіла ўласцівасці Сусвету датычна цябе стане ўжо не такой вялікай. Удасканальванне залежыць ад цябе, Ґун — ад настаўніка. Настаўнік дае табе Ґун росту Ґун[49], і гэты Ґун пачынае дзейнічаць. Тады ён і можа прымусіць Дэ — гэтае рэчыва звонку твайго цела — эвалюцыянаваць у Ґун. Ты няспынна падвышаешся, няспынна ўдасканальваешся ўгару, твой слуп Ґун таксама ўвесь час прарываецца ўгару. Практыкоўцу трэба, знаходзячыся сярод звычайных людзей, удасканальваць сябе, загартоўваць сябе і паступова пазбавіцца ад навязлівых ідэяў ды ўсялякіх жаданняў. Рэчы, якія нашае чалавецтва часта лічыць добрымі, з пункту гледжання высокіх узроўняў нярэдка з'яўляюцца дрэннымі. Таму (хоць людзі і лічаць гэта добрым) чым больш чалавек атрымлівае сярод звычайных людзей асабістае выгады, чым лепш жыве, тым у вачах Вялікіх Прабуджаных ён горш. І ў чым жа ён горш? Чым больш чалавек атрымлівае, тым больш шкодзіць іншым, бо здабывае тое, што яму не належыць атрымаць. Ён надае вялікае значэнне рэпутацыі ды багаццю і тады страчвае Дэ. Калі ты хочаш развіць Ґун, але не звяртаеш увагі на ўдасканальванне Сіньсін, тады твой Ґун наогул не ўзрасце.

У нашых колах удасканальвальнікаў лічаць, што душа чалавека несмяротная. Раней, калі хтосьці казаў пра чалавечую душу, тады людзі маглі абвінаваціць яго ў забабоннасці. Як вам вядома з даследаванняў нашага чалавечага цела ў фізіцы, існуюць малекулы, пратоны, электроны, і, калі ісці далей, даследаванні дайшлі да кваркаў, нейтрына і г.д. Калі даходзіш да гэтага кроку, тады пад мікраскопам ужо нічога не бачна. Але ўсё гэта знаходзіцца яшчэ вельмі далёка ад крыніцы жыцця, крыніцы матэрыі. Як вам вядома, для расшчаплення атамнага ядра неабходны ўдар дастатковай энергіі ды велізарная колькасць цеплыні. Толькі тады можа адбыцца зліццё ядраў, толькі тады ядро можа быць расшчэпленае. Калі чалавек памірае, як могуць так проста знікнуць атамныя ядры чалавечага цела? Таму мы выявілі, што, калі чалавек памірае, гэта ўсяго толькі ў нашай прасторы скідваецца слой найвялікшых малекулярных кампанентаў; у іншых жа прасторах цела зусім не руйнуецца. Задумайцеся: які выгляд мае чалавечае цела пад мікраскопам? Увесь чалавечы арганізм рухаецца. Ты сядзіш там нерухома, але ўсё цела знаходзіцца ў руху. Малекулярныя клеткі рухаюцца, усё цела з'яўляецца рыхлым, нібы складаецца з пяску. Вось якім з'яўляецца чалавечае цела пад мікраскопам. Калі мы паглядзім на яго нашымі вачыма, тады карціна цалкам змяняецца. Гэта таму, што чалавечыя вочы здольныя ствараць табе ілюзію і не даюць табе гэтага

бачыць. Калі адкрылася нябеснае вока, тады можна бачыць з павелічэннем. Раней гэта было прыроджанай здольнасцю чалавека, а цяпер называецца экстрасэнсорнай здольнасцю. Калі ты хочаш, каб у цябе праявіліся экстрасэнсорныя здольнасці, табе трэба вярнуцца да свайго першапачатковага выгляду, удасканаліцца назад.

Пагаворым пра вышэйзгаданы Дэ. Якая канкрэтна ўзаемасувязь паміж Дэ і Ґун? Прааналізуйма гэта. Мы, людзі, маем па адным целе ў шматлікіх прасторах. Разгледзім складнікі чалавечага цела, якое мы зараз можам бачыць. Найбуйнейшымі з іх з'яўляюцца клеткі. Гэта нашае чалавечае фізічнае цела. Калі ты пранікнеш паміж клеткамі ды малекуламі, паміж малекуламі ды малекуламі, тады зведаеш пераход у іншую прастору. Якая форма існавання таго цела? Вядома, табе нельга гэта разумець, выкарыстоўваючы цяперашнія паняцці прасторы. Тваё цела павінна адпавядаць патрабаванням такое прасторы па форме яе існавання. Целы ў іншых прасторах самі па сабе могуць павялічвацца ды памяншацца. Тады ты выявіш, што гэта таксама непараўнальна вялікая прастора. Тут я маю на ўвазе простую форму існавання іншых прастораў — такіх, якія існуюць адначасова на тым жа самым месцы. Чалавек мае па адным канкрэтным целе ў многіх іншых прасторах. І ў адной адмысловай прасторы вакол чалавечага цела існуе поле. Якое поле? Гэта і ёсць поле Дэ, пра якое мы гаворым. Дэ — белае рэчыва. Яно зусім не з'яўляецца тым, што прыналежыць да чалавечае разумовае дзейнасці альбо чалавечае ідэалогіі, як мы лічылі раней. Яно цалкам і поўнасцю з'яўляецца матэрыяльным існаваннем. Таму, калі ў мінулым старыя казалі пра назапашванне Дэ і яго страту, тады цалкам мелі рацыю. Дэ атачае чалавечае цела, утвараючы поле. Раней у Школе Даа казалі, што гэта настаўнік шукае сабе вучня, а не вучань настаўніка. Што гэта значыць? Тое, што настаўнік павінен паглядзець, ці вялікую колькасць кампанентаў Дэ мае цела гэтага кандыдата ў вучні. Калі вялікую, тады ўдасканальвацца яму будзе лёгка; калі невялікую — тады цяжка, яму будзе вельмі цяжка развіць высокі Ґун.

Адначасова з белым існуе і чорнае рэчыва. Мы тут называем яго кармай[50]. У будызме яго называюць злой кармай. Абодва рэчывы — і белае, і чорнае — існуюць адначасова. Якая паміж імі сувязь? Рэчыва Дэ мы атрымліваем, трываючы пакуты, зведваючы ўдары, робячы добрыя справы; а чорнае рэчыва чалавек атрымлівае, здзяйсняючы зло, здзяйсняючы благія ўчынкі ды абражаючы іншых. Цяпер людзі не толькі гоняцца за нажывай, некаторыя гатовыя на любое зло. Дзеля грошай яны бяруцца за любую кепскую справу: забойства, замоўленае забойства, гомасексуалізм, наркаманію і г.д., бывае ўсё што толькі заўгодна. Калі чалавек здзяйсняе благі ўчынак, тады страчвае Дэ. Якім чынам гэта адбываецца? Калі ён лае іншых, тады адчувае, што нібыта перамог, спагнаў на іх свой гнеў. Але ў Сусвеце існуе прынцып: «Хто не страціў, не атрымае. Калі атрымліваеш, тады страціш. Калі не страчваеш — цябе змусяць страціць». Хто выконвае гэтую функцыю? Яе выконвае ўласцівасць Сусвету. Таму, калі ты хочаш толькі атрымліваць, дык так не выйдзе. Што ж рабіць? Калі чалавек лае іншых, абражае іншых, тады ён кідае ім Дэ; а

супрацьлеглы бок з'яўляецца бокам, які незаслужана пакрыўдзілі, які панес страту і зведаў пакуты, таму ён і атрымлівае кампенсацыю. Калі адзін чалавек на гэтым баку лае другога, услед за яго лаянкай з яго ўласнага прасторавага поля адлятае кавалак Дэ і апускаецца на цела пацярпелага. Чым больш рэзкая лаянка, тым больш першы дае другому Дэ. Усё будзе гэтак жа, калі хтосьці б'е ды абражае іншага. Ён б'е іншага кулаком, б'е нагой. Чым больш моцныя ўдары першага, тым адпаведна больш пераходзіць да другога і асядае Дэ. Але звычайны чалавек не бачыць гэтага высокага прынцыпу. Ён лічыць, што яго пакрыўдзілі, і не можа гэтага вытрымаць: «Ты мяне ўдарыў, і я дам табе здачы». «Бац!» — ён дае кулаком здачы ды перасоўвае Дэ назад. У выніку ні адзін з іх ані страціў, ані атрымаў. Апошні ж, верагодна, падумаў: «Ты ўдарыў мяне адзін раз, а я цябе ўдару двойчы, інакш мне не спагнаць сваю злобу». І ён ізноў наносіць удар, і ад яго зноў адлятае да супрацьлеглага боку кавалак Дэ.

Чаму Дэ надаюць такое вялікае значэнне? Якая існуе сувязь у пераўтварэнні Дэ? У рэлігіі кажуць, што калі чалавек, які мае Дэ, не атрымае ў гэтым жыцці, дык атрымае ў наступным. Што ён атрымае? Калі ў чалавека Дэ шмат, тады, верагодна, ён стане высокім службоўцам, вельмі разбагацее, у яго будзе ўсё, што ён толькі захоча. Усё гэта будзе атрымана ў абмен на Дэ. У рэлігіі таксама кажуць, што калі ў чалавека няма Дэ, тады адбываецца поўнае знішчэнне цела і душы. Яго душа будзе знішчаная, пасля яго смерці ўсё памрэ, нічога не застанецца. А ў нашых колах удасканальвальнікаў кажуць, што Дэ можа непасрэдна эвалюцыянаваць у Ґун.

Вось мы і паразмаўляем пра тое, як Дэ эвалюцыянуе ў Ґун. У колах удасканальвальнікаў ёсць такі выраз: «Удасканальванне — у тваёй кампетэнцыі, а Ґун — у кампетэнцыі настаўніка». Аднак некаторыя надаюць вялікае значэнне «ўсталяванню трыножка, падрыхтоўцы печы і здабыванню лекавых сродкаў для прыгатавання дань[51]», а таксама дзеянню думак. Яны лічаць гэта вельмі важным. Скажу табе, што гэта зусім не важна. Калі ты пра такое будзеш шмат думаць, тады гэта і будзе навязлівай ідэяй. Калі ты лічыш гэта важным, тады хіба не азначае, што ты ўпарта за гэтым гонішся? Самаўдасканальванне залежыць ад цябе, а Ґун — ад настаўніка. Дастаткова ўжо таго, што ў цябе ёсць такое жаданне. А насамрэч гэта ажыццяўляе настаўнік. Табе гэтага зусім не зрабіць. У цябе цела звычайнага чалавека, і ты зможаш стварыць гэткую Вышэйшую істоту, якая складаецца з рэчываў высокай энергіі? Гэта абсалютна немагчыма. Нават казаць пра такое смешна. Працэс эвалюцыі чалавечага цела ў іншых прасторах неймаверна цудоўны, неверагодна складаны. Ты наогул не ў стане гэтага зрабіць.

А што ж дае табе настаўнік? Ён дае табе Ґун росту Ґун. Бо Дэ знаходзіцца звонку чалавечага цела. Сапраўдны Ґун чалавека ўтвараецца менавіта з Дэ. Вышыня ўзроўню чалавека і велічыня яго сілы Ґун цалкам спараджаюцца з Дэ. Ґун росту Ґун прымушае твой Дэ эвалюцыянаваць у Ґун, які спіралепадобна расце ўгару. Ґун, які сапраўды вызначае вышыню ўзроўню чалавека, расце

звонку цела. Урэшце, пасля таго як ён спіралепадобна вырасце да макаўкі чалавека, утвараецца слуп Ґун. Якая ў гэтага чалавека вышыня Ґун, бачна з аднаго позірку на вышыню яго слупа Ґун. Гэта і ёсць яго ўзровень, тое, што ў будызме называецца Рангам дасягнення. У некаторых людзей падчас сядзення ў медытацыі душа можа пакінуць цела. Яна адразу падымаецца вельмі высока, а яшчэ вышэй падняцца ўжо не можа — не вырашаецца. Гэта яна робіць, седзячы на сваім слупе Ґун, і здольная падняцца толькі на такую вышыню. Бо яе слуп Ґун толькі такое вышыні. Яшчэ вышэй падняцца яна ўжо не можа. Гэта і з'яўляецца Рангам дасягнення, пра які распавядаецца ў будызме.

Для вымярэння вышыні Сіньсін таксама існуе і лінейка. Лінейка ды слуп Ґун знаходзяцца не ў адной і той жа прасторы, але існуюць аднachасова. Твой Сіньсін падвысіцца, калі, напрыклад, сярод звычайных людзей іншыя цябе аблаюць, а ты не скажаш ні слова і ў душы застанешся вельмі спакойным; калі цябе ўдараць кулаком, ты таксама нічога не скажаш, пасмяешся з гэтае праблемы ды пакінеш яе ў мінулым. Сіньсін у такога чалавека ўжо вельмі высокі. Такім чынам, калі ты практыкоўца, тады што табе належыць атрымаць? Ты атрымліваеш Ґун. Калі падвышаецца твой Сіньсін, тады расце і твой Ґун. Якая вышыня Сіньсін, такая і вышыня Ґун. Гэта абсалютная ісціна. Раней некаторыя з тых, хто выконваў практыкаванні ціґун у парках альбо дома, рабілі гэта, дарэчы, вельмі старанна, вельмі шчыра, і атрымлівалася няблага. Але, ступіўшы за дзверы, яны пераставалі быць самімі сабой, зноў браліся за сваё, сярод звычайных людзей змагаліся з іншымі дзеля рэпутацыі ды грошай. Ці мог расці іх Ґун? Зусім не мог. Іх захворванні таксама не маглі прайсці — з гэтае ж самае прычыны. Чаму людзі не выздараўліваюць нават за працяглы перыяд заняткаў ціґун? Ціґун — гэта самаўдасканальванне, нешта звышнатуральнае. Гэта не гімнастыка звычайных людзей. Абавязкова трэба надаваць вялікае значэнне Сіньсін — толькі тады прыйдзе выздараўленне або ўзрасце Ґун.

Некаторыя людзі лічаць, быццам, калі «ўсталёўваюць трыножак, рыхтуюць печ і здабываюць лекавыя сродкі для прыгатавання дань», дык гэты дань і з'яўляецца Ґун. Не. У дань захоўваецца толькі частка энергіі, гэта не ўся яе колькасць. Што ж такое дань? Як вам вядома, у нас ёсць таксама і рэчы для ўдасканальвання даўгалецця. У целе чалавека яшчэ павінны з'явіцца здольнасці, а таксама вельмі шмат магічных рэчаў. Пераважная іх частка замкнёная. Табе не даюць іх выкарыстоўваць. Існуе велізарная колькасць здольнасцяў — больш за дзесяць тысяч відаў. Як толькі адна з іх утвараецца, яе замыкаюць. Чаму ж здольнасці не праяўляюцца? Мэта ў тым, каб не даць табе адвольна здзейсніць нешта, выкарыстаўшы іх у грамадстве звычайных людзей. Нельга адвольна перашкаджаць грамадству звычайных людзей. І нельга, як табе ўздумаецца, дэманстраваць у грамадстве свае ўменні. Бо ўсё гэта парушыла б стан грамадства звычайных людзей. Шмат людзей самаўдасканальваецца з дапамогай усведамлення. Калі б ты ўсё ім паказаў, тады, убачыўшы, што гэта праўда, удасканальвацца прыйшлі б і ўсе астатнія, нават людзі, якія зрабілі такое зло, за якое не даюць літасці[52]. Таму гэта не дазволена. Нельга дазваляць табе так сябе паказваць. І ты, верагодна, зрабіў

бы благі ўчынак, бо не бачыш прычыннае сувязі рэчаў, не бачыш іх сутнасці. Ты б думаў, нібы робіш добрае, а здзейсніў бы, верагодна, благі ўчынак. Таму табе не дазволена выкарыстоўваць здольнасці. Бо як толькі ты зробіш благое, дык твой узровень упадзе, і ўдасканальванне будзе марным. Улічваючы гэта, вельмі шмат здольнасцяў замкнёныя. Што ж рабіць? Калі прыйдзе дзень адкрыцця Ґун і адкрыцця ўсведамлення, згаданы дань, які насамрэч з'яўляецца бомбай, выбухнуўшы, адкрые ўсе здольнасці, усе замкі ды ўсе цяў на целе чалавека. «Бабах!» — адбудзецца рэзкае страсенне, і ад яго ўсё цалкам адкрыецца. Вось для чаго патрэбны дань. Пасля смерці манаха і крэмацыі яго цела застаецца шарыра. Некаторыя людзі кажуць, што гэта костка або зубы. Чаму ж тады такога няма ў звычайных людзей? Гэта дань, выбухнуўшы, вызваліў сваю энергію. Сама шарыра ўключае ў сябе вялікую колькасць рэчываў з іншых прастораў. Яна, урэшце, таксама з'яўляецца матэрыяльным прадметам, аднак не мае аніякага прызначэння. Цяперашнія людзі лічаць яе чымсьці вельмі каштоўным. Яна мае энергію, глянцавітая ды вельмі цвёрдая. Вось што гэта такое.

У адсутнасці росту Ґун ёсць таксама іншая прычына: няведанне Закону высокіх узроўняў, з-за чаго не можаш удасканальвацца. Што гэта значыць? Гэта як з тым, пра што я толькі што распавядаў, калі некаторыя людзі займаліся практыкаваннямі многіх метадаў практыкі. Скажу табе наступнае: колькі б метадаў ты ні вывучыў, усё адно без толку. Ты ўсё адно застанешся толькі школьнікам, школьнікам у самаўдасканальванні. Бо гэта ўсё прынцыпы нізкіх узроўняў. Калі ты з дапамогай такіх прынцыпаў нізкіх узроўняў станеш удасканальвацца на высокія ўзроўні, яны тады не будуць адыгрываць настаўляльнае ролі. Чытаючы ва ўніверсітэце падручнікі пачатковае школы, ты ўсё адно застаешся вучнем пачатковае школы. Наколькі б шмат ты ні вывучыў, карысці ўсё адно не будзе, а, наадварот, толькі горай. На розных узроўнях існуюць розныя Законы. Закон на розных узроўнях адыгрывае розную настаўляльную ролю. Таму прынцыпы нізкіх узроўняў, якімі ты карыстаешся, не змогуць указваць табе дарогу ва ўдасканальванні на высокія ўзроўні. Тое, што мы далей будзем тлумачыць, — гэта прынцыпы ўдасканальвання на высокіх узроўнях. Я чытаю лекцыі, спалучаючы ў іх рэчы розных узроўняў. Таму ў тваім далейшым удасканальванні яны заўсёды будуць адыгрываць настаўляльную ролю. Я маю некалькі кніг, а таксама аўдыя- і відэакасеты. Ты выявіш, што пасля таго як прачытаеш, праслухаеш або паглядзіш іх адзін раз, а праз некаторы час зноў прачытаеш, зноў праслухаеш або паглядзіш, яны будуць гарантавана далей адыгрываць для цябе пуцяводную ролю. Ты будзеш пастаянна падвышацца, і яны пастаянна будуць адыгрываць для цябе пуцяводную ролю. Гэта і ёсць Закон. Вышэй я распавёў пра дзве прычыны таго, чаму падчас практыкі ціґун не расце Ґун: няведанне Закону высокіх узроўняў, а значыць, адсутнасць метаду ўдасканальвання; і нястача ўнутранага ўдасканальвання — Ґун не расце без удасканальвання Сіньсін. Вось такія дзве прычыны.

**АДМЕТНЫЯ РЫСЫ ФАЛУНЬ ДАФА**

Наш Фалунь Дафа з'яўляецца адной з 84 тысяч школ у Школе Буды. Яго ніколі адкрыта не перадавалі ў цяперашні гістарычны перыяд цывілізацыі чалавецтва, але ў адзін з дагістарычных перыядаў ён шырокамаштабна выратоўваў людзей. У заключны перыяд канцавое кальпы я яшчэ раз шырока распаўсюджваю яго, таму ён з'яўляецца надзвычай каштоўным. Я апісаў форму непасрэднага пераўтварэння Дэ ў Ґун. Насамрэч Ґун выпрацоўваецца не практыкай, а ўдасканальваннем. Вельмі шмат людзей імкнецца да ўзрастання Ґун, звяртаючы асноўную ўвагу толькі на выкананне практыкаванняў і не надаючы належнае ўвагі ўдасканальванню. Насамрэч выпрацоўка Ґун цалкам абапіраецца на ўдасканальванне Сіньсін. Тады чаму мы тут яшчэ навучаем людзей і практыцы ціґун? Перадусім, пагаворым пра тое, чаму манахі не выконваюць практыкаванні. Асноўныя іх заняткі — сядзець у медытацыі, чытаць каноны, удасканальваць Сіньсін, у выніку чаго ў іх узрастае Ґун, які вызначае вышыню іх узроўню. Раз Шак'ямуні прапаведаваў адмову ад усяго з людскога свету, уключаючы адмову ад уласнага цела, тады рухі цела не патрэбныя. У Школе Даа не здзяйсняюць выратаванне ўсіх жывых істот. Яны не маюць справы з людзьмі, якія знаходзяцца ў розных душэўных станах альбо з людзьмі вельмі рознага ўзроўню (бо якіх толькі людзей не бывае, у некаторых з іх вялікі эгаізм, у некаторых — не). Яны самі сабе падбіраюць вучняў. Знаходзяць трох вучняў, і нават сярод іх сапраўдная перадача выконваецца толькі аднаму. Гэты вучань будзе гарантавана з высокім Дэ, будзе добрым, і з ім не ўзнікне праблем. Таму яны засяроджваюцца на навучанні яго тэхнікам практыкаванняў для ўдасканальвання даўгалецця. Шляхам практыкі ён выпрацоўвае цудатворную сілу[53], магічныя ды іншыя рэчы. Тут ужо патрэбныя некаторыя рухі.

Фалунь Дафа — гэта таксама метад удасканальвання і Сіньсін, і даўгалецця, таму ў ім трэба практыкаваць рухі. З аднаго боку, рухі выкарыстоўваюць для ўзмацнення здольнасцяў. Што маецца на ўвазе пад узмацненнем? Пры дапамозе тваёй магутнай сілы Ґун узмацняюць твае звышздольнасці, каб яны рабіліся ўсё больш магутнымі. З іншага боку, у тваім целе таксама павінна быць створана вялікая колькасць жывых істот. Калі чалавек дасягае ў самаўдасканальванні высокіх узроўняў, у яго, як кажуць у Школе Даа, з'яўляецца на свет Дасканалае немаўля, альбо, паводле Школы Буды, Дыяментанятленнае цела. Таксама павінна быць створана вельмі шмат магічных рэчаў. Усё гэта трэба выпрацаваць пры дапамозе практыкаванняў. Вось што выпрацоўваецца праз рухі. Поўны метад практыкі ўдасканальвання і Сіньсін, і даўгалецця патрабуе ўдасканальвання і практыкі. Думаю, цяпер вы зразумелі, адкуль бярэцца Ґун. Ґун, які сапраўды вызначае вышыню твайго ўзроўню, выпрацоўваецца зусім не практыкай, а ўдасканальваннем. Гэта ў ходзе ўдасканальвання сярод звычайных людзей ты падвысіў свой Сіньсін, асіміляваўся з уласцівасцю Сусвету, такім чынам уласцівасць Сусвету перастала цябе абмяжоўваць, і значыць, ты можаш узвысіцца. Тады Дэ

пачынае эвалюцыянаваць у Ґун. Ґун падвышаецца менавіта пасля падвышэння стандарту твайго Сіньсін. Менавіта такая ўзаемасувязь.

Наш метад практыкі і сапраўды прыналежыць да метадаў удасканальвання і Сіньсін, і даўгалецця. Выпрацаваны намі Ґун назапашваецца ў кожнай клетцы цела да карпускулярных кампанентаў крыніцы матэрыі, якія існуюць у найбольш мікраскапічным стане. Ва ўсіх іх захоўваецца Ґун з матэрыі высокай энергіі. Услед за тым як твая сіла Ґун будзе станавіцца ўсё вышэй, гушчыня Ґун будзе станавіцца ўсё больш, яго магутнасць будзе таксама станавіцца ўсё больш. Такія рэчывы высокай энергіі маюць разумовыя здольнасці. Паколькі яны назапашваюцца ў кожнай клетцы чалавечага цела да крыніцы жыцця, дык за доўгі час набываюць тую ж форму, што і клеткі твайго цела, такі ж парадак размяшчэння, як у малекул, аднолькавую форму з усімі атамнымі ядрамі. Але змяняецца сутнасць. Гэта ўжо не тое цела, якое першапачаткова змяшчала клеткі плоці. Ці не азначае гэта, што ты ўжо не знаходзішся ў пяці элементах? Вядома, тваё ўдасканальванне яшчэ не завершана. Ты і далей удасканальваешся сярод звычайных людзей, таму знешне ты ствараеш уражанне звычайнага чалавека. Адзінае адрозненне ў тым, што, у параўнанні са сваімі равеснікамі, ты вельмі молада выглядаеш. Вядома, перш за ўсё патрэбна ліквідаваць дрэннае з твайго цела, уключаючы хваробы. Але тут у нас ніякае не лекаванне. Мы ачышчаем цела. Ужыты тэрмін таксама не «лекаванне». Мы гэта называем менавіта ачышчэннем цела — ачышчэннем цела для тых, хто сапраўды ўдасканальваецца. Некаторыя людзі прыйшлі менавіта лекавацца. Мы не дапускаем на свае курсы людзей з вельмі цяжкімі хваробамі, бо яны не могуць вызваліцца ад жадання вылекавацца, не могуць выкінуць з галавы думкі пра тое, што яны хворыя. Яны сур'ёзна захварэлі, і ім вельмі блага. Хіба такія людзі могуць выкінуць гэта з галавы? Яны не ў стане ўдасканальвацца. Мы зноў і зноў падкрэсліваем, што не прымаем цяжкахворых. Тут у нас самаўдасканальванне. Гэта вельмі адрозніваецца ад таго, чаго яны жадаюць. Яны могуць звярнуцца з такой просьбай да іншых майстроў ціґун. Вядома, шмат з тых, хто ў нас навучаецца, хворыя. Раз ты сапраўдны ўдасканальвальнік, мы зробім гэта для цябе.

Тыя, хто вучыцца нашаму Фалунь Дафа, пасля таго, як яны ўжо будуць удасканальвацца нейкі час, знешне вельмі зменяцца. Іх скура стане далікатнай, румянай, у старых людзей стане менш зморшчын. Да такое ступені, што іх нават застанецца вельмі мала. Гэта паўсюдная з'ява. Я тут не кажу пра «містычныя Неба і Зямлю». Шмат хто з прысутных тут з намі дасведчаных вучняў гэта ведае. Апроч таго, у пажылых жанчын нават з'явяцца месячныя, бо ў метадах практыкі ўдасканальвання і Сіньсін, і даўгалецця патрэбны менструальны ці для ўдасканальвання даўгалецця. Месячныя будуць, але ў абмежаванай колькасці, на цяперашнім этапе толькі трохі — столькі, колькі трэба, і годзе. Гэта таксама распаўсюджаная з'ява. Інакш, калі табе будзе не ставаць такога ці, тады як табе ўдасканальваць жыццё? Мужчыны таксама — і старыя, і маладыя — адчуюць лёгкасць ва ўсім целе. Калі ты будзеш сапраўды ўдасканальвацца, тады ты адчуеш на сабе такія змены.

Практыка па нашым метадзе з’яўляецца грандыёзнай. Яна не падобная да вялікае колькасці метадаў практыкі, якія ў сваіх практыкаваннях імітуюць жывёл. Гэтая практыка проста-такі каласальная. Усе прынцыпы, якія ў свой час выклалі Шак’ямуні ды Ла́а-цзы[54], — гэта прынцыпы ў межах нашага Млечнага шляху. А што практыкуе наш Фалунь Дафа? Мы ўдасканальваемся па законах эвалюцыі Сусвету, па найвышэйшай уласцівасці Сусвету — у нашым удасканальванні шлях указвае крытэр Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Мы практыкуем такую велічную рэч. Гэта раўназначна таму, што мы практыкуем Сусвет.

Наш Фалунь Дафа мае яшчэ адну надзвычай выключную рысу, якой адрозніваецца ад усіх іншых метадаў практыкі. Усе віды ціґун, якія ў наш час распаўсюджваюцца ў грамадстве, ідуць шляхам дань, выпрацоўваюць дань. У ціґун, у якім выпрацоўваюць дань, вельмі цяжка дасягнуць адкрыцця Ґун і адкрыцця ўсведамлення сярод звычайных людзей. Наш Фалунь Дафа не ідзе шляхам дань. Наш метад практыкі ўдасканальвае ўнізе жывата чалавека Фалунь[55], які я асабіста ўкладваю ў вучняў на навучальных курсах. Падчас майго выкладання Фалунь Дафа мы па чарзе ўкладзем у вас Фалунь. Некаторыя гэта адчуваюць, некаторыя — не. Большасць адчувае. Фізічныя дадзеныя ва ўсіх розныя. Мы загартоўваем Фалунь, а не дань. Фалунь — гэта Сусвет у зменшаным выглядзе, ён мае ўсе функцыі Сусвету. Ён здольны аўтаматычна вярцецца, круціцца. Фалунь будзе заўсёды круціцца ўнізе жывата. Як толькі ён будзе ў цябе ўкладзены, ён больш не спыніцца і будзе круглы год заўсёды такім чынам круціцца. У працэсе вярчэння ў галоўным кірунку Фалунь аўтаматычна ўсмоктвае энергію з Сусвету, ён сам таксама ператварае энергію, забяспечваючы эвалюцыю энергіі, патрэбнай для кожнай часткі твайго цела. Адначасова, калі ён круціцца ў супрацьлеглым (гадзіннікавай стрэлцы) кірунку, тады выпускае энергію, выкідае адпрацаваныя рэчывы, і яны рассейваюцца вакол цела. Калі Фалунь выпускае энергію, тады выкідае яе вельмі далёка і зноў прыносіць новую энергію. Ад энергіі, якую ён выпускае, людзі вакол цябе атрымліваюць карысць. Школа Буды заклікае ратаваць і сябе, і іншых, ратаваць усіх жывых істот. Трэба не толькі ўдасканальваць сябе, але і здзейсніць выратаванне ўсіх жывых істот. Іншыя таксама атрымаюць карысць: ты можаш ненаўмысна наладзіць здароўе іншых, вылекаваць іх і г.д. Вядома ж, энергія не страчваецца. Калі Фалунь круціцца ў галоўным кірунку (па гадзіннікавай стрэлцы), тады збірае яе назад, бо ён вечна няспынна верціцца.

Нехта з вас падумаў: «Дзякуючы чаму гэты Фалунь можа вечна, не спыняючыся, круціцца?» Іншы ў мяне спытаў: «За кошт чаго ж ён круціцца? У чым прынцып? Назапашаная ў вялікай колькасці энергія здольная ўтварыць дань. Гэта зразумець проста. А вярчэнне Фалунь неспасціжнае». Я прывяду вам прыклад. Сусвет рухаецца, усе млечныя шляхі ў Сусвеце, усе галактыкі рухаюцца, дзевяць вялікіх планет круцяцца вакол Сонца, Зямля таксама круціцца вакол сваёй восі. Задумайцеся: хто іх штурхнуў? Хто прыкладае да іх сілу? Ты не можаш зразумець гэта з дапамогай такога паняцця звычайных людзей. У іх проста такі механізм вярчэння. Гэтак жа і з нашым Фалунь — ён

проста круціцца. Фалунь вырашыў праблему практыкі ціґун для звычайных людзей у нармальных умовах жыцця, павялічваючы час вашае практыкі. Якім чынам павялічваючы? Тым, што ён увесь час круціцца — пастаянна ўсмоктвае энергію з Сусвету і выклікае яе эвалюцыю. Калі ты на працы, ён цябе загартоўвае. Вядома, усё ж такі не толькі Фалунь — мы ўкладзем у тваё цела яшчэ вельмі шмат функцыяў, механізмаў, якія ва ўзаемасувязі з Фалунь аўтаматычна дзейнічаюць і выклікаюць эвалюцыю. Таму гэты Ґун цалкам аўтаматычна абумоўлівае эвалюцыю чалавека. Такім чынам, сфармавалася тое, што называецца «Ґун выплаўляе чалавека», альбо па-іншаму «Закон выплаўляе чалавека». Калі ты не практыкуеш ціґун, Ґун цябе выплаўляе; калі ты практыкуеш, Ґун таксама цябе выплаўляе. Калі ты ясі, спіш або працуеш, тады дзякуючы Ґун увесь час знаходзішся ў стане эвалюцыі. Навошта табе практыкаваць ціґун? Вашая практыка ўзмацняе Фалунь, узмацняе ўсе функцыі ды цідзі[56], якія я ў цябе ўклаў. Калі самаўдасканальваешся на высокіх узроўнях, усё праходзіць у Нядзеянні, рухі ідуць услед за механізмамі, няма ніякага кіравання з дапамогай думак, не звяртаецца ўвага на ўдыхі і выдыхі і да таго падобнае.

Для нас таксама не мае значэння, калі і дзе практыкаваць. Некаторыя запытваюць: «У які час лепш практыкаваць? З дваццаць трэцяй гадзіны да першай? З сёмай да дзявятай? З адзінаццатай да трынаццатай?» Мы не зважаем на час сутак. Калі апоўначы ты не практыкуеш ціґун, Ґун цябе выплаўляе; калі раніцай не практыкуеш, Ґун таксама цябе загартоўвае; калі ты заснуў, Ґун таксама цябе выплаўляе; калі ідзеш па вуліцы, Ґун гэтак жа цябе выплаўляе; ты на працы — Ґун і далей цябе загартоўвае. Гэта істотна скарачае тэрмін тваёй практыкі ціґун, хіба не так? Шмат хто з нас сапраўды жадае спасцігнуць Даа. І ў гэтым, вядома, мэта самаўдасканальвання. Канчатковая мэта ўдасканальвання — спасцігнуць Даа і дасягнуць Поўнае Дасканаласці. Ды ў некаторых людзей ужо такі ўзрост, што колькасць гадоў, якую ім засталося пражыць, вельмі абмежаваная, ім наўрад ці хопіць часу. Наш Фалунь Дафа здольны вырашыць такую праблему, скараціўшы працэс практыкі. Разам з тым гэта зноў-такі метад удасканальвання і Сіньсін, і даўгалецця. Калі ты пастаянна ўдасканальваешся, тады тваё жыццё пастаянна прадоўжваецца. Ты пастаянна практыкуеш, і яно бесперапынна прадоўжваецца. Так што тым, у каго добрая маральная аснова, але паважны ўзрост, часу для практыкі ціґун хопіць. Аднак існуе крытэр: жыццё, якое прадоўжылася пасля таго, як мінуў на раду напісаны былы ход твайго жыцця, цалкам прызначанае для тваёй практыкі. Калі ў тваіх думках з'явіцца хоць найменшае адхіленне, тады гэта прывядзе да небяспекі для жыцця, бо твой жыццёвы працэс даўно ўжо мінуў. Гэтага абмежавання не стане толькі пасля таго, як ты выйдзеш за межы ўдасканальвання па Законе чалавечага свету. Тады адбудзецца пераход у іншы стан.

Мы не зважаем на бакі свету і не робім адмысловага завяршэння практыкі ціґун. Гэта таму, што Фалунь заўсёды бесперапынна круціцца, і яго нельга спыніць. Звоніць тэлефон альбо хто-небудзь прыйшоў ды грукоча ў дзверы — адразу ідзі ды рабі патрэбныя справы, і няма неабходнасці адмысловым чынам завяршаць

практыку. Калі ты возьмешся за свае справы, Фалунь неадкладна пачне круціцца па гадзіннікавай стрэлцы і адразу ж абсарбуе назад энергію, якая была рассеяна звонку твайго цела. Калі штучна «трымаць ці абедзвюма рукамі ды ўліваць яго ў макаўку», тады, як бы ты яго ні трымаў, усё адно будуць страты. Фалунь з'яўляецца разумнай істотай. Ён сам ведае, што трэба рабіць. Таксама не зважаем на бакі свету, бо ўвесь Сусвет рухаецца, Млечны Шлях круціцца, дзевяць вялікіх планет круцяцца вакол Сонца, Зямля таксама круціцца вакол сваёй восі. Мы практыкуем па такім жа вялікім прынцыпе, як Сусвет. Дзе ўсход, поўдзень, захад і поўнач? Такога няма. Калі практыкуеш, павярнуўшыся да любога боку свету, гэта азначае, што павярнуўся адразу да ўсіх бакоў; калі практыкуеш, павярнуўшыся да любога боку свету, гэта раўнасільна таму, што выконваеш практыку, павярнуўшыся адначасова да ўсходу, поўдня, захаду і поўначы. Наш Фалунь Дафа абараняе тых, хто вучыцца, ад узнікнення адхіленняў. І як жа ён абараняе? Калі ты сапраўды з'яўляешся ўдасканальвальнікам, наш Фалунь цябе абараняе. Мае карані пушчаны ва ўсім Сусвеце. Хто замахнецца на цябе, той замахнецца і на мяне. Шчыра кажучы, ён замахнецца на ўвесь Сусвет. Мае словы гучаць вельмі дзіўна, але, калі далей будзеш вучыцца, ты іх зразумееш. Ёсць таксама іншае, але тое, што занадта высокага ўзроўню, я не магу распавядаць. Мы будзем выкладаць Закон высокага ўзроўню сістэматычна — ад павярхоўнага да глыбокага. Калі твой Сіньсін не будзе належным, тады так нічога не атрымаецца. Калі ты станеш за чымсьці гнацца, тады, магчыма, узнікнуць праблемы. Я выявіў, што ў многіх маіх дасведчаных слухачоў курсаў Фалунь усё ж дэфармаваўся. Чаму? Выконваючы практыкаванні, ты падмяшаў іншае, узяў нешта чужое. У такім разе чаму ж цябе не абараняе Фалунь? Тое, што табе далі, — гэта тваё, ім кіруе твая свядомасць. Калі ты сам чагосьці хочаш, тады ніхто ў гэта не ўмешваецца — такі прынцып Сусвету. Калі ты больш не жадаеш удасканальвацца, тады нікому нельга прымушаць цябе ўдасканальвацца, бо гэта было б раўназначна здзяйсненню благога ўчынку. Хто ж можа прымусіць цябе змяняць свае думкі? Табе трэба самому прад'яўляць да сябе патрабаванні. Ты «запазычаеш лепшае з усіх школ», чыё толькі не бярэш. Сёння займаешся адным цігун, заўтра — іншым. Твая мэта — пазбавіцца ад хваробаў. І ты ад іх пазбавіўся? Не. Табе толькі адсунулі немач на потым. У самаўдасканальванні на высокіх узроўнях неабходна цалкам засяродзіцца на адным. Трэба ўдасканальвацца, прытрымліваючыся адное школы. Па якой бы школе ты ні ўдасканальваўся, ты абавязкова павінен укласці ўсю душу ў тую школу, пакуль не дасягнеш у ёй адкрыцця Ґун і адкрыцця ўсведамлення. Толькі тады ты зможаш перайсці да іншага метаду практыкі, каб удасканальвацца далей. Там будзе ўжо іншы комплекс рэчаў. Бо такі комплекс рэчаў, які сапраўды перадаецца з пакалення ў пакаленне, быў пакінуты з далёкіх эпох. У яго быў даволі складаны працэс эвалюцыі. Ёсць такія, хто выконвае практыкаванні ціґун, прыслухоўваючыся да ўласных адчуванняў. Чаго вартыя твае адчуванні? Нічога не вартыя. Сапраўдны працэс эвалюцыі адбываецца ў іншых прасторах і з'яўляецца вельмі складаным і таямнічым. Нельга нават трохі адхіліцца ад нормы. Гэта таксама, як і з дакладным прыборам. Калі ты дадасі яму дэталь ад іншае прылады, тады ён адразу ж сапсуецца. З тваімі целамі ў кожнай прасторы адбываюцца змены,

надзвычай цудоўныя змены. Нельга дапусціць нават найменшага адхілення. Хіба я табе не казаў, што ўдасканальванне залежыць ад цябе, а Ґун — ад настаўніка? Ты адвольна бярэш чужыя рэчы. Як толькі ты дадасі іх унутр, дык яны ўнясуць іншую інфармацыю і тады перашкодзяць рэчам гэтае школы, тады ў цябе ўзнікнуць адхіленні. Ды яшчэ гэта адаб'ецца ў грамадстве звычайных людзей, прынясе табе непрыемнасці звычайных людзей. Ты сам гэта прыняў, такім чынам іншым нельга ў гэта ўмешвацца. Гэта праблема ўсведамлення. У той жа час прымешаныя рэчы ўжо прывядуць твой Ґун у стан поўнага бязладдзя. Ты ўжо не зможаш удасканальвацца. Узнікне такая праблема. Я не кажу, што ўсе павінны вучыцца толькі Фалунь Дафа. Ты не вучышся Фалунь Дафа, але атрымаў сапраўдную передачу ў іншым метадзе практыкі, тады я гэта таксама ўхваляю. Але я скажу табе, што ў сапраўдным самаўдасканальванні на высокія ўзроўні абавязкова трэба цалкам засяродзіцца на адным. Ёсць нешта, пра што я таксама павінен табе распавесці: цяпер няма другога такога чалавека, які, як я, навучаў бы ціґун сапраўды высокага ўзроўню. Пазней ты даведаешся пра тое, што я для цябе зрабіў, таму спадзяюся, што тваё ўсведамленне не будзе занадта нізкім. Шмат людзей жадае ўдасканальвацца на высокія ўзроўні, а гэтую рэч ужо проста паклалі перад табой. Ты, магчыма, нават не можаш правільна адрэагаваць. Ты ўсюды паступаеш да іншых у вучні, марнуеш столькі грошай, але так і не можаш знайсці тое, што шукаеш. Сёння табе прывезлі гэта да дзвярэй твайго дома, а ты, магчыма, нават не можаш гэтага зразумець! Усё зводзіцца да таго, усвядоміш ты ці не ўсвядоміш, гэта значыць можна цябе выратаваць або нельга.

# ЛЕКЦЫЯ ДРУГАЯ

## ПРА НЯБЕСНАЕ ВОКА

Шмат майстроў ціґун заводзіла гаворку пра некаторыя акалічнасці адносна нябеснага вока. Але Закон на розных узроўнях мае розныя формы праявы. Той, хто дайшоў у самаўдасканальванні да нейкага ўзроўню, здольны бачыць карціны толькі таго ўзроўню. Сапраўдныя карціны, якія перавышаюць той узровень, ён ужо не бачыць і не верыць у іх, таму лічыць, быццам правільным з'яўляецца толькі тое, што ён бачыць на тым узроўні. Калі чалавек не дасягнуў ва ўдасканальванні ўзроўню настолькі вялікае вышыні, тады думае, што тых рэчаў не існуе, і яны непраўдападобныя. Гэта вызначаецца ўзроўнем. Яго мысленне таксама не можа дасягнуць падвышэння. Гэта значыць, на тэму чалавечага нябеснага вока нехта распавядае адно, а хтосьці — іншае, і ў выніку сказанае прыводзіць да вялікага сумбуру. Урэшце ніхто гэтага ўцямна так і не патлумачыў. Насамрэч нябеснае вока не з'яўляецца тым, што можна было б дакладна растлумачыць на нізкіх узроўнях. Раней з-за таго, што будова нябеснага вока была таямніцай з таямніц, звычайным людзям не давалі пра яе ведаць, таму пра гэта ніхто ніколі не распавядаў. Мы ж тут не будзем весці гаворку вакол мінулае тэорыі, а растлумачым нябеснае вока з дапамогай сучаснае навукі найбольш простай для разумення сучаснай мовай і адначасова абмяркуем асноўныя звязаныя з ім пытанні.

Нябеснае вока, пра якое мы кажам, па сутнасці, знаходзіцца трохі вышэй за міжброўе чалавека ды злучаецца з шышкападобнай залозай. Гэта галоўны праход. Чалавечае цела мае яшчэ вельмі шмат іншых вачэй. Школа Даа лічыць кожную «цяў» вокам. Школа Даа называе акупунктурныя кропкі (тэрмін кітайскае медыцыны) на целе чалавека цяў. А ў Школе Буды лічыцца, што кожная потавая пора — гэта вока. Таму некаторыя людзі ўмеюць чытаць вушамі, ёсць і такія, хто бачыць кісцямі рук, патыліцай, а іншыя — ступнямі ды жыватом. Усё гэта магчыма.

Калі гаворка зайшла пра нябеснае вока, мы перадусім пагаворым пра нашыя, чалавечыя, фізічныя вочы. Цяпер некаторыя людзі думаюць, што гэтыя вочы здольныя бачыць любую матэрыю, любы прадмет нашага свету. Таму ў некаторых узнікла такое ўпартае ўяўленне: яны лічаць цалкам рэальным толькі тое, што бачаць на ўласныя вочы; а ў тое, чаго не бачаць, яны не вераць. Раней заўсёды лічылася, што ў такіх людзей дрэнная здольнасць усведамлення. Некаторыя ж людзі не маглі зразумела растлумачыць, чаму гэта з'яўляецца прыкметай дрэннае здольнасці ўсведамлення. «Не веру ў тое, чаго не бачу», — гэтая фраза гучыць даволі разумна. Але з пункту гледжання трохі больш высокага ўзроўню яна ўжо не з'яўляецца разумнай. Любая прастора-час складаецца з матэрыі. Вядома, розныя прасторы-часы маюць розную будову матэрыі, і ў іх ёсць разнастайныя формы праявы розных істот.

Прывяду вам прыклад. У будызме гаворыцца, што ўсе з'явы ў чалавечым грамадстве — ілюзія, нерэальныя. Як гэта ілюзія? Гэта ж цалкам рэальныя прадметы, якія вось тут знаходзяцца. Хто можа сказаць, што яны з’яўляюцца несапраўднымі? Форма існавання прадмета адна, аднак форма яго праявы ўсё-ткі іншая. Нашыя ж вочы, аказваецца, маюць такую функцыю: яны здольныя стабілізаваць прадметы нашае матэрыяльнае прасторы ў такім стане, у якім мы іх зараз бачым. А фактычна гэтыя прадметы не знаходзяцца ў такім стане — нават у нашай прасторы. Напрыклад, які выгляд мае чалавек пад мікраскопам? Увесь чалавечы арганізм з'яўляецца рыхлым, такім, які складаецца з мікрамалекул, падобных да пяску, крупчастых і рухомых. Электроны рухаюцца вакол ядраў атамаў, усё цела варушыцца, рухаецца. Паверхня цела з'яўляецца нягладкай, няправільнай. З кожным прадметам у Сусвеце — сталлю, жалезам, каменем — такая ж самая справа. Малекулярныя кампаненты ўнутры іх рухаюцца. Поўнае ж формы ты наогул не бачыш. Насамрэч, яна зусім не стабільная. Гэты стол таксама варушыцца, аднак вочы не бачаць сапраўднае карціны. Гэтыя вочы здольныя ствараць людзям такое хібнае адчуванне.

Тое, што мы не ў стане бачыць мікраскапічныя рэчы, і ў чалавека няма такога ўмення, не адпавядае рэчаіснасці. Чалавек мае такое ўменне ад нараджэння. Мікраскапічныя ў пэўнай меры рэчы ён можа бачыць. Менавіта пасля таго, як у нас, людзей, з'явіліся вочы, якія прыналежаць да гэтае матэрыяльнае прасторы, яны цяпер могуць ствараць людзям такія скрыўленыя вобразы, не даюць бачыць. Таму ў мінулым у колах удасканальвальнікаў тыя, хто не прызнае таго, чаго не бачыць, лічыліся людзьмі з дрэннай здольнасцю ўсведамлення. Скрыўленыя вобразы звычайных людзей увялі іх у зман. Яны згубіліся сярод звычайных людзей. У рэлігіі даўно так казалі. Насамрэч гэта справядліва і на нашую думку.

Гэтыя вочы здольныя фіксаваць рэчы даступнае нам матэрыяльнае прасторы ў такім стане. Акрамя гэтага ў іх няма нейкага там яшчэ вялікага ўмення. Калі людзі на нешта глядзяць, вобразы фармуюцца не непасрэдна ў вачах. Вочы, падобна да аб'ектыва фотакамеры, адыгрываюць ролю толькі інструмента. Калі здымаюць нешта ўдалечыні, аб'ектыў падаўжаецца. Нашыя вочы адыгрываюць такую ролю. Калі чалавек глядзіць на нешта ў цёмным месцы, зрэнкі пашыраюцца. Калі ж у цёмным месцы здымаюць на фотакамеру, тады пашыраюць дыяфрагму, інакш будзе недастатковая экспазіцыя, і ўвесь здымак будзе цёмным. Калі выходзіш на вуліцу, дзе вельмі яркае святло, зрэнкі рэзка звужаюцца, інакш вочы слепіць, і выразна нічога не бачна. У фотакамеры такі ж прынцып, яе дыяфрагму таксама звужаюць. Яны здольныя толькі здымаць прадметы, яны з’яўляюцца толькі інструментамі. Калі мы сапраўды нешта назіраем, глядзім на чалавека, глядзім на форму існавання нейкага прадмета — гэта ўтвараецца выява ў чалавечым галаўным мозгу. Гэта значыць, калі мы глядзім, візуальная інфармацыя праходзіць праз чалавечыя вочы і далей перадаецца праз зрокавыя нервы да шышкападобнае залозы ў задняй частцы мозга, каб у гэтай частцы мозг утварыў выяву. Гэта азначае, што насамрэч

утварае выяву і бачыць прадметы менавіта гэтая частка нашага галаўнога мозга — шышкападобная залоза. Гэта спазналі і ў сучаснай медыцыне.

Адкрыццё нябеснага вока, пра якое мы гаворым, азначае ў абыход чалавечых зрокавых нерваў прабіць праход паміж бровамі чалавека — даць магчымасць шышкападобнай залозе непасрэдна глядзець навонкі. Гэта і называецца адкрыццём нябеснага вока. Некаторыя людзі думаюць: гэта ж нерэальна, гэтыя вочы, урэшце, усё ж такі здольныя выконваць функцыю інструмента, здымаць прадметы, без вачэй жа нельга. Пры дапамозе роспалаці ў сучаснай медыцыне ўжо выявілі, што пярэдняя палова шышкападобнае залозы мае поўную структуру чалавечага вока. З прычыны таго, што яно знаходзіцца ўнутры чалавечага чэрапа, яго называюць рудыментарным вокам. Ці з’яўляецца шышкападобная залоза рудыментарным вокам, у нашых колах удасканальвальнікаў усё ж не каментуюць. Але ўсё-ткі ў сучаснай медыцыне ўжо даведаліся, што ўнутры галавы чалавека існуе вока. Прабіты намі праход вядзе менавіта ў гэтую кропку. Гэта акурат супадае з тым, што было спазнана ў сучаснай медыцыне. Гэтае вока не стварае чалавеку скрыўленыя вобразы, як гэта робяць нашыя фізічныя вочы. Яно здольнае бачыць прыроду рэчаў, прыроду матэрыі. Таму людзі з нябесным вокам вельмі высокага ўзроўню праз нашую прастору могуць бачыць іншыя прасторы-часы, могуць бачыць карціны, нябачныя звычайным людзям. А людзі з нябесным вокам нізкага ўзроўню маюць пранікальную здольнасць — бачаць прадметы скрозь сцяну ды прасвечваюць чалавечае цела. Вось якую здольнасць яны маюць.

У Школе Буды гаворыцца пра пяць ступеняў бачання: бачанне фізічнага вока, бачанне вока неба, бачанне вока мудрасці, бачанне вока Закону і бачанне вока Буды. Гэта пяць вялікіх узроўняў нябеснага вока. Кожны ўзровень таксама падзяляецца на вышэйшы, сярэдні ды нізкі. Школа Даа кажа пра дзевяць на дзевяць, гэта значыць 81 узровень вока Закону. Мы тут адкрываем вам нябеснае вока. Але не на ўзроўні бачання вока неба або ніжэй. А чаму? Нягледзячы на тое, што ты тут сядзіш і пачаў удасканальвацца, аднак, ты ўсяго толькі распачаў свой шлях ад звычайнага чалавека і яшчэ не вызваліўся ад многіх уласцівых яму навязлівых ідэяў. Калі б мы адкрылі табе нябеснае вока на ўзроўні бачання вока неба або ніжэй, у цябе ўзнікла б тое, што звычайныя людзі лічаць экстрасэнсорнымі здольнасцямі — ты стаў бы бачыць прадметы скрозь сцяну ды прасвечваць чалавечае цела. Калі б мы такім чынам распаўсюджвалі гэтую здольнасць у шырокіх маштабах і кожнаму чалавеку адкрывалі нябеснае вока да такое ступені, гэта стварыла б сур'ёзныя перашкоды грамадству звычайных людзей ды парушыла б яго стан. Дзяржаўныя таямніцы нельга было б захаваць; было б усё адно, насілі б людзі адзенне ці не; калі б чалавек знаходзіўся ў пакоі, ты, стоячы на вуліцы, мог бы ўсё бачыць; ідучы па вуліцы і пабачыўшы продаж латарэйных квіткоў, ты, магчыма, выцягнуў бы галоўны прыз. Гэта недапушчальна! Задумайцеся: калі ў кожнага чалавека будзе нябеснае вока, адкрытае на ўзроўні бачання вока неба, хіба гэта будзе яшчэ чалавечым грамадствам? Існаванне з'яў, якія ствараюць сур'ёзныя перашкоды чалавечаму грамадству, катэгарычна забаронена. Калі б

я сапраўды адкрыў табе нябеснае вока на гэтым узроўні, тады ты, магчыма, адразу ж стаў бы майстрам ціґун. Ёсць такія, хто раней ужо хацеў стаць майстрам ціґун, а тут у іх адкрылася б нябеснае вока, і яны ўжо маглі б лекаваць хворых. Хіба не вывеў бы я цябе тады на благі шлях?

Тады на якім жа ўзроўні табе адкрыць нябеснае вока? Я зраблю табе гэта непасрэдна на ўзроўні бачання вока мудрасці. Калі адкрыць на яшчэ больш высокім узроўні, тады ў цябе будзе для гэтага недастатковы Сіньсін; калі ж адкрыць на больш нізкім узроўні, тады гэта істотна парушыць стан грамадства звычайных людзей. Калі зрабіць гэта на ўзроўні бачання вока мудрасці, у цябе не будзе ўмення бачыць прадметы скрозь сцяну, прасвечваць чалавечае цела, але ты ўсё-ткі зможаш бачыць карціны, якія існуюць у іншых прасторах. Якая табе ад гэтага карысць? Гэта можа ўзмацніць тваю веру ў практыку ціґун. Ты цалкам рэальна пабачыш тое, чаго звычайныя людзі не бачаць, і адчуеш, што гэта сапраўды існуе. Зараз, незалежна ад таго, зможаш ты выразна бачыць ці не, я ўсё адно адкрыю табе нябеснае вока на гэтым узроўні. Гэта будзе карысным для тваёй практыкі. Тыя, хто шчыра ўдасканальваецца па Дафа і сурова патрабуе ад сябе падвышэння Сіньсін, будуць мець такі ж самы эфект ад чытання гэтае кнігі.

Чым вызначаецца ўзровень чалавечага нябеснага вока? Гэта не так, што пасля таго, як табе адкрыюць нябеснае вока, табе ўсё стане бачна. Не, існуе яшчэ падзел на ўзроўні. Тады чым вызначаецца гэты ўзровень? Існуюць тры чыннікі. Першы чыннік палягае ў тым, што знутры навонкі чалавечага нябеснага вока павінна быць поле. Мы называем яго энергіяй сутнасці. Якую яна адыгрывае ролю? Гэта падобна да тэлевізійнага экрана. Пры адсутнасці люмінесцэнтнага парашку пасля ўключэння тэлевізара экран быў бы проста лямпай — было б святло без выявы. Карцінка можа з'явіцца на тэлеэкране толькі пры наяўнасці люмінесцэнтнага парашку. Вядома, гэты прыклад усё ж не надта ўдалы, бо мы глядзім непасрэдна, а ў тэлевізары выява дэманструецца з дапамогай экрана. Але ў агульных рысах сэнс такі. Энергія сутнасці надзвычай каштоўная. Яна складаецца з яшчэ больш каштоўных рэчаў, атрыманых з Дэ. Звычайна ў кожнага чалавека розная колькасць энергіі сутнасці. З дзесяці тысяч людзей, мабыць, знойдуцца толькі двое такіх, якія знаходзяцца на адным узроўні.

Узровень нябеснага вока з'яўляецца прамым увасабленнем Закону нашага Сусвету. Ён з'яўляецца чымсьці звышнатуральным і цесна звязаны з Сіньсін чалавека. Калі ў кагосьці Сіньсін нізкі, тады нізкі і ўзровень. З-за нізкага Сіньсін ён страціў вялікую колькасць энергіі сутнасці. А ў іншага чалавека Сіньсін вельмі высокі. Ён у грамадстве звычайных людзей з дзяцінства да сталасці вельмі абыякава ставіцца да рэпутацыі, грошай, супярэчнасцяў з людзьмі, уласных інтарэсаў, сямі пачуццяў ды шасці жаданняў. Энергія сутнасці ў такога чалавека, магчыма, захоўваецца параўнальна добра. Таму пасля адкрыцця нябеснага вока ён бачыць даволі выразна. Што ж тычыцца дзяцей да шасці

гадоў, дык яны пасля яго адкрыцця бачаць вельмі выразна, і яго лёгка адкрыць: адна мая вымаўленая фраза, і іх нябеснае вока можа адкрыцца.

Забруджваючыся ад магутнае плыні, вялікага фарбавальнага чана грамадства звычайных людзей, людзі лічаць нешта правільным, калі насамрэч вельмі шмат з таго памылковае. Усе ж людзі хочуць жыць лепей, хіба не праўда? Дзеля такое мэты чалавек, верагодна, будзе прычыняць шкоду чужым інтарэсам, будзе патураць сваім чалавечым эгаістычным схільнасцям, прыўлашчваць чужую выгаду, абражаць іншых, шкодзіць іншым. Калі змагаешся сярод звычайных людзей дзеля асабістых інтарэсаў — хіба гэта не з’яўляецца супрацьлеглым уласцівасці Сусвету? Таму тое, што людзі лічаць правільным, зусім не абавязкова з'яўляецца правільным. Выхоўваючы малых дзяцей, дарослыя часта, каб у будучыні дзецям удалося моцна ўстаць на ногі ў грамадстве звычайных людзей, змалку выхоўваюць іх так: «Табе трэба навучыцца быць больш хітрым». А быць «больш хітрым» у нашым Сусвеце ўжо лічыцца хібным, бо мы скараемся натуральнай плыні рэчаў. Трэба ставіцца абыякава да асабістых інтарэсаў. Чалавек хітруе, каб дамагчыся ўласнае выгады. «Калі хтосьці цябе абразіць, звярніся да яго настаўніка, звярніся да яго бацькоў», «Знойдзеш грошы — падбяры», — вось як іх выхоўваюць. З дзяцінства да сталасці гэтае дзіця ўбірае ў сябе шмат гэткіх рэчаў, і паступова яго эгаістычныя схільнасці ў грамадстве звычайных людзей усё ўзмацняюцца, тады яно атрымлівае выгаду несумленным шляхам і, значыць, страчвае Дэ.

Пасля такое страты гэтае рэчыва — Дэ — не знікае, а пераходзіць да іншага чалавека. Але энергія сутнасці знікае. Калі змалку і да сталага ўзросту чалавек хітруе, мае вельмі вялікае жаданне задавальняць асабістыя інтарэсы, імкнецца толькі да нажывы, тады часта пасля адкрыцця нябеснае вока ў такога чалавека не дзейнічае, і ён не можа выразна бачыць. Але гэта не значыць, што з гэтага часу яно ўжо больш ніколі не будзе дзейнічаць. А чаму? Таму што мы ў ходзе самаўдасканальвання акурат і вернемся да свайго першапачатковага выгляду. Калі ўвесь час практыкуеш, тады пастаянна аднаўляецца энергія сутнасці ды кампенсуецца яе недахоп. Таму неабходна надаваць вялікую ўвагу Сіньсін. Мы надаем значэнне ўсебаковаму падвышэнню, дасягненню ўздыму ў цэлым. Калі падвышаецца Сіньсін, тады ўсё астатняе падымаецца ўслед за ім; калі ж Сіньсін не падвышаецца, тады энергія сутнасці нябеснага вока таксама не можа кампенсавацца. Менавіта такі прынцып.

Другі чыннік: калі сам практыкуеш ціґун, і ў цябе добрая маральная аснова, тады можна практыкай адкрыць сабе нябеснае вока. Некаторыя людзі часта, калі нябеснае вока толькі адкрылася, надзвычай палохаюцца. Чаму надзвычай палохаюцца? Бо звычайна для практыкі ціґун людзі абіраюць час з дваццаць трэцяй да першай гадзіны, калі позняя ноч, і пануе цішыня. Чалавек практыкуе, практыкуе і тут раптам бачыць перад сабой вялікае вока, ад чаго адразу ж вельмі палохаецца. Палохаецца страшэнна: пасля гэтага ён больш не адважваецца практыкаваць. Як жа жудасна! Вось такой велічыні вока, лыпае

ды лыпае. Гэта бачна вельмі выразна. Таму адны яго называюць вокам д'ябла, іншыя — вокам Буды і да таго падобным. Насамрэч гэта тваё ўласнае вока. Вядома, удасканальванне залежыць ад цябе, а Ґун — ад настаўніка. Увесь працэс эвалюцыі Ґун ва ўдасканальвальніка ў іншых прасторах уяўляе сабой вельмі складаны працэс. І не толькі ў адной іншай прасторы — целы чалавека ва ўсіх і кожнай прасторы змяняюцца. Ці пад сілу табе самому гэта ажыццявіць? Не пад сілу. Гэтыя рэчы плануе настаўнік, робіць настаўнік. Таму гэта і называецца: «Удасканальванне залежыць ад цябе, а Ґун — ад настаўніка». У цябе самога ёсць толькі такое жаданне, ты так падумаў. А насамрэч тыя рэчы робіць настаўнік.

Некаторыя людзі, практыкуючы, самі адкрылі сабе нябеснае вока. Мы кажам, што гэта тваё вока, але самому табе яго не стварыць. У некаторых ёсць настаўнік. Настаўнік бачыць, што ў цябе адкрылася нябеснае вока, тады і стварае табе вока, якое называецца сапраўдным. Вядома, у некаторых людзей няма настаўніка. Але ў іх ёсць настаўнік-мінак. У Школе Буды кажуць так: «Няма такога месца, дзе б не было Будаў[57]. Яны паўсюль». Іх настолькі шмат, што нехта сказаў: «У метры над галавой знаходзіцца Боства» — гэта значыць іх неверагодна шмат. Настаўнік-мінак, як толькі ўбачыў, што ты практыкуеш вельмі нядрэнна і што ў цябе ўжо адкрылася нябеснае вока, але бракуе сапраўднага вока, стварае яго табе. І гэта таксама лічыцца, што ты выпрацаваў яго практыкай. Бо ў выратаванні людзей не ставяць умоў, не зважаюць на цану, узнагароду ды рэпутацыю. Гэта значна перавышае ўзорных герояў звычайных людзей! Гэта робіцца цалкам з міласэрнасці.

Пасля адкрыцця нябеснага вока ў чалавека ўзнікае такі стан: святло моцна цябе асляпляе, адчуваеш, што рэжа вочы. Насамрэч яно раздражняе не твае вочы, а тваю шышкападобную залозу. Ты адчуваеш, што рэжа вочы. Гэта таму, што ты не маеш гэтага сапраўднага вока. Пасля таго як у цябе яго ўкладуць, ты ўжо не будзеш адчуваць рэзі ў вачах. Частка нашых практыкоўцаў можа адчуваць, бачыць гэтае вока. Паколькі яно мае аднолькавую прыроду з Сусветам, значыць, яно з'яўляецца вельмі наіўным, а таксама вельмі цікаўным. Яно зазірае ўнутр, каб спраўдзіць, ці адкрылася тваё нябеснае вока, ці можа яно бачыць. Гэтае вока, зазіраючы ўнутр, у цябе ўзіраецца. У той жа момант у цябе адкрываецца нябеснае вока, а яно акурат глядзіць на цябе. Раптоўна яго ўбачыўшы, ты можаш надзвычай спалохацца. Насамрэч гэта тваё ўласнае вока. Надалей ты будзеш глядзець менавіта гэтым вокам. Калі ў цябе яго няма, тады ты наогул не зможаш бачыць. Нават калі адкрыецца нябеснае вока.

Трэці чыннік палягае ў тым, што падчас прарыву ўзроўняў праяўляюцца адрозненні ў кожнай прасторы. Гэта і ёсць тое, што сапраўды вызначае ўзровень нябеснага вока. Каб глядзець, апроч галоўнага праходу, у чалавека ёсць яшчэ шмат дадатковых праходаў. Школа Буды лічыць вокам кожную потавую пору; а Школа Даа лічыць, што ўсе цяў на целе чалавека з'яўляюцца вачыма, гэта значыць усе акупунктурные кропкі — гэта вочы. Вядома, тое, пра

што яны вядуць гаворку — гэта формы, якія з'яўляюцца ў выніку эвалюцыі Закону ў целе чалавека. Можна бачыць любым месцам.

Узроўні, пра якія мы кажам, усё ж такі адрозніваюцца ад вышэйзгаданага. Акрамя галоўнага праходу, існуе яшчэ некалькі важных дадатковых праходаў у некалькіх месцах: у бровах, над павекамі, пад павекам ды ў кропцы ша́ньґэнь[58]. Яны і вырашаюць пытанне прарыву ва ўзроўнях. Вядома, калі ў звычайнага ўдасканальвальніка ўсе гэтыя некалькі месцаў здольныя бачыць, тады гэты чалавек прарваў ужо вельмі высокія ўзроўні. А некаторыя людзі могуць бачыць і вачыма. Яны ўжо ўдасканалілі свае вочы, і тыя маюць усялякія формы здольнасцяў. Але калі нехта дрэнна валодае тым[59] вокам, тады ўвесь час будзе так, што ён будзе бачыць гэты прадмет, але не зможа бачыць той прадмет, і гэта таксама не гадзіцца. Таму ў некаторых часта адно вока бачыць тую прастору, а другое — гэтую прастору. Пад гэтым (правым) вокам няма дадатковага праходу, бо гэта непасрэдна звязана з Законам. Калі людзі здзяйсняюць благія ўчынкі, тады любяць карыстацца правым вокам, таму пад ім і няма дадатковага праходу. Тут гаварылася пра некалькі важных дадатковых праходаў, якія ўзнікаюць у самаўдасканальванні па Законе чалавечага свету.

Пасля таго як дасягнеш вельмі высокага ўзроўню ды выйдзеш за межы ўдасканальвання па Законе чалавечага свету, яшчэ з'яўляецца вока, падобнае да фасеткавых вачэй. Гэта значыць, на ўсёй верхняй палове твара ўзнікае вялізнае вока, унутры якога безліч дробных вачэй. Некаторыя Вялікія Прабуджаныя вельмі высокага ўзроўню ўдасканальваннем выпрацавалі надзвычай шмат вачэй, якія пакрываюць увесь іх твар. Усе гэтыя вочы глядзяць праз гэтае вялікае вока. Што Прабуджаны хоча ўбачыць, тое і бачыць. З аднаго позірку ён бачыць усе ўзроўні. Зараз заолагі, энтамолагі вывучаюць мух. Вочы ў мух вельмі вялікія. Зірнуўшы на іх у мікраскоп, можна ўбачыць, што ўнутры іх безліч дробных вачэй. Гэта называецца фасеткавымі вачыма. Гэты стан можа ўзнікнуць па дасягненні вельмі высокага ўзроўню. Ён можа з'явіцца толькі ў тых, хто нашмат вышэйшы за Татгаґату. Аднак звычайныя людзі не бачаць гэтага вока. Тыя, хто знаходзіцца на звычайных узроўнях, таксама не бачаць яго наяўнасці. Яны бачаць толькі, што гэты чалавек такі ж самы, як звычайныя людзі, бо гэтае вока знаходзіцца ў іншай прасторы. Тут ішла гаворка пра прарыванне ўзроўняў, гэта значыць пра магчымасць перавышаць кожную прастору.

Структуру нябеснага вока ў асноўным я вам апісаў. Калі мы адкрыем вам яго з дапамогай знешняе сілы, тады гэта пройдзе даволі хутка, даволі лёгка. Падчас майго аповеду пра нябеснае вока кожны з нас адчувае, як яго лоб нацягваецца, плоць збіраецца разам і, сабраўшыся, прасвідроўваецца ўнутр. Ці не так? Так. Кожны гэта адчуе, дастаткова толькі, каб ён тут навучаўся Фалунь Дафа, сапраўды вызваліўшыся ад імкненняў. У дадатак да гэтага сіла, якая цісне ўнутр, велізарная. Мы выпускаем адмысловы Ґун, які адказвае за адкрыццё твайго нябеснага вока, і ён выконвае сваю функцыю. Адначасова мы дасылаем

Фалунь, каб ён правёў табе рэгенерацыю. Калі мы распавядаем пра нябеснае вока, тады адкрываем яго кожнаму, калі ён толькі самаўдасканальваецца па Фалунь Дафа. Аднак зусім неабавязкова, што кожны зможа бачыць выразна, і таксама неабавязкова, што кожны наогул зможа бачыць. Гэта звязана непасрэдна з табой самім. Гэта не страшна. Калі не бачыш, гэта не страшна. Удасканальвайся пастунова. Услед за няспынным падвышэннем твайго ўзроўню ты паступова пачнеш бачыць, і ад стану, калі бачыш невыразна, паступова пяройдзеш да такога стану, калі ўбачыш выразна. Калі толькі ты будзеш удасканальвацца, калі будзеш поўны рашучасці ўдасканальвацца, тады кампенсуеш усё страчанае.

Самому сабе адкрыць нябеснае вока даволі складана. Я пагавару пра некалькі формаў таго, калі сам адкрываеш сабе нябеснае вока. Скажам, некаторыя з нас, седзячы ў медытацыі,назіраюць свой лоб, назіраюць нябеснае вока. Ім здаецца, што там зусім чорна, нічога няма. Праз доўгі час яны пачынаюць адчуваць, што ў ілбе паступова бялее. Удасканальваючыся яшчэ пэўны перыяд часу, яны заўважаюць, што там паступова святлее, пасля чаго пачынае чырванець. У гэты час яно пачынае расцвітаць, як кветка. Як гэта дэманструюць у кіно альбо па тэлевізары: бутоны кветкі ў адно імгненне распускаюцца — паказваюць такі эпізод. Тое чырвонае першапачаткова з'яўляецца плоскім. Потым яно адразу пачынае з цэнтра раскрывацца і няспынна расцвітае, увесь час расцвітае. Калі ты хочаш самастойна дасягнуць таго, каб праход наскрозь прабіўся, тады малаверагодна, што гэта атрымаецца зрабіць нават за восем або дзесяць гадоў, бо ўсё нябеснае вока аказваецца цалкам закладзеным.

У некаторых людзей нябеснае вока не закладзенае. Яно мае праход. Але з-за таго, што яны не практыкуюць ціґун, у іх няма энергіі. Таму, калі яны пачынаюць практыкаваць, раптам перад імі з'яўляецца нешта чорнае круглай формы. За доўгі час практыкі яно паступова бялее і ад белага паступова святлее. Урэшце становіцца ўсё больш светлым. Пачынаеш адчуваць, што крыху рэжа вочы. Тады некаторыя і кажуць: «Я ўбачыў сонца, убачыў месяц». Насамрэч ты не ўбачыў ані сонца, ані месяца. Што ж ты ўбачыў? Толькі свой праход. Некаторыя людзі прарываюць узроўні даволі хутка. Пасля таго як у іх укладуць вока, яны ўжо непасрэдна змогуць бачыць. А для некаторых гэта праходзіць вельмі цяжка. Яны прасоўваюцца па гэтым праходзе, які камусьці нагадвае тунэль, а іншым — калодзеж. Толькі пачаўшы выконваць практыку ціґун, яны бягуць навонкі. Нават калі спяць, адчуваюць, што бягуць навонкі. Камусьці здаецца, што ён скача на кані, нехта ляціць, нехта бяжыць, хтосьці мчыцца навонкі, седзячы ў машыне. Але ім пастаянна здаецца, што да канца не дамчацца, бо самому адкрыць сабе нябеснае вока вельмі цяжка. Школа Даа лічыць чалавечае цела малым сусветам. Калі яно з'яўляецца малым сусветам, тады, задумайцеся: пераадолець адлегласць ад ілба да шышкападобнае залозы — гэта нават далей, чым дабрацца на край свету[60]. Таму ім увесь час здаецца, што яны мчацца навонкі, але ніяк не дамчацца да канца.

Школа Даа лічыць чалавечае цела малым сусветам. Гэта цалкам справядліва. Справа не ў тым, што яго будова вельмі падобная да будовы Сусвету. Гаворка ідзе не пра форму існавання цела ў нашай матэрыяльнай прасторы. Мы скажам так: якім, паводле сучаснае навукі, з'яўляецца стан на ўзроўні ніжэйшым за клеткі матэрыяльнага цела? Разнастайныя малекулярныя кампаненты. Ніжэй за малекулы — атамы, пратоны, ядры атамаў, электроны ды кваркі. Найменшыя часцінкі, да якіх цяпер дайшлі даследаванні, — гэта нейтрына. Тады што ж будуць за часцінкі, калі дайсці да найменшых? Даследаваць гэта ўжо сапраўды занадта цяжка. Шак'ямуні ў апошнія гады свайго жыцця сказаў: «Настолькі вялікі, што няма вонкавага, настолькі малы, што няма ўнутранага». Што гэта значыць? На ўзроўні Татгаґаты Сусвет вялікі да такое ступені, што не бачна мяжы; малы да такое ступені, што не бачна найменшае часцінкі матэрыі. Таму ён і сказаў: «Настолькі вялікі, што няма вонкавага, настолькі малы, што няма ўнутранага».

Шак'ямуні таксама выказаў тэорыю пра тры тысячы велічэзных светаў. Паводле яго слоў, у нашым Сусвеце, у нашым Млечным Шляху існуе тры тысячы планет, дзе, падобна да нашага чалавецтва, істоты маюць фізічнае цела. Ён таксама сказаў, што і ў адной пясчынцы таксама ёсць такія тры тысячы велічэзных светаў. Адна пясчынка быццам Сусвет. Унутры яе таксама ёсць падобныя да нас разумныя людзі, ёсць такія планеты, ёсць горы і рэкі. Гэта гучыць вельмі дзіўна! Калі гэта так, тады задумайцеся: ці няма пяску і ўнутры пясчынкі? А ці не існуе ўнутры тых пясчынак таксама па тры тысячы велічэзных светаў? Тады хіба няма ўнутры гэтых трох тысячаў велічэзных светаў таксама пяску? А ці не існуе ў тых пясчынках таксама па тры тысячы велічэзных светаў? Таму на ўзроўні Татгаґаты не бачна гэтаму канца.

Гэтак жа і з чалавечымі малекулярнымі клеткамі. Людзі запытваюцца, наколькі вялікі Сусвет. Скажу вам, што Сусвет мае мяжу. Аднак на ўзроўні Татгаґаты ўсе лічаць яго бязмежным, бясконца вялікім. А ўнутраная частка чалавечага цела — ад малекул да мікраскапічных карпускул — такая ж вялікая, як Сусвет. Гучыць вельмі дзіўна. Калі быў створаны нейкі чалавек альбо істота, у найбольш мікраскапічным стане ўжо былі створаны індывідуальныя складнікі яго жыцця, яго сутнасць. Таму нашая сучасная навука ў вывучэнні гэтых рэчаў усё яшчэ вельмі адстае. У параўнанні з істотамі вышэйшага розуму, якія існуюць на планетах усяго Сусвету, навукова-тэхнічны ўзровень чалавецтва застаецца неймаверна нізкім. Мы нават не можам прарвацца ў іншыя прасторы, якія існуюць адначасова ў тым жа самым месцы. А іншапланетныя лятучыя талеркі рухаюцца непасрэдна па іншых прасторах, дзе пануе цалкам іншае паняцце прасторы-часу. Таму яны прылятаюць і адлятаюць імгненна. Гэта адбываецца настолькі хутка, што людзі са сваімі ўяўленнямі проста не ў стане гэтага спасцігнуць.

Распавядаючы пра нябеснае вока, мы закранулі такое пытанне: калі ты бяжыш па праходзе нябеснага вока навонкі, табе здаецца, што ён бяскрайні. А

некаторыя людзі, магчыма, бачаць іншае: яны адчуваюць, нібыта бягуць не па тунэлі, а па бясконцым шырокім шляху, абапал якога і горы, і рэкі, і гарады. Яны бягуць проста па ім навонкі, што гучыць яшчэ больш неспасціжна. Прыгадваю, быў майстар ціґун, які казаў такія словы: «Унутры адное потавае поры чалавека існуе горад, у якім імчацца цягнікі ды аўто». Калі іншыя людзі гэта чулі, дык вельмі здзіўляліся, гэта было для іх поўнай містыкай. Як вам вядома, сярод часцінак матэрыі ёсць малекулы, атамы, пратоны. Урэшце, калі даследаваць далей, ідучы ўніз, і калі на кожным узроўні ты будзеш здольны бачыць паверхню гэтага ўзроўню, а не адну кропку, бачыць паверхню ўзроўню[61] малекул, паверхню ўзроўню атамаў, паверхню ўзроўню пратонаў, паверхню ўзроўню ядраў атамаў, тады ты ўбачыш формы існавання розных прастораў. Усякі прадмет, уключна з чалавечым целам, адначасова існуе ды ўзаемна злучаецца з прасторавымі ўзроўнямі Космасу. Нашая сучасная фізіка, даследуючы матэрыяльныя часцінкі, вывучае толькі адну часцінку. Яе раскладваюць на элементы, расшчапляюць. Атамнае ядро расшчапляюць, пасля чаго вывучаюць яго кампаненты пасля расшчаплення. Калі б існаваў такі прыбор, пры дапамозе якога можна было б разгарнуць ды ўбачыць цэласную праяву ўсіх атамных альбо малекулярных кампанентаў на гэтым узроўні, калі б можна было ўбачыць гэтую карціну, тады ты б ужо перавысіў гэтую прастору ды ўбачыў сапраўдныя карціны існавання іншых прастораў. Чалавечыя целы адпавядаюць знешнім прасторам. Яны маюць такую форму існавання.

Калі сам адкрываеш сабе нябеснае вока, ёсць яшчэ некалькі розных станаў. Мы патлумачылі галоўным чынам дастаткова распаўсюджаныя з'явы. Некаторыя людзі таксама бачаць, што нябеснае вока круціцца. Тыя, хто практыкуе ціґун Школы Даа, часта бачаць, што нябеснае вока ўнутры круціцца. Дыск тайдзі[62] — «Плясь!» — расколваецца, пасля чаго яны ўжо бачаць выяву. Але гэта не значыць, што ў тваёй галаве ёсць тайдзі. Гэта настаўнік з самага пачатку ўклаў у цябе набор рэчаў, адной з якіх быў тайдзі. Ён заблакаваў тваё нябеснае вока. Калі надыходзіць час яго адкрыцця, тайдзі расколваецца. Настаўнік знарок яго для цябе запланаваў. Яго не было ў тваёй галаве заўсёды.

Ёсць таксама частка людзей, якія гоняцца за адкрыццём нябеснага вока. Але, калі яны ўсё больш і больш выконваюць практыкаванні, яно ніяк не хоча адкрывацца. У чым жа прычына? Ім і самім гэта незразумела. Галоўным чынам гэта таму, што за нябесным вокам нельга гнацца. Чым больш гонішся, тым больш верагодна, што нічога не будзеш мець. Калі ўсё больш за ім гонішся, тады яно не толькі не адкрываецца, а, наадварот, знутры нябеснага вока чалавека пачынае нешта выцякаць — накшталт чорнага, а не чорнае, нібыта белае і не белае. Яно пакрывае тваё нябеснае вока. Пасля таго як мінае шмат часу, тое рэчыва ўтварае велізарнае поле. Чым далей, тым больш яго выцякае. Чым даўжэй нябеснае вока не адкрываецца, тым гарачэй ты гэтага прагнеш, тым больш яго выцякае. У выніку тое рэчыва атачае ўсё цела чалавека. Нават да такое ступені, што становіцца вялізнае таўшчыні ды мае вельмі інтэнсіўнае поле. Калі б у гэтага чалавека і сапраўды адкрылася нябеснае вока, тады б ён усё адно нічога не ўбачыў, бо ад навязлівай ідэі ў яго ўсё было б закладзеным.

Толькі калі ў будучыні ён перастане пра гэта думаць і цалкам адмовіцца ад гэтай навязлівай ідэі, тое рэчыва пачне паступова рассейвацца. Але, каб ад яго пазбавіцца, трэба прайсці вельмі цяжкі, вельмі працяглы працэс удасканальвання. Гэта абсалютна лішняе. Некаторыя людзі гэтага не ведаюць. Настаўнік сказаў яму, што нельга гнацца, нельга гнацца. А ён не дае веры ды толькі і ведае, што за гэтым гнацца. Як вынік — прама супрацьлеглы рэзультат.

## ЗДОЛЬНАСЦЬ ДЫСТАНЦЫЙНАГА БАЧАННЯ

Адна са здольнасцяў, якая непасрэдна звязаная з нябесным вокам, называецца дыстанцыйным бачаннем. Ёсць людзі, якія кажуць: «Седзячы тут, я магу бачыць Пекін, бачыць ЗША, бачыць іншы бок зямнога шара». Некаторыя людзі не могуць гэтага зразумець. З пункту гледжання навукі людзі таксама не могуць растлумачыць: «Як жа такое магчыма?» Нехта тлумачыць і так, і гэтак, але ўсё адно не сыходзіцца. Яны думаюць: «Як чалавек можа мець такое вялікае ўменне?» Гэта не так, на ўзроўні Закону чалавечага свету ўдасканальвальнікі не маюць такога ўмення. Калі такія людзі глядзяць, у тым ліку выкарыстоўваючы дыстанцыйнае бачанне, а таксама вельмі шмат іншых экстрасэнсорных здольнасцяў, усё гэта дзейнічае ў межах адмысловае прасторы і нават у найбольшай сваёй праяве не перавышае матэрыяльнае прасторы, у якой існуе нашае чалавецтва. Звычайна нават не выходзіць за межы ўласнага прасторавага поля.

У нашага цела ў адной адмысловай прасторы існуе поле. Гэтае поле і поле Дэ не з'яўляюцца адным і тым самым полем, яны не прыналежаць да адной і той жа прасторы. Але зоны дзеяння гэтых палёў маюць аднолькавы памер. Гэтае поле злучана з Сусветам своеасаблівай сувяззю адлюстравання. Што існуе там, у Сусвеце, здольнае адлюстроўвацца ў гэтым полі чалавека, усё можа тут адбіцца. Яно з'яўляецца адлюстраваннем, а не рэчаіснасцю. Напрыклад, на Зямлі ёсць ЗША, ёсць Вашынгтон; у полі чалавека таксама адлюстроўваецца ЗША, адлюстроўваецца Вашынгтон, але гэта адлюстраванне. Зрэшты, адлюстраванні таксама з'яўляюцца матэрыяльным існаваннем. Яны звязаныя з адлюстраваным і змяняюцца ўслед за зменамі там. Таму дыстанцыйнае бачанне, пра якое некаторыя распавядаюць, — гэта калі бачыш нешта ў рамках свайго прасторавага поля. А пасля таго як чалавек выходзіць за межы самаўдасканальвання па Законе чалавечага свету, тады глядзіць ужо не такім чынам. Тады ён ужо глядзіць непасрэдна, што называецца цудатворнай сілай Закону Буды. Гэта непараўнальна магутная рэч.

А як дзейнічае здольнасць дыстанцыйнага бачання ў Законе чалавечага свету? Я гэта для вас прааналізую. У прасторы, да якое прыналежыць гэтае поле, на месцы лба чалавека ёсць люстэрка. У тых, хто не практыкуе ціґун, яно закрыта; а ў практыкоўцаў люстэрка пераварочваецца да свайго працоўнага стану. Калі ў чалавека праяўляецца здольнасць дыстанцыйнага бачання, люстэрка пачынае

туды-сюды пераварочвацца. Як вам вядома, калі кінастужка пракручваецца з хуткасцю 24 кадры ў секунду, гэта можа рабіць фільм звязным; а калі хуткасць менш за 24 кадры, тады ўжо ўзнікае адчуванне скачкападобных рухаў. Хуткасць пераварочвання гэтага люстэрка перавышае 24 кадры ў секунду. Люстэрка фіксуе ў сабе тое, што адлюстроўваецца, паварочваецца да цябе, каб ты ўбачыў. Далей, пасля таго як яно ад цябе адвярнулася, выява сціраецца. Потым яно зноў адлюстроўвае, зноў пераварочваецца ды зноў сцірае. Люстэрка пастаянна пераварочваецца, таму тое, што ты бачыш, з'яўляецца рухомым. Гэта яно адлюстравала нешта ўнутры твайго прасторавага поля, каб ты гэта ўбачыў. А рэчы ў прасторавым полі адлюстраваныя з вялікага Сусвету.

Тады як жа ўбачыць тое, што за спінай чалавека? Такое малое люстэрка наўрад ці адлюструе ўсё, што атачае яго цела? Як вам вядома, калі ўзровень адкрыцця нябеснага вока чалавека перавышае бачанне вока неба і павінен перайсці ў бачанне вока мудрасці, тады яно ўжо мусіць прарваць нашую прастору. Менавіта ў той момант, калі яно вось-вось яе перавысіць, але яшчэ цалкам не перавысіла, з нябесным вокам адбываецца такая змена: чалавек бачыць, што ўсе прадметы перасталі існаваць, бачыць, што і людзі зніклі, і сцены зніклі, усё знікла — матэрыі больш не існуе. Гэта значыць, у гэтай асаблівай прасторы, калі і далей будзеш глядзець, тады выявіш, што чалавека ўжо не стала, адно толькі люстэрка стаіць у межах твайго прасторавага поля. І гэтае люстэрка ў ім мае такі ж памер, як усё прасторавае поле. Такім чынам, калі ўнутры яно туды-сюды пераварочваецца, тады можа адлюстраваць любое месца. Калі толькі нешта ў межах твайго прасторавага поля з'яўляецца адлюстраваннем з Сусвету, люстэрка здольнае цалкам усё гэта для цябе адлюстраваць. Такой з’яўляецца здольнасць дыстанцыйнага бачання, пра якую мы гаворым.

Калі навукоўцы, якія працуюць у галіне навук пра чалавечае цела, спраўджваюць гэтую здольнасць, тады часта схільныя яе абвяргаць. Аргументам для абвяржэння становіцца наступнае. Напрыклад, запытваюць, што зараз робіць сваяк нейкага чалавека дома ў Пекіне? Калі паведамяць імя ды агульныя звесткі пра гэтага сваяка, той, каго правяраюць, адразу ж усё ўбачыць. Ён распавядае, як выглядае будынак, як можна зайсці ў дзверы; пасля таго як зайшоў у пакой — як ён абмэбляваны. Усё сказанае ім цалкам супадае. І што ж чалавек зараз робіць? Паводле яго слоў, ён піша. Каб у гэтым пераканацца, тэлефануюць таму чалавеку і пытаюцца: «Што ты зараз робіш?» — «Ем». Але гэта супярэчыць таму, што ён убачыў, ці не так? Менавіта таму раней і адмаўлялі ў існаванні гэтае здольнасці. Але той, каго правяралі, зусім не памыліўся, апісваючы ўбачаную ім абстаноўку. Прычына неадпаведнасці ў тым, што паміж нашай прасторай і часам, якія мы называем прасторай-часам, і прасторай-часам тое прасторы, дзе функцыянуе тая здольнасць, існуе розніца ў часе. І паняцці часу ў двух бакоў розныя. Толькі што чалавек там пісаў, а зараз есць — вось такая розніца ў часе. Таму, калі людзі, якія праводзяць даследаванні ў галіне навук пра чалавечае цела, будуць прытрымлівацца агульнапрынятых тэорыяў, рабіць высновы ды праводзіць даследаванні ў

адпаведнасці з цяперашняй навукай, тады ўсё будзе марным, нават калі пройдзе яшчэ дзесяць тысяч гадоў. Раз гэтыя рэчы з самага пачатку з'яўляюцца такімі, якія перавышаюць звычайных людзей, дык у мысленні людзей павінен адбыцца пераварот. Больш ужо нельга так гэта разумець.

## ЗДОЛЬНАСЦЬ ВЕДАЦЬ ЛЁС

Яшчэ адна здольнасць, якая непасрэдна звязаная з нябесным вокам, называецца веданнем лёсу. Цяпер у свеце ёсць шэсць агульнапрызнаных відаў здольнасцяў, сярод якіх нябеснае вока, дыстанцыйнае бачанне, а таксама веданне лёсу. А што такое веданне лёсу? Гэта калі можаш ведаць будучыню і мінулае чалавека; у большым маштабе — ведаць росквіт і заняпад грамадства; у яшчэ большым — бачыць заканамернасці зменаў усяго Нябеснага цела. Гэта і з’яўляецца здольнасцю ведаць лёс. Бо матэрыя рухаецца па пэўных заканамернасцях. Любы прадмет у адмысловай прасторы мае формы існавання ў вельмі многіх іншых прасторах. Прывяду прыклад. Ледзь чалавечае цела варухнецца, як разам з ім пачынаюць рухацца ўсе клеткі ў ім, а ў мікраскапічнасці адбываецца рух усіх кампанентаў: усіх малекул, пратонаў, электронаў ды найменшых часцінак. Аднак яны маюць свае незалежныя формы існавання. З формамі цела чалавека, якія існуюць у іншых прасторах, таксама адбываюцца змены.

Хіба мы не кажам, што матэрыя не знікае? У адной пэўнай прасторы, калі чалавек нешта зрабіў, напрыклад, памахаў рукой, усё гэта існуе матэрыяльна, гэта пакідае адлюстраванне ды інфармацыю. У іншай прасторы яны захоўваюцца і вечна там існуюць. Чалавек, які мае здольнасць, калі ўбачыць карціну мінулага, адразу ж пра ўсё даведаецца. У будучыні, пасля таго як у цябе праявіцца здольнасць ведаць лёс, паглядзі на форму нашае сённяшняе лекцыі тут. Яна ўсё яшчэ будзе існаваць. Яна ўжо адначасова там існуе. Калі чалавек нараджаецца, тады ў адной адмысловай прасторы, дзе няма паняцця часу, ужо існуе ўсё яго жыццё. Часам больш як адно.

Мабыць, нехта з вас падумаў: «Дык вось, няма аніякае неабходнасці, каб мы прыкладалі ўласныя намаганні, самі сябе змянялі?» Ён не можа з такім пагадзіцца. Насамрэч уласныя намаганні могуць змяніць нязначныя рэчы ў жыцці чалавека. Шляхам уласных намаганняў з некаторымі нязначнымі рэчамі могуць адбыцца некаторыя змены. Аднак менавіта з-за таго, што ты заўзята спрабаваў гэта змяніць, ты, верагодна, і атрымаеш карму. Інакш ужо не існавала б праблемы стварэння кармы, не было б праблемы здзяйснення добрых або благіх учынкаў. Калі чалавек, не зважаючы ні на што, так робіць, тады можа завалодаць чужымі выгадамі. Тады ён здзейсніць благі ўчынак. Таму ў самаўдасканальванні мы зноў і зноў гаворым, што трэба скарыцца натуральнай плыні рэчаў. Вось у чым логіка. Бо сваімі ўпартымі намаганнямі ты прычыняеш іншым шкоду. Насамрэч у тваім жыцці гэтага не было, і, па сутнасці,

яно ў грамадстве прыналежала іншаму чалавеку. Але ты гэта атрымаў. Тады ты яму завінаваціў.

Змяніць значныя падзеі звычайны чалавек наогул не ў стане. Але спосаб, з дапамогай якога можна іх змяніць, усё ж ёсць: калі гэты чалавек увесь час робіць дрэнныя справы, здзяйсняе ўсё магчымае зло, тады змяніць сваё жыццё ён можа. Аднак яго будзе чакаць поўнае знішчэнне. З высокага ўзроўню мы бачым — калі чалавек памірае, яго душа і далей жыве. Як жа атрымліваецца, што душа не памірае? Мы бачым, што насамрэч, пасля таго як чалавек памёр, і яго паклалі ў морг, гэта ўсяго толькі клеткі чалавечага цела ў нашай прасторы. Кожная клеткавая тканка ва ўнутраных органах ды ў іншых частках унутры цела, усё чалавечае цела, клеткі, якія прыналежаць да гэтае прасторы, былі скінутыя. А ў іншых прасторах целы (якія складаюцца з яшчэ меншых матэрыяльных часцінак, чым малекулы, атамы, пратоны ды іншыя кампаненты) зусім не памерлі. Яны знаходзяцца ў іншых прасторах і працягваюць існаваць у мікраскапічных прасторах. А таго, хто робіць усё магчымае зло, чакае поўны распад усіх клетак, што ў будызме называецца поўным знішчэннем цела і душы.

Існуе яшчэ адзін спосаб, які можа даць чалавеку магчымасць змяніць усё яго жыццё, і гэта адзіны спосаб: чалавек ад сёння становіцца на шлях самаўдасканальвання. Тады чаму ўступленне на шлях удасканальвання можа змяніць жыццё чалавека? Хто здольны лёгка змяніць такую рэч? Як толькі чалавек захоча стаць на шлях удасканальвання, ледзьве ў чалавека прамільгне такая думка, яна бліснe, нібы золата, і скалане дзесяцібаковы Свет (паняцце Сусвету ў Школе Буды грунтуецца на вучэнні пра дзесяцібаковы Свет). Бо, з пункту гледжання Вышэйшых істотаў, чалавечае жыццё прызначанае не для таго, каб быць чалавекам. Яны лічаць, што чалавечыя істоты нарадзіліся ў Космасе, што яны былі аднолькавае з Космасам прыроды, былі добрымі ды складаліся з матэрыі Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Але яны таксама мелі групавыя адносіны. Калі ў гэтых істотаў развіліся сацыяльныя адносіны ў групах, некаторыя з іх станавіліся благімі, таму падалі ўніз; на тым узроўні яны зноў не маглі застацца, станавіліся яшчэ горш ды зноў падалі на адзін узровень, яны падалі, падалі, падалі ды ўрэшце ўпалі на ўзровень звычайных людзей.

На гэтым узроўні гэтага чалавека ўжо трэба было знішчыць, са свету зградзіць. Але Вялікія Прабуджанныя з вялікае міласэрнасці наўмысна стварылі такую прастору — прастору, падобную да нашага чалавечага грамадства. У гэтай прасторы яму дадалі чалавечае фізічнае цела, дадалі вось такія вочы, абмежаваныя здольнасцю бачыць прадметы толькі ў нашай матэрыяльнай прасторы, з-за якіх чалавек трапіў у зман, і якія не даюць яму бачыць сапраўдны выгляд Сусвету. А ў іншых прасторах усё можна бачыць. У гэтым змане, у гэтым становішчы чалавеку пакінулі вось такі шанец. Паколькі ён знаходзіцца ў змане, дык яму найбольш горка. Яму далі такое цела, каб прымусіць пакутаваць. Калі ў гэтай прасторы чалавек здольны вярнуцца назад уверх — як кажуць у практыцы Школы Даа, вярнуцца туды, адкуль ты паходзіш,

— калі ён мае жаданне ўдасканальвацца, тады ў яго праявілася прырода Буды. Такое жаданне лічаць самым каштоўным, і яму дапамогуць. Чалавек у такім нікчэмным становішчы ўсё яшчэ не прапаў, яшчэ хоча вярнуцца назад. Таму яму дапамогуць, дапамогуць безумоўна, яму могуць дапамагчы ва ўсім. Вось чаму для ўдасканальвальнікаў мы так рабіць можам, а для звычайных людзей — не.

Калі ты, як звычайны чалавек, хочаш вылекавацца, тады мы нічым не можам табе дапамагчы. Звычайны чалавек — гэта звычайны чалавек, а звычайным людзям якраз і належыць знаходзіцца ў стане грамадства звычайных людзей. Шмат хто кажа: «Але Буда ратуе ўсіх жывых істот, у Школе Буды акцэнтуецца выратаванне ўсіх жывых істот». Скажу табе, перагартай усе будыйскія каноны — там няма такога месца, дзе б гаварылася, што лекаванне звычайных людзей лічыцца выратаваннем усіх жывых істот. У апошнія гады менавіта тыя фальшывыя майстры ціґун нявечаць гэтую справу. Сапраўдныя майстры ціґун, майстры, якія пракладалі шлях, зусім не заклікалі цябе лекаваць іншых. Яны толькі вучылі цябе самога выконваць практыкаванні, лекавацца ды аздараўляцца. Ты — звычайны чалавек і навучаўся ўсяго два дні. Як ты можаш лекаваць іншых? Хіба гэта не махлярства? Хіба гэта не стымулюе развіццё навязлівых ідэяў? Пагоню за імем і грашыма, за звышнатуральнымі рэчамі, каб дэманстраваць іх сярод звычайных людзей! Гэта катэгарычна забаронена. Такім чынам, чым больш некаторыя людзі за гэтым гоняцца, тым больш верагодна, што нічога не будуць мець. Табе не дазволяць так рабіць і не дазволяць такім чынам адвольна парушаць стан грамадства звычайных людзей.

У Сусвеце ёсць такі прынцып: калі ты хочаш вярнуцца туды, адкуль ты паходзіш, тады табе дапамогуць. Таму лічаць, што чалавечая істота якраз і павінна вярнуцца назад, а не заставацца сярод звычайных людзей. Калі б чалавецтву дазволілі не мець аніякіх хваробаў і жыць у поўным камфорце, тады, нават калі б табе дазволілі стаць жыхаром неба, ты ад такога б адмовіўся. Няма ані хваробаў, ані пакутаў, маеш усё, што пажадаеш — як гэта цудоўна, гэта ўжо сапраўды быў бы свет жыхароў неба. Але ты, стаўшы благім, упаў да такое ступені, таму табе не будзе камфорту. Чалавек, знаходзячыся ў змане, схільны рабіць дрэнныя рэчы. У будызме гэта называецца пачарговай кармічнай адплатай. Таму часта, калі ў яго самога здарылася бяда, адбылося нешта дрэннае, усё гэта з’яўляецца тым, што ён у пачарговай кармічнай адплаце пагашае сваю карму. У будызме таксама кажуць, што Буды — паўсюль. Адзін Буда адзін раз узмахне рукой — і ў цэлага чалавецтва знікнуць усе хваробы. Гэтага гарантавана можна дасягнуць. Існуе настолькі шмат Будаў, дык чаму ж яны гэтага не робяць? Бо чалавек зведвае гэтыя пакуты толькі таму, што раней зрабіў благі ўчынак і завінаваціў. Калі ты яго вылекуеш, тады гэта ўсё адно, што парушыць прынцып Сусвету, усё адно, што гэтаму чалавеку можна рабіць благое і не аддаваць таго, што ён завінаваціў іншым. Гэта недапушчальна. Таму ўсе яны абараняюць стан грамадства звычайных людзей, і ніхто з іх яго не парушае. Адзінае, што сапраўды прывядзе цябе да

найбольшага камфорту, калі адсутнічаюць хваробы, і да магчымасці дасягнуць мэты сапраўднага вызвалення — гэта самаўдасканальванне! Даць людзям магчымасць удасканальвацца па праведных метадах — толькі гэта з'яўляецца сапраўдным выратаваннем усіх жывых істот.

Чаму ж вялікая колькасць майстроў ціґун можа лекаваць хворых? Чаму яны лекуюць? Нехта з вас, магчыма, задумваўся над гэтым пытаннем. Большасць такіх майстроў ціґун не прыналежыць да правільнага шляху. Сапраўдны майстар ціґун з міласэрнасці, з жалю, калі бачыць у ходзе самаўдасканальвання, што ўсе істоты пакутуюць, дапамагае іншым. Гэта дазваляецца. Але ён не можа іх вылекаваць. Ён здольны толькі часова стрымаць захворванне; альбо адсунуць яго для цябе — не захварэеш зараз, але захварэеш у будучыні; альбо яго для цябе трансфармаваць, зрабіўшы так, каб яно перайшло на тваіх блізкіх. Сапраўды ж канчаткова ліквідаваць тваю карму ён ужо не можа. Забаронена адвольна рабіць гэта для звычайных людзей, а можна толькі для ўдасканальвальнікаў. Вось у чым логіка.

Змест ужыванае ў Школе Буды фразы «выратаванне ўсіх жывых істотаў» такі: з найбольш пакутлівага стану звычайнага чалавека забраць цябе на высокі ўзровень, дзе ты больш ніколі не будзеш пакутаваць і назаўжды вызвалішся. Вось які сэнс таго, пра што яны кажуць. Шак'ямуні ж казаў пра іншы бераг нірваны. Такі сапраўдны сэнс іх «выратавання ўсіх жывых істот». Калі ж даць табе сярод звычайных людзей у поўнай меры атрымліваць асалоду ад шчасця, калі маеш паўнютка грошай, калі нават ложак у цябе дома ўсцелены грашыма, і ў цябе няма аніякіх пакутаў, тады, нават калі табе дадуць стаць жыхаром неба, ты не пагодзішся. Як для ўдасканальвальніка, можна змяніць табе жыццёвы шлях. І яго можна змяніць толькі ў тым выпадку, калі ты ўдасканальваешся.

Форма здольнасці ведаць лёс такая: у месцы чалавечага лба ёсць маленькі экран, падобны да тэлевізійнага. У адных людзей ён размешчаны на месцы лба; у другіх — вельмі блізка да лба; у трэціх — унутры лба. Некаторыя людзі могуць бачыць з заплюшчанымі вачыма, а ў тым выпадку, калі здольнасць вельмі магутная, некаторыя могуць бачыць і з расплюшчанымі. Аднак староннія людзі не бачаць формы гэтае здольнасці. Гэта тое, што знаходзіцца ў межах прасторавага поля чалавека. Гэта значыць, пасля праявы гэтае здольнасці ёсць яшчэ адзін від здольнасці, які як носьбіт адлюстроўвае ўбачаныя ў іншай прасторы карціны, каб чалавек убачыў гэта сваім нябесным вокам — даведаўся чыюсьці будучыню, чыёсьці мінулае, убачыў вельмі дакладна. Наколькі б дакладна хтосьці ні варажыў[63], дробныя акалічнасці і дэталі яму ўсё-ткі не вызначыць. А вось той, хто мае здольнасць ведаць лёс, наадварот, бачыць гэта вельмі выразна. Нават эпоху бачыць. Ён бачыць нават дэталі, якія змяняюцца, бо тое, што ён бачыць, — гэта рэальнае адлюстраванне людзей або прадметаў у розных прасторах.

Мы адкрываем нябеснае вока кожнаму, калі толькі ён самаўдасканальваецца па Фалунь Дафа. Што ж тычыцца іншых здольнасцяў, якія мы закранем у аповедзе пазней, іх мы табе ўжо не разблакуем. Услед за бесперапынным падвышэннем узроўню здольнасць ведаць лёс узнікне ў цябе натуральна. У будучыні ва ўдасканальванні ты сутыкнешся з такой сітуацыяй. Калі гэтая здольнасць узнікне, ты будзеш ведаць, у чым справа. Таму мы выказалі ўсе гэтыя Законы ды прынцыпы.

## БЫЦЬ ПА-ЗА ПЯЦЦЮ ЭЛЕМЕНТАМІ І ВЫЙСЦІ ЗА МЕЖЫ ТРОХ СФЕР

Што значыць «быць па-за пяццю элементамі, выйсці за межы Трох сфер»? Размовы на гэтую тэму прыводзяць да вострых спрэчак. Раней многія майстры ціґун закраналі гэтую тэму, і з іх моцна смяяліся тыя, хто не верыць у ціґун: «Вы займаецеся ціґун, хто ж з вас выйшаў за межы пяці элементаў, хто ўжо не знаходзіцца ў Трох сферах?» Некаторыя людзі не з'яўляюцца майстрамі ціґун. Званне майстра яны надалі самі сабе. Калі не можаш дакладна растлумачыць, дык маўчы. Але яны яшчэ асмельваюцца пра гэта казаць, і людзі затыкаюць ім рот. Гэта наносіць колам удасканальвальнікаў велізарную шкоду і прыводзіць да вялікае блытаніны. З гэтае нагоды людзі здзяйсняюць нападкі на ціґун. «Быць па-за пяццю элементамі, выйсці за межы Трох сфер» — гэта выраз з колаў удасканальвальнікаў. Ён паходзіць з рэлігіяў, з’явіўся ў рэлігіях. Таму мы не можам раскрываць гэтую тэму ў адрыве ад гэтага гістарычнага фону, ад тагачасных абставінаў.

Што значыць «быць па-за пяццю элементамі»? І нашая старажытная кітайская фізіка, і сучасная фізіка лічаць кітайскае вучэнне пра пяць элементаў правільным. Метал, дрэва, вада, агонь, зямля — гэтыя пяць элементаў утварылі абсалютна ўсё ў нашым Сусвеце. Гэта правільна. Таму мы ўжываем гэты тэрмін. Калі кажуць, што чалавек выйшаў за межы пяці элементаў, калі выказацца сучаснай мовай, гэта азначае выхад за межы нашага матэрыяльнага свету, што гучыць даволі ашаламляльна. Падумайце над такім фактам, што ў майстроў ціґун ёсць Ґун. Я прымаў удзел у эксперыменце. Вельмі вялікая колькасць майстроў ціґун таксама ўдзельнічала ў такой праверцы, мэта якой — вымераць іх энергію. Бо матэрыяльныя кампаненты такога Ґун можна зафіксаваць многімі даступнымі нам цяпер прыборамі. Гэта значыць, кажучы пра кампаненты, якія выпраменьваюць майстры ціґун, калі толькі ёсць такі від вымяральнае апаратуры, тады і можна вызначыць наяўнасць Ґун. Сучасныя прыборы могуць вызначыць прысутнасць інфрачырвоных, ультрафіялетавых прамянёў, ультрагуку, інфрагуку, электрычнага, магнітнага, гама-выпраменьвання, атамаў, нейтронаў. Уся гэтая матэрыя ёсць у майстроў ціґун. Бывае і такое, калі нейкую матэрыю, якую выпраменьваюць майстры ціґун, немагчыма зафіксаваць — няма такой апаратуры. Калі ў наяўнасці ёсць адпаведныя прыборы, усё можна цалкам зафіксаваць. Было выяўлена, што матэрыя, якую выпраменьваюць майстры ціґун, з’яўляецца надзвычай багатай.

Пад дзеяннем адмысловага электрамагнітнага поля майстры ціґун могуць выпраменьваць вялікае ды інтэнсіўнае свячэнне, надзвычай прыгожае. Чым вышэй іх сіла Ґун, тым больш энергетычнае поле, якое выпраменьваецца. А ў звычайных людзей гэтае свячэнне хоць і ёсць, але яно вельмі, вельмі слабае. У даследаваннях фізікі высокіх энергіяў людзі лічаць, што энергія — гэта нейтроны, атамы і да таго падобнае. Шмат майстроў ціґун, у тым ліку даволі знакамітыя, таксама ўдзельнічалі ў вымярэннях. Я таксама ўдзельнічаў у вымярэннях. Паводле іх вынікаў, колькасць гама-прамянёў ды цеплавых нейтронаў, якія выпраменьваюцца мной, у 80-170 разоў перавысіла колькасць, уласцівую звычайнаму рэчыву. У гэты час стрэлкі вымяральных прыбораў дасягнулі максімальных значэнняў шкалы. Паколькі стрэлкі дасягнулі мяжы, дык яшчэ невядома, наколькі вялікімі былі нарэшце гэтыя значэнні. Такі магутны паток нейтронаў, проста неспасціжна! Як чалавек можа выпраменьваць настолькі вялікі паток нейтронаў? Гэта даказвае, што мы, майстры ціґун, маем Ґун, маем энергію. Гэта атрымала пацверджанне ў навукова-тэхнічных колах.

Для выхаду за межы пяці элементаў гэта яшчэ мусіць быць метад практыкі ўдасканальвання Сіньсін і даўгалецця. Калі гэта не такі метад, тады чалавек толькі развівае свой Ґун, які вызначае вышыню ўзроўню. Але ў метадах практыкі, у якіх не здзяйсняюць удасканальвання цела, такое праблемы не існуе. Яны не выходзяць за межы пяці элементаў. У метадах удасканальвання Сіньсін і даўгалецця энергія чалавека назапашваецца ва ўсіх клетках яго арганізма. У нашых звычайных практыкоўцаў, тых, у каго толькі пачаў расці Ґун, часцінкі энергіі, якая выпраменьваецца, вельмі грубыя, паміж імі ёсць прамежкі, гушчыня энергіі нязначная, таму яе магутнасць вельмі малая. Калі іх узровень становіцца ўсё больш высокім, тады гушчыня іх энергіі перавышае гушчыню звычайных малекул вады ў сто, у тысячу, у сто мільёнаў разоў — усё гэта магчыма. Бо чым вышэй узровень, тым больш гушчыня энергіі, тым больш дробныя яе часцінкі, тым больш яе магутнасць. У такіх абставінах энергія чалавека назапашваецца ў кожнай клетцы цела. І не толькі ў кожнай клетцы цела ў нашай матэрыяльнай прасторы. Ва ўсіх целах у іншых прасторах клеткі, якія складаюцца з малекул, атамаў, пратонаў, электронаў, ажно да такіх кампанентаў, якія створаныя найбольш мікраскапічнымі часцінкамі, папаўняюцца такой энергіяй. З цягам часу чалавечы арганізм будзе цалкам напоўнены матэрыяй высокай энергіі.

Такая матэрыя высокай энергіі з'яўляецца разумнай ды здольнай. Як толькі яе становіцца шмат, а яе гушчыня становіцца вялікай, пасля таго як яна запоўніла ўсе клеткі чалавечага цела, яна здольная запанаваць над клеткамі фізічнага цела чалавека — надзвычай слабымі клеткамі. Пасля таго як аднойчы яна гэта зробіць, спыніцца метабалізм, і ўрэшце матэрыя высокай энергіі цалкам заменіць клеткі чалавечага фізічнага цела. Вядома, сказаць мне гэта лёгка, а вось давядзенне самаўдасканальвання да гэтага этапу — працэс павольны. Калі ты дойдзеш ва ўдасканальванні да гэтага кроку, усе клеткі твайго арганізма будуць замененыя такой матэрыяй высокай энергіі. Падумай: хіба тваё цела яшчэ будзе складацца з пяці элементаў? Хіба гэта ўсё яшчэ будзе матэрыя

нашае прасторы? Цела ўжо будзе складацца з матэрыі высокай энергіі, сабранай з іншых прастораў. Кампаненты Дэ таксама з'яўляюцца матэрыяй, якая існуе ў іншай прасторы, яны таксама не абумоўліваюцца полем часу нашае прасторы.

Сучасная навука лічыць, што час мае поле. Тое, што не знаходзіцца ў межах дзеяння поля часу, не абумоўліваецца часам. Іншыя прасторы адрозніваюцца ад нашага боку паняццем прасторы-часу. Як жа гэты час можа абумоўліваць матэрыю іншых прастораў? Ён на іх ужо абсалютна не дзейнічае. Задумайся: хіба не выйдзеш ты тады з пяці элементаў? Хіба ў цябе яшчэ будзе цела звычайнага чалавека? Ужо зусім не. Але тут ёсць вось які момант — звычайным людзям усё-ткі гэтага не разглядзець. Хаця цела чалавека ўжо змянілася да такое ступені, але гэта яшчэ не лічыцца канцом удасканальвання. Чалавек павінен і далей, удасканальваючыся ўверх, прарываць узроўні. Такім чынам, яму і надалей трэба ўдасканальвацца, знаходзячыся сярод звычайных людзей. Калі ніхто з людзей яго не ўбачыць, тады нічога не атрымаецца.

А што ж рабіць пасля гэтага? Хаця ў ходзе самаўдасканальвання чалавека ўсе малекулярныя клеткі яго цела ўжо замененыя матэрыяй высокай энергіі, але атамы маюць свой парадак размяшчэння. З парадкам размяшчэння малекул, атамных ядраў не адбылося аніякіх зменаў. У клетках цела парадак размяшчэння малекул менавіта такі, што яно навобмацак мяккае; парадак размяшчэння малекул у костках будзе з высокай гушчынёй, таму косткі навобмацак цвёрдыя; гушчыня малекул крыві надзвычай малая, таму кроў — гэта вадкасць. Звычайныя людзі знешне не ўбачаць у табе зменаў. Малекулярныя клеткі такога чалавека ўсё яшчэ захаваюць першасную будову і парадак размяшчэння. Іх структура не зведае змены — зменіцца энергія ўнутры іх. Таму такі чалавек з гэтага часу перастане натуральна старэць, яго клеткі перастануць адміраць, і, такім чынам, ён назаўжды застанецца маладым. У ходзе ўдасканальвання чалавек будзе выглядаць маладзейшым за свае гады і ўрэшце ўжо стабілізуецца ў такім стане.

Вядома, калі такое цела сутыкнецца з аўто, тады, магчыма, гэтак жа адбудзецца пераломам косткі, калі парэзацца нажом, тады па-ранейшаму пацячэ кроў. Гэта таму, што парадак размяшчэння малекул цела не змяніўся. Адзінае, што з целам чалавека не адбываецца натуральнага адмірання, не адбываецца натуральнага старэння, няма абмену рэчываў. Гэта і з'яўляецца выхадам за межы пяці элементаў, пра якія мы распавядаем. Дзе ж тут так званыя забабоны? Усё можна да канца растлумачыць, навукова абгрунтаваўшы. Некаторыя на гэтым не знаюцца, але адвольна пра гэта кажуць, вось людзі і абвінавачваюць іх у прапагандзе забабонаў. Гэта таму, што выраз паходзіць з рэлігіяў, а не ўведзены ў сучасным ціґун.

Што такое «выйсці за межы Трох сфер»? Як я нядаўна казаў, ключ да росту Ґун у тым, што, удасканаліўшы Сіньсін, мы асімілюемся з уласцівасцю Сусвету,

уласцівасць Сусвету перастае цябе абмяжоўваць; калі падняўся твой Сіньсін, кампаненты Дэ эвалюцыянуюць у Ґун. Ґун пастаянна расце і падымаецца ўгару, і пасля таго, як падымецца да высокага ўзроўню, утворыцца слуп Ґун. Якое вышыні гэты слуп Ґун, такое вышыні і твой Ґун. Ёсць такі выраз: «Дафа — бязмежны». Усё цалкам абапіраецца на выпраўленне тваіх думак. Тое, наколькі высока ты здольны ўдасканаліцца, цалкам залежыць ад тваёй сілы цярпення і здольнасці трываць пакуты. Калі тваё белае рэчыва ўжо цалкам выкарыстанае, тады тваё чорнае рэчыва шляхам пакутаў можна ператварыць у белае. Калі ўсё адно не хапае: твае сваякі і добрыя сябры — яны не ўдасканальваюцца, і калі ты возьмеш на сябе іх грахі, тады таксама можаш развіць Ґун. Тут гаворка вядзецца пра тых, хто дасягнуў надзвычай высокага ўзроўню ў самаўдасканальванні. Як удасканальвальнік звычайнага ўзроўню, ні ў якім разе не думай пра тое, каб узяць на сябе грахі сваёй сям'і. З настолькі вялікай кармай звычайны чалавек не зможа паспяхова завершыць удасканальванне. Тут я распавядаю пра прынцыпы розных узроўняў.

Пад Трыма сферамі, пра якія вядзецца гаворка ў рэлігіях, маецца на ўвазе дзевяць узроўняў нябёсаў альбо трыццаць тры ўзроўні нябёсаў, інакш кажучы — нябесныя, зямныя ды падземныя істоты ўтвараюць жывых істотаў Трох сфер. У рэлігіях гаворыцца, што ўсе істоты, якія знаходзяцца ў межах трыццаці трох узроўняў нябёсаў, праходзяць Шэсць колаў пераўвасабленняў. Шэсць колаў пераўвасабленняў азначаюць, што ў гэтым жыцці нехта з'яўляецца чалавекам, а ў наступным, можа так здарыцца, стане жывёлай. У будызме кажуць: даражыце гадамі жыцця, якія вам засталіся, бо калі зараз не пачаць удасканальвацца, дык тады калі ж? Бо жывёлам забаронена самаўдасканальвацца, забаронена слухаць Закон. Нават калі яны стануць удасканальвацца, ім усё адно не дамагчыся Паўнапраўнага дасягнення[64]. Калі жывёла атрымае высокі Ґун, дык усё адно будзе забітая Небам. Ты не можаш атрымаць чалавечае цела і за некалькі стагоддзяў — для гэтага трэба больш за тысячу гадоў. І вось, атрымаўшы чалавечае цела, ты ўсё адно не ведаеш, што ім трэба даражыць. Калі ты пераўвасобішся ў камень, тады не вызвалішся і за дзесяць тысяч гадоў. Калі той камень не раздрабняць, калі ён не выветрыцца, тады ты ніколі не зможаш выйсці. Наколькі ж няпроста атрымаць чалавечае цела! Калі хтосьці сапраўды здольны атрымаць Дафа, дык гэтаму чалавеку проста неймаверна пашчасціла. Чалавечае цела атрымаць цяжка. Вось пра што яны кажуць.

Практыкуючы ціґун, мы надаем вялікае значэнне ўзроўню. Гэты ўзровень цалкам грунтуецца на тваім уласным удасканальванні. Калі ты хочаш перавысіць Тры сферы, тады, калі твой слуп Ґун дзякуючы ўдасканальванню стаў вельмі-вельмі высокім, хіба ты ўжо не перавысіў Тры сферы? Калі падчас сядзення ў медытацыі ў некаторых людзей душа пакідае цела, тады яна адразу падымаецца вельмі высока. Адзін з вучняў, які падзяліўся са мной у лісце сваімі дасягненнямі і перажытым, сказаў: «Настаўніку, я падняўся праз вось столькі і столькі ўзроўняў нябёсаў ды ўбачыў нейкія карціны». Я кажу: «Спрабуй падняцца яшчэ вышэй». Ён кажа: «Я не змог падняцца, не асмеліўся. Вышэй

падняцца не змог». Чаму? Бо яго слуп Ґун толькі такое вышыні. Ён падымаўся, седзячы на сваім слупе Ґун. Гэта і з'яўляецца Рангам дасягнення, пра які гаворыцца ў будызме. Ён удасканаліўся да такога Рангу дасягнення. Але, калі казаць пра ўдасканальвальніка, гэта не значыць, што ён дайшоў да вяршыні свайго Рангу дасягнення. Ён і далей няспынна ўзносіцца ўгару, няспынна падымаецца, няспынна падвышаецца. Калі твой слуп Ґун перавысіў межы Трох сфер, тады ці не выйшаў ты за іх межы? Мы вымералі ды адкрылі, што Тры сферы, пра якія гаворыцца ў рэлігіях, ляжаць усяго толькі ў межах нашых дзевяці вялікіх планет. Некаторыя кажуць пра дзесяць вялікіх планет. А я кажу, што такога наогул не існуе. Я ўбачыў, што ў некаторых майстроў ціґун мінулага слуп Ґун прабіўся за межы Млечнага шляху і дасягнуў вялікае вышыні. Тры сферы ўжо даўно засталіся для іх ззаду. Толькі што я закрануў «выхад за межы Трох сфер». Насамрэч гэта і ёсць пытанне пра ўзроўні.

## ІМКНЕННЕ ЧАГОСЬЦІ ДАСЯГНУЦЬ

Многія людзі, трымаючы ў глыбіні сэрца нейкія імкненні, прыходзяць на месцы, дзе мы самаўдасканальваемся. Некаторыя з іх маюць імкненне здабыць здольнасці, некаторыя хочуць паслухаць тэорыю, іншыя — вылекавацца, а нехта вырашыў прыйсці для таго, каб атрымаць Фалунь — якіх толькі душэўных станаў няма. Быў і такі, які мне сказаў: «Адзін з чальцоў нашае сям'і яшчэ не быў на курсах. Я заплачу трохі за навучанне, а ты дай яму Фалунь». Мы прайшлі праз шмат жыццяў, праз надзвычай доўгую эпоху — такую доўгую, што, калі сказаць лічбу, яна ўсіх напалохае. А ты выдаткуеш некалькі дзясяткаў юаняў ды купіш сабе Фалунь — тое, што сфармавалася за настолькі працяглую эпоху? Чаму мы безумоўна можам даць кожнаму з вас Фалунь? Таму што ты хочаш стаць удасканальвальнікам. Гэтае жаданне не купіш ні за якія грошы. У цябе праявілася прырода Буды. Толькі таму мы так робім.

Ты ж маеш імкненні. Ты прыйшоў толькі дзеля гэтага? Маё Цела Закону ў іншай прасторы ведае кожную тваю думку, бо паняцце прасторы-часу ў дзвюх прасторах адрозніваецца. Каліназіраць у іншай прасторы, фармаванне тваіх думак з'яўляецца вельмі павольным працэсам. Маё Цела Закону ўжо ўсё ведае нават да таго, як ты падумаеш. Таму табе трэба адмовіцца ад усіх сваіх няправільных думак. У Школе Буды вераць у лёс. Усіх вас прывёў сюды лёс. Калі ты гэта атрымаў, гэта азначае, што, магчыма, табе належала гэта атрымаць. Таму даражы гэтым і не май аніякіх імкненняў.

У мінулым у рэлігійным самаўдасканальванні ў Школе Буды гаварылася пра Пустату — ні пра што не думаць, увайсці ў вароты Пустаты; а ў Школе Даа гаварылася пра Ніштo[65] — нічога не мець, нічога не хацець, ні за чым не гнацца. Як кажуць практыкоўцы, «ёсць жаданне практыкаваць ціґун, няма жадання атрымаць Ґун». Прытрымлівайся стану Нядзеяння[66], турбуйся толькі пра тое, каб удасканальваць свой Сіньсін, тады твой узровень і будзе

прарывацца, і ты, вядома, будзеш мець тое, што належыць мець. Калі цябе гэта турбуе, тады ці не з'яўляецца гэта навязлівай ідэяй? Мы тут адразу выкладаем настолькі высокі Закон, таму, вядома, што і патрабаванні да твайго Сіньсін высокія. Таму нельга вучыцца Закону, маючы імкненні.

Каб быць перад вамі адказнымі, мы вядзем вас правільным шляхам. Што тычыцца Закону, дык нам неабходна да канца яго вам растлумачыць. Калі нехта гоніцца за адкрыццём нябеснага вока, тады яно само сябе заблакуе ды закрыецца. Прычым, я таксама вам скажу, калі чалавек удасканальваецца ў Законе чалавечага свету, усе здольнасці, якія ў яго праяўляюцца, з'яўляюцца прыроджанымі здольнасцямі, уласцівымі фізічнаму целу, — тым, што ў нас цяпер называюць экстрасэнсорнымі здольнасцямі. Яны могуць толькі ў наяўнай прасторы, у межах нашае прасторы адыгрываць сваю ролю ды ўплываць на звычайных людзей. Дык для чаго ты прагнеш гэтых нікчэмных здольнасцяў ды магіяў? Ты гонішся і гонішся за імі, а пасля таго як дасягнеш Закону за межамі чалавечага свету, у іншых прасторах яны ўжо не будуць дзейнічаць. Калі надыходзіць час выхаду за межы ўдасканальвання па Законе чалавечага свету, усе гэтыя здольнасці неабходна выкінуць, уціснуць іх у адну вельмі глыбокую прастору і захаваць іх там на будучыню як запісы твайго працэсу ўдасканальвання. Яны змогуць адыгрываць толькі такую нязначную ролю.

Пасля выхаду за межы Закону чалавечага свету чалавек павінен удасканальвацца нанова. Такое цела, пра якое я толькі што распавядаў і з'яўляецца целам, якое выйшла за межы пяці элементаў. Яно з'яўляецца Целам Буды. Хіба такое цела ўжо не называецца Целам Буды? Гэтае Цела Буды трэба пачаць зноў удасканальваць, у ім ізноў пачынаюць праяўляцца здольнасці. Хоць яны называюцца ўжо не здольнасцямі, а цудатворнай сілай Закону Буды. Яе магутнасць бязмежная, яна ўплывае на кожную прастору. Гэта нешта сапраўды эфектыўнае. Скажы, якая карысць з таго, што ты ўсё яшчэ гонішся за здабыццём здольнасцяў? Ці не так, што кожны, хто за гэтым гоніцца, жадае выкарыстоўваць іх сярод звычайных людзей, дэманстраваць звычайным людзям? Інакш, навошта яны яму патрэбныя? Здольнасцяў не ўбачыць, да іх не дакрануцца. Нават для ўпрыгажэння шукаюць жа нешта прыгожае! Гарантую, што ў тваёй падсвядомасці ўтойваецца мэта іх выкарыстоўваць. Нельга гнацца за здольнасцямі, як за нейкім уменнем звычайных людзей. Яны з’яўляюцца чымсьці цалкам звышнатуральным і тым, што нельга даць табе дэманстраваць сярод звычайных людзей. Сама цяга паказваць сябе — вельмі вялікая навязлівая ідэя. Гэта вельмі дрэннае жаданне — такое, ад якога ўдасканальвальнік павінен пазбавіцца. А калі ты хочаш пры дапамозе здольнасцяў зарабляць грошы, разбагацець і ў асабістай упартай барацьбе дасягнуць сваіх мэтаў звычайнага чалавека, тады гэта тым больш не дазволена. Гэта азначае рэчамі высокага ўзроўню ствараць перашкоды грамадству звычайных людзей, руйнаваць грамадства звычайных людзей — гэта яшчэ горшы спосаб мыслення. Таму і забаронена адвольна выкарыстоўваць здольнасці.

Даволі часта здольнасці праяўляюцца ў тых, хто знаходзіцца на двух канцах, — у дзяцей ды старых. Асабліва пажылыя жанчыны — звычайна яны здольныя берагчы свой Сіньсін. Сярод звычайных людзей яны не маюць нейкіх там навязлівых ідэяў. Пасля праявы здольнасцяў ім лёгка стрымацца і ў іх няма тое схільнасці паказваць сябе. Чаму здольнасці не могуць праявіцца ў маладых людзей? Асабліва гэта тычыцца маладых мужчын — яны яшчэ хочуць змагацца ў грамадстве звычайных людзей, усё яшчэ хочуць дасягнуць нейкіх мэтаў! Калі ў маладых мужчын праявяцца здольнасці, тады яны іх выкарыстаюць, каб рэалізаваць свае мэты. Здольнасці стануць сродкам дасягнення іх мэты. Гэта абсалютна недапушчальна. Таму здольнасці ў іх не праяўляюцца.

Справа самаўдасканальвання — гэта зусім не дзіцячая забаўка або майстэрства звычайных людзей. Гэта неймаверна сур'ёзная рэч. Ці хочаш, ці можаш ты ўдасканальвацца, цалкам залежыць ад таго, як ты будзеш падвышаць свой Сіньсін. Калі б з'яўлення ў чалавека здольнасцяў сапраўды можна было б дабіцца імкненнем, гэта была б бяда! Паглядзі толькі: якое там удасканальванне? Гэты чалавек зусім бы не думаў пра гэта. Паколькі яго Сіньсін знаходзіўся б на ўзроўні звычайных людзей, ды яшчэ і здольнасці былі б здабытыя шляхам пагоні, дык ён, бадай, здзейсніў бы ўсе магчымыя благія ўчынкі: у банку мора грошай, перамяшчу трохі сабе; на цэнтральнай вуліцы поўна латарэйных квіткоў, выцягну першы прыз. А чаму такога не бывае? Некаторыя майстры ціґун кажуць: «Тыя, хто не надае значэння маральнасці, пасля праявы здольнасцяў схільныя да здзяйснення благіх учынкаў». Я сказаў бы, што гэта памылковае меркаванне, усё зусім не так. Калі ты не надаеш значэння маральнасці, калі не ўдасканальваеш свой Сіньсін, здольнасці ў цябе наогул не ўзнікнуць. У некаторых людзей Сіньсін добры. Аднойчы на нейкім узроўні ў іх праяўляюцца здольнасці. Пасля, не здолеўшы ўтрымацца, яны здзяйсняюць тое, чаго нельга было рабіць. Такая з'ява існуе. Але як толькі яны зробяць благі ўчынак, дык здольнасці аслабнуць альбо зусім знікнуць. Калі страціш, дык страціш назаўжды. Разам з тым самым небяспечным з'яўляецца тое, што людзі могуць развіваць з-за гэтага навязлівыя ідэі.

Некаторыя майстры ціґун кажуць, што тыя, хто вучыцца іх ціґун, змогуць лекаваць хворых праз тры-пяць дзён. Гэта як рэклама. Гэта называецца ціґунскім бізнесам. Задумайся: калі ты звычайны чалавек, і ты выпраменіш трохі ці, хіба зможа гэта вылекаваць хворага? Ці ёсць і ў целе звычайных людзей, і ў цябе. Ты толькі пачаў займацца ціґун, і ў цябе толькі адкрылася акупунктурная кропка лаўґун[67], праз якую можна прымаць і выпраменьваць ці. Калі ты лекуеш іншага, у яго целе таксама ёсць ці. Хто ведае, магчыма, яго ці будзе лекаваць цябе! Як можа адзін ці ўплываць на іншы? Ці зусім не здольны нікога вылекаваць. Ды яшчэ, калі ты кагосьці лекуеш, паміж табой ды хворым утвараецца адно поле, з прычыны чаго хваробатворны ці з цела хворага цалкам пераходзіць у тваё цела. Значыць, у цябе яго будзе столькі ж. Хоць корань хваробы ў яго целе, але калі ў цябе будзе шмат хваробатворнага ці, гэта прывядзе да таго, што ты таксама захварэеш. Як толькі табе пачне здавацца, што ты здольны лекаваць, дык ты пачнеш ацаляць людзей з адчыненымі

дзвярыма, нікому не адмаўляючы. У цябе разаўецца навязлівая ідэя. Ты кагосьці вылекаваў, якая радасць! Але дзякуючы чаму ты здольны кагосьці вылекаваць? Ты не задумваўся пра тое, што ўсе фальшывыя майстры ціґун апантаныя нячыстым духам[68]. Каб прымусіць цябе паверыць, нячысты дух даў табе вось такую нязначную колькасць інфармацыі. Калі ты вылекуеш траіх, пяцярых, васьмярых або дзесяцярых, яна вычарпаецца. Гэта своеасаблівы выдатак энергіі. Таму гэтае порцыі энергіі ўжо не застанецца. Ты сам не маеш Ґун, і адкуль яму ў цябе ўзяцца? Мы, майстры ціґун, прайшлі праз некалькі дзясяткаў гадоў самаўдасканальвання. У мінулым удасканальвацца па Даа было вельмі няпроста. Удасканальвацца, не прысвяціўшы сябе праведным школам, па бакавых школах, па малых Даа было вельмі цяжка.

Паглядзі, некаторыя буйныя майстры ціґун вельмі знакамітыя. Яны ўдасканальваліся некалькі дзясяткаў гадоў і толькі тады змаглі выпрацаваць настолькі мізэрны Ґун. Ты не самаўдасканальваўся, а толькі пабываў на курсах, і ў цябе ўжо ўзнік Ґун? Дзе ты такое бачыў? З таго часу ў цябе з'явілася навязлівая ідэя. Як толькі яна ўзнікла, дык, калі ты не можаш кагосьці вылекаваць, ты пачынаеш хвалявацца. Дзеля захавання сваёй рэпутацыі да чаго ж даходзяць у сваіх думках некаторыя, калі лекуюць хворых? «Хай на гэтую хваробу захварэю я, толькі б ён ачуняў». Гэта не з міласэрнасці — ён зусім не ліквідаваў славалюбства ды карысталюбства, а пры такіх умовах наогул не можа нарадзіцца міласэрнасць. Ён баіцца страціць рэпутацыю, толькі і марыць, каб яму самому далі захварэць на гэтую хваробу. Вось як ён баіцца страціць сваё рэнамэ. Наколькі ж у яго вялікае імкненне праславіцца! Як толькі ў яго з’явіцца такое жаданне — дык хвароба адразу ж пяройдзе на яго цела. Гэтае жаданне сапраўды адыграе такую ролю. Ён вернецца дадому хворым. Той чалавек выздаравее, а ён, пасля таго як скончыць яго лекаваць, вернецца дадому, і яму стане блага. Ты лічыш, што вылекаваў хворага, іншыя называюць цябе папулярным майстрам ціґун, а ты ад радасці спачываеш на лаўрах страшэнна задаволены. Хіба гэта не навязлівая ідэя? Калі ў цябе не атрымліваецца кагосьці вылекаваць, тады ты падаеш духам. Хіба гэта не імкненне да славы і выгады дзейнічае? Разам з тым усе хваробатворныя ці людзей, якіх ты лекуеш, пераходзяць у тваё цела. Фальшывы майстар ціґун вучыць цябе, як можна іх з сябе выдаляць. Скажу табе, што ты зусім не зможаш выдаліць з сябе хваробатворны ці, нават крыху не зможаш — бо ты не здольны адрозніць добры ці ад дрэннага. З цягам часу ўсё тваё цела ўнутры стане чорным. Гэта і будзе карма.

Калі пачнеш шчыра самаўдасканальвацца, табе моцна дастанецца. Што табе тады рабіць? Колькі ж пакутаў табе прыйдзецца вытрымаць, каб ператварыць карму ў белае рэчыва? Гэта будзе вельмі цяжка. У прыватнасці, чым лепш у чалавека маральная аснова, тым больш верагодна ўзнікненне гэтае праблемы. Некаторыя людзі толькі і ведаюць, што гнацца за лекаваннем хворых, лекаваннем хворых. У цябе ёсць імкненне, і гэта ўбачыла жывёла. Яна хоча ў цябе ўсяліцца. Гэта і ёсць нячысты дух. Хочаш лекаваць хворых? Жывёла дасць табе магчымасць лекаваць. Але яна гэта зробіць зусім не без дай

прычыны. Хто не страціць, той не атрымае. Гэта вельмі небяспечная рэч. Урэшце ты прывабіў жывёлу. Пра якое ўдасканальванне яшчэ можна казаць? Гэта ўжо абсалютны канец усяму.

Некаторыя людзі з добрай маральнай асновай абменьваюць сваю маральную аснову на чужую карму. Той чалавек хворы, у яго вялікая карма. Калі ты вылекуеш цяжкахворага, тады, вярнуўшыся дадому па сканчэнні лекавання, ты пачуешся неймаверна блага! Шмат тых з нас, хто ў мінулым лекаваў іншых, менавіта так сябе і адчуваюць. Хворы ачуняў, а цябе, калі ты прыйшоў дадому, зваліла цяжкае захворванне. За доўгі час на цябе пераходзіць у абмен вялікая колькасць кармы. Ты даеш іншым Дэ ў абмен на карму, бо не страціш — не атрымаеш. Хоць ты просіш хваробу, усё адно мусіш у абмен на карму аддаць Дэ. У Сусвеце ж існуе прынцып: калі ты сам гэтага хочаш, ніхто не можа ў гэта ўмешвацца, і нельга сказаць, што ты добры. У Сусвеце прадугледжана такая рэч: у каго шмат кармы, той і з’яўляецца благім чалавекам. Ты абменьваеш сваю маральную аснову на чужую карму. Калі кармы стане шмат, якое яшчэ можа быць удасканальванне? Уся твая маральная аснова будзе цалкам знішчаная хворымі. Хіба гэта не страшна? Іншы ачуняў, стаў пачувацца добра, а ты ідзеш дадому пакутаваць. Калі ты вылекуеш двух людзей, хворых на рак, тады ты павінен будзеш сам замест іх памерці. Хіба гэта не небяспечна? У тым вось і справа. А вельмі шмат людзей не ведае гэтае логікі.

Што тычыцца некаторых фальшывых майстроў ціґун, ты не глядзі на тое, наколькі ён славуты — «быць знакамітым» не абавязкова азначае «быць разумным»[69]. Што ведае звычайны чалавек? Ён верыць таму, што паўтарае натоўп. Не глядзі, што гэты фальшывы майстар ціґун зараз так робіць. Ён шкодзіць не толькі іншым, але і сабе самому. Паглядзі, што з ім будзе праз год ці два. Не дазволена вось так нявечыць удасканальванне. Лекаваць яно здольнае, але прызначанае не для гэтага. Яно з'яўляецца чымсьці звышнатуральным, гэта не тэхніка звычайных людзей. Катэгарычна забаронена адвольна яго руйнаваць такім вось чынам. Атмасфера, якую цяпер ствараюць некаторыя фальшывыя майстры ціґун, сапраўды атручаная. Яны ставяцца да ціґун як да сродку дасягнення славы ды багацця, ствараюць зламысныя групоўкі для пашырэння сваёй сферы ўплыву, і іх у шмат разоў больш, чым сапраўдных майстроў ціґун. Усе звычайныя людзі так кажуць, так робяць, а ты і паверыў? Ты лічыш, што ціґун з'яўляецца менавіта такім. Гэта не так. Я распавядаю рэальны прынцып.

Калі звычайныя людзі ўступалі ў разнастайныя сацыяльныя адносіны, яны, здзейсніўшы дзеля ўласных інтарэсаў благія ўчынкі, завінавацілі іншым, вось і нясуць адказнасць за вяртанне доўгу. Скажам, ты будзеш адвольна лекаваць хворых, але, нават калі ты сапраўды здольны іх вылекаваць, хіба можна такое дазволіць? Буды — паўсюль. Чаму ж, калі іх настолькі шмат, яны гэтага не робяць? Як жа было б цудоўна, калі Буды далі б усяму чалавецтву жыць у поўным камфорце! І чаму ж яны гэтага не зробяць? Чалавек павінен сам

расплачвацца за сваю карму — ніхто не смее парушаць гэты прынцып. Для асобных людзей, якія знаходзяцца ў працэсе самаўдасканальвання, магчыма, з міласэрнасці яны калі-нікалі камусьці дапамогуць, але гэта таксама будзе азначаць, што яны толькі адсунулі захворванне на будучыню. Ты не будзеш пакутаваць цяпер, а будзеш пакутаваць пазней, альбо ж яны зробяць табе канвертаванне: не захварэеш — дык страціш грошы альбо патрапіш у бяду. Магчыма такое. А каб можна было сапраўды гэта зрабіць — адразу ліквідаваць табе карму, — дык гэта распаўсюджваецца толькі на ўдасканальвальнікаў. Для звычайных жа людзей гэтага рабіць нельга. Тут я распавядаю не пра прынцып маёй школы. Я кажу пра ісціну ўсяго нашага Сусвету, пра рэальную сітуацыю ў колах удасканальвальнікаў.

Мы тут ні ў якім разе не вучым цябе лекаваць. Мы вядзем цябе Вялікім Даа, праведным шляхам, вядзем цябе ўгару. Таму, калі я даю курс лекцыяў, тады штораз кажу, што ўсім паслядоўнікам Фалунь Дафа забаронена лекаваць хворых. Калі ты пачнеш лекаваць, тады ўжо не будзеш прыналежаць да майго Фалунь Дафа. Паколькі мы вядзем цябе праведным шляхам, дык у ходзе ўдасканальвання па Законе чалавечага свету пастаянна ачышчаем табе цела, ачышчаем цела, ачышчаем цела — пакуль яно не будзе цалкам ператворанае ў рэчывы высокай энергіі. А ты і далей набіраеш у сваё цела тыя чорныя рэчы. Як жа табе ўдасканальвацца? Гэта карма! Ты наогул не зможаш удасканальвацца. Калі ты іх шмат у сябе набярэш, тады не зможаш іх вытрымаць. Калі твае пакуты стануць занадта цяжкімі, ты ўжо не зможаш удасканальвацца. Вось у чым логіка. Я выкладаю гэты Дафа. Ты, магчыма, яшчэ не ведаеш, *што* я выкладаю. Раз я здольны выкладаць гэты Дафа, значыць, у мяне ёсць і сродкі яго абароны. У тым выпадку, калі ты будзеш лекаваць іншых, маё Цела Закону цалкам забярэ назад усе ўкладзеныя ў тваё цела рэчы, прызначаныя для ўдасканальвання. Нельга даць табе дзеля рэпутацыі ды грошай адвольна псаваць настолькі каштоўнае. Калі робіш насуперак патрабаванням Закону, тады больш не будзеш прыналежаць да нашага Фалунь Дафа. Твой арганізм таксама вернуць да стану звычайнага чалавека, вернуць табе назад дрэнныя рэчы, бо ты хочаш быць звычайным чалавекам.

З учарашняга дня вельмі многія з нас, пасля таго як скончылі слухаць лекцыю, адчулі лёгкасць ва ўсім целе. Але ў вельмі нязначнае колькасці людзей, якія з'яўляюцца цяжкахворымі, рэакцыя пачалася раней за ўсіх іншых — яны пачалі блага пачувацца яшчэ ўчора. Пасля таго як учора я зняў з вашых целаў дрэннае, большасць адчула лёгкасць ва ўсім целе і стала пачувацца выдатна. Аднак у нашым Сусвеце існуе прынцып, які называецца «не страціш — не атрымаеш». Нельга здымаць з цябе ўсё цалкам. Абсалютна недапушчальна, каб ты зусім нічога не знес. Гэта значыць, мы знялі з цябе карэнную прычыну твайго захворвання, карэнную прычыну нездароўя, але ў цябе засталося яшчэ поле хваробы. Калі нябеснае вока адкрыта на вельмі нізкім узроўні, у целе згустак за згусткам бачны чорны ці, брудны хваробатворны ці, які таксама

з'яўляецца канцэнтраванымі згусткамі чорнага ці, вельмі высокае канцэнтрацыі. Калі яны рассеюцца, тады запоўняць усё тваё цела.

З сённяшняга дня ў некаторых з вас усё цела будзе зябіць, нібы ў вас цяжкая форма прастуды, магчыма, нават будуць балець косткі. У большасці людзей будзе лакальны дыскамфорт — забаліць нага, здарыцца запамарока. Верагодна, ты лічыў, што дзякуючы практыкаванням ціґун вылекаваў тыя месцы, якія раней у цябе былі хворымі. Таксама магчыма, што нейкі майстар ціґун іх табе вылекаваў. Але цяпер усё зноў паўтарылася. Гэта таму, што ён цябе не вылекаваў, а толькі адсунуў хваробу на потым, і яна ўсё яшчэ застаецца ў тым месцы. Ён зрабіў так, каб ты не захварэў тады, а захварэў у будучыні. Мы павінны ўсё гэта вывернуць, выкінуць усё гэта з цябе, цалкам выкарчаваць. Такім чынам, верагодна, ты адчуеш, што адбыўся рэцыдыў захворвання. Гэта карэннае ліквідаванне кармы, таму ў цябе будзе рэакцыя. У некаторых будзе мясцовая рэакцыя — тут блага, там блага, праявяцца рознага роду недамаганні. Усё гэта нармальна. Скажу вам: як бы там ні было блага, што б там ні было, лекцыі абавязкова працягвайце наведваць. Варта вам толькі зайсці ў аўдыторыю, як усе вашыя сімптомы знікнуць, не будзе аніякае небяспекі. Пра гэта я кожнаму з вас кажу: як бы блага ты ні пачуваўся ад «хваробы», спадзяюся, што ты ўсё адно праявіш настойлівасць і прыйдзеш. Цяжка атрымаць Закон. Калі ты пачуваешся ўсё горш, гэта ўказвае на тое, што «нешта, дасягнуўшы піку, абавязкова пойдзе на спад»[70], і ўвесь твой арганізм будзе ачышчаны, павінен быць цалкам ачышчаны. Корань хваробы ўжо вырваны, а чорны ці, які застаўся, выходзіць з цябе сам, каб ты змог патрываць трохі пакутаў. Нельга, каб ты зусім нічагусенькі не перажыў.

Змагаючыся з людзьмі дзеля рэпутацыі ды выгады ў грамадстве звычайных людзей, ты дрэнна спіш, дрэнна ясі ды ўжо давёў сваё здароўе да вартага жалю стану. Калі ў іншай прасторы зірнуць на тваё цела, тады бачна, што кожная твая костка чорная. Калі мы адразу ачысцім вось такое цела, тады нельга, каб не было аніякае рэакцыі. Таму рэакцыя ў цябе будзе. У некаторых людзей яшчэ будзе панос і ваніты. Раней слухачы курсаў з многіх месцаў, калі дзяліліся са мной у лістах дасягненнямі ды перажытым, згадвалі пра гэта: «Настаўніку, калі я, скончыўшы слухаць лекцыю, вяртаўся з курсаў дамоў, усю дарогу пастаянна шукаў прыбіральню, пакуль не дабраўся дадому». Гэта таму, што неабходна ачысціць усе ўнутраныя органы чалавека. Яшчэ некаторыя асобныя людзі засынаюць, а прачынаюцца, як толькі я скончу чытаць лекцыю. Чаму ж так? Таму што хвароба існуе ўнутры яго мозга, неабходна правесці яму рэгуляванне. Калі пачаць наладжванне мозга, тады чалавек наогул не вытрымае. Таму абавязкова трэба ўвесці яго ў стан анестэзіі, каб ён нічога не ведаў. Але ў некаторых з часткай, якая адказвае за слых, праблемаў няма. Таму, хоць яны і салодка спяць, але ўсё ж не прапускаюць аніводнага слова — чуюць усё. Такія з гэтага часу стануць бадзёрымі ды не будуць знясіленымі, нават калі два дні не будуць спаць. Ва ўсіх свая сітуацыя, усім патрэбна правесці рэгуляванне. Увесь твой арганізм трэба цалкам ачысціць.

У кожнага, хто шчыра практыкуе Фалунь Дафа, — калі ты зможаш вызваліцца ад такіх імкненняў, — цяпер пачнецца рэакцыя. Што тычыцца тых, хто не можа ад іх пазбавіцца, хоць на словах яны і кажуць, што ўжо гэта зрабілі, а насамрэч гэта зусім не так, выканаць ім ачышчэнне цела вельмі цяжка. Ёсць і такая частка людзей, якія, праслухаўшы, зразумелі сэнс маіх лекцыяў пазней. Яны вызваліліся ад тых імкненняў, і іх цела пачало ачышчацца. Іншыя даўно ўжо адчуваюць лёгкасць ва ўсім целе, а ў іх толькі пачынаецца ўстараненне хваробы, яны толькі пачалі пачувацца блага. На кожных нашых курсах бываюць такія адсталыя, якім крыху бракуе ўсведамлення. Таму, з чым бы ты ні сутыкнуўся, усё гэта з'яўляецца нармальным. Калі я чытаў лекцыі ў іншых месцах, такая сітуацыя ўзнікала штораз. Камусьці стала вельмі блага, і, скурчыўшыся на сядзенні, ён не ідзе, чакаючы, што я сыду з кафедры ды пачну яго лекаваць. Я не буду гэтага рабіць. Нават гэтае выпрабаванне ты не можаш прайсці. Надалей, калі ты будзеш удасканальвацца сам, з табой здарыцца шмат вялікіх бедаў. Калі ты нават гэтага не можаш прайсці, тады пра якое ўдасканальванне яшчэ можа весціся гаворка? Няўжо не вытрываеш і такое нікчэмнае прыгоды? Ты ўсё здольны стрываць. Таму хай ніхто не звяртаецца да мяне з просьбай вылекаваць — я не лекую хворых. Як толькі ты згадаеш у размове слова «хвароба» — далей я слухаць ужо не хачу.

Выратаваць чалавека вельмі цяжка. На кожных нашых курсах заўсёды ёсць 5-10 адсоткаў такіх, якія не паспяваюць. Немагчыма, каб кожны спасціг Даа. Нават калі нягледзячы на ўсё ты зможаш цвёрда практыкаваць далей, яшчэ трэба будзе спраўдзіць, ці зможаш ты ўдасканаліцца, яшчэ трэба будзе паглядзець, ці зможаш ты праявіць рашучасць удасканальвацца. Немагчыма, каб кожны стаў Будам. У тых, хто шчыра ўдасканальваецца па Дафа, падчас чытання кнігі ўзнікне такі ж самы стан, ты гэтак жа атрымаеш усё, што табе належыць атрымаць.

# ЛЕКЦЫЯ ТРЭЦЯЯ

## Я ЛІЧУ ЎСІХ, ХТО Ў НАС НАВУЧАЕЦЦА, СВАІМІ ПАСЛЯДОЎНІКАМІ

Ці ведаеце вы, што я зрабіў? Я стаўлюся да ўсіх, хто ў нас навучаецца, як да сваіх паслядоўнікаў, сярод якіх і самавукі, здольныя шчыра самаўдасканальвацца. Навучаючы практыцы ціґун на высокім узроўні, па-іншаму і нельга рабіць. Гэта было б раўназначна безадказнасці, учыненню бязладдзя. Мы даем табе так шмат, мы далі табе даведацца пра столькі прынцыпаў, якія звычайным людзям ведаць не належыць. Я перадаю табе гэты Дафа ды яшчэ дам вельмі шмат чаго іншага. Я ачысціў табе арганізм і яшчэ збалансоўваю некаторыя іншыя праблемы. Таму ніяк нельга ставіцца да цябе не як да паслядоўніка. Забаронена вось так цалкам адвольна выдаваць столькі нябесных таямніц звычайнаму чалавеку. Але ёсць вось які момант: час цяпер іншы, і мы не выконваем такую фармальнасць, як, напрыклад, паклон у ногі або малы паклон. Гэтая фармальнасць ні да чаго. Гэта было б падобна да таго, як робяць у рэлігіі. Мы так не робім. Таму што хай ты нават пакланіўся ў ногі, прайшоў пасвячэнне ў вучні, але, выйшаўшы за дзверы, ты зноў бярэшся за сваё, сярод звычайных людзей, што табе трэба, тое ты і далей робіш — змагаешся за сваю славу і выгаду. Якая ад гэтага карысць? Магчыма, ты пад маім сцягам нават будзеш псаваць рэпутацыю Дафа!

Справа сапраўднага самаўдасканальвання цалкам абапіраецца на выпраўленне тваіх думак. Дастаткова таго, каб ты быў у стане ўдасканальвацца, мог цалкам добрасумленна ўдасканальвацца далей, тады мы і будзем ставіцца да цябе як да свайго паслядоўніка. Па-іншаму да цябе ставіцца будзе ніяк нельга. Аднак ёсць такія людзі, якія наўрад ці змогуць шчыра ўдасканальвацца далей, лічачы сябе практыкоўцамі. Для некаторых гэта немагчыма. Але вельмі шмат хто будзе сапраўды ўдасканальвацца далей. Толькі б ты ўдасканальваўся далей, тады мы і будзем весці цябе як паслядоўніка.

Ці лічыцца паслядоўнікам Фалунь Дафа той, хто толькі штодня практыкуе гэтыя некалькі цялесных рухаў? Наўрад ці так. Таму што ў сапраўдным самаўдасканальванні трэба прад'яўляць да сябе патрабаванні па выкладзеных намі крытэрах Сіньсін, трэба сапраўды падвышаць свой Сіньсін. Толькі тады гэта будзе сапраўдным удасканальваннем. Калі ты толькі і робіш, што выконваеш рухі, а Сіньсін не падвышаеш, і няма магутнай энергіі, якая ўсё ўзмацняе, тады годзе і гаварыць пра ўдасканальванне, і мы таксама не можам лічыць цябе паслядоўнікам Фалунь Дафа. Калі ты будзеш цягнуць так і далей, тады, хаця ты і практыкуеш, але дзейнічаеш насуперак патрабаванням нашага Фалунь Дафа, не падвышаеш Сіньсін, сярод звычайных людзей ізноў узяўся за сваё, тады цалкам магчыма, што ты нават сутыкнешся з непрыемнасцямі ды, хто ведае, магчыма, пачнеш гаварыць, што з-за практыкі Фалунь Дафа ў цябе ўзніклі адхіленні. Усё гэта магчыма. Таму табе сапраўды трэба дзейнічаць у адпаведнасці з патрабаваннямі нашых стандартаў Сіньсін. Толькі тады ты

будзеш шчырым удасканальвальнікам. Я вам усё выразна растлумачыў, таму больш не звяртайцеся да мяне з просьбай выканаць фармальнасці кшталту нейкага там яшчэ пасвячэння ў вучні. Дастаткова таго, каб ты шчыра ўдасканальваўся, і тады я так да цябе і буду ставіцца. Маіх Целаў Закону настолькі шмат, што іх не злічыць. Я ў стане паклапаціцца пра ўсіх, хто ў нас вучыцца, як бы шмат іх ні было, не кажучы ўжо пра прысутных.

## ЦІҐУН ШКОЛЫ БУДЫ І БУДЫЗМ

Ціґун Школы Буды — гэта не будызм, я дакладна вам гэта кажу. Насамрэч ціґун Школы Даа — гэта таксама не даасізм. Некаторыя з нас ніяк не могуць гэтага зразумець. Адны з нас з'яўляюцца манахамі з манастыроў, а другія — свецкімі будыстамі. Ім здаецца, што яны знаюцца на тым, што звязана з будызмам, больш за іншых, вось яны і сталі з імпэтам распаўсюджваць гэтыя рэчы сярод тых, хто ў нас вучыцца. Скажу табе: не рабі так, бо гэта рэчы розных школ. Рэлігія мае рэлігійныя формы. А мы тут выкладаем частку ўдасканальвання ў нашай школе, якая, за выключэннем прафесійных паслядоўнікаў Фалунь Дафа, не прымае рэлігійных формаў. Таму нашая школа не з'яўляецца будызмам Канцавога перыяду Закону.

Закон будызму з'яўляецца толькі малой часткай Закону Буды. Існуе і шмат іншых высокіх ды глыбокіх Вялікіх Законаў. Ды яшчэ кожны ўзровень мае свае Законы. Шак'ямуні казаў, што існуе 84 000 школаў самаўдасканальвання. У будызме ж налічваецца толькі некалькі школ: Т'еньтай, Хўаень, Дзэн, Чыстая зямля, Тантра і г.д. — вось такія некалькі школ. Гэта не можа лічыцца нават яго невялікай крыхой! Таму Закон будызму не можа абагульняць увесь Закон Буды і з'яўляецца толькі малой яго часткай. Наш Фалунь Дафа таксама з'яўляецца адной з 84 000 школ. Але ён не мае дачынення ані да будызму (ад першаснага будызму да будызму Канцавога перыяду Закону), ані да іншых цяперашніх рэлігіяў.

Будызм быў заснаваны Шак'ямуні 2500 гадоў таму ў Старажытнай Індыі. Пасля таго як у свой час у Шак'ямуні адкрыліся Ґун і ўсведамленне, ён згадаў тое, што ўдасканальваў раней, і распаўсюдзіў гэта для выратавання людзей. Колькі б дзясяткаў тысяч тамоў канонаў ні выйшла ў яго школе, сутнасць іх змяшчаецца толькі ў трох словах — характэрныя рысы яго школы называюцца «Запаведзь, Медытацыя, Мудрасць»[71]. Запаведзь азначае, што трэба адмовіцца ад усіх жаданняў звычайных людзей, цябе прымушаюць пазбавіцца ад імкнення да выгады, парваць з усім свецкім і да таго падобнае. Такім чынам, душа чалавека становіцца пустой, чалавек больш ні пра што не думае, а значыць, здольны ўвайсці ў медытацыю. Тут адно ўзаемна дапаўняе іншае. Пасля таго як увойдзеш у медытацыю, трэба ажыццяўляць шчырае ўдасканальванне, седзячы ў медытацыі, удасканальвацца ўгару за кошт сваёй сілы медытацыі. Гэта і ёсць тая частка, якая складае цяперашняе ўдасканальванне ў гэтай

школе. Яны не вядуць гаворкі пра тэхніку практыкаванняў, не змяняюць свайго цела. Толькі выпрацоўваюць Ґун, які вызначае вышыню ўзроўню. Таму яны толькі і ведаюць, што ўдасканальваць свой Сіньсін. Даўгалецце яны не ўдасканальваюць, а значыць, і не надаюць значэння эвалюцыі Ґун. У той жа час, знаходзячыся ў медытацыі, яны павялічваюць сваю сілу медытацыі; медытуючы, пакутуюць і ліквідуюць сваю карму. Пад Мудрасцю маецца на ўвазе тое, што ў чалавека адкрылася ўсведамленне, і ён дасягнуў вялікае мудрасці. Ён убачыў ісціну Сусвету, убачыў рэальныя карціны кожнае прасторы Сусвету і грандыёзна праяўляе цудатворную сілу. Гэта адкрыццё мудрасці, адкрыццё ўсведамлення альбо, па-іншаму, адкрыццё Ґун.

Калі ў свой час Шак’ямуні заснаваў гэтую школу, у Індыі адначасова распаўсюджвалася восем рэлігіяў. Сярод іх была глыбока ўкаранёная рэлігія, якая называлася брахманізмам. Паміж Шак’ямуні ды іншымі рэлігіямі ўсю рэшту яго жыцця ўвесь час ішла ідэалагічная барацьба. Паколькі тое, што прапагандаваў Шак’ямуні на працягу ўсяго працэсу выкладання Закону, было праведным метадам, дык Закон Буды, які ён прапаведаваў, рабіўся ўсё больш магутным і ўсё больш квітнеў. А іншыя рэлігіі ўсё больш прыходзілі ў заняпад. Нават вышэйзгаданы глыбока ўкаранёны брахманізм быў на мяжы гібелі. Аднак пасля сыходу Шак’ямуні ў нірвану іншыя рэлігіі зноў пачалі набываць папулярнасць, асабліва брахманізм. Ён пачаў зноў квітнець. А што ж усё-такі сталася з будызмам? У некаторых манахаў на розных узроўнях адкрыўся Ґун, адкрылася ўсведамленне, але гэта адбылося на параўнальна нізкіх узроўнях. Шак’ямуні дасягнуў узроўню Татгаґаты, а вялікая колькасць манахаў да гэтага ўзроўню не дайшла.

На розных узроўнях Закон Буды праяўляецца па-рознаму, але чым вышэй, тым бліжэй да Ісціны, а чым ніжэй, тым ад яе далей. Таму тыя манахі, у якіх адкрыліся Ґун і ўсведамленне на нізкіх узроўнях, тлумачылі словы Шак’ямуні з дапамогай убачаных імі з'яў Сусвету на сваім узроўні, абставінаў, пра якія яны даведаліся, і прынцыпаў, якія яны ўсвядомілі. Гэта значыць, некаторыя манахі тлумачылі Закон, які прапаведаваў Шак’ямуні, і так, і гэдак. Былі і такія манахі, якія ў сваіх аповедах падавалі тое, што спасціглі яны самі, як словы Шак’ямуні, а не цытавалі арыгінальныя словы Шак’ямуні. Гэта прывяло да таго, што Закон Буды змяніўся да такое ступені, што яго ўжо немагчыма было пазнаць[72]. Гэта быў ужо зусім не той Закон, які прапаведаваў Шак’ямуні. У выніку ў Індыі ўрэшце з будызму Закон Буды знік. Гэта суровы ўрок гісторыі. Таму пасля ў Індыі, наадварот, не стала будызму. Да свайго знікнення будызм шматкроць зведваў рэформы і нарэшце, змяшаўшыся з рэчамі брахманізму, сфармаваў у Індыі цяперашнюю рэлігію, якая называецца індуізмам. Там пакланяюцца ўжо ніякаму не Буду, а іншым стварэнням, ужо не вераць у Шак’ямуні. Менавіта такі там стан рэчаў.

У ходзе развіцця будызму адбылося некалькі вельмі значных рэформаў. Адна з іх мела месца неўзабаве пасля скону Шак’ямуні. На базе выкладзеных

Шак’ямуні прынцыпаў высокага ўзроўню некаторыя людзі заснавалі будызм Вялікае калясніцы[73]. Лічыцца, што той Закон, які Шак’ямуні прапаведаваў публічна, ён распавядаў звычайным людзям. Той Закон быў прызначаны для таго, каб чалавек вызваліў сябе самога і дабіўся Рангу дасягнення Аргата, а не здзяйсняў выратаванне ўсіх жывых істотаў. Таму яго і называюць будызмам Малое калясніцы[74]. Манахі краін Паўднёва-Усходняй Азіі захавалі арыгінальны метад самаўдасканальвання эпохі Шак’ямуні. У нас у ханьскім рэгіёне[75] яго называюць будызмам Малое калясніцы. Вядома, яны самі такое назвы не прызнаюць і лічаць, што атрымалі ў спадчыну арыгінальныя рэчы Шак’ямуні. Гэта сапраўды так. У асноўным яны атрымалі ў спадчыну метад удасканальвання эпохі Шак’ямуні.

Будызм Вялікае калясніцы, з’яўляючыся вынікам рэформы, пасля пранікнення ў наш Кітай трывала ўсталяваўся ў нашай краіне. Гэта і ёсць распаўсюджаны сёння ў нашай краіне будызм. Фактычна ў параўнанні з будызмам эпохі Шак’ямуні ён ужо абсалютна ва ўсім змяніўся, ад адзення да ўсяго стану спасціжэння і працэсу ўдасканальвання. У першапачатковым будызме пакланяліся толькі Шак’ямуні як вельмішаноўнаму заснавальніку. Аднак у цяперашнім будызме з'явіліся шматлікія Буды, Вялікія Бадгісатвы ды іншыя, прычым ён стаў політэістычнай[76] верай. Узнікла вера ў вельмі многіх Будаў-Татгаґатаў, у выніку чаго ўтварыўся шматбожы будызм. Напрыклад, вера ў Буду Амітабгу, Буду-Ацаляльніка, Татгаґату Вялікага Сонца і г.д., таксама з'явілася шмат Вялікіх Бадгісатваў. Такім чынам, увесь будызм стаў зусім іншым, чым той, які ў свой час заснаваў Шак’ямуні.

У гэты перыяд адбыўся яшчэ іншы працэс рэформы. Бадгісатва Наґарджуна[77] разгаласіў метад эзатэрычнага самаўдасканальвання, які потым з Індыі праз Афганістан патрапіў у наш Сіньдзян[78] і тады пранік у ханьскі рэгіён. У той час якраз была эпоха дынастыі Тан, таму яго назвалі Танскай Тантрай. Наш Кітай зведаў даволі значны ўплыў канфуцыянскае школы, і сваімі ўяўленнямі пра мараль кітайцы адрозніваюцца ад іншых нацыяў. Метад удасканальвання Тантры ўключае ў сябе тое, што прыналежыць да парнага ўдасканальвання мужчыны і жанчыны, што не магло быць прынята тагачасным грамадствам, таму падчас рэпрэсіяў супраць будыстаў у перыяд Хўэйчан[79] танскае эпохі[80] ён быў знішчаны. Тады Танская Тантра і знікла з нашага ханьскага рэгіёну. У Японіі зараз ёсць школа Усходняе Тантры[81], якую ў свой час перанялі менавіта з нашага Кітая. Але яна не прайшла ўлівання энергіі ў макаўку, а паводле таго, што гаворыцца ў Тантры, калі нехта, не прайшоўшы ўлівання ў макаўку, вучыцца таму, што прыналежыць да Тантры, тады гэта крадзеж Закону, і яго не прызнаюць тым, каму асабіста перадаў веды настаўнік. Іншае адгалінаванне з Індыі ды Непала пранікла ў Тыбет і называецца Тыбецкай Тантрай[82]. Яна пастаянна перадавалася да нашых дзён. Вось пераважна такім і з’яўляецца становішча будызму. Я вельмі спрошчана і абагульнена распавёў пра ход яго развіцця ды эвалюцыі. У працэсе развіцця ўсяго будызму яшчэ ўзніклі такія школы як заснаваны Бадгідгармай Дзэн[83], а таксама Чыстая зямля, Хўаень і г.д. Усе яны спасціглі нешта з таго, што ў свой час прапаведаваў Шак’ямуні, і

таксама прыналежаць да рэфармаванага будызму. У будызме больш за дзесяць такіх школ. Яны ўсе набылі рэлігійную форму, таму ўсе прыналежаць да будызму.

Рэлігіі, якія ўзніклі ў гэтым[84] стагоддзі... ды хіба толькі ў гэтым стагоддзі? На працягу некалькіх папярэдніх стагоддзяў па ўсім свеце з'явілася шмат новых рэлігіяў. Большасць з іх прыналежыць да фальшывых. Кожны з Вялікіх Прабуджаных для выратавання людзей мае сваё Нябеснае царства. Шак’ямуні, Буда Амітабга, Татгаґата Вялікага Сонца ды іншыя — кожны з гэтых Будаў-Татгаґатаў для выратавання людзей мае свет, які ён ачольвае. У нашым Млечным Шляху існуе больш за сто такіх светаў. У нашага Фалунь Дафа таксама ёсць свет — Свет Фалунь.

А куды ратуюць людзей фальшывыя школы? Яны не здольныя ратаваць людзей. Тое, што яны прапаведуюць, не з'яўляецца Законам. Вядома, некаторыя з тых, хто заснаваў рэлігію, у пачатковы перыяд не мелі за мэту станавіцца дэманамі, якія руйнуюць праведныя рэлігіі. На розных узроўнях у іх адкрыўся Ґун і адкрылася ўсведамленне, яны ўбачылі малюсенькі прынцып, але гэтым заснавальнікам рэлігіяў было далёка да Прабуджаных, якія выратоўваюць людзей, — іх узровень быў вельмі нізкім. Яны заўважылі некаторыя прынцыпы, выявілі, што некаторыя ўчынкі звычайных людзей хібныя. Таксама гэтыя заснавальнікі рэлігіяў сказалі людзям, як рабіць добрыя ўчынкі. Спачатку яны не выступалі супраць іншых рэлігіяў. Людзі ж урэшце паверылі ў іх, лічачы, што яны маюць рацыю, і значыць, усё больш і больш верылі ў іх, у выніку чаго гэтыя людзі пачалі пакланяцца ім, а не вызнаваць праведныя рэлігіі. А заснавальнікі рэлігіяў, калі ў іх саміх развіліся славалюбства ды карысталюбства, дазволілі людзям надаць ім нейкія рангі. З тых часоў яны заснавалі новую рэлігію. Скажу вам, што ўсе гэтыя рэлігіі прыналежаць да ерасі. Нават калі яны і не шкодзяць людзям, дык усё адно з’яўляюцца ерассю. Бо гэтыя рэлігіі перашкаджаюць людзям вызнаваць праведныя рэлігіі. Праведныя рэлігіі выратоўваюць людзей, чаго яны не ў стане зрабіць. З цягам часу, развіваючыся далей, яны пачалі таемна рабіць дрэнныя рэчы. Зусім нядаўна шмат такіх рэлігіяў пранікла і ў наш Кітай. Адной з іх з'яўляецца, напрыклад, так званая школа Ґуаньінь. Таму, што б там ні было, будзьце пільнымі. Кажуць, што ў нейкай краіне Усходняй Азіі больш за дзве тысячы такіх фальшывых школ. У Паўднёва-Усходняй Азіі ды ў заходніх краінах у што толькі не вераць. У адной краіне адкрыта існуе вядзьмарская рэлігія. Усё гэта дэманы, якія з'явіліся ў Канцавы перыяд Закону. Пад Канцавым перыядам Закону маецца на ўвазе не толькі будызм, а тое, што сапсавалася вельмі шмат прастораў, якія знаходзяцца ніжэй за пэўны вельмі высокі ўзровень. Пад канцом Закону маецца на ўвазе не толькі канец Закону будызму, але і тое, што чалавечае грамадства больш не стрымліваюць духоўныя законы, якія б падтрымлівалі мараль.

## ВА ЎДАСКАНАЛЬВАННІ ТРЭБА ЗАСЯРОДЗІЦЦА НА АДНОЙ ШКОЛЕ

Мы вучым, што ў самаўдасканальванні трэба цалкам засяродзіцца на адной школе. Як бы ты ні ўдасканальваўся, нельга гэта рабіць, прымешваючы іншыя рэчы. Некаторыя свецкія будысты ўдасканальваюцца і па тым, што прыналежыць да будызму, і па тым, што прыналежыць да нашага Фалунь Дафа. Скажу табе, што ты ўрэшце нічога не атрымаеш, ніхто табе нічога не дасць. Таму што, хоць усе мы і прыналежым да Школы Буды, тут існуе праблема Сіньсін і разам з тым праблема поўнага засяроджвання толькі на адной школе. Цела ў цябе толькі адно. Ґун якое школы ў тваім целе ўтвараецца? Як табе яго развіваць[85]? Куды ты патрапіш? Па якой школе ты ўдасканальваешся, туды і патрапіш. Калі ты ўдасканальваешся па Чыстай зямлі, дык патрапіш да Свету Найвышэйшага Шчасця Буды Амітабгі; калі ўдасканальваешся згодна з Будам-Ацаляльнікам, тады — да Глазуравага Свету. У рэлігіі гаворыцца менавіта так. Гэта называецца прынцыпам «толькі адна школа».

Практыка, пра якую мы тут гаворым, сапраўды ўключае ўвесь працэс эвалюцыі Ґун, які праходзіць згодна са сваёй школай удасканальвання. Скажы, куды ты рухаешся?.. Седзячы на двух крэслах[86], ты нічога не дасягнеш. Нельга змешваць не толькі практыку ціґун з удасканальваннем у Буду ў манастыры, але і розныя метады ўдасканальвання, розныя віды ціґун, розныя рэлігіі. Нават калі гэта адна і тая ж рэлігія, усё адно нельга ўдасканальвацца, змяшаўшы разам некалькі яе школаў. Можна выбраць толькі адну школу. Калі ты ўдасканальваешся па Чыстай зямлі, тады толькі па Чыстай зямлі; калі ўдасканальваешся па Тантры, дык толькі па Тантры; калі па Дзэн, дык толькі па Дзэн. Седзячы на двух крэслах, удасканальваючы і тое, і іншае, нічога не атрымаеш. Гэта значыць, у будызме кожны павінен прытрымлівацца прынцыпу «толькі адна школа». Табе забаронена, удасканальваючыся, прымешваць нешта іншае. У будызме гэта таксама практыка, гэта таксама самаўдасканальванне. Усе іх працэсы ўтварэння Ґун праходзяць у адпаведнасці з працэсам удасканальвання ды эвалюцыі ў іх уласнай школе будызму. У іншых прасторах таксама існуе працэс эвалюцыі Ґун. Гэта вельмі шматбаковы, надзвычай цудоўны працэс. З гэтага пункту гледжання таксама нельга, удасканальваючыся, адвольна прымешваць іншае.

Некаторыя свецкія будысты, толькі пачуўшы, што тыя, хто ў нас вучыцца, практыкуюць ціґун Школы Буды, адразу ж цягнуць іх у храм прайсці цырымонію пасвячэння ў будысты. Скажу табе: нікому з прысутных тут нашых удзельнікаў курсаў нельга гэтага рабіць. Ты парушаеш і наш Дафа, і будыйскія запаведзі. Разам з тым ты перашкаджаеш іншым слухачам курсаў. З-за цябе яны нічога не атрымаюць, а гэта нікуды не варта. Самаўдасканальванне — гэта сур'ёзная справа, абавязкова трэба цалкам засяроджвацца на адной школе. Тая частка, якой мы навучаем сярод звычайных людзей, хоць і не з'яўляецца рэлігіяй, але мэта ўдасканальвання аднолькавая з ёй: і тут, і там жадаюць дасягнуць адкрыцця Ґун і адкрыцця ўсведамлення, дамагчыся поспеху і Поўнае Дасканаласці. Вось якая мэта.

Шак'ямуні сказаў, што калі надыдзе Канцавы перыяд Закону, тады манахам манастыроў стане вельмі цяжка выратаваць нават саміх сябе, а пра свецкіх будыстаў годзе і казаць — пра іх тым больш будзе няма каму клапаціцца. Нягледзячы на тое, што ты стаў чыімсьці вучнем, той так званы настаўнік таксама з'яўляецца ўдасканальвальнікам. Калі ён па-сапраўднаму не ўдасканальваецца, тады пасвячэнне з'яўляецца дарэмным. Без выпраўлення сваіх думак ніхто не можа падняцца. Цырымонія пасвячэння ў будысты — гэта проста фармальнасць звычайных людзей. Тое, што ты прайшоў гэтую цырымонію, азначае, што ты цяпер прыналежыш да Школы Буды? І Буда цяпер пра цябе клапоціцца? Гэта не так. Нават калі ты штодня будзеш класці зямныя паклоны і ад гэтага разаб'еш сабе галаву, а таксама пучок за пучком будзеш паліць фіміям, тады ад гэтага ўсё адно не будзе карысці. Табе неабходна сапраўды шчыра выпраўляць свае думкі. Толькі гэта падзейнічае. Калі надышоў Канцавы перыяд Закону, у Сусвеце ўжо адбыліся велізарныя змены. Дайшло нават да таго, што і месцы веравызнання перасталі мець эфект. Тыя, хто мае здольнасці (сярод якіх і манахі), таксама гэта выявілі. Зараз ва ўсім свеце толькі я адзін публічна выкладаю праведны метад. Я зрабіў тое, чаго ніколі не рабілі мае папярэднікі, прычым у Канцавы перыяд Закону я адчыніў настолькі вялікія дзверы. Насамрэч гэта шанец, які не сустрэнеш і за тысячу, і за дзесяць тысяч гадоў. Але ці можна цябе выратаваць, гэта значыць, ці зможаш ты ўдасканальвацца, усё адно будзе залежыць ад цябе. Тое, што я выкладаю, — гэта Ісціна каласальнага Сусвету.

Я не кажу, што ты абавязкова павінен вучыцца майму Фалунь Дафа. Я выкладаю прынцып. Калі ты хочаш удасканальвацца, тады павінен цалкам засяродзіцца на адным. У адваротным выпадку ты наогул не зможаш удасканальвацца. Вядома, калі ты не хочаш удасканальвацца, дык мы больш не будзем умешвацца ў твае справы. Закон выкладаецца для тых, хто шчыра ўдасканальваецца. Таму абавязкова трэба цалкам засяроджвацца на адным. Нельга прымешваць нават канцэпцыяў іншых метадаў практыкі. Я тут не вучу дзеянню канцэпцыяў[87]. У нашым Фалунь Дафа няма аніякае дзеі думак. Таму не дадавайце да яго нічога такога, што прыналежыць да канцэпцыяў. Неадменна звярніце на гэта ўвагу. У асноўным няма дзеі думак. Школа Буды кажа пра Пустату, школа Даа — пра Нішто.

Аднойчы я злучыў свае думкі з думкамі чатырох-пяцёх Вялікіх Прабуджаных і Вялікіх Даосаў вельмі высокага ўзроўню. Каб выказаць, наколькі ўсё ж такі высокага, скажу, што ў вачах звычайных людзей іх узровень проста-такі ашаламляльны. Яны хацелі даведацца, пра што я думаю. Я ўдасканальваўся так шмат гадоў, што калі б іншыя хацелі ведаць мае думкі, дык гэта было б абсалютна немагчыма, чужыя здольнасці зусім не могуць у мяне ўвайсці. Ніхто не можа мяне ведаць і не можа ведаць, пра што я думаю. Яны хацелі ведаць мае думкі. Таму быў такі перыяд, калі, атрымаўшы на гэта маю згоду, яны злучылі мае думкі са сваімі. Пасля злучэння мне стала цяжкавата. Нягледзячы на тое, наколькі мой узровень высокі, або наколькі ён нізкі, паколькі я знаходжуся сярод звычайных людзей, усё яшчэ раблю справу дзеяння, справу

выратавання людзей, дык галава занятая выратаваннем людзей. А да якое ж ступені суцішыліся іх думкі?! Да страшэннае ступені. Калі б так было з адным чалавекам, дык яшчэ было б нічога. Аднак калі чацвёра-пяцёра людзей сядзяць там, супакоіўшыся да такое ступені, што гэта нагадвае ставок са стаялай вадой, на паверхні якога нічога няма... Я хацеў іх адчуць, але не змог. У тыя некалькі дзён на душы ў мяне сапраўды было невыносна. Такое ў мяне было адчуванне. Нашым звычайным людзям немагчыма сабе такое ўявіць, немагчыма адчуць. Гэта было поўнае Нядзеянне, Пустата.

Падчас удасканальвання на вельмі высокім узроўні наогул няма дзеяння канцэпцыяў, бо калі ты знаходзішся на ўзроўні звычайных людзей, на якім закладаюць падмурак, тады там закладанне таго падмурка ўжо завершана. Калі надыходзіць удасканальванне на высокім узроўні, тады, асабліва ў нашым метадзе практыкі, яно з'яўляецца аўтаматычным. Удасканальванне адбываецца цалкам аўтаматычна. Варта табе толькі падвысіць свой Сіньсін, дык ужо расце і твой Ґун. Больш нават не патрэбна, каб ты выконваў нейкія рухі. Нашыя рухі ўзмацняюць аўтаматычныя механізмы. Чаму ж, знаходзячыся ў медытацыі, будыст увесь час сядзіць нерухома? Ён цалкам знаходзіцца ў Нядзеянні. Як ты бачыш, у Школе Даа вучаць і такому, і іншаму руху, нейкім дзеяннем канцэпцыяў ды вядзенню пры дапамозе думак. Скажу табе: пасля таго як у Школе Даа хоць трохі выйдуць з узроўню ці, дык у іх ужо нічога не застанецца, і яны наогул не будуць выкарыстоўваць тую ці іншую канцэпцыю. Таму некаторыя людзі, якія раней рабілі практыкаванні іншых відаў ціґун, увесь час хвалююцца пра нейкія яшчэ ўдыхі ды выдыхі, канцэпцыі і да таго падобнае. Я вучу іх універсітэцкім прадметам, а яны ўвесь час запытваюць мяне пра справы вучняў пачатковае школы: як весці з дапамогай думак, якое павінна быць дзеянне канцэпцыяў. Яны ўжо з такім звыкліся і лічаць ціґун менавіта такім. Насамрэч, гэта не так.

## ЗВЫШЗДОЛЬНАСЦІ ДЫ СІЛА ҐУН

Многія дрэнна знаюцца на тэрміналогіі ціґун, увесь час блытаюць яе. Пад звышздольнасцямі[88] яны маюць на ўвазе сілу Ґун[89], а пад сілай Ґун — звышздольнасці. Ґун, які мы выпрацоўваем шляхам удасканальвання, і які залежыць ад нашага Сіньсін, з'яўляецца тады, калі мы асіміляваліся з уласцівасцю Сусвету, і наш Дэ эвалюцыянуе ў Ґун. Ён і вызначае вышыню ўзроўню чалавека, велічыню яго сілы Ґун і вышыню яго Рангу дасягнення. Гэта найбольш ключавы Ґун. Які стан узнікае ў людзей падчас удасканальвання? Могуць з'яўляцца некаторыя экстрасэнсорныя здольнасці, якія мы скарочана называем проста здольнасцямі. Вышэйзгаданы мной Ґун, прызначаны для падвышэння ўзроўню, называецца сілай Ґун. Чым вышэй узровень, тым больш сіла Ґун, тым больш магутныя здольнасці.

Здольнасці — гэта толькі пабочны прадукт працэсу ўдасканальвання. Яны не адлюстроўваюць узровень, не адлюстроўваюць вышыню ўзроўню чалавека або велічыню яго сілы Ґун. У кагосьці яны праяўляюцца, магчыма, больш, а ў кагосьці — менш. Апроч таго, здольнасці нельга здабыць, калі гнацца за імі як за галоўнай мэтай самаўдасканальвання. Разам з тым абавязкова, каб гэты чалавек цвёрда вырашыў, што будзе шчыра ўдасканальвацца. Толькі тады ў яго могуць праявіцца здольнасці. Аднак нельга ўдасканальвацца, прымаючы іх за галоўную мэту. Для чаго ты хочаш выпрацаваць гэтыя рэчы? Хочаш выкарыстоўваць іх сярод звычайных людзей? Абсалютна нельга дазволіць табе адвольна выкарыстоўваць іх сярод звычайных людзей. Таму, чым больш ты за імі гонішся, тым менш верагодна, што ты іх будзеш мець. Гэта таму, што ты імкнешся, а менавіта імкненне ўжо з’яўляецца навязлівай ідэяй. Ва ўдасканальванні ж навязлівыя ідэі якраз і трэба ўстараняць.

Ёсць вельмі шмат людзей, якія ў працэсе ўдасканальвання дасягнулі вельмі высокіх ды глыбокіх сфераў, але яны не маюць здольнасцяў. Настаўнік ім іх замыкае, баючыся, што яны страцяць над сабой кантроль і зробяць нешта благое, таму ўвесь час не дае гэтым людзям праявіць сваю цудатворную сілу. Такіх людзей неверагодна шмат. Здольнасці кіруюцца чалавечай свядомасцю. Калі чалавек спіць, дык магчыма такое, што ён не ўтрымае сябе ў руках. Калі ён нешта сасніць, хто ведае, магчыма, ранкам наступнага дня «будуць перавернутыя дагары нагамі Неба і Зямля». Вось гэтага і не дазваляюць. Раз гэта самаўдасканальванне сярод звычайных людзей, тады ўсім, хто мае вялікія здольнасці, звычайна забаронена іх выкарыстоўваць. Большасць з іх замкнёная. Але гэта не з'яўляецца абсалютным. Ёсць вельмі шмат людзей, якія няблага ўдасканальваюцца. Тым, хто здольны добра валодаць сабой, дазваляецца мець частку здольнасцяў. Калі ты папросіш такіх людзей узяць ды адвольна паказаць свае здольнасці, яны ні ў якім разе такога не зробяць. Яны ў стане сябе кантраляваць.

## АДВАРОТНАЕ ЎДАСКАНАЛЬВАННЕ І ПАЗЫЧАННЕ ҐУН

Некаторыя людзі раней ніколі не практыкавалі ціґун альбо нейкіх там пару разоў пабывалі на якіх-небудзь курсах ціґун, але ўсё гэта прыналежала да ацалення ды аздараўлення, гэта не было аніякім удасканальваннем. Гэта значыць, гэтыя людзі не атрымалі сапраўднае перадачы. Аднак неяк пасярод ночы ў іх раптам з'явіўся Ґун. Вось мы і пагаворым пра тое, адкуль бярэцца такі Ґун, і пра некалькі формаў, якія гэтая з'ява прымае.

Адна з іх — гэта адваротнае ўдасканальванне. Што такое адваротнае ўдасканальванне? Справа ў тым, што некаторыя з нас — пажылога ўзросту — хочуць удасканальвацца, але зрабіць гэта з самага пачатку ўжо не паспеюць. Падчас ціґунскага буму яны таксама захацелі ўдасканальвацца. Яны ведалі, што ў ціґун можна рабіць дабро іншым і адначасова можна самому дасягнуць

падвышэння. У іх было такое жаданне — яны хацелі падвышацца, хацелі ўдасканальвацца. Аднак у мінулыя гады, калі быў уздым ціґун, усе тыя майстры ціґун працавалі над яго распаўсюдам, але ніхто з іх па-сапраўднаму не вучыў рэчам высокага ўзроўню. Нават да сённяшняга дня толькі я адзін публічна па-сапраўднаму вучу практыцы ціґун на высокім узроўні, другога такога чалавека няма. Усім, хто адваротна ўдасканальваецца, больш за пяцьдзясят гадоў, у іх даволі паважны ўзрост, выдатная маральная аснова, яны маюць у сваім целе вельмі добрыя рэчы, і ледзьве не ўсе з'яўляюцца такімі, каго іншыя хочуць навучаць як вучня, пераемніка. Але гэта людзі пажылыя. Яны захацелі ўдасканальвацца, аднак гэта толькі сказаць лёгка! Дзе ім было знайсці настаўніка? Але як толькі яны захацелі ўдасканальвацца, гэтая думка, ледзь прамільгнуўшы, бліснула, нібы золата, і скаланула дзесяцібаковы Свет. Людзі часта кажуць: «Прырода Буды, прырода Буды». Гэта і азначае, што ў чалавека праявілася згаданая прырода Буды.

З пункту гледжання высокага ўзроўню прызначэнне чалавечага жыцця не ў тым, каб быць чалавекам. Бо чалавечыя істоты нарадзіліся ў Космасе. Яны былі асіміляваныя з уласцівасцю Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Па сваёй прыродзе яны былі добрымі, годнымі. Але з прычыны таго, што істотаў стала шмат, паміж імі ўзніклі своеасаблівыя грамадскія адносіны. Адсюль некаторыя з іх сталі эгаістычнымі або благімі і ўжо не маглі заставацца на вельмі высокіх узроўнях, таму падалі ўніз — на адзін узровень упалі. На тым узроўні яны зноў сталі благімі, зноў падалі, падалі ды ўрэшце ўпалі на ўзровень звычайных людзей. Калі нехта падаў на гэты ўзровень, яго трэба было канчаткова знішчыць. Але Вялікія Прабуджаныя з міласэрнасці вырашылі даць людзям яшчэ адзін шанец у самым пакутлівым асяроддзі і тады стварылі такую прастору.

Ні ў каго з людзей іншых прастораў няма такога цела. Яны могуць плаваць у паветры, а таксама павялічвацца ды памяншацца. А ў гэтай прасторы чалавека змусілі мець такое цела — нашае фізічнае цела. Пасля атрымання гэтага цела чалавек не можа вытрымаць ані холаду, ані спёкі, ані стомы, ані голаду — так ці інакш, яму ўсё адно горка. Захварэўшы, ты пачуваешся блага. Ты праходзіш праз нараджэнне-старасць-хваробы-смерць. Гэта значыць, што цябе змушаюць у гэтых пакутах расплаціцца за карму і глядзяць, ці зможаш ты вярнуцца назад. Табе далі яшчэ адзін шанец. Такім чынам, чалавек упаў у свет зману. Пасля таго як ты сюды патрапіў, табе стварылі гэтыя вочы, якія не даюць табе бачыць іншыя прасторы і не бачаць рэальнага выгляду матэрыі. Калі ты будзеш здольны вярнуцца назад, тады самае балючае стане для цябе самым каштоўным. Калі ў змане ты будзеш удасканальвацца назад, абапіраючыся на сваё ўсведамленне, і будзеш вельмі шмат пакутаваць, дык хутка вернешся назад. Калі ж ты і далей будзеш псавацца, дык цябе, як істоту, знішчаць. Таму з пункту гледжання Прабуджаных, чалавечае жыццё, быць чалавекам — гэта не мэта. Яно прызначана для таго, каб даць табе вярнуцца туды, адкуль ты паходзіш, вярнуцца назад. Звычайныя людзі не могуць гэтага ўсвядоміць і, знаходзячыся ў чалавечым грамадстве, застаюцца звычайнымі людзьмі. Яны

думаюць пра тое, як ім развівацца, як добра жыць. Чым лепш яны жывуць, тым становяцца больш эгаістычнымі, тым больш хочуць мець, тым далей адыходзяць ад уласцівасці Сусвету. Так яны ідуць да згубы.

Вось як гэта бачаць на высокіх узроўнях. Табе здаецца, што ты ідзеш наперад, а насамрэч адыходзіш назад. Чалавецтва лічыць, быццам, развіваючы навуку, прагрэсуе, а фактычна яно не больш чым проста рухаецца па заканамернасцях Сусвету. Джан Ґалаў[90], — адзін з Васьмі несмяротных, ездзіць на асле, седзячы спінай наперад. Вельмі мала хто ведае, чаму ён так робіць. Ён выявіў, што ісці наперад азначае адыходзіць назад, вось ён і пачаў ездзіць, седзячы спінай наперад. Таму, калі хтосьці захоча ўдасканальвацца, Прабуджаныя будуць лічыць гэтую думку вельмі каштоўнай і змогуць безумоўна яму дапамагчы. Гэта як з нашымі слухачамі курсаў, якія сёння тут сядзяць, — калі ты хочаш удасканальвацца, я магу безумоўна табе дапамагчы. Але калі ты, як звычайны чалавек, хочаш вылекавацца, хочаш прасіць таго ці іншага, дык такое ўжо не дазволена, ужо нельга табе дапамагаць. А чаму? Таму што ты хочаш быць звычайным чалавекам, а звычайнаму чалавеку трэба праходзіць праз нараджэнне-старасць-хваробы-смерць. Так і павінна быць. Ва ўсяго ёсць прычынныя сувязі, якія нельга парушаць. Чалавеча, у тваім жыцці першапачаткова не было запланавана самаўдасканальванне. Цяпер ты захацеў удасканальвацца. Такім чынам, неабходна нанова спланаваць твой далейшы шлях. Можна прывесці да ладу і тваё здароўе.

Тады, калі чалавек захацеў удасканальвацца, ледзь у яго з'явілася гэтае жаданне, Прабуджаныя гэта ўбачылі. Яно з’яўляецца проста-такі вельмі каштоўным. Аднак як жа яму дапамагчы? Дзе ў чалавечым свеце знайсці настаўніка, які б яго вучыў? Да таго ж чалавеку ўжо за пяцьдзясят. Вялікім Прабуджаным нельга было яго вучыць. Бо калі б яны ўзніклі перад табой, каб цябе вучыць, прапаведаваць табе Закон і навучаць практыцы ціґун, тады б гэта было разгалашэннем нябесных таямніц, і за гэта нават яны самі ўпалі б уніз. Чалавек сам, нарабіўшы благіх учынкаў, упаў у свет зману, значыць, і павінен удасканальвацца, знаходзячыся ў змане ды абапіраючыся на сваё ўсведамленне. Таму Прабуджаным нельга было яго вучыць. Убачыўшы, што жывы Буда прапаведуе табе Закон ды яшчэ і вучыць практыцы, нават людзі, якія з'яўляюцца ўвасабленнем зла, прыйшлі б навучацца. Усе ў гэта паверылі б. Тады што ж засталося б усведамляць? Ужо б не было праблемы ўсведамлення, бо чалавек сам упаў у свет зману, і яго належала знішчыць. Табе далі шанец, знаходзячыся ў гэтым змане, вярнуцца назад. Можаш вярнуцца — вярніся; не можаш — пераўвасабляйся далей і будзь знішчаны.

Ты сам праходзіш свой уласны шлях. Што рабіць, калі ты захацеў удасканальвацца? Яны прыдумалі спосаб. Тады ж ціґун дасягнуў уздыму. Гэта таксама было гэткім змяненнем астранамічных з'яў. Таму, каб узгадняцца з гэтымі астранамічнымі з'явамі, Прабуджаныя перадавалі чалавеку Ґун прапарцыйна вышыні яго Сіньсін, далучыўшы да яго цела своеасаблівы шланг,

падобны да водаправоднага крана. Пасля таго як яго адкрывалі, Ґун прыходзіў. Калі чалавек хацеў выпраменьваць Ґун, ён прыходзіў. Калі ж ён не выпраменьваў Ґун, тады сам яшчэ яго не меў. Вось які ў яго быў стан. Гэта называецца адваротным удасканальваннем. Чалавек дасягае Поўнае Дасканаласці, удасканаліўшыся зверху ўніз.

Як правіла, мы вядзем самаўдасканальванне знізу ўверх — ажно да адкрыцця Ґун і дасягнення Поўнае Дасканаласці. Адваротнае ж удасканальванне, пра якое вядзецца гаворка, было прызначанае для тых, хто быў пажылым і не паспяваў удасканаліцца знізу ўверх. Таму ўдасканальванне зверху ўніз для іх праходзіла хутчэй. Гэта таксама было з'явай, абумоўленай тым часам. Сіньсін такіх людзей мусіў быць вельмі высокім. Іх забяспечвалі колькасцю энергіі, якая адпавядала вышыні іх Сіньсін. У чым была мэта? Па-першае, узгадняцца з тагачаснымі астранамічнымі з'явамі. Адначасова з ажыццяўленнем добрых спраў чалавек можа і зведаць пакуты. Таму што ён сутыкаецца са звычайнымі людзьмі, і яму перашкаджаюць разнастайныя жаданні звычайных людзей. Некаторыя людзі, калі ты вылекаваў іх ад нейкага захворвання, зусім цябе не разумеюць. Ад якое вялікае колькасці дрэннага ты іх ачысціў падчас лекавання, да якое ступені вылекаваў, неабавязкова, што ў тое ж імгненне праявяцца адчувальныя змены. А вось яны гэтым незадаволеныя і табе зусім не ўдзячныя. Хто ведае, можа, яны нават абвінавацяць цябе ў махлярстве! Вось, завастраючы ўвагу на гэтых праблемах, табе і даюць магчымасць у гэткім асяроддзі загартаваць сваю волю. Мэтай таго, што чалавеку давалі Ґун, было даць яму ўдасканальвацца, падвышацца. Каб адначасова з ажыццяўленнем добрых спраў ён развіў свае здольнасці, вырасціў свой Ґун. Але некаторыя людзі не ведалі гэтай логікі. Хіба я не казаў, што нельга было прапаведаваць ім Закон? Усвядоміў, значыць, усвядоміў. Гэта праблема ўсведамлення. Калі ж не ўсвядоміў, дык няма рады.

Некаторым людзям, калі да іх прыйшоў Ґун, у нейкую ноч раптам стала нясцерпна горача — настолькі, што яны нават не маглі больш ляжаць пад коўдрай. Калі чалавек устаў ранкам, да чаго б ні дакрануўся, б’е токам. Ён зразумеў, што ў яго з'явіўся Ґун. Калі камусьці дзесьці балела, дык варта яму было там толькі пагладзіць, як чалавек пачынаў пачувацца нашмат лепш, вельмі добра. Ён зразумеў, што з гэтага часу да яго прыйшоў Ґун, зрабіў сябе майстрам ціґун, павесіў шыльду і, надаўшы сабе статус майстра ціґун, узяўся за справу. Паколькі гэта быў чалавек неблагі, спачатку, калі ён вылекваў іншых, а тыя за гэта давалі яму грошы, дарылі рэчы, дык ён, магчыма, не браў, адмаўляўся. Але, паколькі ён быў не ў стане супраціўляцца забруджванню ад вялікага фарбавальнага чана звычайных людзей, яму было вельмі цяжка ўтрымаць свой Сіньсін, бо такія людзі, якія адваротна ўдасканальваліся, не праходзілі сапраўднага ўдасканальвання Сіньсін. Патроху ён пачаў прымаць маленькія сувеніры. Паступова стаў браць і вялікія прадметы. А ўрэшце гэты чалавек пачаў крыўдзіцца, калі яму давалі мала. Урэшце ён ужо казаў: «Навошта ты прынес мне столькі рэчаў, давай грошы!» Калі ж грошай давалі мала, гэты чалавек таксама вельмі злаваўся. Нават майстроў ціґун прамое

перадачы ў спадчыну ён ужо не прызнаваў і жадаў слухаць толькі тое, як людзі расхвальваюць яго выдатнае ўменне. Калі хтосьці казаў пра яго нешта дрэннае, ён таксама злаваўся. У гэтага чалавека ў поўнай меры развіліся славалюбства ды карысталюбства. Ён пачаў лічыць сябе выбітнейшым за іншых, лічыць сябе надзвычайным. Ён вырашыў, што яму далі Ґун для таго, каб ён стаў майстрам ціґун, вельмі разбагацеў, а насамрэч гэта было зроблена, каб даць гэтаму чалавеку магчымасць удасканальвацца. Як толькі ў яго ўзніклі славалюбства ды карысталюбства, дык, па сутнасці, яго Сіньсін ужо ўпаў.

Як я ўжо казаў, якая вышыня Сіньсін чалавека, такая і вышыня яго Ґун. Калі ў гэтага чалавека ўпаў Сіньсін, тады, у сваю чаргу, больш нельга было даваць яму такі вялікі Ґун. Трэба было даваць адпаведна з яго Сіньсін, бо якая вышыня Сіньсін, такая і вышыня Ґун. Чым больш у яго станавілася славалюбства ды карысталюбства, тым больш адчувальна ён падаў сярод звычайных людзей, разам з гэтым падаў і яго Ґун. Калі ўрэшце ён упаў цалкам, даваць Ґун яму перасталі — аніякага Ґун у яго больш не засталося. У мінулыя гады з'явілася нямала такіх людзей. Даволі часта гэта былі жанчыны, якім было за пяцьдзясят. Такая пажылая спадарыня, як ты бачыш, рабіла практыкаванні ціґун, не атрымаўшы аніякае сапраўднае перадачы. Магчыма, яна на нейкіх курсах ціґун навучылася некалькім рухам для ацалення ды аздараўлення. І тут аднойчы да яе раптам прыйшоў Ґун. А калі ж яе Сіньсін сапсаваўся, і развіліся славалюбства ды карысталюбства, тады яна ўпала і ў выніку цяпер стала нікім, і Ґун у яе знік. Зараз вельмі шмат такіх, хто адваротна ўдасканальваўся ды ўпаў. Тых, хто застаўся, можна па пальцах пералічыць. Чаму ж так? Жанчына не ведала, што гэта было для таго, каб даць ёй магчымасць удасканальвацца. Яна падумала, што гэта для таго, каб даць ёй узбагаціцца сярод звычайных людзей, праславіцца ды стаць майстрам ціґун. Насамрэч гэта было зроблена, каб даць ёй самаўдасканальвацца.

Што такое пазычанне Ґун? У гэтым выпадку не было ўзроставых абмежаванняў, але было адно патрабаванне, а менавіта: гэта мусіў быць чалавек з выключна добрым Сіньсін. Ён ведаў, што з дапамогай ціґун можна ўдасканальвацца. Ён і хацеў удасканальвацца. У яго ўзнікла такое жаданне. Але дзе ж яму было знайсці сабе настаўніка? У мінулыя гады насамрэч былі сапраўдныя майстры, якія навучалі ціґун. Але ўсё тое, чаму яны вучылі, прыналежала да ацалення ды аздараўлення. Ніхто не навучаў на высокім узроўні. Іншыя гэтаму не навучаюць.

Завёўшы гаворку пра пазычанне Ґун, я раскрыю яшчэ адну тэму. У чалавека, акрамя яго галоўнае душы (галоўнае свядомасці), таксама існуюць дапаможныя душы (дапаможныя свядомасці). У некаторых людзей ёсць адна, дзве, тры, чатыры дапаможныя душы, а бывае, што і пяць. Такія дапаможныя душы не абавязкова аднолькавага з чалавекам полу: адны — мужчынскія, іншыя — жаночыя, ва ўсіх па-рознаму. Насамрэч галоўная душа таксама не абавязкова аднолькавага з фізічным целам полу, бо мы выявілі, што цяпер у надзвычай вялікай колькасці мужчын жаночая душа, а ў надзвычай вялікай колькасці

жанчын — мужчынская. Гэта дакладна адпавядае цяперашняй з'яве, якую апісвае Школа Даа, калі інь і ян перавярнуліся, і якая характарызуецца росквітам інь ды заняпадам ян.

Часта чалавечая дапаможная душа паходзіць з больш высокага чым галоўная душа ўзроўню. У прыватнасці, што тычыцца некаторых людзей, іх дапаможныя душы паходзяць з неверагодна высокіх узроўняў. Дапаможная душа — гэта ні ў якім разе не нячысты дух[91]. Яна адначасова з табой нарадзілася з улоння маці, мае з табой адно імя, з'яўляецца часткай твайго цела. Звычайна, калі людзі думаюць пра нешта, штосьці робяць, тады вырашальнае слова за галоўнай душой. Дапаможная душа пераважна адыгрывае ролю стрымлівання галоўнае душы, каб тая, наколькі толькі магчыма, не здзяйсняла благіх учынкаў. Але калі галоўная душа ў нечым вельмі ўпартая, тады дапаможная не дае рады. Дапаможная душа не зведвае зман грамадства звычайных людзей, а галоўная душа схільная зведваць яго зман.

Некаторыя дапаможныя душы паходзяць з вельмі высокіх узроўняў. Ім, магчыма, толькі крыху не хапае да Паўнапраўнага дасягнення. Дапаможная душа жадае ўдасканальвацца. Але калі галоўная душа гэтага не хоча, тады няма рады. І вось аднойчы ў час уздыму ціґун галоўная душа таксама захацела вучыцца ціґун ды ўдасканальвацца на высокія ўзроўні. Вядома, гэтая думка была вельмі простая, чалавек зусім не хацеў гнацца за такімі рэчамі, як рэпутацыя ды грошы. Як жа ўсцешылася дапаможная душа: я хачу ўдасканальвацца, ды не маю вырашальнага слова; ты захацеў удасканальвацца, і гэта акурат супадае з маім жаданнем. Але дзе знайсці настаўніка? Дапаможная душа мае вялікія ўменні — яна пакінула цела, каб звярнуцца да Вялікіх Прабуджаных, з якімі была знаёмая да нараджэння. Паколькі ўзровень некаторых дапаможных душ вельмі высокі, яны могуць пакідаць цела. Там яна кажа, што хоча ўдасканальвацца і хоча пазычыць Ґун. Прабуджаныя паглядзелі — чалавек неблагі. Хоча ўдасканальвацца — вядома, яны дапамогуць! Так дапаможная душа пазычыла Ґун. Часта такі Ґун мае рассеяную энергію і транспартуецца праз трубу; трапляецца і такое, калі пазычаюць ужо сфармаваныя рэчы, якія часта ідуць разам са здольнасцямі.

Такім чынам, чалавек разам з гэтым мог здабыць здольнасці. Яму таксама, як я толькі што распавядаў, уначы ў сне станавілася нясцерпна горача, а калі ранкам наступнага дня чалавек прачынаўся, тады да яго прыходзіў Ґун. Да чаго б ён ні дакранаўся, б'е токам. Ён стаў здольны лекаваць іншых. Сам чалавек таксама ведаў, што прыйшоў Ґун. Адкуль ён узяўся? Гэта яму было незразумела. У агульных рысах ён ведаў, што Ґун прыйшоў з космасу, а адкуль канкрэтна, не ведаў. Дапаможная душа яму пра гэта не распавядала, бо гэта ўдасканальвалася дапаможная душа. Чалавек ведаў толькі, што прыйшоў Ґун.

Часта для пазычальнікаў Ґун не было ўзроставых абмежаванняў — сярод іх было даволі шмат маладых людзей. Таму ў мінулыя гады былі такія, каму за

дваццаць, за трыццаць, за сорак, а былі і пажылыя. Маладыя людзі тым больш не могуць валодаць сабой. Як бачыце, у звычайных умовах яны былі вельмі добрымі. Калі ў іх не было аніякага ўмення ў грамадстве звычайных людзей, тады славалюбства ды карысталюбства ў іх былі вельмі слабыя. Калі ж адбывалася так, што яны пачыналі на галаву перавышаць іншых, тады часта гэтыя людзі былі схільныя зведваць перашкоды ад славы ды выгады. Ім здавалася, што іх яшчэ чакае вельмі доўгі жыццёвы шлях, і яны яшчэ хацелі паклапаціцца, пазмагацца і дасягнуць нейкае мэты звычайнага чалавека. Таму, калі аднойчы ў гэтых людзей праяўляліся здольнасці, калі яны здабывалі ўменне, тады часта ставіліся да яго як да сродку дасягнення асабістых мэтаў у грамадстве звычайных людзей. Тады гэта ўжо было непрымальным, гэта значыць забаронена было так выкарыстоўваць пазычанае. Чым больш яны выкарыстоўвалі Ґун, тым менш яго станавілася, і ўрэшце нічога не засталося. Такіх людзей упала яшчэ больш. Як я бачу, зараз з іх не засталося аніводнага.

Выпадкі двух відаў, якія я толькі што апісаў, прыналежаць да таго, калі Ґун атрымлівалі людзі з даволі добрым Сіньсін. Гэты Ґун яны не выпрацавалі самі шляхам практыкі, а атрымалі ад Прабуджаных, таму сам Ґун быў добрым.

## АПАНТАНАСЦЬ НЯЧЫСТЫМ ДУХАМ

Многія з нас, магчыма, чулі ў колах удасканальвальнікаў пра апантанасць духамі жывёлаў: лісы, тхара, вожыка, змяі ды іншых падобных істот. У чым жа тут усё-ткі справа? Па словах некаторых людзей, практыкаванні ціґун развіваюць у чалавека экстрасэнсорныя здольнасці. Насамрэч гэта не так. Тыя экстрасэнсорныя здольнасці — гэта не што іншае, як чалавечыя прыроджаныя здольнасці. Проста ўслед за прасоўваннем наперад чалавечага грамадства людзі ўсё больш засяроджвалі сваю ўвагу на бачных ды адчувальных прадметах нашае матэрыяльнае прасторы, усё больш спадзяваліся на нашыя сучасныя інструменты, таму чалавечыя прыроджаныя здольнасці ўсё больш дэградавалі. Урэшце гэта прывяло да поўнага іх знікнення.

Калі хочаце мець здольнасці, тады трэба прайсці шлях удасканальвання, вярнуцца да свайго першапачатковага выгляду. Выпрацаваць іх самаўдасканальваннем. А ў жывёлаў няма такіх складаных думак, таму яны злучаныя з уласцівасцю Сусвету, у іх ёсць прыроджаныя здольнасці. Некаторыя людзі кажуць, што жывёлы ўмеюць удасканальвацца, што ліса можа выпрацаваць дань, што змяя ды іншыя жывёлы ўмеюць удасканальвацца. Не тое, каб яны ўмелі. Спачатку яны наогул не разумелі, што гэта такое — тая практыка. Яны проста мелі прыроджаныя здольнасці. Такім чынам, у асаблівых умовах, у асаблівых абставінах з цягам часу, магчыма, і праявіліся эфекты — яны змаглі атрымаць Ґун, і ў іх маглі ўзнікнуць здольнасці.

Такім чынам, яны здабылі ўменне, як у нас раней казалі, здабылі звышнатуральную сілу, атрымалі ўменне. У вачах звычайных людзей жывёлы такія лютыя і могуць лёгка кантраляваць людзей. А я сказаў бы, што насамрэч яны не магутныя. Для сапраўднага ўдасканальвальніка яны — ніхто. Хоць яны і ўдасканальваліся каля тысячы гадоў, але, каб раздушыць іх, нават аднаго мезенца ўжо больш чым дастаткова. Мы кажам, што ў жывёлаў ёсць прыроджаныя здольнасці, і што яны могуць мець уменне. Аднак у нашым Сусвеце існуе і такі прынцып: не даваць жывёлам паспяхова завершыць удасканальванне. Таму, як вы маглі прачытаць у старажытных кнігах, іх трэба забіваць у вялікай ці малой катастрофе раз у некалькі стагоддзяў. Па дасягненні пэўнага моманту ў жывёлаў вырастае Ґун, вось іх і трэба знішчаць — паражаць громам і гэтак далей. Ім забаронена ўдасканальвацца. Бо жывёлы не маюць чалавечае прыроды. Ім нельга ўдасканальвацца, як людзям. Яны не маюць чалавечых асаблівасцяў. Калі жывёлы завершаць удасканальванне, дык гарантавана стануць дэманамі. Вось ім і не даюць яго завершыць. Таму Неба іх забівае. Самім жывёлам гэта таксама вядома. Але, як я ўжо казаў, чалавечае грамадства зараз перажывае рэзкі заняпад. Некаторыя людзі здзяйсняюць усялякае зло. Калі ўсё дайшло да такога стану, тады хіба не знаходзіцца чалавечае грамадства ў небяспецы?

Усё, дасягнуўшы крайняга пункта, абавязкова ідзе ў адваротны бок! Мы выявілі, што кожны раз у дагістарычныя часы, калі чалавечае грамадства ў розных цыклах знішчалі, гэта заўсёды адбывалася тады, калі яно знаходзілася ва ўмовах крайняе маральнае сапсаванасці. Зараз прастора, у якой існуе нашае чалавецтва, ды шмат іншых прастораў знаходзяцца ў сітуацыі крайняе небяспекі. Такая ж справа і з іншымі прасторамі на гэтым узроўні. Жывёлы таксама хочуць неадкладна ўцячы ад небяспекі, яны таксама хочуць падняцца на высокія ўзроўні. Яны думаюць, што могуць уцячы, падвысіўшы свой узровень. Але гэта лёгка толькі на словах, ці не так? Калі хочаш удасканальвацца, дык павінен мець чалавечае цела. Такім чынам, гэта і з'яўляецца адной з прычын узнікнення ў ціґуніста апантанасці нячыстым духам.

Нехта падумаў: чаму ж ёсць столькі Вялікіх Прабуджаных, ёсць столькі настаўнікаў з высокім ґунфу[92], і ўсе яны не ўмешваюцца? У нашым Сусвеце існуе і такі прынцып: калі ты сам да чагосьці імкнешся, калі нечага хочаш, тады іншыя не будуць у гэта ўмешвацца. Мы тут вучым вас, як ісці праведным шляхам. Адначасова мы вычарпальна тлумачым табе Закон і даем табе магчымасць яго ўсвядоміць. Вучыцца ці не — гэта твая ўласная справа. «Настаўнік заводзіць чалавека ў дзверы[93], а ўдасканальванне залежыць ад яго самога». Ніхто цябе не змушае, не прымушае ўдасканальвацца. Рабіць гэта ці не — твая ўласная справа. Гэта значыць, якім шляхам ты хочаш ісці, чаго ты хочаш, што хочаш атрымаць, — ва ўсё гэта ніхто не будзе ўмешвацца. Можна толькі заахвочваць цябе да дабра.

Некаторыя людзі — хоць ты бачыш, што яны робяць практыкаванні ціґун, — насамрэч усё аддаюць нячыстаму духу. Чаму яны прывабілі да сябе нячысты дух? Колькі ціґуністаў у кожным кутку па ўсёй краіне, ззаду якіх ёсць нячысты дух? Калі пра гэта распавесці, дык вельмі многія не адважацца займацца ціґун. Якая гэта жахлівая лічба! Дык чаму ж узнікла такое становішча? Гэтыя істоты руйнуюць грамадства звычайных людзей, як жа магла ўзнікнуць настолькі небяспечная з'ява? Менавіта чалавецтва яе і наклікала. Бо чалавецтва дэгенеруе. Усюды дэманы. У прыватнасці, усе фальшывыя майстры ціґун апантаныя нячыстым духам. А навучанне імі ціґун — гэта не што іншае, як заражэнне людзей гэтымі стварэннямі. У гісторыі чалавецтва заўсёды было забаронена, каб жывёлы ўсяляліся ў чалавечае цела. Калі такое здаралася, іх забівалі. Любы, убачыўшы гэта, не дазволіў бы такога. Але ў нашым сённяшнім грамадстве ёсць такія, якія іх просяць, іх запрашаюць, ім пакланяюцца. Некаторыя падумалі: не было такога, каб я яе прама папрасіў! Ты яе не прасіў, але ты імкнуўся здабыць здольнасці. Хіба маглі табе гэта даць Прабуджаныя праведнага метаду ўдасканальвання? Імкненне — гэта навязлівая ідэя звычайных людзей. Такую ідэю трэба ўстараніць. Тады хто ж табе мог гэта даць? Толькі дэманы з іншых прастораў ды розныя жывёлы. Гэта раўназначна таму, што ты іх папрасіў. Вось яны і прыйшлі.

Колькі ёсць такіх, якія займаюцца практыкаваннямі ціґун з правільнымі думкамі? Практыкуючы ціґун, трэба надаваць вялікае значэнне маралі, трэба рабіць добрыя ўчынкі, рабіць дабро, усюды і заўсёды прад’яўляць да сябе такія патрабаванні. А з тых, хто выконвае практыкаванні ціґун у парках альбо дома, колькі людзей так думае? Нехта, нават не ведаючы, якім ціґун ён займаецца, выконвае практыкаванні ды пахістваецца, а яшчэ і балбоча: «А! У гэтай нявесткі няма да мяне аніякае павагі»; «Чаму мая свякроў такая благая?!» А хтосьці балбоча пра рэчы пачынаючы ад працы на прадпрыемстве і да падзеяў дзяржаўнага маштабу — няма такога, пра што б ён не балбатаў. А калі яно не адпавядае яго асабістым уяўленням, ён яшчэ і страшэнна закіпае. Вось скажыце, хіба гэта практыка? Ёсць і такі, у якога, калі ён стаіць у паставе слупа і выконвае практыкаванні, ад стомы дрыжаць ногі, але мозг не сціхае: «Цяпер усё стала такім дарагім! Цэны выраслі. Нашае прадпрыемства ўжо не ў стане выплачваць нам зарплату. Чаму я ніяк не магу выпрацаваць здольнасці? Калі б я іх выпрацаваў, тады стаў бы майстрам ціґун, разбагацеў бы — лекуючы іншых, я зарабляў бы сабе грошы». Калі ён убачыў, што ў іншых людзей праявіліся здольнасці, тады стаў яшчэ больш раздражнёным. Ён толькі і ведае, што гнацца за здабыццём здольнасцяў, гнацца за адкрыццём нябеснага вока, гнацца за магчымасцю лекаваць. Задумайцеся: наколькі гэта ўсё далёка ад уласцівасці Сусвету, ад Ісціны-Дабрыні-Цярпення! Гэта яе поўнае парушэнне. Калі сказаць больш сурова, такі чалавек займаецца па няправедным метадзе! Аднак ён робіць гэта несвядома. Чым больш ён так думае, тым горшыя думкі дасылае. Гэты чалавек не авалодаў Законам, не ведае, што трэба надаваць значэнне маралі. Ён лічыць, нібыта, займаючыся ціґун, з дапамогай цялесных рухаў можна выпрацаваць Ґун, што таго, што ён хоча, можна дамагчыся гонячыся за гэтым. Вось як ён думае.

Менавіта праз уласныя няправільныя думкі чалавек і прывабіў да сябе благое стварэнне. Жывёла ўбачыла: «Гэты чалавек хоча шляхам практыкаванняў ціґун разбагацець; той хоча праславіцца, хоча здабыць здольнасці. Вось дык штука! А цела ў чалавека неблагое, рэчы, якія ён мае, таксама выдатныя. Але вельмі дрэнныя думкі — ён гоніцца за набыццём здольнасцяў! Магчыма, у яго ёсць настаўнік. Зрэшты, нават калі і так, я ўсё адно не баюся». Жывёла ведае, што настаўнік праведнага метаду ўдасканальвання бачыць, што чалавек так гоніцца за здольнасцямі. Аднак чым больш зацята ён за імі гоніцца, тым больш верагодна, што настаўнік не дасць яму здольнасцяў, бо гэта і з'яўляецца навязлівай ідэяй, якую настаўніку трэба дапамагчы яму ўстараніць. Чым больш у чалавека такіх думак, тым менш верагоднасць таго, што яму дадуць здольнасці, тым цяжэй яму гэта ўсвядоміць. Чым больш зацята чалавек за імі гоніцца, тым яго думкі становяцца горш. Урэшце настаўнік, убачыўшы, што гэтаму чалавеку канец, цяжка ўздыхнуў ды перастаў звяртаць на яго ўвагу. У некаторых людзей няма настаўніка, але могуць быць настаўнікі-мінакі, якія патроху пра іх клапоцяцца. Бо ў кожнай прасторы шмат Прабуджаных. Прабуджаны ўбачыў чалавека. Паназіраўшы за ім і пабыўшы з ім цэлы дзень, ён заўважыў, што той нікуды не варты, і сышоў. На наступны дзень прыйшоў іншы, пацікавіўся гэтым чалавекам і, убачыўшы, што ён благі, таксама сышоў.

Жывёла ведае: як бы там ні было — у чалавека ёсць настаўнік, альбо ў яго ёсць настаўнік-мінак, — а настаўнік не можа даць яму тое, за чым ён гоніцца. Паколькі жывёла не бачыць прастораў, дзе знаходзяцца Вялікія Прабуджаныя, дык яна і не баіцца. Яна знайшла сабе пралаз. У нашым Сусвеце ёсць прынцып: калі нехта сам за чымсьці гоніцца, сам чаго-небудзь хоча, тады пры звычайных абставінах іншым нельга ў гэта ўмешвацца. Жывёла скарысталася такім пралазам: «Раз чалавек хоча, дык я гэта яму дам. Калі я яму дапамагу, тады ў гэтым жа няма нічога благога, ці не так?» Вось жывёла і дае. Спачатку яна не вырашаецца ўсяліцца ў чалавека і спярша дае яму трохі Ґун для пробы. Аднойчы дзякуючы прагнаму імкненню да чалавека раптам сапраўды прыйшоў Ґун, і ён змог кагосьці ацаліць. Жывёла ўбачыла, што ўсё прайшло выдатна, нібыта была выканана прэлюдыя музычнага твора: «Калі чалавек ахвотна ўсё прымае, тады, мабыць, я ўсялюся ў яго і тады змагу даваць шмат, і рабіць гэта мне стане больш зручна. Хочаш нябеснае вока? На гэты раз я дам табе ўсё». І яна ўсялілася.

У сваіх думках чалавек гоніцца за гэтымі рэчамі, і менавіта ў гэты момант у яго адкрываецца нябеснае вока, ён здабывае здольнасць выпраменьваць Ґун, а таксама да яго прыходзяць дробныя здольнасці. Чалавек вельмі ўсцешыўся! Ён вырашыў, што нарэшце дамогся гэтых рэчаў, што выпрацаваў іх практыкаваннямі. Насамрэч гэты чалавек нічога не выпрацаваў. Яму падаецца, што ён ужо здольны прасвечваць чалавечае цела, бачыць, дзе ў целе чалавека хворае месца. Насамрэч яго нябеснае вока зусім не адкрылася. Гэта жывёла падпарадкавала сабе яго мозг. Жывёла адлюстроўвае ў мозгу чалавека тое, што бачыць на свае вочы. Чалавек жа лічыць, што ў яго самога адкрылася нябеснае вока. «Хочаш выпраменьваць Ґун? Калі ласка — выпраменьвай».

Калі ён працягвае рукі, каб выпраменьваць Ґун, маленькія лапкі жывёлы таксама выцягваюцца з-за яго спіны; толькі чалавек пачынае выпускаць Ґун, як з галавы змейкі высоўваецца язык, і яна сваім языком палізвае пацыенту хворае месца або месца, дзе вырасла пухліна. Гэта неймаверна распаўсюджаная рэч. Усе гэтыя людзі наклікáюць на сябе апантанасць нячыстым духам самі сваімі імкненнямі.

Чалавек жа гнаўся за гэтымі рэчамі, хацеў разбагацець, хацеў праславіцца. Што ж, ён здабыў здольнасці, ужо ў стане лекаваць, а таксама можа бачыць нябесным вокам. Вось ён і ўсцешыўся. Жывёла гэта ўбачыла: «Хочаш разбагацець? Добра, я дам табе разбагацець». Кіраваць мозгам звычайнага чалавека — гэта ж самая простая справа. Жывёла здольная кіраваць вельмі многімі людзьмі, каб яны звярталіся да гэтага чалавека з просьбай вылекаваць, каб іх прыходзіла вельмі шмат. Нічога сабе! Чалавек тут прымае хворых, а жывёла там адпраўляе журналістаў рэкламаваць яго ў газетах. Яна кіруе звычайнымі людзьмі, каб яны так рабілі. Калі хто-небудзь з пацыентаў дае мала грошай, тады жывёла зусім яму гэтага не дазволіць — яна выкліча ў яго галаўны боль. Так ці інакш, але ты мусіш плаціць шмат грошай. І вось чалавек дамогся і славы, і выгады — і ўзбагаціўся, і ўславіўся, і стаў майстрам ціґун. Часта такія людзі не надаюць значэння Сіньсін і гатовыя сказаць што заўгодна — яны па рангу на другім месцы пасля Неба. Яны вырашаюцца казаць, што яны Царыца-маці[94] або Нефрытавы імператар[95], якія сышлі ў марны свет, яны нават наважваюцца называць сябе Будамі. Паколькі такія людзі не прайшлі сапраўднага ўдасканальвання Сіньсін, значыць, робячы практыкаванні ціґун, гоняцца за здабыццём здольнасцяў і ў выніку прыцягваюць да сябе жывёлаў-нячысцікаў.

Нехта з вас, магчыма, падумаў: «Што ў гэтым благога? Прынамсі можна зарабіць грошай, разбагацець, і тое добра. Таксама можна стаць знакамітым». Нямала людзей так думае. Скажу вам: насамрэч жывёла мае сваю мэту, яна дае табе нешта не без дай прычыны. У Сусвеце ёсць прынцып, які называецца «хто не страціць, той не атрымае». Што атрымлівае жывёла? Хіба я толькі што не закранаў гэтае пытанне? Яна жадае атрымаць квінтэсенцыю твайго цела, каб, удасканаліўшыся, набыць чалавечую знешнасць, вось і збірае яе з чалавечага цела. А квінтэсенцыя чалавечага цела толькі адна. Калі хочаш удасканальвацца, тады ёсць толькі адна такая рэч. Калі ты дасі жывёле гэта забраць, тады больш і не думай пра самаўдасканальванне. Пра якое яшчэ ўдасканальванне табе можна будзе весці гаворку? Калі ў цябе нічога не застанецца, ты наогул не зможаш удасканальвацца. Нехта, магчыма, скажа: «А я і не хачу ўдасканальвацца, я толькі хачу разбагацець. Былі б грошы, і добра. Мне абыякава!» Скажу наступнае. Ты хочаш разбагацець, і я распавяду табе сутнасць гэтага, і ты больш так не будзеш меркаваць. Чаму? Калі жывёла пакіне тваё цела раней, тады ў цябе ўсе канечнасці стануць нямоглымі. З таго часу так будзе на працягу ўсяго твайго жыцця. Гэта таму, што яна забрала ў цябе зашмат чалавечае квінтэсенцыі. Калі жывёла пакіне тваё цела пазней, ты акажашся ў вегетатыўным стане — усё астатняе жыццё будзеш толькі дыхаць,

лежачы ў ложку. У цябе будуць грошы, але ці зможаш ты іх траціць? У цябе будзе слава, але ці зможаш ты насалоджвацца ёй? Хіба гэта не страшна?

Такія рэчы надзвычай прыкметныя і шматлікія сярод цяперашніх ціґуністаў. Жывёла не толькі ўсяляецца ў чалавека, а і забівае яго душу. Яна пралазіць у палац нівань[96] чалавека ды сядзіць там на кукішках. На выгляд такі ціґуніст — чалавек, але гэта не чалавек. Цяпер з'явілася нават такое. Таму што змяніўся ўзровень маралі ўсяго чалавецтва. Калі нехта здзяйсняе благі ўчынак, і ты яму пра гэта скажаш, дык ён нават не паверыць. Ён лічыць, што зарабляць грошы, гнацца за грашыма, багаццем — гэта ўжо стала бясспрэчнай ісцінай, што гэта правільна. Таму ён крыўдзіць іншых, шкодзіць іншым, няма такога зла, якое б ён не здзейсніў дзеля грошай, — ён гатовы на ўсё. Калі жывёла не страціць, тады і не атрымае. Хіба можа яна без дай прычыны нешта табе даць? Яна хоча здабыць нешта з твайго цела. Вядома, як мы ўжо казалі, гэта людзі наклікáюць на сябе непрыемнасці з-за сваіх няправільных уяўленняў, няправільных думак.

Пагаворым пра Фалунь Дафа. Калі ты ўдасканальваешся па нашай школе, тады дастаткова толькі, каб ты ўтрымаў свой Сіньсін, і тады «адна праведнасць пераможа сотню дэманаў», і ў цябе не ўзнікне аніякіх праблем. Калі ты не ўтрымаеш Сіньсін і пачнеш гнацца за адным, гнацца за іншым, тады бясспрэчна наклічаш на сябе непрыемнасці. Некаторыя з вас ніяк не могуць адкінуць тое, што адносіцца да ціґун, якім яны займаліся раней. Мы вучым, што ў практыцы патрэбна цалкам засяроджвацца на адным, у сапраўдным удасканальванні трэба засяроджвацца на адным. Нягледзячы на тое, што некаторыя майстры ціґун напісалі кнігі, скажу: у тых кнігах ёсць усё, што толькі заўгодна, аднолькавае са стварэннямі з іх практыкаванняў — змеі, лісы, тхары. Калі чытаеш такія кнігі, гэтыя стварэнні выскокваюць са слоў навонкі. Як я ўжо казаў, колькасць фальшывых майстроў ціґун шматкроць перавышае колькасць сапраўдных. Ты не зможаш іх дакладна адрозніць, таму кожны абавязкова павінен сябе кантраляваць. Я тут не імкнуся прымусіць цябе ўдасканальвацца абавязкова па Фалунь Дафа. Па якой бы школе ты ні ўдасканальваўся, усё гадзіцца. І ў мінулым была прымаўка: «Няхай нават за тысячу гадоў я не знайду праведнага метаду, але нават і аднаго дня не буду ўдасканальвацца ў лісінай медытацыі[97]». Таму неадменна трымайце сябе ў руках ды шчыра ўдасканальвайцеся па праведным метадзе. Удасканальваючыся, нічога не прымешвайце. Нельга дадаваць нават думак. Фалунь у некаторых людзей ажно дэфармаваўся. Чаму дэфармаваўся? Яны кажуць, што не выконвалі практыкаванні іншага ціґун. Але як толькі яны пачынаюць рабіць практыкаванні, дык дадаюць мінулыя канцэпцыі. Хіба гэта не азначае, што яны гэта ўносяць? Датычна праблемы апантанасці нячыстым духам на гэтым усё.

**«КАСМІЧНАЯ МОВА»**

Што такое касмічная мова? Гэта калі чалавек раптам можа гаварыць на нейкай дзівачнай мове, лапатаць. Яны і самі не ведаюць, што кажуць. Тыя, хто мае здольнасць ведаць чужыя думкі, могуць разумець гэта ў агульных рысах, але пра што канкрэтна ідзе гаворка, усё ж не могуць зразумець. Ды яшчэ некаторыя людзі могуць размаўляць на многіх такіх розных мовах. Некаторым гэта нават здаецца вельмі ўзрушальным, яны думаюць, што гэта ўменне, здольнасць. Гэта не здольнасць, не ўменне ўдасканальвальніка. І гэта не адлюстроўвае твой узровень. Тады што ж гэта такое? Справа ў тым, што тваё мысленне трапіла пад кантроль духа, які прыйшоў звонку. А табе гэта яшчэ і здаецца цудоўным, ты з радасцю яго прымаеш, ты ўсцешыўся. Чым больш ты радуешся, тым мацней ён над табой пануе. Ты, як сапраўдны ўдасканальвальнік, хіба можаш дазволіць, каб ён табой валодаў? І ў дадатак да гэтага такія духі прыходзяць з вельмі нізкага ўзроўню. Таму нам, як сапраўдным удасканальвальнікам, нельга наклікаць на сябе гэтыя непрыемнасці.

Людзі з’яўляюцца найкаштоўнейшымі, яны вянец усяго існага. Як ты можаш знаходзіцца пад кантролем такіх стварэнняў? Табе не патрэбна нават тваё цела — як жа гэта сумна! Некаторыя з гэтых стварэнняў усяляюцца ў цела чалавека; ёсць і такія, якія гэтага не робяць і трымаюцца ад чалавека на некаторай адлегласці. Аднак дух кіруе табой, падпарадкоўвае цябе сабе. Калі ты хочаш гаварыць, тады ён робіць так, каб ты гаварыў — лапатаў. Гэтым таксама можна заражаць іншых. Нехта захоча гэтаму навучыцца, набярэцца смеласці, адкрые рот і ў яго таксама гэта атрымаецца. Насамрэч тыя істоты існуюць раямі. Калі хочаш так гаварыць, адна з іх уселіцца ў цябе ды прымусіць цябе гаварыць.

Чаму такое трапляецца? З тое ж прычыны, што я распавядаў, — такія духі жадаюць падвысіць свой узровень. Але на тым баку не існуе пакутаў, таму нельга і ўдасканальвацца, нельга падвышацца. Вось яны і прыдумалі спосаб — дапамагаць людзям рабіць добрыя ўчынкі. Але зноў-такі духі не разумеюць, што рабіць. Аднак яны ведаюць, што энергія, якую яны выпраменьваюць, можа аказаць на хворага чалавека нязначны стрымальны ўплыў, можа часова зняць з хворага боль, але не здольная яго вылекаваць. Таму духі ведаюць, што выпраменьванне энергіі пры дапамозе рота чалавека можа даваць такі эфект. Вось у чым справа. Некаторыя людзі называюць гэта нябеснай мовай, а іншыя — мовай Будаў. Гэта зневажанне Будаў. Я сказаў бы, што гэта проста-такі бязглуздзіца!

Як вам вядома, Буды скупыя на словы. Калі Буда раскрыў бы вусны і пачаў гаварыць у нашай прасторы, тады гэта магло б выклікаць тут, у чалавецтва, землятрус. Гэта быў бы проста жах! Гук быў бы громападобны. Некаторыя людзі кажуць: «Я сваім нябесным вокам бачыў, што Буда са мной размаўляў». Гэта не так. Такая ж справа, калі нехта бачыць маё Цела Закону. Яно з табой не размаўляе, а дасылае думкі са стэрэагукам. Ты чуў, і гэта было падобна да таго, нібыта Цела Закону гаварыла. Звычайна яно можа гаварыць у сваёй

прасторы. Але пасля таго, як яго голас данясецца сюды, ты не зможаш разабраць, што яно кажа. Гэта таму, што паняцце прасторы-часу ў дзвюх прасторах рознае. Адзін шычэнь нашае прасторы роўны цяперашнім дзвюм гадзінам. А ў той вялікай прасторы адзін наш шычэнь роўны іх цэламу году. Наш час, наадварот, павальнейшы за іх.

У мінулым была прымаўка: «Калі на небе прайшоў адзін дзень, на Зямлі ўжо прайшла тысяча гадоў». У ёй маецца на ўвазе ўнітарны свет, дзе адсутнічае паняцце прасторы і часу, гэта значыць светы, у якіх знаходзяцца Вялікія Прабуджаныя. Напрыклад, Свет Найвышэйшага Шчасця, Глазуравы Свет, Свет Фалунь, Свет Лотаса і да таго падобнае. Вось пра якія месцы гаворка. У вялікай жа прасторы час, наадварот, хуткі. Калі б ты быў здольны прыняць, пачуць іх размову (у некаторых людзей прабіліся нябесныя вушы, адкрыўся слых), калі ты зможаш пачуць іх размову, тады не атрымаецца разабраць словы. Калі ты будзеш слухаць, усё будзе як шчэбет птушак, быццам у прайгравальніку ўключана хуткая перамотка наперад, — нічога не разбярэш. Вядома, некаторыя людзі могуць чуць музыку, а таксама мову. Але абавязкова, каб усё праходзіла праз такую здольнасць, якая адыгрывае ролю носьбіта, ліквідуе гэтую розніцу ў часе і перадае гук у твае вушы. Толькі тады ты зможаш дакладна ўсё чуць. Вось у чым справа. Хтосьці кажа, што гэта мова Будаў. Гэта зусім не так.

Калі Прабуджаныя сустракаюць адзін аднаго, калі абодва яны ўсміхаюцца, тады яны ўжо ўсё зразумелі. Гэта таму, што яны выкарыстоўваюць бязгучную тэлестэзію[98], якая ў таго, хто яе прымае, становіцца аб'ёмным гукам. Калі яны адзін аднаму ўсміхаюцца, тады ўжо скончылі абмен думкамі. Выкарыстоўваецца не толькі выключна такая форма, часам выкарыстоўваецца таксама іншы спосаб. Як вам вядома, у тантры тыбецкія ламы надаюць вялікую ўвагу выкананню мудраў. Але калі спытаеш ламу, што такое мудра, дык ён адказвае, што гэта найвышэйшая ёга. А што гэта канкрэтна? Ён і не ведае. Насамрэч гэта мова Вялікіх Прабуджаных. Калі людзей шмат, яны выконваюць вялікія мудры, вельмі прыгожыя, разнастайныя вялікія мудры; калі людзей мала, Прабуджаныя выконваюць малыя мудры, таксама вельмі прыгожыя, малыя мудры з разнастайнымі палажэннямі рук, неверагодна складаныя, надзвычай багатыя. Бо гэта такая мова. Раней усё гэта было нябеснай таямніцай, а мы ўсё распавялі. У Тыбеце выкарыстоўваецца толькі некалькі адзінарных палажэнняў рук, прызначаных для практыкі. Іх абагульнілі ды сістэматызавалі. Яны з'яўляюцца толькі самай простай мовай для практыкі, прычым толькі тымі некалькімі яе формамі для практыкі. А сапраўдныя мудры неймаверна складаныя.

## ШТО НАСТАЎНІК ДАЕ ВУЧНЯМ

Некаторыя людзі, убачыўшы мяне, хапаюць маю руку, паціска́юць і ніяк не адпускаюць. А іншыя, убачыўшы, што тыя паціскаюць мне руку, робяць тое ж

самае. Я ведаю, пра што яны думаюць. Адны хочуць паціснуць руку Настаўніка, адчуваючы вялікую радасць; другія ж хочуць атрымаць крыху інфармацыі, таму трымаюць руку і не адпускаюць. Я вось што скажу. Сапраўднае самаўдасканальванне — гэта твая ўласная справа. Тут у нас не ацаленне ды аздараўленне, калі табе даюць трохі інфармацыі, каб цябе палекаваць. Мы гэтага не робім. За ўстараненне тваіх захворванняў вазьмуся асабіста я. А на пунктах практыкі гэта зробяць мае Целы Закону. Тых, хто чытаючы гэтую кнігу, вучыцца самастойна, таксама пазбавяць ад хваробаў мае Целы Закону. Думаеш, можна дабіцца ўзрастання Ґун, толькі памацаўшы маю руку? Хіба гэта не смешна?

Ґун залежыць ад удасканальвання твайго Сіньсін. Калі ты не здзяйсняеш шчырага самаўдасканальвання, тады Ґун не ўзрасце, бо існуюць стандарты Сіньсін. Калі ў цябе ўзрасце Ґун, з высокіх узроўняў можна будзе ўбачыць, што ты пазбавіўся ад навязлівай ідэі, пазбавіўся ад тое матэрыі, і над тваёй макаўкай вырасла лінейка. Прычым такая лінейка існуе ў форме слупа Ґун. Якая вышыня лінейкі, такая і вышыня слупа Ґун. Яна адлюстроўвае Ґун, выпрацаваны тваім уласным удасканальваннем, а таксама адлюстроўвае вышыню твайго Сіньсін. Калі нехта іншы дадасць табе колькі-небудзь Ґун, дык гэта зусім не спрацуе. Нават калі дадаць толькі трохі, яго ўсё адно не ўтрымаць, яго ўзровень усё адно спадзе. Я магу зараз жа даць табе дасягнуць стану «Тры кветкі збіраюцца на макаўцы», але як толькі ты выйдзеш за дзверы, дык Ґун адразу ж спадзе. Гэта не тваё, ты не выпрацаваў гэта сваім удасканальваннем, яго не ўтрымаць, таму што эталон твайго Сіньсін не знаходзіцца на тым узроўні. Хто б ні дадаў табе Ґун, у яго ўсё адно б нічога не атрымалася. Выпрацоўка Ґун цалкам залежыць ад твайго ўдасканальвання, ад выпраўлення тваіх думак. Ты зможаш падняцца, толькі калі будзеш як след развіваць свой Ґун, бесперапынна падвышацца ды асіміляваццa з уласцівасцю Сусвету. Некаторыя з вас просяць у мяне аўтограф, а вось распісвацца мне зусім не хочацца. Некаторыя распавядаюць, што Настаўнік даў ім аўтограф, хочуць пахваліцца альбо хочуць, каб інфармацыя Настаўніка іх абараняла. Хіба гэта не з’яўляецца зноў навязлівымі ідэямі? У самаўдасканальванні трэба спадзявацца на сябе. Якой яшчэ інфармацыі ты надаеш значэнне? Хіба ты можаш падчас удасканальвання на высокім узроўні звяртаць на гэта ўвагу? Што гэта за пусцяковіна? Гэтаму надаюць значэнне толькі падчас ацалення ды аздараўлення.

Што тычыцца Ґун, які ты сам выпрацоўваеш шляхам практыкі, дык у надзвычай мікраскапічным стане яго часцінкі маюць дакладна такі самы, як у цябе, вобраз. Калі надыдзе час выхаду за межы Закону чалавечага свету, ты будзеш удасканальваць Цела Буды. Тады ва ўсім тваім Ґун будуць вобразы Цела Буды — яны будуць вельмі прыгожыя і будуць сядзець на лотасах. Яны будуць на кожнай дробнай часцінцы Ґун. А ў Ґун жывёлаў усюды дробныя ліскі, змейкі ды іншыя стварэнні. На дробных часцінках Ґун у надзвычай мікраскапічным стане гэтыя стварэнні паўсюль. Таксама існуе так званая інфармацыя. Размяшалі гарбату, а ты пі, так ці інакш гэта таксама Ґун[99]. Звычайныя людзі імкнуцца

толькі да таго, каб часова зняць з сябе боль, адсунуць захворванне на потым альбо прытармазіць яго развіццё. У любым выпадку звычайныя людзі — гэта звычайныя людзі. Да якога б дрэннага стану яны не даводзілі сваё здароўе, мы ў гэта не ўмешваемся. Я вам пра гэта распавёў толькі таму, што мы практыкоўцы. З гэтага часу ні ў якім разе так не рабіце — так званая інфармацыя, тое ды сёе — ні за што не жадайце гэтых рэчаў. Нейкі майстар ціґун кажа: «Я буду выпраменьваць для вас інфармацыю. Вы яе зможаце прыняць у любым месцы краіны». Прыняць што? Скажу вам, усё гэта не можа адыгрываць нейкай істотнай ролі. Дапусцім, што карысць усё ж ёсць, але гэта ўсяго толькі для тых, хто імкнецца атрымаць ацаленне ды аздараўленне. Мы ж, як практыкоўцы, у працэсе ўдасканальвання самі выпрацоўваем Ґун. А інфармацыйны Ґун, які выпраменьваюць іншыя, не можа падвысіць нам узровень, а можа толькі пазбавіць звычайнага чалавека ад хваробаў. Абавязкова май правільныя намеры. У самаўдасканальванні ніхто не можа цябе замяніць. Ты зможаш падвысіць свой узровень, толькі калі сам будзеш сапраўды ўдасканальвацца.

Такім чынам, што я вам даю? Як вы ведаеце, многія з нас ніколі раней не практыкавалі ціґун і пакутуюць ад захворванняў; а шмат хто, хоць і рабіў практыкаванні ціґун шмат гадоў, да гэтага часу блукае на ўзроўні ці і не мае Ґун. Вядома, некаторыя лекуюць іншых, але ці ведаюць яны, як ім гэта ўдаецца рабіць? Калі я тлумачыў праблему апантанасці нячыстым духам, дык ужо цалкам зняў апантанасць нячыстым духам з тых, хто здольны шчыра ўдасканальвацца па Дафа, зняў усіх гэткага роду благіх істот, у тым ліку тых, якія знаходзіліся як унутры, так і звонку цела чалавека, незалежна ад таго, што гэта былі за стварэнні. Тыя, хто самастойна шчыра ўдасканальваецца, калі вы чытаеце гэты Дафа, я ачышчаю цела і вам. У дадатак да гэтага неабходна ачысціць і тваё хатняе асяроддзе. Хутчэй выкідвай рытуальныя шыльды лісіцаў і тхароў, якім ты раней рабіў прынашэнні, — іх усіх я знішчыў, больш іх не існуе. Раз ты хочаш удасканальвацца, мы можам даць табе для гэтага зручную магчымасць, зрабіць гэта для цябе. Але гэта распаўсюджваецца толькі на сапраўдных удасканальвальнікаў. Вядома, некаторыя людзі не збіраюцца ўдасканальвацца. Яны так нічога і не зразумелі нават да гэтага часу. Тады і мы не можам пра іх клапаціцца. Мы клапоцімся толькі пра шчырых удасканальвальнікаў.

Таксама ёсць людзі, якім іншыя раней казалі, што яны апантаныя нячыстым духам, і яны самі таксама гэта адчувалі. Але пасля таго, як з гэтых людзей апантанасць нячыстым духам была знятая, яны не могуць пазбавіцца ад трывогі. Ім увесь час падаецца, быццам той стан існуе і далей, яны лічаць, што ён яшчэ застаўся. Гэта ўжо навязлівая ідэя, якая называецца надумлівасцю. З цягам часу такія людзі, магчыма, самі зноў прывабяць да сябе жывёлу. Табе самому неабходна адкінуць такія думкі, аніякае апантанасці нячыстым духам ужо наогул не існуе. На мінулых курсах мы ўжо вырашылі некаторым людзям гэтую праблему, я ўжо гэта зрабіў — устараніў ім усім апантанасць нячыстым духам.

У Школе Даа падчас практыкі ціґун на нізкім узроўні закладаюць пэўную базу, фармуюць круг неба, даньт'ень[100], а таксама тое, што прыналежыць да іншых аспектаў. Мы тут укладваем Фалунь, цідзі, усе механізмы самаўдасканальвання ды вельмі шмат іншага, што па колькасці перавышае дзесяць тысяч. Усё гэта неабходна табе даць, нібы пасеяць у табе насенне. Ты зможаш сапраўды ўдасканаліцца ў нашай школе толькі пасля таго, як я ўстараню твае хваробы, зраблю ўсё, што трэба зрабіць, і цалкам укладу ў цябе ўсё, што трэба ўкласці. Інакш, калі я нічога табе не дам, дык гэта будзе толькі ацаленнем ды аздараўленнем. Шчыра кажучы, калі некаторыя з вас не надаюць значэння Сіньсін, тады для іх усё ж такі лепш будзе займацца гімнастыкай!

Калі ты будзеш шчыра ўдасканальвацца, тады і ставіцца да цябе нам трэба з адказнасцю. Людзі, якія ўдасканальваюцца самастойна, гэтак жа змогуць усё атрымаць, але яны павінны сапраўды ўдасканальвацца. Усё гэта мы даем шчырым удасканальвальнікам. Як я ўжо казаў, трэба выхоўваць цябе насамрэч як свайго паслядоўніка. Апроч таго, Закон высокага ўзроўню трэба абавязкова вывучыць грунтоўна, каб ведаць, якім чынам удасканальвацца; а пяці метадам практыкі ты навучышся адразу, цалкам іх засвоіш. У будучыні ты зможаш дасягнуць неймаверна высокага ўзроўню, настолькі высокага, што ты нават не ўяўляеш, — атрыманне Паўнапраўнага дасягнення не будзе праблемай. Я выкладаю Закон, пераплятаючы ў ім змест розных узроўняў. Дастаткова таго, каб ты ўдасканальваўся, і ты выявіш, што ў тваім далейшым самаўдасканальванні на розных узроўнях Закон заўсёды будзе адыгрываць для цябе настаўляльную ролю.

Ты стаў удасканальвальнікам, і твой далейшы жыццёвы шлях зменіцца — маё Цела Закону зноўку ўсё табе расплануе. Як расплануе? Колькі яшчэ засталося некаторым людзям гадоў жыцця? Для іх саміх гэта застаецца невядомым. Некаторых праз год ці паўгода, магчыма, чакае цяжкае захворванне, і яно, верагодна, будзе цягнуцца некалькі гадоў; у іншых, магчыма, будзе інсульт[101] або іншыя хваробы, якія зробяць іх цалкам нерухомымі. Як жа табе ўдасканальвацца, маючы наперадзе такі жыццёвы шлях? Усё гэта мы табе ўстаронім, нельга дапусціць, каб так сталася. Але мы загадзя папярэджваем, што можам зрабіць гэта толькі для сапраўдных удасканальвальнікаў. Ні ў якім разе нельга адвольна рабіць гэта для звычайных людзей. Гэта было б раўназначна здзяйсненню благіх учынкаў. Нараджэнне-старасць-хваробы-смерць — усе гэтыя падзеі жыцця звычайных людзей маюць прычынныя сувязі, якія нельга адвольна парушаць.

Мы лічым удасканальвальнікаў найкаштоўнейшымі людзьмі, таму можам змяніць гэта толькі для іх. Як змяніць? Калі ў настаўніка вельмі высокі Вэйдэ́[102], гэта значыць, у яго вельмі высокая сіла Ґун, тады ён можа ануляваць табе кармы. Настаўнік з высокім Ґун можа пазбавіць цябе ад вельмі многіх кармаў, а настаўнік з нізкім — здольны ўстараніць толькі трохі. Прывядзем прыклад. Усе рознага роду кармы на тваім далейшым жыццёвым шляху будуць сабраныя

разам, з іх частка ўстаранёна, устаранёна палова. Паловы, якая застанецца, табе ўсё адно не вытрымаць, яна будзе вышэй за гару. Што ж рабіць? Магчыма, калі ты спасцігнеш Даа, тады ў будучыні будзе шмат людзей, якія атрымаюць ад гэтага карысць. Такім чынам, яны возьмуць на сябе частку тваіх кармаў. Вядома, для іх гэта нічога не будзе азначаць. Ты сам таксама маеш шмат выпрацаваных практыкай жывых істотаў, ды яшчэ, акрамя галоўнае і дапаможнае душы, у цябе самога ёсць яшчэ шмат «я», кожнае з якіх возьме на сябе частку тваіх кармаў. Калі для цябе прыйдзе час зведаць бедствы, тады ўжо вельмі мала застанецца. Кажу, што застанецца вельмі мала, але карма будзе ўсё яшчэ даволі вялікай, і табе ўсё адно яе будзе не вытрымаць. І як жа зрабіць тады? Падзяліць яе на мноства порцыяў ды размясціць іх на кожным узроўні твайго самаўдасканальвання, выкарыстоўваючы іх для падвышэння твайго Сіньсін, пераўтварэння тваёй кармы, развіцця твайго Ґун.

Ёсць яшчэ сёе-тое. Калі хто-небудзь хоча ўдасканальвацца, дык гэта зусім не такая ўжо простая справа. Як я ўжо казаў, гэта вельмі сур'ёзная рэч, у дадатак да гэтага яна перавышае звычайных людзей і складанейшая за любую справу звычайных людзей. Бо самаўдасканальванне з'яўляецца звышнатуральным. Таму патрабаванні да цябе будуць вышэй, чым у любой справе звычайных людзей. Мы, людзі, маем душу. Душа несмяротная. Калі яна несмяротная, падумай: ці не здзяйсняла твая душа благіх учынкаў у грамадскай дзейнасці да гэтага твайго жыцця? Гэта цалкам верагодна. Забіла жывую істоту, камусьці нешта завінавацiла, некага пакрыўдзіла, нанесла камусьці шкоду — магчыма, што твая душа ўсё гэта зрабіла. Калі гэта так, тады ты на гэтым баку ўдасканальваешся, а пакрыўджаная табой істота на тым баку ўсё вельмі выразна бачыць. Калі ты толькі ацаляешся ды аздараўляешся, тады яна не ўмешваецца. Яна ведае, што ты адсоўваеш бедства на потым, і калі не расплацішся цяпер, дык зробіш гэта ў будучыні, а тады расплата будзе яшчэ цяжэй. Таму, калі ты часова не расплачваешся, тады ёй абыякава.

Калі ты заяўляеш, што будзеш самаўдасканальвацца, тады яна ўжо зусім не можа з гэтым пагадзіцца: «Ты збіраешся ўдасканальвацца, збіраешся сыходзіць. Калі ў цябе вырасце Ґун, тады мне ўжо будзе цябе не дастаць, не дацягнуцца». З гэтым яна ніяк не можа змірыцца. Тая істота ўсімі праўдамі ды няпраўдамі табе перашкаджае, не дае табе ўдасканальвацца. Таму яна звяртаецца да разнастайных сродкаў, каб табе перашкодзіць, ажно да таго, што нават сапраўды прыйдзе цябе забіць. Вядома, усё-ткі не можа быць, каб падчас сядзення тут у медытацыі ты быў абезгалоўлены. Гэта немагчыма, бо павінна адпавядаць стану грамадства звычайных людзей. Магчыма, толькі выйшаўшы з дому, ты патрапіш пад машыну, звалішся з высокага паверха альбо здарыцца іншая небяспека. Такое можа здарыцца, і гэта даволі небяспечна. Сапраўднае самаўдасканальванне — зусім не такая простая справа, як ты сабе ўяўляеш. Ты зможаш удасканальвацца, толькі проста гэтага захацеўшы?! Калі ты пачнеш шчыра ўдасканальвацца, дык адразу сутыкнешся з небяспекай для жыцця, адразу ўзнікне гэтая праблема. Вельмі шмат майстроў ціґун не вырашаецца

навучаць ціґун на высокім узроўні ды весці людзей на высокія ўзроўні. Чаму? Таму што ім з гэтым не ўправіцца, яны не ў стане цябе абараніць.

Раней многія з тых, хто прапаведаваў Даа, мелі магчымасць навучаць толькі аднаго паслядоўніка. З абаронай аднаго вучня яны яшчэ маглі сяк-так управіцца. Але ў такіх вялікіх маштабах... звычайны чалавек ужо наўрад ці на такое вырашыцца. Аднак, як мы ўжо вам казалі, я гэта зрабіць у стане, бо ў мяне безліч Целаў Закону, якія маюць маю каласальную цудатворную сілу ды моц Закону. Яны могуць праявіць велізарную цудатворную сілу, велізарную моц Закону. У дадатак да гэтага, тое, што мы сёння робім, таксама не з'яўляецца такім простым, як можа падацца на першы погляд. Я выйшаў гэта рабіць не таму, што паддаўся імпэту. Я магу вам сказаць, што за гэтай справай пільна сочыць шмат Вялікіх Прабуджаных — мы ў Канцавы перыяд Закону апошні раз распаўсюджваем праведны метад. Недапушчальна, каб у справе, якую мы робім, адбылося адхіленне. Калі ўдасканальваешся, сапраўды ідучы праведным шляхам, тады ніхто не адважыцца неразважліва цябе крануць. Акрамя таго, ты знаходзішся пад аховай маіх Целаў Закону. Не можа стацца аніякае небяспекі.

Даўгі трэба вяртаць, таму на тваім шляху самаўдасканальвання, магчыма, трапяцца небяспечныя выпадкі. Але падчас узнікнення такіх выпадкаў ты не спалохаешся, і не дадуць, каб для цябе з'явілася сапраўдная небяспека. Я магу прывесці вам некалькі прыкладаў. Калі я праводзіў курсы ў Пекіне, адна іх наведвальніца пераязджала вуліцу на ровары. Калі яна паварочвала за рог, яе на крутым павароце збіла элітнае легкавое аўто. Гэтай жанчыне было за пяцьдзясят. Аўто рэзка яе ўдарыла. Ды яшчэ як: было чуваць гук «Бац!» ад удару галавой аб машыну. Яна стукнулася дакладна аб дах аўто. У той час вучаніца ўсё ж такі ўседзела на ровары. Яе ўдарыла ў галаву, аднак яна не адчула болю. Жанчына не толькі не адчула болю, але ў яе і крывацёк не пачаўся, не было нават ґузака. А вось кіроўца аўто вельмі спалохаўся. Выскачыўшы з машыны, ён паспешліва ў яе спытаў: «Вы як? Не траўмаваліся? Паедзьма ў лякарню?» Яна адказала, што ўсё ў парадку. Вядома, у нашае вучаніцы быў вельмі высокі Сіньсін, яна не магла сабе дазволіць нарабіць іншаму праблем. Яна сказала, што ўсё ў парадку, аднак на аўто ад удару засталася вялікая ўмяціна.

Такія прыгоды здараюцца, каб забраць жыццё, але ты не апынешся ў небяспецы. Калі мы мінулым разам праводзілі курсы ў Дзіліньскім універсітэце[103], адзін са слухачоў курсаў выходзіў з роварам з галоўнае брамы ўніверсітэта. Як толькі ён дайшоў да сярэдзіны вуліцы, дык раптоўна апынуўся паміж двума легкавымі аўто. Яго павінны былі вось-вось збіць, але ён зусім не спалохаўся. Часта, калі з намі такое здараецца, дык у нас няма страху. У тое ж імгненне машыны спыніліся, і ніякіх праблемаў не ўзнікла.

У Пекіне быў яшчэ такі выпадак. Узімку цямнее даволі рана, людзі кладуцца спаць таксама даволі рана. На дарозе было пуста і вельмі ціха. Адзін з тых, хто ў нас вучыцца, спяшаўся на ровары дадому. Перад ім імчаўся адзін толькі джып. Джып імчаўся, імчаўся ды раптам затармазіў. Вучань не звярнуў на гэта ўвагі і далей ехаў наперад, схіліўшы галаву. Аднак нечакана джып даў задні ход, імкліва падаўся назад. Машына паехала вельмі хутка. Дзве сілы злучыліся разам — гэта таксама прыйшлі забраць жыццё. За імгненне да ўдару нейкая сіла адразу адсунула яго ровар больш чым на паўметра назад. Прычым джып, крануўшы кола ровара, адразу ж затармазіў — магчыма, кіроўца аўто заўважыў, што ззаду нехта ёсць. Гэты вучань тады таксама не спалохаўся. Ніхто з тых, хто сутыкаецца з такімі сітуацыямі, не палохаецца. Магчыма, потым бывае запознены страх. Вось пра што ён перш за ўсё падумаў: «Вось дык так! Хто ж адцягнуў мяне назад? Мне трэба яму падзякаваць». Азірнуўся і толькі хацеў сказаць «дзякуй», як убачыў, што на дарозе няма ні душы, пануе глыбокая ціша. Ён імгненна зразумеў: «Гэта ж Настаўнік мяне абараняе».

Быў яшчэ адзін інцыдэнт, які адбыўся ў Чанчуні. Ля дома аднаго з тых, хто ў нас вучыцца, будуецца ґмах. Цяпер жа дамы будуюць вунь якія высачэзныя. Рыштаванне складзена з жалезных трубаў таўшчынёй шэсць сантыметраў і даўжынёй чатыры метры. Аднойчы гэты вучань недалёка адышоў ад свайго дома, як адна з жалезных трубаў з таго ґмаха пачала падаць вертыкальна ўніз і накіроўвалася проста ў яго цемя. Усе мінакі аслупянелі. Ён кажа: «Хто гэта мяне стукнуў?» — яму падалося, што нехта ляпнуў яго па галаве. У той жа момант, калі азірнуўся, ён убачыў, што над яго макаўкай круціцца вялікі Фалунь! Жалезная труба праслізнула ўздоўж яго галавы, пасля чаго ўваткнулася ў зямлю, так і застаўшыся там тырчаць. Калі б труба сапраўды ўваткнулася ў чалавека, тады, задумайцеся: пры такой вазе гэта сапраўды быў бы няйнакш як танхулу[104], нанізаны на шампур. Чалавека працяла б наскрозь. Гэта было вельмі небяспечна!

Такіх выпадкаў здаралася вельмі шмат, іх не злічыць. Але аніякае небяспекі не ўзнікла. Наўрад ці з такімі прыгодамі сутыкнуцца ўсе. Яны здараюцца з некаторымі нашымі людзьмі. Сутыкнешся ты з такім або не сутыкнешся, я гарантую, што для цябе не з'явіцца аніякае небяспекі. Гэта я магу гарантаваць. Некаторыя з тых, хто ў нас навучаецца, не паводзяцца згодна з патрабаваннямі да Сіньсін — яны толькі практыкуюць рухі, а Сіньсін не ўдасканальваюць. Такія не могуць лічыцца практыкоўцамі.

Адносна таго, што дае Настаўнік, я даю вам, уласна, гэтыя рэчы. Маё Цела Закону ахоўвае цябе, пакуль ты не зможаш сам сябе абараніць. У той час ты выйдзеш за межы ўдасканальвання па Законе чалавечага свету і ўжо спасцігнеш Даа. Але ты павінен стаць сапраўдным удасканальвальнікам — толькі тады ты зможаш гэтага дасягнуць. Ёсць такі чалавек, які з маёй кнігай у руцэ ходзіць па праспекце ды крычыць: «Дзякуючы абароне Настаўніка Лі можна не баяцца трапіць пад машыну». Гэта руйнаванне Дафа. Такіх людзей я

не абараняю. Насамрэч паслядоўнікі, якія шчыра ўдасканальваюцца, так не робяць.

## ПОЛЕ ЭНЕРГІІ

Падчас нашае практыкі навокал узнікае поле. Што гэта за поле? Некаторыя называюць яго полем ці, магнітным, электрычным полем. Насамрэч, якім бы полем ты яго ні называў, усё гэта было б памылковым, бо такое поле вельмі багатае на матэрыю. У гэтым Ґун ёсць ледзьве не любая матэрыя, якая складае ўсе прасторы нашага Сусвету. Вось калі мы назавем яго полем энергіі, тады гэта будзе яшчэ параўнальна слушнай назвай. Таму мы звычайна называем яго полем энергіі.

У такім выпадку якую ж ролю адыгрывае гэтае поле? Як вам вядома, у нас, удасканальвальнікаў праведнага метаду, бывае такое адчуванне: паколькі такое поле з'яўляецца дзякуючы ўдасканальванню па праведным метадзе, і яно з'яўляецца міласэрным ды асіміляваным з уласцівасцю Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне, тады ўсе нашыя слухачы курсаў, якія сядзяць у гэтым полі, яго адчуваюць. У іх галаве няма дрэнных думак, і многія з іх, седзячы тут, нават не згадваюць пра тое, каб пакурыць, яны адчуваюць вельмі мірную і добрую атмасферу, надзвычайны камфорт. Менавіта такая энергія, уласцівая практыкоўцам па праведным Законе, адыгрывае падобную ролю ў межах яе поля. У будучыні, пасля заканчэння гэтых курсаў, абсалютная большасць з нас атрымае Ґун, сапраўды ўзнікне Ґун. Бо я перадаю табе тое, што прызначана для ўдасканальвання па праведным метадзе, і ты сам таксама прад'яўляеш да сябе патрабаванні па крытэрах Сіньсін. Услед за тваёй бесперапыннай практыкай ды ўдасканальваннем па нашых патрабаваннях да Сіньсін, паступова твая энергія будзе ўсё павялічвацца ды павялічвацца.

Мы выратоўваем і сябе, і іншых, даем паратунак усім жывым істотам. Таму, калі Фалунь круціцца ўнутр, ён ратуе цябе, а калі круціцца навонкі, тады ратуе іншых. Калі ён круціцца навонкі, тады выпускае энергію, прыносячы іншым карысць. Такім чынам, усе, хто будзе знаходзіцца ў зоне пакрыцця твайго поля энергіі, атрымаюць ад гэтага карысць. Яны, магчыма, пачнуць пачувацца вельмі добра. Незалежна ад таго, ідзеш ты па вуліцы, альбо знаходзішся ва ўстанове ці дома, магчыма, яно ўсюды будзе адыгрываць такую ролю. Верагодна, ты неспадзявана адрэгулюеш здароўе людзей, якія будуць знаходзіцца ў межах твайго поля, бо такое поле можа выпраўляць усе няправільныя станы. Чалавечае цела не павінна быць хворым. Калі хварэеш, гэта прыналежыць да няправільнага стану. Вось гэтае поле і можа яго выправіць. Калі той, у каго ёсць дрэнныя думкі, думае пра нешта няправільнае, тады, знаходзячыся пад інтэнсіўным уздзеяннем твайго поля, ён таксама можа перадумаць. Магчыма, тады ён перастане думаць пра дрэнныя рэчы. Магчыма, хтосьці захацеў кагосьці аблаяць, але раптам перадумае ды ўжо не захоча лаяцца. Такі эфект

можа мець выключна энергетычнае поле ад удасканальвання па праведным метадзе. Таму ў мінулым у будызме быў такі выраз: «Калі ззянне Буды асвятляе ўсё, тады і прыстойнасць, і сумленнасць, і поўная яснота». Менавіта такое значэнне.

## ЯК ТЫМ, ХТО ВУЧЫЦЦА ФАЛУНЬ ДАФА, ПЕРАДАВАЦЬ ПРАКТЫКУ

Шмат удзельнікаў нашых курсаў па вяртанні дадому адчуваюць, што гэты метад практыкі вельмі добры, і захочуць навучыць яму сваіх сваякоў і добрых сяброў. Гэта можна. Ты можаш усюды яму навучаць. Каго б ты яму ні вучыў, усё гэта можна. Але ёсць адзін момант, пра які мы мусім вам заявіць. Мы даем вам так шмат рэчаў, якія нельга ацаніць аніякімі грашыма. І для чаго ж мы вам гэта даем? Для таго, каб даць вам магчымасць удасканальвацца. Мы можам вам гэта даць толькі пры ўмове вашага ўдасканальвання. Такім чынам, інакш кажучы, калі вы ў будучыні будзеце навучаць людзей практыцы ціґун, вам нельга выкарыстоўваць усё гэта для пагоні за славай і выгадай. Таму вам нельга, як я, праводзіць такія курсы і браць за гэта плату. Нам жа трэба друкаваць кнігі ды матэрыялы, каб усюды распаўсюджваць нашую практыку, а гэта патрабуе выдаткаў. Плата[105], якую мы бярэм, ужо стала самай нізкай ва ўсім Кітаі, а даем мы больш за ўсіх. Мы сапраўды вядзем людзей на высокія ўзроўні. Гэта вы спазналі на ўласным досведзе. Калі ты ў будучыні пойдзеш вучыць людзей практыцы, мы маем да цябе, як да вучня Фалунь Дафа, два патрабаванні.

Першае патрабаванне: нельга браць плату. Мы даем табе столькі ўсяго не для таго, каб ты разбагацеў і дамогся славы, а дзеля таго, каб цябе выратаваць, даць табе магчымасць удасканальвацца. Калі ты возьмеш грошы, тады маё Цела Закону забярэ ў цябе назад абсалютна ўсе рэчы, і, такім чынам, ты больш не будзеш прыналежаць да нашага Фалунь Дафа, і тое, чаму ты вучышся, больш не будзе нашым Фалунь Дафа. Калі вы навучаеце людзей практыцы, дык не ганіцеся ані за славай, ані за грашыма. Вы добраахвотна служыце іншым. Так робяць нашыя вучні па ўсёй краіне. Кансультанты ўсіх месцаў таксама паказваюць гэта на ўласным прыкладзе. Хто б ні прыходзіў вучыцца нашай практыцы, калі ты толькі хочаш вучыцца, дык і прыходзь. Мы можам несці перад табой адказнасць і не возьмем за гэта ні капейкі.

Другое патрабаванне: не прымешвайце ў Дафа асабістыя рэчы. Гэта азначае, што падчас навучання людзей практыцы, незалежна ад таго, ці адкрылася ў цябе нябеснае вока, ці бачыш ты нешта, ці ўзніклі ў цябе нейкія здольнасці, табе нельга тлумачыць наш Фалунь Дафа паводле таго, што ты ўбачыў. Тыя дробязі, якія ты пабачыў на сваім узроўні, насамрэч не могуць ісці з ім ні ў якое параўнанне, ім неймаверна далёка да сапраўднага зместу Закону, які мы выкладаем. Таму з гэтага моманту падчас навучання людзей практыцы, як бы

там ні было, звяртай на гэта ўвагу. Толькі так можна гарантаваць нязменнасць арыгінальных рэчаў нашага Фалунь Дафа.

Таксама не дазволена навучаць практыцы, выкарыстоўваючы такую форму, як у мяне. Забаронена выкладаць Закон у форме вялікае лекцыі, як гэта раблю я. Ты не ў стане выкладаць Закон. Бо выказанае мной мае вельмі глыбокі змест. Я чытаю лекцыі, пераплятаючы ў іх рэчы высокіх узроўняў. Вы ўдасканальваецеся на розных узроўнях. У будучыні, пасля таго як ты падвысішся і станеш паўторна слухаць гэты аўдыязапіс, тады будзеш пастаянна падвышацца. Ты няспынна будзеш слухаць, і ў цябе пастаянна будуць новыя ўсведамленні, новыя дасягненні. З чытаннем кнігі гэта яшчэ ў большай ступені так. У сваіх словах я пераплятаю вельмі высокія ды глыбокія рэчы, таму ты не здольны выкладаць гэты Закон. Табе не дазволена ў сваім аповедзе выкарыстоўваць мае арыгінальныя словы як свае, інакш гэта будзе актам крадзяжу Закону. Табе можна толькі прыводзіць мае арыгінальныя словы, дадаючы: так кажа Настаўнік, так напісана ў кнізе. Толькі так можна казаць. Чаму? Таму што, калі ты так скажаш, тады гэта будзе мець сілу Дафа. Ты не можаш вучыць людзей таму, што табе вядома, выдаючы гэта за Фалунь Дафа. Інакш тое, чаму ты будзеш навучаць, ужо не будзе Фалунь Дафа, і гэта будзе раўназначна руйнаванню нашага Фалунь Дафа. Калі ты распавядаеш паводле свайго пункту гледжання, згодна са сваімі думкамі, тады гэта не з’яўляецца Законам. Яно не здольнае выратаваць людзей і не здольнае адыграць аніякае ролі. Таму ніхто не ў стане выкладаць гэты Закон.

Спосаб для вашага навучання людзей практыцы такі: на пунктах практыкі альбо ў месцах навучання людзей практыцы можна ўключыць навучэнцам аўдыя-, відэазапіс, і каб пасля гэтага кансультант навучыў іх практыцы. Можна выкарыстоўваць форму суразмовы, дзе ўсе будуць, абменьваючыся паміж сабой думкамі, вучыцца адно ў аднаго, размаўляць, камунікаваць. Мы патрабуем, каб рабілі так. Разам з тым нельга называць вучняў (паслядоўнікаў), якія распаўсюджваюць Фалунь Дафа, «настаўнікамі», «вялікімі майстрамі» і да таго падобным. Настаўнік[106] Дафа толькі адзін. Незалежна ад таго, рана ці позна хтосьці ўступіў у школу, ён усё адно з'яўляецца паслядоўнікам.

Калі вы навучаеце людзей практыцы, некаторыя з вас, магчыма, падумалі: «Настаўнік здольны ўкласці Фалунь, здольны наладзіць чалавеку здароўе. Мы ж не ў стане гэтага зрабіць». Гэта не мае значэння. Як я ўжо казаў, за кожным з тых, хто ў нас вучыцца, ёсць маё Цела Закону, прычым не адно. Таму гэта выконваюць мае Целы Закону. Калі ты кагосьці навучаеш, калі ён мае такі лёс, ён адразу ж можа атрымаць Фалунь. Калі ж такі лёс у яго слабей, тады пасля заканчэння наладжвання здароўя і пасля таго, як пачне практыкаваць, ён таксама праз пэўны час можа яго атрымаць. Мае Целы Закону дапамогуць яму ў наладжванні здароўя. І гэта яшчэ не ўсё. Скажу табе: калі ты, чытаючы мае кнігі, праглядаючы мае відэазапісы альбо праслухоўваючы мае гуказапісы,

будзеш навучацца Закону і практыцы, калі ты сапраўды будзеш лічыць сябе практыкоўцам, тады таксама атрымаеш тое, што належыць атрымаць.

Таксама мы не даем нашым вучням лекаваць іншых людзей. Тым, хто вучыцца Фалунь Дафа, катэгарычна забараняецца лекаваць іншых. Мы навучаем цябе ўдасканальвацца ўгару і не даем табе развіваць любыя навязлівыя ідэі, а таксама не даем табе сапсаваць сваё здароўе. Нашыя месцы практыкі лепшыя за любыя іншыя месцы заняткаў практыкаваннямі ціґун. Калі толькі ты будзеш хадзіць туды практыкаваць, тады эфект будзе нашмат магутнейшы, чым тады, калі ты будзеш лекавацца. Мае Целы Закону сядзяць там па коле. У небе над месцам практыкі таксама покрыва, над якім вялікі Фалунь. Вялікае Цела Закону над покрывам назірае за тым месцам. Гэта не простае месца, не месца для звычайных практыкаванняў ціґун, а месца для самаўдасканальвання. Шмат тых з нас, хто мае здольнасці, бачыў, што месца практыкі Фалунь Дафа пакрыта чырвоным святлом, і там цалкам усё чырвонае.

Мае Целы Закону таксама могуць непасрэдна ўкладваць у людзей Фалунь, але мы не заахвочваем да ўзнікнення навязлівых ідэяў. Калі ты кагосьці вучыш цялесным рухам, ён кажа: «Вой, у мяне з'явіўся Фалунь». Ты думаеш, што ты яго ўклаў. Гэта зусім не так. Я вам пра гэта сказаў. Не спрыяйце развіццю ў сябе гэтай навязлівай ідэі. Усё гэта робяць мае Целы Закону. Вось як паслядоўнікі нашага Фалунь Дафа навучаюць людзей практыцы.

Калі хтосьці хоча перайначыць метад практыкі Фалунь Дафа па-свойму, тады ён руйнуе Дафа, руйнуе гэтую школу. Ёсць такі, хто зрабіў з інструкцыі метаду практыкі прыпеўку. Гэта абсалютна недапушчальна. Сапраўдныя метады самаўдасканальвання засталіся з дагістарычных часоў, з неймаверна далёкіх эпох. Дзякуючы ім удасканалілася безліч Вялікіх Прабуджаных. Ніхто ніколі не адважваўся нават трохі іх змяніць. Такое з'явілася толькі ў наш Канцавы перыяд Закону. У гісторыі ніколі такога не здаралася. Што б там ні было, будзьце ўважлівымі ў гэтым аспекце.

# ЛЕКЦЫЯ ЧАЦВЁРТАЯ

## СТРАТА І НАБЫЦЦЁ

У колах удасканальвальнікаў часта заходзіць гаворка пра сувязь паміж стратай і набыццём. Сярод звычайных людзей таксама гэта абмяркоўваюць. Як мы, практыкоўцы, ставімся да страты і набыцця? У гэтым мы разыходзімся са звычайнымі людзьмі. Тое, што яны жадаюць атрымаць, — гэта асабістая выгада. Яны думаюць пра тое, як жыць лепей, як жыць больш камфортна. Мы ж, практыкоўцы, думаем не так, а якраз наадварот. Мы не гонімся за тым, што звычайныя людзі хочуць атрымаць. З іншага боку, тое, чаго дасягаем мы, звычайныя людзі хоць і жадаюць атрымаць, ніколі не атрымаюць. Хіба што калі стануць самаўдасканальвацца.

Страта, якую мы звычайна маем на ўвазе, не з'яўляецца стратай у вельмі вузкім сэнсе. Калі згадваеш пра страту, тады некаторыя адразу думаюць: «Хіба гэта не тое, калі ахвяруеш трохі грошай? Калі ўбачыў, што ў кагосьці фінансавыя цяжкасці, тады нечым дапамагаеш. Сустрэўшы на вуліцы жабрака, штосьці яму падаеш». Гэта таксама своеасаблівая адмова, страта, але гэта азначае толькі тое, што ты больш абыякава ставішся толькі да аднаго — да грошай або матэрыяльных каштоўнасцяў. Грэбаванне багаццем, вядома, таксама з'яўляецца адным з аспектаў страты, адным з немалаважных аспектаў. Але страта, пра якую гаворым мы, не абмяжоўваецца такімі вузкімі рамкамі. Мы ў ходзе ўдасканальвання, як практыкоўцы, павінны адмовіцца ад велізарнае колькасці прывязанасцяў: ад схільнасці паказваць сябе, зайздрасці, імкнення да барацьбы, ад радасці. Трэба пазбавіцца ад вельмі многіх самых разнастайных навязлівых ідэяў. Страта, пра якую мы гаворым, мае шырокае значэнне. Ва ўсім ходзе ўдасканальвання трэба адкідаць усе навязлівыя ідэі ды разнастайныя жаданні звычайных людзей.

Магчыма, у кагосьці з вас узнікла такая думка: «Мы ўдасканальваемся сярод звычайных людзей. Калі ўсё страціць, хіба мы не станем такімі ж як манахі, манашкі? Страціць усё, мабыць, нездзяйсняльна». Нашая школа ад тое часткі практыкоўцаў, якія ўдасканальваюцца сярод звычайных людзей, патрабуе ўдасканальвацца менавіта ў грамадстве звычайных людзей, у максімальнай меры застаючыся аднолькавымі са звычайнымі людзьмі, і не змушае цябе сапраўды страціць нешта ў матэрыяльным плане. Хоць бы нават ты стаў службоўцам нейкага высокага рангу альбо нажыў вялізнае багацце, ключ у тым, ці можаш ты адкінуць тыя ідэі.

Нашая школа прама ўказвае на думкі чалавека. У асабістых інтарэсах, у супярэчнасцях з людзьмі ці можаш ты глядзець на гэтыя праблемы лёгка ды абыякава? Вось ключавое пытанне. Удасканальванне ў манастыры, у глухіх гарах ды глухіх лясах прымушае цябе цалкам ізалявацца ад грамадства звычайных людзей, прымушае страціць гэтыя ідэі звычайных людзей, не дае

табе атрымліваць матэрыяльную выгаду і тым самым змушае цябе да страты. Тыя, хто ўдасканальваецца сярод звычайных людзей, ідуць не такім шляхам. Патрабуецца, каб яны знайшлі спосаб, як ставіцца абыякава да ўсяго гэтага менавіта ў жыццёвых умовах звычайных людзей. Вядома, гэта вельмі цяжка. Але гэта з’яўляецца найбольш ключавым у нашай школе. Таму страту, пра якую мы гаворым, трэба разумець у шырокім, а не ў вельмі абмежаваным сэнсе. Возьмем здзяйсненне добрага ўчынку, ахвяраванне камусьці дробных грошай. Паглядзі на цяперашніх вулічных жабракоў. Для некаторых з іх гэта стала прафесіяй, і яны нават заможнейшыя за цябе. Нам трэба звяртаць сваю ўвагу на галоўнае, а не на другаснае. Гэта ж самаўдасканальванне, трэба гэта рабіць велічна, накіроўваючы погляд на галоўнае. У ходзе страты тое, што мы сапраўды страчваем, — гэта тое благое.

Часта людзі лічаць добрым усё тое, за чым самі гоняцца. Насамрэч з пункту гледжання высокіх узроўняў усё гэта дзеля таго, каб сярод звычайных людзей задаволіць тыя нікчэмныя карыслівыя інтарэсы. У рэлігіі кажуць: «Як бы шмат грошай у цябе ні было, якой бы высокай ні была твая пасада, гэта ўсяго толькі на некалькі дзясяткаў гадоў. Гэтага не прынесці з сабой, калі нараджаешся, і не забраць, калі паміраеш». Чаму Ґун настолькі каштоўны? Таму, што ён расце непасрэдна на тваёй душы, і яго можна прынесці, калі нараджаешся, і ўзяць з сабой, калі паміраеш. Ды яшчэ ён непасрэдна вызначае твой Ранг дасягнення. Таму ўдасканальвацца цяжка. Іншымі словамі, ты адмаўляешся ад благога. Толькі так можна будзе даць табе вярнуцца туды, адкуль ты паходзіш. А што ж ты ў такім разе атрымаеш? Падвышэнне ўзроўню ды ўрэшце Паўнапраўнае дасягненне, дасягнеш поспеху і Поўнае Дасканаласці. Будзе вырашана карэнная праблема. Вядома, калі мы хочам пазбавіцца ад самых разнастайных жаданняў звычайных людзей і здолець дасягнуць эталону сапраўднага ўдасканальвальніка, дык адразу гэта выканаць усе-ткі цяжка. Трэба рабіць гэта паступова. Я кажу рабіць паступова, і ты пачуў. Ты скажаш: «Настаўнік кажа рабіць паступова, вось і рабіцьма паступова». Так нельга! Ты павінен прад’яўляць да сябе суровыя патрабаванні. Аднак мы дазваляем табе падвышацца паступова. Калі б ты сёння адразу ж усё выканаў, тады сёння і стаў бы Будам. Гэта нерэальна. Ты дасягнеш гэтага паступова.

Страчваем мы, па сутнасці, благое. І што ж гэта? Карма. Яна і разнастайныя навязлівыя ідэі чалавека адно аднаго ўзаемаабумоўліваюць. Напрыклад, звычайныя людзі маюць разнастайныя дрэнныя ідэі і, здзяйсняючы дзеля ўласнае выгады разнастайныя благія ўчынкі, атрымліваюць такое чорнае рэчыва — карму. Гэта непасрэдна звязана з нашымі ўласнымі думкамі. Каб пазбавіцца ад гэтага благога, спачатку трэба змяніць свае думкі.

**ПЕРАЎТВАРЭННЕ КАРМЫ**

Паміж белым і чорным рэчывам існуе працэс пераўтварэння. Ён адбываецца пасля ўзнікнення паміж людзьмі супярэчнасцяў. Здзяйсняючы добры ўчынак, атрымліваеш белае рэчыва — Дэ; здзяйсняючы благі, атрымліваеш чорнае рэчыва — карму. Таксама існуе працэс успадкавання. Хтосьці кажа: «Ці не таму гэта, што чалавек зрабіў нешта благое ў першай палове свайго жыцця?» Не абавязкова, што такая сітуацыя ва ўсіх, бо людзі накапляюць кармы не адно жыццё. У колах удасканальвальнікаў лічаць, што душа несмяротная. Калі душа несмяротная, тады ў яе, магчыма, была грамадская дзейнасць і да гэтага жыцця. Такім чынам, у сваёй дзейнасці ў папярэднім жыцці яна, верагодна, завінавацiла камусьці, абражала каго-небудзь альбо здзяйсняла іншыя благія ўчынкі, забівала жывых істотаў і да таго падобнае. Тады ствараецца такая карма. Гэтыя рэчы накапляюцца ў іншых прасторах, і чалавек заўжды носіць іх з сабой. Гэтак жа і з белым рэчывам. І гэта не адзіная іх крыніца. Існуе і такое, калі гэтыя рэчывы могуць накапляцца ў тваім родзе, сярод продкаў. Раней старыя казалі такія словы: «збірай Дэ, збірай Дэ!»; «продкі назапашваюць Дэ»; «гэты чалавек страчвае Дэ, губляе Дэ». Усе гэтыя словы былі абсалютна правільныя. Зараз звычайныя людзі да гэтага не прыслухоўваюцца. Ты кажаш той моладзі пра амаральнасць і пра недахоп Дэ, а яна зусім не бярэ гэта блізка да сэрца. Насамрэч значэнне белае матэрыі вельмі глыбокае. Яна не толькі з'яўляецца ідэалагічным і духоўным крытэрам сучасных людзей, а і рэальным матэрыяльным існаваннем. Нашае чалавечае цела мае абодва гэтыя рэчывы.

Нехта з вас запытваецца: «Гэта праўда, што пасля таго як чорнага рэчыва стала шмат, ты ўжо не зможаш удасканальвацца на высокія ўзроўні?» Можна сказаць так: вялікая колькасць чорнага рэчыва ўплывае на здольнасць усведамлення чалавека. Бо яно ўтварае вакол твайго цела поле, якое якраз абгортвае цябе з усіх бакоў, ізалюючы ад уласцівасці Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Здольнасць усведамлення ў такога чалавека, верагодна, будзе дрэннай. Іншыя кажуць пра самаўдасканальванне, ціґун, а ён гэта ўсё без выключэння лічыць забабонамі ды наогул не дае веры. Гэта здаецца яму смешным. Часта гэта так, але гэта не абсалютна. Ці праўда, што калі гэты чалавек захоча ўдасканальвацца, тады ўжо будзе вельмі цяжка, і ён ужо не зможа развіць высокі Ґун? Усё-ткі не. Мы кажам, што Дафа бязмежны. Усё цалкам грунтуецца на выпраўленні тваіх думак. Настаўнік заводзіць у дзверы[107], а ўдасканальванне залежыць ад самога чалавека. Усё залежыць ад таго, як ты будзеш удасканальвацца. У стане ты будзеш удасканальвацца альбо не, цалкам залежыць ад таго, ці зможаш ты сам трываць, ці зможаш аддаваць, ці зможаш пакутаваць. Калі ты здольны набрацца такое рашучасці, што аніякія цяжкасці цябе не спыняць, тады, на маю думку, няма праблемы.

Тыя, у каго шмат чорнае матэрыі, часта змушаныя больш аддаваць, чым тыя, у каго шмат белае. Паколькі белая матэрыя непасрэдна асімілюецца з уласцівасцю Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне, дык дастаткова толькі, каб Сіньсін чалавека падняўся, каб чалавек змог падвысіцца ў супярэчнасцях, і

тады ў яго ўжо расце Ґун. Вось наколькі проста. Людзі з вялікай колькасцю Дэ маюць высокае ўсведамленне і здольныя зносіць пакуты. «Стамляе яго цяглiцы ды косткі, гняце яго волю і думкі»[108] — нават калі такія людзі будуць трываць у фізічным плане больш, а ў духоўным менш, тады ў іх усё адно можа расці Ґун. Для тых, у каго шмат чорнага рэчыва, такое ўжо не дазволена. Яны мусяць спачатку прайсці такі працэс: перадусім ім трэба ператварыць чорнае рэчыва ў белае. Вось які працэс. Ён надзвычай балючы. Таму часта людзям з дрэннай здольнасцю ўсведамлення трэба больш пакутаваць. Калі карма вялікая, а ўсведамленне слабае, тады ўдасканальвацца чалавеку цяжэй.

Прывядзем канкрэтны прыклад і паглядзім, як яны ўдасканальваюцца. Падчас удасканальвання ў медытацыі неабходна доўга сядзець у паставе лотасу. Калі прымаеш гэтую паставу, тады ногі і баляць, і дранцвеюць. З часам з'яўляецца неспакой, нясцерпны неспакой. «Стамляе яго цягліцы ды косткі, гняце яго волю і думкі» — целу непрыемна, на душы таксама непрыемна. Некаторыя людзі падчас сядзення ў паставе лотасу баяцца болю. Яны выпростваюць ногі, не жадаючы праявіць настойлівасць. Некаторыя, прасядзеўшы ў гэтай паставе крыху даўжэй, ужо не вытрымліваюць. Калі яны выпростваюць ногі, практыка зводзіцца на нішто. Як толькі ногі ў паставе лотасу забаляць, дык гэтыя людзі парухаюць імі ды пасля гэтага зноў прымаюць паставу лотасу. На наш погляд, тады ад практыкі няма эфекту. Бо, калі ім баляць ногі, мы бачым, што ногі атакуе чорнае рэчыва. Чорнае рэчыва — гэта карма. Пакутуючы, можна яе ліквідаваць, пераўтварыўшы яе гэтым у Дэ. З узнікненнем болю карма ўжо пачынае знішчацца. Чым больш яна ціснe ўніз, тым усё больш рэзкім становіцца боль у іх нагах. Таму ногі ў гэтых людзей баляць не беспадстаўна. Часта тым, хто сядзіць у медытацыі, ногі баляць прыступамі. Калі адбываецца прыступ, становіцца надзвычай нясцерпна, а калі ён мінае, тады ты трохі адыходзіш, але пасля зноў пачынае балець. Часта гэта так.

Карма ж знішчаецца згустак за згусткам. Калі быў знішчаны адзін згустак, назе становіцца трохі лепей. Неўзабаве зноў усплывае згустак, і зноў пачынаецца боль. Чорнае рэчыва пасля ануляванне не знікае. Тут таксама дзейнічае закон захавання матэрыі. Пасля ўстаранення яно непасрэдна пераходзіць у белае рэчыва, а белае рэчыва — гэта Дэ. Чаму ж карма можа так пераўтварацца? Бо чалавек папакутаваў, аддаў, вытрываў боль. Мы вучым, што Дэ ты атрымліваеш дзякуючы таму, што стрываў боль, выпакутаваў, зрабіў дабро. Таму падчас медытацыі і ўзнікае гэтая праблема. Некаторыя людзі, як толькі ногі ім хоць трохі забаляць, выпростваюць іх, размінаюць ды зноўку садзяцца ў лотас. Тады наогул няма эфекту. Некаторыя, стоячы ў паставе слупа[109], калі іх паднятыя рукі стамляюцца, не вытрымліваюць ды апускаюць іх. Тады зусім няма аніякага эфекту. Што гэта за пакуты? Я сказаў бы, калі б чалавек, патрымаўшы так рукі падчас практыкі, ужо мог бы паспяхова ўдасканаліцца, тады гэта было б проста-такі занадта лёгка. Вось якія ўзнікаюць сітуацыі ў людзей падчас удасканальвання ў медытацыі.

Нашая школа галоўным чынам усё ж такі не ідзе такім шляхам, хаця гэты аспект адыгрывае пэўную ролю. Большасць з нас пераўтварае карму ў звязаных з Сіньсін звадах паміж людзьмі. Вось у чым гэта часта ўвасабляецца. Калі чалавек знаходзіцца ў супярэчнасцях, у звадах з людзьмі, тады гэта нават перавышае такі боль. Я сказаў бы, што стрываць боль у целе — гэта самае лёгкае: сцісні зубы — і ўсё ўжо мінула. А вось калі людзі плятуць інтрыгі[110], тады стрымаць свае пачуцці цяжэй за ўсё.

Прывяду прыклад. Чалавек, прыйшоўшы на працу, чуе, як двое распавядаюць пра яго гадасці, вельмі крыўдныя, ад чаго ён вельмі раззлаваўся. Але, як мы ўжо казалі, калі ты практыкоўца, трэба дасягнуць таго, каб не наносіць удар у адказ, калі цябе б'юць, не гаварыць нічога ў адказ, калі цябе лаюць, трэба прад’яўляць да сябе патрабаванні па высокіх крытэрах. Вось гэты чалавек і думае: «Настаўнік сказаў, што мы, практыкоўцы, не такія, як іншыя, і трэба быць велікадушнымі». Ён не стаў сварыцца з тымі двума. Але часта, калі ўзнікае супярэчнасць і не раздражняе душу чалавека, тады яна не залічваецца, не спрацоўвае — падвышэння не дасягнуць. Таму чалавека не пакідаюць думкі пра гэта, яно яго трывожыць. Верагодна, гэта распальвае сэрца чалавека, ён увесь час хоча азірнуцца ды паглядзець на выразы твараў дваіх, якія злосна пляткараць пра яго. Чалавек азіраецца і бачыць іх лютыя фізіяноміі ў самым разгары размовы. Ён адразу ж не стрымліваецца, закіпае і, верагодна, адразу ж з імі сварыцца. Калі паміж людзьмі ўзнікаюць супярэчнасці, тады вельмі цяжка ўтрымаць сябе ў руках. Калі б усё адбывалася падчас сядзення ў медытацыі, тады, я сказаў бы, што гэта яшчэ было б лёгка. Вось толькі заўсёды так не будзе.

Таму ў сваёй далейшай практыцы ты сутыкнешся з самымі разнастайнымі бедамі. Калі б іх не было, тады як бы ты ўдасканальваўся?! Сярод прысутных усе такія: і ты добры, і я добры, няма канфлікту інтарэсаў, няма перашкодаў ад чалавечых думак. Ты сядзеш там, і твой Сіньсін ужо падвысіцца? Так нічога не атрымаецца. Чалавек павінен па-сапраўднаму на практыцы сябе загартоўваць, толькі тады ён зможа падвысіцца. Нехта з вас мяне спытаў: «Чаму, практыкуючы, мы ўвесь час сутыкаемся з непрыемнымі выпадкамі? І яны амаль не адрозніваюцца ад тых, што ў звычайных людзей». Таму што ты ўдасканальваешся менавіта сярод звычайных людзей. Не будзе такога, каб цябе раптам перавярнулі дагары нагамі, паднялі ў паветра ды, прымусіўшы так вісець, адправілі на неба трохі папакутаваць. Такога не будзе. Усё будзе ў стане звычайных людзей: хтосьці цябе сёння раздражняў, хтосьці правакаваў, хтосьці дрэнна з табой абышоўся, без нічога ніякага нагаварыў табе грубасцяў. Тады глядзяць менавіта на тое, як ты паставішся да гэтых праблемаў.

Чаму ты сутыкаешся з гэтымі праблемамі? Усе яны выкліканыя тваёй уласнай кармай, якую ты завінаваціў. Мы ўжо ліквідавалі табе безліч, безліч яе частак. Засталася толькі мізэрная колькасць бедаў, падзеленых ды расстаўленых на кожным узроўні для падвышэння твайго Сіньсін, загартоўкі чалавечага сэрца ды

ўстаранення ўсялякіх навязлівых ідэяў. Усё гэта твае ўласныя беды. Мы скарысталіся імі для падвышэння твайго Сіньсін і цалкам здольныя даць табе іх прайсці. Дастаткова толькі, каб ты падвысіў Сіньсін, і ўжо зможаш прайсці. Асцерагаемся толькі таго, што сам ты не захочаш гэтага зрабіць. Калі ты толькі захочаш прайсці, тады зможаш. Такім чынам, калі ты з гэтага часу будзеш сутыкацца з супярэчнасцямі, не лічы іх выпадковымі. Бо, калі супярэчнасці ўзнікаюць, гэта адбываецца раптоўна, але ўсё-ткі яны існуюць не выпадкова, а для таго, каб ты падвысіў свой Сіньсін. Толькі б ты лічыў сябе практыкоўцам, тады і зможаш усё паспяхова вырашыць.

Вядома, пра набліжэнне бедаў ды супярэчнасцяў да іх з'яўлення табе не скажуць. Калі табе ўсё паведаміць, тады што ж застанецца для твайго ўдасканальвання? Яны ўжо не будуць мець эфекту. Часта яны ўзнікаюць знянацку. Толькі тады можна выпрабаваць Сіньсін чалавека, толькі тады можна дазволіць яго Сіньсін дасягнуць сапраўднага падвышэння, убачыць, ці зможа чалавек утрымаць Сіньсін. Толькі тады можна будзе гэта ўбачыць. Такім чынам, супярэчнасці ўзнікаюць невыпадкова. Ва ўсім працэсе ўдасканальвання падчас пераўтварэння кармы ўзнікаюць гэтыя праблемы. Яны нашмат складанейшыя за тое, калі табе «гняце цягліцы ды косткі», як гэта звычайна ўяўляюць людзі: практыкуючы, выконваў рухі цела трохі даўжэй, і паднятыя рукі пачалі дрыжэць, альбо ногі стаміліся ад стаяння, і так нібыта ўжо ўзрасце Ґун. Ты будзеш практыкаваць на некалькі гадзін больш, і толькі ад гэтага ў цябе ўжо зможа ўзрасці Ґун? Гэта мае эфект толькі ў пераўтварэнні твайго ўласнага цела. Але таксама неабходна энергія, якая адыгрывала б ролю ўзмацнення. Гэта не дае эфекту падвышэння ўзроўню. «Гнесці яго волю і думкі» — вось што з'яўляецца сапраўдным ключом да падвышэння ўзроўню. Калі сцвярджаць, што можна падвысіцца, калі «стамляе цягліцы ды косткі», дык я спытаў бы наступнае: кітайскія сяляне пакутуюць больш за ўсіх, такім чынам, паводле гэтае логікі, яны павінны былі б пертварыцца ў вялікіх майстроў ціґун? Як бы табе ні «стамляла цяглiцы ды косткі», ты ім у гэтым саступіш. Дзень пры дні, нягледзячы на пякучае сонца, яны працуюць у полі ды пакутуюць ад знясільвальнай працы. Усё не так проста. Таму, як мы ўжо казалі, калі хочаш сапраўды падвысіцца, трэба зрабіць так, каб сапраўды падвысіліся твае думкі. Толькі тады ты зможаш сапраўды падвысіцца.

Каб у ходзе пераўтварэння кармы быць здольнымі ўтрымаць сябе ў руках і каб не адбылося так, як у звычайных людзей, калі яны робяць толькі горш, нам у паўсядзённым жыцці трэба захоўваць міласэрныя думкі і добразычлівы настрой. Калі раптоўна ты сустрэнешся з нейкай праблемай, тады зможаш паспяхова яе вырашыць. Часта, калі твае думкі ўвесь час застаюцца добрымі ды міласэрнымі, і знянацку ўзнікае праблема, ты маеш магчымасць змякчыць удар, маеш магчымасць памеркаваць. Калі ты ў думках пастаянна спрачаешся з іншымі, усяляк з імі змагаешся, тады я спрагназаваў бы, што як толькі ты сутыкнешся з праблемай, дык адразу ж пасварышся з іншымі. Гарантую, што так будзе. Таму я кажу: сутыкнуўшыся з нейкай супярэчнасцю, сапраўды трэба

дабіцца таго, каб твая чорная матэрыя была пераўтвораная ў белую, пераўтвораная ў Дэ.

Нашае чалавецтва развілося да такое ступені, як сёння, калі практычна ў кожнага чалавека, які нарадзіўся, да кармы дадаецца яшчэ карма; калі людзі ў сваіх целах маюць гіганцкую карму. Таму часта ў праблеме трансфармавання кармы з'яўляецца сітуацыя, калі адначасова з ростам твайго Ґун, адначасова з падвышэннем твайго Сіньсін ліквідуецца ды пераўтвараецца і твая карма. Калі, сутыкнуўшыся з супярэчнасцю, якая, магчыма, праявіцца ў загартоўцы[111] Сіньсін пры ўзаемадзеянні з людзьмі, ты зможаш сцярпець, тады і твая карма знішчыцца, і Сіньсін падымецца, і Ґун вырасце — яны сплавяцца разам. У людзей мінулага Дэ быў вялікім, іх Сіньсін ужо і так быў высокім. Варта ім было толькі вытрымаць нават мізэрныя пакуты, і ў іх ужо мог расці Ґун. Цяперашнія людзі не такія: як толькі яны сутыкаюцца з пакутамі, дык ужо не жадаюць удасканальвацца, ды яшчэ іх усведамленне ўсё пагаршаецца, а значыць, удасканальвацца ім становіцца яшчэ складаней.

У самаўдасканальванні, калі рэагуеш на канкрэтныя супярэчнасці, калі іншыя дрэнна з табой абыходзяцца, могуць быць дзве прычыны. Па-першае, у папярэднім жыцці ты, магчыма, дрэнна абыходзіўся з іншымі. Ты ж губляеш душэўную раўнавагу: чаго гэта са мной так абыходзяцца? У такім разе чаму ў мінулым ты паводзіўся так з іншымі? Кажаш, што тады ты не ведаў, і што гэтае жыццё не мае аніякага дачынення да падзеяў тых жыццяў. Так нельга. Ёсць таксама іншае — у супярэчнасцях закранаецца пытанне пераўтварэння кармы. Такім чынам, калі мы канкрэтна на іх рэагуем, нам трэба быць велікадушнымі, нельга рабіць, як звычайныя людзі. На прадпрыемствах, у іншых працоўных асяроддзях усё гэтак жа. У самазанятых асобаў таксама, яны маюць зносіны з людзьмі. Немагчыма не кантактаваць з грамадствам. Прынамсі ёсць суседскія стасункі.

У грамадскіх стасунках усе сутыкаюцца з самымі разнастайнымі супярэчнасцямі. Што тычыцца тое часткі нашых практыкоўцаў, якія ўдасканальваюцца сярод звычайных людзей, — колькі б грошай у цябе ні было і якую б высокую пасаду ты ні займаў, калі ты індывідуальны прадпрымальнік, запачаткаваў кампанію, займаешся нейкім бізнесам, усё гэта не страшна. Заключай сумленныя ўгоды ды будзь праведны сэрцам. Кожнай прафесіі чалавечага грамадства належыць існаваць. Справа ў тым, што ў людзей няправеднае сэрца, а не ў тым, якім відам працы яны займаюцца. Раней быў выраз «з дзесяці гандляроў — дзевяць махляроў»[112]. Гэта словы звычайных людзей. Я лічу, праблема ў сэрцы чалавека. Трэба, каб усе былі праведныя сэрцам, заключалі сумленныя ўгоды — ты больш аддаеш, таму і павінен зарабляць больш грошай. Ты атрымліваеш таму, што сярод звычайных людзей нешта аддаеш. Не страціш — не атрымаеш. Гэта працоўны даход. У кожнай праслойцы грамадства можна быць добрым чалавекам. У розных праслойках — розныя супярэчнасці. У вышэйшых слаях — формы супярэчнасцяў

вышэйшых слаёў. Усюды можна правільна ставіцца да супярэчнасцяў; у любой грамадскай праслойцы існуе пытанне, як быць добрым чалавекам. Паўсюль можна зрабіцца абыякавым да разнастайных жаданняў ды навязлівых ідэяў. У кожным з розных слаёў можна праявіць сябе добрым чалавекам. Кожны можа ўдасканальвацца ў тым слоі, у якім ён знаходзіцца.

Зараз у Кітаі, незалежна ад таго, ці на дзяржаўных, ці на іншых прадпрыемствах, супярэчнасці паміж людзьмі надзвычай асаблівыя. У іншых краінах ды ў гісторыі ніколі не было такое з'явы. Таму звязаныя з выгадамі супярэчнасці праяўляюцца вельмі востра. Інтрыгі, барацьба за нікчэмную выгаду. Думкі, якімі людзі кіруюцца, прыёмы, якія выкарыстоўваюць, вельмі паскудныя. Нават добрым чалавекам быць цяжка. Напрыклад, чалавек прыйшоў працаваць на прадпрыемства. Ён адчуў, што атмасфера тут нейкая ненармальная. Потым нехта яму распавёў: «Такі-та распаўсюдзіў пра цябе жахлівую інфармацыю, звярнуўся да кіраўніцтва са скаргай на цябе і страшэнна цябе дыскрэдытаваў». Людзі кідаюць на цябе здзіўленыя позіркі. Хіба просты чалавек зможа такое сцярпець? Як можна вынесці гэткую абразу? «Ён са мной так абыходзіцца, дык я адкажу яму тым жа. У яго свае прыхільнікі, у мяне — свае. Пазмагаймася». Калі ты так зробіш сярод звычайных людзей, тады яны назавуць цябе моцным. Аднак калі ты практыкоўца, дык будзеш зусім нікуды не варты. Калі ты змагаешся гэтак жа, як звычайныя людзі, тады і з’яўляешся звычайным чалавекам. Калі ты так будзеш рабіць з яшчэ большай заўзятасцю, чым ён, дык акажашся яшчэ горшым за таго звычайнага чалавека.

Як нам рэагаваць на такія праблемы? Калі мы сутыкаемся з такімі супярэчнасцямі, нам перш за ўсё трэба захоўваць спакой, не трэба паводзіцца гэтак жа, як супрацьлеглы бок. Вядома, мы можам добразычліва ўсё растлумачыць. Калі мы дакладна пра ўсё распавядзем, тады нічога страшнага ў гэтым няма. Аднак ты не павінен быць да гэтага занадта прывязаным. Калі мы сутыкаемся з такімі непрыемнасцямі, тады нельга змагацца гэтак жа, як іншыя. Калі ты робіш, як ён, хіба ты не з’яўляешся звычайным чалавекам? Табе не толькі нельга змагацца, як ён, табе яшчэ і нельга ў душы яго ненавідзець. Насамрэч нельга ненавідзець. Калі ты стаў яго ненавідзець, хіба ты не паддаўся гневу? Такім чынам, ты не дасягнуў Цярпення. Мы ж прытрымліваемся Ісціны, Дабрыні, Цярпення. У такім разе тваёй Дабрыні тым больш няма адкуль узяцца. Таму табе нельга быць такім жа, як ён. Табе сапраўды нельга на яго злавацца, нягледзячы на тое, што ён дыскрэдытаваў цябе і перад кіраўніцтвам, і перад супрацоўнікамі — так, што табе ад гэтага сорамна галаву падняць. Табе не толькі нельга на яго злавацца, але нават трэба ў душы яму дзякаваць. Сапраўды трэба дзякаваць. Сярод звычайных людзей, магчыма, вось як падумаюць: хіба я тады не ператваруся ў Ак’ю[113]? Скажу табе: гэта не той выпадак.

Задумайся, калі ты практыкоўца, тады хіба не трэба прад’яўляць да цябе і патрабаванні па высокіх крытэрах?! Магчыма, ужо нельга патрабаваць ад цябе

па прынцыпе звычайных людзей. Раз ты ўдасканальвальнік, значыць, ты атрымліваеш рэчы высокіх узроўняў, ці не так? Такім чынам, трэба прад’яўляць да цябе і патрабаванні па прынцыпах высокіх узроўняў. Калі ты зробіш так, як супрацьлеглы бок, тады хіба не станеш такім жа, як ён? Дык чаму ж трэба яшчэ і дзякаваць яму? Падумай: што ты атрымліваеш? У Сусвеце існуе прынцып, які гучыць як «хто не страціў, не атрымае; калі атрымліваеш, тады страціш». Той чалавек вельмі сапсаваў тваю рэпутацыю сярод звычайных людзей — ён лічыцца бокам, які атрымаў. Ён пажывіўся за чужы рахунак. Чым больш ён цябе дыскрэдытаваў, чым большую зрабіў сенсацыю, тым больш табе прыйшлося знесці, тым больш Дэ ён страціў. Увесь гэты Дэ ён аддаў табе. Адначасова, калі ты ўсё гэта зносіў, магчыма, супакоіўся да такое ступені, што стаў вельмі абыякавым да гэтага і не прыняў гэта блізка да сэрца.

У Сусвеце існуе і такі прынцып: калі ты вытрываў велізарныя пакуты, тады твая карма таксама будзе пераўтворана. Бо ты аддаў. Колькі ты знес, столькі і кармы пераўтвараецца — усё трансфармуецца ў Дэ. Дэ ж патрэбны практыкоўцам. Ты атрымаў двайную карысць. Яшчэ і ад кармы пазбавіўся. Калі б той чалавек не стварыў табе такую сітуацыю, дзе б ты падвысіў Сіньсін? Ты добры, і я добры, ва ўсім поўная ідылія, мы сядзім там, і ад гэтага ўжо ўзрастае Ґун — дзе ты такое бачыў?! Менавіта дзякуючы таму, што ён стварыў табе такую супярэчнасць, надарылася такая магчымасць для падвышэння Сіньсін. Таму ты змог падняць свой Сіньсін. Ці не ўзрос твой Сіньсін? Гэта трайная карысць. Ты практыкоўца. Калі падымаецца твой Сіньсін, тады ж падвышаецца і твой Ґун, ці не так? Чатыры карысці адным скокам. Хіба табе не трэба дзякаваць чалавеку? У душы табе сапраўды трэба яму як мае быць падзякаваць. Гэта сапраўды так.

Вядома, тым чалавекам кіравалі благія намеры, інакш бы ён не аддаў табе Дэ. Аднак ён сапраўды стварыў табе магчымасць для падвышэння Сіньсін. Гэта значыць, што мы абавязкова павінны надаваць вялікае значэнне ўдасканальванню Сіньсін. Адначасова з удасканальваннем Сіньсін устараняецца карма, ператвараючыся ў Дэ, і толькі тады ты можаш падвысіць свой узровень. Гэта з’яўляецца ўзаемаабумоўленым. На высокіх узроўнях прынцып цалкам змяняецца. Звычайныя людзі гэтага не разумеюць. Калі ты паглядзіш на прынцып на высокіх узроўнях, дык убачыш, што ён цалкам змяніўся. Ты бачыш прынцып сярод звычайных людзей і лічыш яго правільным, але ён не з'яўляецца сапраўды правільным. Толькі дасягнуўшы высокіх узроўняў, бачыш сапраўды правільнае. Вельмі часта гэта так.

Прынцып я вычарпальна вам патлумачыў і спадзяюся, што ў далейшым удасканальванні вы зможаце ставіцца да сябе як да практыкоўцаў і будзеце шчыра ўдасканальвацца, бо тут выкладзены гэты прынцып. Магчыма, некаторым з-за таго, што яны знаходзяцца сярод звычайных людзей, надзённая матэрыяльная выгада звычайных людзей, якая перад імі, усё ж такі здаецца больш практычнай. У магутнай плыні звычайных людзей яны ўсё ж такі не ў стане прад’яўляць да сябе патрабаванні па высокіх крытэрах. Насамрэч, каб

быць добрым звычайным чалавекам, існуюць прыклады герояў ды ўзорных постацяў. Гэта — прыклады для звычайных людзей. Калі ты хочаш быць удасканальвальнікам, тады ўсё цалкам грунтуецца на выпраўленні тваіх уласных думак, на тваім уласным усведамленні, і тут няма аніякага ўзору. На шчасце, мы сёння ўжо выклалі Дафа. У мінулым, калі б ты і хацеў удасканальвацца, ніхто яшчэ не распавядаў, як гэта рабіць! Такім чынам, кіруючыся ў сваіх учынках Дафа, магчыма, ты будзеш рабіць лепей. Ці зможаш ты ўдасканальвацца, ці зможаш гэта рэалізаваць, прарыў да якога ўзроўню здзейсніш — гэта ўжо цалкам залежыць ад цябе самога.

Вядома, форма пераўтварэння кармы не поўнасцю такая, як я толькі што распавёў. Яно праяўляецца і ў іншых аспектах, узнікаючы і ў грамадстве, і дома. Магчыма, ты сутыкнешся з непрыемнымі інцыдэнтамі, ідучы па вуліцы альбо знаходзячыся ў іншым сацыяльным асяроддзі. Трэба даць табе вызваліцца ад усіх ідэяў, за якія ты, не адпускаючы, трымаешся сярод звычайных людзей. Усе навязлівыя ідэі, калі толькі яны ў цябе ёсць, трэба ва ўсялякіх сітуацыях сцерці. Цябе прымусяць набіць сабе ґузы[114] і дзякуючы гэтаму ўсвядоміць Даа. Менавіта так і праходзіць самаўдасканальванне.

Даволі тыповай з'яўляецца і такая сітуацыя. Шмат у каго з нас у ходзе ўдасканальвання бывае такое: часта, калі ты практыкуеш, твая жонка ці муж надзвычай злуецца. Як толькі ты возьмешся выконваць практыку, дык твая «палова» пачынае з табой ваяваць. Калі ты робіш нешта іншае, тады яна не ўмешваецца. Ты распавядаеш, што калі ты, гуляючы ў ма́дзян[115], марнуеш на яго шмат часу, тады твая «палова» таксама незадаволеная, але не настолькі, як падчас тваёй практыкі ціґун. Твая практыка ніяк не правакуе і не зачапляе тваю «палову», а загартоўвае тваё цела, гэта ж такая добрая рэч! Але варта табе толькі пачаць практыкаваць, дык твая «палова» спаганяе на табе сваё раздражненне. У некаторых з-за практыкі такія сваркі з іх «паловай», што яны вось-вось расстануцца. Вялікая колькасць людзей не задумвалася пра тое, чаму ж гэтая сітуацыя ўзнікае. Пасля ты запытваешся ў сваёй жонкі ці мужа: «Чаму ж тое, што я выконваю практыкаванні, выклікае ў цябе такую вялікую злосць?!» Яна ці ён не знаходзіць адказу, сапраўды не можа нічога адказаць: «Вядома, мне не трэба было так злавацца! Тады мяне сапраўды ахапіў неймаверна вялікі гнеў». У чым жа тут насамрэч справа? Адначасова з практыкай мае месца пераўтварэнне кармы. Хто не страціць, той не атрымае. Страчваеш ты, урэшце, благое. Табе трэба аддаваць.

Магчыма, як толькі ты, прыйшоўшы дадому, зойдзеш у дзверы, дык твая жонка ці муж накінецца на цябе са страшэнным скандалам. Калі ты стрываеш, тады сваю сённяшнюю практыку ціґун ты выконваў не дарэмна. Ёсць такія, хто разумее, што, практыкуючы, трэба надаваць вялікую ўвагу маральнасці, таму, як правіла, вельмі добра ставяцца да сваёй «паловы». Але тут гэты чалавек можа падумаць: «Звычайна як кажу, так і робіцца, аднак сёння “на галаву мне садзіцца”». Чалавек не можа саўладаць са сваім гневам ды распачынае сварку,

з-за чаго сённяшняя практыка адразу ж зноў аказваецца марнай. У цябе ж прысутнічае карма. Твая «палова» дапамагае табе ад яе пазбавіцца. А ты гэтага не прымаеш. Ты сварышся са сваёй «паловай», ад чаго карму не атрымліваецца паспяхова ўстараніць. Такіх выпадкаў вельмі шмат. Безліч нашых практыкоўцаў раней сутыкалася з такой сітуацыяй, але не задумвалася, чаму так адбываецца. Калі ты робіш нешта іншае, тады твая жонка ці муж не надта ў гэта і ўмешваецца. Тут жа, па сутнасці, добрая справа, а твая «палова», наадварот, пастаянна табе перашкаджае. Насамрэч яна проста дапамагае табе пазбавіцца ад кармы. Але ёй самой пра гэта невядома. Гэта зусім не так, што твая «палова» толькі знешне з табой пасварылася, а ў душы ўсё яшчэ цудоўна да цябе ставіцца. Гэта зусім не так. Яна раззлавалася сапраўды непрытворна. Бо кожны, на каго апускаецца карма, пачуваецца блага. Гарантую, што гэта так.

**ПАДВЫШЭННЕ СІНЬСІН**

Раней у многіх людзей з-за таго, што яны не маглі ўтрымаць свой Сіньсін, узнікала вялікая колькасць праблем. Па дасягненні ў практыцы пэўнага ўзроўню ім больш не ўдавалася падвысіцца. Ёсць такія, у каго ўжо з самага пачатку быў даволі высокі Сіньсін. У практыцы ў іх адразу адкрылася нябеснае вока і дасягнула нейкае сферы. Паколькі ў гэтага чалавека даволі добрая маральная аснова ды вельмі высокі Сіньсін, значыць, яго Ґун таксама вельмі хутка падымаецца. Калі чалавек дасягае месцазнаходжання свайго Сіньсін, яго Ґун таксама вырастае да такое вышыні. Калі чалавек захоча падняць свой Ґун яшчэ вышэй, тады і супярэчнасці абвострацца. Тады трэба патрабаваць, каб ён і далей падвышаў свой Сіньсін. Асабліва ў выпадку з тымі, у каго ад нараджэння добрая маральная аснова. Ён увесь час адчувае, што яго Ґун выдатна ўзрастае. Практыкуе ён таксама вельмі добра. Але чаму ж раптам узнікла так шмат клапотных спраў? Чаму ўсё стала блага? І людзі пачалі кепска да яго ставіцца, і начальніку ён стаў не падабацца, і сітуацыя дома стала вельмі напружанай. Чаму ж узнікае столькі супярэчнасцяў? Сам ён яшчэ не ўсвядоміў. Раз у яго добрая маральная аснова, і ён дасягнуў пэўнага ўзроўню, узнік такі стан. Але хіба гэта канчатковы эталон Поўнае Дасканаласці практыкоўцы? Да завяршэння ўдасканальвання яшчэ далёка! Табе трэба падвышацца і далей. Ты змог дасягнуць такога стану толькі дзякуючы сваёй невялікай маральнай аснове. А каб падняцца яшчэ вышэй, трэба падвысіць і крытэры.

Некаторыя кажуць: «Калі я зараблю пабольш грошай, уладкую сваю сям'ю, тады мяне больш нічога не будзе турбаваць. Тады я стану ўдасканальвацца па Даа». Я сказаў бы, што гэта ў цябе нязбытныя мары. Ты не ў стане ўмяшацца ў жыццё іншых, не ў стане кіраваць іх лёсам, у тым ліку лёсам жонкі ды дзяцей, бацькоў ды братоў. Хіба ў гэтым твае слова з'яўляецца вырашальным? Апроч таго, калі ў цябе больш не будзе хвалявання за свой тыл, калі не застанецца аніякіх клопатаў, тады што ж застанецца для твайго ўдасканальвання? У

камфорце ды ўтульнасці вось там будзеш выконваць практыку? Дзе ты такое бачыў? Гэта ты разважаеш з пазіцыі звычайнага чалавека.

У самаўдасканальванні якраз і трэба практыкаваць, знаходзячыся ў бедах, у якіх паглядзяць, ці зможаш ты парваць з сямю пачуццямі ды шасцю жаданнямі, ці зможаш раўнадушна да іх ставіцца. Калі ты ўвесь час будзеш моцна трымацца за гэтыя рэчы, дык не зможаш удасканаліцца. Любая справа мае прычынную сувязь. Чаму людзі могуць быць людзьмі? Бо ў людзей ёсць пачуцці. Дзеля гэтых пачуццяў людзі і жывуць. Родная пачуцці, пачуцці паміж мужчынам і жанчынай, бацькоўскія пачуцці, прыхільнасць, сяброўскія пачуцці, людзі робяць нешта дзеля сяброўства — ні ў чым нельга адысці ад пачуццяў. Хочаш нешта рабіць ці не хочаш, рады ці не рады, любоў і нянавісць — усё, што ёсць у цэлым чалавечым грамадстве, цалкам бярэ выток з пачуццяў. Калі ты не парвеш з імі, дык не зможаш удасканальвацца. Калі ты выскачыш з пачуццяў, тады ніхто не зможа цябе закрануць. Настроі звычайных людзей ужо не змогуць весці цябе за сабой. Іх месца зойме міласэрнасць, што з’яўляецца чымсьці больш высакародным. Вядома, адразу парваць з гэтым усё-ткі цяжка. Удасканальванне — працэс павольны. Гэта працэс паступовага ўстаранення тваіх навязлівых ідэяў. Аднак сам ты павінен прад’яўляць да сябе строгія патрабаванні.

У нас, як у практыкоўцаў, супярэчнасці ўзнікаюць знянацку. Што рабіць? Калі ты ўвесь час будзеш захоўваць міласэрны настрой, спакойны і добразычлівы душэўны стан, тады, сутыкнуўшыся з праблемай, зробіш добра, бо будзе магчымасць для змякчэння канфлікту. Калі ты ўвесь час міласэрны, робіш людзям дабро, ажыццяўляючы нешта, заўсёды думаеш пра іншых і штораз, калі сутыкаешся з праблемай, перш за ўсё думаеш пра тое, ці змогуць іншыя гэта вытрымаць, ці не прычыніць гэта шкоду іншым, тады не ўзнікне праблем. Такім чынам, практыкуючы, табе трэба прад’яўляць да сябе патрабаванні па высокіх ды яшчэ больш высокіх крытэрах.

Часта некаторыя людзі не могуць гэтага ўсвядоміць. У кагосьці адкрылася нябеснае вока, і ён убачыў Буду. Вярнуўшыся дадому, ён выконвае паклон перад Будам, а ў думках паўтарае: «Чаму ж ты пра мяне не клапоцішся?! Дапамажы мне вырашыць гэтую праблему!» Буда ж, вядома, не стаў умешвацца. Бедства менавіта ён і запланаваў. Мэта — падвысіць твой Сіньсін. У супярэчнасці ты можаш падвысіцца. Хіба Буда можа вырашыць для цябе гэтую праблему? Ён зусім гэтага не зробіць. Калі Буда яе вырашыць, тады як у цябе зможа ўзрасці Ґун, як ты падвысіш свой Сіньсін ды ўзровень? Даць табе дамагчыся ўзрастання Ґун — вось што з'яўляецца ключавым. З пункту гледжання Вялікіх Прабуджаных, быць чалавекам — гэта не мэта. Сэнс чалавечага жыцця не ў тым, каб быць чалавекам, а ў тым, каб ты вярнуўся назад. Колькі чалавек будзе пакутаваць? Яны лічаць, што чым больш будзе пакутаваць, тым лепш. Так ён хутчэй верне даўгі. Вось які ў іх лад мыслення. А вышэйзгаданы чалавек не змог гэтага зразумець. Калі з маленняў да Буды

нічога не атрымалася, ён пачаў на яго скардзіцца: «Як гэта так, ты ніколі мне не дапамагаеш? Толькі дзень пры дні палі табе фіміям ды кладзі зямныя паклоны». З-за гэтага чалавек разбіў статую Буды і пасля пачаў ганьбіць Буду. А паколькі ён стаў ганьбіць Буду, Сіньсін яго ўпаў, а Ґун знік. Зразумеўшы, што ў яго нічога не засталося, ён яшчэ больш узненавідзеў Буду. Ён падумаў, што той яго губіць. Сіньсін Буды ён ацэньвае па логіцы звычайных людзей. Хіба можна так ацэньваць? На справы высокага ўзроўню ён глядзіць, прытрымліваючыся крытэраў звычайных людзей. Хіба так можна? Таму часта ўзнікае такая праблема — пакуты ў сваім жыцці людзі лічаць несправядлівасцю да сябе. Шмат людзей з-за гэтага вельмі хутка пападала ўніз.

Некалькі гадоў таму шмат вялікіх майстроў ціґун, сярод якіх і знакамітыя, таксама зведалі крах. Вядома, сапраўдныя майстры ціґун вярнуліся назад. Завершыўшы сваю гістарычную місію, яны ўжо вярнуліся. Засталіся і далей ажыццяўляюць сваю дзейнасць толькі тыя, хто згубіўся сярод звычайных людзей і ў каго ўпаў Сіньсін. У іх ужо няма Ґун. Некаторыя майстры ціґун, якія раней былі даволі вядомымі, усё яшчэ ажыццяўляюць сваю дзейнасць у грамадстве. Настаўнікі, убачыўшы, што гэтыя майстры ціґун упалі да ўзроўню звычайных людзей, загрузлі ў славе ды грошах і ўжо не здольныя выбрацца, што для іх ужо няма аніякае надзеі, адвялі прэч іх дапаможныя душы. Увесь іх Ґун быў на дапаможных душах. Такіх тыповых прыкладаў было неймаверна шмат.

У нашай школе такіх прыкладаў даволі мала. Калі і ёсць, дык яны не такія ўжо яскравыя. А вось у падвышэнні Сіньсін неймаверна шмат надзвычайных прыкладаў. Адзін з тых, хто ў нас вучыцца, працуе на тэкстыльнай фабрыцы нейкага горада правінцыі Шаньдун. Пасля таго як пачаў вучыцца Фалунь Дафа, ён навучыў практыцы таксама іншых працаўнікоў фабрыкі. У выніку гэта выклікала паляпшэнне маральнага вобразу ўсёй фабрыкі. Раней працаўнікі ўпотай забіралі дадому па махровым ручніку з тых, якія вырабляе фабрыка. Усе працаўнікі бралі. Пасля таго як наш вучань пачаў вучыцца практыцы, ён не толькі перастаў браць, але і прынес назад тое, што ўжо забраў сабе. Убачыўшы, што ён так робіць, усе астатнія таксама перасталі браць. А некаторыя нават вярнулі фабрыцы ўсё тое, што ўзялі раней. На ўсёй фабрыцы склалася такая сітуацыя.

Старшыня кансультацыйнага пункта аднаго горада прыбыў на адзін завод паглядзець, як практыкуюць тыя, хто вучыцца Фалунь Дафа. Дырэктар завода асабіста іх прыняў: «З таго часу, як гэтыя працаўнікі пачалі вучыцца вашаму Фалунь Дафа, яны прыходзяць рана, а сыходзяць позна, працуюць уважліва ды сумленна. Калі кіраўніцтва размяркоўвае нейкую працу, яны ніколі не праяўляюць пераборлівасці. Змагацца за свае інтарэсы таксама перасталі. Пачаўшы так рабіць, яны выклікалі паляпшэнне маральнага вобразу цэлага завода. Палепшылася і эканамічная эфектыўнасць завода. Ваш ціґун такі магутны! Калі прыедзе ваш Настаўнік? Я таксама пайду на курсы». Галоўная

мэта ўдасканальвання па нашым Фалунь Дафа — весці людзей на высокія ўзроўні. Мы наогул не думалі гэтага рабіць. Аднак Фалунь Дафа здольны адыгрываць велізарную стымулявальную ролю для духоўнае культуры грамадства. Калі кожны будзе шукаць у сабе, кожны будзе думаць, як яму рабіць добра, тады я сказаў бы, што грамадства стабілізуецца, а маральныя нормы чалавецтва зноў падымуцца.

Калі я выкладаў Закон і навучаў практыцы ў горадзе Тайюань, там была ўдзельніца курсаў, якой было за пяцьдзясят. Пажылая сямейная пара ішла на нашыя курсы. Калі яны, пераходзячы вуліцу, дайшлі да сярэдзіны праезнае часткі, з велізарнай хуткасцю прамчалася легкавое аўто, а яго люстэрка задняга агляду раптам зачапіла адзенне жанчыны. Зачапіўшы, аўто працягнула жанчыну больш за дзесяць метраў, і — «Бах!» — шпурнула яе на зямлю. Машына праехала яшчэ больш за 20 метраў, пакуль не спынілася. Кіроўца, выскачыўшы з аўто, яшчэ і раззлаваўся: «А! Ідзеш і не глядзіш». Цяперашні чалавек менавіта такі. Сутыкнуўшыся з праблемай, ён перш за ўсё пазбягае адказнасці. Вінаваты ці не, ён усё адно абвінавачвае іншых. Пасажыр, які сядзеў у машыне, сказаў: «Паглядзі, ці не пабілася яна, адвязі яе ў лякарню». Кіроўца апамятаўся і таропка кажа: «Спадарыня, як вы? Ці не траўмаваліся? Паедзьма ў лякарню, там вас агледзяць». Нашая вучаніца павольна паднялася з зямлі ды кажа: «Нічога страшнага, вы едзьце». Яна страсянула бруд, узяла мужа пад руку ды пайшла.

Калі яна прыйшла на курсы ды распавяла мне пра гэты інцыдэнт, я вельмі ўсцешыўся. У нашай вучаніцы сапраўды падвысіўся Сіньсін. Яна мне сказала: «Настаўніку, я ўжо пачала вучыцца Фалунь Дафа. Калі было б не так, тады я сёння да гэтага б так не паставілася». Задумайцеся: яна выйшла на пенсію, цяпер такія высокія цэны і не засталося аніякіх матэрыяльных ільготаў. Чалавека, якому за пяцьдзясят, аўто працягнула на такую вялікую адлегласць ды шпурнула на зямлю. Што б яна траўмавала? Усё цела траўмавала б. Яна ляжала б на зямлі і была б не ў стане падняцца. У лякарню? Калі ласка. Легла б у лякарню і больш не выйшла б адтуль. Калі на яе месцы быў бы звычайны чалавек, магчыма, усё менавіта так і было б. Але яна практыкоўца, яна так не зрабіла. Таму мы кажам: «Добра ці блага — вынікае з адное думкі. Розніца нават у адной думцы прывядзе да розных вынікаў». Калі б на месцы нашае вучаніцы быў звычайны чалавек, тады хіба мог бы ён, маючы такі ўзрост, не траўмавацца? Але яна нават скуру сабе не падрала. Добра ці блага — вынікае з адное думкі. Калі б яна, лежачы там, сказала: «Ай, паміраю! І тут, і там балюча», — тады, верагодна, у яе былі б разрывы звязак ды пераломы, пара́ліч. Колькі б грошай ёй ні далі, яна была б вымушаная праляжаць у лякарні ўсё астатняе жыццё без магчымасці ўстаць. Хіба магла б яна быць здаровай? А разявакі былі здзіўленыя: «Чаго ж гэтая пажылая спадарыня не садрала з кіроўцы трохі грошай? Няхай бы запатрабавала грошы». У цяперашніх людзей адбылося скрыўленне ўзроўню маралі. Так, кіроўца хутка вёў машыну. Але хіба ён мог наўмысна збіць чалавека? Хіба не здарылася гэта выпадкова? Аднак нашыя цяперашнія людзі менавіта такія. Калі не садраць з кіроўцы грошай, дык

нават разявакі ў душы застаюцца незадаволенымі. На маю думку, цяпер людзі ўжо не ў стане ясна адрозніць добрае ад благога. Калі ім нехта скажа, што яны робяць благі ўчынак, тады яны не дадуць веры. Бо ўзровень маралі цалкам змяніўся. Некаторыя людзі імкнуцца толькі да нажывы. Яны зробяць усё, абы можна было здабыць грошы. «Хто пра сябе не клапоціцца, таго Неба і Зямля знішчае» — гэта ўжо стала дэвізам!

Адзін з пекінскіх слухачоў курсаў пасля вячэры павёў дзіця на шпацыр па праспекце Т’е́ньмэнь[116]. Яны ўбачылі машыну з гучнагаварыльнікам, праз які людзей заахвочвалі купляць латарэйныя квіткі. Хлопчык зацікавіўся, яму захацелася таксама выцягнуць латарэйны квіток. «Латарэя, дык латарэя», — вучань даў дзіцяці адзін юань на квіток, і той адразу ж выцягнуў другі прыз — першакласны дзіцячы ровар. Хлопчык неймаверна ўсцешыўся. А ў нашага вучня ў тое ж імгненне ў галаве — «Бум!» — загуло: «Я ж практыкоўца. Як я магу гнацца за гэтай рэччу? Калі я атрымаю гэта няправедна нажытае дабро, дык колькі мушу аддаць іншым Дэ?!» Сыну ён сказаў: «Мы яго не возьмем. Калі хочаш, мы самі сабе купім ровар». Хлопчык засмуціўся: «Калі я прасіў цябе купіць, ты не купіў. Цяпер жа я сам выйграў ровар, а ты не даеш мне яго забраць». Ён так страшэнна плакаў і лямантаваў, што не было аніякага выйсця, акрамя як адвезці ровар дадому. Дома вучань чым больш пра гэта думаў, тым больш адчуваў, што нешта тут не так: «Я проста пайду і аддам ім грошы». Тады ён перадумаў — у яго з'явілася новая ідэя: «Латарэйных квіткоў ужо няма. Калі я аддам ім грошы, тады яны падзеляць іх паміж сабой. Я проста падару грошы нашай установе ў якасці ахвяравання».

Добра, што ва ўстанове працуе нямала тых, хто вучыцца Фалунь Дафа, і начальнік таксама яго разумее. Калі ў звычайным асяроддзі, у звычайнай установе ты скажаш, што ты практыкоўца, што ты выйграў ровар, але заяўляеш, што яго не возьмеш і аддасі прадпрыемству грошы ў якасці ахвяравання, тады нават кіраўнік падумае, што ў цябе з галавой нешта не так. Іншыя таксама пачнуць разважаць за тваёй спінай: «У яго што, у практыцы ціґун узніклі адхіленні, “выбліск ды вар'яцтва”?» Як я ўжо казаў, узровень маралі скрывіўся. У 50-60-я гады[117] хіба гэта было б дзіўным? Гэта быў бы цалкам звычайны выпадак, які ні ў кога не выклікаў бы вялікага здзіўлення.

Мы лічым, што, да якое б ступені ні змяняўся ўзровень маралі чалавецтва, уласцівасць Сусвету — Ісціна-Дабрыня-Цярпенне — усё-ткі вечна застаецца нязменнай. Калі нехта кажа, што ты добры, ты не абавязкова сапраўды добры; калі нехта кажа, што ты благі, дык ты не абавязкова сапраўды благі, бо крытэры ацэнкі добрага і благога сталі скажоныя. Добрым чалавекам з'яўляецца толькі той, хто адпавядае ўласцівасці Сусвету. Гэта адзіны крытэр ацэнкі добрага і благога чалавека. Гэта прызнаецца ў Сусвеце. Нягледзячы на тое, наколькі вялікія змены адбыліся з чалавечым грамадствам, на вялікі абвал узроўню маралі чалавецтва, на тое, што мараль грамадства штодня падае і людзі гоняцца толькі за нажывай, Сусвет зусім не змяняецца ўслед за зменамі ў

чалавецтве. Стаўшы ўдасканальвальнікам, ты ўжо не можаш прад'яўляць да сябе патрабаванні па крытэрах звычайных людзей. Звычайныя людзі кажуць, што гэта правільна, і вось ты паводле гэтага і робіш? Гэта нікуды не варта. Тое, што звычайныя людзі называюць добрым, зусім не абавязкова з'яўляецца добрым; тое, што яны называюць благім, таксама не абавязкова з'яўляецца благім. У эпоху скажоных маральных нормаў, калі хтосьці робіць блага, і ты яму скажаш, што ён робіць блага, дык ён нават не дасць веры! Удасканальвальнік павінен ацэньваць рэчы ўласцівасцю Сусвету — толькі тады ён зможа адрозніць, што з'яўляецца сапраўды добрым і сапраўды благім.

## УЛІВАННЕ ЭНЕРГІІ Ў МАКАЎКУ

У колах удасканальвальнікаў існуе з'ява, якая называецца ўліваннем энергіі ў макаўку[118]. Уліванне ў макаўку — гэта рэлігійная цырымонія ў метадзе ўдасканальвання Тантры Школы Буды. Яе мэта ў тым, што пасля яе правядзення гэтаму чалавеку ўжо нельга ўступаць у іншую школу — ён прызнаецца сапраўдным паслядоўнікам гэтае школы. А што ж цяпер выклікае здзіўленне? Тое, што такі рытуал з'явіўся і ў ціґун: уліванне ў макаўку пачалі выконваць і ў метадах практыкі Школы Даа, а ўжо не ў адной толькі адзінай Тантры. Як я ўжо казаў, усе, хто пад сцягам Тантры вучыць у грамадстве метаду практыкі Тантры — дакладна самазванцы. І чаму ж я так кажу? Бо Танская Тантра ў нашай краіне знікла больш за тысячу гадоў таму, і яе наогул больш не існуе; Тыбецкая Тантра з-за моўнага бар'еру да гэтага часу так і не пранікла ў цэласным выглядзе ў ханьскі рэгіён. Асаблівасць яшчэ ў тым, што Тыбецкая Тантра з'яўляецца эзатэрычнай рэлігіяй, у якой удасканальвацца трэба абавязкова ўпотай у манастыры. Апроч таго, абавязкова трэба таксама прайсці таемнае навучанне ў настаўніка — настаўнік вядзе чалавека ў яго эзатэрычным удасканальванні. Без выканання гэтых умоў катэгарычна нельга навучаць Тантры.

Шмат людзей паднялося ў Тыбет навучацца практыцы з такой мэтай: прайсці пасвячэнне ў вучні ды навучыцца Тыбецкай Тантры, каб у будучыні стаць майстрам ціґун, праславіцца ды разбагацець. Падумайце: ламы-«жывыя буды»[119], якія насамрэч атрымалі сапраўдную перадачу, маюць вельмі магутныя здольнасці ды могуць убачыць, пра што думаюць тыя, хто вучыцца практыцы. Як толькі яны паглядзяць на яго думкі, дык ім адразу ж стане зразумела, для чаго ён сюды прыехаў: захацеў падняцца сюды і навучыцца гэтым рэчам, каб потым выйсці адсюль і стаць майстрам ціґун — узбагаціцца ды зрабіць сабе імя, зруйнаваўшы метад удасканальвання ў Буду гэтае школы. Ці можна даць табе адвольна знявечыць настолькі сур'ёзную школу ўдасканальвання ў Буду, каб ты стаў нейкім там майстрыкам ціґун дзеля рэпутацыі ды грошай? Што ў цябе за матыў такі? Такім чынам, яму наогул нічога не перададуць, ён не атрымае сапраўднае перадачы. Вядома, манастыроў там шмат. Магчыма, ён атрымае трохі чагосьці павярхоўнага. Калі ў яго няправеднае сэрца, і ён жадае

стаць майстрам ціґун і рабіць дрэнныя рэчы, дык ён прывабіць нячысты дух. Нячысты дух таксама мае Ґун, толькі не Тыбецкае Тантры. Тыя, хто з'ехаў у Тыбет сапраўды ў пошуках Закону, магчыма, застануцца там і больш не вернуцца. Гэта шчырыя ўдасканальвальнікі.

Дзіўным з'яўляецца тое, што зараз у многіх метадах практыкі Школы Даа таксама выконваюць уліванне ў макаўку. Школа Даа мае справу з энергетычнымі каналамі, якое яшчэ ўліванне ў макаўку ў іх можа быць?! Калі я вучыў практыцы на поўдні, дык, наколькі я ведаю, там было ажно больш за дзесяць бязладных метадаў практыкі, якія праводзілі ўліванне ў макаўку, у прыватнасці, даволі шмат такога было ў правінцыі Ґўандун. У чым тут справа? Ён зрабіў табе ўліванне ў макаўку, значыць, ты стаў яго паслядоўнікам, і табе больш нельга навучацца іншаму ціґун. Калі ты пачнеш яму вучыцца, ён цябе пакарае. Вось для чаго яны гэта робяць. Хіба гэта не ерась? Тое, чаму яны вучаць, прыналежыць да лекавання ды аздараўлення. Народ, навучыўшыся гэтаму, хоча ўсяго толькі атрымаць здароўе. Навошта ж такое рабіць? Некаторыя кажуць, што, калі чалавек пачаў займацца яго ціґун, яму больш нельга займацца іншым ціґун. Ці здольны ён выратаваць людзей так, каб тыя дасягнулі Поўнае Дасканаласці? Гэта ж ён выводзіць слабейшых за сябе на хібны шлях[120]. Вельмі шмат хто так робіць.

У Школе Даа такога няма, і ўсё адно там з'явілася «ўліванне ў макаўку». Я выявіў, што ў таго майстра ціґун, які найбольш зацята выконвае ўліванне ў макаўку... Як вы думаеце, якое вышыні ў яго слуп Ґун? Вышынёй усяго толькі з двух-, трохпавярховы будынак. Вельмі знакаміты вялікі майстар ціґун, а Ґун, як я ўбачыў, у яго ўпаў да такое ступені, што засталося мізэрна мала. Сотні, больш за тысячу чалавек стаяць у чарзе, каб ён выканаў ім уліванне ў макаўку. Ґун у яго абмежаваная колькасць, толькі такое вышыні. Неўзабаве Ґун паніжэе, і яго больш не застанецца. Дык што ж ён тады будзе ўліваць людзям? Хіба гэта не падман? Ад сапраўднага ўлівання ў макаўку, калі глядзець на гэта з іншае прасторы, косткі чалавека з галавы да ног становяцца падобнымі да белага нефрыту. Гэта поўнае ачышчэнне цела пры дапамозе Ґун, рэчываў высокай энергіі, уліваннем ад галавы да пят. Ці здольны той майстар гэтага дасягнуць? Не здольны. Навошта ж ён гэта робіць? Вядома, не абавязкова ўсе займаюцца рэлігіяй. Мэта ў тым, што калі нехта пачынае вучыцца яго ціґун, тады пачынае яму прыналежаць. Ты мусіш браць удзел у яго курсах, вучыцца яго рэчам. Мэта — атрымаць твае грошы. Калі ніхто не будзе ў яго вучыцца, тады грошай ён не заробіць.

Паслядоўнікам Фалунь Дафа, гэтак жа як і паслядоўнікам іншых школаў Школы Буды, уліванне ў макаўку шматразова робіць Настаўнік, але не дае табе пра гэта даведацца. Тыя, у каго ёсць здольнасці, могуць даведацца, чуллівыя людзі таксама могуць адчуць, што ў сне або ў нейкі час, магчыма, раптам ад галавы ўніз апускаецца гарачы паток, праходзячы ўсё цела наскрозь. Мэта ўлівання ў макаўку не ў тым, каб падвысіць табе Ґун — яго ты выпрацоўваеш сам шляхам

удасканальвання. Уліванне ў макаўку — гэта своеасаблівы сродак узмацнення: табе ачышчаюць цела, робяць яшчэ адзін крок наперад у ачышчэнні твайго цела. Неабходна выконваць уліванне шматкроць, на кожным узроўні трэба дапамагчы табе ачысціць арганізм. Бо ўдасканальванне залежыць ад цябе, а Ґун — ад настаўніка. Таму мы не праводзім уліванне ў макаўку як цырымонію.

Некаторыя людзі яшчэ праводзяць так званае «пасвячэнне ў вучні». Дайшоўшы да гэтага месца, я між іншым згадаю, што многія людзі жадаюць прайсці пасвячэнне ў мае вучні. Наш цяперашні гістарычны перыяд адрозніваецца ад феадальнага грамадства Кітая. Ты ўкленчыў ды зрабіў зямны паклон, і гэта ўжо лічыцца, што прайшоў пасвячэнне ў вучні? Мы не праводзім гэтую фармальнасць. Шмат хто з нас вось як думае: «Я буду біць чалом, паліць фіміям, рабіць Буду прынашэнні і буду ў душы крыху пабожным, тады ў мяне і вырасце Ґун». На маю думку, гэта смешна. Сапраўдная практыка цалкам залежыць ад удасканальвання цябе самога. Няма аніякае неабходнасці нешта прасіць. Не пакланяйся Буду, не палі фіміям, шчыра ўдасканальвайся па крытэрах удасканальвальнікаў, тады Буда будзе вельмі рады на цябе глядзець. Калі ж ты, знаходзячыся не дома, увесь час здзяйсняеш благія ўчынкі, тады, хоць ты і паліш ладан ды кладзеш зямныя паклоны, яму нават зірнуць на цябе будзе брыдка. Хіба не ў гэтым сутнасць? Сапраўднае ўдасканальванне залежыць ад цябе самога. Сёння ты біў зямныя паклоны, прайшоў пасвячэнне ў вучні, а як выйшаў за дзверы, ізноўку ўзяўся за сваё. Якая ад гэтага карысць? Мы зусім не прытрымліваемся такіх фармальнасцяў. Інакш ты, магчыма, яшчэ заплямізў бы маё добрае імя.

Мы даем вам настолькі шмат усяго. Толькі б усе вы шчыра ўдасканальваліся ды строга выконвалі патрабаванні Дафа, тады я і буду весці вас як сваіх паслядоўнікаў. Дастаткова таго, каб ты ўдасканальваўся па Фалунь Дафа, тады мы і будзем весці цябе як паслядоўніка. Калі ты перастанеш удасканальвацца, тады мы нічога не зможам для цябе зрабіць. Калі ты перастанеш удасканальвацца, дык якая карысць у тым, каб насіць такое званне? «Удзельнік першых курсаў», «удзельнік другіх курсаў»... Калі ты толькі і робіш, што практыкуеш гэтыя рухі, тады ты і з'яўляешся нашым паслядоўнікам? Ты павінен сапраўды ўдасканальвацца па нашым крытэры Сіньсін, толькі тады ты зможаш дасягнуць здароўя, толькі тады зможаш сапраўды падняцца на высокія ўзроўні. Таму мы не праводзім гэтых цырымоніяў. Дастаткова толькі, каб ты ўдасканальваўся, тады ты і будзеш прыналежаць да нашае школы. Маім Целам Закону ўсё вядома, яны ведаюць усе твае думкі ды здольныя ўсё зрабіць. Калі ты не будзеш удасканальвацца, тады яны не будуць дбаць пра цябе; калі ж будзеш удасканальвацца, тады ад пачатку і да канца будуць табе дапамагаць.

Ціґуніст нейкага метаду практыкі, які яшчэ ніколі не бачыўся са сваім настаўнікам, кажа, што для пасвячэння ў вучні дастаткова, павярнуўшыся ў такі-та бок, класці зямныя паклоны і здаць па некалькі сотняў юаняў. Хіба гэта не падман і сябе, і іншых? Ды яшчэ гэты чалавек сам вельмі ахвотна на гэта ідзе. З

гэтага моманту ён пачаў адстойваць гэты ціґун ды яго майстра і кажа людзям, што ім больш нельга вучыцца іншым ціґун. Калі я гэта ўбачыў, мне было вельмі смешна. Яшчэ нехта праводзіць нейкае «абмацванне макаўкі». Невядома, якую ролю адыгрывае гэтае абмацванне.

Фальшывым з'яўляецца не толькі навучанне ціґун пад сцягам Тантры, а і ўсё тое навучанне ціґун, якое робіцца пад сцягам школы будызму наогул. Задумайцеся: метад удасканальвання будызму захоўваў такую форму цягам некалькіх тысяч гадоў. Калі б нехта яе змяніў, дык хіба гэта яшчэ быў бы будызм? Метад удасканальвання — гэта суровае ўдасканальванне ў Буду, ды яшчэ надзвычай таямнічае. Змяні яго хоць трохі, і ўсё прыйдзе ў стан поўнага неладу. Бо працэс эвалюцыі Ґун неверагодна складаны. Адчуванні чалавека нічога не значаць. Нельга самаўдасканальвацца, абапіраючыся на адчуванні. Рэлігійная форма манаха і з'яўляецца метадам удасканальвання. Калі яе зменіш, тады гэта больш не будзе тым, што прыналежыць да тое школы. Кожную школу ачольвае Вялікі Прабуджаны. У кожнай школе таксама ўдасканалілася вельмі шмат Вялікіх Прабуджаных. Ніхто з іх не адважыўся адвольна змяніць метад удасканальвання тое школы. А які такі Вэйдэ мае мізэрны майстрык ціґун, які адважыўся зняважыць Бога[121] ды змяніць школу ўдасканальвання ў Буду? Дапусцім, што насамрэч можна было б яе змяніць, але хіба гэта ўсё яшчэ была б тая школа? Фальшывы ціґун можна распазнаць.

## УСТАЛЯВАННЕ СЮЭНЬҐУАНЬ НА МЕСЦА

Усталяванне сюэньґуань[122] на месца таксама называецца цяў сюэньґуань[123]. Такі тэрмін можна знайсці ва «Унутранай алхіміі», «Даоскім скарбе», «Дасканалым змесце духоўнага і фізічнага»[124]. У такім выпадку, што ж гэта такое? Велізарная колькасць майстроў ціґун не можа гэтага патлумачыць. Бо на ўзроўнях, на якіх знаходзяцца звычайныя майстры ціґун, яго наогул не бачна, і ім не дазволена яго бачыць. Калі ўдасканальвальнік хоча быць здольным яго бачыць, ён павінен дасягнуць найвышэйшага ўзроўню бачання вока мудрасці або вышэй. Толькі тады ён зможа яго ўбачыць. Звычайныя майстры ціґун не дасягаюць такога ўзроўню, таму ім і не бачна. У колах удасканальвальнікаў спакон веку дашукваюцца: «Што ж такое “сюэньґуань”? Дзе ж размешчана “адтуліна”? Як “усталяваць на месца”?» Калі ты будзеш чытаць пра гэта ва «Унутранай алхіміі», «Даоскім скарбе», «Дасканалым змесце духоўнага і фізічнага», дык там гаворка ідзе вакол тэорыі, а сутнасць табе наогул не распавядаюць. Там тлумачаць, тлумачаць і нарэшце, наадварот, цябе заблытваюць. Незразумела выказваюцца. Бо тое, што тычыцца сутнасці, не даюць звычайным людзям ведаць.

Акрамя таго, я хацеў бы вам сказаць нешта яшчэ. Толькі таму, што вы паслядоўнікі нашага Фалунь Дафа, я скажу вам наступнае: ні ў якім разе не чытайце тыя хаатычныя кнігі па ціґун. Я маю на ўвазе не вышэйзгаданыя

некалькі старажытных кніг, а кнігі фальшывага ціґун, напісаныя сучаснымі аўтарамі. Ты іх нават не гартай. Калі ў цябе ў галаве прамільгне нават найменшая думка: «О, гэтыя словы слушныя», — як толькі яна бліснe, дык адтуль у цябе адразу ўселіцца нячысты дух. Вельмі шмат кніг напісана людзьмі, якіх праз іх славалюбства ды карысталюбства накіроўвалі ды кантралявалі нячыстыя духі. Кніг фальшывага ціґун колькі заўгодна, неверагодна шмат. Вельмі шмат людзей з'яўляюцца безадказнымі. Некаторыя з'яўляюцца апантанымі нячыстым духам і маюць у сабе хаатычныя рэчы, але ўсё адно яны пішуць кнігі. Нават вышэйзгаданыя некалькі старажытных кніг або іншыя падобныя старажытныя кнігі звычайна лепш не чытаць, бо тут існуе праблема таго, каб засяродзіцца на адным і не прывесці ўсё ў нелад.

Адзін з кіраўнікоў Асацыяцыі ціґун Кітая распавёў мне пра адзін выпадак, які страшэнна мяне рассмяшыў. Паводле яго слоў, у Пекіне быў такі чалавек, які пастаянна хадзіў слухаць курсы лекцыяў па ціґун. Ён слухаў, слухаў гэтыя лекцыі, і, калі прайшоў доўгі час, яму стала здавацца, што ціґун — гэта, уласна, толькі тыя рэчы. Бо ўсе майстры ціґун прыналежаць да аднаго ўзроўню і кажуць адныя і тыя ж рэчы. Гэты чалавек гэтак жа, як і фальшывыя майстры ціґун, пачаў лічыць, што змест ціґун гэтым і абмяжоўваецца! Ну добра, ён таксама захацеў напісаць кнігу па ціґун. Задумайцеся толькі: той, хто не з'яўляецца практыкоўцам, піша кнігу па ціґун. Зараз кнігі па ціґун такія: ты спісаў у яго, а ён спісаў у цябе. Гэты чалавек пісаў, пісаў і, дайшоўшы да месца пра сюэньґўань, быў вымушаны спыніцца. Хто разумее, што такое сюэньґўань? Нават сярод сапраўдных майстроў ціґун амаль ніхто гэтага не ведае. Таму ён спытаў пра гэта ў аднаго фальшывага майстра ціґун. Яму было невядома, што ён фальшывы, бо насамрэч ён нічога не разумеў у ціґун. Але калі гэты фальшывы майстар ціґун даў бы іншым загнаць сябе пытаннем у тупік, тады людзі даведаліся б пра тое, што ён фальшывы, ці не так? Такім чынам, ён адважыўся нагаварыць абы-чаго і сказаў, што цяў сюэньґўань размешчана на галоўцы мужчынскага чэлеса. Гучыць неймаверна смешна. Але пакуль не смейся — гэтая кніга выйшла з друку. Гэта азначае, што нашыя цяперашнія кнігі па ціґун смешныя да такое ступені. Скажы, якая можа быць карысць ад чытання такіх кніг? Аніякай. Гэта можа толькі шкодзіць людзям.

Што ж такое ўсталяванне сюэньґўань на месца? Ва ўдасканальванні па Законе чалавечага свету, калі чалавек дасягае ўзроўню вышэйшага за сярэдні, гэта значыць, калі ён удасканальваецца на высокім узроўні Закону чалавечага свету, у яго пачынае расці Дасканалае немаўля[125]. Дасканалае немаўля і тыя, каго мы называем Інха́рамі[126] — гэта розныя рэчы. Інхары малюсенькія, яны скачуць ды прытанцоўваюць ад радасці, вельмі гарэзлівыя. Дасканалае ж немаўля з'яўляецца нерухомым. Калі ім не кіруе душа, яно сядзіць нерухома на кветцы лотаса са складзенымі ў дзеінь[127] рукамі ды нагамі ў паставе лотасу. Дасканалае немаўля зараджаецца ў даньт’ень. Яго можна ўбачыць у вельмі мікраскапічным стане ўжо тады, калі яно нават меншае за вастрыё іголкі.

Апроч таго, растлумачым адно пытанне. Сапраўдны даньт’ень толькі адзін. Ён размешчаны ўнізе жывата[128]. Пачынаючы з акупунктурнае кропкі хўэйінь і вышэй, унутры чалавечага цела, ад пупка ды ўніз. Маецца на ўвазе менавіта гэтае «поле»[129]. Велізарная колькасць Ґун, здольнасцяў, магічных рэчаў, Целы Закону, Дасканалае немаўля, Інхары ды вельмі шмат іншых істотаў спараджаюцца ў гэтым «полі».

Раней асобныя даоскія ўдасканальвальнікі прапаведавалі вучэнне пра «верхні, сярэдні ды ніжні даньт’ень». Я сказаў бы, што яно з'яўляецца хібным. Яшчэ некаторыя кажуць, што іх настаўнікі перадавалі гэта на працягу вось столькіх пакаленняў, і ў кнігах так напісана. Скажу вам: смецця ды хламу было поўна і ў даўніну. Нягледзячы на тое, што гэта ўспадкоўвалася вось столькі гадоў, яно зусім не абавязкова з'яўляецца правільным. Малыя Даа чалавечага свету заўсёды распаўсюджваліся сярод звычайных людзей, аднак па іх немагчыма ўдасканальвацца, яны нічога сабой не ўяўляюць. Тыя людзі называюць гэта верхнім, сярэднім ды ніжнім даньт’ень. Яны хочуць сказаць, што там, дзе можа ўтварыцца дань, там і даньт’ень. Хіба гэта не смешна? Калі чалавечыя думкі канцэнтруюцца на адной кропцы, тады праз доўгі час там можа ўтварыцца згустак энергіі ды сфармавацца дань. Калі не верыш, пастаянна канцэнтруй думкі на сваёй руцэ, увесь час захоўвай гэты стан. З цягам часу там утворыцца дань. Таму некаторыя людзі, убачыўшы гэтае становішча, пачалі казаць, што даньт’ень знаходзіцца ўсюды, што гучыць яшчэ больш смяхотна. На іх думку, там, дзе ўтварыўся дань, і знаходзіцца даньт’ень. Насамрэч гэта дань, але не т’ень[130]. Калі ты скажаш, што паўсюль дань, альбо пра верхні, сярэдні ды ніжні дань, тады так, вядома, казаць можна. А «поле», якое сапраўды здольнае спарадзіць мноства Законаў, толькі адно — унізе жывата. Такім чынам, версія пра верхняе, сярэдняе ды ніжняе «пілюльнае поле» памылковая. На чым канцэнтруюцца чалавечыя думкі, там з часам і ўтвараецца дань.

Таму Дасканалае немаўля зараджаецца ў даньт’ень, якое размешчана ўнізе жывата, паступова расце і становіцца ўсё больш і больш. Калі яно вырастае велічынёй з мячык для настольнага тэніса, тады становіцца выразна бачны абрыс усяго яго цела, сфармаваліся нос ды вочы. Разам з тым, калі яно становіцца такое велічыні, каля яго яшчэ ўтвараецца круглы пузырок. Пасля ўтварэння ён расце ўслед за ростам Дасканалага немаўляці. Калі Дасканалае немаўля вырастае вышынёй 13 см[131], тады з'яўляецца пялёстак лотаса. Калі ж вырастае вышынёй 16-19 см, тады пялёсткі лотаса ў асноўным ужо выраслі, утвараецца цэлая кветка лотаса. Дасканалае немаўля, якое зіхаціць золатам, сядзіць у залацістай лотасавай талерцы. Гэта вельмі прыгожа. Гэта і з’яўляецца Дыяментанятленным целам, якое ў Школе Буды называецца Целам Буды; а ў Школе Даа называецца Дасканалым немаўлём.

Нашая школа ўдасканальвае і патрабуе абодвух відаў цел, уласнае цела[132] таксама мусіць быць пераўтворана. Як вам вядома, Цела Буды нельга паказваць сярод звычайных людзей. Але падчас раптоўнага напружання ўсіх

сіл можа праявіцца яго вобраз, вачыма звычайных людзей можна пабачыць яго аптычную выяву. А ўласнае цела пасля пераўтварэння з'яўляецца такім жа самым, як у звычайных людзей, і яны не бачаць розніцы. Але яно можа праходзіць скрозь прасторы. Калі Дасканалае немаўля вырастае вышынёй 13-16 см, пузырок дасягае такое ж вышыні. Ён вельмі падобны да абалонкі паветранага шара і з'яўляецца празрыстым. Дасканалае немаўля сядзіць нерухома ў паставе медытацыі. Калі яно вырасла такога памеру, гэтаму пузырку надыходзіць час пакінуць даньт’ень, ён ужо сфармаваўся. «Калі дыня саспявае, чаранок адпадае»[133]. Таму яму час падымацца. Працэс узыходжання пузырка вельмі павольны, але штодня можна бачыць, што ён пасоўваецца — паступова перамяшчаецца ўгару, падымаецца. Калі мы будзем пільна назіраць, дык адчуем яго прысутнасць.

Калі пузырок падымаецца да месца размяшчэння акупунктурнае кропкі чалавека да́ньджун[134], ён застаецца ў гэтым месцы нейкі перыяд часу. Бо квінтэсенцыя чалавечага цела ды шмат іншага (сэрца таксама размешчана тут) павінны сфармаваць у гэтым пузырку свой комплекс. Квінтэсенцыя чалавека павінна папоўніць пузырок. Пасля таго як міне пэўны час, ён пачынае зноў падымацца. Калі пузырок праходзіць праз шыю, адчуваецца, што бракуе паветра, нібыта крываносныя сасуды сталі сціснутымі, ад раздзімання пачуваешся вельмі блага. Але гэта будзе доўжыцца ўсяго нейкія 1-2 дні, пасля чаго ўсё міне. Тады пузырок дасягне макаўкі галавы. Мы называем гэта ўзыходжаннем да нівань. Хоць мы і гаворым, што пузырок дасягнуў нівань, а насамрэч ён велічынёй з увесь твой мозг. Ты будзеш адчуваць, нібыта галава раздзьмулася. Паколькі нівань з’яўляецца ключавым месцам для чалавечага жыцця, ён таксама сфармуе ўнутры пузырка сваю квінтэсенцыю. Далей пузырок праціскаецца навонкі праз праход нябеснага вока. Пачуваешся падчас гэтага вельмі нясцерпна. Ад раздзімання нябеснае вока вельмі баліць, раздзімаюцца акупунктурныя кропкі та́йян[135], западаюць вочы. Гэта доўжыцца, пакуль пузырок не праціснецца навонкі. Тады ён адразу павісае ў раёне лба. Гэта і называецца ўсталяваннем сюэньґуань на месца. Пузырок павісае тут.

Тыя, у каго адкрытае нябеснае вока, у цяперашні час ужо больш не бачаць. Гэта таму, што ва ўдасканальванні па абедзвюх школах, Буды і Даа, каб даць магчымасць рэчам унутры сюэньґуань як найхутчэй сфармавацца, тыя дзверы не адчыняюцца. Спераду і ззаду там ёсць па дзве створкі. Усе яны зачыненыя. Гэта падобна да арачнае брамы на плошчы Т’ень-а́нь-мэнь[136] у Пекіне: з абодвух бакоў яны маюць па дзве створкі. Каб даць яму як найхутчэй сфармавацца ды папоўніцца, пры адсутнасці экстранных абставінаў дзверы не адчыняюцца. Тыя, хто здольны бачыць нябесным вокам, па дасягненні гэтага этапу ўжо не бачаць — ім не даюць глядзець. Для чаго ж пузырок тут вісіць? Паколькі ўсе мерыдыяны нашага цела зліваюцца тут, дык у гэты час усе мерыдыяны павінны прайсці праз сюэньґуань і, зрабіўшы круг, выйсці. Усе яны прайдуць праз сюэньґуань. Мэта ў тым, каб яшчэ раз закласці ўнутры сюэньґуань падмурак, сфармаваць комплекс. А паколькі чалавечае цела — гэта малы сусвет, сюэньґуань утварае малы свет, унутры якога сфармуюцца ўсе

рэчы ўсёй квінтэсенцыі чалавечага цела. Аднак гэта будзе ўтвораны ўсяго толькі камплект абсталявання, якім яшчэ нельга паўнавартасна карыстацца.

У самаўдасканальванні па метадах практыкі Ці́мэнь сюэньґуань адкрыты. Калі сюэньґуань выстрэльвае навонкі, тады мае выгляд прамое трубкі, але паступова таксама становіцца круглым, такім чынам створкі па абодва бакі яго адчыненыя. Бо ў Цімэнь не ўдасканальваюцца ані ў Буду, ані ў Даоса. Яны самі сябе абараняюць. У абедзвюх Школах — Буды і Даа — безліч настаўнікаў, якія могуць цябе абараніць. Няма неабходнасці, каб ты бачыў, і таму не ўзнікаюць праблемы. А ў Цімэнь гэта ўжо не дзейнічае. Ім трэба самім сябе абараняць. Таму яны павінны захоўваць магчымасць бачыць. Аднак, калі ў той час глядзіш нябесным вокам, тады гэта падобна да таго, калі глядзіш у тэлескоп. Далей, пасля ўтварэння комплексу рэчаў, праз 1-2 месяцы, пузырок пачынае вяртацца назад. Яго вяртанне назад у галаву называецца зменай месца сюэньґуань.

Калі пузырок вяртаецца назад, ад раздзімання ты таксама пачуваешся блага. Далей ён праціскаецца навонкі з акупунктурнае кропкі ю́йджэнь. Падчас гэтага таксама пачуваешся вельмі блага, так, нібыта галава расколваецца. Пузырок адразу выходзіць. Як толькі ён выйшаў, дык імгненна адчуваеш палёгку. Пасля таго як ён выйшаў, ён павісае ў вельмі глыбокай прасторы. Пузырок размешчаны ў форме, якую мае цела ў вельмі глыбокай прасторы, таму, калі спіш, ён табе не замінае. Але ёсць вось які момант. Падчас першага ўсталявання сюэньґуань перад вачыма адчуваеш... хоць ён і знаходзіцца ў іншай прасторы, але ўвесь час здаецца, што ў вачах вельмі пацямнела, нібыта нейкі прадмет засціць вочы, ад чаго становіцца не вельмі прыемна. Паколькі кропка юйджэнь[137] з’яўляецца ключавым вялікім уваходам, дык з тыльнага боку таксама неабходна сфармаваць комплекс рэчаў. І пузырок зноў пачынае вяртацца назад. Вышэйзгаданая цяў сюэньґуань — насамрэч не адна цяў[138]. Яна шматкроць змяняе сваё месцазнаходжанне. Па вяртанні назад у нівань пузырок пачынае апускацца — апускацца ўніз унутры цела да акупунктурнае кропкі мінмэнь[139]. З кропкі мінмэнь ён ізноў выстрэльвае навонкі.

Мінмэнь чалавека з’яўляецца ключавой, галоўнай вялікай цяў. Школа Даа называе акупунктурныя кропкі цяў, а мы называем іх ґуань[140]. Гэта галоўны важны праход. Насамрэч гэта жалезныя вароты, жалезныя дзверы з безліччу слаёў[141]... Як вам вядома, цела з'яўляецца шматслаёвым. Клеткі нашага цяперашняга фізічнага цела — гэта адзін слой, малекулы ўнутры іх — яшчэ адзін. Далей ідуць атамы, пратоны, электроны, бясконца малыя часцінкі, бясконца малыя часцінкі, бясконца малыя часцінкі... да найменшых карпускул. На кожнай паверхні ўсталёўваюць па слоі дзвярэй. Таму вельмі шмат здольнасцяў, вельмі шмат магічных прадметаў замкнёныя за кожным пластом дзвярэй. У іншых метадах практыкі выпрацоўваюць дань. Калі дань выбухае, перш за ўсё трэба, каб ад страсення адкрылася мінмэнь. Калі гэтага не адбудзецца, здольнасці не будуць вызваленыя. Пасля таго як сюэньґуань сфармуе ў кропцы мінмэнь комплекс рэчаў, ён ізноў уваходзіць у цела.

Увайшоўшы, ён пачынае вяртацца ў ніз жывата. Гэта называецца «вяртаннем сюэньґўань на месца».

Па вяртанні на месца сюэньґўань вяртаецца не на сваё ранейшае месца. У той час Дасканалае немаўля ўжо вырасла вельмі вялікім. Пузырок тады пакрывае Дасканалае немаўля, атачыўшы яго. Ён расце следам за ростам Дасканалага немаўляці. У Школе Даа звычайна, калі Дасканалае немаўля вырастае такім, якое з выгляду шасці-сямігадовае дзіця, яму ўжо даюць пакідаць цела, што называецца выхадам Дасканалага немаўляці ў свет. Ім кіруе душа чалавека, яно ўжо можа выйсці ды дзейнічаць. Цела чалавека замірае і застаецца нерухомым, а яго душа выходзіць. У Школе Буды звычайна, калі Дасканалае немаўля, удасканальваючыся, становіцца такога памеру, як сам чалавек, тады ўжо няма небяспекі. Звычайна тады яму ўжо дазваляюць пакідаць цела, аддзяляцца ад гэтага цела, яно можа выходзіць. У той час, калі Дасканалае немаўля вырасла велічынёй з самога чалавека, тады гэта ж зрабіў і яго ахоўны кажух. Той кажух, пашыраючыся, ужо нават выйшаў за межы цела. Гэта і ёсць той сюэньґўань. Паколькі Дасканалае немаўля ўжо стала такога памеру, дык, вядома, сюэньґўань, пашыраючыся, ужо выйшаў за межы цела.

Напэўна, вы бачылі храмавыя выявы Будаў, бачылі, што Буда заўсёды знаходзіцца ў крузе. Асабліва на маляўнічых выявах Буды заўсёды ёсць круг, унутры якога Буда і сядзіць. Такімі з'яўляюцца мноства выяваў Буды, асабліва тыя, якія напісаны ў старажытных храмах. Чаму ж Буда сядзіць унутры круга? Ніхто не можа гэтага растлумачыць. Скажу вам, што гэта і ёсць сюэньґўань. Але ў гэты час ён ужо называецца не сюэньґўань, а светам, хоць яшчэ нельга зусім з пэўнасцю яго так называць. Ён толькі мае камплект абсталявання. Гэта падобна да таго, калі б у нас быў завод, які мае камплект абсталявання, аднак не здольны вырабляць прадукцыю. Неабходна крыніца энергіі ды сыравіна — толькі тады можна будзе весці вытворчасць. Некалькі гадоў таму шмат удасканальвальнікаў казала: «Мой Ґун вышэйшы за Ґун Бадгісатвы», «Мой Ґун вышэйшы за Ґун Буды». Іншым людзям, калі яны такое чулі, гэта здавалася вельмі дзіўным. Насамрэч у іх словах нічога дзіўнага няма. Сапраўды, трэба, каб Ґун дзякуючы практыцы стаў пры жыцці чалавека вельмі высокім.

Тады чаму ж узнікае сітуацыя, калі чалавек паспяхова завяршае ўдасканальванне на больш высокім, чым у Буды, узроўні? Нельга так павярхоўна гэта разумець. Ґун у такога чалавека сапраўды вельмі высокі. Пасля таго як ён дасягае ў самаўдасканальванні вельмі высокага ўзроўню, калі ён дасягае адкрыцця Ґун і адкрыцця ўсведамлення, Ґун у яго сапраўды вельмі высокі. Менавіта ў момант перад адкрыццём Ґун і адкрыццём усведамлення 80 адсоткаў уласнага Ґун гэтага чалавека яму адломліваюць, нават стандарт яго Сіньсін адломліваюць. Гэтай энергіяй напаўняюць яго свет, яго ўласны свет. Як вам вядома, Ґун удасканальвальніка і, асабліва, крытэр яго Сіньсін, выпрацаваныя тым, што чалавек цягам усяго свайго жыцця знес безліч пакутаў, ён у горкім асяроддзі загартаваўся ў выпрабаваннях ды ўдасканаліўся. Таму Ґун

з’яўляецца вельмі каштоўным. 80-ццю адсоткамі настолькі каштоўнага напаўняюць яго свет. Таму, калі ў будучыні гэты чалавек паспяхова завершыць удасканальванне, і яму нечага захочацца, дастаткова будзе толькі працягнуць руку, і ён імгненна гэта будзе мець. У яго будзе ўсё, што ён толькі пажадае. Ён будзе рабіць, што захоча. У яго свеце будзе ўсё. Гэта яго Вэйдэ, якога ён дабіўся дзякуючы таму, што ўдасканаліўся, зведваючы пакуты.

Гэтая энергія чалавека можа па яго жаданні ператварацца ў любыя прадметы. Таму, калі Буда нечага хоча, хоча нешта з'есці, у нешта пагуляць, дык ён мае ўсё. Ён атрымаў гэта дзякуючы ўдасканальванню. Гэта і ёсць статус Буды. І без гэтага чалавек не змог бы паспяхова завершыць сваё ўдасканальванне. У той час ужо можна называць гэта яго ўласным светам. Чалавек жа дасягае Поўнае Дасканаласці ды спасцігае Даа толькі з 20-цю адсоткамі Ґун. Хоць і засталося толькі 20 адсоткаў, але яго цела не заблакаванае. Чалавек альбо не забірае з сабой цела альбо забірае яго, але яно ўжо пераўтворана рэчывамі высокай энергіі. У той час чалавек грандыёзна праяўляе цудатворную сілу, якая мае непараўнальную моц. А калі ўдасканальваешся сярод звычайных людзей, тады ты часта заблакаваны, і ў цябе няма настолькі велізарных уменняў. Якім бы высокім ні быў твой Ґун, ты ўсё адно зведваеш абмежаванні. А цяпер усё стала інакш.

# ЛЕКЦЫЯ ПЯТАЯ

## ВЫЯВА ФАЛУНЬ

Сімвалам нашага Фалунь Дафа з'яўляецца Фалунь. Чалавек са звышздольнасцямі можа бачыць, што гэты Фалунь круціцца, і Фалунь на нашым значку таксама круціцца. Мы ўдасканальваемся, кіруючыся ўласцівасцю Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне. Практыка праходзіць па законах эвалюцыі Сусвету, таму тое, што мы практыкуем, насамрэч грандыёзна. У пэўным сэнсе выява Фалунь — гэта зменшаная копія Сусвету. Школа Буды разглядае Сусвет як дзесяцібаковы свет: Сусвет з чатырма бакамі альбо васьмю накірункамі[142]. Магчыма, некаторыя людзі яшчэ могуць бачыць, што ў яго вертыкальным кірунку існуе слуп Ґун, такім чынам, калі дадаць напрамкі ўверх ды ўніз, акурат атрымаецца дзесяцібаковы свет, які ўтварае Сусвет. Гэта адлюстроўвае абагульненне Сусвету школай Буды.

Вядома, у Сусвеце існуе безліч галактык, уключаючы наш Млечны Шлях. Увесь Сусвет знаходзіцца ў руху, і ўсе галактыкі ў ім таксама рухаюцца, таму тайдзі ды маленькія знакі 卍 на гэтым малюнку таксама круцяцца, увесь Фалунь круціцца, і вялікі знак 卍 у яго сярэдзіне таксама круціцца. У пэўным сэнсе гэта сімвалізуе наш Млечны шлях. Мы прыналежым да школы Буды, таму ў цэнтры знак школы Буды. Гэта калі глядзець на знешні выгляд Фалунь. Уся разнастайная матэрыя мае свае формы існавання ў іншых прасторах, дзе назіраюцца надзвычай багатыя, надзвычай складаныя працэсы эвалюцыі ды формы існавання. Гэтая выява Фалунь з’яўляецца ўвасабленнем Сусвету ў мініяцюры, у іншых прасторах Фалунь таксама мае сваю форму існавання ды працэс эвалюцыі, таму я лічу яго светам.

Калі Фалунь круціцца па гадзіннікавай стрэлцы, ён здольны аўтаматычна паглынаць энергію з Сусвету; калі круціцца супраць гадзіннікавае стрэлкі, здольны выпускаць энергію. Кручэнне ўнутр (па гадзіннікавай стрэлцы) ратуе самога сябе, а кручэнне навонкі (супраць гадзіннікавае стрэлкі) ратуе іншых. Гэта асаблівасць нашага метаду практыкі. Некаторыя запытваюцца: «Раз мы прыналежым да школы Буды, дык чаму яшчэ ёсць тайдзі? Хіба гэты тайдзі не прыналежыць да школы Даа?» Гэта таму, што практыка, якую мы выконваем, з’яўляецца каласальнай. Гэта ўсё адно, што мы практыкуем цэлы Сусвет. Падумайце, у гэтым Сусвеце існуюць дзве буйныя школы: школа Буды і школа Даа. Калі выключыць любую з гэтых дзвюх школаў, дык будзе ніяк немагчыма стварыць паўнавартасны Сусвет. І не магло б існаваць гаворкі пра цэласнасць Сусвету, таму ў нас тут ёсць і рэчы са школы Даа. Некаторыя кажуць: «Але ж існуе не толькі школа Даа! Ёсць таксама і хрысціянства, і канфуцыянства ды іншыя рэлігіі». Скажу вам, што калі канфуцыянства даходзіць да найвышэйшага ўзроўню, тады яно ўваходзіць у школу Даа; а многія заходнія рэлігіі з дасягненнем высокага ўзроўню ўваходзяць у школу Буды, яны прыналежаць да сістэмы школы Буды. Існуюць толькі гэтыя дзве вялікія сістэмы.

Тады чаму ж два тайдзі зверху чырвоныя, знізу сінія, а два іншыя зверху чырвоныя, знізу чорныя? Згодна з тым, што людзям звычайна вядома, тайдзі складаецца з двух відаў матэрыі: чорнай і белай. Гэта ж два ці: інь і ян. Гэта разуменне з погляду вельмі павярхоўнага ўзроўню. У іх розныя праявы ў розных прасторах. Калі яны праяўляюцца на найвышэйшым узроўні, іх колеры менавіта такія. Даа, які мы звычайна маем на ўвазе, зверху чырвоны, а знізу — чорны. Прывядзем прыклад. Тыя з нас, у каго адкрылася нябеснае вока, заўважылі, што чырвоны колер, які бачаць вочы, праяўляецца як зялёны ў іншай прасторы, якая толькі на адзін узровень адрозніваецца ад нашай. А залацісты колер у іншай прасторы праяўляецца як фіялетавы. Такі ў іх кантраст. І ў розных прасторах колеры таксама змяняюцца па-рознаму. Тайдзі з чырвонай верхняй часткай і сіняй ніжняй часткай прыналежыць да школы першапачатковага Вялікага Даа, уключна са школамі ўдасканальвання Цімэнь. Маленькія знакі 卍 з чатырох бакоў прыналежаць да школы Буды. Яны таксама, як і знак 卍 у цэнтры, прыналежаць да школы Буды. Колер Фалунь вельмі яскравы, і мы лічым яго эмблемай Фалунь Дафа.

Фалунь, які мы бачым нябесным вокам, неабавязкова мае менавіта такі колер. Колер фону можа змяняцца, а вось малюнкі на ім — не. Фалунь, які я ўклаў табе ў ніз жывата, падчас вярчэння можа падацца твайму нябеснаму воку чырвоным, фіялетавым, зялёным і, магчыма, бясколерным. Чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы — фон Фалунь няспынна змяняе свой колер, таму колер, які ты бачыш, можа быць іншым, але каляровыя малюнкі знака 卍 і тайдзі ўнутры не змяняюцца. Колер фону на гэтай схеме падаўся нам параўнальна прыгожым, мы яго і зафіксавалі. Той, хто мае звышздольнасці, можа ўбачыць вельмі шмат рэчаў скрозь гэтую прастору.

Нехта з вас сказаў, што гэты знак 卍 падобны да гітлераўскае свастыкі. Скажу вам, што сам гэты знак не змяшчае аніякіх канцэпцыяў пра класы. Нехта кажа: «Калі кончыкі знака накіраваныя ў гэты бок, тады атрымліваецца гітлераўскі знак». Справа не ў гэтым, знак 卍 круціцца і ў тым, і ў іншым накірунку. Яшчэ ў эпоху Шак'ямуні, 2500 гадоў таму, гэты знак быў агульнавядомым нашаму чалавечаму грамадству. З часоў Другое сусветнае вайны да цяперашняга часу прайшло ўсяго некалькі дзясяткаў гадоў, гэта Гітлер у свой час самавольна прыўлашчыў гэты знак свастыкі. Але колер яго знака адрозніваецца ад нашага, — ён чорны і, больш за тое, кончык знака накіраваны ўверх, знак стаяў на кончыку і выкарыстоўваўся ў такім «вертыкальным» выглядзе. Наконт Фалунь на гэтым усё. Мы патлумачылі толькі яго знешнюю форму.

А што ж у такім разе азначае гэты знак 卍 у нашай школе Буды? Некаторыя кажуць, што гэта сімвал поспеху і шчасця. Так тлумачаць звычайныя людзі. Скажу вам, што знак 卍 — гэта знак узроўню Буды. Ён ёсць толькі ў тых, хто дасягнуў узроўню Буды. У Бадгісатваў ды Аргатаў яго няма, але ў Найвялікшае Бадгісатвы і чатырох Вялікіх Бадгісатваў ёсць. Мы бачым, што Вялікія

Бадгісатвы далёка пераўзышлі ўзровень звычайных Будаў, яны нават вышэйшыя за ўзровень Татгаґаты. Будаў, якія пераўзышлі ўзровень Татгаґаты, незлічона шмат. У Татгаґаты ёсць толькі адзін знак 卍. Калі дасягаеш вышэйшых за Татгаґату ўзроўняў, тады колькасць свастык у цябе павялічваецца. Той, хто вышэй за Татгаґату ў два разы, мае два знакі 卍. А той, хто яшчэ вышэй, мае тры, чатыры, пяць, ажно так, што ўсё яго цела пакрыта гэтымі знакамі. Яны могуць з'яўляцца паўсюль: на галаве, на плячах, на каленях. Калі ім ужо няма дзе змясціцца, яны з'яўляюцца ў цэнтры далоняў, у цэнтры ступняў[143], на ўнутраным баку фалангаў пальцаў рук і ног ды ў іншых месцах. Следам за няспынным падвышэннем узроўню колькасць знакаў 卍 павялічваецца, таму знак 卍 азначае вышыню ўзроўню Буды: чым вышэй узровень Буды, тым больш у яго знакаў 卍.

## МЕТАД ПРАКТЫКІ ЦІМЭНЬ

Апроч метадаў практыкі школы Буды і школы Даа існуе і метад практыкі Цімэнь. Яны самі называюць сябе ўдасканальваннем Цімэнь. Як правіла, у звычайных людзей маецца такое разуменне пра метады ўдасканальвання, што са старажытных часоў у Кітаі метады практыкі школы Буды і школы Даа лічацца праведнымі метадамі ўдасканальвання, якія таксама называюць сапраўднымі школамі ўдасканальвання. Метад практыкі Цімэнь ніколі не разгалошваўся, і мала хто ведае пра яго існаванне, людзі ведаюць пра яго толькі з мастацкіх твораў.

Ці існуе метад практыкі Цімэнь? Існуе. У ходзе майго ўдасканальвання, асабліва ў апошнія гады, я сустрэўся з трыма высакароднымі майстрамі Цімэнь; яны перадалі мне найлепшае з іх школаў — надзвычай унікальныя, цудоўныя рэчы. З прычыны сваёй арыгінальнасці выпрацаваныя імі рэчы неймаверна дзіўныя, і звычайныя людзі не могуць іх зразумець. Прычым тыя, хто ўдасканальваецца па гэтай школе, кажуць: «Не Буда, не Даос», яны не ўдасканальваюцца ані ў Буду, ані ў Даоса. Пачуўшы гэта, людзі сталі называць іх метад самаўдасканальвання «бакавымі дзвярыма» і «левымі шляхамі»[144], а самі яны называюць яго «метадам практыкі Цімэнь». Праўда, назва «бакавыя дзверы і левы шлях» — гэта выраз з няўхвальным адценнем, але не негатыўным. Ён не азначае, што гэта няправедны метад. Гэта дакладна. І літаральнае значэнне такога выказвання не змяшчае значэння «няправеднага метаду». У нас здаўна называюць метады практыкі школы Буды і школы Даа ўдасканальваннем сапраўдных школ, а метад практыкі Цімэнь, пакуль яго не спазналі, называлі «панмэнь», гэта азначае бакавымі дзвярыма, а не парадным уваходам. А што азначае «левы шлях»? Пад «левым» маецца на ўвазе «тупы», тупы спосаб. У старажытнай кітайскай мове слова «левы» часта азначала «дурны». Вось такое значэнне і засталося ў выразе «бакавыя дзверы і левы шлях».

Чаму метад практыкі Цімэнь не з'яўляецца няправедным метадам? Бо ён таксама строга патрабуе, каб людзі падвышалі Сіньсін ды ўдасканальваліся, кіруючыся ўласцівасцю Сусвету; гэты метад не супярэчыць уласцівасці Сусвету ды яго правілам, у ім таксама не робяць дрэнных спраў. Таму нельга лічыць яго няправедным метадам. Бо не ўласцівасць Сусвету адпавядае метадам удасканальвання Школы Буды і Школы Даа, а яны адпавядаюць уласцівасці Сусвету і толькі дзякуючы гэтаму сталі праведнымі. Калі метад практыкі Цімэнь адпавядае ўласцівасці Сусвету, тады ён не з'яўляецца няправедным, а таксама з'яўляецца праведным, бо ўласцівасць Сусвету — гэта крытэр ацэнкі добрага і благога, дабра і зла. У метадах практыкі Цімэнь удасканальваюцца па ўласцівасці Сусвету, таму яны з'яўляюцца артадаксальнымі. Проста іх патрабаванні ды характэрныя рысы адрозніваюцца ад патрабаванняў абедзвюх школаў — Буды і Даа. Метад практыкі Цімэнь не надае аніякага значэння шырокаму навучанню, таму вучняў у гэтай школе надзвычай мала. У школе Даа, падчас навучання практыцы, вучаць вялікую групу вучняў, але сярод іх толькі аднаму здзяйсняецца сапраўдная перадача; школа Буды выступае за выратаванне ўсіх жывых істотаў: хто можа ўдасканальвацца, той і ўдасканальваецца.

А датычна ўспадкавання і перадачы ў школе Цімэнь — дык яны ніколі не дазваляюць адначасова знайсці двух чалавек у якасці спадкаемцаў, а толькі за даволі працяглы гістарычны перыяд выбіраюць і вызначаюць аднаго вучня-спадкаемца для перадачы, таму звычайным людзям ніколі не ўбачыць іх рэчаў. Вядома, падчас ціґунскага буму я заўважыў, што некаторыя чальцы гэтае школы таксама выйшлі, каб навучаць практыцы. Неўзабаве яны зразумелі, што зайшлі ў тупік, бо некаторыя рэчы настаўнік наогул не дазваляе ім перадаваць. Калі хочаш навучаць ціґун, тады не будзеш мець магчымасці выбіраць вучняў, а вучыцца прыходзяць людзі з розным узроўнем Сіньсін. Людзі прыходзяць вучыцца з рознымі ўяўленнямі, якіх толькі людзей сярод іх няма — у цябе не будзе магчымасці выбіраць вучняў для перадачы. Таму распаўсюджваць метады практыкі Цімэнь не атрымалася. Лёгка можа з'явіцца небяспека, бо іх рэчы вельмі спецыфічныя.

Некаторыя думаюць: «У школе Буды ўдасканальваюцца ў Буду, у школе Даа — у дасканалага чалавека. А кім жа лічацца тыя, хто завершыць удасканальванне па метадах практыкі Цімэнь»? Яны з'яўляюцца вольнымі Несмяротнымі, у іх няма сталага свету альбо сферы ў Сусвеце. Як вам вядома, Буда Татгаґата Шак'ямуні мае Свет Сага; Буда Амітабга мае Свет Найвышэйшага Шчасця; Буда-Ацаляльнік мае Глазуравы Свет — у кожнага Татгаґаты і Вялікага Буды ёсць свой уласны свет. Кожны Вялікі Прабуджаны мае Нябеснае царства, якое ён сам стварыў, дзе жыве шмат яго паслядоўнікаў. А школа самаўдасканальвання Цімэнь не мае сваёй пэўнай сферы ў Сусвеце. Яны проста жывуць як вандроўныя Несмяротныя.

**ПРАКТЫКА ПА НЯПРАВЕДНЫХ МЕТАДАХ**

Што такое практыка па няправедных метадах? Існуе некалькі формаў такое практыкі, і некаторыя людзі знарок практыкуюць па няправедных метадах, бо ў гісторыі заўсёды былі людзі, якія перадавалі такія рэчы. Чаму яны перадаюць такія рэчы? Таму што яны гоняцца за славай, за выгадамі звычайных людзей, мараць узбагаціцца, яны звяртаюць увагу на гэта. Вядома, Сіньсін у такіх людзей невысокі, і яны не атрымаюць Ґун. Што ж яны могуць атрымаць? Карму. Калі ў чалавека вялікая карма, тады ў яго таксама ўтвараецца своеасаблівая энергія. У такіх людзей няма ўзроўню, і ім не параўнацца з практыкоўцамі. Аднак яны здольныя ўплываць на звычайных людзей. Бо такая рэч таксама з'яўляецца праявай энергіі. Калі яе гушчыня вельмі вялікая, яна таксама можа ўзмацніць звышздольнасці чалавека, таксама можа адыгрываць такую ролю, таму з даўніх часоў перадавалі такую рэч. Такія людзі кажуць: «Калі я раблю дрэнныя справы, калі лаюся, у мяне расце Ґун». Фактычна ў яго не расце Ґун, а ўзмацняецца гушчыня гэтае чорнае матэрыі, бо ў выніку здзяйснення дрэнных спраў чалавек можа атрымаць чорную матэрыю — карму. Пасродкам кармы ён можа ўзмацніць уласцівыя яму нікчэмныя здольнасці ды здабыць некаторыя нязначныя звышздольнасці, але не зможа зрабіць што-небудзь значнае. Такія людзі лічаць, што здзяйсненне дрэнных спраў прывядзе да ўзрастання Ґун. Такая іх думка.

Некаторыя кажуць: «Д'ябал у дзесяць разоў вышэйшы за даоса»[145]. Гэта ерась, якую вярзуць звычайныя людзі — д'ябал ніколі не перасягне Даа. Існуе такая сітуацыя: Сусвет, які спазнае чалавецтва, уяўляе сабой толькі адзін малы сусвет з незлічоных Сусветаў, і мы проста называем яго Сусветам. Штораз пасля таго як гэты наш Сусвет завяршае вельмі працяглы перыяд існавання, здараецца буйная касмічная катастрофа. Гэтая катастрофа прыводзіць да таго, што ўсё ў Сусвеце, уключна з нябеснымі целамі, можа быць знішчана, усе істоты Сусвету могуць быць знішчаныя. Рух Сусвету таксама мае заканамернасць, і ў нашым цяперашнім Сусвеце сапсавалася не толькі чалавецтва. Многія жывыя істоты ўжо заўважылі такую сітуацыю, што ў прасторы гэтага Сусвету даўно ўжо адбыўся гіганцкі выбух. Гэтае з'явы не бачаць сучасныя астраномы, бо нават пры дапамозе самага магутнага тэлескопа мы можам бачыць толькі з'яву, якая адбылася 150 тысяч светлавых гадоў таму. Каб убачыць становішча гэтых нябесных целаў у цяперашні час, прыйдзецца чакаць 150 тысяч светлавых гадоў, і гэта даволі доўгатрывалы перыяд часу.

У цяперашні час ва ўсім Сусвеце ўжо адбыліся велізарныя змены, і штораз, калі адбываюцца такія змены, усе істоты ў Сусвеце знаходзяцца ў працэсе гібелі і татальнага знішчэння. І штораз, калі такая падзея здаралася, уласцівасць Сусвету, якая існавала да гэтага, і матэрыю падрываюць ушчэнт. Звычайна ўсё гінула ад выбуху, але штораз выбух не знішчаў усё дачыста. Калі Найвышэйшыя Вялікія Прабуджаныя зноў ствараюць новы Сусвет, у ім застаюцца тыя, хто не загінуў ад выбуху. Вялікія Прабуджаныя ствараюць гэты

Сусвет адпаведна сваёй уласцівасці ды крытэрам, таму ўласцівасць новага Сусвету ў некаторых аспектах адрозніваецца ад уласцівасці Сусвету папярэдняга перыяду.

Тыя, хто не загінуў ад выбуху, дзейнічаюць у гэтым Сусвеце, чапляючыся за колішнюю ўласцівасць ды колішнюю ісціну. А ў гэтым новастворaным Сусвеце яго жыхары дзейнічаюць ужо згодна з новай уласцівасцю ды новай ісцінай. Такім чынам, тыя, хто не загінуў ад выбуху, ператварыліся ў д'яблаў, якія ствараюць перашкоды ісціне Сусвету. Але яны ўсё ж такі не такія благія, яны толькі паводзяцца адпаведна ўласцівасці Сусвету папярэдняга цыклу. Гэта акурат і ёсць тыя, каго людзі называюць нябеснымі дэманамі. Аднак яны не з'яўляюцца нейкай пагрозай для звычайных людзей і зусім не шкодзяць людзям. Яны проста робяць па-свойму, прытрымліваючыся сваёй ісціны. Раней людзям не дазвалялі ведаць пра гэта. Я скажу, што Будаў, якія нашмат перавышаюць узровень Татгаґаты і знаходзяцца ў вельмі высокіх сферах, незлічона шмат. А хто такія гэтыя дэманы? Вартая жалю нікчэмнасць у параўнанні з Будамі. Старасць, хваробы ды смерць таксама з'яўляюцца своеасаблівымі дэманамі. Але яны былі спароджаныя дзеля аховы ўласцівасці Сусвету.

Будызм, прапаведуючы Шэсць колаў пераўвасабленняў, закрануў пытанне пра асураў. Насамрэч гэта жывыя істоты ў іншых прасторах, якія не маюць чалавечае сутнасці. З пункту гледжання Вялікіх Прабуджаных, яны прыналежаць да надзвычай нізкага ўзроўню і вельмі слабыя, а ў вачах звычайных людзей яны — істоты вельмі страшныя, з пэўнай энергіяй. Яны лічаць звычайных людзей звярамі, таму любяць есці людзей. У апошнія гады яны таксама выйшлі навучаць ціґун. Што яны за стварэнні? Ці могуць яны мець чалавечае аблічча? Асуры вельмі жудасныя. Калі навучацца ў іх, тады патрапіш туды да іх і будзеш аднаго з імі віду. У некаторых людзей падчас практыкі думкі няправільныя, і калі думкі будуць адпавядаць спосабу мыслення асураў, яны і прыйдуць цябе навучаць. Як кажуць: «Адна праведнасць пераможа сотню дэманаў». І калі ты ні за чым не гонішся, тады ніхто не адважыцца цябе чапаць. А калі ў цябе ўзнікнуць заганныя думкі, альбо ты пагонішся за чымсьці благім, тады асуры адразу прыйдуць табе дапамагчы, тады ты і ўдасканалішся ў Кола д'яблаў — можа з'явіцца такая праблема.

Існуе яшчэ іншая сітуацыя, якая называецца «несвядомай практыкай па няправедных метадах». Што называецца «несвядомай практыкай па няправедных метадах»? Гэта акурат азначае, што чалавек займаецца па няправедных метадах і сам пра гэта не ведае. Гэта надзвычай распаўсюджаная з'ява. Такога неверагодна шмат. Гэта падобна да таго, пра што я ўжо распавядаў раней. Многія людзі, калі выконваюць практыкаванні ціґун, маюць няправільныя думкі. Напрыклад, ты можаш убачыць, як чалавек стаіць, займаецца ў паставе слупа, яго рукі ды ногі ўжо дрыжаць ад стомы, а мозг усё не спыняецца. Ён думае: «Цэны на тавары хутка падымуцца, і я павінен сёе-тое

купіць. Як толькі скончу практыкаванні, адразу ж пайду па пакупкі. Калі не паспяшаюся — заплачу больш...» Іншы думае: «Ва ўстанове зараз ідзе размеркаванне кватэр, ці дадуць мне кватэру? Дык вось чаму адказны за размеркаванне кватэр увесь час са мной не ў ладах?» Чым больш ён так думае, тым мацней злуецца: «Ён дакладна не дасць мне кватэры. Тады што я яму зраблю...» Бачыце, пра што толькі людзі не думаюць. Гэта падобна да таго, што я апісаў раней. Некаторыя балбочуць бесперастанку, бурчаць пра справы, пачынаючы ад сямейных ажно да падзеяў дзяржаўнага маштабу. Калі ж яны даходзяць да месца, якое іх сярдуе, чым далей гавораць — тым больш гневаюцца.

Практыкоўцам неабходна надаваць вялікую ўвагу Дэ. Падчас нашае практыкі не думай пра добрыя рэчы. Нельга думаць і пра благое. Найлепей ні пра што не думаць. Бо на нізкім узроўні практыкі трэба закласці аснову (і гэтая аснова, выяўляецца, адыгрывае надзвычай важную ролю), а дзеянне чалавечых думак аказвае пэўны ўплыў. Падумай: калі ты нешта дадасі ў свой Ґун, ці могуць быць добрымі выпрацаваныя табой рэчы? Ці не будуць яны цёмнымі? Колькі людзей робяць практыкаванні ціґун і не маюць такіх думак?! Чаму ты ўвесь час практыкуеш, а хваробы не знікаюць? На пляцоўцы для заняткаў ціґун некаторыя не думаюць пра дрэнныя справы, але ўвесь час маюць у душы імкненне здабыць звышздольнасці, просяць таго ці іншага. Яны займаюцца практыкай у розных душэўных станах і з рознымі моцнымі жаданнямі. Насамрэч, гэтыя людзі ўжо несвядома практыкуюць па няправедных метадах. Калі скажаш, што ён займаецца па няправедных метадах, дык ён раззлуецца: «Я навучаўся ў таго вялікага майстра ціґун». Але той «вялікі майстар» вучыў цябе звяртаць увагу на Дэ. А ты звяртаў? Калі ты займаешся ціґун, увесь час прымешваеш дрэнныя думкі. Скажы, хіба ты зможаш так выпрацаваць нешта добрае? Менавіта такая праблема — несвядомая практыка па няправедных метадах, і гэта даволі распаўсюджаная з'ява.

## ПАРНАЕ ЎДАСКАНАЛЬВАННЕ МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ

У колах удасканальвальнікаў існуе метад, які называецца парным удасканальваннем мужчыны і жанчыны. У метадзе самаўдасканальвання Тыбецкае Тантры, у скульптурных ці жывапісных выявах Будаў вы, магчыма, бачылі, як мужчынскае цела, абдымаючы жаночае, удасканальваецца. Часам мужчынскае цела, якое абдымае абсалютна голую жанчыну, мае форму Буды; сустракаецца і метамарфознае цела Буды — Ваджра з бычынай галавой альбо конскай храпай, якое абдымае жаночае цела, таксама голае. Чаму ж гэта так? Перадусім мы растлумачым вам гэтае пытанне. На нашым зямным шары не толькі наш Кітай зведаў уплыў канфуцыянства... у даўніну, некалькі стагоддзяў таму, уяўленні чалавецтва наконт маральнасці амаль не адрозніваліся. Насамрэч такі метад удасканальвання не створаны на Зямлі, а перададзены з іншае планеты, аднак па такім метадзе сапраўды можна ўдасканальвацца. Калі

ў свой час гэты метад удасканальвання пранік у наш Кітай, менавіта з прычыны таго, што ў ім ёсць парнае ўдасканальванне мужчыны і жанчыны ды пэўныя элементы, якія прыналежалі да таемнае практыкі, кітайцы не маглі яго прыняць. Таму ў гады Хўэйчан[146] дынастыі Тан ён быў ліквідаваны імператарам ханьскае зямлі. Не дазвалялася, каб ён распаўсюджваўся на ханьскай зямлі. У той час ён называўся Танскай Тантрай. Але ў асаблівым асяроддзі, у асаблівым рэгіёне, якім быў Тыбет, ён распаўсюдзіўся. Чаму ж яны так удасканальваюцца? Парнае ўдасканальванне мужчыны і жанчыны мае за мэту дасягненне балансу паміж інь і ян праз збор інь для кампенсавання ян і збор ян для кампенсавання інь, узаемнае кампенсаванне ды ўзаемнае ўдасканальванне адно аднаго.

Як вы ведаеце, у школе Буды, і ў школе Даа, асабліва ў вучэнні школы Даа пра інь і ян, адзначаецца, што ў целе чалавека ўжо існуюць інь і ян. Толькі таму, што ў целе чалавека існуюць інь і ян, яно можа ўдасканальваннем выпрацаваць розныя звышздольнасці, Дасканалае немаўля, Інхараў, Целы Закону ды іншых істот. Раз у ім існуюць інь і ян, значыць, шляхам удасканальвання можна выпрацаваць вельмі шмат жывых істот. Усё адно, мужчынскае гэта цела ці жаночае, усё аднолькава. Усіх тых істотаў можна спарадзіць у даньт'ень — гэтае сцвярджэнне цалкам абгрунтаванае. Школа Даа разглядае верхнюю палову цела як ян, а ніжнюю — як інь; спіну — як ян, а пярэднюю частку цела — як інь; левы бок — як ян, а правы бок — як інь, адкуль і паходзіць выраз, які ёсць у нас у Кітаі: «мужчынскае — гэта левае, жаночае — правае», што з'яўляецца слушным. Раз цела чалавека ўжо і так мае інь і ян, дык падчас іх узаемадзеяння можна самому дасягнуць балансу інь і ян, а значыць, спарадзіць мноства жывых істот.

Гэта сведчыць пра тое, што і без выкарыстання метаду парнага ўдасканальвання мужчыны і жанчыны мы таксама можам дасягнуць вельмі высокага ўзроўню ў самаўдасканальванні. Калі, выкарыстоўваючы ў сваім самаўдасканальванні гэты метад, дрэнна валодаеш сабой, тады ўспыхнеш распуснай жарсцю, і гэта ператворыцца ў няправедны метад. На вельмі высокім узроўні, каб выкарыстоўваць у Тантры парнае ўдасканальванне мужчыны і жанчыны, неабходна, каб гэты манах альбо лама дасягнуў вельмі высокага ўзроўню. Толькі тады пад кіраўніцтвам свайго настаўніка ён зможа здзейсніць такое ўдасканальванне. З прычыны таго, што яго Сіньсін ужо вельмі высокі, ён можа трымаць сябе ў руках, каб гэта не ператварылася ў нейкую ерась. А вось тым, у каго Сіньсін вельмі нізкі, такі метад зусім нельга выкарыстоўваць, і калі яны яго выкарыстаюць, тады, гарантую, упадуць у ерась. Бо ў такіх людзей Сіньсін абмежаваны. На ступені звычайных людзей яны не пазбавіліся ад сексуальнага жадання ды эратычнае цягі. Іх лінейка Сіньсін толькі такое вышыні. Гарантую, як толькі яны пачнуць выкарыстоўваць гэты метад, дык ён адразу ж ператворыцца ў ерась. Таму, як мы ўжо казалі, адвольнае навучанне такому метаду на нізкім узроўні — гэта не што іншае, як навучанне няправеднаму метаду.

У апошнія гады нямала майстроў ціґун перадаюць парнае ўдасканальванне мужчыны і жанчыны. Што тут дзіўнага? У школе Даа таксама з'явіўся метад парнага ўдасканальвання мужчыны і жанчыны, больш за тое, ён з'явіўся не ў цяперашні час, а пачынаючы з дынастыі Тан. Як жа так атрымалася, што ў школе Даа з'явілася парнае ўдасканальванне? Паводле вучэння пра тайдзі школы Даа, цела ўяўляе сабой малы сусвет, дзе ўжо і так існуюць інь і ян. Усе сапраўдныя Вялікія Законы дайшлі да нас з далёкіх часоў, адвольная іх змена, адвольнае прымешванне да іх чагосьці іншага прывядзе ў нелад рэчы тое школы і прывядзе да таго, што па гэтай школе немагчыма будзе дасягнуць мэты поўнае дасканаласці ў самаўдасканальванні. Таму, калі метад практыкі нейкае школы не змяшчае ў сабе парнага ўдасканальвання мужчыны і жанчыны, тады ні ў якім разе нельга яго практыкаваць. Калі гэта зрабіць, з'явяцца адхіленні, і ўзнікнуць праблемы. У прыватнасці, нашая школа Фалунь Дафа не змяшчае парнага ўдасканальвання мужчыны і жанчыны, і мы таксама не навучаем гэтаму. Такі наш погляд на гэтае пытанне.

## УДАСКАНАЛЬВАННЕ СІНЬСІН І ДАЎГАЛЕЦЦЯ

Тэму пра ўдасканальванне Сіньсін і даўгалецця я вам ужо растлумачваў. Удасканальванне Сіньсін і даўгалецця азначае, што ты павінен не толькі ўдасканальваць Сіньсін, але і адначасова ўдасканальваць даўгалецце, гэта значыць змяняць бэньт'і. У працэсе гэтае змены клеткі чалавека паступова замяняюцца рэчывамі высокай энергіі, што можа запаволіць старэнне. Цела пачынае амаладжвацца і паступова пераўтвараецца, пакуль звычайная плоць не будзе канчаткова замененая рэчывамі высокай энергіі, тады цела гэтага чалавека ўжо цалкамператворыцца ў цела з іншага роду матэрыі. Такое цела, як я ўжо казаў, выходзіць за межы «пяці элементаў», не знаходзіцца ў «пяці элементах» ды становіцца «нятленным целам».

Самаўдасканальванне ў манастырах удасканальвае толькі Сіньсін, таму яно праходзіць без цялесных рухаў, без удасканальвання даўгалецця і вядзе да нірваны. Метад, які перадаваў Шак'ямуні, акурат і вядзе да нірваны. Насамрэч Шак'ямуні сам меў глыбокі Вялікі Закон, яго бэньт'і суцэль можна было пераўтварыць у матэрыю высокай энергіі ды забраць з сабой. Для таго, каб пакінуць такі метад удасканальвання, ён сам сышоў у нірвану. Чаму ён навучаў такому метаду? Ён рабіў гэта менавіта для таго, каб людзі максімальна адмовіліся ад прывязанасцяў, адмовіліся ад усяго, урэшце адмовіліся нават ад цела, каб у іх зніклі ўсе жаданні. Для таго, каб людзі рабілі ўсё магчымае ў гэтым накірунку, ён пайшоў шляхам нірваны, таму манахі ўсіх эпох таксама ішлі шляхам нірваны. Пад словам «нірвана» маецца на ўвазе тое, што манах пасля смерці кідае сваю плоць, а яго душа, забраўшы з сабой Ґун, узносіцца ўгару.

Школа Даа робіць акцэнт на ўдасканальванне даўгалецця, бо яны падбіраюць сабе вучняў, а не здзяйсняюць выратаванне ўсіх жывых істот. Яны маюць

справу з надзвычай добрымі людзьмі. Таму надаюць вялікую ўвагу магічным рэчам, тлумачаць пытанне пра тое, як удасканальваць даўгалецце. А што тычыцца метаду ўдасканальвання школы Буды, асабліва метаду ўдасканальвання ў будызме, дык яны гэтага ў сабе не змяшчаюць. Але так бывае не заўсёды, у многіх глыбокіх Вялікіх Законах школы Буды, у тым ліку і ў нашай школе, такое таксама ёсць. У нашай школе Фалунь Дафа патрэбныя і бэньт’і, і Дасканалае немаўля, якія адрозніваюцца адно ад аднаго. Дасканалае немаўля ўяўляе сабой цела, якое складаецца з рэчываў высокай энергіі, але яму ўсё ж такі нельга адвольна паказвацца ў нашай прасторы. А каб у гэтай прасторы доўга захоўваць такі вобраз, як у звычайных людзей, неабходна мець нашае ўласнае цела. Таму пасля пераўтварэння гэтага бэньт’і, хаця яго клеткі былі замененыя рэчывамі высокай энергіі, парадак размяшчэння малекул не змяніўся, у выніку чаго цела знешне мала чым адрозніваецца ад цела звычайнага чалавека. Але ўсё ж розніца ёсць, а менавіта: гэтае цела можа ўвайсці ў іншыя прасторы.

Тыя, хто ўдасканальвае і Сіньсін, і даўгалецце, выглядаюць вельмі маладымі, нашмат маладзейшымі за свае гады. Аднойчы нейкая жанчына спытала мяне: «Настаўніку, на колькі гадоў выглядаю?» Насамрэч ёй ужо пад семдзесят, а на выгляд можна даць толькі гадоў сорак. Твар у яе гладкі, без зморшчынак, белы, з румянцам, яна зусім не падобная да чалавека, якому будзе семдзесят гадоў. Такое бывае ў тых, хто ўдасканальваецца па нашым Фалунь Дафа. Скажу жартам: маладыя дзяўчаты часта захапляюцца касметыкай, жадаюць, каб іх скура стала больш белай і далікатнай. Я скажу: пачні шчыра практыкаваць па метадзе ўдасканальвання Сіньсін і даўгалецця, і ты дасягнеш гэтае мэты прыродным шляхам. Гарантую, што карыстацца касметыкай табе не спатрэбіцца. Мы больш не будзем прыводзіць падобных прыкладаў. Раней з прычыны таго, што ў кожнай прафесіі пераважалі пажылыя людзі, іншыя абыходзіліся са мной як з маладым. Цяпер стала лепш, у кожнай прафесіі стала пераважаць моладзь. Насамрэч, я ўжо не малады. Праміне яшчэ трохі часу, і мне будзе пяцьдзясят. Зараз мне ўжо сорак тры гады.

## ЦЕЛА ЗАКОНУ

Чаму на выявах Будаў існуе поле? Многія людзі не могуць гэтага растлумачыць. Ёсць таксама тыя, хто кажа: «На выявах Будаў існуе поле, бо манахі чыталі перад імі каноны», — гэта значыць з'яўленне такога поля тлумачыцца тым, што манахі перад імі самаўдасканальваюцца. Хто б тут ні ўдасканальваўся, манахі або нехта іншы, энергія была б рассеянай, яна не мела б накіраванасці. Тады ва ўсёй зале для чытання канонаў будыйскага манастыра павінна існаваць раўнамернае поле: на падлозе, на стале ды на сценах. Дык чаму ж, наадварот, менавіта на выявах Будаў назіраецца такое інтэнсіўнае поле? Такое поле асабліва часта маюць статуі Буды, якія знаходзяцца ў нейкай пячоры, альбо высечаныя ў скале. Чаму такое поле ўзнікае? Некаторыя гэта так тлумачаць,

некаторыя па-іншаму, але, як бы ні тлумачылі, усё адно не сходзіцца. Насамрэч такое поле на выяве Буды з'яўляецца таму, што там знаходзіцца Цела Закону Прабуджанага. У выяве Буды знаходзіцца Цела Закону Прабуджанага, таму яна мае энергію.

Шак'ямуні, Бадгісатва Авалакітэшвара[147], калі яны сапраўды былі гістарычнымі постацямі, падумайце, ці не былі яны падчас свайго ўдасканальвання таксама практыкоўцамі? Калі чалавек дасягае пэўнага, даволі высокага ўзроўню ў самаўдасканальванні па Законе за межамі чалавечага свету, у яго з'яўляецца Цела Закону. Цела Закону нараджаецца ў даньт'ень чалавека, яно складаецца з Закону і Ґун і праяўляецца ў іншых прасторах. Цела Закону мае магутную сілу гэтай асобы, але свядомасць Цела Закону, яго думкі ўсё ж знаходзяцца пад кантролем Галоўнага цела. Але само Цела Закону ўяўляе сабой цэласнае, самастойнае ды рэальнае індывідуальнае жыццё, таму яно здольнае самастойна здзяйсняць любую справу. Цела Закону робіць абсалютна тое ж самае, што хацела б зрабіць і галоўная свядомасць чалавека. Абсалютна тое ж самае. Якім бы чынам зрабіла што-небудзь сама асоба, гэтак жа робіць і яе Цела Закону — такім і з'яўляецца Цела Закону, пра якое мы кажам. Калі я хачу нешта зрабіць, скажам, прывесці да ладу здароўе паслядоўнікаў, усё гэта зробяць мае Целы Закону. Целы Закону ж не маюць цела звычайнага чалавека, яны ўвасабляюцца ў іншых прасторах. Гэтыя жывыя істоты таксама не заўсёды застаюцца нязменнымі, яны могуць павялічвацца ды памяншацца. Часам Цела Закону становіцца такіх вялікіх памераў, што цяжка ахапіць адным позіркам усю яго галаву; а часам — вельмі маленечкім, нават меншым за клетку.

## АСВЯЧЭННЕ

Статуі Буды, якія вырабляюцца на фабрыках, з'яўляюцца толькі мастацкімі творамі. Пад асвячэннем маецца на ўвазе запрашэнне Цела Закону Буды ў статую Буды, каб потым пакланяцца статуі Буды, як бачнаму аб'екту сярод звычайных людзей. Калі практыкоўца мае пачуццё глыбокае пашаны падчас самаўдасканальвання, Цела Закону ў статуі Буды з'яўляецца абаронцам Закону для яго, ахоўвае яго ды абараняе яго — гэта з'яўляецца сапраўднай мэтай асвячэння. Гэта можа выканаць толькі той, хто выпраменьвае праведныя думкі на афіцыйнай цырымоніі асвячэння, або Вялікі Прабуджаны, які знаходзіцца на вельмі высокім узроўні, або той, хто ўдасканальваецца на вельмі высокім узроўні ды мае такую сілу.

У манастырах кажуць, што статуі Буды патрэбна асвячаць, і што неасвечаныя статуі не маюць цудадзейнае сілы. Цяпер сярод манахаў у манастырах сапраўдных настаўнікаў ужо няма сярод жывых. Пасля «Вялікае культурнае рэвалюцыі»[148] настаяцелямі манастыроў сталі колішнія малодшыя манахі, якія не атрымалі сапраўднае перадачы, у сувязі з гэтым шмат чаго было страчана. Яго запытваюць: «Навошта асвячаць?» Ён адказвае, што пасля асвячэння

статуя Буды становіцца цудадзейнай. А якім чынам яна становіцца цудадзейнай, ён не можа растлумачыць. Ён толькі ладзіць цырымонію: укладвае ў статую Буды маленькі асобнік канону, потым заляпляе аркушам паперы і чытае перад ёй каноны ды кажа, што асвячэнне выканана. Але ці можна такім чынам асвяціць? Гэта залежыць ад таго, як ён чытаў каноны. Шак'ямуні акцэнтаваў важнасць праведных думак, неабходна цалкам паглыбіцца ў чытанне канонаў, каб сапраўды скалануць свет тое школы, па якой ты ўдасканальваешся, толькі тады можна прывабіць Прабуджанага. Толькі ў тым выпадку, калі адно з Целаў Закону Прабуджанага ўвойдзе ў статую, можна дасягнуць мэты асвячэння.

Некаторыя манахі вуснамі чытаюць канон, а самі думаюць: «Колькі грошай мне дадуць пасля цырымоніі асвячэння статуі?» Альбо, чытаючы канон, думаюць: «Той так дрэнна да мяне ставіцца». Там у іх таксама ўзаемныя інтрыгі. У цяперашні час, у Канцавы перыяд Закону, не прызнаць такое з'явы таксама нельга. Мы тут не крытыкуем будызм: у Канцавы перыяд Закону ў некаторых манастырах сапраўды адсутнічаюць чысціня ды спакой. Калі іх галава забітая гэтымі рэчамі, калі яны дасылаюць настолькі дрэнныя думкі, хіба Прабуджаны можа прыйсці? Так наогул немагчыма дасягнуць мэты асвячэння. Але нельга гэта абсалютызаваць. Існуюць асобныя добрыя будыйскія манастыры і даоскія храмы.

У адным горадзе я ўбачыў манаха з чорнымі, як смоль, рукамі. Ён сунуў канон у статую Буды, потым сяк-так заклеіў яе, прамармытаў пару слоў, і асвячэнне ўжо лічылася выкананым. Потым ён узяў чарговую статую Буды, ізноў прамармытаў пару слоў. За асвячэнне кожнае статуі яму плацілі па 40 юаняў. Цяпер манахі нават лічаць статуі Буды таварам і нажываюць сабе багацце на іх асвячэнні. Я паглядзеў на статую ды ўбачыў, што яна не была асвечаная. І наогул той манах на гэта не здольны. Цяперашнія манахі займаюцца нават такімі справамі. А што яшчэ я ўбачыў? У манастыры нейкі чалавек — нібыта свецкі будыст — сказаў, што асвяціць статую Буды. Ён трымаў у руцэ люстэрка, павернутае да сонца так, каб святло адбівалася на статую Буды. Ён сказаў, што асвячэнне выканана. Гэта ўжо стала смешным да такое ступені! Сёння будызм дайшоў да такога этапу, калі падобныя выпадкі сталі паўсюднай з'явай.

Велізарная бронзавая статуя Буды была адлітая ў горадзе Нанкін ды пастаўленая на востраве Даюйшань у Ганконгу. Каласальная статуя. Шмат манахаў прыехала туды з усіх канцоў свету на асвячэнне гэтае статуі. Адзін з іх трымаў у руцэ люстэрка, накіроўваючы яго на сонца так, каб адлюстраваны прамень падаў на твар статуі, — ён лічыў, што гэта і з'яўляецца асвячэннем. На такой урачыстай цырымоніі, у вельмі сур'ёзных абставінах ён узяў ды выкінуў такую штуку, што падалося мне вельмі сумным! Нядзіўна, што Шак'ямуні сказаў: «У Канцавы перыяд Закону манахам будзе цяжка выратаваць нават саміх сябе, а ратаваць людзей яшчэ цяжэй». Ды яшчэ шмат манахаў са свайго пункту гледжання тлумачаць будыйскія каноны, у манастырах апынуўся нават нейкі

«Канон Багіні Ванму» ды ўсялякае іншае, што не мае аніякага дачынення да будыйскага вучэння, адным словам, поўны хаос. Вядома, усё яшчэ сустракаюцца тыя манахі, якія шчыра ўдасканальваюцца і заслугоўваюць пахвалы. Насамрэч пад асвячэннем маецца на ўвазе запрашэнне Цела Закону Прабуджанага ў статую Буды. Гэта, уласна, і з’яўляецца асвячэннем.

Неасвечаным статуям Буды нельга пакланяцца, інакш будуць надзвычай сур'ёзныя наступствы. Якія сур'ёзныя наступствы? Зараз людзі, якія займаюцца навукай пра цела чалавека, заўважылі, што думкі чалавека, мысленне ў мозгу чалавека спараджае пэўнае рэчыва. З пункту гледжання вельмі высокага ўзроўню мы бачым, што гэта і сапраўды рэчыва, але яно ўяўляе сабой не форму электрычных хваляў мозга, як сцвярджае цяперашняя навука, а форму цэласнага чалавечага мозга. Калі звычайны чалавек думае, ён выпраменьвае форму мозга, якая неўзабаве рассейваецца з прычыны адсутнасці ў ёй энергіі. А вось энергія практыкоўцы можа захавацца нашмат даўжэй. Не гаворым, што статуя Буды з таго моманту, як была выраблена на заводзе, ужо мае здольнасць мыслення, не. Некаторыя статуі Буды не былі асвечаныя, іншыя вазілі ў храм, але так і не была дасягнутая мэта асвячэння. Калі папрасіць выканаць асвячэнне нейкага псеўдамайстра ціґун альбо нейкага ерэтыка, тады будзе яшчэ больш небяспечна: у гэтыя статуі Буды ўлезе нячысты дух накшталт лісы, тхара.

Пакланенне неасвечанай статуі Буды неймаверна небяспечна. Да якое ступені небяспечна? Як я ўжо казаў, сёння чалавецтва ў сваім развіцці ўжо дайшло да такога стану, калі ўсё псуецца, ва ўсім чалавечым грамадстве і ва ўсім Сусвеце ўсё псуецца; усё, што дзеецца цяпер сярод звычайных людзей, абумоўлена самімі людзьмі. Цяжка нават знайсці праведны Закон, гэтак жа цяжка ўстаць на праведны шлях — перашкоды з розных бакоў. Ты хочаш пра што-небудзь папрасіць Буду, дык а хто ж гэты Буда? Нават такі твой намер натыкаецца на цяжкасці. Не верыш? Скажу табе: калі першы чалавек пакланіцца неасвечанай статуі Буды, тады справы кепскія. Колькі сёння сярод людзей, якія пакланяюцца статуям Буды, тых, хто сапраўды просіць Буду пра атрыманне Паўнапраўнага дасягнення? Такіх неймаверна мала. Якая ж мэта ў большасці людзей, якія пакланяюцца статуям Буды? Гэта адвесці бяду, пазбавіцца ад пакутаў, разбагацець. Вось пра што яны просяць. Хіба гэта тое, пра што пішацца ў будыйскіх канонах? Там такога наогул няма.

Калі тыя, хто пакланяецца Буду, гоняцца за грашыма і, кланяючыся статуі Буды (або статуі Бадгісатвы Авалакітэшвары, ці статуі Буды Татгаґаты) кажуць: «Дапамажы мне разбагацець хоць трошкі!», — тады сфармавалася цэласная думка. Раз гэтая думка была выпрамененая на статую Буды, дык адразу ж асела на яе. У іншай прасторы гэты прадмет можа павялічвацца ды памяншацца. Атрымаўшы гэты прадмет, статуя Буды набыла здольнасць мыслення, але яна не мае цела. Нехта іншы таксама прыходзіць на пакланенне, пастаяннае пакланенне можа даць статуі Буды пэўную энергію.

Будзе яшчэ больш небяспечна, калі прыйдуць практыкоўцы: як толькі паклоняцца, дык будуць паступова аддаваць ёй энергію, і ў яе ўтворыцца цела, якое мае форму, але гэтае цела ўтвараецца ў іншай прасторы. Пасля свайго ўтварэння яно знаходзіцца ў іншай прасторы. Яно разумее сякія-такія прынцыпы Сусвету, таму можа сёе-тое рабіць для людзей, дзякуючы чаму ў яго трошкі ўзрасце Ґун, але яго дапамога не безумоўная і чакае аплаты. У іншай прасторы яго дзеянне свабоднае, яно маніпулюе звычайнымі людзьмі неверагодна лёгка. Такое цела, якое мае форму, цалкам ідэнтычнае па абліччы са статуяй Буды — пакланенне спарадзіла фальшывых Бадгісатваў Авалакітэшвараў ды фальшывых Будаў Татгаґатаў. Гэта людзі пакланеннем спарадзілі іх, усе яны — дакладныя копіі статуяў Буды, вобразаў Буды. Думкі ж у псеўдабудаў ды псеўдабадгісатваў надзвычай дрэнныя: яны прагнуць грошай. Яны нарадзіліся ў іншай прасторы ды могуць мысліць, ведаюць некаторыя прынцыпы; яны не смеюць рабіць вялікае зло, але асмельваюцца рабіць дробнае. Часам дапамагаюць людзям: калі б не дапамагалі, тады б яны былі цалкам няправеднымі, і іх бы забілі. Як яны дапамагаюць? Нехта просіць: «Буда, дапамажы мне, у мяне дома хворы». — «Добра, я табе дапамагу». Ён загадаў табе кінуць грошы ў скрыню для дабрачыннага ахвяравання, у яго мысленні — патрабаванне грошай. Хто кідае ў скрыню больш грошай, той і акрыяе хутчэй. З прычыны таго, што яны маюць пэўную энергію, яны ў іншай прасторы могуць кіраваць звычайным чалавекам. Небяспека ўзрасце, калі чалавек, які мае Ґун, прыйдзе на пакланенне. А чаго просіць практыкоўца? Грошай. Падумайце, якога яшчэ багацця прасіць практыкоўцу? Нават маленне аб збавенні сваякоў ад бедстваў ды хваробаў з'яўляецца свайго роду прывязанасцю да сямейных пачуццяў. Ты хочаш распараджацца чужым лёсам, у той час як у кожнага свой лёс! Ты пакланяешся яму, мармычаш: «Дапамажы мне трошкі разбагацець». Добра, ён табе дапаможа, ён так і мроіць, каб ты прасіў шмат грошай; прасіў як мага больш, і тады, у сваю чаргу, ён зможа больш узяць ад цябе, і гэта будзе свайго роду раўнавартасны абмен. У скрыні для дабрачыннага ахвяравання колькі заўгодна грошай, бо іх накідалі туды іншыя людзі. Ён дазволіць табе здабыць гэтыя грошы. Якім чынам? Альбо на вуліцы табе трапіцца кашалёк, альбо на працы выдадуць прэмію. Ён скарыстае любыя спосабы, каб ты атрымаў грошы. Але ён жа не можа дапамагаць табе бескарысліва! Не страціш — не атрымаеш. Яму не хапае Ґун, і ён забярэ ў цябе гэты Ґун або выпрацаваны табой дань і гэтак далей. Вось што яму патрэбна.

Гэтыя псеўдабуды часам вельмі небяспечныя. Шмат хто з нас, у каго адкрылася нябеснае вока, думае, што бачыў Буду. Нехта распавядае, што сёння манастыр наведала група Будаў, якую ачольваў Буда з вось такім імем. Учора, маўляў, была такая група, сёння — іншая; неўзабаве, калі сышла адна група, яе змяніла новая. Што гэта? Яны прыналежаць менавіта да згаданае мной катэгорыі. Яны не сапраўдныя Буды, яны фальшывыя, і такіх даволі шмат.

Калі такая сітуацыя ўзнікне ў манастыры, тады будзе яшчэ больш небяспечна. Калі манахі ім паклоняцца, тады яны возьмуць гэтых манахаў пад сваю апеку: «Хіба ты не пакланяешся мне? Ты свядома пакланяешся мне! Добра, хіба ты не

хочаш удасканальвацца? Добра, я пра цябе падбаю ды скажу, як табе трэба ўдасканальвацца». Ён усё табе заплануе, але куды ты патрапіш, калі завершыцца ўдасканальванне? Гэта ён запланаваў табе, таму аніводная школа наверсе цябе не прызнае сваім. Раз гэта ён запланаваў, дык у будучыні ты будзеш пад яго веданнем. Ці не марна, выходзіць, ты ўдасканальваешся? Я лічу, што зараз чалавецтву атрымаць Паўнапраўнае дасягненне ва ўдасканальванні вельмі цяжка. Такая з'ява вельмі распаўсюджаная. «Ззянне Буды», якое назіраюць многія з нас у славутых гарах і ля вялікіх рэк, у большасці выпадкаў прыналежыць да вышэйзгаданага — яны маюць энергію ды могуць паказвацца. А сапраўдныя Вялікія Прабуджаныя паказваюцца толькі зрэдчас.

У мінулым так званых «наземных будаў» і «наземных даосаў» было параўнальна мала, а цяпер іх надзвычай шмат. Калі яны чыняць зло, тыя, хто знаходзіцца вышэй, іх знішчаюць. Калі яны павінны быць знішчаныя, тады хаваюцца ў статуі Буды. Як правіла, Прабуджаныя, асабліва тыя, якія знаходзяцца на высокіх узроўнях, не парушаюць прынцыпаў звычайных людзей. Чым вышэй Прабуджаны, тым больш ён не парушыць прынцыпаў звычайных людзей, наогул не кране. Было б неверагодным, калі б знянацку статую разбіла ўшчэнт адным ударам грому — Прабуджаныя не зробяць штосьці падобнае. Таму, калі наземныя буды і даосы, уцякаючы, уваходзяць у статуі Буды, тады Прабуджаныя больш не ўмешваюцца. Такім чынам, ці была Бадгісатва Авалакітэшвара, якую ты бачыў, сапраўды Бадгісатвай Авалакітэшварай? Ці быў Буда, якога ты бачыў, сапраўды Будам? Вельмі цяжка сказаць.

Шмат у каго можа ўзнікнуць пытанне: што рабіць са статуяй Буды ў сябе дома? Магчыма, многія згадалі пра мяне. Каб дапамагчы вучням удасканальвацца, я скажу, што можна зрабіць так: вазьмі маю кнігу (бо ў ёй ёсць мой фотаздымак) альбо проста мой фотаздымак і, трымаючы статуэтку Буды ў руках, складзеных у мудру «Вялікага лотаса»[149], папрасі Настаўніка выканаць асвячэнне, нібы просіш мяне самога. Дастаткова паўхвіліны, і пытанне будзе вырашанае. Аднак скажу вам, што гэта распаўсюджваецца толькі на ўдасканальвальнікаў. Для вашых сваякоў і сяброў гэты спосаб асвячэння эфекту мець не будзе, мы дбаем толькі пра ўдасканальвальнікаў. Некаторыя лічаць, што можна выкарыстоўваць партрэт Настаўніка для выгнання злых духаў у доме сваякоў і сяброў. Я не аберагаю ад нячысцікаў звычайных людзей. Гэта праява найвялікшае непавагі да Настаўніка.

Кажучы пра «наземных будаў» і «наземных даосаў», трэба адзначыць наступнае: у старажытным Кітаі шмат хто ўдасканальваўся ў глухіх гарах ды лясах. А чаму цяпер яны зніклі? Насамрэч, яны не зніклі, яны проста не даюць звычайным людзям пра сябе ведаць, іх колькасць ніколькі не скарацілася. Тыя людзі маюць звышздольнасці. Справа не ў тым, што ў апошнія гады яны перасталі існаваць, яны ёсць. Зараз ва ўсім свеце іх некалькі тысяч, у нашай

краіне іх параўнальна больш. Асабліва яны ёсць у вядомых гарах і ля вялікіх рэк, а таксама ў некаторых высакагор'ях. З дапамогай звышздольнасцяў яны закрылі ўваходы ў пячоры, таму вам не заўважыць іх прысутнасці. Практыка іх удасканальвання праходзіць даволі павольна, прыёмы ў іх параўнальна прымітыўныя, яны не могуць улавіць сутнасці ўдасканальвання. А ў нас яно накіравана непасрэдна на душу чалавека. Мы ўдасканальваемся, кіруючыся найвышэйшай уласцівасцю Сусвету, удасканальваемся па форме Сусвету. Пэўная рэч, Ґун у нас узрастае вельмі хутка. Бо школы ўдасканальвання нагадваюць піраміду. Толькі ў сярэдзіне яе Вялікі Даа[150]. Самаўдасканальванне па сцяжынках, якія па краях, наўрад ці можа падняць Сіньсін высока. Магчыма, у іх практыкоўцаў падчас дасягнення невысокага ўзроўню ўжо адкрываецца Ґун. Аднак гэта не можа ісці ні ў якое параўнанне з Вялікім Даа сапраўднага ўдасканальвання.

Тыя, хто прыналежыць да гэткіх малых Даа, таксама перадаюць свае рэчы ў спадчыну ды выхоўваюць вучняў. У іх школе ўдасканальваюцца толькі да пэўнае вышыні; іх Сіньсін абмежаваны такой вышынёй, таму ўсе іх вучні ўдасканальваюцца толькі да такое вышыні. Чым бліжэй да краю піраміды гэты малы Даа ўзроўню чалавечага свету, тым больш у ім сцвярджэнняў. Ды яшчэ метад удасканальвання ў ім складаны, і ўдасканальваюцца там, не ўлавіўшы сутнасці. Самым галоўным у самаўдасканальванні з'яўляецца падвышэнне Сіньсін. Яны ж, аднак, гэтага не разумеюць. Яны думаюць, што для ўдасканальвання дастаткова толькі пакутаваць. Таму яны прайшлі праз працяглы перыяд. Удасканальваўшыся некалькі стагоддзяў, больш за тысячу гадоў, яны ўзрасцілі толькі вось такі мізэрны Ґун. Насамрэч, яны дасягнулі дасканаласці не дзякуючы пакутам. А дзякуючы чаму? Гэта падобна да таго, як бывае з кожным чалавекам: у маладосці быў апанаваны разнастайнымі навязлівымі ідэямі, аднак з цягам часу, калі ўжо прыходзіць старасць, у яго знікае надзея на будучыню, усе яго імкненні самі па сабе адкідваюцца, сціраюцца. Менавіта такі спосаб выкарыстоўваюць і гэтыя малыя Даа. Яны выявілі, што ва ўдасканальванні, абапіраючыся на сядзенне ў медытацыі, сваю сілу сузірання ды трыванне пакутаў, можна таксама вырасціць Ґун. Аднак яны не ведаюць, што іх навязлівыя ідэі звычайных людзей за доўгія горкія гады паступова сціраліся, паступова ўстараняліся, дзякуючы чаму і вырас іх Ґун.

Мы мэтанакіраваныя — мы сапраўды ўказваем на тыя ідэі, аслабляем тыя ідэі, а таму і ўдасканальваемся вельмі хутка. Я бываў у некаторых месцах, дзе часта сустракаўся з такімі людзьмі, якія ўдасканальваліся ўжо вельмі шмат гадоў. Яны мне казалі: «Ніхто не можа ведаць, што мы тут знаходзімся. У тваю справу мы не ўмешваемся і не шкодзім ёй». Такія прыналежаць да параўнальна добрых.

Аднак ёсць і благія, у дачыненні да якіх мы робім неабходныя захады. Напрыклад, калі я ўпершыню прыехаў у правінцыю Ґуйджоў для навучання практыцы, да мяне падчас курсаў прыйшоў адзін чалавек і сказаў, што яго

пранастаўнік хацеў бы са мной сустрэцца, і назваў імя гэтага пранастаўніка, і дадаў, што, маўляў, пранастаўнік удасканальваецца ўжо неймаверна шмат гадоў. Аднаго майго позірку было дастаткова, каб убачыць, што ён мае іньскі ці, вельмі дрэнны. Яго твар быў васковы. Я сказаў, што не пайду на сустрэчу з ім, што не маю на гэта часу, і адмовіў. У выніку той стары важак раззлаваўся ды пачаў мне шкодзіць. Ён штодня ствараў мне перашкоды. Я такі чалавек, які не жадае змагацца з іншымі, ды яно таго і не варта, каб я з ім біўся. Ён накіроўваў на мяне дрэнныя рэчы, а я іх знішчаў, пасля чаго выкладаў свой Закон.

У мінулым, у часы дынастыі Мін, жыў нейкі чалавек, які ўдасканальваўся па Даа, падчас удасканальвання ў яго ўсяліўся нячысцік — змяя. Так і не ўдасканаліўшыся, чалавек гэты памёр. Змяя ж, авалодаўшы яго целам, выпрацавала сабе чалавечы вобраз. Дык гэты пранастаўнік не хто іншы, як тая змяя, якая прыняла чалавечае аблічча. Раз яго сутнасць засталася нязменнай, ён ізноў абярнуўся вялікай змяёй, каб мне шкодзіць. Я ўбачыў, што гэта ўжо занадта, таму схапіў яе ў рукі ды скарыстаў надзвычай магутны від Ґун, які называецца Ґун раскладання. Я расклаў ніжнюю палову цела змяі, ператварыў яе ў ваду. Верхняя ж палова ўцякла назад.

І вось аднойчы яго правучань выклікаў кіраўніцу нашага кансультацыйнага пункту ў правінцыі Ґуйджоў ды сказаў, што яго пранастаўнік хоча сустрэцца з ёй. Яна пайшла на сустрэчу, увайшла ў пячору, дзе было вельмі цёмна, нічога не было бачна, толькі можна было заўважыць, што там сядзіць сілуэт, у якога вочы ззялі зялёным святлом. Калі ён расплюшчваў вочы, у пячоры станавілася светла, а калі заплюшчваў, наставала поўная цемра. На мясцовым дыялекце стары вымавіў: «Лі Хунджы прыязджае зноў, на гэты раз ніхто з нас не будзе перашкаджаць яму. Я памыліўся: Лі Хунджы прыедзе сюды выратоўваць людзей». Яго правучань запытаў у яго: «Пранастаўніку, калі ласка, устаньце! Што сталася з вашымі нагамі?» «Не магу ўстаць, — адказаў стары, — мае ногі параненыя». Спыталі, якім чынам ён іх параніў, і ён пачаў распавядаць пра тое, як ён мне перашкаджаў. У 1993 годзе на Усходняй выставе здароўя ў Пекіне ён ізноў зрабіў мне непрыемнасці. З прычыны таго, што ён увесь час рабіў зло, шкодзіў маёй перадачы Дафа, я знішчыў яго канчаткова. Пасля гэтага яго старшыя ды малодшыя вучні хацелі дзейнічаць. Я адразу сказаў ім некалькі слоў, якія выклікалі ў іх узрушэнне ды неймаверны жах. Ніхто з іх не адважыўся нешта зрабіць. Яны ўжо зразумелі, у чым справа. Сярод іх былі такія, якія так цалкам і засталіся звычайнымі людзьмі, хоць удасканальваліся вельмі доўгі час. Раскрываючы тэму асвячэння, я прывёў тут некалькі прыкладаў.

## ЗАГАВОРЫ

Што сабой уяўляе дысцыпліна загавораў[151]? У колах удасканальвальнікаў у працэсе навучання практыцы многія перадаюць іх як нешта, што прыналежыць да катэгорыі самаўдасканальвання. Насамрэч загаворы не прыналежаць да

катэгорыі самаўдасканальвання. Гэта нагадвае ўспадкаванне і перадачу сакрэтаў, заклёнаў і тэхнік. Формы, якія яны выкарыстоўваюць — гэта накрэсліванне магічных знакаў-формул, спальванне ладану, спальванне ахвяравальнае паперы, прамаўленне заклёнаў ды іншае. Загаворамі можна лекаваць хваробы, і метады такога лекавання вельмі спецыфічныя. Напрыклад, у кагосьці на твары вырас фурункул, а той, хто практыкуе загаворы, абмакнуўшы пэндзаль у цынобру, накрэслівае на зямлі круг, у сярэдзіне круга малюе крыж, потым кажа хвораму ўстаць у цэнтр круга ды пачынае прамаўляць заклёны. Пасля гэтага ізноў абмаквае пэндзаль у цынобру і малюе на твары хворага круг, адначасова прамаўляючы заклёны. Ён малюе, малюе, ставіць на фурункуле кропку, завяршае заклёны ды кажа, што хвароба вылекаваная. Ты памацаў: фурункул паменшыўся і боль суняўся. Метад дзейнічае. Ён можа вылекаваць лёгкую немач, а калі хваробы сур'ёзныя, у яго ўжо нічога не атрымаецца. Што ён зробіць, калі камусьці баліць рука? Ён пачынае прамаўляць заклёны, потым кажа табе выцягнуць рукі ў розныя бакі, пасля гэтага ён падзьме на кропку хэґу[152] адное рукі, каб паветра выйшла з кропкі хэґу другое рукі, і ты адчуеш подых ветрыку. Зноў памацаў хворае месца ды адчуў, што боль суняўся. Ёсць і такое, калі той, хто практыкуе загаворы, выкарыстоўвае спальванне ахвяравальнае паперы, накрэсліванне магічных знакаў, налепліванне магічных знакаў-формул і гэтак далей. Вось што ён робіць.

У малых Даа ўзроўню чалавечага свету, якія прыналежаць да Школы Даа, не здзяйсняюць фізічнага ўдасканальвання, яны займаюцца толькі варажбой, фэн-шуй[153], выгнаннем нячысцікаў ды лекаваннем. Тыя малыя Даа ўзроўню чалавечага свету звычайна выкарыстоўваюць загаворы. З іх дапамогай можна лекаваць хваробы, але метады, якія яны выкарыстоўваюць, не з'яўляюцца добрымі. Мы не будзем казаць, чым яны лекуюць хваробы, але нашым удасканальвальнікам па Дафа нельга выкарыстоўваць такія метады, бо яны нясуць у сабе вельмі нізкую, вельмі дрэнную інфармацыю. У старажытным Кітаі людзі падзялілі метады лекавання хваробаў на дысцыпліны. Напрыклад, кастапраўства, іголкаўколванне, прыпяканне, масаж, туйна[154], кропкавы масаж, ціґунтэрапія, лекаванне зёлкамі і гэтак далей. Яны падзяляліся на вельмі шмат відаў. Кожны метад лекавання называўся нейкай дысцыплінай[155]. Загаворы паставілі пад нумарам трынаццаць, таму яго поўная назва — «трынаццатая дысцыпліна: загаворы». Загаворы не прыналежаць да сферы самаўдасканальвання. Гэта не з’яўляецца Ґун, які атрымліваюць праз самаўдасканальванне, а з’яўляецца магічнай рэччу.

# ЛЕКЦЫЯ ШОСТАЯ

## «ВЫБЛІСК ДЫ ВАР’ЯЦТВА»

У колах удасканальвальнікаў існуе выраз «выбліск ды вар'яцтва». Ён мае велізарны ўплыў на людзей, асабліва, калі хтосьці зацята прапагандуе гэтыя справы, з прычыны чаго некаторыя не адважваюцца займацца практыкай. Людзі, пачуўшы, што ў практыцы бывае «выбліск ды вар'яцтва», баючыся, спыняюць заняткі. Насамрэч, скажу вам, што «выбліску ды вар'яцтва» наогул не існуе.

Нямала людзей з-за свайго няправеднага сэрца прывабілі да сябе нячыстых духаў. Іх галоўная свядомасць не ў стане кіраваць імі самімі, ды яны яшчэ лічаць, што гэта Ґун. Людзі, целы якіх кантралююць нячыстыя духі, паводзяцца непрыстойна, гавораць блытана і няўлад, нешта шалёна выкрыкваючы. Навакольныя думаюць, што гэта здарылася з прычыны заняткаў ціґун, і ад спалоху не адважваюцца займацца. Велізарная колькасць людзей лічыць, што гэта і з’яўляецца Ґун. Дзе тут выпрацоўка Ґун? Гэта ўсяго толькі найніжэйшы стан ацалення ды аздараўлення. Аднак ён вельмі небяспечны. Калі ты ўжо звыкся з такім станам, і твая галоўная свядомасць не ў сілах кіраваць табой, тады тваім целам, магчыма, будуць кіраваць дапаможныя свядомасці альбо знешнія інфармацыі, нячысты дух і падобнае да гэтага. У такім выпадку ты можаш здзейсніць небяспечныя ўчынкі. Ды яшчэ гэта мае каласальную руйнавальную сілу для колаў удасканальвальнікаў. Гэты стан абумоўлены няправеднымі думкамі чалавека, яго навязлівай ідэяй паказаць сябе, і гэта не «выбліск ды вар'яцтва». Некаторыя людзі, якія невядома як сталі так званымі майстрамі ціґун, таксама кажуць пра «выбліск ды вар'яцтва». У рэчаіснасці практыка не можа прывесці да «выбліску ды вар'яцтва» — большасць людзей даведалася пра гэты тэрмін з мастацкіх твораў кшталту раманаў уся́[156] і да таго падобнага. Калі не верыш, перагартай старажытныя кнігі ды кнігі па ўдасканальванні — там такога няма. Дык і дзе ж «выбліск ды вар'яцтва»? Такога наогул не бывае.

Існуе некалькі формаў, якія людзі звычайна прымаюць за «выбліск ды вар'яцтва». Пра адну з гэтых формаў я ўжо распавёў вышэй. Апантанасць нячыстым духам выклікана няправедным сэрцам чалавека, яго ўпартым імкненнем увайсці ў нейкі «ціґунскі стан», паказваць сябе і падобнымі да гэтага рознымі душэўнымі станамі. Некаторыя адкрыта імкнуцца здабыць звышздольнасці або практыкуюць школу псеўдаціґун. Такія людзі падчас практыкі прызвычаіліся расслабляць сваю галоўную свядомасць настолькі, што нічога ўжо не ведаюць, сваё цела аддаюць іншым, і ў такім выпадку іх цела знаходзіцца пад хаатычным кіраваннем дапаможнае свядомасці або якіх-небудзь знешніх інфармацыяў, у выніку чаго яны здзяйсняюць незвычайныя ўчынкі. Калі такому загадаць скокнуць з даху будынка — ён і саскочыць, загадаць кінуцца ў ваду — ён туды і кінецца. Яму самому і жыць не хочацца, бэньт’і аддаў іншым. Такія паводзіны не адносяцца да «выбліску ды вар'яцтва»,

але азначаюць уступленне на памылковы шлях у практыцы. Фармаванне такіх паводзінаў у пачатковай стадыі мае свядомы характар. Вельмі шмат людзей лічыць, што калі нехта хістаецца, дык гэта і з’яўляецца практыкай. Насамрэч, калі сапраўды будзеш практыкаваць у такім стане, тады гэта прывядзе да вельмі сур'ёзных наступстваў. Гэта ўжо не практыка, а наступствы навязлівых ідэяў ды імкненняў звычайнага чалавека.

Іншая форма падобных з'яў праяўляецца ў тым выпадку, калі падчас практыкі ці, які цыркулюе ў целе, дзесьці захрасае. Альбо ці падняўся да макаўкі ды не можа апусціцца, і чалавек палохаецца. Чалавечае цела ўяўляе сабой малы сусвет, асабліва гэта тычыцца метаду практыкі ў школе Даа, калі прабіццё каналаў у целе можа выклікаць такія праблемы. Калі не атрымліваецца прабіць нейкі канал, тады ці там спіральна кружляе. Гэта можа здарыцца ў любым месцы цела, не толькі ў раёне макаўкі, аднак макаўка — найбольш чуллівая частка цела. Калі ці захрасае ў верхняй частцы галавы ды не можа прабіцца ўніз праз праход, тады чалавек адчувае цяжар, разбуханне галавы, нібыта на галаву надзелі вельмі тоўстую шапку з ці і гэтак далей. Але ці нічым не кіруе, ён не можа прывесці да ўзнікнення ў людзей нейкіх праблем і абсалютна не можа выклікаць якое-небудзь захворванне. Некаторыя людзі не ведаюць праўды пра ціґун. Яны неабачліва публікуюць пра яго свае думкі ў прэсе ў выглядзе сенсацыі, у выніку чаго сеюць вялікую паніку. Людзі так і лічаць, што калі ці падымаецца да макаўкі ды не можа апусціцца, тады ў чалавека адбываецца «выбліск ды вар'яцтва», у яго ўзнікае адхіленне і гэтак далей. У выніку вельмі шмат людзей пачалі гэтага баяцца.

Калі ці падымаецца да макаўкі ды не можа апусціцца, гэта ўсяго толькі часовы стан. У некаторых такі перыяд можа цягнуцца вельмі доўга, нават паўгады. У такой сітуацыі можна звяртацца да сапраўднага майстра ціґун, які дапамог бы накіраваць ці, і тады ён апусціцца. У нашай практыцы, калі ці не можа прарваць закупораны праход, не апускаецца ўніз, тады мы шукаем прычыну ў Сіньсін: «Хіба не ў тым прычына, што занадта доўга затрымаўся на нейкім узроўні? Час хутчэй падвысіць свой Сіньсін!» Калі ты насамрэч падвысіш свой Сіньсін, тады ўбачыш, што ці зможа апусціцца. Ты звяртаеш увагу на змяненне Ґун у сваім целе, але не звяртаеш увагі на змяненне свайго Сіньсін. Змены ж Ґун, аднак, не наступаюць, пакуль ты не падвысіш Сіньсін. Толькі тады адбудуцца глабальныя змены. Калі ў чалавека сапраўдная непраходнасць ці, гэта не можа выклікаць якой-небудзь праблемы. Звычайна праблему стварае нашая ўласная псіхіка ды пачутае ад псеўдаціґуністаў, якія сцвярджаюць, што нібыта затрымка ці ў галаве прывядзе чалавека да адхілення. Тады чалавек і палохаецца. Ён спалохаўся, і ад гэтага сапраўды можа з'явіцца праблема. Як толькі ты спалохаўся, у цябе ўзнік страх. Хіба гэта не навязлівая ідэя? Як толькі ў цябе праявілася навязлівая ідэя, хіба яе не трэба адкінуць? Чым мацней ты баішся, тым больш гэта падобна да хваробы. Неабходна ўстараніць гэтую тваю навязлівую ідэю, каб ты мог атрымаць ад гэтага ўрок, дзякуючы чаму ты перамог бы страх і падвысіўся.

У практыкоўцы ў будучыні не будзе камфорту: у тваім целе з'явіцца шмат Ґун, вельмі моцныя рэчы, якія будуць рухацца ў тваім целе, выклікаць тыя ці іншыя непрыемныя адчуванні. Галоўная прычына такіх непрыемных адчуванняў у тым, што ты ўвесь час баішся на штосьці захварэць. Насамрэч, у тваім целе ўжо з'явіліся настолькі магутныя рэчы: Ґун, здольнасці ды яшчэ шмат жывых істот. Іх рухі выклікаюць у тваім целе сверб, боль, немач і гэтак далей. Вельмі чуллівымі стануць і перыферыйныя нервы. Могуць з'явіцца самыя розныя станы. Калі толькі тваё цела яшчэ не было трансфармаванае рэчывамі высокай энергіі, дык такія адчуванні будуць пастаянна. Насамрэч гэта добра. Як ты будзеш удасканальвацца, калі ўвесь час лічыш сябе звычайным чалавекам, увесь час думаеш, што ты на штосьці хварэеш? Калі ў практыцы надыдзе час выпрабаванняў, а ты ўсё яшчэ лічыш сябе звычайным чалавекам, тады, на маю думку, твой Сіньсін у гэты час упаў да ўзроўню звычайнага чалавека. Прынамсі, у дадзеным пытанні ты ўпаў да ўзроўню звычайнага чалавека.

Мы, як сапраўдныя практыкоўцы, павінны падыходзіць да пытанняў з пункту гледжання вельмі высокага ўзроўню, а не з пункту гледжання простага чалавека. Калі ты думаеш, што хворы, гэта можа сапраўды прывесці да захворвання, бо ледзь ты вырашыш, што захварэў, як твой Сіньсін фактычна ўжо знаходзіцца на ўзроўні звычайнага чалавека. Асабліва для практыкоўцаў ды шчырых удасканальвальнікаў такі стан не можа прывесці да захворвання. Як вам вядома, калі нехта захворвае, тады ў 70-ці адсотках выпадкаў гэта выклікана яго псіхікай і толькі ў 30-ці — хваробай. Звычайна ў чалавека ў першую чаргу не вытрымлівае псіхіка, ён не ў стане знесці цяжкую душэўную нагрузку, з прычыны чаго хвароба прагрэсуе — звычайна гэта так. Прывяду прыклад. Аднаго чалавека прывязалі да ложка і, узяўшы яго за руку, сказалі, што пусцяць яму кроў. Потым завязалі яму вочы, па запясці злёгку правялі чымсьці (але зусім не пускалі яму кроў), тым часам адкрылі кран з вадой, каб ён пачуў гукі падзення кропляў. Вырашыўшы, што гэта капае яго ўласная кроў, чалавек неўзабаве памёр. Насамрэч капала вада з крана, а не кроў, і да смерці яго прывёў псіхалагічны стан. Калі ты ўвесь час будзеш лічыць, што захварэў, дык цалкам магчыма, што сам выклічаш у сябе хваробу. Гэта таму, што твой Сіньсін ужо ўпаў да ўзроўню звычайнага чалавека. А звычайным людзям, вядома, належыць хварэць.

Калі ты, як практыкоўца, увесь час прымаеш такі стан, які праяўляецца, за нейкую хваробу, тады фактычна ты просіш, ты просіш, каб табе далі захварэць, і тады хвароба можа ўлезці ў цябе. Як у практыкоўцы, у цябе павінен быць высокі Сіньсін. Табе не трэба пастаянна баяцца, што гэта хвароба, страх хваробы — гэта таксама навязлівая ідэя, якая можа прынесці табе непрыемнасці. Ва ўдасканальванні трэба зжываць кармы, зжыванне кармаў — справа балючая. (Дзе ты такое бачыў, каб Ґун узрастаў ва ўмовах камфорту!?) Калі было б не так — як бы ты адкінуў свае навязлівыя ідэі? Распавяду вам гісторыю з будызму. Калісьці ў мінулым быў такі чалавек, які пасля велізарных высілкаў дайшоў у практыцы да ўзроўню Аргата. Як жа яму не радавацца, калі ён вось-вось атрымае Паўнапраўнае дасягненне, калі ён удасканаліўся ў

Аргата? Выскачыў з Трох сфер! Калі ён усцешыўся, тады праявілася навязлівая ідэя — радасць. Аргат павінен знаходзіцца ў Нядзеянні, яго нічога не павінна чапляць[157]. Але ён упаў, і ўдасканальванне яго аказалася марным. «Калі ўсё аказалася дарэмным, пачну наноў!» Прыклаўшы гіганцкія намаганні, ён ізноў падняўся. На гэты раз у чалавека з'явіўся страх. Ён сказаў сабе: «Мне нельга радавацца, інакш я зноў упаду». Як толькі ён стаў баяцца, адразу ж ізноў упаў уніз. Страх — гэта таксама навязлівая ідэя.

Яшчэ адна сітуацыя: чалавек становіцца псіхічна хворым, а людзі кажуць, што ў яго «выбліск ды вар'яцтва». Нехта яшчэ чакае, каб я стаў лекаваць яго ад псіхозу! Я сказаў бы, што псіхоз — гэта не хвароба. Ды і няма часу ў мяне, каб клапаціцца пра такія справы. А чаму? Ды таму, што ў такіх хворых няма ані вірусаў, ані паталагічных зменаў у целе, няма ніякіх язваў. На мой погляд, гэта не захворванне. Псіхічная хвароба азначае, што ў чалавека галоўная свядомасць стала занадта слабая. Да якое меры слабая? Гэта падобна да таго, калі гэтая асоба не ў стане сама над сабой запанаваць. У псіхічнахворых галоўная свядомасць менавіта такая. Чалавек не хоча кіраваць гэтым целам, увесь час знаходзіцца ў стане поўнага ачмурэння ды ніяк не можа працвярэзіць. У гэты час дапаможныя свядомасці ды інфармацыі знешняга паходжання ствараюць яму перашкоды. У такім стане і дапаможная свядомасць, і знешнія інфармацыі замінаюць яму. Прастораў ды ўзроўняў настолькі шмат — яму перашкаджаюць самыя разнастайныя інфармацыі. Тым больш, калі ў папярэднім жыцці галоўная свядомасць чалавека магла здзейсніць нейкія дрэнныя справы, апроч таго, ёсць крэдыторы, якія, верагодна, хочуць яго пакрыўдзіць. Трапляецца ўсё, што заўгодна. Вось што, на нашую думку, азначае псіхічнае захворванне. Як мне цябе лекаваць? На маю думку, вось як становяцца сапраўднымі душэўнахворымі. Што ж тады рабіць? Навучыце хворага, каб ён працвярэзіў. Аднак гэтага вельмі цяжка дабіцца. У псіхіятрычнай клініцы можна назіраць такую карціну: убачыўшы ў руцэ доктара электрашокер, пацыент імгненна палохаецца, змаўкае ды не кажа больш ані слова бязглуздзіцы. Чаму? У гэты час яго галоўная свядомасць цверазее. Ён баіцца ўдару токам.

Звычайна, калі чалавек ужо ўвайшоў у браму самаўдасканальвання, тады ён ахвотна практыкуе надалей. Прыроду Буды мае кожны, і кожны мае сэрца да ўдасканальвання ў Даа. Таму для многіх, калі аднойчы яны навучацца практыцы, яна становіцца спадарожнікам усяго іх жыцця. Незалежна ад таго, ці можа ён удасканаліцца, ці засвоіў ён Закон, яго сэрца ўсё адно імкнецца да Даа, ён увесь час хоча практыкаваць. Усе навакольнікі ведаюць, што ён робіць практыкаванні ціґун: на працы ведаюць, на вуліцы ведаюць, суседзі ведаюць, што ён займаецца практыкай. Але памяркуйце: сапраўднае ўдасканальванне... хто ім займаўся ў папярэднія гады? Ніхто. Толькі сапраўднае ўдасканальванне можа змяніць жыццёвы шлях чалавека. А ён звычайны чалавек, які ўсяго толькі выконвае практыкаванні ціґун на ўзроўні лекавання ды аздараўлення. Хто стане змяняць яго жыццёвы шлях? Гэта ж звычайны чалавек. У нейкі дзень ён захварэе, у нейкі дзень сутыкнецца з непрыемнасцю, у нейкі дзень, магчыма,

стане душэўнахворым альбо наогул памрэ. Жыццёвы шлях звычайнага чалавека менавіта такі. Ты бачыш, як чалавек займаецца ў парку, а насамрэч ён не сапраўдны практыкоўца, яму хочацца дасягнуць высокіх узроўняў ва ўдасканальванні, але ён не атрымаў сапраўднага Закону, таму не зможа ўдасканаліцца. У яго толькі ёсць жаданне ўдасканальвацца на высокія ўзроўні, але пакуль ён застаецца практыкоўцам на нізкім узроўні ацалення ды аздараўлення. Ніхто не змяняў яго жыццёвы шлях, таму яму даводзіцца хварэць. Калі чалавек не надае ўвагі маральнасці, тады ад хваробы ён не вылекуецца. Няма такога, што калі нехта практыкуе ціґун, дык ён ніколі не захварэе.

Трэба шчыра ўдасканальвацца, звяртаючы вялікую ўвагу на Сіньсін, і толькі тады можна пазбавіцца ад захворванняў. З прычыны таго, што практыка — гэта не гімнастыка, а нешта, што перавышае рэчы звычайных людзей, значыць, патрабаванні да практыкоўцаў зыходзяць з больш высокіх прынцыпаў ды крытэраў. Чалавек мусіць іх выканаць — толькі тады ён дасягне мэты. Але шмат хто гэтага не выконвае і ўсё яшчэ застаецца звычайным чалавекам. Таму, калі надыдзе час, ён усё адно захварэе. Аднойчы ў чалавека раптам здарыўся інсульт, ён захварэў на тое ці іншае захворванне, або захварэў на псіхоз. Усе ж ведаюць, што ён робіць практыкаванні ціґун. Калі аднойчы гэты чалавек звар'яцеў, людзі пачалі казаць, што праз практыкаванні ціґун у яго здарыўся «выбліск ды вар'яцтва». Навешалі цэтлік. Падумайце, хіба гэта справядліва? Дылетанты не разумеюць. Нам, знаўцам, і многім практыкоўцам таксама цяжка даведацца, у чым сапраўдная прычына гэтага. Калі гэты чалавек звар’яцеў дома, дык гэта яшчэ троху лепш, але і тады людзі могуць сказаць, што чалавек захварэў праз практыкаванні ціґун. А калі ён захварэў на псіхоз на пляцоўцы для заняткаў, тады бяда: навесяць цэтлік так, што ўжо не аддзярэш. «Практыкаванні ціґун прывялі да “выбліску ды вар'яцтва” — нават публікацыя выйдзе ў прэсе. Некаторыя людзі слепа выступаюць супраць ціґун: «Бачыце, толькі што гэты чалавек цудоўна займаўся, і раптам такое...» Што лёсам наканавана звычайнаму чалавеку, тое і спраўдзіцца ў жыцці. Магчыма, ён будзе пакутаваць і ад іншых хваробаў або непрыемнасцяў. Хіба справядліва ва ўсім гэтым вінаваціць практыку? Гэта дакладна як з дактарамі лякарняў: калі чалавек стаў лекарам, значыць, усё жыццё не павінен больш занядужваць — хіба можна так разумець?

Таму скажу, што многія людзі не ведаюць праўды пра ціґун, не ведаюць яго прынцыпаў ды паспешліва выказваюцца. Ледзьве ўзнікне нейкая праблема, дык адразу на ціґун навешваюць усялякія цэтлікі. Ціґун стаў папулярным у грамадстве зусім не так даўно. Многія прытрымліваюцца ўпартых уяўленняў, заўжды адпрэчваюць ціґун, наводзяць на яго паклёп і не прымаюць яго. Незразумела, што за псіхалогія іх да гэтага падахвочвае. Ціґун ім проста-такі агідны, нібыта ён неяк умешваецца ў іх жыццё. Варта камусьці завесці гаворку пра ціґун, дык яны кажуць, што ён ідэалістычны. Ціґун з'яўляецца навукай, навукай больш высокага парадку. Прычына толькі ў тым, што ў такое катэгорыі людзей занадта ўпартыя ўяўленні ды занадта абмежаваныя веды.

Яшчэ ёсць адна сітуацыя, якая ў колах удасканальвальнікаў называецца «ціґунскім станам». Розум у такіх людзей затуманены. Але гэта не «выбліск ды вар'яцтва». Такія людзі ў надзвычай добрым розуме. Перадусім я растлумачу, што ўяўляе сабой «ціґунскі стан». Як вы ведаеце, мы, практыкоўцы, звяртаем асаблівую ўвагу на маральную аснову. Ва ўсіх краінах свету існуюць вернікі. У Кітаі цягам некалькіх тысяч гадоў існавалі тыя, хто вызнаваў будызм, даасізм. Яны вераць, што «за дабро вернецца дабром», а «за зло будзе пакаранне». Аднак ёсць і тыя, хто ў гэта не верыць. Асабліва падчас «Вялікае культурнае рэвалюцыі» гэта асуджалася, лічылася забабонамі. Існуюць і тыя, якія за забабоны прымаюць усё без выключэння, што недаступна іх разуменню, не апісана ў кнігах, альбо яшчэ не даказана сучаснай навукай, альбо яшчэ не пазнана людзьмі. У ранейшыя гады такіх людзей было вельмі шмат, сёння стала параўнальна менш, бо некаторыя з'явы, хоць ты іх і не прызнаеш, ужо рэальна праяўляюцца ў нашай прасторы. Ты не смееш глядзець ім у вочы, аднак цяпер людзі ўжо смела кажуць пра гэта. Пачутае на ўласныя вушы ды ўбачанае на ўласныя вочы дапамагло людзям нешта даведацца пра практыку.

Некаторыя настолькі ўпартыя, што пры адной згадцы пра ціґун адразу ад душы высмейваюць цябе. Яны лічаць, што ты прапагандуеш забабоны, што гэта неймаверна смешна. Калі ты пачынаеш казаць пра некаторыя ціґунскія з'явы, яны лічаць, што ты неверагодна цёмны чалавек. І хоць такія людзі вельмі ўпартыя, аднак зусім не абавязкова, што ў іх дрэнная маральная аснова. Калі чалавек з добрай маральнай асновай пачне практыкаваць, тады яго нябеснае вока, магчыма, адкрыецца на вельмі высокім узроўні, ды яшчэ ў яго могуць з'явіцца здольнасці. Такі чалавек не верыць у ціґун, але не застрахаваны ад хваробаў. Калі ён захварэе — пойдзе ў лякарню. Калі заходняя медыцына яго не вылекуе, прыйдзецца тады звярнуцца да кітайскае. Калі ані кітайская медыцына, ані народныя сродкі таксама не дапамогуць, тады ён згадае пра ціґун. Ён падумае: «Ану, выпрабую лёс, пагляджу, ці зможа ціґун вылекаваць мяне». Вельмі неахвотна ён прыйшоў. З прычыны таго, што ён мае добрую маральную аснову, як толькі ён пачне займацца, у яго адразу ж усё цудоўна атрымаецца. Магчыма, ён спадабаецца нейкаму настаўніку, і гэтая вышэйшая істота, якая знаходзіцца ў іншай прасторы, яму дапаможа. І вось у яго адкрыецца нябеснае вока, альбо ён дасягне стану напаўадкрытага ўсведамлення. З дапамогай нябеснага вока, якое адкрылася на вельмі высокім узроўні, ён адразу ўбачыць некаторыя ісціны Сусвету. У яго яшчэ з'явяцца і здольнасці. Вось і скажы, калі такога кшталту чалавек гэта ўбачыць, ці вытрывае яго мозг гэта? Якім будзе яго душэўны стан? Тое, што раней ён заўсёды прымаў за забабоны, лічыў абсалютна немагчымым, з чаго смяяўся, калі іншыя згадвалі гэта, насамрэч узнікла перад ім ва ўсёй сваёй рэальнай адчувальнасці. Яго мозг не вытрывае — занадта ўжо празмерны ціск на псіхіку адчувае чалавек. Ён кажа такія рэчы, якія іншыя не могуць успрыняць[158]. З логікай у яго ўсё выдатна — проста ён не можа наладзіць сувязі паміж двума бакамі. Ён выявіў, што тое, як робіць чалавецтва, з'яўляецца хібным, а тое, як робяць на тым баку, часта з'яўляецца правільным. Калі ж гэты чалавек робіць у адпаведнасці з тым, як робяць на тым баку, тады людзі кажуць, што ён

памыляецца. Людзі яго не разумеюць, таму кажуць, што ў яго праз заняткі ціґун здарыўся «выбліск ды вар'яцтва».

Насамрэч у гэтага чалавека не «выбліск ды вар'яцтва». У большасці з нас у практыцы наогул не ўзнікае гэтае з'явы. Гэты «ціґунскі стан» з'яўляецца выключна ў надзвычай упартых людзей. У многіх з прысутных тут адкрыта нябеснае вока, і такіх вельмі шмат. Яны сапраўды ўбачылі іншыя прасторы, але не здзіўляюцца ды пачуваюцца вельмі добра, іх мозг не адчувае напружання, і ў іх не з'явіцца такі «ціґунскі стан». Чалавек у «ціґунскім стане» паводзіцца вельмі разумна, яго словы вельмі філасофскія ды поўныя цудоўнае логікі. Толькі звычайныя людзі не даюць веры яго словам. Гэты чалавек кажа, што бачыў нейкага памерлага, які сказаў яму нешта зрабіць. Але хто ж са звычайных людзей яму паверыць? Потым ён зразумеў: аказваецца, такія рэчы трэба трымаць у сабе, іх нельга выказваць. Пасля таго як ён наладзіў узаемасувязь паміж двума бакамі, усё нармалізавалася. Такія людзі звычайна маюць звышздольнасці. Гэта таксама не «выбліск ды вар'яцтва».

Яшчэ існуе з'ява, якая называецца «сапраўдным вар'яцтвам», і такія выпадкі надзвычай рэдкія. Тое, што мы называем «сапраўдным вар'яцтвам», не азначае, што сапраўды з'язджаюць з ґлузду, а маецца на ўвазе ўдасканальванне ў Ісціне. Што азначае «сапраўднае вар'яцтва»? Я скажу, што са ста тысяч удасканальвальнікаў магчымы толькі адзін такі выпадак. Гэта сустракаецца надзвычай рэдка. Таму гэтая з'ява малавядомая ды не мае ніякага ўплыву на грамадства.

«Сапраўднае вар'яцтва» звычайна мае папярэднюю ўмову, а менавіта: у гэтага чалавека мусіць быць вельмі добрая маральная аснова, прычым чалавек мусіць быць ужо вельмі старым. Пажылы чалавек ужо не паспее завяршыць самаўдасканальванне. Чалавек з вельмі добрай маральнай асновай звычайна прыходзіць з місіяй з высокага ўзроўню. Усе баяцца прыходзіць у чалавечае грамадства, бо са сцёртай памяццю нікога не пазна́еш. Калі нехта прыходзіць у гэтае асяроддзе грамадства, людзі ствараюць яму перашкоды. Гэта прыводзіць да таго, што ён пачынае лічыць важнымі славу ды грошы і ўрэшце падае ўніз, асуджвае сябе на тое, што дзень яго вызвалення ўжо ніколі не настане. З-за гэтага ніхто не смее з'явіцца на Зямлю, усе гэтага баяцца. Ёсць такі чалавек, які ўсё ж такі сюды прыйшоў. Прыйшоўшы, ён сярод звычайных людзей сапраўды стаў благім і насамрэч вось-вось упадзе ўніз. Цягам усяго свайго жыцця ён нарабіў нямала благіх учынкаў. Калі чалавек жыве і змагаецца дзеля асабістых інтарэсаў, ён можа здзейсніць шмат дрэнных спраў ды завінаваціць іншым вельмі шмат. Яго настаўнік убачыў, што ён вось-вось упадзе. Але ж ён быў з тых, хто мае Ранг дасягнення. Нельга ж дазволіць яму проста так упасці! Што ж рабіць? Настаўнік вельмі непакоіцца: няма такога спосабу, які дазволіў бы яму ўдасканаліцца. Дзе яму знайсці настаўніка ў такі час? Яму ж трэба зноў вяртацца назад, удасканальвацца назад. Але ж гэта толькі сказаць лёгка, ці не

так? Апроч таго, чалавек ужо стары. Калі ён нават і пачне ўдасканальвацца, дык не паспее. Дзе яму знайсці метад удасканальвання і Сіньсін, і даўгалецця?

Толькі ў такой надзвычай асаблівай сітуацыі для чалавека, які мае абавязкова вельмі добрую маральную аснову, можна выкарыстаць такі спосаб — выклікаць у яго вар’яцтва. У выпадку, калі ўжо няма аніякае надзеі на тое, каб чалавек сам вярнуўся назад, магчыма выкарыстанне такога спосабу — прымушаюць яго знаходзіцца ў стане вар'яцтва, заблакаваўшы пэўны ўчастак яго галаўнога мозга. Напрыклад, мы, людзі, баімся холаду, баімся бруду. Але калі заблакаваць частку мозга, якая адказвае за органы пачуццяў на такія раздражненні, дык пасля таго, як заблакуюць гэтыя часткі, у чалавека ўзнікае праблема з псіхікай, ён сапраўды становіцца ненармальным. Але звычайна такі чалавек не здзяйсняе дрэнных спраў, не лаецца і не б’е іншых, часцяком, нават, здзяйсняе добрыя справы. Аднак ён вельмі жорсткі да сябе. Паколькі гэты чалавек не ведае холаду, дык узімку ён, лёгка апрануты, басаНож бегае па снезе, ногі яго крываточаць. З прычыны таго, што ён не ведае бруду, дык нават смее есці кал ды піць мачу. Я ведаў такога чалавека. Конскі памёт, калі замерзне, становіцца вельмі цвёрдым. А таму чалавеку, калі ён яго грыз, было нават вельмі смачна. Той, хто знаходзіцца ў стане «сапраўднага вар'яцтва», можа вытрымаць такія мукі, якія для звычайных людзей з нармальнай псіхікай былі б нясцерпнымі. Падумайце толькі, колькі пакутаў яму прыйдзецца зведаць, калі ён звар'яцее. Вядома, часцяком такія людзі маюць звышздольнасці. Як правіла, большасць такіх людзей — пажылыя жанчыны. У мінулым была старая, якая, хоць і мела забінтаваныя маленькія ступні, але з разгону, выканаўшы сальта, пераскоквала праз сцяну вышынёй у два метры. Сваякі, убачыўшы, што яна з’ехала з ґлузду ды ўвесь час выбягае на вуліцу, замкнулі яе ў хаце. Аднак як толькі ўсе сышлі, яна ўказала пальцам на замок, адчыніла яго, што дазволіла ёй апынуцца на вуліцы. «Давайце тады прыкуем яе ланцугом». Калі ж яны пайшлі з хаты, жанчына страсянула з сябе гэты ланцуг. Няма на тое рады. І яна такім чынам можа вытрымаць шмат пакутаў. Раз яна зведвае неверагодна жахлівыя пакуты, і гэта адбываецца вельмі хуткаплынна, дык хутка расплаціцца за свае грахі. Найбольшы тэрмін «сапраўднага вар'яцтва» не перавышае трох гадоў. Звычайна яно мінае цягам году-двух. Перажытыя ёй пакуты каласальныя. Пасля ўсяго гэтага да тае жанчыны адразу вяртаецца розум. Такім чынам лічыцца, што гэта яна ўжо скончыла сваё ўдасканальванне, і ў яе адразу адкрываецца Ґун ды праяўляецца ўсялякая цудатворная сіла. Гэта надзвычай рэдкая, надзвычай рэдкая з'ява. Такое траплялася ў гісторыі. Гэта не тое, што табе могуць дазволіць зрабіць, калі ў цябе звычайная маральная аснова. Як вам вядома, існавалі будыйскія манахі-вар’яты ды звар'яцелыя даосы. У гісторыі такое сапраўды было, пра гэта існуюць запісы: «Звар’яцелы манах мяце венікам на Ціня», даос-вар’ят. Такіх класічных сюжэтаў вельмі шмат.

Мы сцвярджаем, што «выбліску ды вар'яцтва» дакладна не існуе. Скажам, хтосьці можа выклiка́ць выбліск агню. Калі ён сапраўды на такое здольны, дык я сказаў бы, што гэты чалавек асаблівы. Адкрываючы рот, ён можа вывяргаць агонь, працягваючы руку — выпускаць полымя. Запальваючы цыгарэту, ён

выпроствае палец, і з'яўляецца агонь. Я сказаў бы, што гэта экстрасэнсорная здольнасць!

### ПРАКТЫКА ПРЫВАБЛІВАЕ ДЭМАНАЎ

Што такое «практыка прываблівае дэманаў»? Гэта значыць, што, займаючыся практыкай, мы можам сустрэцца з нейкімі перашкодамі. Якім чынам практыка можа прывабіць дэманаў? Чалавек хоча ўдасканальвацца, а гэта надзвычай цяжка, у сапраўдным удасканальванні без заступніцтва маіх Целаў Закону самому табе не ўдасканаліцца: варта табе выйсці за дзверы, як, магчыма, сутыкнешся з небяспекай для жыцця. Душа чалавека несмяротная, значыць, дзейнічаючы ў грамадстве да гэтага жыцця, ты, магчыма, завінаваціў камунебудзь, крыўдзіў каго-небудзь альбо здзейсніў нейкія дрэнныя справы. І тады крэдытор будзе цябе шукаць. У будызме кажуць: «Чалавечае жыццё — гэта пачарговая кармічная адплата». Калі ты камусьці завінаваціў, дык ён будзе цябе шукаць для спагнання доўгу. Калі ён возьме з цябе больш, чым трэба, тады ў наступны раз ён павінен будзе табе вярнуць. Сын не паважае бацькоў, тады ў наступны раз яны памяняюцца месцамі, вось так усё ідзе па коле. Аднак мы сапраўды бачым, што дэманы, якія ствараюць перашкоды, не даюць табе практыкаваць. Усё гэта мае наканаваную сувязь, мае тую ці іншую прычыну. Калі б усё гэта існавала без пэўнае прычыны, тады ніхто б гэтага не дазволіў.

Самая распаўсюджаная форма ўмяшальніцтва дэманаў падчас практыкі праяўляецца так: калі ты не практыкуеш, тады наваколле больш-менш ціхае. Раз ты ўжо навучыўся практыцы, значыць, хочаш часцей займацца. Але як толькі ты садзішся ў паставу медытацыі, адразу пачынаецца вэрхал: машыны гудуць, потым у калідоры чуюцца крокі, галасы, грукаюць дзверы, на вуліцы яшчэ ўключылі радыё — у адно імгненне стала шумна. Калі ты не займаешся практыкай, умовы наадварот цудоўныя. Варта табе заняцца практыкай, яны становяцца вось гэткімі. Многія з нас глыбока не задумваліся, у чым тут справа. Толькі здзіўляліся, вельмі засмучаліся, бо заняткі даводзілася спыняць. Адно «здзіўленне» цябе ўжо спыніла, а гэта ж якраз дэманы табе перашкаджаюць, яны падбухторылі іншых да гэтага. Гэта найпрасцейшая форма перашкодаў, разлічаная на тое, каб не даць табе займацца. «Практыкуючы, ты спасцігаеш Даа, а рэчы, якія завінаваціў, ты вярнуў?» Дэманы не могуць гэтага праігнараваць, яны імкнуцца перашкаджаць, не даюць табе практыкаваць. Аднак гэта толькі адлюстраванне аднаго ўзроўню. Пройдзе час, і такой з'яве больш не дазволяць існаваць. Інакш кажучы, калі ты вярнуў даўгі, дэманам ужо больш не дазваляюць табе перашкаджаць. З прычыны таго, што ўдасканальванне па нашым Фалунь Дафа ідзе параўнальна хутка, прарыванне ўзроўняў адбываецца таксама даволі хутка.

Ёсць іншая форма перашкодаў ад дэманаў. Як вам вядома, практыка можа адкрыць нябеснае вока. Некаторыя пасля яго адкрыцця, практыкуючы дома,

могуць убачыць страшныя відовішчы альбо жахлівыя фізіяноміі. Нехта з ускудлачанымі валасамі захоча змагацца з табой, робячы пагрозлівыя жэсты. Гэта вельмі жудасна. Часам бывае такое, што варта табе толькі пачаць практыку, дык за акном караскаюцца гэткія стварэнні, вельмі страшныя. Чаму з'яўляецца такая сітуацыя? Усё гэта формы перашкодаў ад дэманаў. Аднак у школе нашага Фалунь Дафа такія выпадкі сустракаюцца вельмі рэдка, скажам, прыкладна ў аднаго адсотка практыкоўцаў, большасць з вас з гэтым не сутыкнецца. З прычыны таго, што такая з'ява для нашае практыкі не прыносіць аніякае карысці, не дазваляюць ім перашкаджаць табе ў такой форме. Але з'ява такога ўмяшальніцтва распаўсюджана ў практыцы звычайных школ і цягнецца вельмі доўга. Страшэнна спалохаўшыся, некаторыя спыняюць практыку. Для вячэрняе практыкі людзі абіраюць ціхае асяроддзе. І раптам яны бачаць, што перад імі нехта стаіць — нібыта чалавек і не чалавек, нібыта чорт і не чорт. Спалохаўшыся, яны больш не адважваюцца практыкаваць. У нашым Фалунь Дафа такое з'явы звычайна няма. Але ў вельмі рэдкіх выпадках гэта ўсё ж сустракаецца. У некаторых людзей сітуацыя надзвычай асаблівая.

Ёсць і такія метады практыкі, у якіх удасканальваюцца і ўнутрана, і знешне, значыць, адначасова практыкуюць баявыя мастацтвы ды ўнутранае ўдасканальванне. Такія метады практыкі даволі часта сустракаюцца ў школе Даа. Людзі, якія займаюцца па такіх метадах практыкі, часта сустракаюцца з падобнымі дэманамі. У звычайных метадах практыкі такая з'ява не сустракаецца, а можа быць толькі ў метадах практыкі, у якіх людзі ўдасканальваюцца ўнутрана-знешне, займаюцца баявымі мастацтвамі, нехта прыходзіць да яго памерацца сіламі ў баявых мастацтвах. На свеце існуе мноства людзей, якія ўдасканальваюцца па вучэнні Даа, ёсць нямала людзей, якія займаюцца баявымі мастацтвамі, унутрана-знешнім аб'яднаным удасканальваннем. У тых, хто займаецца баявымі мастацтвамі, таксама расце Ґун. А чаму? Таму, што яны зжылі прагу да славы, выгады ды іншага — у іх таксама ўзрастае Ґун. Але схільнасць да боек у іх зжываецца вельмі марудна, таму з імі часта адбываюцца такія выпадкі, якія пастаянна паўтараюцца на пэўным узроўні. Седзячы ў медытацыі ў туманным стане, чалавек ведае, што нехта таксама займаецца практыкай. Тады яго душа, пакінуўшы цела, ідзе на пошук таго чалавека, каб з ім змагацца ды вырашыць, у каго ґунфу вышэй, і вось завязваецца бойка. У іншых прасторах можа таксама з'явіцца падобная карціна, прыйдзе нехта на змаганне з іншае прасторы і паб'ецца з ім. Калі ён адмовіцца, тады яго сапраўды заб'юць. Вось яны і б'юцца паміж сабой — б'юцца ды б'юцца. Штораз, ледзь засне чалавек, абавязкова хто-небудзь прыходзіць да яго памерацца сіламі ў валоданні баявымі мастацтвамі, пабіцца. Гэта прыводзіць да таго, што ў яго ўсю ноч няма адпачынку. Насамрэч, усё гэта арганізавана для таго, каб зжыць у ім прагу да боек. Калі ён не зжыве ў сабе гэтае прывязанасці, тады такія сцэны будуць паўтарацца ўвесь час. Чалавек не можа выйсці з гэтага ўзроўню, нават калі гэта цягнецца некалькі гадоў. Гэта ў сваю чаргу прывядзе да таго, што ён не зможа далей практыкаваць. Яго матэрыяльнае цела не зможа вытрымаць — надта ўжо вялікі будзе выдатак энергіі. Чалавек можа зламацца. Калі своечасова не выйсці з гэтага стану, тады

чалавек можа сапсавацца. Таму ў метадах практыкі ўнутрана-знешняга аб’яднанага ўдасканальвання сутыкаюцца з такой сітуацыяй. Ды яшчэ яна надзвычай распаўсюджаная. У нашым метадзе ўнутранага самаўдасканальвання такога стану не бывае — не дазваляюць, каб ён узнікаў. Вышэйзгаданыя формы перашкодаў з’яўляюцца даволі распаўсюджанымі.

Яшчэ існуе форма перашкоды д'ябла, якую сустракае кожны практыкоўца, у тым ліку і практыкоўцы ў нашай школе, — гэта так званы «д'ябал юру». Вельмі сур'ёзная перашкода. У грамадстве звычайных людзей існуе шлюбнае жыццё, дзякуючы якому чалавецтва спараджае нашчадкаў. Чалавецтва менавіта так і развіваецца: у чалавечым грамадстве існуюць пачуцці, таму падобныя паводзіны для простых людзей з'яўляюцца непахіснай ісцінай. У людзей ёсць пачуцці: і гнеў, і радасць, і любоў, і нянавісць — гэта пачуцці; чымсьці любіш займацца — гэта пачуццё; чымсьці не любіш займацца — таксама пачуццё; нехта на твой погляд добры, а хтосьці не — усё гэта з'яўляецца пачуццямі. Звычайныя людзі жывуць менавіта дзеля гэтых пачуццяў. Аднак практыкоўцу, як чалавеку надзвычайнаму, нельга ацэньваць па гэтым прынцыпе, трэба перавысіць гэтую рэч. Да шмат якіх навязлівых ідэяў, спароджаных з пачуццяў, нам трэба ставіцца абыякава ды ўрэшце цалкам вызваліцца ад іх. Сексуальнае жаданне ды юр прыналежаць да людскіх навязлівых ідэяў. Усё гэта трэба адкінуць.

Нашая школа, тая яе частка, якая прыналежыць да ўдасканальвання сярод звычайных людзей, не кажа табе стаць манахам або манашкай, маладым яшчэ трэба арганізоўваць сем'і. Тады як трэба ставіцца да гэтага пытання? Я казаў, што нашая школа непасрэдна ўказвае на думкі чалавека, а не прыводзіць да таго, каб ты сапраўды нешта страціў у матэрыяльным плане. Акурат наадварот, менавіта ў матэрыяльных інтарэсах грамадства звычайных людзей загартоўваецца твой Сіньсін, па-сапраўднаму падвышаецца менавіта твой Сіньсін. Калі твой розум зможа вызваліцца ад гэтага, тады ўсё зможаш адкінуць, і калі сказаць табе адкінуць матэрыяльныя інтарэсы, дык ты, вядома, зможаш гэта зрабіць. Калі твой розум не зможа ад гэтага вызваліцца, дык ты ні ад чаго не зможаш вызваліцца. Такім чынам сапраўдная мэта самаўдасканальвання — выпраўляць свае думкі. Падчас удасканальвання ў манастырах цябе змушаюць ад гэтага пазбавіцца, і гэта таксама для таго, каб дазволіць табе вызваліцца ад гэтых думак. Яны цябе прымушаюць. Цябе прымушаюць парваць з гэтым абсалютна, каб ты пра гэта не думаў. Гэта іх спосаб. А мы патрабуем ісці не такім шляхам, нашае патрабаванне палягае ў тым, каб ты знайшоў выйсце, як ставіцца да гэтага абыякава, менавіта калі перад табой матэрыяльныя інтарэсы. Таму ўдасканальванне ў нашай школе самае грунтоўнае. Гэта не тое, што мы хочам зрабіць з вас манахаў ды манашак. Мы ўдасканальваемся сярод звычайных людзей. І ў будучыні наш метад практыкі будзе станавіцца ўсё больш папулярным, а калі кожны практыкоўца Фалунь Дафа будзе напаўманахам, тады гэта будзе блага. Нашае патрабаванне такое: ты практыкуеш, а твая жонка, магчыма, не, і нельга, каб практыка прывяла да разводу. Я кажу, што мы абыякава ставімся да пытанняў эратычных, не

надавайце гэтаму боку жыцця завялікага значэння, як гэта робяць звычайныя людзі. Асабліва цяпер, калі ў грамадстве распаўсюджваецца так званае «сексуальнае вызваленне»[159], калі эратычныя матэрыялы разбэшчваюць людзей. Некаторыя надаюць гэтаму вялікую ўвагу, а мы, як практыкоўцы, павінны ставіцца да гэтага абыякава.

На высокіх узроўнях кажуць, што звычайныя людзі ў грамадстве проста-такі месяць гліну, месяць гліну без агіды ад таго, што гэта брудна, гуляюцца, месячы на зямлі гліну! Мы кажам: нельга дапусціць, каб праз гэта ў сям'і сталася нязгода, таму на цяперашняй стадыі стаўся да гэтага абыякава, захоўвай нармальнае суладнае шлюбнае жыццё, і годзе. У будучыні, калі ты дасягнеш пэўнага ўзроўню, у цябе будзе стан, які адпавядае таму ўзроўню, а зараз ён такі. Мы патрабуем ад цябе рабіць так, і гэтага ўжо дастаткова. Вядома, нельга знаходзіцца ў такім стане, у якім знаходзіцца цяперашняе грамадства. Гэта ж проста жах!

Тут ёсць яшчэ адно пытанне. Як вам вядома, цела тых, хто займаецца практыкай, мае энергію. Пасля гэтых курсаў 80-90 адсоткаў нашых вучняў не толькі выздаравеюць, але і атрымаюць Ґун. Тваё цела ўжо мае вельмі моцную энергію. На дадзенай стадыі Ґун, які ты маеш, непрапарцыйны адносна Сіньсін. Часова твой Ґун вышэй, табе яго ўраз паднялі, і зараз падвышаем твой Сіньсін. Паступова ты дагоніш, гарантую, што гэта адбудзецца ў бліжэйшыя дні, таму мы зрабілі гэта заўчасна. Адным словам, ты маеш пэўную энергію. Энергія, якая выпрацоўваецца самаўдасканальваннем па праведным метадзе, з'яўляецца чыстай ды міласэрнай, таму вы сядзіце тут і адчуваеце, што вакол вас добрае і міласэрнае поле. Я так удасканальваўся, і я гэта маю. Усе тыя, хто сядзіць тут, адчуваюць вялікае суладдзе, вы вольныя ад дрэнных думак, нават не згадваеце пра тое, каб закурыць. У будучыні, калі ты будзеш чыніць згодна з патрабаваннямі нашага Дафа, тады выпрацаваны самаўдасканальваннем Ґун будзе такім жа. Па меры бесперапыннага падвышэння сілы Ґун энергія выпраменьвання Ґун, якую нясе тваё цела, таксама будзе станавіцца даволі магутнай. Нават калі яна яшчэ не такая магутная, ты таксама зможаш уплываць на звычайных людзей, якія знаходзяцца ў сферы твайго поля… альбо, калі ты сядзіш дома, магчыма, твае сваякі зведаюць твой уплыў. Чаму? Табе нават не трэба пра гэта знарок думаць. Раз нашае поле з'яўляецца полем чыстым і добрым, полем міласэрным, полем праведных думак, значыць, навакольнікі не схільныя думаць пра благое, не схільныя рабіць дрэнныя рэчы. Вось якую ролю яно адыгрывае.

Аднойчы я сказаў: «Калі ззянне Буды асвятляе ўсё, тады і прыстойнасць, і сумленнасць, і поўная яснота». Інакш кажучы, энергія, якую рассейвае нашае цела, можа выправіць усе няправільныя станы. Такім чынам, калі ты не думаеш пра гэтыя справы, тады ўздзеяннем гэтага поля непрыкметна стрымліваеш сваю палову. Калі ў цябе не прамільгнула такіх думак, і ў цябе іх не ўзнікае, тады твая палова таксама не згадае пра гэта. Але гэта не абсалютна. Зараз

такое асяроддзе — уключыш тэлевізар, а там ёсць усё, што заўгодна, што можа распаліць у чалавека жаданне. Але ў звычайнай сітуацыі ты можаш адыгрываць ролю стрымлівання. У будучыні, калі ты ва ўдасканальванні дасягнеш высокага ўзроўню, табе і без маіх парадаў будзе вядома, як трэба рабіць. У той час у цябе будзе іншы стан, і захаваецца суладнае жыццё. Таму не лічы гэтыя рэчы вельмі важнымі, інакш гэта таксама будзе свайго роду навязлівай ідэяй. Паміж мужам і жонкай не існуе эратычнае цягі, а проста жаданне. Да такога пытання стаўся абыякава, захоўвай душэўную раўнавагу, і досыць.

Якія эратычныя дэманы могуць сустрэцца? Калі ў цябе слабая сіла сузірання, тады яны з'явяцца ў сне, з'явяцца імгненна, знянацку, калі ты спіш або сядзіш у медытацыі: перад мужчынам узнікне прыгажуня, а перад жанчынай — такога тыпу мужчына, якога яна ў сэрцы кахае. Але яны будуць абсалютна голыя. Як толькі ў цябе прамільгне думка, тады, магчыма, у цябе адбудзецца семявывяржэнне, і гэта ператворыцца ў рэальнасць. Падумайце як след: у нашай практыцы ці жыццёвае сутнасці ды крыві выкарыстоўваецца для ўдасканальвання даўгалецця чалавека. Табе нельга ўвесь час так вывяргацца. Ты не прайшоў перашкоды сексуальнага жадання, хіба гэта гадзіцца? Таму, і пра гэта я вас папярэджваю, з гэтым сустрэнецца кожны з вас, гарантую, што сустрэнецца. Падчас выкладання Закону я выпраменьваю вельмі магутную энергію на твой мозг. Пакінуўшы гэтую залу, ты, магчыма, не згадаеш усяго, што канкрэтна я сказаў. Аднак, калі сапраўды сустрэнеш праблему, згадаеш мае словы. Толькі б ты лічыў сябе практыкоўцам, і тады ў той момант ты зможаш згадаць, а значыць, зможаш сябе ўтаймаваць. Тады гэтае выпрабаванне ты зможаш прайсці. Калі ты не прайшоў першае выпрабаванне, дык другое выпрабаванне будзе вытрымаць вельмі цяжка. Але бывае і такое, калі ў першы раз не прайшоў, і пасля таго, як прачнуўся, страшэнна засмучаешся. Твой такі душэўны стан, магчыма, паглыбіць уражанне ў тваім мысленні, і наступным разам ты зможаш трымаць сябе ў руках, зможаш прайсці. Тым, хто не прайшоў выпрабаванне ды яшчэ ў дадатак не надаў гэтаму аніякага значэння, надалей будзе яшчэ цяжэй вытрымаць гэтае выпрабаванне. Гарантую, што так будзе.

Форма такое перашкоды бывае ад дэманаў, а бывае і ад Настаўніка, які выпрабоўвае цябе, калі ператварае рэч, указаўшы на яе пальцам. Існуюць абедзве формы. Але такое мусіць прайсці кожны. Гэта будзе тваё першае выпрабаванне на шляху самаўдасканальвання, якое мы пачынаем з узроўню звычайных людзей, і першы крок — такое выпрабаванне. І з гэтым сутыкаецца кожны. Вось вам, дарэчы, такі прыклад. Калі я праводзіў курсы ў горадзе Ухань, быў такі ўдзельнік — хлопец гадоў трыццаці. Вярнуўшыся пасля маёй лекцыі дамоў, ён сеў медытаваць і адразу ж увайшоў у медытацыю. І тут убачыў, як з аднаго боку з'явіўся Буда Амітабга, а з іншага боку — Лаа-цзы. Усё гэта вучань сам распавёў падчас абмену дасягнутым і перажытым. Моўчкі паглядзеўшы на яго, яны гэтак жа моўчкі зніклі. Следам з'явілася Бадгісатва Авалакітэшвара. У руцэ яна несла вазу для кветак, з якое ішоў струменьчык белае дымкі. Усё ясна бачна, і ад гэтага хлопец радуецца. Раптам дымка ператварылася ў некалькіх

прыгажуняў. Тыя прыгажуні былі лятучымі паннамі-апсарамі[160]. Якія ж яны пекныя! Яны танчылі для яго, іх рухі былі надзвычай прыгожымі! «Я тут практыкую, а Бадгісатва Авалакітэшвара мяне заахвочвае, — прамільгнула думка ў хлопца, — даслала некалькіх прыгажуняў, каб я палюбаваўся. Для мяне танчаць апсары». Варта толькі было вучню ўсцешыцца, як дзяўчыны імгненна сталі голымі, сталі абдымаць хлопца хто за шыю, хто за талію. Наш вучань падвышаў свой Сіньсін вельмі хутка — хлопец адразу спахапіўся. У галаву, перш за ўсё, прыйшла думка: «Я не просты чалавек, я практыкоўца, вам нельга так абыходзіцца са мной, я ўдасканальваюся па Фалунь Дафа». Як толькі з'явілася гэтая думка — «Шурх!» — у тое ж імгненне ўсё знікла, насамрэч усё гэта была ілюзія. Пасля гэтага зноў з'явіліся Буда Амітабга ды Лаа-цзы. Паказваючы на хлопца, Лаа-цзы з усмешкай сказаў Буду Амітабгу: «Дзіця прыдатнае для навучання!». Гэта азначае, што хлопец прыдатны, яго можна вучыць.

Калі ў гісторыі альбо ў прасторах высокіх узроўняў разглядаюць, ці можа чалавек удасканальвацца, тады глядзяць на жаданне ды эратычную цягу чалавека, гэта вельмі ключавое пытанне. Таму нам сапраўды трэба абыякава ставіцца да гэтых рэчаў. Аднак мы ўдасканальваемся ў асяроддзі звычайных людзей, таму ніхто не патрабуе, каб у гэтым пытанні ты абмежаваў сябе цалкам, прынамсі, на цяперашняй стадыі табе трэба заставацца абыякавым да ўсяго гэтага, і нельга быць у гэтым плане такім, якім ты быў раней. Практыкоўцам трэба рабіць менавіта так. Калі падчас практыкі з'яўляюцца нейкія перашкоды, табе самому трэба шукаць прычыну, падумай, што ў цябе ёсць такога, ад чаго ты яшчэ не вызваліўся.

## УЛАСНЫЯ ІДЭІ СПАРАДЖАЮЦЬ ДЭМАНАЎ

Што такое «спараджэнне дэманаў уласнымі ідэямі»? Чалавечае цела мае матэрыяльныя палі ў розных прасторах. У адным адмысловым полі ўсё, што існуе ў Сусвеце, дакладна, як адлюстраванне, адбіваецца ў тваім прасторавым полі. Хоць гэта толькі адлюстраванне, але яно таксама з'яўляецца матэрыяльным існаваннем. Тое, што знаходзіцца ў тваім прасторавым полі, скараецца кіраванню твайго галаўнога мозга ды свядомасці. Інакш кажучы, калі ты глядзіш нябесным вокам, знаходзячыся ў поўным спакоі без аніводнае думкі, тады гэта з'яўляецца сапраўдным. Але варта толькі прамільгнуць у галаве якой-небудзь думцы, дык усё, што ты ўбачыш, будзе з'яўляцца фальшывым, — гэта і ёсць «спараджэнне дэманаў уласнымі ідэямі» альбо «ператварэнне адпаведна думкам». Некаторыя практыкоўцы не могуць лічыць сябе ўдасканальвальнікамі, не могуць кантраляваць сябе. Яны гоняцца за звышздольнасцямі, вельмі захапляюцца мізэрнымі здольнасцямі ды магіямі, нават пачутым з іншых прастораў. Яны ўпарта гоняцца за гэтымі рэчамі, і менавіта ў такіх людзей лягчэй за ўсё ўзнікае «спараджэнне дэманаў уласнымі ідэямі», менавіта ім лягчэй за ўсё ўпасці ўніз. Незалежна ад таго, да якое вышыні ўдасканаліўся, як

толькі з'явіцца такая праблема, дык можна ўпасці да самага дна, цалкам прапасці. Гэта надзвычай сур'ёзная праблема. Яна не падобная да іншых выпадкаў, калі твой Сіньсін, аднойчы не вытрымаўшы выпрабавання, пачынае падаць, аднак, упаўшы, практыкоўца можа яшчэ падняцца і ўдасканальвацца далей. А пасля з'яўлення праблемы «спараджэння дэманаў уласнымі ідэямі» — ужо не. Такая праблема ўзнікае асабліва ў тых, у каго нябеснае вока адкрыта на пэўным узроўні ў практыцы. Такая праблема ўзнікае і ў тых, хто лёгка паддаецца ўздзеянню знешніх інфармацыяў. Пра што кажа інфармацыя звонку, таму ён і верыць. Таму некаторыя з нас пасля адкрыцця нябеснага вока зведваюць перашкоды з усіх бакоў.

Прывядзем прыклад. На нізкіх узроўнях удасканальвання вельмі цяжка не паддавацца спакусам. Ты, магчыма, ясна не бачыш, які з выгляду Настаўнік. Аднойчы раптам убачыў, што прыйшоў жыхар неба ростам з волата. Ён кажа табе некалькі кампліментӑў, потым навучае нейкай дробязі, і ты гэта прымаеш. У выніку твой Ґун прыйшоў у поўнае бязладдзе. Ты ў думках усцешыўся, прызнаў яго настаўнікам і стаў вучыцца ў яго, аднак ён таксама не атрымаў Паўнапраўнага дасягнення. У той прасторы ўсяго толькі можна павялічвацца ды памяншацца. Ты на ўласныя вочы бачыш, як гэта адбываецца, выгляд вялікага святога цябе ўзрушыў! Калі ты перапоўнішся радасцю, хіба ты не пойдзеш вучыцца ў яго? Калі ўдасканальвальнік не ў стане сябе кантраляваць, тады яго вельмі цяжка выратаваць, ён можа лёгка загубіць сябе. Жыхары неба з'яўляюцца багамі, аднак яны таксама не атрымалі Паўнапраўнага дасягнення, яны ўсё адно ўваходзяць у Шэсць колаў пераўвасабленняў. Ты так лёгка прызнаў яго настаўнікам і пайшоў за ім, а да якое ступені ён цябе давядзе? Ён сам не атрымаў Паўнапраўнага дасягнення, ці не дарэмна ты ў такім разе ўдасканальваўся? У выніку твой уласны Ґун знаходзіцца ў стане поўнага хаосу. Чалавеку вельмі цяжка не паддавацца спакусам. Кажу вам, што гэта адна з самых сур'ёзных праблем, і ў будучыні шмат хто з нас сустрэнецца з ёй. Закон я табе ўжо выклаў, але ці зможаш ты трымаць сябе ў руках, залежыць толькі ад цябе самога. Тое, пра што я распавёў — толькі адна з сітуацыяў. Хай аніякая сустрэча з Прабуджанымі іншых школаў не пахісне цябе — удасканальвайся толькі па адной школе. «Хай аніякі Буда, аніякі даос, аніякі святы або д'ябал нават не мроіць спакусіць мяне!» Так у цябе неадменна будзе надзея на поспех.

Д'ябал, створаны ўласнымі ідэямі, мае яшчэ іншую форму праявы: магчыма, убачыш памерлых сваякоў, якія, абліваючыся слязьмі, будуць прасіць цябе зрабіць тое ці іншае. Трапляецца ўсё, што заўгодна. У такім выпадку ці лёгка не паддацца спакусе? Ты песціш сваё дзіця, любіш сваіх бацькоў. Аднак твае бацькі ўжо сышлі на той свет, і вось яны просяць, каб ты зрабіў тое, што табе нельга рабіць, калі здзейсніш — бяда. Вось як цяжка быць практыкоўцам. Людзі кажуць, што будыйская рэлігія ўжо прыйшла ў стан неладу, у яе пранікл̆і канфуцыянскія рэчы: шанаванне бацькоў, пачуцці да дзяцей — усё гэта ўвайшло туды. Будызм гэтага не змяшчае. Што маецца на ўвазе? Раз сапраўдным жыццём чалавека з'яўляецца яго душа, тады сапраўднай маці чалавека з'яўляецца тая, хто спарадзіла яго душу. Ты знаходзішся ў шасці

колах пераўвасабленняў, і адны твае маці з роду чалавечага, іншыя — не. Ва ўсіх тваіх перараджэннях твае дзеці таксама незлічоныя. Хто твая маці, хто твае дзеці — пасля смерці[161] ніхто нікога не пазнае, і ты ўсё адно павінен пагасіць зробленыя табой грахі. Людзі жывуць у змане, іх трывожаць гэтыя рэчы. Камусьці не дае спакою яго дзіця, якое, паводле яго слоў, было настолькі цудоўным, але памерла. Якая выдатная ў яго была маці, але таксама памерла. Чалавек напоўнены страшэннай скрухай, і ўсю рэшту жыцця жыве ўспамінамі пра іх. Ты і не падумаў, хіба гэта не мучыць цябе прыйшлі, каб пры дапамозе такое формы зрабіць цябе няшчасным?

Звычайныя людзі, магчыма, гэтага не разумеюць, аднак калі ты будзеш моцна трымацца за гэтыя рэчы, тады абсалютна не зможаш удасканальвацца, таму ў будызме няма такога зместу. Калі хочаш удасканальвацца, тады табе трэба вызваліцца ад чалавечых пачуццяў. Вядома, мы ўдасканальваемся ў грамадстве звычайных людзей. Нам таксама трэба шанаваць бацькоў, выхоўваць дзяцей, у разнастайным атачэнні трэба добра ставіцца да іншых, рабіць людзям дабро, тым больш сваім сваякам. Трэба падтрымліваць добрыя стасункі з усімі, у тым ліку і са сваімі бацькамі ды дзецьмі, паўсюль думаць пра іншых — такое сэрца ўжо пазбаўлена эгаізму. Яно напоўнена добразычлівасцю. Гэта міласэрнасць. Што датычыцца пачуццяў, дык яны ўласцівыя звычайным людзям, дзеля чаго яны і жывуць.

Многія не могуць кантраляваць сябе і гэтым ствараюць сабе цяжкасці ва ўдасканальванні. Нехта з вас распавёў, што Буда яму штосьці сказаў. Любы, хто табе кажа, што сёння з табой здарыцца непрыемнасць, нейкі інцыдэнт, і як табе яго пазбегнуць, альбо хтосьці кажа табе нумар латарэйнага квітка з галоўным прызам, каб ты яго выцягнуў (за выключэннем такіх выпадкаў, калі твайму жыццю пагражае небяспека і табе кажуць, як яе ліквідаваць), кожны, хто заклікае цябе атрымаць выгаду ў грамадстве звычайных людзей, — гэта д'ябал. Ты атрымаў выгаду сярод звычайных людзей, не прайшоў праз гэтыя пакуты, не падвысіўся. Як жа табе ўдасканальвацца, калі цяперашнія ўмовы жыцця сярод звычайных людзей будуць камфортнымі? Як ты будзеш пераўтвараць сваю карму? Дзе знойдзеш асяроддзе, у якім можна падвысіць свой Сіньсін і пераўтварыць сваю карму? Запомніце мае гэтыя словы абавязкова. Дэман часам яшчэ і пахваліць цябе: маўляў, ты дасягнуў даволі высокага ўзроўню, што ты Буда нейкага высокага ўзроўню або даос нейкага высокага ўзроўню, ты чалавек незвычайны — усё гэта хлусня ад пачатку і да канца. Усім, хто шчыра ўдасканальваецца на высокія ўзроўні, трэба адкінуць усе навязлівыя ідэі. Сустрэўшы гэтыя праблемы, вы абавязкова павінны быць пільнымі!

Падчас практыкі ў вас адкрылася нябеснае вока, з-за чаго ўдасканальванне ўскладніцца. Вядома, калі яно не адкрытае, удасканальвацца таксама цяжка. Цяжкасці ўдасканальвання бываюць у абодвух выпадках. Адкрытае нябеснае вока нясе з сабой разнастайнасць інфармацыяў, якія перашкаджаюць табе, таму становіцца цяжка кантраляваць сябе. У іншых прасторах «цудоўныя

каштоўнасці цешаць вока»[162], усюды ўсё невыказна цудоўнае, невымоўна добрае, і ўсё можа цябе спакусіць. У такім выпадку, калі стан тваёй душы будзе няправедным, перашкоды змогуць уздзейнічаць на цябе, і тады твой Ґун прыйдзе ў стан поўнага неладу. Часта ўсё здараецца менавіта так. Таму ў тых, у каго дэманы спараджаюцца ўласнымі ідэямі, і хто не ў стане кантраляваць сябе, яшчэ можа ўзнікнуць і такая сітуацыя. Напрыклад, калі ў гэтага практыкоўцы ўзнікае няправедная думка, тады яму пагражае небяспека. Аднойчы ў яго адкрылася нябеснае вока, і ён стаў усё ясна бачыць і адразу ж вырашыў: «На гэтым пункце практыкі нябеснае вока ў мяне бачыць лепш за ўсіх. Можа, я незвычайны? Я змог навучыцца Фалунь Дафа Настаўніка Лі і змог навучыцца настолькі добра. Я найлепшы. Так, я асаблівы». Такія думкі ўжо хібныя. Аднак ён думае: «Хто ведае? Магчыма, я таксама Буда? Гм, ану я на сябе пагляджу». Паглядзеў на сябе — і сапраўды Буда. А чаму? Атрымалася так таму, што ўся матэрыя ў межах прасторавага поля, якое атачае яго ўласнае цела, эвалюцыянуе ўслед за яго думкамі. А яшчэ гэта называецца «пераўтварэннем адпаведна жаданням».

Рэчы, якія адлюстраваны з Сусвету, змяняюцца ўслед за думкамі чалавека. Бо ўсё, што знаходзіцца ў межах яго прасторавага поля, скараецца яму. Адлюстраванне таксама з'яўляецца матэрыяльным існаваннем. З ім адбываецца тое ж самае. Ён думае: «Я Буда. Можа, на мне і адзенне Буды». Тады ён паглядзеў і адразу ж убачыў сябе ў адзенні Буды. «Вой, я сапраўды Буда, — чалавек страшэнна ўсцешыўся. — А, можа, я і не ніжэйшага рангу Буда, — паглядзеў — ён яшчэ і Вялікі Буда. — А, можа, я яшчэ вышэйшы за Лі Хунджы!». Глянуў, так і ёсць, ён вышэйшы за Лі Хунджы. Некаторыя чулі ўсё гэта на свае вушы. Гэта д'ябал перашкаджае яму, кажа: «Ты нават вышэйшы за Лі Хунджы. Вось наколькі ты вышэйшы за Лі Хунджы». І ён паверыў. А ты не думаў, як з гэтага моманту будзеш удасканальвацца? Ці займаўся ты раней удасканальваннем, хто цябе вучыў? Нават сапраўднаму Буду, які сышоў з пэўнай місіяй у наш свет, трэба ўдасканальвацца наноў. Бо ранейшы Ґун яму не дадуць. Проста яго цяперашняе ўдасканальванне будзе праходзіць хутчэй. Такім чынам, як толькі ў чалавека з'явіцца падобная праблема, яму будзе надзвычай цяжка вызваліцца ад яе. Бо адразу ж разаўецца гэтая навязлівая ідэя. З гэтага моманту ён смее сцвярджаць абы-што: «Я Буда. Вам не трэба вучыцца ў іншых. Бо Буда — гэта я. Я вам скажу, як рабіць». Вось як ён пачаў рабіць.

Хіба ў нас няма ў Чанчуні гэткага чалавека? Быў ён спачатку неблагім чалавекам, потым дагуляўся да таго, што з ім здарылася такая гісторыя. Ён «стаў Будам». Урэшце ён абвясціў сябе вышэйшым за ўсіх. Усё гэта адбылося з прычыны таго, што чалавек не мог кантраляваць сябе, развіў навязлівую ідэю. Чаму здараецца такая з'ява? У будызме кажуць так: «Што б ты ні ўбачыў, не цікаўся гэтым, усё гэта — мана́». Клапаціся толькі пра тое, каб увайсці ў медытацыю ды ўдасканальвацца ўгару. Чаму табе не даюць глядзець на гэтыя карціны, не дазваляюць звяртаць на гэта вялікую ўвагу? Таму, што баяцца з'яўлення менавіта гэтае праблемы. У будыйскай рэлігіі няма метаду

інтэнсіўнага ўдасканальвання, у канонах няма настаўленняў, як пазбавіцца ад падобнае праблемы. У свой час Шак’ямуні не выкладаў гэтага Закону. Каб пазбегнуць такое праблемы, як «спараджэнне дэманаў уласнымі ідэямі» ды «пераўтварэнне адпаведна жаданням», яны ўсё без выключэння пабачанае падчас удасканальвання называюць д'ябальскай маной. Такім чынам, калі з'яўляецца навязлівая ідэя, тады, магчыма, узнікае гэткая д'ябальская мана, ад якое вельмі цяжка пазбавіцца. Тады гэтаму чалавеку, верагодна, прыйшоў канец — ён стаў д'яблам. Раз ён называе сябе Будам, ён ужо стаў д'яблам. Урэшце можа прывабіць да сябе нячыстага духа ці нейкую іншую бяду. Яму ўжо канчаткова прыйшоў канец. Душа яго ўжо сапсавалася, ён канчаткова ўпаў, і такіх людзей даволі шмат. І на гэтых курсах цяпер ужо ёсць такія, хто адчувае, што яны надзвычайныя, іх манера размовы ды паводзінаў зусім іншыя. Урэшце, што з імі адбываецца, самі не ведаюць, і гэта нават з’яўляецца тэмай табу ў будыйскай рэлігіі. Вышэй я распавёў яшчэ пра адзін выпадак, звязаны са з'явай «спараджэнне дэманаў уласнымі ідэямі» альбо, па-іншаму, «пераўтварэнне ўслед за думкамі». У Пекіне ёсць такія вучні, яны з'явіліся і ў іншых раёнах. І яны ствараюць велізарныя перашкоды практыкоўцам.

У мяне запытваюцца: «Настаўніку, чаму ж Вы гэта не ліквідавалі?» Падумайце, калі б я ліквідаваў усе перашкоды на шляху твайго ўдасканальвання, як бы ты стаў удасканальвацца? Менавіта калі ёсць перашкоды ад д'яблаў, можна выявіць, ці можаш ты і далей удасканальвацца, ці можаш ты ўсвядоміць, дзе правільны шлях, ці можаш зведаць перашкоды, ці можаш быць адданым гэтай школе. «Велізарныя хвалі прамываюць пясок» — менавіта гэта і ўяўляе сабой удасканальванне. Толькі тое, што застанецца — сапраўднае золата. Калі ў цябе не будзе такое формы перашкодаў, тваё ўдасканальванне стане занадта лёгкім. На маю думку, табе і так занадта лёгка практыкаваць. Тыя Вялікія Прабуджаныя на высокіх узроўнях, пабачыўшы гэта, былі яшчэ больш незадаволеныя: «Што ж ты робіш? Гэта ты так ратуеш людзей? На шляху няма ніякіх перашкодаў, ад пачатку ўдасканальвання і ажно да самага канца. Хіба гэта ўдасканальванне? Чым далей практыкуюць, тым ім становіцца больш камфортна, няма аніякіх перашкодаў, хіба так гадзіцца?» Менавіта такая праблема, і я таксама гэта абмяркоўваю. На пачатковым этапе вашага ўдасканальвання я разабраўся са многімі такімі дэманамі. Аднак увесь час так рабіць — таксама няправільна. Мне сказалі: «Ты дазваляеш ім удасканальвацца занадта лёгка. У іх толькі мізэрныя асабістыя цяжкасці, паміж людзьмі ўзнікаюць толькі такія нязначныя канфлікты. Усё яшчэ ёсць вельмі шмат навязлівых ідэяў, ад якіх яшчэ не могуць пазбавіцца! У змане ды хаосе ці змогуць зразумець твой Дафа — гэта само па сабе яшчэ застаецца пытаннем!» Вось якая існуе праблема, таму і трапляюцца перашкоды, трапляюцца выпрабаванні. Як я ўжо распавёў вышэй, гэта адна з формаў дэманаў. Па-сапраўднаму выратаваць чалавека вельмі цяжка, аднак загубіць чалавека вельмі лёгка. Як толькі твая душа страціць праведнасць, за адно імгненне ўсё будзе скончана.

## ГАЛОЎНАЯ СВЯДОМАСЦЬ ПАВІННА БЫЦЬ МОЦНАЙ

У працэсе ўсяго жыцця, у колах сваіх шматлікіх перанараджэнняў здзейсненыя чалавекам многія благія ўчынкі ствараюць для яго бедствы, а для ўдасканальвальнікаў — супраціўленне ад кармы, таму існуюць нараджэнне—старасць—хваробы—смерць. Гэта звычайныя кармы. Існуе яшчэ адзін тып моцных кармаў, які называецца «разумовымі кармамі». Ён мае вельмі вялікі ўплыў на практыкоўцаў. Чалавек жыве, а значыць, думае. З-за таго, што ён знаходзіцца ў змане звычайных людзей, у яго мысленні часцяком узнікаюць думкі пра славу, выгаду, секс, гнеў і гэтак далей. За трывалы час утвараюцца магутныя разумовыя кармы. У іншых прасторах усе істоты маюць жыццё, тое ж самае і з кармамі. Калі чалавек пачынае ўдасканальвацца па праведным Законе, тады яму трэба зжыць кармы — ліквідаваць, пераўтварыць іх. Кармы, вядома, не могуць з гэтым пагадзіцца, у выніку чаго ў чалавека ўзнікаюць цяжкасці, супраціўленне. Аднак «разумовыя кармы» маюць здольнасць непасрэдна пранікаць у чалавечы мозг, з прычыны чаго ў галаве з'яўляюцца ўсялякія словы лаянкі ў бок Настаўніка, супраць Дафа нараджаюцца розныя злыя намеры ды лаянка. Такім чынам, некаторыя практыкоўцы не ведаюць, у чым справа, і прымаюць гэтыя думкі за свае. Іншыя лічаць, што гэта апантанасць нячыстым духам. Аднак усё гэта не так. Гэта наступства ўздзеяння разумовых кармаў у мозгу чалавека. Тыя, у каго галоўная свядомасць не моцная, могуць паддацца сваім разумовым кармам ды здзейсніць што-небудзь благое, і такім людзям прыйдзе канец, яны ўпадуць уніз. Але большасць людзей у стане выцясняць «разумовыя кармы», у стане супрацьстаяць ім вельмі моцнымі суб'ектыўнымі думкамі (моцнай галоўнай свядомасцю). Такім чынам, гэта сведчыць пра тое, што чалавека можна выратаваць, ён ясна адрознівае добрае ад благога, гэта значыць мае добрую здольнасць усведамлення. У такім выпадку маё Цела Закону дапаможа яму ліквідаваць большую частку гэткіх «разумовых кармаў». Такая сітуацыя сустракаецца даволі часта. Калі такое мае месца, усё залежыць ад таго, ці можаш ты сам перамагчы дрэнныя думкі. Тых, хто зможа застацца непахісным, ад кармаў можна пазбавіць.

## АБАВЯЗКОВА ТРЭБА БЫЦЬ СЭРЦАМ ПРАВЕДНЫМ

Што значыць няправеднае сэрца? Гэта значыць, што чалавек увесь час не лічыць сябе практыкоўцам. Падчас самаўдасканальвання практыкоўца сутыкаецца з цяжкасцямі, якія праяўляюцца ў супярэчнасцях паміж людзьмі, у інтрыгах ды сварках і падобных рэчах, уздзейнічаюць непасрэдна на яго Сіньсін, такіх выпадкаў вельмі шмат. Якія яшчэ сітуацыі бываюць у практыкоўцаў? Мы раптам пачынаем адчуваць у целе дыскамфорт, бо ідзе працэс пагашэння кармаў. Ён можа праяўляцца па-рознаму. У пэўны час табе ствараюць сітуацыю, калі вельмі цяжка адрозніць праўду ад хлусні. Робяць так, каб ты адчуў сумневы: ці існуе той Ґун, ці можаш ты ўдасканальвацца, ці можаш, уласна, удасканаліцца, ці існуе Буда, праўда гэта ці хлусня. У будучыні, выпрабоўваючы, ці можаш ты выстаяць на абраным шляху ў

самаўдасканальванні, табе могуць стварыць сітуацыю, поўную ілюзіяў: будзе здавацца, што нічога гэтага няма, што ўсё гэта хлусня. Але ты вырашыў, што абавязкова будзеш цвёрдым ды непахісным, і з такім сэрцам у патрэбны час ты сапраўды зможаш быць цвёрдым, ты, натуральна, зможаш рабіць добра, бо твой Сіньсін ужо падвысіцца. А зараз ты яшчэ такі нестабільны. Калі б табе стварылі гэтыя нягоды зараз, тады б ты наогул не ўсвядоміў ды наогул не змог бы ўдасканальвацца. Нягоды могуць з'явіцца ў любых аспектах.

У людзей менавіта такі працэс удасканальвання ўверх. Некаторыя з нас, як толькі адчуваюць недзе ў целе дыскамфорт, дык адразу мяркуюць, што захварэлі. Яны ўвесь час не могуць лічыць сябе практыкоўцамі, і ў такой сітуацыі часта прымаюць недамаганне за хваробу: «Чаму са мной здараецца столькі непрыемнасцяў?» Скажу табе: тую тваю непрыемнасць ужо значна зменшылі. Калі б табе не скасавалі яе, тады б, сустрэўшыся з ёй, ты, магчыма, памёр бы, а, магчыма, хвароба надоўга прыкавала б цябе да ложка. А ты скардзішся на гэткую маленькую непрыемнасць, ты шукаеш утульнасці ды спакою. А хіба гэта магчыма? Прывяду прыклад. У горадзе Чанчунь на маіх лекцыях прысутнічаў чалавек з вельмі добрай маральнай асновай, гэта быў сапраўды «кавалак матэрыялу», і я спыніў свой выбар на ім. Вырашыў крыху ўзмацніць яго пакуты, каб даць яму хутчэй расплаціцца з даўгамі, каб у яго адкрыўся Ґун, намер мой быў менавіта такі. І вось аднойчы ў яго з'явіліся нібыта сімптомы інсульту: ён раптам упаў, канечнасці перасталі слухацца, цела аказалася нерухомым. Хуткая даставіла чалавека ў лякарню. Але неўзабаве ён змог спускацца з ложка на падлогу. Падумайце, як пасля інсульту магчыма так хутка ўстаць з ложка, каб рукі ды ногі зноў сталі рухомымі? Пасля гэтага ён ва ўсім абвінаваціў Фалунь Дафа, маўляў, гэта вучэнне Фалунь Дафа выклікала ў яго адхіленне. Ён не падумаў: інсульт, і так хутка акрыяў? Калі б ён зараз не займаўся Фалунь Дафа, тады, магчыма, зваліўшыся з ног, памёр бы на месцы альбо застаўся б назаўжды паралізаваным, гэта сапраўды аказалася б інсультам.

Вось як цяжка вырataваць чалавека. Столькі за яго зроблена, а ён нават не ўсведамляе гэтага і, наадварот, яшчэ так кажа. Адзін дасведчаны ўдзельнік курсаў паскардзіўся: «Настаўніку, чаму я ва ўсім целе адчуваю дыскамфорт? Пастаянна хаджу ў лякарню на ўколы — нічога не дапамагае, лекі не дзейнічаюць. Глытаю таблеткі — таксама не дапамагае». Распавядаў ён пра гэта, нават не саромячыся! Дык, вядома, яно не дапаможа. Бо гэта ж не хвароба — хіба лекі ў такім разе могуць дапамагчы? Прайдзі абследаванне ды пераканайся, што аніякага захворвання ў цябе няма. Проста ты блага пачуваешся. Ды яшчэ знайшоўся адзін слухач курсаў, які пайшоў у лякарню, пагнулі шмат іголак шпрыцаў, але аніводная не ўвайшла ў цела. Падчас апошняе спробы ўсадзіць іголку ў цягліцы ва ўсе бакі пырснулі лекі. І толькі тады ён уцяміў: «Вой, я ж практыкоўца. Я не буду рабіць укол». Толькі тады ён згадаў, што ўкол лішні. Таму, калі вы сустракаеце якія-небудзь беды, звяртайце адмысловую ўвагу на гэтае пытанне. Нехта мяркуе, што гэта я не дазваляю яму хадзіць у лякарню, і падумаў: «Не даяце мне лекавацца ў лякарні, тады я пайду

лекавацца да майстра ціґун». Ён усё ж такі прымае гэта за хваробу ды ідзе лекавацца да майстра ціґун. Але дзе ж ты знойдзеш сапраўднага майстра? Калі ён акажацца фальшывым, дык імгненна цябе загубіць.

Мы запытаем цябе: як ты можаш дакладна адрозніць сапраўднага майстра ад фальшывага? Многія майстры ціґун з'яўляюцца самазванцамі. Я прайшоў праз экспертызу адмыслоўцаў, і маю на руках дадзеныя вымераў, праведзеных навукова-даследчымі інстытутамі. Вельмі многія майстры ціґун фальшывыя, самазванцы, ашуканцы паўсюль. Такія псеўдамайстры таксама здольныя лекаваць хворых. А чаму яны здольныя да гэтага? Бо яны апантаныя нячыстым духам. Без апантанасці яны б не змаглі дурыць людзей! Нячысты дух таксама можа выпраменьваць Ґун і таксама можа лекаваць хваробы. У яго таксама ёсць энергія, якой вельмі лёгка ўздзейнічаць на звычайнага чалавека. Але, як я ўжо казаў, калі нячысты дух лекуе хваробы, тады што ён накіроўвае на тваё цела? У надзвычай мікраскапічным стане гэта з'яўляецца вобразам нячыстага духа, ён накіроўвае гэта на тваё цела, і што ж табе пасля гэтага рабіць? «Запрасіць дух лёгка, а вось выправадзіць цяжка». Не будзем разважаць пра звычайных людзей, якія хочуць заставацца такімі ж, маючы часовы камфорт. Але ж ты практыкоўца. Хіба табе не трэба няспынна ачышчаць сваё цела? Пасля таго як у цябе ўселіцца гэтае стварэнне, калі ж ты зможаш яго выкінуць з сябе? Прычым яно мае пэўную энергію. Хтосьці з вас падумаў: «А чаму ж тады Фалунь дазваляе яму ўсяліцца? Хіба нас не абараняюць Целы Закону Настаўніка?» У нашым Сусвеце ёсць такі прынцып: калі ты сам да нечага імкнешся — у гэта ніхто не ўмешваецца, калі нечага сам хочаш — ніхто не ўмешваецца. Маё Цела Закону будзе спыняць цябе, намякаць табе, але калі ты ўвесь час праяўляеш упартасць, яно перастане ўмешвацца. Дзе ты такое бачыў, каб людзей прымушалі ўдасканальвацца? Нельга прымушаць цябе ўдасканальвацца. Сапраўднага падвышэння можна дабіцца, спадзяючыся толькі на сябе, і, калі ты падвышацца не хочаш — няма на тое рады. Прынцыпы я табе ўжо растлумачыў, Закон таксама табе выклаў, і калі ты нават з такімі ўмовамі не хочаш падвышацца, тады каго ты ў гэтым вінаваціш? Фалунь не можа адказваць за тое, што ты выпрасіў сам, маё Цела Закону ў такіх выпадках таксама не будзе ўмешвацца, гарантую, што гэта так. Некаторыя яшчэ наведваюць лекцыі іншых майстроў ціґун і пасля гэтага пачуваюцца блага. Дык зразумелая рэч. Тады чаму Цела Закону цябе не абараняе? З якой мэтай ты пайшоў на гэтыя лекцыі? Пайшоў слухаць. Хіба гэта не значыць, што ты пайшоў прасіць? Калі ты не слухаеш яго сваімі вушамі, ці змогуць яго словы ў цябе ўвайсці? Некаторыя людзі ўжо дэфармавалі свой Фалунь. Скажу табе: гэты Фалунь даражэйшы за тваё жыццё, ён з'яўляецца вышэйшай істотай, нельга яго так папросту псаваць. Цяпер існуе вялікая колькасць псеўдамайстроў ціґун. Некаторыя з іх вельмі знакамітыя. У размове з кіраўніком Даследчае асацыяцыі ціґун Кітая я сказаў, што ў старажытнасці быў выпадак, калі Да́дзі[163] выклікала разлад у царскім двары, гэтая ліса надзвычай лютавала. Але ўсё адно тады не было настолькі небяспечна, як зараз з-за псеўдаціґун — ён прывёў да сапраўднае трагедыі ў маштабах усёй краіны. Колькі людзей ад гэтага пацярпелі! Табе здаецца, што знешне яны нібыта выдатна выглядаюць, але

колькі людзей носіць у сваім целе гэтае стварэнне? Псеўдамайстар ціґун выпраменьвае гэта на цябе, вось яно і ўсялілася ў тваё цела. Яны проста надзвычай расперазаліся. Звычайным людзям вельмі цяжка распазнаць іх па знешнасці.

Магчыма, нехта думае: «Сёння прысутнічаў на лекцыі Лі Хунджы, скончыў слухаць лекцыю Лі Хунджы. Аказваецца, ціґун такі шырокі ды глыбокі! Наступным разам, калі будуць яшчэ лекцыі іншых ціґун, я таксама пайду паслухаць». Раю табе ні ў якім разе не хадзіць, інакш у цела праз вуха пранікне благая істота. Вельмі цяжка выратаваць чалавека, змяніць тваё мысленне таксама цяжка, таксама цяжка прывесці да ладу тваё здароўе. Псеўдамайстроў ціґун процьма. Нават сапраўдныя майстры ціґун прамога ўспадкавання... хіба тыя майстры сапраўды чыстыя? Некаторыя жывёлы дужа магутныя. Яны не могуць усяліцца ў целы тых майстроў, але і майстры не могуць іх адагнаць. Яны не маюць такое сілы, каб у вялікіх маштабах кранаць тых істот, у прыватнасці ў сваіх вучняў. Нягледзячы на тое, што майстар ціґун выпраменьвае Ґун, у яго вучняў усяго настолькі намяшана, што ў іх ёсць якія заўгодна стварэнні. Сам жа майстар вельмі праведны, а вось яго вучні няправедныя ды апантаныя ўсялякімі нячыстымі духамі. Чаго ў іх толькі няма.

Калі ты сапраўды вырашыў удасканальвацца па Фалунь Дафа, тады табе нельга ісці на тыя лекцыі. Вядома, калі не збіраешся ўдасканальвацца па Фалунь Дафа, а хочаш займацца ўсім запар, тады ідзі. Мне да цябе няма справы, бо ты не прыналежыш да паслядоўнікаў Фалунь Дафа, і, калі здарыцца што-небудзь, не перакладвай віну на Фалунь Дафа. Толькі ў тым выпадку, калі ты будзеш прытрымлівацца стандарту Сіньсін, удасканальвацца па Вялікім Законе, ты можаш лічыцца сапраўдным паслядоўнікам Фалунь Дафа. Нехта запытвае: «Ці можна мець зносіны з людзьмі, якія практыкуюць іншы ціґун?» Я скажу табе: ён займаецца звычайным ціґун, а ты ўдасканальваешся па Фалунь Дафа. Пасля гэтых курсаў паміж вамі з’явіцца невядома якая прорва ва ўзроўнях. Гэты Фалунь, які мае вялікую магутнасць, людзі ўтвараюць, толькі прайшоўшы ўдасканальванне на працягу многіх жыццяў. Вядома, калі ты хочаш кантактаваць з такімі людзьмі, тады не прымай ад іх нічога і нічога не прасі, падтрымлівай звычайныя сяброўскія адносіны, тады нічога страшнага не будзе. Аднак калі ў целе гэтага чалавека сапраўды ёсць нейкія стварэнні, тады гэта вельмі блага, і лепш за ўсё не кантактаваць з ім. Што тычыцца сямейных пар, дык, калі адзін з сужэнцаў займаецца ціґун іншае плыні, я думаю, нічога страшнага таксама няма. Але адзначу наступнае: раз ты ўдасканальваешся па праведным Законе, дык калі займаешся практыкай, іншыя атрымліваюць ад гэтага карысць. Калі твая палова займаецца чымсьці няправедным ды нясе ў сваім целе нешта нячыстае, тады дзеля тваёй бяспекі я ачышчаю і яе. Дзеля цябе ачышчаю ўсё, што знаходзіцца ў іншай прасторы, а таксама тваё хатняе асяроддзе. Калі не ачысціць асяроддзе, дык розныя рэчы стануць перашкаджаць табе, тады як ты будзеш практыкаваць?

Але ёсць такі выпадак, калі маё Цела Закону не стане ачышчаць. Аднойчы адзін са слухачоў курсаў убачыў, што да яго прыйшло маё Цела Закону, ён страшэнна ўсцешыўся: «О, Цела Закону Настаўніка! Прашу, Настаўніку, заходзьце». Маё Цела Закону сказала: «У пакоі ў цябе поўнае бязладдзе. Зашмат рэчаў». І сышло. Наогул кажучы, калі ў іншай прасторы зашмат істотаў, тады маё Цела Закону іх знішчыць. Але пакой вучня быў поўны ўсялякіх хаатычных кніг па ціґун. Вучань усё зразумеў і адразу ж прыбраўся: частку кніг спаліў, а частку прадаў. Тады маё Цела Закону вярнулася. Гэта ён мне так распавёў.

Некаторыя просяць іншых ім паваражыць[164]. Мяне аднойчы спыталі: «Настаўніку, я ўдасканальваюся па Фалунь Дафа, але мяне вельмі цікавіць «Джоў-і» ды прадказанне лёсу. Ці магу я гэтым яшчэ карыстацца?» Можна так сказаць: калі ты ўжо нясеш у сабе пэўную энергію, тады выказаныя табой словы будуць мець сілу. Калі ты прадкажаш тое, што не наканавана лёсам, тады ты зробіш кепскую справу. Звычайны чалавек — істота слабая. Інфармацыі ў яго нестабільныя, зменлівыя. Калі ты адкрыў рот і распавёў чалавеку, магчыма, бяда ўжо стала існаваць. Альбо, дапусцім, у яго вялікая карма, якую яму трэба пагасіць, а ты ўвесь час прарочыш яму радасныя падзеі, з прычыны чаго ён не пагасіць сваёй кармы. Хіба так можна? Хіба гэтым ты не шкодзіш чалавеку? Некаторыя, лічачы сябе вельмі здольнымі да варажбы, прывязаныя да гэтага занятку і не могуць гэта адкінуць. Хіба гэта не навязлівая ідэя? Нават калі ты сапраўды нешта ведаеш, тады ты, як практыкоўца, павінен утрымаць свой Сіньсін і не павінен выбалбатаць нябесныя таямніцы звычайным людзям. Вось логіка рэчаў. Як бы ты ні прадказваў пры дапамозе «Джоў-і», некаторыя рэчы ўсё адно ўжо не адпавядаюць рэчаіснасці. Прадказанні могуць быць праўдзівымі, а могуць быць і хібнымі, але ў любым выпадку ў грамадстве звычайных людзей існаванне варажбы дазваляецца. З прычыны таго, што ты маеш Ґун, на маю думку, з’яўляючыся сапраўдным практыкоўцам, ты павінен патрабаваць ад сябе па высокіх крытэрах. Але бываюць людзі, якія просяць іншых прадказаць іх лёс: «Прадкажы, што мяне чакае. Паглядзі, як у мяне справы з практыкай?» Альбо: «Ці ёсць нейкая бяда на маім шляху?» Ён просіць іншых паваражыць яму наконт гэтага. Як ты будзеш удасканальвацца, калі табе прадкажуць тую бяду? Жыццё практыкоўцы ўжо змянілася. Прыкметы на далонях і твары, гараскоп з васьмі знакаў[165] ды інфармацыя, якую мае яго цела, ужо не тыя, што былі раней, яны ўжо змяніліся. Ты просіш варажбіта прадказаць, значыць, ты яму верыш, інакш навошта просіш? Прадказанні яго павярхоўныя, наваражыў ён тое, што ты нёс у сабе раней, і што, па сутнасці, ужо змянілася. Тады вы падумайце, раз ты прасіў яго варажыць, значыць, ты слухаў яго, даваў яму веры? У такім выпадку ў душы тваёй, магчыма, з’явіўся цяжар? З’явіўся. Ты думаеш пра гэта, і хіба гэта не навязлівая ідэя? Як табе пераадолець гэтую прывязанасць? Хіба гэта не азначае, што ты сам сабе штучна дадаў яшчэ адну бяду? Пасля з'яўлення гэтай навязлівай ідэі хіба не трэба яшчэ больш пакутаваць, каб адкінуць гэтую новаствораную навязлівую ідэю? У кожным выпрабаванні, у кожнай бядзе мае месца пытанне ўдасканальвання ўверх альбо падзення ўніз. Ужо і так цяжка, а

ты штучна павялічваеш гэты цяжар. Як табе гэта прайсці? Цалкам магчыма, што з гэтае прычыны ты сустрэнешся з нягодамі ды непрыемнасцямі. Іншым забаронена бачыць, як выглядае твой жыццёвы шлях пасля яго змянення. Як ты будзеш удасканальвацца надалей, калі хтосьці ўбачыць твой лёс і скажа, дзе цябе чакаюць нягоды?! Таму глядзець лёс наогул не дазваляецца. Нікому з іншых школаў не дазваляюць бачыць. Нават паслядоўнікам адное школы не дазваляецца. Ніхто не зможа табе правільна распавесці. Бо твой лёс ужо змяніўся. Гэта жыццё, прысвечанае самаўдасканальванню.

Хтосьці ў мяне запытвае: «Ці можна чытаць кнігі іншых рэлігіяў, а таксама кнігі па ціґун?» Мы кажам, што кнігі розных рэлігіяў, асабліва будызму, вучаць людзей, як удасканальваць Сіньсін. Мы таксама прыналежым да школы Буды. У прынцыпе, праблемы не будзе. Адно трэба адзначыць: у многіх будыйскіх канонах некаторыя рэчы падчас перакладу ўжо былі перакладзеныя памылкова. Да іх ідуць зробленыя на розных узроўнях незлічоныя каментары, плюс вельмі шмат тлумачэнняў канонаў, зробленых з пазіцыі розных узроўняў, і ў якіх адвольна даюцца вызначэнні. Усё гэта не што іншае, як руйнаванне Закону. Аўтары гэтых адвольных тлумачэнняў занадта далёкія ад узроўню Буды і зусім не разумеюць сапраўднага сэнсу канонаў, таму назіраецца разыходжанне ў разуменні тэксту. Цалкам зразумець каноны не надта проста. Сам ты гэта зрабіць не зможаш. Але ты кажаш: «Нас цікавяць будыйскія каноны». Калі ты ўвесь час вучышся таму, што звязана з канонамі, ты фактычна ўжо ўдасканальваешся па дадзенай школе, бо ў канонах ужо злучаныя Ґун і Закон тое школы. Калі ты пачаў ім вучыцца, тады, вядома, ужо вучышся па той школе. Вось якая існуе праблема. Калі ты цалкам паглыбіўся ў будыйскія каноны, тады, магчыма, ужо практыкуеш тую школу, а не нашую. У колах удасканальвальнікаў заўжды дзейнічае прынцып «поўная адданасць толькі адной школе». Чытай каноны толькі тое школы, па якой ты сапраўды ўдасканальваешся.

Калі займаешся самаўдасканальваннем, тады кніг па ціґун не чытай, асабліва выдадзеных цяпер кніг па ціґун не чытай. Што тычыцца «Унутранага канона Жоўтага імператара»[166], «Дасканалага зместу духоўнага і фізічнага» альбо «Даоскага скарбу» ды іншых падобных кніг, дык іх таксама чытаць не варта, хоць гэтыя кнігі не з'яўляюцца шкоднымі, але таксама нясуць інфармацыю рознага ўзроўню. Яны самі ўжо з'яўляюцца метадам самаўдасканальвання, таму, калі ты чытаеш гэтыя кнігі, дык фактычна ўспрымаеш перашкоды. Табе, магчыма, падасца, што вось тыя словы правільныя, тады яны і ўвойдуць у цябе. Хаця гэта не нейкія дрэнныя рэчы, але калі да твайго Ґун дадаць штонебудзь іншароднае, як ты будзеш практыкаваць далей? Хіба гэта не праблема? Скажам, напрыклад, калі ў тэлевізар дадалі нейкую лішнюю дэталь, што тады будзе? Тэлевізар адразу зламаецца — менавіта такі прынцып. Тым больш цяпер шмат кніг па ціґун фальшывыя, нясуць разнастайную інфармацыю. Адзін з нашых вучняў гартаў кнігу па ціґун, і раптам з кнігі выскачыла вялікая змяя. Вядома, я не маю жадання падрабязна пра гэта гаварыць. Я тут распавёў пра тое, як практыкоўцы з-за няправільнага

стаўлення да сябе стварылі некаторыя непрыемнасці — гэта значыць пра непрыемнасці, выкліканыя няправеднымі думкамі. Кажу вам гэта для вашае ж карысці. Дзякуючы гэтаму, вы будзеце ведаць, як трэба рабіць, як у гэтым разабрацца, каб у будучыні не было непрыемнасцяў. Не звяртайце ўвагі, што я казаў пра гэта ў лёгкай манеры. Абавязкова звярніце ўвагу на тое, што менавіта ў гэтым пытанні можна спатыкнуцца. Удасканальванне сапраўды справа надзвычай цяжкая ды вельмі суровая. Найменшая твая няўважлівасць можа прывесці да таго, што ты ўпадзеш уніз, зведаеш крах у адно імгненне. Таму тваё сэрца абавязкова павінна быць праведным.

## ЦІҐУН БАЯВЫХ МАСТАЦТВАЎ

Апроч метадаў практыкі, накіраваных на ўнутранае ўдасканальванне, існуе яшчэ ціґун баявых мастацтваў. Перад тым, як я пачну казаць пра гэта, хачу акцэнтаваць увагу вось на чым. У цяперашні час у колах удасканальвальнікаў кажуць пра мноства відаў ціґун.

З'явіўся і ціґун выяўленчага мастацтва, і ціґун музыкі, і ціґун каліграфіі, і ціґун танца — усё што заўгодна, і ўсё гэта ціґун? Мяне гэта здзіўляе. Магу сказаць, што гэта толькі губіць ціґун. І не толькі губіць, але і ганьбіць. Якое тэарэтычнае абгрунтаванне ў гэтых людзей? Яны кажуць, што калі малюеш, спяваеш, танцуеш, пішаш іерогліфы, тады ўваходзіш у туманны стан, у так званы «ціґунскі стан». Хіба гэта ціґун? Нельга гэта так разумець. Я кажу: няўжо гэта не абражае ціґун? Ціґун — усёабдымная, глыбокая навука пра ўдасканальванне чалавечага цела. Ах, туманны стан — гэта ўжо ціґун? Тады як разумець, калі чалавек у «стане ціґун» сходзіць у прыбіральню? Хіба гэта не ганьбіць ціґун? На маю думку, ганьбіць. Пазалетась[167] на Усходняй выставе здароўя быў нейкі ціґун каліграфіі. А што такое ціґун каліграфіі? Я вырашыў паглядзець. Аказваецца, чалавек пісаў пэндзлем іерогліфы, потым рукамі выпраменьваў на кожны іерогліф ці. Ці ў яго быў чорнага колеру. Уся галава чалавека была забітая думкамі пра грошы і славу, скажы, хіба мог ён мець Ґун? Ці таксама не мог быць добрым. Каліграфію сваю ён вешаў на сцяну і прасіў за яе вельмі дорага, пакупнікі — выключна замежнікі. Таго, хто купіў яго твор, на маю думку, будуць пераследваць няўдачы. Якая можа быць карысць ад чорнага ці? І нават твар самога каліграфа быў увесь чорны. Ён апантаны грашыма, толькі і думае пра грошы. Адкуль жа тут узяцца Ґун? У яго візітоўцы куча разнастайных званняў, такіх як «майстар ціґун міжнароднае каліграфіі» і г.д. Я вас запытваю: хіба гэтыя рэчы могуць лічыцца ціґун?

Падумайце, пасля заканчэння нашых курсаў 80-90 адсоткаў тых, хто іх скончыць, не толькі стануць здаровымі, але і будуць мець Ґун, сапраўдны Ґун. Тое, што ўжо нясе тваё цела, з'яўляецца надзвычайным. Гэтыя рэчы ты не зможаш выпрацаваць сам нават за ўсё жыццё сваёй самастойнай практыкі. Маладыя людзі, пачынаючы заняткі з гэтага моманту і пад кіраўніцтвам

сапраўднага настаўніка, да канца жыцця свайго не змогуць выпрацаваць тое, што я ўклаў у цябе. Я адразу ўклаў у цябе Фалунь і шматлікія механізмы, якія выпрацаваныя намі цягам многіх жыццяў. Таму скажу вам: нельга легкадумна страціць іх з-за таго, што яны лёгка атрыманыя. Такія рэчы не маюць цаны, іх каштоўнасць нельга вызначыць аніякімі грашыма. Скончыўшы гэтыя курсы, ты будзеш мець сапраўдны Ґун, матэрыю высокай энергіі. Дома напішаш некалькі іерогліфаў, у іх будзе Ґун незалежна ад таго, ці добра яны напісаныя! Таму пасля гэтых курсаў кожны можа дадаць сабе іерогліф «майстар»[168], няўжо ў такім выпадку ўсіх вас можна будзе прылічыць да майстроў ціґун каліграфіі? Я кажу, што не трэба так разумець, бо чалавеку, які сапраўды мае Ґун, а значыць, і энергію, няма неабходнасці адмыслова выпраменьваць Ґун: на ўсім, да чаго ён дакранаецца рукой, застаецца энергія, усё блішчыць, усё свеціцца.

Мне трапіўся адзін часопіс, у ім была рэклама арганізацыі курсаў ціґун каліграфіі. Я пагартаў, каб азнаёміцца з іх методыкай. Там было напісана так: спачатку трэба адрэгуляваць дыханне, потым сесці ў медытацыю ды ўявіць сабе ці даньт’ень. Прасядзеўшы ў гэткай паставе ад 15 хвілін да паўгадзіны, уявіць сабе, што ці з даньт’ень падымаецца ды ўваходзіць у локвіцу. Абмакнуць пэндзаль у туш, у думках накіраваць ці ў кончык пэндзля. І калі думка дойдзе да кончыка пэндзля, пачаць пісаць іерогліфы. Хіба гэта не падман? Ах, падыманне ці да якога-небудзь месца ўжо называецца нейкім ціґун? Тады падчас таго, як ямо, сядзем ненадоўга ў медытацыю, возьмем у рукі палачкі[169], накіруем у палачкі ці ды пачнем есці. Гэта ўжо будзе называцца ціґун яды, так? Ды яшчэ ўсё, што мы будзем есці, будзе энергіяй. Вось пра што я вяду гаворку. Яны лічаць ціґун настолькі павярхоўным. На маю думку, яны менавіта ганьбяць ціґун. Так разумець нельга.

Аднак ціґун баявых мастацтваў вылучаецца, як самастойны від ціґун. Чаму? Таму што ў ім існуе працэс пераемнасці ды перадачы, які налічвае ўжо некалькі тысяч гадоў. Ціґун баявых мастацтваў мае свой комплекс тэарэтычнае часткі па самаўдасканальванні ды цэлы комплекс методык заняткаў, таму яго можна лічыць паўнавартасным комплексам. Нягледзячы на гэта ціґун баявых мастацтваў з’яўляецца рэччу найніжэйшага ўзроўню сярод метадаў практык унутранага ўдасканальвання. Жорсткі ціґун — гэта менавіта згустак матэрыі ды энергіі, які выкарыстоўваецца выключна для нанясення ўдараў. Прыводжу прыклад. Аднаму пекінскаму вучню па заканчэнні курсаў Фалунь Дафа рукамі нельга было ні на што націскаць. Ён пайшоў у краму па дзіцячы вазок, але варта было яму выпрабаваць яго на трываласць, як — «Хрась!» — вазок адразу ж разламаўся. Вучань вельмі здзівіўся. Вярнуўшыся дадому, збіраючыся прысесці, ён злёгку абапёрся на крэсла рукой — «Хрась!» — крэсла адразу ж разламалася. Вучань спытаў мяне, у чым справа. Я не стаў яму тлумачыць, баючыся, што ў яго з’явіцца навязлівая ідэя. Я сказаў: «Усё гэта з'яўляецца натуральным станам. Скарыся натуральнай плыні рэчаў і не звяртай на гэта ўвагі. Гэта добрая з'ява». Калі добра навучыцца карыстацца гэтай здольнасцю, дык нават камень раздрабіцца, калі сціснуць яго пальцамі. Хіба гэта не жорсткі ціґун? Аднак ён не займаўся жорсткім ціґун. Звычайна ў метадах практыкі

ўнутранага ўдасканальвання ўсе гэтыя здольнасці ўзнікаюць. Але з прычыны таго, што чалавек не можа ўтрымаць свой Сіньсін, часта, нават калі здольнасць з'явілася, табе не даюць ёй карыстацца. Асабліва калі чалавек знаходзіцца на нізкіх узроўнях удасканальвання, і ў яго не падвысіўся Сіньсін, тады наогул не даюць такіх звышздольнасцяў, якія ўзнікаюць на нізкіх узроўнях. Калі міне шмат часу, і твой узровень падвысіцца, ад гэтых рэчаў ужо аніякае карысці не будзе, таму яны ўжо не праяўляюцца.

Як канкрэтна трэніруюцца ў ціґун баявых мастацтваў? У ціґун баявых мастацтваў надаецца адмысловая ўвага накіроўванню ці. Спачатку ці накіроўваць цяжка. Хіба ты зможаш перасунуць ці, толькі захацеўшы гэтага? Зрабіць гэта яшчэ не атрымліваецца. Што ж тады рабіць? Ім трэба гартаваць кісці, бакі цела або ступні, ногі, плечы ды локвіцы, галаву — усе гэтыя часткі цела трэба гартаваць. Як гартаваць? Адны рукой або далонню моцна б'юць аб дрэва, іншыя — аб камень: «Бах! Бах!». Уявіце, наколькі мусяць балець косткі, непасрэдна датыкаючыся да цвёрдых прадметаў падчас гэтага? Ударыш крыху мацней, і ўжо з'яўляецца кроў, а ці ўсё не перасоўваецца. Дык і што ж рабіць? Яны пачынаюць размахваць рукамі, накіроўваючы кроў у супрацьлеглым напрамку, у выніку чаго ацякаюць рукі ды кісці. Насамрэч дзякуючы ацёку потым, калі яны б'юць аб камень, косткі становяцца абароненымі пракладкай, ужо не кантактуючы непасрэдна з каменем, таму ўжо не так балюча. Гэта і ёсць практыка, якая праходзіць пад наглядам настаўніка, і з цягам часу яны ўжо навучацца перасоўваць ці. Але толькі ўмець перасоўваць ці яшчэ недастаткова, падчас рэальнага паядынку ніхто ж цябе чакаць не будзе. Вядома, калі чалавек можа перасоўваць ці, значыць, ён ужо здольны абараняцца ад удараў і нават, калі ўдарыш яго таўшчэзнай палкай, не адчувае болю, бо пасля накіравання ці месца можа разадзьмуцца. Аднак ці з’яўляецца самай прымітыўнай рэччу пачатковае стадыі тэхнікі. Але з правядзеннем бесперапыннае трэніроўкі ці паступова ператвараецца ў рэчыва высокай энергіі. Калі ён ператвараецца ў матэрыю высокай энергіі, паступова фармуецца згустак энергіі велізарнае канцэнтрацыі. А такі згустак энергіі ўжо мае разумовыя здольнасці, такім чынам, гэта ўжо згустак-здольнасць — гэта ўжо з’яўляецца экстрасэнсорнай здольнасцю. Але такая здольнасць выкарыстоўваецца выключна для нанясення ўдараў ды абароны ад іх. Бессэнсоўна выкарыстоўваць яе для лекавання хваробаў. З прычыны таго, што матэрыя высокай энергіі знаходзіцца ў іншай прасторы, і яна не ідзе нашай прасторай, дык яе час хутчэйшы за наш. Калі ты збіраешся нанесці ўдар, табе ўжо няма неабходнасці накіроўваць ці, няма неабходнасці збірацца з думкамі, твой Ґун ужо знаходзіцца ў тым месцы. Калі іншыя цябе б’юць, і ты адбіваеш удары — Ґун ужо знаходзіцца ў тым месцы. Як бы хутка ты ні наносіў удары, Ґун заўсёды хутчэйшы за цябе, бо паняцце пра час у дзвюх прасторах рознае. Пры дапамозе ціґун баявых мастацтваў можна выпрацаваць «жалезныя далоні», «цынобравыя далоні», «ногі-Ваджра», «ступні Аргата» — гэта ўменні ўзроўню звычайных людзей. Звычайныя людзі шляхам трэніроўкі могуць дасягнуць такое ступені.

Найбольшае адрозненне паміж ціґун баявых мастацтваў і метадамі практыкі, па якіх займаюцца ўнутраным удасканальваннем: ціґун баявых мастацтваў патрабуе, каб загартоўка праходзіла ў руху, таму ці перасоўваецца пад скурай. З-за таго, што трэніроўка праходзіць у руху, немагчыма ўвайсці ў спакой, ці рухаецца пад скурай, насычае цяглiцы і не ўваходзіць у даньт’ень, таму там немагчыма ўдасканальваць даўгалецце[170] і выпрацаваць высокі ды глыбокі ґунфу. У нашых метадах практыкі ўнутранага ўдасканальвання патрабуецца практыкаваць у стане спакою. У звычайных метадах практыкі ці ідзе ў даньт’ень, у ніз жывата. Там прытрымліваюцца ўдасканальвання ў стане спакою, пераўтварэння ўласнага цела, дзякуючы чаму можна ўдасканальваць даўгалецце і дасягнуць больш высокіх узроўняў.

Верагодна, вы чулі, што існуюць такія ґунфу, апісаныя ў літаратурных творах, як «залаты звон», «жалезны халат», «прабіць таполю за сто крокаў». Ёсць яшчэ Ґун «бязважкі» — некаторыя людзі могуць перамяшчацца туды-сюды высока ў паветры. Іншыя нават могуць уцячы ў іншую прастору. Ці існуюць такія ґунфу? Так, існуюць. І гэта дакладна. Аднак не сярод звычайных людзей. Тым, хто сапраўды выпрацаваў такія высокія ґунфу, нельга іх паказваць. Бо яны іх выпрацавалі не аднымі толькі трэніроўкамі ў баявых мастацтвах. Гэта ўжо цалкам перавышае ўзровень звычайных людзей. Такім чынам, такі чалавек павінен удасканальвацца па метадах практыкі ўнутранага ўдасканальвання. Ён павінен звяртаць вялікую ўвагу на Сіньсін — падвышаць свой Сіньсін і абыякава ставіцца да матэрыяльных выгадаў. Хоць гэтыя людзі могуць выпрацаваць такія ґунфу шляхам самаўдасканальвання, але ім ужо з гэтага часу нельга самавольна выкарыстоўваць іх сярод звычайных людзей. Калі ніхто не бачыць, і карыстаешся сам, тады, наадварот, можна. Ты мог прачытаць у раманах, што персанажы дзеля нейкае там кнігі па валоданні мячом, дзеля захопу скарбаў, дзеля жанчын б'юцца і забіваюць, у кожнага з іх велізарныя ўменні, і яны, падобна да духаў, раптам з'яўляюцца ды знікаюць. Падумайце, людзі, якія сапраўды маюць такія ґунфу, хіба не выпрацавалі іх шляхам унутранага ўдасканальвання? Яны выпрацавалі такія здольнасці менавіта шляхам удасканальвання свайго Сіньсін, яны даўно ўжо абыякавыя да славы, выгады і розных жаданняў. Ці могуць яны забіваць людзей? Ці могуць яны так сур'ёзна ставіцца да багацця? Гэта абсалютна немагчыма. Гэта ўсяго толькі мастацкія гіпербалы. Людзі цяпер гоняцца за псіхічным узбуджэннем. Аўтары, выкарыстоўваючы гэтую чытацкую рысу, пішуць так, абы наталіць гэтую смагу і задаволіць цябе. Так ці інакш, што спатольвае тваю смагу, што цябе захапляе, пра тое яны для цябе што моцы і пішуць. Чым больш дзіўна напісана, тым больш табе хочацца гэта чытаць. Гэта толькі мастацкія перабольшанні. Тыя, хто сапраўды мае такія ґунфу, не стануць так рабіць. Тым больш немагчыма, каб яны дэманстравалі іх на сцэне.

**СХІЛЬНАСЦЬ ПАКАЗВАЦЬ СЯБЕ**

Многія нашыя вучні, займаючыся сярод звычайных людзей, не могуць пазбавіцца ад сваіх навязлівых ідэяў, якія ўжо сталі натуральнымі, і яны самі ўжо іх не заўважаюць. Гэтая схільнасць паказваць сябе праяўляецца ўсюды, бывае нават у тым выпадку, калі робіш добры ўчынак. Звычайна дзеля славы і выгады, каб атрымаць карысць, афішуеш, паказваеш сябе: маўляў, я маю здольнасці, я прыналежу да моцных гэтага свету. У нас такая сітуацыя таксама ёсць: калі хтосьці займаецца крыху лепш, альбо ў кагосьці нябеснае вока бачыць крыху больш ясна, рухі трошкі больш прыгожыя, вось тады ён і пачынае паказваць сябе.

Вось нейкі чалавек аб'яўляе: «Я чуў, як Настаўнік Лі нешта сказаў». І ўсе, вядома, абступаюць яго, каб паслухаць. А ён распавядае — зыходзячы са свайго разумення «дадае галіны ды лісце»[171], пашырае плёткі. З якой мэтай гэта робіцца? Як заўжды — паказаць сябе. Яшчэ бываюць такія, якія распаўсюджваюць афіцыйна непацверджаныя навіны, ён — яму, яна — ёй. Стаіць там і ўзахлёб распавядае, так, нібыта ён добра інфармаваны. У нас столькі вучняў, і ніхто так ясна не разумее, як ён, і ніхто не ведае столькі, колькі ён. Гэта ўжо стала для яго натуральным станам, і, магчыма, ён не ўсведамляе гэтага. Але ў яго падсвядомасці схавана імкненне паказваць сябе, інакш навошта яму распаўсюджваць гэтыя чуткі? Ёсць і такі, які распаўсюджвае інфармацыю, нібыта Настаўнік праз нейкі час вернецца ў горы. Я ж не з гор прыйшоў, у якія горы я вярнуся? Яшчэ нехта кажа, маўляў, у нейкі дзень Настаўнік камусьці нешта казаў, праявіў да кагосьці асаблівае стаўленне. Якая карысць ад распаўсюду гэткіх рэчаў? Аніякай. Аднак мы ўбачылі, што гэта яго навязлівая ідэя, схільнасць паказваць сябе.

Некаторыя просяць мой аўтограф. З якой мэтай? І далей трымаюцца шаблонаў звычайных людзей: пастаў аўтограф, пакінь пра сябе ўспамін. Калі ты не займаешся самаўдасканальваннем, тады навошта табе мой подпіс? Кожны знак у маёй кнізе — гэта мой вобраз, гэта Фалунь, кожная фраза — мая. Навошта табе яшчэ мой подпіс? Нехта думае: калі атрымаю аўтограф, тады мяне будзе абараняць інфармацыя Настаўніка. Зноў «старая песня» пра інфармацыю, мы не надаем увагі аніякай інфармацыі. Дадзеная кніга бясцэнная. Што табе яшчэ трэба? Усё гэта толькі праява тваіх навязлівых ідэяў. Ёсць яшчэ і такія, якія пераймаюць паводзіны вучняў, якія бываюць побач са мной, незалежна ад таго, добрае гэта ці благое. Насамрэч, незалежна ад асобы існуе толькі адзін Закон. Усе мы павінны чыніць згодна з гэтым Дафа — вось сапраўдны крытэр. Ніхто з вучняў, якія бываюць побач са мной, не атрымаў больш за іншых. Яны такія ж самыя, як і астатнія. Яны толькі працаўнікі асацыяцыі, не развівай у сабе гэтых навязлівых ідэяў. Часта, калі ты развіваеш гэткія ідэі, ты ўжо несвядома адыгрываеш ролю руйнавання Дафа. Ты ствараеш сенсацыю, у выніку чаго могуць нават узнікнуць супярэчнасці, гэта можа абудзіць навязлівыя ідэі ў іншых вучняў (бо яны ж спяшаюцца пабыць побач з Настаўнікам, хочуць больш

чагосьці пачуць) ды выклікаць іншыя падобныя інцыдэнты. Хіба ва ўсіх гэтых выпадках не тая ж праблема?

Да чаго яшчэ можа лёгка прывесці схільнасць паказваць сябе? Я навучаю ціґун ужо два гады. Неўзабаве ў некаторых старых вучняў Фалунь Дафа, магчыма, адкрыецца Ґун, іншыя ўступяць у стан паступовага ўсведамлення, раптам увойдуць у паступовае ўсведамленне. Чаму ж тады ў цябе не праяўляюцца гэтыя звышздольнасці? Нельга адразу падымаць цябе да такое вышыні, калі ты зусім яшчэ не пазбавіўся ад многіх ідэяў звычайнага чалавека. Безумоўна, Сіньсін твой стаў ужо нашмат вышэй, але ўсё ж многія навязлівыя ідэі не ліквідаваныя, таму не можам дазволіць табе праяўляць звышздольнасці. Калі ж гэтая стадыя міне, пасля таго як ты стабілізуешся, я адразу падыму цябе да стану паступовага ўсведамлення. У такім стане нябеснае вока адкрыецца на вельмі высокім узроўні, ды яшчэ з'явяцца шматлікія звышздольнасці. Скажу табе, насамрэч, калі ты пачнеш шчыра ўдасканальвацца, тады ў цябе ўжо, магчыма, з'явяцца шматлікія звышздольнасці. Ты ўжо падымешся на такі высокі ўзровень, які і вызначыць наяўнасць гэтых здольнасцяў. У бліжэйшы час у многіх з нас можа з'явіцца такі стан. Ёсць сярод нас яшчэ такія людзі, якія не змогуць дасягнуць высокага ўзроўню ва ўдасканальванні, бо спалучэнне іх маральнае асновы і здольнасці трываць жорстка вызначаныя. Таму ў некаторых людзей ужо на вельмі нізкім узроўні адбудзецца адкрыццё Ґун і адкрыццё ўсведамлення, канчатковае адкрыццё ўсведамлення, з'явяцца такія людзі.

Я сказаў вам гэта для таго, каб вы ні ў якім разе не прынялі такіх людзей, калі яны з'явяцца, за нейкіх незвычайных Прабуджаных. Гэта з'яўляецца вельмі сур'ёзнай праблемай у самаўдасканальванні. І толькі чыніць згодна з Дафа застаецца правільным падыходам. Калі ўбачыш у кагосьці нейкія звышздольнасці, цудатворную сілу альбо яшчэ што-небудзь, не следуй за ім, не слухай яго. Ты можаш нашкодзіць яму — у яго ўзнікне радасць, і ўрэшце ён усё страціць, у яго ўсё закрыецца, і ў выніку ён упадзе ўніз. Тыя, у каго адкрыўся Ґун, таксама падаюць. Тыя, у каго адкрылася ўсведамленне, калі не могуць утрымацца, таксама падаюць. Нават Буды, калі дрэнна сябе кантралююць, падаюць уніз! Дык што ўжо казаць пра цябе — таго, хто ўдасканальваецца сярод звычайных людзей! Таму колькі б звышздольнасцяў у цябе ні праявілася, якія б вялікія яны ні былі, наколькі б моцна ні праяўлялася цудатворная сіла, ты абавязкова павінен трымаць сябе ў руках. Зусім нядаўна некаторыя з нас, седзячы тут, зніклі ды неўзабаве з'явіліся зноў. Менавіта так. Можа праявіцца яшчэ больш моцная цудатворная сіла. Што ты будзеш рабіць у такім выпадку? Калі ў будучыні гэта здарыцца з табой альбо з іншым, ты, як наш вучань і паслядоўнік, не схіляй перад ім галаву і не жадай гэтых рэчаў. Як толькі твае думкі пойдуць у няправільным кірунку, дык адразу ж усё будзе скончана — ты ўпадзеш уніз. Але, магчыма, твой узровень быў нават вышэй, чым у таго чалавека, толькі ў цябе цудатворная сіла яшчэ не праявілася. Прынамсі, ты ўпаў уніз у дадзеным пытанні. Таму звярніце сур'ёзную ўвагу на дадзеную праблему. Я паставіў гэтае пытанне на вельмі важнае месца, бо такое

здарыцца ў бліжэйшы час. Калі гэта аднойчы здарыцца, і ты будзеш дрэнна кантраляваць сябе, тады будзе кепска.

Калі ва ўдасканальвальніка ўзнікае ці адкрываецца Ґун або сапраўды адкрываецца ўсведамленне, яму нельга ў такой сітуацыі лічыць сябе невядома кім. Тое, што ён бачыць, ён бачыць толькі на сваім узроўні. Раз яго ўдасканальванне дайшло да такога этапу, значыць, яго ўсведамленне дайшло да такога ўзроўню, яго стандарт Сіньсін падняўся да такога ўзроўню, значыць, у сваю чаргу дасягнула такога этапу і яго мудрасць. Таму, верагодна, ён не паверыць у рэчы, якія знаходзяцца на больш высокіх узроўнях. Менавіта яго нявер'е прывяло да таго, што тое, што ён убачыў, ён лічыць абсалютным, тым і абмяжоўваецца. Насамрэч, практыкоўцу яшчэ далёка да ісціны, бо яго ўзровень толькі такі.

У часткі людзей Ґун адкрыецца на дадзеным узроўні. Калі б яны і далей удасканальваліся ўгару, тады больш не змаглі б падвысіцца. Таму толькі і застаецца, што адкрыць ім Ґун і ўсведамленне на дадзеным узроўні. З гэтага моманту падчас удасканальвання ў адных з нас адкрыецца ўсведамленне на ўзроўні маленькіх Даа чалавечага свету, у другіх — на розных узроўнях, а ў трэціх — падчас атрымання Паўнапраўнага дасягнення. Найвышэйшым з'яўляецца ўсведамленне падчас атрымання Паўнапраўнага дасягнення. Тады можна бачыць на розных узроўнях і там праяўляцца. Нават тыя, хто дасягае адкрыцця Ґун і ўсведамлення на найніжэйшых узроўнях маленькіх Даа чалавечага свету, таксама змогуць убачыць некаторыя прасторы і некаторых Прабуджаных, мець з імі зносіны. Падчас гэтага табе нельга праяўляць самаздаволенне: тыя, у каго адкрываецца Ґун на ўзроўні маленькіх Даа чалавечага свету, на нізкіх узроўнях, не атрымліваюць Паўнапраўнага дасягнення. Гэта дакладна. Што тады рабіць? Яму прыйдзецца трымацца на гэтым узроўні. Працягнуць сваё ўдасканальванне на больш высокія ўзроўні — гэта справа яго будучыні. Для чаго ўтрымліваць яго ад адкрыцця Ґун, калі ён мог удасканаліцца толькі да такое вышыні? Пастаянна ўдасканальваецца ўгару, аднак падвысіцца не можа. Таму ў яго ўжо адкрываецца Ґун, яго ўдасканальванне ўжо дайшло да канца. З'явіцца шмат такіх людзей. Але ў любым выпадку трэба ўтрымаць пад кантролем свой Сіньсін, бо сапраўды правільным з'яўляецца толькі тое, калі чыніш згодна з Дафа. Усё — і твае звышздольнасці, і адкрыццё ў цябе Ґун — ты атрымаў толькі дзякуючы ўдасканальванню па Дафа. Калі ты будзеш ставіць Дафа на другаснае месца, а сваю цудатворную сілу — на першаснае, альбо, калі ў цябе адкрыецца ўсведамленне, прымеш тое ці іншае сваё пазнанне за абсалютную ісціну, ставячы сябе вышэй за Дафа, тады, на маю думку, ты ўжо пачаў падаць са свайго ўзроўню. Гэта вельмі небяспечна, і чым далей, тым будзе горай. Тады ты сапраўды апынешся ў бядзе. Тваё ўдасканальванне можа аказацца марным, і ты страціш свой узровень. Усё будзе дарэмна.

Скажу вам яшчэ, што змест дадзенае кнігі з'яўляецца спалучэннем майго выкладання Закону на некалькіх курсах. Усё гэта — мае выказванні. Кожнае слова сказаў я. Усё спісана з аўдыякасет. Гэта мае паслядоўнікі, вучні, іерогліф за іерогліфам дапамаглі перапісаць з магнітных стужак мае выступы, потым я раз-пораз уносіў праўкі. Усё гэта мой Закон. Менавіта гэты Закон я і выкладаў.

# ЛЕКЦЫЯ СЁМАЯ

## ПРА ЗАБОЙСТВА ЖЫВЫХ ІСТОТ

Забойства жывых істот — тэма вельмі далікатная. У дачыненні да практыкоўцаў мы маем параўнальна строгія патрабаванні: практыкоўцам нельга забіваць жывых істот. Усім тым, хто займаецца па школе Буды, па школе Даа, па школе Цімэнь альбо яшчэ па нейкіх школах, калі толькі яны ўдасканальваюцца па праведным Законе, нельга забіваць жывых істот. Патрабаванне вельмі катэгарычнае: нікому нельга забіваць жывых істот, і гэта бясспрэчна. З прычыны ўзнікнення каласальных праблемаў пасля забойства, мы мусім пагаварыць пра гэта падрабязна. Пад забойствам у першапачатковым будызме галоўным чынам мелася на ўвазе забойства чалавека, што лічылася найцяжэйшым. Потым сталі даражыць таксама іншымі буйнымі істотамі, буйной свойскай жывёлай альбо жыццём, большым за дробныя жыцці. Чаму ў колах удасканальвальнікаў заўсёды так сур'ёзна ставіліся да забойства жывых істот? У мінулым у будызме казалі, што забітыя жывыя істоты, якім не наканавана было памерці, ператвараюцца ў самотныя душы ды дзікія здані. Раней надавалі вялікае значэнне рытуалу выратавання душ загінулых, які быў накіраваны менавіта на такіх людзей. Калі не правесці для іх гэты рытуал, тады гэтым істотам няма чаго есці ды піць, і яны знаходзяцца ў вельмі гаротным становішчы. Так калісьці лічылася ў будызме.

Мы кажам, што калі хтосьці зрабіў благое іншаму, тады для кампенсацыі ён аддасць апошняму вельмі шмат Дэ. Звычайна гэта тычыцца прыўлашчвання чужых рэчаў і гэтак далей. Але калі раптам перапыніць адно жыццё — ці жывёлы, ці іншае жывое істоты — тады адразу ж можна нажыць велічэзную карму. Раней пад забойствам жывых істот, якое можа стварыць табе вялікую карму, галоўным чынам, мелася на ўвазе забойства чалавека. Але забойства звычайных жывых істотаў таксама стварае даволі вялікую карму. У прыватнасці, як для практыкоўцы, у працэсе ўдасканальвання на розных узроўнях з мэтай падвышэння табе ўсталёўваюць невялікія нягоды. Усё гэта твае ўласныя беды, якія вынікаюць з тваёй уласнай кармы. Яны расстаўленыя на розных узроўнях, каб дазволіць табе падвысіцца. Дастаткова таго, каб ты толькі падвысіў Сіньсін, як ужо зможаш іх прайсці. Але калі адразу будзе дададзена настолькі каласальная карма, тады як ты гэта пройдзеш? Абапіраючыся на свой Сіньсін, табе будзе абсалютна немагчыма гэта прайсці. Тады гэта, верагодна, прывядзе да таго, што ты наогул не зможаш удасканальвацца.

Мы выявілі, што калі чалавек нараджаецца на свет, тады ў прасторах пэўнае сферы гэтага Сусвету адначасова нараджаюцца яго шматлікія падабенствы аднолькавае з ім знешнасці, якія маюць такое ж імя, падобныя паводзіны[172], якіх можна называць складнікамі яго адзінага цэлага. Тады ўзнікае такая праблема: калі раптам загінула адна жывая істота (гэтак жа адбываецца і з жыццём буйное жывёлы), а яе падабенствы ў іншых прасторах яшчэ не прайшлі запланаваны шлях жыцця, яны павінны яшчэ пражыць вельмі шмат гадоў. У такім выпадку памерлая істота застаецца без прытулку, пачынае дрэйфаваць у Космасе. Калісьці казалі пра гэткія самотныя непрыкаяныя душы і дзікія здані, якім няма чаго есці ды піць і якія вельмі пакутуюць. Магчыма, гэта так. Але мы дакладна бачым, што забітая істота знаходзіцца ў вельмі страшным становішчы: ёй давядзецца чакаць і чакаць, каб дачакацца таго моманту, пакуль усе яе падабенствы ў іншых прасторах не пройдуць свой жыццёвы шлях, і толькі пасля гэтага яны ўсе разам змогуць шукаць свой далейшы прытулак. Чым даўжэй цягнецца такое чаканне, тым больш пакутуе істота. І чым больш яна пакутуе, тым больш яна перадае кармы ў цела забойцы, які прычыніў ёй гора. Падумай, наколькі каласальную карму ты сабе дадасі? Усё гэта мы ўбачылі пры дапамозе звышздольнасцяў.

Яшчэ мы ўбачылі такую сітуацыю: калі чалавек нарадзіўся, тады ў пэўнай прасторы ўжо ёсць форма існавання ўсяго яго жыцця, гэта значыць там ужо адзначана, калі і што яму наканавана рабіць. Хто запланаваў усё яго жыццё? Вядома, гэтымі справамі займаюцца вышэйшыя жывыя істоты. Напрыклад, у грамадстве звычайных людзей пасля нараджэння чалавек знаходзіцца ў сям'і, у школе або, калі вырасце, — на прадпрыемстве. Праз сваю працу чалавек наладжвае ўсебаковыя сувязі з грамадствам. Гэта значыць, так распланавана будова цэлага грамадства. Але раптам гэтую жывую істоту забілі насуперак вызначанаму плану — адбыліся змены. Тады тая вышэйшая істота не злітуецца над тым, хто гэта разладзіў. Падумайце, мы, як практыкоўцы, удасканальваемся на высокія ўзроўні. Ці атрымаецца ў чалавека ўдасканальвацца, калі вышэйшая істота не даруе яму? Бываюць такія выпадкі, калі настаўнік нейкага практыкоўцы па ўзроўні ніжэй за вышэйшую істоту, якая плануе ўсё загадзя. Тады нават настаўнік таго чалавека таксама апынецца ў бядзе. Ён будзе выбіты са свайго ўзроўню. Падумай, хіба гэта простая праблема? Таму, раз нехта здзейсніў такі ўчынак, яму будзе вельмі цяжка ўдасканальвацца.

Магчыма, сярод вучняў Фалунь Дафа ёсць тыя, хто змагаўся ў гады вайны. Вайна — гэта стан, які выкліканы вялікімі зменамі цэлых астранамічных з'яў. У гэтым выпадку ты ўсяго толькі «адзін з вінцікаў у тым механізме». Калі б падчас зменаў астранамічных з'яў унізе ніхто б нічога не рабіў, дык гэта ўсё ж такі не змагло б выклікаць у грамадстве звычайных людзей такі стан, а такім чынам, гэта ўжо не называлася б зменамі астранамічных з'яў. Такія падзеі развіваюцца ўслед за больш значнымі зменамі. Нельга рабіць цябе цалкам адказным за ўзнікненне гэтае падзеі. Мы тут гаворым пра карму, якая з'явілася праз забойства дзеля асабістае барацьбы, альбо для задавальнення ўласных інтарэсаў, або калі хтосьці табе чымсьці перашкаджае, і ты, нягледзячы ні на

што, хочаш зрабіць благі ўчынак. Тое, што тычыцца вялікіх зменаў цэлае прасторы, вялікіх зменаў становішча ў грамадстве, не з'яўляецца тваёй інай.

Забойства жывых істотаў стварае велічэзную карму. Тады некаторыя з вас падумалі: «Я дома займаюся прыгатаваннем ежы, а калі мне не дазваляюць забіваць жывых істотаў, тады што есці маёй сям'і»? Такіх канкрэтных пытанняў я не закранаю. Я тут выкладаю Закон практыкоўцам, а не проста гутару са звычайнымі людзьмі пра тое, як трэба жыць. А як трэба рабіць у кожнай канкрэтнай сітуацыі, я параіў бы табе ацэньваць згодна з Дафа: як табе здаецца правільным, так і рабі. Звычайныя людзі як хочуць, так і робяць. Гэта іх справы. Немагчыма, каб усе без выключэння шчыра ўдасканальваліся. А вось патрабаванні, якія прад'яўляюцца да практыкоўцаў, павінны мець высокія крытэры. Таму патрабаванні, прад’яўленыя тут, адрасуюцца практыкоўцам.

Жывыя не толькі людзі ды жывёлы, але і расліны. У іншых прасторах жыццё ўвасабляецца ў любой матэрыі. Калі тваё нябеснае вока адкрыта на ўзроўні бачання вока Закону, ты заўважыш, што камяні, сцены — любыя прадметы — размаўляюць, вітаюцца з табой. Магчыма, некаторыя думаюць: «Што нам рабіць са збажынай, гароднінай, якія таксама з’яўляюцца жывымі?» альбо «Што рабіць, калі дома з’явіліся мухі ды камары? Камары летам кусаюцца нясцерпна. Бачыш, як яны цябе кусаюць, але застаешся нерухомым, а мухі заседжваюць ежу, забруджваючы яе, але забіваць іх зноў-такі нельга». Я вам растлумачу. Нам нельга адвольна і беспадстаўна губіць жывых істот. Аднак мы не можам стаць педантычнымі джэнтльменамі, якія ўвесь час надаюць увагу дробязям і, калі ідуць па дарозе, скачуць, баючыся раздушыць нават мурашак. На маю думку, можна стаміцца ад такога жыцця. Хіба гэта таксама не навязлівая ідэя? Ты перасоўваешся скачкамі, абыходзячы мурашак, аднак ты раздушыў шмат мікраарганізмаў. Бо ў мікраскапічным стане існуюць шматлікія яшчэ больш дробныя жывыя істоты, напрыклад, грыбкі ды бактэрыі. Магчыма, ты многіх з іх раздушыў, але нельга ж адмаўляцца жыць з-за гэтага. Мы не павінны станавіцца такімі, інакш немагчыма будзе ўдасканальвацца. Падчас удасканальвання мы павінны быць велікадушнымі, павінны накіроўваць сваю ўвагу на галоўнае ды асноўнае, удасканальвацца з годнасцю.

Раз мы, людзі, жывем, дык і маем права падтрымліваць сваё жыццё. Такім чынам умовы навакольнага асяроддзя павінны адпавядаць патрэбам чалавечага жыцця. З аднаго боку нам нельга наўмысна шкодзіць жывым істотам, з іншага — нам не трэба быць занадта педантычнымі ў гэтых дробязях. Напрыклад, гародніна ды збажына жывыя, але мы не можам з-за таго, што яны жывыя, нічога не есці ды не піць. Інакш, як удасканальвацца? Трэба глядзець шырэй. Напрыклад, калі ты хадзіў, мурашы ды іншыя насякомыя забеглі табе пад ногі ды былі раздушаныя, значыць, ім, магчыма, было наканавана памерці — бо ты не наўмысна ім шкодзіў. У свеце жывых істот альбо сярод мікраарганізмаў таксама існуе праблема экалагічнае раўнавагі: нястрымнае размнажэнне прывядзе да іх лішку, яны запоўняць усё навокал. Таму мы

прытрымліваемся ўдасканальвання з годнасцю. Калі ў кватэры з'явяцца мухі, камары, мы выганім іх ды паставім на вокны маскітныя сеткі, якія не дазволяць ім залятаць. Часам іх не атрымліваецца выгнаць, тады забілі, дык забілі. У прасторы, дзе жывуць людзі, яны кусаюцца, шкодзяць людзям. Вядома, трэба іх выганяць. Калі іх не атрымліваецца выгнаць, мы не можам дапускаць, каб яны свабодна кусалі. Ты, як практыкоўца, не баішся, бо ты неўспрымальны да хваробаў. Але твае сваякі не практыкуюць і з’яўляюцца звычайнымі людзьмі, якім, як і раней, пагражае заражэнне. Нельга ж стаяць і нічога не рабіць, калі ўбачыў, што камары кусаюць тваіх дзяцей у твар.

Прыводжу прыклад. Ёсць такая гісторыя, якая здарылася з Шак’ямуні ў маладосці. Аднойчы Шак’ямуні захацеў памыцца і загадаў свайму паслядоўніку ачысціць ванну ў лесе. Яго паслядоўнік пайшоў ды ўбачыў, што ў ванне поўна казурак, калі ён ачысціць ванну, дык непазбежна заб’е іх. Ён вярнуўся і сказаў Шак’ямуні: «Па ўсёй ванне поўзаюць казуркі». Шак’ямуні нават не зірнуў на яго, толькі кінуў фразу: «Ну дык пайдзі ды вычысці яе». Паслядоўнік ізноў падышоў да ванны і ўбачыў, што яму няма адкуль пачаць — адзін рух рукой, і казуркі загінуць. Ён зрабіў яшчэ адзін круг, вярнуўшыся да Шак’ямуні зноў: «Найшаноўнейшы Настаўніку, у ванне поўзаюць незлічоныя казуркі. Ад аднаго руху маёй рукі яны загінуць». Шак’ямуні паглядзеў на яго і сказаў: «Я папрасіў цябе пачысціць ванну». Паслядоўнік раптам зразумеў ды адразу ачысціў ванну. Гэта ілюструе такую праблему: мы не можам не мыцца з-за насякомых, шукаць новае жытло з-за камароў, таксама нельга «зацягнуць сабе горла», нічога не есці ды не піць з-за таго, што збажына ды гародніна таксама жывыя. Не. Нам трэба наладзіць гэтую сувязь ды ўдасканальвацца велічна. Мы не шкодзім жывым істотам наўмысна і гэтага ўжо дастаткова. Разам з гэтым чалавек павінен мець сваю жыццёвую прастору ды ўмовы існавання, якія таксама трэба абараніць. Чалавек павінен падтрымліваць сваё жыццё і нармальны побыт.

У мінулым некаторыя псеўдамайстры ціґун сцвярджалі, што першага і пятнаццатага каляндарнага дня штомесяц дазваляецца забойства жывых істот. Іншыя казалі, што можна забіваць жывёлаў з дзвюма нагамі, нібыта двухногія не з’яўляюцца жывымі істотамі. Калі такія паводзіны першага і пятнаццатага дня не лічацца забойствам жывых істотаў, тады як гэта назваць — капаннем зямлі? Псеўдамайстроў ціґун можна цалкам распазнаць па іх словах і паводзінах, па тым, што яны кажуць, за чым гоняцца. Звычайна любы майстар ціґун, які такое кажа, апантаны нячыстым духам. Заўважце, што майстар, апантаны лісой, есць кураціну з такім выглядам, што проста «пажырае, як воўк, заглынае, як тыгр»[173]. Нават костак не жадае выплюнуць.

Забойства жывых істот не толькі стварае вялікую карму, але і закранае пытанне міласэрнасці. Хіба ў нас, удасканальвальнікаў, не павінна быць міласэрнасці? Калі нашая міласэрнасць праяўляецца, мы можам убачыць, што ўсе жывыя істоты пакутуюць. На каго ні зірнеш, усім горка. Будзе такая з'ява.

**ПРА ЎЖЫВАННЕ МЯСА**

Ужыванне мяса таксама з’яўляецца тэмай вельмі далікатнай, аднак ужыванне мяса не азначае забойства жывых істот. Вы вывучаеце Закон ужо столькі часу, але ж мы не патрабуем, каб вы адмовіліся ад мяса. Многія майстры ціґун, як толькі ты прыходзіш на іх курсы, адразу ж папярэджваюць, што з цяперашняга моманту ўжыванне мяса забараняецца. У цябе можа ўзнікнуць думка, што ты яшчэ не гатовы да таго, каб адразу адмовіцца ад мяса. Сёння дома акурат гатуецца тушаная курка, смажаная рыба. Пахне вельмі смачна, але есці нельга. Ва ўдасканальванні ў рэлігіях тое ж самае — прымушаюць не ўжываць мяса. Як правіла, у ціґун школы Буды і ў некаторых ціґун школы Даа таксама так кажуць — мяса есці нельга. Мы не змушаем вас так рабіць, але таксама надаем гэтаму адпаведнае значэнне. Тады які ў нас да гэтага падыход? У нашым метадзе практыкі «Закон выплаўляе чалавека». Метад «Закон выплаўляе чалавека» азначае, што некаторыя станы праяўляюцца з Закону, з Ґун. У практыцы на розных узроўнях праяўляюцца розныя станы. У нейкі дзень альбо сёння пасля маёй лекцыі хтосьці ўвойдзе ў такі стан: ён ужо не зможа есці мяса. Пах мяса для яго стане вельмі смярдзючым. Калі ён яго з'есць, дык захоча ванітаваць. Гэта не тое, што цябе штучна абмяжоўваюць, не дазваляючы есці мяса, альбо тое, што ты сам сябе прымушаеш яго не есці, а гэта ідзе з душы. Калі дасягаеш гэткага ўзроўню, з Ґун адлюстроўваецца тое, што больш не можаш ужываць мяса. Калі нават ты сапраўды праглынеш мяса, дык цябе абавязкова званітуе.

Дасведчаныя вучні ведаюць, што такі стан з'яўляецца падчас удасканальвання па Фалунь Дафа, на розных узроўнях праяўляюцца розныя станы. У некаторых нашых вучняў прага да мяса, гэтая навязлівая ідэя вельмі моцная — звычайна яны могуць яго вельмі шмат з’есці. У той час, калі іншыя адчуваюць у мясе благі пах, яны не адчуваюць гэтага і ўсё яшчэ могуць яго есці. Што зрабіць, каб дазволіць ім адкінуць такую навязлівую ідэю? Няхай яму забаліць жывот, калі ён з'есць мяса, а калі не будзе есці, болю не будзе; калі з'явіцца такі стан, гэта азначае: больш нельга есці мяса. Няўжо з гэтага часу людзі нашае школы разрываюць любыя сувязі з мясам? Зусім не. Які наш падыход? Калі не можаш есці мяса, гэта ідзе сапраўды з душы. Якая мэта? Прымусовая забарона на мясную ежу ва ўдасканальванні ў манастырах і той стан у нашай школе, калі не могуць есці мяса — усё гэта накіравана на тое, каб пазбавіць чалавека ад прагі да мяса і ад адпаведнай навязлівай ідэі.

Некаторыя, калі ў іх талерцы няма мяса, нават не могуць даесці страву — гэта менавіта і з'яўляецца прывязанасцю звычайных людзей. Раніцай, праходзячы міма задняе брамы парка Перамогі ў горадзе Чанчунь, я сустрэў траіх людзей, якія з шумам выйшлі з брамы. Адзін з іх сказаў: «Пра якія практыкаванні ціґун можна казаць, калі нельга есці мяса! Скараці мне жыццё на дзесяць гадоў, дык і тады буду есці мяса!» Вось наколькі моцная ў яго прага. Падумайце, ці не трэба пазбавіцца ад такое прагі? Безумоўна, трэба. Чалавек у ходзе ўдасканальвання

якраз і пазбаўляецца ад усялякіх прывязанасцяў і навязлівых ідэяў. Скажам прама: калі не пазбавішся ад жадання есці мяса, хіба гэта не значыць, што не пазбавіўся ад навязлівай ідэі? Ці можна ў такім разе дасягнуць Поўнае Дасканаласці? Таму, калі толькі ёсць навязлівая ідэя, тады ад яе трэба пазбавіцца. Аднак гэта не значыць, што з гэтага часу ніколі нельга есці мяса. Сама забарона на ўжыванне мяса — не мэта, мэта ў тым, каб не даваць табе мець гэтую навязлівую ідэю. Калі ў той перыяд, у які ты не можаш есці мяса, ты ўстароніш гэтую навязлівую ідэю, тады пасля, верагодна, зноў зможаш яго есці. Пах мяса перастане быць для цябе смярдзючым, а смак — такім агідным. Тады еж яго, і ўсё будзе добра.

Калі ты зноў зможаш есці мяса, у цябе ўжо знікне навязлівая ідэя і прывязанасць да яго. Але станецца вялікая змена. Потым, калі ты зноў будзеш есці мяса, яно ўжо не будзе для цябе смачным. Калі дома гатуюць мясную страву, ты будзеш есці разам з сям'ёй. Калі не, дык ты нават не згадаеш пра гэта. З'явіцца стан, калі табе падасца, што мяса страціла смак. Аднак удасканальвацца сярод звычайных людзей — справа вельмі цяжкая: калі дома ўвесь час гатуюць мяса, з часам, яно зноў можа падацца табе смачным. Можа здарыцца рэцыдыў, ва ўсім працэсе ўдасканальвання такі рэцыдыў будзе паўтарацца шматкроць. Раптам ты зноў не зможаш есці мяса, не зможаш, дык не еж. Ты сапраўды не зможаш есці мяса. Калі з’ясі, дык цябе званітуе. Калі ж ты зноў зможаш есці мяса, дык еж. Скарыся натуральнай плыні рэчаў. Пытанне не ў тым, ужываць мяса ці не. Ключ у тым, каб пазбавіцца ад гэтай навязлівай ідэі.

У нашай школе Фалунь Дафа людзі прасоўваюцца параўнальна хутка. Калі толькі ты будзеш падвышаць свой Сіньсін, тады кожны ўзровень будзеш прарываць даволі хутка. Некаторыя і так былі не вельмі ахвочымі да мяса. Ім было абыякава, ёсць яно ці няма. У такіх людзей прага да мяса пройдзе хутка, праз адзін-два тыдні. У іншых працэс прадоўжыцца месяц, два, тры месяцы, магчыма, паўгады, максімум — год. Яны зноў змогуць есці мяса за выключэннем надзвычай асаблівых абставін. Бо мяса ўжо стала неад’емнай часткай рацыёну чалавека. Аднак тым, хто прафесійна ўдасканальваецца ў манастырах, нельга есці мяса.

Пагаворым пра тое, як будыйская рэлігія ставіцца да ўжывання мяса. У самым пачатку будыйскае рэлігіі не ўстрымліваліся ад мяса. Калі Шак’ямуні вёў вучняў займацца пакутлівым удасканальваннем у лесе, наогул не існавала запаведзі пра адмову ад мясное ежы. Чаму не было такое запаведзі? Гэта таму, што, калі Шак’ямуні займаўся перадачай Закону дзве тысячы пяцьсот гадоў таму, чалавечае грамадства знаходзілася на вельмі адсталым узроўні: у адных месцах існавала сельская гаспадарка, а ў многіх іншых раёнах яе яшчэ не было, ворнай зямлі было мала, з краю ў край распасціраліся лясы. Не хапала збажыны, яе было вельмі мала. Людзі, якія зусім нядаўна выйшлі з першабытнага грамадства, жылі, галоўным чынам, за кошт палявання, у многіх

месцах мяса было галоўнай ежай. Каб максімальна пазбавіць людзей ад навязлівых ідэяў, Шак’ямуні не дазваляў мець справу з грашыма, маёмасцю і падобнымі рэчамі; ён вадзіў сваіх вучняў прасіць ежу, збіраць міласціну. Што людзі давалі, тое яны і елі, бо ўдасканальвальнікі не мелі магчымасці выбіраць ежу, а ў ежы, якую ім давалі, магло быць і мяса.

Але ў першапачатковым будызме існавала версія пра ўстрыманне ад забароненай ежы[174]. Такая версія ўзята з першапачатковае будыйскае рэлігіі, і толькі цяпер за забароненую ежу прымаецца мяса. Насамрэч жа ў самым пачатку пад забароненай ежай мелася на ўвазе не мяса, а цыбуля, імбір, часнок ды іншае. Чаму тады іх прымалі за забароненую ежу? Цяпер многія манахі ўжо не могуць гэтага растлумачыць, бо яны не займаюцца шчырым удасканальваннем ды шмат чаго не ведаюць. Тое, што перадаваў у свой час Шак’ямуні, можна было звесці да «Запаведзі, Медытацыі, Мудрасці». Запаведзь азначае адмову ад усіх жаданняў звычайных людзей; Медытацыя азначае, што практыкоўца ўдасканальваецца, седзячы ў медытацыі ў поўным трансе, — яму трэба цалкам увайсці ў медытацыю. Усё, што магло перашкодзіць уваходжанню ў спакой, што магло адмоўна паўплываць на ўдасканальванне, разглядалі як сур'ёзную перашкоду. Тыя, хто з'еў цыбулю, імбір, часнок, выдыхалі моцны непрыемны пах. У той час манахі сядзелі ў медытацыі ў лесе альбо ў пячорах, яны ўсаджваліся ў кола па сем-восем чалавек. Той, хто з'еў гэтыя прадукты, выдзяляў рэзкі непрыемны пах. Гэтым ён перашкаджаў іншым увайсці ў медытацыю, сур'ёзна перашкаджаў практыцы. Гэтыя прадукты разглядалі як забароненую ежу, а ўстрыманне ад іх стала адной з запаведзяў. Гэты непрыемны пах вельмі агідны для многіх жывых істотаў, якія спараджаюцца ў чалавечым целе шляхам удасканальвання. Цыбуля, імбір ды часнок яшчэ могуць стымуляваць у чалавека з'яўленне прагі — калі іх шмат есці, дык можна да іх прыахвоціцца, таму іх разглядалі як забароненую ежу.

Раней многія манахі, якія дасягнулі вельмі высокіх узроўняў і набылі стан адкрытага альбо напаўадкрытага Ґун, ведалі, што тыя запаведзі, якіх прытрымліваешся ў ходзе ўдасканальвання, з’яўляюцца неістотнымі. Калі пазбавіўся ад навязлівай ідэі, тады тая матэрыя сама па сабе не будзе адыгрываць аніякае ролі, а насамрэч чалавеку перашкаджае менавіта тая ідэя. Таму многія вышэйшыя манахі многіх стагоддзяў убачылі, што праблема ўжывання мяса для людзей не з'яўляецца ключавым пытаннем. Ключ у тым, ці можаш ты пазбавіцца ад адпаведнай ідэі. Калі не маеш навязлівай ідэі, можна есці любую ежу, абы можна было запоўніць страўнік. Удасканальванне ў манастырах заўжды праходзіць такім чынам, з чым многія ўжо звыкліся. Больш за тое, гэтая праблема стала ўжо не адным толькі пытаннем запаведзі, яна ўжо ўваходзіць у правілы ды распарадак манастыроў, дзе катэгарычна забараняюць есці мяса, людзі ўжо прызвычаіліся так удасканальвацца. Пагаворым пра манаха Дзіґуна[175], якога ў літаратуры апісваюць як манаха, які не выконваў запаведзь пра ўстрыманне ад мяса, што вылучае яго сярод іншых. А насамрэч, калі Дзіґуна выгналі з манастыра Ліньіньсы, пытанне ежы стала для яго дужа надзённай праблемай — настаў крытычны момант для яго выжывання. Каб

запоўніць страўнік, ён еў усё, што траплялася, абы не застацца галодным, у яго не было аніякае прывязанасці да якой-небудзь ежы, яму было абыякава, што есці. Дасягнуўшы свайго ўзроўню ва ўдасканальванні, ён разумеў гэты прынцып. Насамрэч Дзіґун еў мяса выпадкова, толькі аднойчы ці двойчы. Пісьменнік зацікавіўся, калі сустрэў тэму пра тое, як манах есць мяса. Бо чым больш дзіўная тэма, тым больш яна прывабіць чытачоў. Літаратурны твор, спароджаны жыццём, выходзіць за рамкі жыцця; так і быў створаны гэты вобраз. Насамрэч, калі ў цябе сапраўды атрымаецца пазбавіцца ад той навязлівай ідэі, тады ўсё адно, што есці, абы не застацца галодным.

У Паўднёва-Усходняй Азіі ці на поўдні Кітая, у раёне абедзвюх правінцыяў Ґуан — Ґуандун і Ґуансі — некаторыя будысты, якія не прынялі пастрыжэння, не кажуць, што яны ўдасканальваюцца ў Буду, быццам бы выраз «удасканальванне ў Буду» занадта старамодны. Яны называюць сябе вегетарыянцамі, якія посцяць. Значыць, яны маюць на ўвазе, што ўдасканальваюцца ў Буду шляхам вегетарыянства. Такія свецкія будысты лічаць удасканальванне ў Буду чымсьці настолькі прымітыўным. Хіба аднаго вегетарыянства ўжо дастаткова, каб удасканаліцца ў Буду? Як вам вядома, жаданне есці мяса — толькі адна з навязлівых ідэяў, прывязанасцяў чалавека. Вегетарыянства паказвае на тое, што ты ўстараніў толькі адну такую навязлівую ідэю. Апроч яе, у чалавека існуюць разнастайныя душэўныя заганы, напрыклад, зайздрасць, імкненне да суперніцтва і барацьбы, пачуццё радасці, схільнасць паказваць сябе ды іншае. Імкненняў і жаданняў у чалавека вялікая колькасць. Каб дасягнуць Поўнае Дасканаласці, неабходна пазбавіцца ад усіх душэўных прывязанасцяў, жаданняў. Хіба пазбавіўшыся толькі ад адное прагі да мяса, можаш удасканаліцца ў Буду? Такое сцвярджэнне памылковае.

Трэба пазбавіцца ад прагі не толькі да мяса, але і да любое іншае ежы. Гэтак жа і з іншымі харчовымі прадуктамі. «Я люблю ласавацца вось гэтым», — заяўляюць некаторыя. Але ж гэта таксама праява навязлівай ідэі. Удасканальвальнікі па дасягненні вызначанае ступені не маюць такой навязлівай ідэі. Вядома, мы выкладаем Закон на даволі высокім узроўні, пераплятаючы розныя ўзроўні, вы не ў сілах адразу дасягнуць гэтага. Ты кажаш, што любіш ласавацца менавіта чымсьці. Але прыйдзе час, калі ты павінен адкінуць гэтую навязлівую ідэю, і ты ўжо не зможаш гэта есці. Калі з'ясі, дык смак будзе ўжо не такі, а, магчыма, які-небудзь іншы. Калі я працаваў на прадпрыемстве, ядальня пры ім увесь час зведвала страты і, урэшце, зачынілася. Супрацоўнікі сталі браць ежу з сабой на працу. Прыгатаванне ранкам якой-небудзь ежы вельмі клапотнае, бо тады ты дужа заняты тым, што збіраешся на працу. Часам я куплю па дзве паравыя булачкі ды па порцыі тофу пад соевым соусам. Калі разважаць лагічна, настолькі поснае, мабыць, ужываць можна, але ўвесь час гэта есці таксама не дазваляецца. Гэта таксама навязлівая ідэя, ад якое трэба пазбавіцца. Як толькі зірнеш на тофу, дык зробяць так, што ў тваім страўніку выдзеліцца кіслата, і ты страціш апетыт да яго. Гэта з'яўляецца прыкметай таго, што асцерагаюцца, як бы ў цябе не

нарадзілася навязлівая ідэя. Вядома, каб такое мела месца, трэба дасягнуць ва ўдасканальванні пэўнае ступені. Калі толькі пачынаеш, такога не бывае.

У школе Буды забараняюць ужываць алкаголь. Ці ты бачыў, каб хтосьці з Будаў падымаў гарлач віна? Не. Я распавядаў пра стан, калі не можаш есці мяса. Падчас удасканальвання сярод звычайных людзей, пасля таго як ты пазбавішся ад навязлівай ідэі, яго можна будзе есці, праблемы не будзе. Аднак аднойчы кінуўшы піць, больш не пі ніколі. Хіба ў целе практыкоўцы не існуе паўсюль Ґун? Ґун разнастайных формаў. Ёсць некаторыя звышздольнасці, якія могуць праявіцца на паверхні твайго цела. Усе яны чыстыя. Калі вып'еш, усе такога кшталту здольнасці адразу ж пакінуць тваё цела. Імгненна ў тваім целе нічога не застанецца, бо ўсе яны не зносяць паху спірту. Ты заразіўся звычкай, ад якое вельмі цяжка пазбавіцца. Ужываючы алкаголь, чалавек духоўна дэградуе. А чаму ў некаторых школах удасканальвання Вялікага Даа патрабуецца піць віно? Таму, што яны не ўдасканальваюць сваю галоўную душу. Гэта робіцца, каб задурманьваць галоўную душу.

Некаторыя зусім не ўяўляюць свайго жыцця без спіртнога; іншыя напіваюцца; трэція да таго дапіліся, што ўжо атручаныя алкаголем, нават абедаць не пачынаюць[176], калі не выпілі — не піць яны ўжо не могуць. Нам жа, практыкоўцам, нельга такімі быць. Ужыванне алкаголю, бясспрэчна, выклікае прывыканне. Гэта ж прага. Гэта стымулюе людскія нервы, якія адказваюць за прывыканне, — чым больш п’еш, тым мацней становіцца шкодная звычка. Падумайце, ці не трэба нам, практыкоўцам, пазбавіцца ад такой навязлівай ідэі? Вядома, трэба ад яе пазбавіцца. Нехта падумае: «Не! Так не гадзіцца. Я працую на прыёмах ды святкаваннях», — альбо, — «Я спецыялізуюся на бізнес-кантактах з гандлёвымі агентамі. Без выпіўкі цяжка весці бізнес». На маю думку, наўрад ці гэта так. Як правіла, калі вядуцца бізнес-перамовы, асабліва, калі маеш справу з замежнікамі, кожны замаўляе сабе напой: адзін — мінеральную ваду, іншы — куфаль піва. Ніхто цябе не прымусіць піць спіртныя напоі. Ты п'еш тое, што ты сам замовіў. Колькі хочаш, столькі п'еш. Асабліва гэта назіраецца сярод інтэлігенцыі. Часта гэта так.

Курэнне — гэта таксама навязлівая ідэя. Некаторыя кажуць, што курэнне бадзёрыць. На маю думку, такое сцвярджэнне — самападман і падман іншых. Бывае, калі чалавек стамляецца ад працы альбо напісання чагосьці[177] ды хоча трошкі адпачыць, тады ён паліць, яму здаецца, ён узбадзёрыўся ад курэння. А насамрэч гэта не так. Гэта таму, што ён зрабіў перадышку. Думка чалавека можа ствараць хібнае адчуванне, можа нават выклікаць ілюзію. З цягам часу можа сфармавацца такое ўяўленне, з'явілася такое зманлівае адчуванне, быццам курэнне дадало табе бадзёрасці. Насамрэч курэнне не адыгрывае такое ролі. Курэнне не прыносіць аніякае карысці для здароўя чалавека. Пры роспалаці трупа курца, які паліў доўгі час, бачна, што ў яго і трахея, і лёгкія чорныя.

Хіба мы, практыкоўцы, не кажам пра ачышчэнне цела? Мы бесперастанку ачышчаем яго, бесперапынна ўдасканальваемся, імкнучыся да высокіх узроўняў, а ты наадварот забруджваеш свой арганізм. Твае дзеянні прама супрацьлеглыя нашым. Апроч таго, гэта таксама моцная прага. Некаторыя курцы ведаюць, што курыць шкодна, ды толькі не могуць кінуць. Насамрэч, скажу я вам, што калі чалавекам не кіруюць правільныя думкі, і ён вось проста так захоча кінуць курыць, дык гэта будзе не так лёгка. Як удасканальвальнік, паспрабуй сёння пазбавіцца ад курэння як ад навязлівай ідэі ды паглядзі, ці зможаш кінуць. Я раю вам з гэтага моманту кінуць паліць, калі сапраўды хочаце ўдасканальвацца; я гарантую, што вы даб’яцеся гэтага. У зале, дзе праходзяць нашыя курсы, ніхто не згадаў пра тое, каб пакурыць. Ты абавязкова кінеш курыць, калі толькі маеш такое жаданне. Ізноў запаліш, і смак будзе ўжо не той[178]. Калі будзеш чытаць дадзеную лекцыю маёй кнігі, тады будзе такі ж самы эфект. Вядома, калі не жадаеш удасканальвацца, тады мы больш не будзем умешвацца ў твае справы. Я лічу, што ты, як удасканальвальнік, павінен кінуць курыць. Я прыводзіў такі прыклад: ці бачыў ты, каб нехта з Будаў ці Даосаў сядзеў з цыгарэтай у роце? Як такое можа быць? Якая ў цябе, як удасканальвальніка, мэта? Хіба табе не трэба кінуць курыць? Таму я і кажу: калі хочаш удасканальвацца — кінь паліць, курэнне шкодзіць твайму здароўю. Больш за тое, яно само з’яўляецца адной з прывязанасцяў і супярэчыць патрабаванням, якія прад’яўляюцца да нас, удасканальвальнікаў.

## ЗАЙЗДРАСЦЬ

Падчас пропаведзі Закону я часта закранаю тэму зайздрасці. Чаму? Таму што зайздрасць у Кітаі праяўляецца надзвычай люта — да такое меры, што яна стала натуральнай, а ты сам яе нават не адчуваеш. Чаму ж у кітайцаў настолькі вялікая зайздрасць? Гэта мае свае вытокі. У мінулым кітайцы зведалі даволі глыбокі ўплыў канфуцыянства і па тэмпераменце ў асноўным з'яўляюцца інтравертамі. Калі мы сярдуем, тады гэтага не паказваем, калі радуемся — таксама. Кітайцы надаюць вялікае значэнне стрыманасці ды цярплівасці. Раз людзі з гэтым ужо звыкліся, ва ўсёй нашай нацыі сфармаваўся вельмі інтравертаваны тэмперамент. Вядома, такі характар мае свой станоўчы бок — ты адораны, але не афішуеш гэтага. Але адначасова ён мае і недалікі: можа прывесці да кепскага стану. Асабліва ў Канцавы перыяд Закону гэты негатыўны бок праяўляецца настолькі моцна, што можа развіваць у людзях зайздрасць. Калі ў кагосьці сталася радасная падзея, і ён гэта паказаў, тады іншыя адразу пачынаюць страшэнна зайздросціць. Калі хто-небудзь на прадпрыемстве альбо дзесьці яшчэ атрымаў прэмію, атрымаў нязначную выгаду, тады ён, вярнуўшыся назад, не асмельваецца нават абмовіцца пра гэта. Бо калі іншыя даведаюцца пра гэта, яны страцяць душэўную раўнавагу. Людзі на Захадзе называюць такую псіхалогію «ўсходняй зайздрасцю» альбо «азіяцкай зайздрасцю». Уся Азія знаходзіцца пад параўнальна глыбокім уплывам

канфуцыянства Кітая, на ўсіх ляжыць гэты адбітак, але даволі інтэнсіўна гэта праяўляецца выключна ў нашым Кітаі.

Гэта мае пэўную сувязь з ідэяй абсалютнай роўнасці, якую ўкаранялі раней: калі неба абрынецца, усё адно ўсе памруць разам; будзе выгада — падзелім яе пароўну; калі прыйдзе час падвысіць зарплату на некалькі адсоткаў, тады ўсім падвысіць аднолькава. Можа падацца, што такія думкі слушныя — усе роўныя. А насамрэч, як усе могуць быць роўнымі? У кожнага свая праца, і кожны працуе з рознай стараннасцю. У нашым Сусвеце існуе яшчэ такі прынцып: «Не страціш — не атрымаеш. Калі атрымліваеш, тады страціш». Сярод звычайных людзей кажуць так: хто не працуе, той не есць; хто больш працуе, той больш атрымае; хто менш працуе, той менш атрымае; хто больш аддае, той і павінен больш атрымаць. Раней, калі панавала ідэя абсалютнай роўнасці, казалі, што ад нараджэння ўсе людзі аднолькавыя, што гэта далейшае жыццё іх змяніла. На маю думку, такое сцвярджэнне занадта катэгарычнае. Калі нешта занадта катэгарычнае, дык яно хібнае. Чаму людзі ад нараджэння адрозніваюцца па полу? Чаму маюць розную знешнасць? Некаторыя ад нараджэння з'яўляюцца хворымі, выродлівымі, словам, яны не аднолькавыя. На высокім узроўні мы бачым, што ў іншай прасторы бачна ўсё жыццё чалавека. Хіба можа яно быць ва ўсіх аднолькавым? Усе хочуць быць роўнымі. Як ты будзеш роўным з іншымі, калі гэта не наканавана? Людзі не роўныя.

У заходніх краінах людзі па тэмпераменце ў асноўным з’яўляюцца экстравертамі. Калі чалавек радуецца альбо сярдуе — усё бачна, як на далоні. Такі тэмперамент мае свае перавагі, але мае і недалікі — нястрыманасць[179]. Праз розніцу ў падыходзе двух тэмпераментаў адзін і той жа ўчынак мае розны эфект. Возьмем хаця б Кітай. Калі начальнік хваліць каго-небудзь ці заахвочвае, тады іншыя адразу ж губляюць душэўную раўнавагу. Калі ты атрымаў крыху больш прэміяльных, крадком хаваеш іх у кішэню, каб іншыя не даведаліся. Зараз нават узорным працаўнікам быць несалодка: «Ты ўзорны працаўнік, ты малайчына. Ты мусіш раней за іншых прыходзіць на працу і пазней сыходзіць з яе. Ты працуеш добра, а мы нікчэмныя, дык чаму б табе не выканаць усю працу самому?», — з такога ўедліва глумяцца[180]. Часта нават цяжка быць добрым чалавекам.

А калі гэта мае месца за мяжой, дык гэта выглядае зусім інакш. Скажам, гаспадар бачыць, што чалавек сёння добра працаваў, і вырашыў выдаць яму больш прэміяльных. Той з радасцю пералічвае грошы перад усімі: «Ого, колькі грошай мне даў сёння гаспадар!» — перабірае пальцамі купюры, радасна пра гэта ўсім распавядае. У яго з прычыны гэтага не будзе дрэнных наступстваў. А ў Кітаі, калі нехта атрымае больш прэміяльных, дык нават кіраўнік загадае яму пахутчэй схаваць грошы, каб іншыя не ўбачылі. За мяжой, калі дзіця атрымлівае ў школе сто балаў, яно бяжыць, падскокваючы, са школы дамоў з радасным крыкам: «Я атрымаў сёння сто, атрымаў сто!» — і так усю дарогу дадому. Суседзі адчыняюць дзверы, каб крыкнуць: «Гэй, Томе! Цудоўна, малы!»

Іншыя адчыняюць вокны: «Гэй, Джэку! Малайчына!». Калі б гэта здарылася ў Кітаі — бяда. «Я атрымаў сто, я атрымаў сто!» — з гэтым крыкам дзіця бяжыць са школы дамоў. Дзверы дома яшчэ нават не адчынілі, а ўжо даносіцца лаянка: «Што тут такога! І што такога, што атрымаў сто? Чаго ты фанабэрышся? Хто не атрымліваў сто?!» З гэтых двух розных уяўленняў нараджаюцца розныя вынікі. Такое ўяўленне можа выклікаць у чалавека зайздрасць: іншыя намагаюцца стаць лепш, а ты не радуешся за іх, а губляеш душэўную раўнавагу. Вось да якое праблемы гэта прыводзіць.

Ідэя абсалютнай роўнасці, якую ўкаранялі ў папярэднія гады, проста-такі знявечыла чалавечыя ідэі ды ўяўленні. Прывяду канкрэтны прыклад. Чалавек працуе на прадпрыемстве. Ён адчувае, што іншыя ва ўсім яму саступаюць: чым бы ён ні займаўся, з усім управіцца, сапраўды, малайчына. Ён думае пра сябе: «Калі прызначаць мяне дырэктарам фабрыкі, я і тады ўпраўлюся. Магу заняць больш высокую пасаду, думаю, у мяне б атрымалася, нават, калі б мяне прызначылі прэм'ер-міністрам». Кіраўнік, магчыма, таксама лічыць яго выдатным і што ён упраўляецца з усім. Калегі, магчыма, таксама кажуць, што гэты чалавек надзвычай здольны і таленавіты. Аднак у іх брыгадзе або ў той самай канторы, дзе яны працуюць, ёсць такі чалавек, які ні да чаго не здольны, нічога не ўмее. Але аднойчы не гэтага, першага, а няўмеку падвысілі да менеджара, прычым ён стаў нават яго кіраўніком. Тады той чалавек адразу страціў душэўную раўнавагу, стаў звяртацца і да кіраўніцтва, і да супрацоўнікаў па пратэкцыю[181], поўны абурэння ды страшэннае зайздрасці.

Я вам растлумачу недасяжны для звычайных людзей прынцып: ты лічыш сябе здольным да ўсяго, але не суджана табе гэтым заняцца. Ён чалавек няздольны, але гэта яму лёсам наканавана, і ён стаў кіраўніком. Што б ні думалі звычайныя людзі — гэта думкі звычайных людзей. З пункту гледжання вышэйшых жывых істотаў, развіццё чалавечага грамадства ўсяго толькі ідзе па спецыяльна вызначанай заканамернасці, і чым табе займацца ў жыцці — гэта яны табе плануюць ужо ніяк не згодна з тваімі здольнасцямі. Будызм тлумачыць гэта пачарговай кармічнай адплатай, гэта значыць яны гэта табе плануюць у адпаведнасці з тваёй кармай. Няхай нават здольнасці ў цябе даволі вялікія, але калі ты не маеш Дэ, дык, магчыма, за ўсё жыццё ты нічога не будзеш мець. Ты лічыш, што ён ні да чаго не здольны, але ў яго шмат Дэ, і ён заняў высокую пасаду, дужа разбагацеў. Звычайныя людзі не бачаць гэтага, таму ім увесь час здаецца, што яны павінны займацца тым, да чаго здольныя. З прычыны гэтага яны змагаюцца ўсё жыццё, і душа іх зведвае моцныя раны. Яны адчуваюць гора, стомленасць і пастаянны душэўны дысбаланс, ядуць без апетыту, дрэнна спяць, пачуваюцца прыгнечана. І ў старасці маюць падарванае здароўе, у выніку чаго праяўляюцца якія заўгодна хваробы.

Тады мы, удасканальвальнікі, тым больш не павінны так рабіць. Мы скараемся натуральнай плыні рэчаў: тое, што павінна быць тваім, не згубіш, а таго, што не наканавана табе лёсам, не заваюеш. Вядома, гэта не з'яўляецца абсалютным.

Калі б усё было такім абсалютным, тады не існавала б пытання пра здзяйсненне чалавекам благіх учынкаў, іншымі словамі, тут могуць існаваць некаторыя няўстойлівыя чыннікі. Аднак пра нас, практыкоўцаў, звычайна клапоцяцца Целы Закону Настаўніка. Іншым не ўдасца забраць у цябе тваё. Таму мы скараемся натуральнай плыні рэчаў. Часам здаецца, што нейкая рэч — твая, іншыя таксама так сцвярджаюць, а насамрэч яна не твая. Ты, магчыма, ужо прымаеш яе за сваю, але ўрэшце аказалася, што яна не твая. І па гэтым бачна, ці зможаш ты адпусціць. Калі не зможаш, значыць, гэта і ёсць акурат навязлівая ідэя, і тады і трэба будзе такім спосабам устараніць у цябе гэтае імкненне абараняць свае інтарэсы. Вось сутнасць праблемы. З прычыны таго, што звычайныя людзі не могуць усвядоміць гэтага прынцыпу, калі на кану стаяць іх інтарэсы, яны змагаюцца з іншымі.

Зайздрасць сярод звычайных людзей праяўляецца надзвычай люта, і ў колах удасканальвальнікаў яна таксама спрадвеку была даволі прыкметнай. Розныя плыні ціґун не мірацца адна з іншай. Твой ціґун, маўляў, добры альбо яго ціґун добры — ад пят да галоў абмаўляюць. На маю думку, усе гэтыя плыні знаходзяцца на адным узроўні — узроўні ацалення ды аздараўлення. Большасць ціґуністаў, якія канкуруюць паміж сабой, носяць у сабе хаатычны Ґун, прынесены нячыстым духам, такія людзі не звяртаюць увагі на Сіньсін. Нехта практыкаваў больш за дваццаць гадоў, але не здабыў аніякіх звышздольнасцяў, а іншы, як толькі пачаў практыкаваць, дык у яго ўжо праявіліся звышздольнасці. Даведаўшыся пра гэта, першы страціў душэўную раўнавагу: «Я практыкую больш за дваццаць гадоў, і ніякіх звышздольнасцяў. Гэта ў яго звышздольнасці? Якія гэта ў яго звышздольнасці? — ён моцна разлютаваўся. — Гэта праява “выбліску ды вар'яцтва”, ён апантаны нячыстым духам!» Калі адзін майстар ціґун праводзіў курсы, нейкі чалавек сядзеў у залі ды, грэбуючы, выказваў сваю нязгоду з пачутым: «Глянь, які майстар ціґун! Я нават слухаць не хачу тое, што ён распавядае». Той майстар, магчыма, сапраўды чытае лекцыю горш за яго, але ж ён чытае тое, што прыналежыць да яго ўласнае школы. А гэты чалавек вучыцца ўсяму, што патрапіцца, у яго куча сертыфікатаў аб заканчэнні курсаў. Які б майстар ні праводзіў курсы, ён ва ўсіх удзельнічае. Сапраўды ведае шмат, нават больш за таго майстра ціґун. Але якая ад гэтага карысць? Усе яго веды прыналежаць да катэгорыі ацалення ды аздараўлення. Чым больш ён ведае, тым больш блытанымі ды складанымі становяцца інфармацыі ў яго арганізме, тым цяжэй яму ўдасканальвацца. Атрымліваецца поўная блытаніна. У сапраўдным удасканальванні поўнасцю засяроджваюцца на адной школе, што гарантуе ад любых адхіленняў. Сярод шчырых удасканальвальнікаў па Даа такое таксама праяўляецца. Яны не хочуць прымірыцца адно з адным, і калі яны не пазбавіліся ад імкнення да суперніцтва і барацьбы, дык у іх таксама можа ўзнікнуць зайздрасць.

Прыгадайма класічны сюжэт. На думку Шэнь Ґунбаў[182] з раману «Пасвячэнне ў Багі»[183], Дзян Цзыя[184] і стары, і не мае талентаў. Але Вялікі настаўнік Юаньшы Т’еньцзунь[185] прызначыў Дзян Цзыя праводзіць рытуал пасвячэння ў Багі. Шэнь Ґунбаў адразу страціў душэўную раўнавагу: «Чаму вы менавіта яго прызначылі

праводзіць пасвячэнне ў Багі? Паглядзіце, які я, Шэнь Ґунбаў, магутны. Нават калі адцяць маю галаву, я магу паставіць яе зноў на месца. Чаму вы не загадалі выконваць пасвячэнне ў Багі мне?» У яго была страшэнная зайздрасць, і ён увесь час ладзіў падседы супраць Дзян Цзыя.

У эпоху Шак'ямуні першапачатковы будызм прызнаваў існаванне звышздольнасцяў, але ў сучасным будызме ніхто не смее згадваць пра іх. Калі ты згадаеш пра іх, тады людзі скажуць, што ў цябе «выбліск ды вар'яцтва». Якія там здольнасці? Зусім іх не прызнаюць. Чаму так? Сучасныя манахі зусім не ведаюць у чым справа. У Шак'ямуні было дзесяць старшых вучняў, сярод якіх ён назваў Маўдґальяяну найлепшым у цудатворнай сіле. У Шак'ямуні меліся і вучаніцы, сярод якіх Упалавана, якая была таксама найлепшай у цудатворнай сіле. Пасля пранікнення будызму ў Кітай здарылася тое ж самае. На працягу многіх стагоддзяў з'явілася мноства манахаў высокага ўзроўню. Калі Бадгідгарма рухаўся да Кітая, ён пераправіўся праз раку Янцзы на адной сцябліне трыснягу. Аднак потым, па меры развіцця гісторыі, цудатворную сілу ўсё больш выцяснялі. Галоўнай прычынай было тое, што старшы манах, галоўны манах, настаяцель і гэтак далей — усе яны не абавязкова мелі добрую маральную аснову. Хаця ён і стаў настаяцелем, старшым манахам, гэта не больш чым пасада сярод звычайных людзей. Ён таксама чалавек, які ўдасканальваецца, проста ён зрабіў гэта сваёй прафесіяй. Ты не пастрыгся ў манахі, але таксама ўдасканальваешся, з'яўляешся аматарам. Ці атрымаецца дасягнуць дасканаласці — гэта залежыць толькі ад выпраўлення думак чалавека, гэта для ўсіх аднолькава, не дапускаецца нават найменшага адхілення. А вось малодшы манах, які распальвае агонь і гатуе ежу, не абавязкова прыналежыць да людзей з малой маральнай асновай. Чым больш манашак трывае нягодаў, тым больш верагодным для яго становіцца адкрыццё Ґун, а чым больш раскашуе старшы манах, тым адкрыццё Ґун для яго з'яўляецца менш верагодным, бо тут існуе пытанне пераўтварэння кармы. Малодшы манах увесь час адчувае цяжар працы і стому, дзякуючы чаму хутка пагасіць сваю карму і дасягне адкрыцця Ґун. Хто ведае, магчыма, у нейкі дзень ён раптам даб'ецца адкрыцця Ґун. Пасля адкрыцця Ґун, усведамлення або дасягнення напаўадкрытага ўсведамлення ў яго і з'явіцца цудатворная сіла. Усе манахі манастыра звяртаюцца да яго па парады, усе схіляюцца перад ім. І настаяцель не можа стрываць гэтага: «Як жа мне цяпер быць настаяцелем? Што гэта ў яго за адкрыццё ўсведамлення! У яго проста "выбліск ды вар'яцтва". Выгнаць яго!». І яго выгналі. З цягам часу ў мясцовасцях, населеных ханьцамі, ніхто з будыстаў не асмельваўся гаварыць пра здольнасці. У свой час жыў манах Дзіґун з магутнымі здольнасцямі: ён мог перанесці бярвенні з гор Эмэйшань[186], выцягваючы іх адно за адным з калодзежа. Але ўрэшце яго выгналі з манастыра Лінъіньсы.

Праблема зайздрасці — вельмі крытычная, бо яна непасрэдна тычыцца таго, ці можам мы дасягнуць Поўнае Дасканаласці. Без пазбаўлення ад зайздрасці ўсё, што дасягнута ва ўдасканальванні, вельмі крохкае. Тут прадугледжана наступнае: калі ў сваім удасканальванні ты не пазбавішся ад зайздрасці, дык не

атрымаеш Паўнапраўнага дасягнення. Немагчыма атрымаць. Раней вы, магчыма, чулі, што Буда Амітабга сказаў, што з кармай можна перанарадзіцца ў Свет Найвышэйшага Шчасця. Але без пазбаўлення ад зайздрасці гэта ніяк не дазваляецца. Калі ў іншых аспектах трохі не адпавядаеш патрабаванням, і, маючы дробязную карму, пераўвасобішся ў целе Буды, каб далей удасканальвацца, тады, магчыма, усё ж дазволяць. Але калі чалавек не пазбавіўся ад зайздрасці, гэта катэгарычна забаронена. Сёння я кажу практыкоўцам: не зацінайся ў сваіх хібных уяўленнях. Мэта, якой ты жадаеш дасягнуць — удасканальванне на яшчэ больш высокія ўзроўні. Зайздрасць абавязкова трэба адкінуць. Таму мы і выклалі гэтае пытанне асобна.

## ПРА ЛЕКАВАННЕ ХВАРОБАЎ

Я кажу пра лекаванне хваробаў не для таго, каб навучыць цябе лекаванню. Нікому са шчырых паслядоўнікаў Фалунь Дафа не дазваляецца лекаваць хворых. Ледзь ты пачнеш лекаваць, маё Цела Закону забярэ назад усе рэчы Фалунь Дафа, якія ты маеш у сваім целе. Чаму мы ставімся да гэтага пытання настолькі сурова? Бо гэта з'ява, якая шкодзіць Дафа. Я ўжо маўчу пра тое, што лекаванне хворых знявечыць тваё ўласнае здароўе. У некаторых людзей, як толькі ім удасца кагосьці вылекаваць, ажно рукі свярбяць — каго б ні сустрэлі, цягнуць яго да сябе палекаваць, паказваюць сябе. Хіба гэта не навязлівая ідэя? Яна сур'ёзна замінае людзям удасканальвацца.

Шмат псеўдамайстроў ціґун, ухапіўшыся за псіхалогію звычайных людзей, якія хочуць пры дапамозе ціґун лекаваць хворых, сталі вучыць іх гэтаму. Яны кажуць, што выпраменьванне ці можа лекаваць захворванні. Хіба гэта не смяхоцце? Ты маеш ці, іншы таксама мае ці! Няўжо, выпраменіўшы ці, ты палекаваў іншага? Хто ведае, магчыма, яго ці палекуе цябе. Адзін ці не аказвае ўплыву на іншы. Калі чалавек удасканальваецца на высокіх узроўнях, у яго ўзнікае Ґун, які з'яўляецца рэчывам высокай энергіі, якая сапраўды можа вылекаваць, стрымаць хваробу, але не ў сілах выкараніць яе. Такім чынам, каб сапраўды вылекаваць хваробу, трэба мець звышздольнасці. Толькі тады яе можна будзе канчаткова вылекаваць. Для лекавання кожнага віду хваробы прызначана пэўная звышздольнасць. Я сказаў бы, што для лекавання захворванняў існуе больш за тысячу звышздольнасцяў: колькі існуе відаў хваробаў, столькі ж і відаў звышздольнасцяў, прызначаных для іх лекавання. Калі ты не маеш гэтае здольнасці, тады, як бы ўмела ты ні лекаваў, гэта не спрацуе.

У апошнія гады некаторыя людзі ўнеслі хаос у колы ўдасканальвальнікаў. Хто ж з тых майстроў ціґун, якія выйшлі ў людзі ацаляць ды аздараўляць іншых ды праклалі шлях для распаўсюду ціґун, вучыць людзей лекаваць іншых? Усе яны толькі самі ацалялі цябе альбо навучалі, як удасканальвацца, як гартаваць свой арганізм, перадавалі табе метад практыкі, а далей ты шляхам практыкаванняў

ацаляўся. Потым з’явіліся псеўдамайстры ціґун, якія стварылі нездаровую атмасферу. Тыя, хто хоча лекаваць, прывабяць нячыстага духа. Гэта неадменна так. У той сітуацыі былі майстры ціґун, якія лекавалі хворых. Гэта рабілася для таго, каб адпавядаць тагачасным астранамічным з'явам. Але гэта не тэхніка звычайных людзей, і яе нельга было пакінуць ім назаўжды. Гэта было выклікана тагачаснымі зменамі астранамічных з'яў, было прадуктам толькі таго перыяду. Пазней пачалося наўмыснае навучанне людзей лекаванню іншых, што ўжо з'яўляецца брыдотай. Няўжо звычайнаму чалавеку дастаткова трох-пяці дзён, каб ужо стаць здольным лекаваць іншых? Некаторыя кажуць: «Я здольны вылекаваць тую і гэтую хваробу». Я табе кажу: такія людзі апантаныя нячыстым духам. Ці ведаеш ты, што за стварэнне ляжыць ніцма на тваёй спіне? Ты апантаны нячыстым духам, але сам гэтага не адчуваеш, не ведаеш. Табе гэта здаецца цудоўным, здаецца, што ты здольны.

Сапраўдныя майстры ціґун могуць дасягнуць такое мэты толькі праз шматгадовае цяжкае ўдасканальванне. Падумай, калі ты лекуеш хворага, хіба маеш настолькі магутныя звышздольнасці, каб пазбавіць яго ад кармы? Ты атрымаў ад кагосьці сапраўдную перадачу? Хіба праз два-тры дні заняткаў ты стаў здольны лекаваць іншых? Няўжо ты можаш рукамі звычайнага чалавека лекаваць іншых? Тыя псеўдамайстры ціґун ухапіліся за тваё слабае месца, за навязлівую ідэю чалавека. Ты гонішся за здольнасцю лекаваць? Выдатна. Яны зладзяць курсы навучання лекаванню, дзе наўмысна навучаць цябе лекавальным прыёмам: нейкаму «ўколу з паветрам», метаду «светлавога лекавання», метаду «выкіду ці» ды «папаўнення ці», нейкім там «ударам па акупунктурных кропках», так званаму «схопліванню ў жменю». Назваў там вельмі шмат. Мэта — вымантачыць у цябе грошы.

Пагаворым пра «схопліванне ў жменю». Мы бачым наступную акалічнасць. Чаму чалавек хварэе? Карэннай прычынай яго захворванняў ды ўсіх няшчасцяў з'яўляецца карма, поле чорнае матэрыі. Яно прыналежыць да рэчаў з прыродай інь, да дрэнных рэчаў. А благія разумныя істоты таксама маюць прыроду інь. Усе яны прыналежаць да чорных, адпаведна могуць увайсці ў тое месца, такое асяроддзе ім пасуе. Яны з'яўляюцца карэннай прычынай захворванняў у людзей, самай галоўнай крыніцай з’яўлення захворванняў. Вядома, існуюць яшчэ дзве формы: адна з іх — вельмі-вельмі дробныя істоты ў высокай канцэнтрацыі, накшталт згусткаў кармы, а таксама форма транспартавання таго, што накапілі продкі, пры дапамозе нечага падобнага да трубы (такое трапляецца даволі рэдка). Бывае і такое.

Пагаворым пра хваробы, якія сустракаюцца найчасцей. Скажам, у чалавека з'явілася пухліна, недзе здарылася запаленне, дзесьці назіраецца разрастанне касцявога рэчыва і гэтак далей. У іншай прасторы дакладна ў гэтым месцы знаходзіцца дух — у вельмі глыбокай прасторы прысутнічае дух. Звычайныя майстры ціґун гэтага не бачаць, і пры дапамозе звычайных звышздольнасцяў таксама не бачна. Яны бачаць толькі чорны ці ў целе чалавека. Дзе чорны ці,

там і хвароба. Гэта слушна. Аднак чорны ці не з'яўляецца карэннай прычынай з’яўлення хваробы. Справа ў тым, што ў яшчэ больш глыбокай прасторы прысутнічае такая істота, якая і выпраменьвае гэтае поле. Некаторыя кажуць пра выкід, спусканне чорнага ці. Дык тады здзейсні выкід ці! Не паспее прайсці крыху больш за хвіліну, як ён з'явіцца зноў. Некаторыя падобныя істоты вельмі магутныя. Як толькі ці будзе выкінуты, дык яна адразу ж збярэ яго назад. Яны здольныя збіраць ці назад, у выніку чаго вылекаваць чалавека не атрымліваецца.

На думку экстрасэнсаў, у тым месцы прысутнічае чорны ці, які яны лічаць хваробатворным. Кітайская медыцына тлумачыць хваробу тым, што там затор у канале — затрымка ці ды крыві, засмечванне мерыдыянаў. Еўрапейская ж медыцына лічыць, што там утварылася язва, пухліна, разрастанне касцявога рэчыва або запаленне і да таго падобныя праявы — такая форма адлюстравання тых духаў у нашай прасторы. Калі ты ўстароніш тое стварэнне, тады ўбачыш, што на гэтым баку ў фізічным целе хворага ўсё знікла: і выпінанне міжпазваночных дыскаў, і разрастанне касцявога рэчыва. Калі ты ўстароніш тую істоту ды выдаліш тое поле, дык убачыш, што адразу ўсё нармалізуецца. На рэнтгенаўскім здымку ўбачыш, што аніякага разрастання касцявога рэчыва ўжо няма, карэнная прычына захворвання ў тым, што дзейнічае тое стварэнне.

Некаторыя кажуць, што навучаць цябе лекаваць за тры або пяць дзён, навучаць цябе «схопліванню ў жменю». Ану, схапі, а я на гэта пагляджу! Чалавек — слабейшы за ўсіх, а тая істота надзвычай лютая. Ёй падпарадкаваны твой галаўны мозг, яна раз-пораз пацяшаецца з цябе і цалкам у стане вельмі проста забраць у цябе жыццё. Ты кажаш, што схопіш яе. Як ты гэта зробіш? Сваёй рукой звычайнага чалавека ты не дакранешся да гэтага стварэння. Ты там хаатычна махаеш рукой, а яно не звяртае на цябе ўвагі. Магчыма, яно яшчэ смяецца з цябе. Ты паўсюль адвольна хапаеш рукой паветра — гэта вельмі смешна. Калі ты сапраўды зможаш дакрануцца да гэтае пачвары, яна імгненна раніць тваю руку! Гэта будзе сапраўднае раненне! Калісьці я аглядаў аднаго хворага: рукі ў яго нармальныя; пасля разнастайных клінічных абследаванняў было выяўлена, што чалавек здаровы, і абедзве рукі нармальныя, тым не менш, ён ніяк не мог падняць рук, рукі так і звісалі. Нават такога хворага я сустрэў. Яго цела, якое знаходзіцца ў іншай прасторы, было пашкоджанае, ён ужо быў сапраўдным калекам. Як жа не быць калекам, калі тое яго цела ўжо параненае? Нехта мяне запытвае: «Настаўніку, ці магу я практыкаваць? Мяне стэрылізавалі» альбо «...мне нешта выдалілі». Я растлумачыў, што ўсё гэта не паўплывае на практыку, бо тое тваё цела, якое знаходзіцца ў іншай прасторы, не закранула аперацыя, а ў практыцы галоўную ролю адыгрывае менавіта тое цела. Таму, як я толькі што сказаў, калі ты паспрабуеш схапіць тую істоту, але не дакранешся да яе, тады яна не зверне на цябе ўвагі. А калі ты дакранешся да яе, тады, верагодна, яна параніць тваю руку.

Каб падтрымаць буйнамаштабную дзейнасць дзяржавы ў галіне ціґун, я прывёў некалькіх сваіх вучняў для ўдзелу ў Выставах здароўя Усходу, якія ладзіліся ў Пекіне. На абедзвюх выставах мы вылучаліся больш за ўсіх. На першай выставе нашаму Фалунь Дафа надалі пачэснае званне «зорная школа ціґун» сярод школаў ціґун. На другой выставе да нас прыйшло столькі людзей, што мы проста не маглі даць рады. Ля іншых стэндаў народу было замала, а вакол нас збіраўся суцэльны натоўп. Было тры чаргі: першая чарга запісвалася на ранішні прыём; другая чарга чакала, каб запісацца на прыём пасля абеду; трэцяя чакала майго аўтографа. Мы не лекуем захворванняў, тады навошта ўдзельнічаць у выставах? Мы падтрымалі буйнамаштабную дзейнасць дзяржавы ў галіне ціґун, зрабілі свой унёсак у гэтую справу. Такім чынам мы прынялі ў гэтым удзел.

Я раздзяліў свой Ґун паміж паслядоўнікамі, якіх узяў з сабой — кожнаму па порцыі. Гэта былі энергетычныя згусткі, якія складаліся з больш чым ста звышздольнасцяў, з'яднаных разам. Такім спосабам я шчыльна закрыў іх рукі, але нават у такім выпадку ў некаторых рукі былі ўкушаныя, укушаныя да пухіроў, да крывацёку. І такое бывала вельмі часта! Вось наколькі лютыя тыя стварэнні. Падумай, у цябе рукі звычайнага чалавека, і ты адважышся яго чапаць? Табе не ўдасца яго схапіць, у цябе няма такіх звышздольнасцяў. Як толькі захочаш што-небудзь рабіць, як толькі ў цябе ў галаве мільгане думка пра тое, як яго злавіць, у іншай прасторы яно ўжо пра ўсё даведалася і даўно ўцякло. Калі хворы выйдзе ад цябе за дзверы, яно адразу вернецца да яго, і хвароба зноў праявіцца. Каб утаймаваць яго, патрэбны такі від звышздольнасці, які дазволіць, толькі працягнуўшы руку, — «Плясь!» — прымусіць кагосьці замерці на месцы. Пасля таго як тое стварэнне замрэ, можна звярнуцца да іншае звышздольнасці, якая ў мінулым называлася «Вялікім метадам вымання душы»; гэтая здольнасць яшчэ больш магутная, і з яе дапамогай можна выхапіць з цела ўсю душу чалавека, у выніку чаго чалавек імгненна страчвае магчымасць рухацца. Тая здольнасць выкарыстоўваецца з пэўнай мэтай. І мы накіроўваем гэтую звышздольнасць менавіта на тое, каб схапіць тое стварэнне. Як вам вядома, у руцэ Буды Татгаґаты была чаша[187]. Варта яму было толькі адбіць ёй святло на Караля Малпаў Сунь Укуна, як той, хоць і быў велізарным, імгненна стаў велічынёй з кропачку. Гэтая здольнасць адыгрывае менавіта такую ролю. Якой бы вялікай ці малой ні была гэтая істота, яна стане вельмі маленькай і будзе схопленай у тваю жменю.

Апроч таго, нельга ж увесці руку непасрэдна ў плоць хворага, каб вырваць з цела тую істоту. Гэта парушыла б мысленне звычайных людзей у грамадстве. Катэгарычна забаронена так рабіць. Нават калі той, хто лекуе, здольны да гэтага. Ён уводзіць у цела хворага руку іншае прасторы. Скажам, у чалавека хворае сэрца. Калі гэтая рука цягнецца ў напрамку месца, дзе ў чалавека знаходзіцца сэрца, тады рука іншае прасторы ўжо ўвайшла ўнутр. Пасля таго як у адно імгненне яна вельмі хутка схопіць тую істоту, твая знешняя рука сцісне кулак, і абедзве рукі злучацца разам. Тая істота ўжо схопленая ў тваёй руцэ. Яна вельмі лютая. Часам яна супраціўляецца ў тваім кулаку, свідруе, часам

кусаецца, нават крычыць! У руцэ яна падаецца маленькай, але калі ты раскрыеш руку, яна можа стаць велізарнай. Гэта не так, што кожны ў стане яе чапаць. Не маючы таго віду здольнасці, наогул не зможаш гэтага зрабіць. Гэта зусім не так проста, як людзі ўяўляюць.

Вядома, у будучыні такой форме ціґунтэрапіі, магчыма, дазволяць існаваць. У мінулым яна заўсёды існавала. Але неадменна мусіць быць выкананая ўмова: той чалавек павінен быць удасканальвальнікам. У працэсе ўдасканальвання чалавек праяўляе міласэрнасць, дык дапушчальна, каб ён рабіў гэта для малое колькасці добрых людзей. Аднак ён не здольны цалкам пазбавіць іншага ад кармы з прычыны недастатковага Вэй Дэ. Такім чынам нягоды яшчэ застануцца, хоць канкрэтная хвароба ўжо вылекаваная. Звычайны майстрык ціґун не прыналежыць да тых, хто спасціг Даа ва ўдасканальванні. Ён здольны толькі адсунуць чалавеку захворванне ў будучыню; можа яго трансфармаваць; а можа ператварыць у іншае бедства. Аднак ён сам, магчыма, і не ведае пра адсоўванне захворвання. Калі дадзены метад практыкі ўдасканальвае дапаможную свядомасць, значыць, гэта здзяйсняе яна. Ціґуністы некаторых метадаў практыкі быццам бы славутыя. Велізарная колькасць знакамітых майстроў ціґун не маюць Ґун. Увесь іх Ґун захоўваецца ў дапаможнай свядомасці. Такім чынам, ім у ходзе ўдасканальвання дазваляецца так рабіць. Паколькі некаторыя людзі знаходзяцца на гэтым узроўні працяглы час (яны выконваюць практыкаванні, не выходзячы за межы гэтага ўзроўню па некалькі гадоў, па некалькі дзясяткаў гадоў), дык усё сваё жыццё ўвесь час лекуюць ды лекуюць людзей. З прычыны таго, што яны затрымліваюцца на гэтым узроўні, ім дазваляюць так рабіць. Паслядоўнікам жа Фалунь Дафа катэгарычна забараняецца лекаваць іншых. Прачытай хвораму гэтую кнігу, і калі той зможа яе прыняць, тады зможа быць вылекаваны. Але ў людзей з рознай велічынёй кармы вынікі таксама будуць розныя.

## КЛІНІЧНАЕ ЛЕКАВАННЕ І ЦІҐУНТЭРАПІЯ

Пагаворым на тэму ўзаемасувязі паміж клінічным лекаваннем і ціґунтэрапіяй. Некаторыя дактары еўрапейскае медыцыны не прызнаюць ціґун, і такія, можна сказаць, складаюць большасць. Яны разумеюць пытанне так: «Калі ваш ціґун можа лекаваць, навошта існуюць нашыя лякарні? Замяніце іх! Як добра было б, калі б ваш ціґун змог замяніць нашыя лякарні. У ціґунтэрапіі патрэбныя толькі адны рукі, усё абыдзецца без ін'екцыяў, глытання лекаў ды шпіталізацыі; хіба не было б цудоўна, калі б вы нас замянілі?!» Такія развагі не маюць падставы і вельмі неразумныя. Некаторыя не цямяць у ціґун. Па сутнасці, ціґунтэрапію нельга выкарыстоўваць гэтак жа, як лекавальныя прыёмы звычайных людзей. Гэта не тэхніка звычайных людзей, а рэч звышнатуральная. Дык хіба можна такое дазволіць, каб звышнатуральная справа ў вялікіх маштабах стварала перашкоды грамадству звычайных людзей? Здольнасці Буды каласальныя: аднаго ўзмаху яго рукі было б дастаткова, каб пазбавіць ад хваробаў усё

чалавецтва. Але чаму ён гэтага не робіць? Больш за тое, Будаў вельмі шмат, чаму ж яны не праявяць міласэрнасць ды не пазбавяць цябе ад захворванняў? Грамадства звычайных людзей менавіта такое: знаходзіцца ў стане нараджэння-старасці-хваробаў-смерці, што мае цыклічную сувязь. Усё гэта мае прычынную сувязь, усё гэта пачарговая кармічная адплата. Раз ты нешта завінаваціў, значыць, мусіш гэта вярнуць.

Калі ты вылекуеш кагосьці, значыць, парушыш гэты прынцып. Атрымліваецца, усім можна рабіць дрэнныя справы і не трэба за іх расплачвацца. Хіба можа быць такое дазволена? Калі падчас самаўдасканальвання ты праяўляеш міласэрнасць, тады, калі ты не маеш такое вялікае сілы, каб канчаткова вырашыць дадзеную праблему, табе дазваляюць лекаваць. Раз ты праяўляеш міласэрнасць, дазваляюць табе так рабіць. Але калі ты сапраўды здольны вырашыць дадзеную праблему ды шырокамаштабна гэта рабіць, тады такое ўжо забаронена. У такім выпадку ты б моцна парушыў стан грамадства звычайных людзей, таму гэта не дазваляецца. Такім чынам, замена лякарняў звычайных людзей ціґун катэгарычна забароненая. Ціґун — гэта звышнатуральны метад.

Вось калі б у Кітаі былі створаныя ціґунскія лякарні (дапусцім, было б дазволена так зрабіць), і ўсе вялікія майстры ціґун за гэта б узяліся, тады, паглядзі, якую б форму гэта набыло? Гэта не дазваляецца, бо трэба захаваць стан грамадства звычайных людзей. Калі стварыць ціґунскія лякарні, ціґунскія паліклінікі, цэнтры аздараўлення, санаторна-курортныя цэнтры, як толькі гэта будзе зроблена, дык эфект лекавання майстрамі ціґун адразу рэзка паніжэе[188], адразу перастане быць ранейшым. Чаму? Таму што гэтыя майстры створаць рэч звычайных людзей, а значыць, яна павінна будзе мець такую ж вышыню, як Закон звычайных людзей, і быць на адным узроўні са станам звычайных людзей. Эфект лекавання ў іх мусіць быць такім жа, як і ў звычайнай лякарні. Таму вылекаваць людзей ужо не атрымліваецца, і майстры ціґун пачнуць распавядаць дзівацтва кшталту «лекаванне патрабуе некалькіх тэрапеўтычных курсаў». Часта так і бывае.

Незалежна ад таго, створаць ціґунскія лякарні ці не, ціґун здольны лекаваць людзей, і гэтага факту ніхто не можа перакрэсліць. Ціґун распаўсюджваецца ў грамадстве ўжо столькі часу, і такая колькасць людзей шляхам заняткаў ціґун сапраўды дасягнула пазбаўлення ад хваробаў ды ўмацавання здароўя. Магчыма, майстры ціґун адклалі іх хваробу на будучыню, а магчыма, тут дзейнічае нешта іншае, ва ўсякім разе, захворванне цяпер адсутнічае. Тое, што ціґун можа лекаваць захворванні, ніхто не можа закрэсліць[189]. Большасць з тых, хто звяртаецца да майстроў ціґун па дапамогу, мае захворванні, якія цяжка вылекаваць, якія не вылекавалі ў лякарнях. Яны прыйшлі да майстроў ціґун выпрабаваць лёс, і былі вылекаваныя. Ніхто б не звярнуўся да майстроў ціґун, калі б мог вылекавацца ў лякарні, асабліва спачатку ўсе людзі так гэта разумеюць. Усё ж ціґун можа лекаваць. Толькі гэта нельга рабіць так, як

робяцца іншыя справы ў грамадстве звычайных людзей. Яго буйнамаштабнае выкарыстанне абсалютна не дазваляецца. Калі ўсё робіцца, не падымаючы шуму, у малых маштабах, альбо калі няма занадта вялікага ўплыву на грамадства, тады гэта дазваляецца. Але так немагчыма канчаткова вылекаваць хваробу, і гэта дакладна. Лепш за ўсё самому выгнаць свае хваробы з дапамогай практыкаванняў ціґун.

Некаторыя майстры ціґун кажуць: «У лякарнях не могуць вылекаваць чалавека. Лекавальны эфект у лякарнях зараз невялікі...» Што мы пра гэта скажам? Вядома, тут існуе мноства прычын. Асноўная, на маю думку, палягае ў заняпадзе маральнага ўзроўню чалавецтва, што і спараджае разнастайныя дзіўныя хваробы, якія лякарні не вылекваюць, і на якія выкарыстанне лекаў не дзейнічае. Ды яшчэ з'явілася мноства лекаў-падробак. Усё гэта плады таго, што самі людзі да такое меры сапсавалі грамадства. Няхай ніхто не абвінавачвае ў гэтым іншых, бо кожны адыгрываў ролю падкідвання дроваў у агонь[190], таму кожны падчас удасканальвання сутыкаецца з пакутамі.

Бываюць хваробы, якія падчас клінічнага абследавання ў лякарнях не могуць дыягнаставаць, хаця чалавек насамрэч хворы. Няхай нават абследаванне пацвердзіла наяўнасць захворванняў, усё адно немагчыма даведацца, як іх назваць. Гэта хваробы, з якімі ніколі раней не сутыкаліся і якія ў лякарнях агулам называюць «сучаснымі хваробамі». Ці могуць у лякарнях вылекаваць людзей? Вядома, могуць. Інакш, чаму людзі давяраюць ім ды ідуць туды лекавацца? У клініках усё ж могуць вылекаваць захворванні, толькі метады іх лекавання прыналежаць да катэгорыі грамадства звычайных людзей, а вось тыя захворванні з'яўляюцца звышнатуральнымі. Некаторыя хваробы надзвычай сур'ёзныя, таму ў лякарнях кажуць, што калі нехта захварэў, дык яго трэба лекаваць на ранняй стадыі. Калі хвароба развілася, тады яны ўжо будуць не ў стане яе вылекаваць, а ад павелічэння дозы лекаў чалавек атруціцца. Цяперашні ўзровень медыцыны менавіта такі, як і наш навукова-тэхнічны ўзровень, — і тое, і іншае знаходзіцца на ўзроўні звычайных людзей. Таму медыцына мае толькі такі лекавальны эфект. Тут трэба патлумачыць вось што: звычайна ціґунтэрапія ды клінічнае лекаванне проста адсоўваюць карэнную прычыну захворвання на будучыню, на другую палову жыцця або на тое, што будзе далей, але карма застаецца ніяк незакранутай.

Далей мы пагаворым пра кітайскую медыцыну. Лекаванне ў кітайскай медыцыне вельмі блізкае да ціґунтэрапіі. У старажытным Кітаі лекары ў асноўным мелі экстрасэнсорныя здольнасці. Вялікія лекары кітайскае медыцыны, такія як Сунь Сымя́ў[191], Хўа То[192], Лі Шыджэнь[193], Б'ень Цю́э[194] ды іншыя былі экстрасэнсамі. Пра ўсё гэта існуюць запісы ў медычных трактатах. Аднак такія найкаштоўнейшыя рэчы цяпер часта падвяргаюцца крытыцы, сучасная кітайская медыцына ўспадкавала ўсяго толькі рэцэпты альбо, так бы мовіць, досвед спробаў ды памылак. У старажытным Кітаі медыцына была неверагодна развітая. Яе ўзровень перавышаў узровень цяперашняе

медыцыны. Хтосьці з вас падумаў: «Але ж цяперашняя медыцына вельмі развітая: пры дапамозе кампутарнага тамографа можна ўбачыць вантробы чалавека, у дадатак ёсць яшчэ ўльтрагукавая дыягностыка, флюараграфія, рэнтгенаўскія здымкі». Сучаснае абсталяванне вельмі перадавое, але, на маю думку, яно ўсё адно саступае медыцыне старажытнага Кітая.

Хўа То ўбачыў пухліну ў галаве Цаў Цаў ды прапанаваў яму ўскрыць чэрап, каб правесці аперацыю па выдаленні пухліны. Пачуўшы гэта, Цаў Цаў падумаў, што Хўа То мае намер адсекчы яму галаву, і загадаў пасадзіць Хўа То ў турму, дзе той памёр. Калі ў Цаў Цаў здарыўся рэцыдыў хваробы, ён згадаў пра Хўа То і загадаў яго выклікаць, але Хўа То ўжо не было ў жывых. Пазней Цаў Цаў сапраўды памёр ад гэтае хваробы. Адкуль Хўа То даведаўся? Ён убачыў хваробу. Гэта нашая чалавечая экстрасэнсорная здольнасць, і ўсе вялікія медыкі мінулага мелі такое ўменне. Пасля адкрыцця нябеснага вока можна з аднаго боку адначасова бачыць профілі чатырох розных бакоў чалавечага цела, гэта значыць адначасова бачыць усе чатыры бакі чалавечага цела — спераду можна бачыць задні, левы, правы бок. Яшчэ можна бачыць асобна слой за слоем, можна ўбачыць карэнную прычыну захворвання скрозь гэтую прастору. Хіба пры дапамозе цяперашніх медычных сродкаў можна гэтага дабіцца? Ім надта далёка да гэтага. Каб такое стала магчымым, павінна мінуць, мабыць, яшчэ тысяча гадоў! Пры дапамозе кампутарнага тамографа, ультрагукавое дыягностыкі, рэнтгенаўскіх прамянёў можна ўбачыць вантробы чалавека, але гэтае абсталяванне даволі грувасткае: усё гэта немагчыма насіць з сабой. Ды яшчэ яно не працуе без электраэнергіі. А нябеснае вока заўсёды з табой, куды б ты ні пайшоў, і электраэнергія не патрэбная. Як тое можа параўнацца з ім?!

Некаторыя хваляць сучасныя лекі. А я паставіў бы гэта пад сумнеў. У старажытным Кітаі лекі на аснове зёлак сапраўды маглі імгненна вылекаваць хваробы. Вельмі шмат чаго было забыта; а вельмі шмат не было забыта і распаўсюджана ў народзе. Калі я праводзіў курсы ў горадзе Ціцігар[195], дык убачыў латочнікаў, адзін з якіх выдаляў людзям зубы. Адразу было бачна, што ён паўднёвец: адзеты быў не так, як жыхар паўночна-ўсходніх раёнаў. Ён быў рады кожнаму — выдаляў зубы ўсім, хто да яго звяртаўся. Ля яго была цэлая кучка выдаленых зубоў. У яго была мэта не зубы выдаляць, а прадаць сваю мікстуру, ад якой ішла вельмі густая жоўтая пара. Перад выдаленнем зуба ён адчыняў накрыўку пляшачкі, мясціў пляшачку звонку шчакі пацыента насупраць сапсаванага зуба ды загадваў хвораму некалькі разоў усмактаць жоўтую пару мікстуры, якая пры гэтым амаль не расходавалася. Потым зачыняў пляшачку ды клаў побач. Затым вымаў з кішэні запалку і, распавядаючы мінакам пра дзеянне сваёй мікстуры, адначасова падсякаў запалкай зуб, і той выпадаў. І гэта адбывалася безбалесна. На дзяснах заставаўся невялікі крывяны прожылак, але кроў не цякла. Падумайце толькі: ад крыху большага высілку запалка можа зламацца, а той чалавек падсякаў ёй зуб, і зуб выпадаў.

Я казаў, што ў Кітаі некаторыя рэчы распаўсюджаныя ў народзе. Прычым ім саступаюць найноўшыя прылады заходняе медыцыны. Прааналізуйма, чый вынік лепшы: чалавек падкалупнуў запалкай, і зуб выпаў. А калі лекар еўрапейскае медыцыны хоча выдаліць камусьці зуб, тады, перш за ўсё, ён мусіць зрабіць анестэзію. Робіць укол тут, там. Гэта вельмі балюча. Калі абязбольвальны сродак падзейнічае, лекар пачынае выдаленне зуба абцугамі. Праца займае шмат часу, а корань зуба яшчэ можа зламацца ды застацца ў дзясне. Тады лекар бярэ вялікі малаток і зубіла, каб выкалупаць яго. Ён так дзяўбе, што ў чалавека ажно душа ў пятках апынаецца, а потым свідруе пры дапамозе дакладных прыладаў. Некаторыя ажно падскокваюць ад гэтага свідравання — вельмі балюча, у роце шмат крыві, даводзіцца яе час ад часу сплёўваць. Скажы, які метад лепшы? Які больш перадавы? Нельга глядзець павярхоўна, толькі на інструменты, трэба глядзець на эфект. Старажытная кітайская медыцына была вельмі развітая. Колькі б гадоў яшчэ ні мінула, сучаснай еўрапейскай медыцыне яе не дагнаць.

Старажытная кітайская навука адрозніваецца ад сучаснае навукі, якую пераянялі з Захаду. Яна ішла іншым шляхам і магла прывесці да іншага стану. Таму нельга спазнаваць старажытную кітайскую навуку і тэхніку, выкарыстоўваючы наш цяперашні метад пазнання, бо старажытная кітайская навука была накіраваная непасрэдна на даследаванне чалавечага цела, жыцця, Сусвету і, значыць, ішла іншым шляхам. Навучэнцы таго часу павінны былі знацца на сядзенні ў медытацыі, падчас сядзення надавалася ўвага паставе. Калі хтосьці браў у рукі пэндзаль, ён мусіў звяртаць увагу на накіроўванне ці, дыханне. Людзі ва ўсіх сферах дзейнасці ачышчалі свае намеры, рэгулявалі дыханне. Цэлае грамадства знаходзілася ў такім стане.

Хтосьці з вас запытаўся: «Калі б мы пайшлі па шляху старажытнае кітайскае навукі, тады хіба маглі б з'явіцца цяперашнія аўтамашыны, цягнікі? Хіба маглі б з'явіцца сённяшнія тэхналогіі?» Мой адказ: табе нельга спрабаваць спазнаць іншы стан развіцця з пазіцыі гэтага асяроддзя, у тваіх думках ды ўяўленнях павінна адбыцца рэвалюцыя. Няма тэлевізара, але ў самога чалавека ў пярэдняй частцы галавы была б падобная рэч: што ты хацеў бы ўбачыць, тое б і ўбачыў. Ды яшчэ меў бы звышздольнасці. Не існавала б цягнікоў, аўтамашын, але людзі, седзячы, змаглі б плаўна ўзняцца ў паветра, нават ліфт бы не спатрэбіўся. Тая навука прывяла б да іншага стану развіцця грамадства. Не абавязкова абмяжоўвацца гэтымі рамкамі. Лятучыя талеркі іншапланецянаў прылятаюць і адлятаюць з казачнай хуткасцю, могуць павялічвацца ды памяншацца. Іх накірунак развіцця яшчэ больш адрозны ад нашага. У іх іншыя навуковыя метады.

# ЛЕКЦЫЯ ВОСЬМАЯ

## БІҐУ

Нехта з вас закрануў пытанне біґу. Такая з'ява, як біґу, існуе, яна сустракаецца не толькі ў колах удасканальвальнікаў, але і ва ўсім нашым чалавечым грамадстве ёсць нямала людзей, у якіх з'явіўся такі стан. Некаторыя на працягу некалькіх гадоў, а часам нават больш за дзесяць гадоў, не ядуць, не п'юць, але, нягледзячы на гэта, цудоўна жывуць. Адны падаюць біґу як дасягненне пэўнага ўзроўню; іншыя разглядаюць яго як праяву ачышчэння цела; трэція лічаць, што гэта працэс удасканальвання на высокім узроўні.

Па сутнасці, усё гэта не тое. Тады ў чым справа? Адмова ад ужывання ежы фактычна з'яўляецца асаблівым метадам удасканальвання, які выкарыстоўваецца ў пэўных умовах. А ў якіх менавіта ўмовах яго выкарыстоўваюць? У старажытным Кітаі, асабліва ў перыяд, калі яшчэ не было рэлігіяў, многія ўдасканальвальнікі займаліся таемна, у адзіноце, адасобіўшыся ў глухіх гарах або пячорах — падалей ад людскога натоўпу. У гэтым выпадку ўзнікала пытанне пра забеспячэнне ежай. Калі б чалавек не выкарыстоўваў метад біґу, тады б ён наогул не мог бы ўдасканальвацца і памёр бы ад голаду і смагі. Калі я плыў на судне па плыні ракі Янцзы на ўсход з горада Чуньцін у горад Ухань, каб выкладаць там Закон, я ўбачыў, што на схілах гор па абодвух берагах «Трох цяснінаў» на паўдарозе да вяршыняў ёсць пячоры. У шмат якіх славутых гарах ёсць такія пячоры. Раней, бывала, удасканальвальнік ускараскваўся па вяроўцы і, увайшоўшы ў пячору, пераразаў яе і пачынаў там удасканальвацца. Калі ў яго не атрымлівалася ўдасканаліцца, тады ён там і паміраў. Без вады, без ежы, у такіх вельмі адмысловых умовах і выкарыстоўваўся такі асаблівы метад удасканальвання.

Многія метады практыкі прайшлі такі працэс успадкавання і перадачы, таму яны змяшчаюць у сабе адмову ад ужывання ежы. А ў шмат якіх іншых метадах практыкі такога зместу няма. Большасць метадаў практыкі, якія распаўсюджваюцца сёння ў нашым грамадстве, не маюць такога зместу. Мы кажам, што падчас самаўдасканальвання неабходная поўная адданасць аднаму напрамку ў практыцы, што табе нельга адвольна чыніць так, як уздумаецца. Табе здаецца, што гэта цудоўна, і ты таксама хочаш выкарыстаць біґу. Навошта табе гэта? Некаторым здаецца, што гэта добра, і ў іх узнікае цікаўнасць; альбо ім падаецца, што ў іх высокі ґунфу, які можна паказаць іншым — з якімі толькі душэўнымі станамі людзей няма. Нават калі і выкарыстаць такі метад для самаўдасканальвання, усё адно гэта запатрабуе выдатку ўласнай энергіі, каб падсілкоўваць цела, таму тут вычынка даражэйшая за аўчынку. Вам вядома, што, асабліва пасля стварэння рэлігіяў, падчас сядзення ў медытацыі альбо пустэльніцтва[196] ў манастыры табе даюць гарбату ці ежу, і тады гэтае праблемы не ўзнікае. Тым больш, мы займаемся ўдасканальваннем у грамадстве звычайных людзей, і ты наогул не маеш патрэбы выкарыстоўваць гэты метад. Апроч гэтага, у тваёй школе няма такога метаду, і табе нельга

рабіць усё, што прыйдзе ў галаву. Але калі ты сапраўды хочаш выкарыстаць метад біґу — калі ласка, выкарыстоўвай. Наколькі я ведаю, звычайна, калі настаўнік перадае які-небудзь метад практыкі — сапраўды настаўляе людзей на высокія ўзроўні — і калі ў яго школе ёсць біґу, тады гэтая з’ява можа мець месца. Аднак біґу нельга распаўсюджваць, і заняткі з вучнем звычайна праходзяць таемна, па-пустэльніцку.

Зараз ёсць майстры ціґун, якія вучаць людзей біґу. І як, ці дасягнулі людзі біґу? Урэшце не. Хіба ёсць тыя, хто дасягнуў? Я бачу, што шмат хто патрапіў у лякарню, у многіх з іх жыццё на павуцінцы ліпіць. Тады чаму ўзнікае такая сітуацыя? Хіба не існуе такая з'ява, як біґу? Так, яна існуе. Але трэба адзначыць, што адвольна парушаць стан грамадства звычайных людзей не дазваляецца нікому. Не кажам, што будзе, калі па ўсёй краіне безліч людзей, якія займаюцца ціґун, не будуць есці ды піць. Возьмем хаця б горад Чанчунь, калі б усе там не елі ды не пілі, тады, на маю думку, гэта было б пазбаўленне ад турботаў! Тады не трэба будзе спяшацца з прыгатаваннем ежы. Сяляне займаюцца земляробствам, не шкадуючы сіл. Калі б раптам усе перасталі есці, тады было б нашмат прасцей: людзі толькі працуюць, а не ядуць. Ці магчыма гэта? Тады ці будзе гэта яшчэ чалавечым грамадствам? Адказ абавязкова будзе адмоўным, не дазваляецца, каб такая рэч шырокамаштабна перашкаджала грамадству звычайных людзей.

Падчас навучання біґу некаторымі майстрамі ціґун з'явілася шмат небяспечных выпадкаў. Некаторыя проста памяшаныя на дасягненні біґу, але яны яшчэ не пазбавіліся ад навязлівай ідэі, не пазбавіліся ад шматлікіх жаданняў, уласцівых звычайным людзям. Убачыўшы смачную ежу, такі чалавек бядуе, што не можа яе з’есці. Ледзь у яго праяўляецца навязлівая ідэя — ён не вытрымлівае. Ён хвалюецца, яму хочацца есці. Калі ў гэтага чалавека абуджаецца жаданне, ён жадае есці — калі не паесць, дык адчувае голад. Але калі ён што-небудзь з'есць, тады яго пачынае ванітаваць — ежа ў горла не ідзе, што і выклікае нервовае напружанне і моцны спалох. Многіх з іх даставілі ў лякарню, у многіх сапраўды з'явілася пагроза для жыцця. Некаторыя звярнуліся да мяне, каб я разабраўся з гэтай бязладзіцай, але мне не хочацца займацца гэтымі справамі. Некаторыя майстры ціґун чыняць самавольства. Хто захоча разбіраць гэтае смецце?

І тым больш, калі з табой што-небудзь здарылася падчас біґу, тады ці не значыць гэта, што ты сам на тое напрасіўся? Мы кажам, што з'ява гэтая існуе, але гэта не стан, які з'яўляецца на высокім узроўні, і не нейкая адмысловая рэакцыя. Гэта толькі спосаб практыкі, які выкарыстоўваецца ў адмысловых умовах, але яго нельга распаўсюджваць. Шмат людзей імкнецца дасягнуць біґу, называюць яго такім-та біґу, напаўбіґу, нават падзяляючы на ступені. Некаторыя кажуць, што яны п'юць ваду, іншыя — што ядуць садавіну. Усё гэта фальшывы біґу. Такія, магу сцвярджаць, доўга не пратрымаюцца. Той, хто шчыра

ўдасканальваецца, аддаляецца ў пячору, нічога не есць ды не п'е. Гэта сапраўдны біґу.

## КРАДЗЕЖ ЦІ

Пры адной толькі згадцы пра крадзеж ці, некаторыя ажно ў твары змяняюцца[197], так палохаюцца, што больш не асмельваюцца займацца ціґун. Менавіта з-за таго, што ў колах практыкоўцаў ходзяць чуткі пра «выбліск ды вар'яцтва», пра «крадзеж ці» ды іншыя з'явы, многія баяцца займацца ціґун, многія баяцца мець справу з ціґун. Калі б такіх чутак не было, тады б колькасць людзей, якія займаюцца ціґун, была б яшчэ большай. Некаторыя майстры ціґун з дрэнным Сіньсін наўмысна навучаюць такім рэчам, атручваючы атмасферу ў колах удасканальвальнікаў. Насамрэч усё гэта не так жахліва, як яны апісваюць. Мы кажам, што ці — гэта проста ці, хоць ты і называеш яго першародным ці, такім ці або іншым ці. Пакуль у целе чалавека існуе ці, гэты чалавек знаходзіцца на ўзроўні ацалення ды аздараўлення, і таму яго яшчэ нельга прылічыць да практыкоўцаў. Пакуль у чалавека існуе ці, гэта сведчыць пра тое, што ён яшчэ не дасягнуў высокае ступені ачышчэння арганізма, што ў яго яшчэ ёсць хваробатворны ці. Гэта дакладна. Чалавек, які займаецца крадзяжом ці, таксама знаходзіцца на ўзроўні ці. Каму ж з нашых практыкоўцаў патрэбны такі нячысты ці? У тых, хто не практыкуе, ці вельмі каламутны. Калі возьмешся практыкаваць, ён можа пачаць станавіцца ўсё больш празрыстым. Тады ў асяродку захворвання праяўляецца згустак чорнае матэрыі велічэзнае канцэнтрацыі. Калі практыкаваць далей, калі сапраўды дойдзеш да ацалення ды аздараўлення, гэты ці паступова становіцца жаўтлявым. Калі практыкаваць далей, тады хваробы ў чалавека сапраўды знікнуць, і тады ён ужо больш не будзе мець ці ды набудзе стан малочна-белага цела.

Інакш кажучы, ёсць ці — ёсць і хваробы. Мы — практыкоўцы. Каму і навошта патрэбны ці, калі ён выпрацоўвае Ґун? Калі чалавеку трэба ачышчаць сваё цела, тады навошта яму яшчэ і каламутны ці?! Дакладна ні да чаго. Тыя, хто хоча ці, таксама знаходзяцца на ўзроўні ці і не змогуць адрозніць добры ці ад дрэннага, у іх няма такое здольнасці. А сапраўдны ці, які захоўваецца ўнутры даньт'ень твайго цела, яму не закрануць; гэты дасканалы ці можа чапаць толькі чалавек з высокім ґунфу. Што тычыцца каламутнага ці ў целе, дык няхай крадзе. Што тут такога? Калі я захачу ўліць у сябе ці, тады, як толькі падумаю пра гэта падчас практыкі, жывот у мяне адразу ж раздзімаецца ад ці.

У школе Даа вучаць, як прымаць «паставу слупа» ў выглядзе іерогліфа «неба»[198], а школа Буды вучыць, як, трымаючы ці, уліваць яго ў макаўку: у Сусвеце ці процьма, ты можаш увесь дзень уліваць яго ў сябе. З адкрыццём кропак лаўґун і байхўэй[199] улівай яго ў сябе. Засяродзіўшы сваю думку на даньт'ень, улівай ці прыгаршчамі ды неўзабаве напоўнішся ім. Але да якое б меры ты ні напоўніў сябе, якая ад гэтага карысць? Некаторыя людзі

назапашваюць шмат ці ды адчуваюць распіранне ўнутраных бакоў фалангаў пальцаў, распіранне цела. А тыя, хто падыходзіць да іх, адчуваюць, што вакол іх ёсць нейкае поле: «Ого! Як добра ты займаешся ціґун». На маю думку, гэта нішто. Хіба тут ёсць Ґун? Гэта ўсё яшчэ практыкаванні з ці, і як бы шмат яго ні было, усё адно ён не заменіць Ґун. Мэта практыкаванняў з ці ў тым, каб добрым вонкавым ці замяніць ці цела — ачысціць арганізм. Навошта назапашваць залішні ці? Пакуль ты знаходзішся на гэтым узроўні, і з табой яшчэ не адбыліся сутнасныя змены, яго нельга лічыць Ґун. Колькі б ці ты ні ўкраў, у лепшым выпадку, ты ўяўляў бы сабой вялікі мех, напоўнены ці. Якая ад гэтага карысць? Ён жа не ператварыўся ў матэрыю высокай энергіі. Чаго ж ты баішся? Хто сапраўды крадзе ці, той хай сабе крадзе.

Падумай, калі ў тваім целе ёсць ці, значыць, там ёсць і хваробы. А калі чалавек крадзе ў цябе ці, хіба не значыць гэта, што ён адначасова крадзе і твой хваробатворны ці? Ён наогул не здольны адрозніць здаровы ці ад хваробатворнага, бо чалавек, які жадае здабыць ці, таксама знаходзіцца на ўзроўні ці, і ў яго няма аніякіх здольнасцяў. Чалавеку, які мае Ґун, ці дакладна не патрэбны. Калі не верыш, можам правесці эксперымент: ты стаіш, хай ён там крадзе; ты пры дапамозе думак уліваеш у сябе ці з Сусвету, а ён няхай займаецца яго крадзяжом ззаду цябе. Бачыш, як гэта добра: ён паскарае ачышчэнне твайго цела, вызваліўшы цябе ад выканання рухаў «чун-ґўань»[200]. Паколькі намер у яго благі (ён крадзе чужое, і няхай нават ён забраў дрэнную рэч, але ўсё адно зрабіў учынак, які выклікае страту Дэ), ён дасць табе Дэ. Адбываецца ўзаемаабмен: тут ён бярэ ў цябе ці, а там аддае табе Дэ. Той, хто займаецца крадзяжом ці, не ведае пра гэта. Калі б ён ведаў, тады б не адважыўся гэтага рабіць!

Ва ўсіх, хто займаецца крадзяжом ці, сінюшны колер твару. Ва ўсіх іх. Вельмі шмат хто з тых, якія займаюцца ціґун у парку, займаюцца менавіта дзеля пазбаўлення ад хваробаў. Якіх толькі хваробаў у іх не бывае! Іншыя пасля лекавання хворых выкідаюць з сябе ці. А тыя, хто крадзе ці, не тое, каб выкідаць, — набіраюць яго ва ўсё сваё цела. У іх ёсць якія толькі заўгодна хваробатворныя ці. Нават вантробы іх цела смаліста-чорныя. Яны ўвесь час страчваюць Дэ, вакол іх усё становіцца чорным з-за пашырэння поля кармы і вялікае страты Дэ; яны становяцца чорнымі і ўнутры, і звонку. Калі б людзям, якія займаюцца крадзяжом ці, было б вядома, што ў іх целе адбываюцца такія змены, што яны аддаюць іншым Дэ, што яны робяць гэткае глупства, яны б так не рабілі!

Некаторыя кажуць пра ці, як пра нешта таямнічае: ты, маўляў, знаходзішся ў ЗША, я тут выпраменьваю ці, а ты зможаш прыняць яго там; ты, маўляў, стаіш за сцяной, я тут выпраменьваю ці, і ты зможаш яго там прыняць. Некаторыя людзі вельмі чуллівыя, яны заўсёды могуць прыняць ці, калі іншыя яго выпраменьваюць. Але ці ідзе не па гэтай прасторы, а па іншай прасторы — у тым месцы няма сцяны. Тады чаму часам ты не адчуваеш ці, які выпраменьвалі

некаторыя майстры ціґун на адкрытай пляцоўцы? Справа ў тым, што ў іншай прасторы існуе нейкая перашкода. Такім чынам, ці не мае такое вялікае пранікальнае сілы, як пра яго кажуць.

Сапраўдны эфект дае толькі Ґун. Калі практыкоўца можа выпраменьваць Ґун, у яго ўжо няма ці. Ён выпраменьвае матэрыю высокай энергіі, якая, калі глядзець на яе нябесным вокам, выглядае як святло. Такое святло, калі даходзіць да чыйгосьці цела, выклікае адчуванне жару і можа непасрэдна ўздзейнічаць на звычайнага чалавека. Але і ім немагчыма цалкам вылекаваць хваробу. Гэта можа толькі стрымаць яе. Для таго, каб сапраўды вылекаваць хваробу, патрэбна звышздольнасць, розныя звышздольнасці прызначаныя для канкрэтных хваробаў. У надзвычай мікраскапічным стане кожная часцінка Ґун мае твой уласны вобраз. Яна можа распазнаваць людзей, усе яны маюць разумовую здольнасць ды ўяўляюць сабой рэчывы высокай энергіі. Як яны могуць застацца ў таго, хто іх украў? Яны там не застануцца, іх не ўтрымаеш, бо яны не прыналежаць таму чалавеку. Пасля ўзнікнення Ґун усе сапраўдныя практыкоўцы знаходзяцца пад наглядам настаўніка. Настаўнік вось там сочыць за тым, што ты робіш. Калі ты возьмеш тое, што прыналежыць іншаму, тады *яго* настаўнік таксама гэтага не дапусціць!

**ЗБОР ЦІ**

Крадзеж ці ды збор ці — не тыя пытанні, якія мы маем намер для вас вырашыць падчас навучання практыцы на высокім узроўні. Але я яшчэ стаўлю сабе за мэту аднавіць добрае імя самаўдасканальвання, здзейсніць невялічкі добры ўчынак — распавесці пра тыя негатыўныя з'явы, пра якія раней ніхто не казаў. Трэба, каб усе мы іх разумелі і такім чынам стала менш такога, калі некаторыя людзі ўвесь час робяць дрэнныя справы, у выніку чаго іншыя — тыя, хто не ведае сапраўднага стану рэчаў у ціґун, — пры адной толькі згадцы пра яго заўсёды палохаюцца.

Ці — паўсюль у Сусвеце. Некаторыя кажуць пра нябесны янскі альбо зямны іньскі ці. Ты таксама з'яўляешся часцінкай Сусвету, дык збірай сабе, калі ласка. Аднак некаторыя збіраюць не касмічны ці, яны наўмысна вучаць людзей збіраць ці з раслінаў і нават абагульняюць досвед на гэты конт: у таполі ці, маўляў, белы, у хвоі жоўты; і яшчэ: як трэба іх збіраць, калі збіраць. Нехта сказаў: «Перад маім домам расло дрэва. Я так збіраў з яго ці, што яно ажно загінула». Што гэта за здольнасць? Хіба не азначае гэта, што ты займаўся кепскай справай? Як вам вядома, мы, калі шчыра ўдасканальваемся, цэнім дабраякасныя інфармацыі, надаем вялікую ўвагу асіміляцыі з уласцівасцю Сусвету. Хіба ты не павінен сур'ёзна ставіцца да пытання Дабрыні? Падчас асіміляцыі з уласцівасцю Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне трэба звяртаць увагу на Дабрыню. Ці зможа ўзрасці твой Ґун, калі ты ўвесь час займаешся кепскімі справамі? Ці зможаш ты вылекавацца ў такім выпадку? Хіба гэта не

ідзе акурат насуперак патрабаванням, якія прад'яўляюцца да нас, удасканальвальнікаў? Гэта таксама можна лічыць забойствам жывых істотаў ды здзяйсненнем зла! Магчыма, некаторыя скажуць: «Чым далей, тым больш таямнічым становіцца ваш аповед. Забіць жывёлу — гэта забойства жывое істоты. І забіць расліну — таксама забойства жывое істоты». Насамрэч гэта так. У будызме гаворыцца пра Шэсць колаў пераўвасабленняў, у працэсе якіх ты можаш ператварыцца ў расліну. Так гаворыцца ў будызме. Мы гаворым пра гэта інакш. Але мы вам скажам, што і дрэва — жывая істота, апроч таго, яно мае высокаразвітую разумовую здольнасць.

Прыводжу прыклад. У ЗША ёсць чалавек, які спецыялізуецца на электроніцы ды вучыць, як карыстацца дэтэктарам хлусні. Аднойчы яму ў галаву прыйшла думка злучыць электроды прылады з драцэнай Масанжа і паліць вадой карань тое кветкі. Зрабіўшы гэта, ён выявіў, што электронны самапісец прылады хутка намаляваў крывую. Гэтая крывая акурат ідэнтычная крывой галаўнога мозга чалавека, якая ўтвараецца ў вельмі кароткі прамежак часу падчас уздыму, радасці. Гэта агаломшыла адмыслоўца: «Як расліна можа мець эмоцыі?!» Ён ледзь не выбег на вуліцу, каб закрычаць: «Расліны маюць эмоцыі!» Гэты выпадак натхніў яго на даследаванне ў гэтай галіне, і ён правёў шэраг эксперыментаў.

Аднойчы ён, паставіўшы дзве расліны разам, загадаў свайму вучню растаптаць адну з іх перад іншай, якую пасля перанеслі ў лабараторыю і там далучылі да паліграфа. Потым ён сказаў, каб пяцёра вучняў па чарзе ўваходзілі ў лабараторыю. З'явіліся першыя чатыры вучні, і аніякае рэакцыі не было. Але як толькі ў лабараторыю ўвайшоў пяты вучань, той, хто растаптаў расліну, ён яшчэ нават не наблізіўся, а электронны самапісец імкліва накрэсліў графік, які бывае толькі тады, калі асоба напалоханая. Даследчык быў вельмі ўражаны! Гэты факт даказваў адну вельмі важную рэч. Мы заўсёды лічылі чалавека вышэйшай жывой істотай, лічылі, што чалавек мае здольнасць успрымання, здольнасць пазнаваць іншых; мае галаўны мозг, які здольны ўсё аналізаваць. А як расліна можа распазнаць штонебудзь? Ці не азначае гэта, што яна мае органы пачуццяў? Калі б раней нехта сказаў, што расліна мае органы пачуццяў, мае мысленне, эмоцыі, здольнасць да распазнавання, тады б яго абвінавацілі ў забабонах. Апроч таго, у пэўных аспектах расліна нібыта перасягнула нас, сённяшніх людзей.

Аднойчы гэты навуковец злучыў дэтэктар хлусні з раслінай і падумаў: «Які эксперымент зрабіць? Спалю яе лісце і пагляджу, якая будзе рэакцыя». Як толькі ў яго мільганула такая думка, электронны самапісец адразу, не чакаючы, калі чалавек прымецца спальваць, накрэсліў крывую, якая з'яўляецца толькі тады, калі чалавек крычыць: «Ратуйце!» Такая звышпачуццевая здольнасць раней называлася тэлепатыяй. Гэта прыхаваная магчымасць, прыроджаная здольнасць чалавека. Аднак усё чалавецтва цяпер дэградуе; табе прыйдзецца зноў удасканальвацца, вярнуцца да вытоку, вярнуцца да ісціны, вярнуцца да

сваёй першапачатковай прыроды. Толькі тады ты будзеш мець такую здольнасць. А расліны, аказваецца, яе ўжо маюць. Яны ведаюць, пра што ты думаеш. Гучыць вельмі дзіўна. Але гэта быў цалкам рэальны навуковы эксперымент. Навуковец ставіў яшчэ іншыя доследы, у тым ліку эксперыменты для вывучэння здольнасцяў тэлекантролю на вялікай адлегласці. Публікацыя яго артыкула выклікала сенсацыю ва ўсім свеце.

Батанікі ўсіх краін разгарнулі даследаванні ў гэтай сферы, кітайскія таксама. Гэта ўжо ніякія не забабоны. Я ў той дзень сказаў: таго, што адбылося, што адкрыта і выяўлена сёння чалавецтвам, дастаткова, каб змяніць нашыя сённяшнія падручнікі. Аднак паддаючыся ўплыву традыцыйных уяўленняў, людзі не жадаюць прызнаваць такія факты; у дадатак да гэтага ніхто не займаецца сістэматызацыяй гэтых з'яў.

У адным парку ў Паўночна-Усходнім Кітаі я бачыў, як загінуў увесь хвойнік. Некаторыя людзі рабілі невядома якія практыкаванні, яны качаліся па зямлі, потым пачыналі збіраць ці нагамі ды рукамі. Неўзабаве той хвойнік пажаўцеў і загінуў. Ты гэта добры ўчынак зрабіў ці благі? З пункту гледжання нашых практыкоўцаў гэта не што іншае, як забойства жывых істот. З'яўляючыся практыкоўцам, ты павінен быць добрым чалавекам, пастунова асімілявацца з уласцівасцю Сусвету, парваць з усім благім. З пункту гледжання звычайных людзей, гэта таксама нядобры ўчынак. Гэта псаванне грамадскае маёмасці, псаванне зялёных насаджэнняў, парушэнне экабалансу. З якога пункту гледжання ні кажы, гэта нельга лічыць добрым учынкам. У космасе процьма ці, ты можаш збіраць, колькі хочаш. Некаторыя людзі маюць велізарную энергію. Калі яны дасягнуць вызначанага ўзроўню ў практыцы ціґун, яны сапраўды могуць адным узмахам рукі разам сабраць ці раслінаў з вялікае плошчы. Але гэта ўсяго толькі ці, дык што толку ў зборы вялікае колькасці ці? Некаторыя, ідучы ў парк, не маюць намеру там займацца чымсьці іншым. Яны кажуць: «Мне не трэба практыкаваць. Дастаткова пры хадзе размахваць рукамі — і досыць. Вось і ўсе мае практыкаванні». Атрымаў ці — і добра, ён прымае ці за Ґун. Калі падысці да такога чалавека бліжэй, можна адчуць, што ад яго цела вее халадком. Бо ці раслінаў іньскае прыроды. Практыкоўцы ж падтрымліваюць раўнавагу інь ды ян. У гэтага чалавека ўсё цела пахне хваёвым алеем, а ён яшчэ думае, што добра выконвае практыкаванні.

## ХТО ПРАКТЫКУЕ, ТОЙ І АТРЫМЛІВАЕ ҐУН

Пытанне «хто практыкуе, той і атрымлівае Ґун» з'яўляецца сапраўды ключавым. Калі мяне запытваюць, у чым перавага Фалунь Дафа, я адказваю, што Фалунь Дафа адрозніваецца тым, што ў стане дасягнуць эфекту «Ґун выплаўляе чалавека» і скарачае тэрмін практыкі; Фалунь Дафа здольны вырашыць такую праблему: калі ў людзей не хапае часу для заняткаў, ён можа дазволіць ім доўга знаходзіцца ў стане, калі Ґун іх выплаўляе. У той жа час наш

метад практыкі — сапраўдны метад удасканальвання і Сіньсін, і даўгалецця, з-за чаго нашае матэрыяльнае цела моцна змяняецца. Фалунь Дафа мае яшчэ адну найбольшую перавагу, пра якую я да гэтага часу ўмоўчваў, і толькі сёння мы адкрыем яе. Бо гэтая праблема звязана з вельмі прынцыповым пытаннем гістарычных вытокаў, яна мае каласальны ўплыў на колы ўдасканальвальнікаў. У гісторыі ніхто і ніколі не асмельваўся гэта раскрыць, і было забаронена гэта рабіць. Але не распавесці пра гэта я таксама не магу.

Адзін з маіх паслядоўнікаў сказаў: «Кожная фраза, якую выказаў Вялікі майстар Лі Хунджы, — гэта разгалашэнне нябесных таямніц, гэта ён выдае нябесную таямніцу». Але мы па-сапраўднаму настаўляем людзей на высокія ўзроўні, значыць, ратуем людзей. Нам трэба несці адказнасць перад усімі, і мы ў стане ўзяць на сябе такую адказнасць, таму гэта ўжо не разгалашэнне нябесных таямніц. І толькі тое, калі безадказна распавядаеш, што табе ўздумаецца, з'яўляецца разгалашэннем нябесных таямніц. Сёння мы высветлім гэтае пытанне — пытанне «хто практыкуе, той і атрымае Ґун». На маю думку, усе цяперашнія метады практыкі, сярод якіх усе гістарычныя метады практыкі абедзвюх школаў, Буды і Даа, а таксама метады практыкі школы Цімэнь, заўжды ўдасканальвалі дапаможныя душы людзей (дапаможныя свядомасці), і Ґун у іх атрымліваюць менавіта дапаможныя душы. Пад галоўнай душой, пра якую мы гаворым, маецца на ўвазе тваё ўласнае мысленне. Ты сам павінен разумець, пра што думаеш, што робіш. Гэта і з’яўляецца тваім сапраўдным «я». А што робіць дапаможная душа — гэта табе невядома. Хоць яна нарадзілася адначасова з табой, носіць такое ж імя, як і ты, кіруе разам з табой адным і тым самым целам, мае такую ж знешнасць, але, калі казаць строга, дапаможная душа ўсё-ткі не з’яўляецца табой.

У гэтым Сусвеце існуе прынцып: хто страчвае, той і атрымлівае, хто ўдасканальваецца, той і атрымлівае Ґун. Усе метады практыкі розных гістарычных эпох вучаць практыкоўцаў, што падчас практыкі трэба ўвайсці ў туманны стан, калі ні пра што не думаеш, пасля чаго ўвайсці ў глыбокую медытацыю — да такое ступені, што ўрэшце ты больш нічога не ведаеш. Ёсць такі чалавек, у якога адчуванне ад трохгадзіннага сядзення ў медытацыі такое, нібыта прайшло толькі адно імгненне. Іншыя яшчэ ў захапленні ад яго сілы медытацыі. А ці практыкаваў ён насамрэч? Яму гэта наогул невядома. Асабліва ў метадах практыкі школы Даа кажуць: «Разумовая душа[201] памірае — дасканалая душа[202] нараджаецца». Разумовую душу, пра якую яны кажуць, мы называем галоўнай душой; дасканалую ж душу, пра якую яны кажуць, мы называем дапаможнай душой[203]. Калі б твая разумовая душа сапраўды памерла, тады і ты б сапраўды памёр, сапраўды б не стала тваёй галоўнай душы. Адзін чалавек, які займаецца іншым метадам практыкі, мне кажа: «Настаўніку, калі я раблю практыкаванні, тады дома нікога не пазнаю». Іншы мне кажа: «А я не выконваю практыкаванні ціґун так, як гэта робяць іншыя — з раніцы да ночы! Прыйшоўшы дамоў, я кладуся на канапу, і маё “я” выходзіць з мяне, каб пазаймацца. Я, лежачы, гляджу, як яно гэта робіць». З аднаго боку мне гэта падаецца вельмі сумным, але, з іншага, гэта не так ужо і сумна!

Чаму ратуюць дапаможную душу? Люй Дунбінь[204] сказаў: «Лепш ужо выратаваць жывёлу, чым чалавека». Чалавеку, сапраўды, занадта цяжка ўсвядоміць, бо звычайныя людзі знаходзяцца ў змане грамадства звычайных людзей; паддаўшыся спакусе надзённых выгадаў, яны не ў стане вызваліць сябе ад упартых жаданняў іх мець. Запэўніваю цябе, што некаторыя, выйшаўшы адсюль пасля лекцыі, зноў ператвараюцца ў звычайных людзей: калі хто-небудзь закране або пакрыўдзіць іх, тады яны з гэтым не змірацца. Пройдзе нейкі час, і яны ўжо зусім перастануць лічыць сябе практыкоўцамі. У гісторыі многія з тых, хто ўдасканальваўся ў Даа ўбачылі, што чалавека вельмі цяжка выратаваць, гэта значыць яго галоўная душа знаходзіцца ў глыбокім змане. У некаторых добрая здольнасць усведамлення — адзін намёк — і ўсё ўжо спасцiглі. А іншыя, як ім ні кажы, ніяк не вераць і лічаць, што ты перабольшваеш. Мы настойліва патрабуем, каб яны ўдасканальвалі свой Сіньсін, а яны, апынуўшыся сярод звычайных людзей, усё адно робяць так, як лічаць патрэбным. Яны лічаць тыя нікчэмныя выгады звычайных людзей, якія з'яўляюцца надзённымі, адчувальнымі на дотык і дасягальнымі, усё ж такі рэальнай выгадай, і будуць і далей так рабіць. Выкладзены Настаўнікам Закон хоць і гучыць пераканаўча, але з’яўляецца нездзяйсняльным. Выратаваць галоўную душу чалавека — справа найцяжэйшая, а дапаможная свядомасць можа бачыць карціны іншых прастораў, таму іншыя так думаюць: «Навошта мне ратаваць менавіта тваю галоўную свядомасць, дапаможная свядомасць таксама з’яўляецца табой, хіба не ўсё адно, калі я выратую менавіта яе, дапаможную свядомасць? Абедзве яны з’яўляюцца табой. Якая розніца, хто з іх атрымае, вынік адзін і той жа — атрымаў ты сам».

Я растлумачу іх канкрэтны метад удасканальвання. Чалавек, які мае здольнасць дыстанцыйнага бачання, можа ўбачыць такую карціну. Калі ты сядзеш у медытацыю, тады ў момант уваходу ў сузіранне ўбачыш, як — «Фіць!» — з твайго цела адразу выйдзе тваё «я», якое выглядае, насамрэч, як ты. Аднак распазнай, дзе ты сам зараз. Сядзіш тут! Калі яно выходзіць з твайго цела, ты бачыш, што настаўнік навучае яго ўдасканальванню ў створанай настаўнікам прасторы, якая можа прадставіцца або ў форме грамадства мінулага, або ў форме грамадства цяперашняга, або ў форме грамадства іншае прасторы, там яго і вучыць. Ён зведаў нямала пакутаў, праводзячы штодня па 1-2 гадзіне на занятках. Калі ён, скончыўшы заняткі, вяртаецца, тады і ты выходзіш са стану сузірання. Гэта пра тых, хто бачыць.

Калі не бачыш, тады яшчэ больш сумна: ты, нічога не ведаючы, сядзіш у несвядомым стане дзве гадзіны ў сузіранні, потым выходзіш з яго. Некаторыя могуць праспаць запар 2-3 гадзіны, і гэта таксама лічыцца, нібыта ён папрактыкаваў; яны цалкам аддаюць сябе ў распараджэнне іншых. Такая форма практыкі выконваецца з інтэрваламі, працягласць штодзённага сядзення ў медытацыі нязменная. Бывае і такая форма заняткаў, якая выконваецца разава; магчыма, вы чулі, што Бадгідгарма прасядзеў тварам да сцяны[205] дзевяць гадоў — раней працягласць разавага сядзення ў многіх манахаў магла дасягаць дзясяткаў гадоў. Паводле гістарычных запісаў, рэкордная працягласць

— звыш 90 гадоў. Але і гэта яшчэ не мяжа. У такіх практыкоўцаў на павеках ляжаў тоўсты слой пылу, іх целы зараслі травой, але яны працягвалі сядзець там і далей. Некаторыя школы Даа таксама вучаць гэтаму. У прыватнасці, у некаторых метадах практыкі Цімэнь практыкоўцы спяць: як заснуць, дык не выходзяць з медытацыі, і не прачынаюцца на працягу некалькіх дзясяткаў гадоў. Аднак хто ж практыкуе? Гэта іх дапаможная душа, выйшаўшы з цела, практыкуе. Калі яны здольныя бачыць, тады бачаць, як настаўнік вучыць яе практыкаваць. Дапаможныя душы таксама завінавачваюць велізарную карму. Настаўнік не здольны цалкам пазбавіць дапаможную душу ад кармы. Таму ён ёй кажа: «Ты тут добранька займайся, а я вярнуся праз хвіліну. Ты пачакай мяне».

Настаўнік дакладна ведае, *што* здарыцца, але ён змушаны так зрабіць. Неўзабаве дэман прыходзіць палохаць дапаможную душу альбо, ператварыўшыся ў прыгажуню, спакушаць яе, бывае ўсё што заўгодна. Дэман, убачыўшы, што яна сапраўды не паддалася спакусам (бо дапаможным душам параўнальна лягчэй удасканальвацца, і яны могуць ведаць гэты рэальны стан рэчаў), раззлаваўся ды захацеў яе забіць. Каб адпомсціць, ён сапраўды яе забіў, дзякуючы чаму яна адразу цалкам расплацілася з даўгамі. Пасля таго як яе забілі, дапаможная свядомасць выйшла, як струменьчык дыму, аддаўшыся волі ветру. Яна ізноў перарадзілася, перарадзілася ў вельмі беднай сям'і. З дзяцінства трывае нягоды, і, калі пачынае нешта разумець, прыходзіць настаўнік. Вядома, яна настаўніка не пазнала. Настаўнік з дапамогай сваіх здольнасцяў разблакаваў яе захаваную памяць, і яна адразу згадала: «Гэта ж настаўнік!» Настаўнік ёй сказаў: «Цяпер усё добра, можна пачынаць практыкаваць». Так прайшло шмат гадоў, і настаўнік усё ёй перадаў.

Калі скончылася навучанне, настаўнік сказаў: «У цябе шмат душэўных прывязанасцяў, ад якіх трэба пазбавіцца. Вандруй па свеце!» Вандраваць — справа неймаверна гаротная: дапаможная душа ходзіць у грамадстве, выпрошвае ежу, каб утаймаваць голад, сутыкаецца з усялякімі людзьмі, якія яе высмейваюць, зневажаюць ды прыніжаюць. Чаго там толькі не сустрэнеш. Яна паводзіцца як практыкоўца, імкнецца наладзіць стасункі з людзьмі, утрымаць Сіньсін, бесперапынна падвышаючы яго; яна не вагаецца перад спакусамі розных выгадаў звычайных людзей і праз некалькі гадоў вяртаецца з падарожжа. Настаўнік ёй кажа: «Ты ўжо спасціг Даа і дасягнуў Поўнае Дасканаласці. Калі табе больш няма чаго рабіць, тады вяртайся ды збірайся ісці; а калі ў цябе ёсць нейкія справы сярод звычайных людзей, тады дарабі іх». Такім чынам, праз шмат гадоў дапаможная душа вярнулася. Як толькі гэта адбылося, тады на гэтым баку галоўная душа таксама выйшла з медытацыі, прачнулася галоўная свядомасць.

Аднак насамрэч галоўная душа не ўдасканальвалася. Гэта ўдасканальвалася дапаможная душа, таму дапаможная душа і атрымлівае Ґун. Але галоўнай душы таксама было горка, усё ж такі яна прасядзела там усю сваю маладосць,

так мінулі ўсе дні яе жыцця звычайнага чалавека. Што рабіць? Яна адчувае, што, выйшаўшы з медытацыі, выпрацавала Ґун, што мае звышздольнасці; яна хоча лекаваць хворых, яна здатная да ўсяго, чым захоча займацца. А дапаможная душа, у сваю чаргу, стараецца задаволіць яе, бо яна ўсё ж такі галоўная душа, якая кіруе целам чалавека і мае вырашальнае слова. Ды яшчэ яна тут столькі гадоў прасядзела — усё жыццё мінула. Пасля смерці чалавека дапаможная душа сышла. Кожная пайшла сваім шляхам. Як кажуць у будызме, чалавек усё адно ўвойдзе ў Шэсць колаў пераўвасабленняў. З прычыны таго, што ў яго целе ўдасканаліўся Вялікі Прабуджаны, ён таксама назапасіў шмат Дэ. Дык і што далей? Магчыма, у наступным перараджэнні ён зойме высокую пасаду, вельмі разбагацее. Можа быць толькі так. Хіба гэта не азначае, што чалавек марна ўдасканальваўся?

Толькі прайшоўшы праз вельмі шмат перыпетыяў, мы атрымалі згоду на тое, каб выцягнуць гэты факт на белы свет. Я раскрыў адвечную таямніцу, таямніцу з усіх таямніц, якая абсалютна не падлягала разгалашэнню, адкрыў аснову розных метадаў удасканальвання незлічоных пакаленняў. Хіба я не казаў, што дадзеная праблема тычыцца вельмі глыбокіх гістарычных каранёў? Менавіта з гэтае прычыны. Падумай: якая Школа, якая школа[206] ўдасканальваецца не такім спосабам? Ты сам удасканальваешся і так, і гэтак, але Ґун у цябе няма. Хіба для цябе гэта не прыкра?! А каго вінаваціць у гэтым? Чалавек *настолькі* задурманены, ён проста не можа ўсвядоміць. Як ні намякай — гэта не дапамагае. Калі кажаш з высокага ўзроўню, тады гэта для яго гучыць таямніча; калі з нізкага, дык ён не можа ўсвядоміць вышэй. Нягледзячы на тое, што я ўсё растлумачыў, некаторыя ўсё ж просяць, каб я іх лекаваў. Мне проста няёмка ім нешта сказаць. Мы самаўдасканальваемся. Мы можам дбаць толькі пра тых, хто ўдасканальваецца на высокія ўзроўні.

У нашай школе Ґун атрымлівае галоўная свядомасць чалавека. Аднак, калі ты толькі скажаш, што Ґун атрымлівае галоўная свядомасць, дык так ужо і адбудзецца? Хто ж такое дазволіць? Не, гэта мусіць мець свае перадумовы. Як вы ведаеце, у нашай школе ўдасканальваюцца, не пазбягаючы грамадства звычайных людзей, не пазбягаючы, не ўцякаючы ад супярэчнасцяў; у складаным асяроддзі звычайных людзей ты застаешся цвярозым і цалкам свядома ідзеш на тое, каб твае інтарэсы зведвалі страты, і, калі іншыя прыўлашчваюць твае выгады, ты не змагаешся так, як гэта робяць яны; знаходзячыся ў разнастайных перашкодах для Сіньсін, ты нясеш страты; у гэткім цяжкім асяроддзі ты загартоўваеш сваю волю, падвышаеш свой Сіньсін і, зведваючы ўздзеянні самых разнастайных дрэнных думак звычайнага чалавека, ты можаш вырвацца з іх путаў.

Памяркуй, хіба гэта не ты цалкам свядома зносіш пакуты? Хіба гэта не твая галоўная душа аддае? Ты страчваеш нешта сярод звычайных людзей. Ці не цалкам свядома ты гэта страчваеш? У такім разе і Ґун належыць атрымаць табе — хто страчвае, той і атрымлівае. Такім чынам, вось якая прычына таго,

што ў нашай школе ажыццяўляюць удасканальванне, не ізалюючыся ад гэтага складанага асяроддзя звычайных людзей. Чаму мы павінны ўдасканальвацца ў супярэчнасцях звычайных людзей? Таму што мы хочам самі атрымаць Ґун. У будучыні нашыя прафесійныя паслядоўнікі, якія ўдасканальваюцца ў манастырах, павінны будуць вырушыць вандраваць сярод звычайных людзей.

Некаторыя кажуць: «Але ў іншых метадах практыкі зараз таксама займаюцца сярод звычайных людзей». Так, але ўсе яны папулярызуюць ацаленне ды аздараўленне. Сапраўднаму ўдасканальванню на высокія ўзроўні, акрамя перадачы адзінаму спадкаемцу, ніхто публічна не вучыць. Той, хто сапраўды вучыць свайго спадкаемца, ужо забраў яго ды вучыць таемна. Хто за такую вялікую колькасць гадоў выкладаў гэта шматлікай аўдыторыі? Ніхто. Толькі нашая школа. Бо такі наш метад удасканальвання, і менавіта такім чынам мы атрымліваем Ґун. Разам з тым у нашай школе ўкладаюць у тваё цела шмат тысячаў рэчаў — усё для тваёй галоўнай душы. Каб сапраўды дазволіць атрымаць Ґун табе самому. Скажу, што зрабіў тое, чаго ніколі не рабілі нашыя папярэднікі, адчыніў самую вялікую браму. Некаторыя з вас зразумелі мае словы. Гэта ні ў якім разе не пустыя размовы. Я такі чалавек, які звыкся распавядаць у дзесяць разоў менш, чым можа[207]. Скажаце, што я выхваляюся, — я не супраць. Насамрэч я распавёў толькі трохі. Што ж тычыцца больш высокіх ды глыбокіх Вялікіх Законаў, дык з-за надта вялікае розніцы ва ўзроўнях, я абсалютна не магу нават крыху табе пра гэта распавесці.

Удасканальванне ў нашай школе праходзіць менавіта так, каб ты сам сапраўды атрымаў Ґун, што з'яўляецца беспрэцэдэнтным з часоў стварэння Неба і Зямлі; можаш навесці гістарычныя даведкі, і ты пераканаешся ў гэтым. Добра тое, што ты сам атрымліваеш Ґун. Аднак з-за гэтага і вельмі цяжка. Ты можаш праявіць сябе, знаходзячыся ў складаным асяроддзі звычайных людзей, у звязаных з Сіньсін звадах паміж людзьмі. Гэта з'яўляецца найцяжэйшым. Цяжкасць у тым, што ты свядома ідзеш на тое, каб твае інтарэсы звычайнага чалавека зведвалі страты. Ці будзеш ты ўстрывожаны, калі на кану будуць стаяць твае ўласныя інтарэсы; ці будзеш устрывожаны, калі людзі будуць ладзіць супраць цябе інтрыгі; ці будзеш устрывожаны, калі твае сваякі і добрыя сябры будуць пакутаваць? Як ты ўсё гэта будзеш ацэньваць? Вось як цяжка быць практыкоўцам! Адзін чалавек мне сказаў: «Настаўніку, дастаткова быць добрым чалавекам сярод звычайных людзей. Хто зможа ўдасканаліцца?!» Пачутае вельмі раніла маё сэрца! Я нічога не адказаў. Якога толькі Сіньсін у людзей не бывае. Калі ён можа ўсвядоміць толькі да такое ступені, дык так і будзе. Хто ўсвядоміць, той і атрымае.

Лаа-цзы сказаў: «Даа можна называць Шляхам, але не ў звычайным сэнсе гэтага слова»[208]. Калі б ён усюды валяўся на зямлі, тады, каб паспяхова ўдасканаліцца, дастаткова было б проста падабраць яго з долу. Але тады ён ужо не быў бы каштоўным. Нашая школа дазваляе ў супярэчнасцях атрымаць Ґун табе самому, значыць, мы павінны ў максімальнай ступені адпавядаць

звычайным людзям. Прычым цябе не просяць нічога страчваць у матэрыяльным плане. Аднак у гэтым асяроддзі матэрыяльных інтарэсаў ты павінен падвышаць свой Сіньсін. У гэтым і зручнасць. Нашая школа з'яўляецца найзручнейшай: можна ўдасканальвацца сярод звычайных людзей і не выкарыстоўваць форму сыходу ў манастыр. Тады самая вялікая цяжкасць таксама палягае ў гэтым: удасканальванне ў складаным асяроддзі — асяроддзі звычайных людзей. Але самая вялікая перавага зноў у гэтым, бо нашая школа дазваляе табе самому атрымаць Ґун, што якраз і з'яўляецца найбольш ключавой рэччу ў нашай школе, і пра якую я вам сёння распавёў. Вядома, калі галоўная душа атрымлівае Ґун, тады дапаможная таксама яго атрымлівае. А чаму? Ва ўсіх інфармацыяў твайго цела, усіх духаў, усіх тваіх клетак расце Ґун, таму, вядома, у дапаможнай душы ён таксама расце. Але па дасягненні нейкага этапу яна заўжды будзе ніжэйшай за цябе. Ты будзеш Уладаром, а яна — Абаронцам Закону.

Дайшоўшы да гэтага месца, я хацеў бы сёе-тое дадаць. У колах удасканальвальнікаў існуе нямала людзей, якія жадаюць дасягнуць высокіх узроўняў ва ўдасканальванні. Яны пабывалі ўсюды ў пошуках Закону, выдаткавалі шмат грошай, зрабілі поўны круг «на поўдзень ад гор і на поўнач ад акіяна», каб знайсці знакамітага настаўніка, але так і не знайшлі. «Быць знакамітым» не азначае «быць сапраўды разумным». У выніку гэтыя людзі, дарэмна пераадолеўшы шлях туды і назад, марна знясіліўшы людзей ды патраціўшы грошы, так нічога і не атрымалі. Вось сёння такі добры метад практыкі мы прынеслі і паднеслі табе дзвюма рукамі[209], даставілі табе да дзвярэй твайго дома. Цяпер усё залежыць ад таго, ці зможаш ты ўдасканальвацца, ці зможаш быць прыдатным. Калі зможаш, тады ўдасканальвайся далей. Калі не зможаш, тады з гэтага часу годзе і думаць пра ўдасканальванне. Апроч д'яблаў, якія цябе абдураць, ніхто цябе не навучыць, і табе з гэтага часу не заняцца ўдасканальваннем. Калі я не змагу цябе выратаваць, тады ўжо ніхто цябе не ўратуе. Фактычна, цяпер знайсці сапраўднага настаўніка праведнага Закону, які б цябе навучаў, цяжэй, чым падняцца на Неба, наогул ніхто не дбае пра гэта. У Канцавы перыяд Закону нават вельмі высокія ўзроўні знаходзяцца ў канцавой кальпе, і тым больш нікому няма справы да звычайных людзей. Гэта найзручнейшая школа, ды яшчэ практыкуюць у ёй непасрэдна па ўласцівасці Сусвету, удасканальванне ідзе вельмі хутка і найкарацейшым шляхам. Яно скіравана прама на думкі чалавека.

## КРУГ НЕБА

У школе Даа надаецца шмат увагі «вялікаму ды малому кругу неба». Вось мы і пагаворым пра тое, што такое «круг неба». «Круг неба», які звычайна маюць на ўвазе, гэта злучэнне двух мерыдыянаў: мерыдыяну цяжарнасці[210] ды вядучага[211] мерыдыяну. Такі «круг неба» з'яўляецца павярхоўным. Ён нічога

сур'ёзнага не азначае і адносіцца толькі да катэгорыі ацалення ды аздараўлення, і называецца «малым кругам неба». Існуе яшчэ іншы «круг неба», які не называецца ані малым, ані вялікім кругам неба. Гэта форма «круга неба» падчас удасканальвання ў медытацыі. Ён ідзе ўнутры цела па такой лініі: абагнуўшы «палац нівань», апускаецца ўніз да даньт'ень і, абагнуўшы яго, падымаецца ўверх. Ён цыркулюе ўнутры. Гэта сапраўдны «круг неба» для ўдасканальвання ў медытацыі. Пасля таго як такі «круг неба» сфармуецца, ён утварае вельмі моцны паток энергіі, а далей адзін канал вядзе ўсе каналы, прабівае ўсе іншыя каналы. У Школе Даа распавядаюць пра «круг неба», а ў будызме яго не згадваюць. Пра што ж распавядаюць у будызме? Калі Шак'ямуні выкладаў свой Закон, ён не гаварыў пра Ґун. Пра Ґун ён не гаварыў, але яго метад практыкі таксама мае свае формы эвалюцыі шляхам самаўдасканальвання. І як жа пралягае канал у будызме? Спачатку наскрозь прабівае кропку байхўэй, а далей ад макаўкі спіральна разгортваецца па целе ўніз і ўрэшце ў такой форме прабівае ўсе каналы.

«Сярэдзінны канал» у Тантры мае тую ж самую мэту. Некаторыя кажуць, што «сярэдзіннага канала» не існуе. Тады чаму ж у Тантры шляхам удасканальвання можна яго выпрацаваць? Насамрэч, калі падсумаваць разам усе каналы цела чалавека, дык іх нават больш за дзесяць тысяч. Яны пераплятаюцца ўздоўж ды ўшыркі, як крывяносныя сасуды; іх яшчэ больш, чым крывяносных сасудаў. У прамежках паміж унутранымі органамі крывяносных сасудаў няма, а вось каналы ёсць. Ад макаўкі да кожнае часткі цела, пераплятаючыся ўздоўж ды ўшыркі, распасціраецца сетка каналаў. Ты пачынаеш іх злучаць. Спачатку, магчыма, яны не прамыя. Пасля злучэння прабіваеш іх наскрозь, потым патроху пашыраеш, і паступова ўтвараецца прамы канал. Гэты канал выкарыстоўваецца як вось, якая круціцца. Яна прыводзіць у рух некалькі ўяўных колаў, якія круцяцца гарызантальна. Мэта гэтага — таксама поўнасцю прабіць усе каналы цела.

Удасканальванне па нашым Фалунь Дафа пазбягае метаду «адзін канал вядзе ўсе каналы». З самага пачатку ўжо патрабуецца, каб усе каналы адначасова былі прабітыя ды прыведзеныя ў рух. Мы адразу сталі практыкаваць на вельмі высокім узроўні, абмінуўшы вельмі нізкія рэчы. Адзін канал вядзе ўсе каналы… калі ты хочаш дабіцца таго, каб ён іх цалкам прабіў, дык некаторыя людзі, прапрактыкаваўшы ўсё сваё жыццё, усё адно да гэтага нават не набліжаюцца; іншым жа для гэтага патрэбна ўдасканальвацца некалькі дзясяткаў гадоў. Гэта вельмі цяжка. У вельмі многіх метадах практыкі кажуць, што за адно жыццё не паспееш завяршыць удасканальванне. А ў многіх высокіх ды глыбокіх Вялікіх Законах удасканальвальнікі могуць падаўжаць працягласць свайго жыцця. Яны ж удасканальваюць даўгалецце. Можна ўдасканальвацца, падаўжаючы сваё жыццё, і рабіць гэта вельмі доўга.

«Малы круг неба» ў асноўным прызначаны для ацалення ды аздараўлення, а «вялікі круг неба» — гэта ўжо выпрацоўка Ґун, ужо сапраўднае

ўдасканальванне чалавека. «Вялікі круг неба», які мае на ўвазе школа Даа, цыркулюе не так бурна, як наш, дзе цалкам прабіваюцца ўсе каналы. У іх гэта вярчэнне «круга неба», які праходзіць толькі некалькімі мерыдыянамі: ад трох мерыдыянаў боку інь[212] рукі да трох мерыдыянаў боку ян[213] рукі; ад ступняў і ног аж да валасоў[214] і тулава. Поўны круг і лічыцца цыклам «вялікага круга неба». «Вялікі круг неба» — гэта ўжо з самага пачатку сапраўдная практыка, таму некаторыя майстры ціґун яго не перадаюць. Яны вучаць толькі таму, што адносіцца да лекавання ды аздараўлення. А некаторыя, хоць і казалі пра «вялікі круг неба», але нічога ў цябе не ўклалі. Тады сам ты яго не праб'еш. Калі нічога не ўклалі, табе прыйдзецца самому прабіць яго з дапамогай думак. Гэта лёгка толькі на словах! Эфект ад гэтага будзе такі ж, як ад гімнастыкі. Хіба можа гэта адкрыць «круг неба»? Удасканальванне залежыць ад цябе, Ґун — ад настаўніка. «Вялікі круг неба» можна прабіць толькі тады, калі ў цябе будзе ўкладзены адпаведны ўнутраны «механізм».

Школа Даа заўжды лічыла цела чалавека малым сусветам. Там лічаць, што, наколькі вялікі Сусвет звонку, настолькі ж вялікі ён і ўнутры; як ён выглядае звонку, так ён выглядае і ўнутры. Гэта быццам бы гучыць няўяўна і неспасціжна. Сусвет настолькі вялікі, як можна параўноўваць яго з целам чалавека? Мы прывядзем такі аргумент: нашая сучасная фізіка вывучае матэрыяльныя часціцы ад малекулы, атама, электрона, пратона, кварка ажно да нейтрына. А наколькі вялікім з’яўляецца Сусвет яшчэ далей уніз? Па дасягненні таго этапу пад мікраскопам ужо нічога не бачна. Што за драбнюткія часцінкі будуць, калі ісці далей уніз? Невядома. Насамрэч таму, што пазнала нашая сучасная фізіка, занадта далёка да найдрабнейшых часцінак Сусвету. Калі ў чалавека няма фізічнага цела, яго вочы здольныя бачыць рэчы з павелічэннем, што дазваляе ўбачыць мікрасвет. Чым вышэй узровень, тым больш можна ўбачыць у мікрасвеце.

Шак’ямуні, знаходзячыся на сваім узроўні, выклаў вучэнне пра «тры тысячы велічэзных светаў». Гэта значыць, у Млечным Шляху існуюць яшчэ іншыя людзі, якія маюць такое ж фізічнае цела, як у нашага чалавецтва. Ён таксама выказаў дактрыну пра тое, што ў адной пясчынцы змяшчаюцца тры тысячы велічэзных светаў. Гэта супадае з разуменнем нашае сучаснае фізікі. Хіба ёсць розніца паміж формай вярчэння электрона вакол ядра атама і формай вярчэння Зямлі вакол Сонца? Таму Шак’ямуні сказаў, што ў мікрасвеце, у адной пясчынцы, існуе тры тысячы велічэзных светаў. Адна пясчынка падобная да сусвету. Унутры яе ёсць жыццё, ёсць матэрыя. Калі гэта праўда, ці ёсць яшчэ пясок у светах у той пясчынцы? Тады ці ёсць у пясчынках у той пясчынцы яшчэ па тры тысячы велічэзных светаў? Тады ці ёсць у трох тысячах велічэзных светаў у пясчынках у той пясчынцы яшчэ пясок? Калі мы будзем так дакопвацца да кораня, тады гэта будзе бясконцым. Таму Шак’ямуні, хаця і дайшоў да ўзроўню Татгаґаты, усё-ткі сказаў такія словы: «Такі вялікі, што няма знешняга, такі малы, што няма ўнутранага». Вялікі настолькі, што не бачна краю Сусвету; малы настолькі, што не бачна найдрабнейшае часцінкі вытоку матэрыі.

Адзін майстар ціґун сказаў, што ў потавай поры стаіць горад, там імчацца цягнікі ды аўтамабілі. Гучыць гэта вельмі таямніча, але мы бачым, што такую версію нельга лічыць дзіўнай, калі разумець і вывучаць яе па-сапраўднаму з пункту гледжання навукі. У той дзень, калі я чытаў лекцыю пра адкрыццё нябеснага вока, многія падчас яго адкрыцця ўбачылі гэткую карціну: яны выяўлялі, што бягуць навонкі па праходзе ў сваім ілбе, і, здавалася, што да канца ніколі не дабегчы. Штодня падчас заняткаў яны бягуць гэтай магістраллю, абапал якое і горы, і рэкі. Прабягаюць міма гарадоў і бачаць шмат людзей. Ім здаецца, што гэта галюцынацыя. У чым жа справа? Усё ясна бачна, значыць, гэта не галюцынацыя. Кажу вам, калі цела чалавека ў мікраскапічным стане сапраўды можа быць такім велізарным, тады гэта не галюцынацыя. У практыцы школы Даа здаўна лічаць цела чалавека Сусветам, а калі гэта сапраўды Сусвет, тады адлегласць ад ілба да шышкападобнае залозы мозга будзе нават далей, чым дабрацца на край свету. Паспрабуй вырвацца навонкі. Гэта вельмі далёка.

Поўнае прабіццё «вялікага круга неба» падчас удасканальвання прынясе ўдасканальвальніку пэўную звышздольнасць. А якую менавіта? Вам вядома, што «вялікі круг неба» называецца «кругам неба Цзы-У[215]», «вярчэннем Т'ень і Кунь»[216], «вярчэннем Хэ́чэ»[217]. Ужо на вельмі нізкім узроўні ад вярчэння «вялікага круга неба» фармуецца паток энергіі, які паступова павялічвае сваю гушчыню. Пераходзячы на больш высокія ўзроўні, «вялікі круг неба» ператвараецца ў пояс энергіі вельмі вялікае гушчыні. Гэты паток энергіі круціцца, знаходзіцца ў працэсе вярчэння. Пры дапамозе нябеснага вока на вельмі нізкім узроўні мы ўжо можам заўважыць, што гэты паток энергіі ў працэсе свайго вярчэння можа прыводзіць да таго, што ці вантробаў чалавека памяняюцца месцамі: ці сэрца пераходзіць у кішэчнік, ці печані апынаецца ў страўніку... У мікрасвеце можна бачыць, што пояс энергіі перасоўвае вельмі буйныя рэчы, і калі выпусціць гэты пояс энергіі за межы цела, гэта будзе звышнатуральная здольнасць «перамяшчальны Ґун»[218]. Людзі, якія маюць вельмі магутны Ґун, могуць перасунуць вялікі прадмет, гэта «вялікае перамяшчэнне». Людзі, у якіх вельмі слабы Ґун, могуць перасунуць маленькі прадмет, гэта «малое перамяшчэнне». Такой з'яўляецца форма перамяшчальнага Ґун і яго ўтварэння.

«Вялікі круг неба» — гэта ўжо непасрэдна выпрацоўка Ґун, таму ён прыносіць розныя станы і формы Ґун. Ён таксама прывядзе нас у адзін вельмі адмысловы стан. Які менавіта? Вы, напэўна, чыталі ў такіх старадаўніх кнігах, як «Біяграфіі несмяротных» альбо «Унутраная алхімія», «Даоскі скарб», «Дасканалы змест духоўнага і фізічнага» такі выраз, як «узлёт[219] сярод белага дня», які азначае, што чалавек узлятае на вачах ва ўсіх. Скажу вам, калі прабіты «вялікі круг неба», тады чалавек ужо сапраўды зможа ўзняцца ў паветра. Гэта менавіта так проста. Хтосьці з вас падумаў: «Людзі практыкуюць ужо па столькі гадоў. Тых, у каго прабіты «вялікі круг неба», мусіць быць нямала». Калі я скажу, што шмат дзясяткаў тысяч чалавек здольныя дасягнуць гэтага стану, дык і тады не памылюся, бо ўсё ж такі «вялікі круг неба» — гэта толькі самы пачатак практыкі.

У такім разе чаму тады ніхто не бачыць, як гэтыя людзі ўзносяцца, як уздымаюцца ў паветра? Справа ў тым, што нельга парушаць стан грамадства звычайных людзей, нельга адвольна парушаць ці змяняць форму грамадства звычайных людзей. Ці можна дазволіць, каб людзі лёталі па небе? Ці будзе тады гэта яшчэ грамадствам звычайных людзей? Гэта галоўны аспект. Іншы аспект у тым, што людзі жывуць сярод звычайных людзей не для таго, каб быць людзьмі, а для таго, каб вярнуцца туды, адкуль яны паходзяць. Таму тут таксама існуе пытанне ўсведамлення. Калі б хто-небудзь убачыў, што многія людзі сапраўды могуць узляцець, тады б ён таксама пайшоў удасканальвацца, і ўжо б не існавала пытання ўсведамлення. Таму, калі нават ты і дасягнуў гэтага ў выніку самаўдасканальвання, табе нельга адвольна паказваць гэта іншым. Не дазваляецца, каб людзі ўсё гэта ўбачылі, бо іншыя таксама павінны ўдасканальвацца. Таму, пасля прабіцця «вялікага круга неба», трэба замкнуць кончык пальца тваёй рукі, нагі альбо нейкую частку цела, і тады ты ўжо не зможаш узляцець.

Калі набліжаецца момант прабіцця «вялікага круга неба», з'яўляецца такі стан: у некаторых падчас сядзення ў медытацыі тулава ўвесь час нахіляецца наперад. З прычыны таго, што на спіне «вялікі круг неба» прабіты даволі добра, спіна неверагодна лёгкая, а ў пярэдняй частцы адчуваецца цяжар. У іншых цела нахіляецца назад, гэта значыць у спіне адчуваецца цяжар, а перад лёгкі. Калі ў цябе ўсё будзе прабіта вельмі добра, тады ты будзеш падскокваць угару, і табе будзе здавацца, што ты можаш узляцець, што ты адрываешся ад зямлі. Калі ты сапраўды зможаш, табе не дазволяць гэта рабіць. Але гэта не з’яўляецца катэгарычным. Звышздольнасці ўзнікаюць у людзей на двух канцах: у дзяцей няма навязлівых ідэяў, як і ў пажылых, асабліва ў пажылых жанчын. У іх лягчэй праяўляюцца і захоўваюцца гэтыя здольнасці. А калі мужчыны, асабліва маладыя, здабудуць здольнасці, яны не могуць пазбавіцца ад схільнасці паказваць сябе. У той жа час яны, верагодна, паставяцца да іх як да сродку канкурэнцыі сярод звычайных людзей. Вось ім і не дазваляюць мець здольнасці. Калі ў іх нават і ўзнікнуць такія звышздольнасці, трэба заблакаваць іх. Трэба замкнуць толькі частку цела, і чалавек ужо не зможа ўзляцець. Гэта не значыць, што табе ні ў якім разе не дазволяць, каб у цябе ўзнік такі стан. Табе могуць даць паспрабаваць, у некаторых гэта можа захавацца.

Такія выпадкі сустракаліся паўсюдна, дзе былі арганізаваныя курсы. Калі я чытаў лекцыі ў правінцыі Шаньдун, там былі вучні і з горада Дзінань, і з Пекіна. Хтосьці з іх сказаў: «Настаўніку, што са мной? Калі іду вуліцай, адчуваю, што ледзь не адрываюся ад зямлі. Калі дома кладуся спаць, узлятаю ўгару. Накрываюся коўдрай, і нават коўдра ўзлятае ўгару. Увесь час узлятаю, нібы паветраны шар». Калі я чытаў лекцыі ў горадзе Ґуйян, там была дасведчаная вучаніца з правінцыі Ґуйджоў — старая жанчына. У яе дома стаяць два ложкі, па адным ля супрацьлеглых сценаў. Яна сядзела на ложку ў медытацыі і тут адчула, што ўзляцела. Расплюшчыўшы вочы, вучаніца ўбачыла, што ўжо пераляцела на іншы ложак. Яна падумала: «Мне трэба вярнуцца назад!» — і зноў пераляцела на першы ложак.

Адзін вучань з горада Ціндаў сеў медытаваць на ложку падчас абедзеннага перапынку ў пустым пакоі. Ледзь сеўшы, ён пачаў вельмі моцна падскокваць больш чым на метр. Узлятаў ды з шумам падаў. Так і паўтаралася, ад чаго нават коўдра спаўзла на падлогу. Ён адчуваў лёгкае ўзрушэнне, хоць і трохі баяўся, так працягвалася ўвесь час абедзеннага перапынку. Напрыканцы прагучаў званок пра пачатак працы, і вучань падумаў: «Нельга дазваляць іншым убачыць гэта. Што гэта я раблю? Хутчэй бы спыніцца». І адразу спыніўся. Пажылыя людзі могуць трымаць сябе ў руках. Калі б гэта здарылася з маладым, тады, калі б прагучаў званок на працу, ён бы падумаў: «Няхай усе прыйдуць і паглядзяць, як я ўзлятаю». Гэта сведчыць пра тое, што чалавеку цяжка трымаць сябе ў руках, калі яго адольвае імкненне паказаць сябе: «Паглядзі, як я выдатна практыкую. Я магу ўзляцець». Гэта не дазваляецца. Як толькі ён стане сябе паказваць, усё знікне. Такіх выпадкаў вельмі шмат. Яны могуць сустрэцца сярод нашых вучняў з любых рэгіёнаў.

У нас з самага пачатку патрабуецца, каб усе каналы цалкам адкрыліся. На сённяшні дзень 80-90 адсоткаў з нас ужо дасягнулі стану лёгкасці ва ўсім целе, стану, калі няма хваробаў. Разам з тым, як мы ўжо казалі, на гэтых курсах мы не толькі прасунем цябе да такога стану, цалкам ачысцім твой арганізм, але і ўкладзем у цябе шмат рэчаў, каб у цябе ўжо на нашых курсах з’явіўся Ґун. Гэта ўсё адно, што я падымаю цябе ды прасоўваю наперад. На курсах я ўвесь час выкладаю ўсім вам Закон. Ваш Сіньсін таксама ўвесь час змяняецца. Многія з вас, выйшаўшы з гэтае залы, адчуюць, што нібыта сталі іншымі людзьмі. Магу запэўніць, што змяніўся і твой светагляд. Ты ўжо ведаеш, як у будучыні быць чалавекам, ведаеш, што больш нельга быць такім някемлівым. Гарантую, што гэта так. Такім чынам ваш Сіньсін ужо дагнаў.

Хоць пасля прабіцця «вялікага круга неба» табе не дадуць узляцець, але ты адчуеш лёгкасць ва ўсім целе і сваёй хадой будзеш ствараць вецер. Раней, ледзь прайшоўшы некалькі крокаў, ты ўжо стамляўся. Зараз, які б далёкі шлях ні пераадолеў, будзеш пачувацца вельмі лёгка. Калі ты едзеш на ровары, дык цябе нібы хтосьці штурхае. Як бы высока ты ні падымаўся па сходах, незалежна ад таго, на які паверх, усё адно не стомішся. Гарантую, што так будзе. Той, хто чытае гэтую кнігу і ўдасканальваецца самастойна, таксама зможа дасягнуць належнага стану. Я такі чалавек: калі я не хачу пра штосьці распавядаць, тады магу змаўчаць, але калі распавёў, дык гэта праўда. Асабліва ў такіх абставінах, калі б я не казаў праўду падчас выкладання Закону, а казаў бы пустыя словы і, будучы не ў змозе нічым гэта падмацаваць, наўздагад распавядаў бы абы што, тады б я навучаў вас няправеднаму метаду. Рабіць гэтую справу мне таксама няпроста. Увесь Сусвет назірае! Нельга ні ў чым адхіляцца.

Звычайныя людзі ведаюць толькі пра існаванне такога «вялікага круга неба», і ўсё. Насамрэч гэтага яшчэ недастаткова. Каб дасягнуць як мага больш хуткае замены, пераўтварэння цела матэрыяй высокай энергіі, патрэбна цыркуляцыя

яшчэ адное формы «круга неба», якая б стымулявала цыркуляцыю ва ўсіх каналах твайго цела. Гэта называецца «круг неба Ма́ў-Ёў»[220], пра які, магчыма, ужо мала хто ведае. У кнігах часам згадваецца такі тэрмін, але ніхто яго не тлумачыць, ніхто не распавядае пра яго. Толькі віляюць навокал тэорыі. Гэта ж таямніца з таямніцаў. А мы тут усё табе распавядзем: «круг неба Маў-Ёў» пачынаецца ў кропцы байхўэй (ці ў кропцы хўэйінь), ідзе мяжой бакоў інь і ян цела, спускаецца па вушной ракавіне да пляча, потым адтуль уніз да рукі, абгінае адзін за адным усе пальцы, затым ідзе па баку цела, праходзіць праз ступню і падымаецца ўнутраным бокам сцягна. Потым ён пераходзіць да іншага сцягна, зноў апускаецца, зноў праходзіць праз ступню. Потым падымаецца па баку цела, зноў абгінае адзін за адным усе пальцы і, зрабіўшы поўны круг, даходзіць да макаўкі. Гэта і ёсць «круг неба Маў-Ёў». Іншыя маглі б напісаць пра гэта цэлую кнігу. А мне, каб распавесці, было дастаткова ўсяго некалькіх сказаў. Мне здаецца, гэта нельга лічыць нейкай нябеснай таямніцай. Але іншыя лічаць гэтыя рэчы вельмі каштоўнымі, таму зусім не распавядаюць пра іх. Кажуць пра «круг неба Маў-Ёў» толькі тады, калі сапраўды вучаць паслядоўніка. Хоць я пра яго і распавёў, але нікому з вас нельга практыкаваць, накіроўваючы яго пры дапамозе думак, кіруючы ім. Калі ты будзеш так практыкаваць, гэта ўжо не будзе наш Фалунь Дафа. Сапраўднае ўдасканальванне на высокія ўзроўні праходзіць у стане Нядзеяння і не змяшчае аніякае дзейнасці думак. Усё цалкам укладваецца ў цябе ў гатовым выглядзе. Усё гэта фармуецца аўтаматычна. Гэтыя ўнутраныя механізмы цябе загартоўваюць. Калі прыйдзе час, яны самі пачнуць вярцецца. Аднаго дня падчас практыкі галава ў цябе пачне нахіляцца. Калі яна нахіляецца ў гэты бок, значыць, механізм круціцца ў гэты бок. Калі галава нахіляецца ў той бок, значыць, ён круціцца ў той бок. Ён будзе круціцца ў абодва бакі.

Пасля прабіцця «вялікага і малога круга неба», падчас сядзення ў медытацыі практыкоўцы ківаюць галавой. Гэта з’яўляецца прыкметай праходжання энергіі. Тое ж самае адбываецца і тады, калі мы займаемся па метадзе «Круг неба Фалунь». Мы так і практыкуем. Насамрэч, ён круціцца і тады, калі ты не практыкуеш. Ён круціцца заўсёды. Калі ты практыкуеш, ты ўзмацняеш гэты механізм. Хіба мы не вучым таму, што Закон выплаўляе чалавека? У паўсядзённы час ты можаш заўважыць, што твой «круг неба» ўвесь час цыркулюе. Хоць ты не займаўся, але ўсталяваныя вакол цела чалавека цідзі — знешнія вялікія каналы — прыводзяць тваё цела ў стан практыкі. Яны цалкам аўтаматычныя. Цідзі круцяцца ў той ды іншы бок, кожнае імгненне прабіваюць твае каналы.

У чым жа мэта прабіцця «круга неба»? Само яго прабіццё — не мэта практыкі. Нават калі ты прабіў «круг неба», я сказаў бы, што гэта нішто. Трэба ўдасканальвацца далей, каб шляхам гэтае формы «круга неба» адзін канал вёў усе каналы, прывёў да поўнага адкрыцця ўсіх каналаў цела. Мы ўжо працуем над гэтым. Далей у практыцы падчас цыркуляцыі «вялікага круга неба» некаторыя заўважаць, што ад практыкі каналы становяцца вельмі шырокімі, таўшчынёй з палец рукі, унутры вельмі шырокімі. З прычыны таго, што энергія

ўжо вельмі магутная, пасля ўтварэння патоку энергіі каналы будуць вельмі шырокія ды вельмі яскравыя. Калі гэта яшчэ нічым не лічыцца, тады да якога ж стану трэба давесці нашую практыку? Трэба дабіцца таго, каб усе каналы чалавечага цела паступова пашыраліся, каб энергія станавілася ўсё мацней ды мацней, усе каналы станавіліся ўсё святлей ды святлей, каб урэшце звыш дзясятка тысяч каналаў з’ядналіся ў адно цэлае, каб усё цела чалавека аказалася ў такім стане, калі не існуе ані каналаў, ані акупунктурных кропак. Каб увесь арганізм, з’яднаўшыся, стаў маналітным. Вось у чым канчатковая мэта прабіцця каналаў. Мэта ў тым, каб усё цела чалавека было пераўторанае ў матэрыю высокай энергіі.

Калі чалавек дайшоў да гэтага этапу ў практыцы, яго цела ў асноўным ужо пераўторана матэрыяй высокай энергіі; іншымі словамі, ён ужо дайшоў да найвышэйшага ўзроўню ва ўдасканальванні па Законе чалавечага свету. Фізічная плоць цела чалавека ўжо ўдасканалілася да самае вяршыні. Дасягненне такога этапу таксама прыводзіць чалавека ў пэўны стан. І які ж стан? Выпрацаваны Ґун стаў надзвычай багатым. У ходзе ўдасканальвання цела звычайнага чалавека, гэта значыць у ходзе ўдасканальвання па Законе чалавечага свету, усе экстрасэнсорныя здольнасці (схаваныя магчымасці) чалавека ўжо праяўленыя. Але падчас удасканальвання сярод звычайных людзей, большасць з іх замкнёная. Апроч таго, слуп Ґун чалавека ўжо дасягае даволі вялікае вышыні, усе формы Ґун узмацніліся магутным Ґун і сталі надзвычай магутнымі. Але яны дзейнічаюць толькі ў нашай прасторы і не могуць уплываць на іншыя прасторы. Бо гэта толькі звышздольнасці, праяўленыя ўдасканальваннем фізічнага цела звычайнага чалавека. Аднак яны ўжо неймаверна багатыя. У кожнай прасторы, ва ўсялякіх формах існавання цела розных прастораў адбыліся каласальныя змены. Рэчы, якія мае цела… рэчы, якія мае цела ў кожнай прасторы, надзвычай багатыя і на выгляд вельмі страшныя. У некаторых людзей усё цела пакрыта вачыма, усе потавыя поры з’яўляюцца вачыма. Ва ўсёй сферы яго прасторавага поля паўсюль вочы. Гэта ж Ґун школы Буды, таму ў некаторых усё цела пакрываюць вобразы Бадгісатвы, Буды. Усялякія формы Ґун ужо дасягнулі надзвычай багатага стану. Апроч таго, з’яўляецца мноства жывых істот.

У гэты час можа з'явіцца і такі стан, які называецца «тры кветкі збіраюцца на макаўцы». Гэта вельмі выразны стан, які кідаецца ў вочы. Яго здольныя ўбачыць нават тыя, у каго нябеснае вока невысокага ўзроўню. На галаве з’яўляюцца тры кветкі. Адна з іх — лотас, але не лотас нашае матэрыяльнае прасторы. Іншыя дзве кветкі таксама з іншых прастораў. Яны неверагодна прыгожыя. Тры кветкі круцяцца на макаўцы па гадзіннікавай стрэлцы і ў адваротным кірунку. Ды яшчэ кожная з іх круціцца таксама вакол сваёй восі. У кожнай кветкі — вялікі слуп таўшчынёй з дыяметр самой кветкі. Тры вялікія слупы вядуць проста ў зеніт. Гэта зусім не слуп Ґун, у іх усяго толькі такая форма, надзвычай таямнічая. Калі б ты іх убачыў на ўласныя вочы, тады б моцна спалохаўся. На гэтай стадыі ўдасканальвання цела чалавека становіцца вельмі чыстым, скура — далікатнай. У гэты час ты дасягнуў найвышэйшае

формы ўдасканальвання па Законе чалавечага свету. Але гэта яшчэ не значыць, што ты дасягнуў вяршыні. Трэба ўдасканальвацца далей, трэба далей ісці наперад.

Зрабіўшы яшчэ крок наперад, ты ўвойдзеш у пераходную стадыю паміж Законам чалавечага свету і Законам за межамі чалавечага свету. Гэта называецца станам «чыста-белага цела» (альбо станам крышталёва-чыстага цела). Калі ўдасканальванне дайшло да самай высокай стадыі ўдасканальвання па Законе чалавечага свету, тады ўсяго толькі здзейснена пераўтварэнне фізічнага цела ў найвышэйшую форму. Калі ты сапраўды ўвайшоў у такую стадыю, тады ўвесь твой арганізм ужо цалкам складаецца з матэрыі высокай энергіі. Чаму ж ён называецца чыста-белым целам? Гэта таму, што ён ужо дасягнуў абсалютнае чысціні. Калі глядзець нябесным вокам, тады ўсё цела з'яўляецца празрыстым, нібы шкло. Выглядае так, нібы ў ім нічога няма. Можа праявіцца такі стан і, шчыра кажучы, гэта ўжо цела Буды, бо цела, якое складаецца з матэрыі высокай энергіі, ужо адрозніваецца ад нашага ўласнага. У гэты час усе звышздольнасці, якія з'явіліся ў целе, ды ўсё іншае, накшталт магічных рэчаў, адразу ўсе выкідаюцца, выгружаюцца ў адну вельмі глыбокую прастору. Ад іх ужо няма аніякае карысці, і з гэтага часу яны больш непатрэбныя. Толькі ў дзень, калі ты завершыш самаўдасканальванне і спасцігнеш Даа, калі захочаш зірнуць назад, на працэс свайго ўдасканальвання, ты дастанеш іх ды агледзіш. У гэты час застануцца толькі дзве рэчы: слуп Ґун і Дасканалае немаўля, якое ўжо вырасла вялікім дзякуючы ўдасканальванню. Але яны знаходзяцца ў адной вельмі глыбокай прасторы, і звычайныя людзі з нябесным вокам нізкага ўзроўню не бачаць іх. Яны могуць бачыць толькі тое, што цела ў гэтага чалавека празрыстае.

З прычыны таго, што «стан чыста-белага цела» з’яўляецца пераходным узроўнем, калі ўдасканальвацца далей, чалавек сапраўды ўваходзіць у стадыю ўдасканальвання па Законе за межамі чалавечага свету, або, па-іншаму, удасканальвання цела Буды. Тады ўвесь арганізм будзе складацца з Ґун, а Сіньсін у чалавека стане стабільным. Чалавек зноў пачне ўдасканальвацца, у яго зноў з'явяцца звышздольнасці, якія называюцца ўжо не звышздольнасцямі, а цудатворнай сілай Закону Буды. Яна ўплывае на ўсе прасторы разам і кожную асобна, мае бязмежную моц. У будучыні па меры таго, як ты будзеш бесперапынна ўдасканальвацца, і будуць праяўляцца рэчы яшчэ больш высокіх узроўняў, ты сам будзеш ведаць, як трэба ўдасканальвацца, якія існуюць формы ўдасканальвання.

## РАДАСЦЬ

Абмяркуем адну праблему. Гэта тычыцца радасці. Многія займаюцца ціґун працяглы час, але ёсць і такія, якія, хоць і ніколі не займаліся ціґун, але ўсё жыццё шукаюць ісціну, сапраўдны сэнс жыцця чалавека, думаюць пра гэта. Калі

такія людзі сталі вучыцца нашаму Фалунь Дафа, яны адразу зразумелі вельмі шмат таго, што хацелі зразумець у сваім жыцці, але так і не зразумелі. Верагодна, гэта суправаджаецца ўздымам мыслення, і яны адчуваюць надзвычайнае хваляванне. Гэта дакладна. Я ведаю, што тыя, хто сапраўды ўдасканальваецца, ведаюць важнасць гэтага, што яны даражаць гэтым. Але часта ўзнікае такая праблема. З-за таго, што чалавек усцешыўся, узнікае залішняя радасць, пад уздзеяннем якой ён у зносінах з людзьмі, у асяроддзі грамадства звычайных людзей праяўляе сябе ненармальна па форме. Я сказаў бы, што гэта ўжо кепска.

Удасканальванне па нашай школе, галоўным чынам, праходзіць у грамадстве звычайных людзей, і нельга дазваляць сабе адрывацца ад жыцця грамадства. Неабходна цалкам свядома ўдасканальвацца. У цябе ўсё яшчэ застануцца нармальныя стасункі з людзьмі. Безумоўна, Сіньсін твой павінен быць вельмі высокім, стан душы — вельмі праведным; падвышаючы ўласны Сіньсін ды ўзровень, не будзеш рабіць благіх учынкаў, а будзеш рабіць добрыя. Усяго толькі вось так будзеш сябе праяўляць. Некаторыя паводзяцца быццам ненармальныя, нібыта яны спазналі ілюзорнасць чалавечага свету. Іх слоў людзі таксама не разумеюць. Людзі кажуць: «Чаму, пачаўшы вучыцца Фалунь Дафа, гэты чалавек стаў такім, нібыта ў яго клёку ў галаве няма?». Насамрэч, гэта не так, проста некаторыя знаходзяцца ва ўзрушаным, усхваляваным стане, таму чыняць насуперак розуму. Падумай: калі ты так робіш, дык гэта няправільна, бо ты кінуўся ў іншую крайнасць, а гэта зноў навязлівая ідэя. Ты павінен вызваліцца ад усяго гэтага, у асяроддзі звычайных людзей трэба, як усе іншыя, жыць нармальным жыццём і ўдасканальвацца. Звычайныя людзі глядзяць на цябе як на таго, хто не пры сваім розуме, ніхто не ставіцца да цябе як да роўнага, усе трымаюцца ад цябе падалей. Ніхто не дае табе шанец падвысіць свой Сіньсін, ніхто не прымае цябе за нармальнага. Я лічу, што так нельга! Таму ўсе вы ў любым выпадку звярніце на гэта ўвагу. Абавязкова добра трымайце сябе ў руках.

Наш ґунфа адрозніваецца ад звычайных метадаў практыкі, у якіх займаюцца ў несвядомым, туманным ці неразумным стане. Наш метад практыкі патрабуе, каб ты цалкам свядома ўдасканальваў сябе. Адзін з вас увесь час кажа: «Настаўніку, як толькі я заплюшчваю вочы, дык пачынаю пахіствацца». Я адказваю, што наўрад ці гэта так. Ты ўжо прызвычаіўся адмаўляцца ад сваёй галоўнай свядомасці. Як толькі заплюшчваеш вочы, дык адразу расслабляеш галоўную свядомасць, і тая знікае. Ты ўжо выпрацаваў такую звычку. Чаму ты, седзячы тут, не пахістваешся? Трымай вочы расплюшчанымі, потым злёгку прымруж іх — пахістваешся? Зусім не. Ты лічыш, што гэтым ціґун трэба займацца менавіта так, у цябе ўжо сфармавалася такая канцэпцыя. Ледзь ты заплюшчыш вочы, як ты ўжо знікнеш, куды ты падзеўся, таксама не ведаеш. Мы навучаем таму, што твая галоўная свядомасць абавязкова павінна заставацца цвярозай, бо гэты метад практыкі ўдасканальвае цябе самога. І ты мусіш падвышацца цалкам свядома. У нас таксама ёсць статычная практыка. Як яе выконваць? Нашае патрабаванне такое: як бы глыбока ты ні ўвайшоў у

медытацыю, ты павінен усведамляць, што ты вось тут выконваеш практыку. Катэгарычна не дазваляецца ўваходзіць у такі стан, калі ўжо нічога не ведаеш. У такім выпадку які канкрэтна ўзнікне стан? Калі ты там сядзіш, дык пачуваешся так цудоўна, нібыта сядзіш у шкарлупіне курынага яйка. Гэта будзе надзвычай прыемны стан. Ты ведаеш, што займаешся, але адчуваеш, што цела не можа варухнуцца. Усё гэта неадменна з'яўляецца ў гэтым нашым метадзе практыкі. Бывае іншы стан: сядзіш-сядзіш і тут выяўляеш, што ў цябе зніклі ногі, ніяк не згадаеш, куды яны падзеліся; знікла і тулава, і рукі, і кісці. Засталася толькі галава. Калі практыкуеш далей, тады выяўляеш, што і галава знікла. Засталося толькі тваё мысленне, малюсенькая думка: «Я ведаю, што я тут практыкую». Нам трэба дасягнуць толькі такога стану, і досыць. Чаму? Калі чалавек так практыкуе, у яго целе ў найбольш поўнай меры адбываецца эвалюцыя. Гэта найлепшы стан. Таму мы патрабуем, каб ты паглыбіўся ў медытацыю і знаходзіўся ў такім стане. Аднак не засні, не задрамі, інакш добрыя рэчы, верагодна, дазволіш выпрацаваць ды забраць іншым.

Усе нашыя практыкоўцы, у любым выпадку, звяртайце асаблівую ўвагу на тое, каб не паводзіцца ненармальна сярод звычайных людзей. Калі сярод звычайных людзей вы не будзеце адыгрываць станоўчае ролі, і людзі будуць казаць, маўляў, чаму ўсе, хто пачынае вучыцца Фалунь Дафа, становяцца такімі, тады гэта будзе раўназначна псаванню рэпутацыі Фалунь Дафа. Абавязкова будзь пільным у гэтым. У іншых аспектах удасканальвання і ў яго працэсах таксама звяртай увагу на тое, каб не спараджаць радасць. Ёй вельмі лёгка карыстаюцца дэманы.

## УДАСКАНАЛЬВАННЕ ГАВОРКІ

«Удасканальвай гаворку», — у мінулым у рэлігіях таксама так казалі. Але ў той час гэта тычылася галоўным чынам тых, хто ўдасканальваўся прафесійна — будыйскіх манахаў, даосаў; патрабавалася, каб яны закрывалі рот і маўчалі. З прычыны таго, што яны ўдасканальваліся прафесійна, іх мэта была ў тым, каб максімальна пазбавіцца ад навязлівых ідэяў чалавека, бо яны лічылі, што ледзь чалавек пра нешта падумае — гэта ўжо карма. У рэлігіях карма падзялялася на два віды: добрую ды злую. Незалежна ад таго, добрая ці злая карма, згодна з Пустатой школы Буды і Нічым школы Даа, ані тую, ані іншую не трэба ствараць. Таму яны кажуць: «Я нічога не раблю». Яны не бачаць наканаваных сувязяў рэчаў ды з'яў, не могуць разабрацца, ці добрая гэта справа ўрэшце, ці благая, якая ў ёй прычынная сувязь. Тыя, хто ўдасканальваецца на невысокім узроўні, не бачаць гэтых рэчаў, таму яны баяцца, што справа, якая выглядае добрай, калі яе зрабіць, магчыма, акажацца благой. Таму яны па меры магчымасці стараюцца прытрымлівацца Нядзеяння. Яны нічога не робяць, каб пазбегнуць новае кармы. Бо калі чалавек стварыў карму, дык яму давядзецца ад яе пазбавіцца, давядзецца трываць пакуты. Дапусцім, было ўжо запланавана, калі і на якой стадыі адкрыць Ґун у тых, хто ўдасканальваецца па нашай школе, але

на паўдарозе ты яшчэ дадаў нейкія лішнія рэчы і гэтым стварыў цяжкасці для ўсяго ўдасканальвання. Таму манахі і даосы прытрымліваюцца Нядзеяння.

Пад удасканальваннем гаворкі, пра якое кажуць у школе Буды, маецца на ўвазе тое, што гаворка чалавека кантралюецца яго свядомасцю. А гэтая свядомасць *ужо* поўная дзеяння[221]. Калі сама свядомасць чалавека хоча пра нешта падумаць і штосьці сказаць, штосьці зрабіць, кіраваць органамі пачуццяў і канечнасцямі, тады ўсё гэта, верагодна, будзе відам навязлівай ідэі. Вось, напрыклад, паміж людзьмі існуюць супярэчнасці: ты добры, а ён благі, ты ўдасканальваешся добра, а ён — дрэнна. Само гэта ўжо з'яўляецца супярэчнасцямі. Возьмем для прыкладу самае звычайнае: «Я хачу зрабіць тое ці гэта, я лічу, што гэта трэба рабіць так і так». Магчыма, ужо неспадзявана пакрыўдзіў некага, бо супярэчнасці паміж людзьмі вельмі складаныя. Магчыма, так ненаўмысна была створаная карма. Такім чынам, яны закрываюць рот і захоўваюць абсалютнае маўчанне. У мінулым у рэлігіі заўсёды лічылі ўдасканальванне гаворкі вельмі істотным. Так гаварылася ў рэлігіі.

Абсалютная большасць удасканальвальнікаў нашага Фалунь Дафа ўдасканальваецца сярод звычайных людзей (акрамя паслядоўнікаў-прафесіяналаў). А значыць, яны не могуць пазбегнуць нармальнага жыцця ў грамадстве звычайных людзей ды стасункаў у грамадстве. У кожнага ёсць свая праца, ды яшчэ трэба добра яе выконваць. Для некаторых з вас гаварыць — вашая праца. Тады ці няма тут супярэчнасці? Няма. Чаму няма? Удасканальванне гаворкі, якому мы навучаем, карэнным чынам адрозніваецца ад таго, што было ў рэлігіях. У розных школах удасканальвання розныя патрабаванні. Калі мы адкрываем рот і пачынаем гаварыць, тады заўжды гаворым згодна з Сіньсін практыкоўцы, не кажам такога, што правакуе сваркі, не кажам абразлівых слоў. Як удасканальвальнікам, нам трэба ацэньваць сябе па крытэрах Закону: патрэбна ці не патрэбна гэта казаць. Калі твае словы адпавядаюць стандарту Сіньсін практыкоўцы з пункту гледжання Закону, тады праблемы не будзе. Ды яшчэ мы павінны таксама распавядаць пра Закон, распаўсюджваць Закон, таму нам нельга не гаварыць. Пад удасканальваннем гаворкі, пра якое мы кажам, маецца на ўвазе наступнае: не трэба балбатаць пра славу і выгаду, якія турбуюць удасканальвальніка сярод звычайных людзей, і пра тое, што не мае ніякага дачынення да яго фактычнае працы ў грамадстве; альбо калі паслядоўнікі адное школы пустасловяць паміж сабой; альбо калі падбухтораны навязлівай ідэяй паказваеш сябе; альбо калі распаўсюджваеш пачутыя краем вуха плёткі; альбо калі вельмі ўзрушана ды ахвотна абмяркоўваеш нейкія іншыя грамадскія падзеі. На маю думку, усё гэта навязлівыя ідэі звычайных людзей. Я лічу, што, уласна, у гэтых аспектах мы павінны ўдасканальваць сваю гаворку. Гэта і ёсць удасканальванне гаворкі, якому мы навучаем. У мінулым манахі лічылі гэтыя рэчы вельмі важнымі, бо варта ім было толькі пра нешта падумаць, як яны ўжо стваралі карму. Таму яны прытрымліваліся прынцыпу «цела, гаворка, думкі». Іх «удасканальванне цела» азначала, што чалавек не павінен здзяйсняць благіх учынкаў. «Удасканальванне гаворкі» азначала, што чалавек павінен маўчаць.

«Удасканальванне думак» азначала нават не думаць. У мінулым у манастырскім прафесійным удасканальванні гэтага патрабавалі вельмі сурова. А мы прад’яўляем да сябе патрабаванні па стандарту Сіньсін практыкоўцы. Калі добра разумееш, што можна казаць, а што не, тады гэтага ўжо дастаткова.

## ЛЕКЦЫЯ ДЗЯВЯТАЯ

### ЦІҐУН І СПОРТ

Знаходзячыся на звычайным узроўні, людзі схіляюцца да меркавання, што ціґун і спорт непасрэдна звязаныя паміж сабой. З пазіцыі нізкага ўзроўню з мэтай набыцця моцнага здароўя, ціґун і спорт маюць аднолькавую накіраванасць. Аднак паміж імі існуе вялікае адрозненне ў сродках, якія выкарыстоўваюцца, і ў канкрэтных метадах загартоўкі. З мэтай набыцця моцнага здароўя спорт павялічвае нагрузку, узмацняе трэніроўку, а ўдасканальванне ў ціґун, акурат наадварот, патрабуе, каб чалавек не рухаўся, а калі і рухаўся, дык плаўна, павольна і кругападобна, і нават захоўваў нерухомы стан. У гэтым ціґун вельмі адрозніваецца па форме ад заняткаў спортам. А з пункту гледжання высокіх узроўняў мэта ціґун не толькі ў лекаванні хваробаў ды ўмацаванні арганізма, ён мае рэчы больш высокіх узроўняў, больш глыбокі змест. Ён не абмяжоўваецца чымсьці, што прыналежыць да ўзроўню звычайных людзей, а ўяўляе сабой нешта звышнатуральнае ды яшчэ на розных узроўнях праяўляецца ў рознай форме. Ён значна перавышае рэчы звычайных людзей.

У сутнасці трэніроўкі таксама назіраюцца вялікія адрозненні паміж ціґун і спортам. Ад спартоўцаў патрабуецца павелічэнне трэніравальнае нагрузкі, асабліва ад сучасных спартоўцаў. Каб прыстасаваць сябе фізічна да ўзроўню сучаснае спартовае падрыхтоўкі ды адпавядаць нарматывам, спартоўцы мусяць увесь час падтрымліваць свой арганізм у найлепшым стане. Каб дасягнуць такое мэты неабходна павялічваць трэніравальную нагрузку, стымуляваць кровазварот і гэтым самым узмацняць метабалічную здольнасць у клетках, дазваляючы арганізму заўжды захоўваць стан уздыму. Чаму абавязкова трэба ўзмацняць метабалічную здольнасць? Бо цела спартоўца павінна пастаянна знаходзіцца ў найлепшай для спаборніцтваў спартовай форме. Чалавечае цела складаецца з незлічонае колькасці клетак, якія праходзяць некалькі фазаў развіцця. Новыя клеткі маюць падвышаную жыццяздольнасць і актыўнасць, яны ўваходзяць у стан росту. А калі даходзяць да мяжы свайго развіцця, спыняюць рост, пачынаюць страчваць актыўнасць. І калі яна падае да ніжняе мяжы, ім на змену прыходзяць новыя клеткі. Возьмем для прыкладу дванаццацігадзінны цыкл. Скажам, а шостай раніцы адбываецца дзяленне клетак, пасля чаго ўсе клеткі знаходзяцца ў стане ўздыму. А восьмай, дзявятай, дзясятай гадзіне для іх цудоўны час. Але а дванаццатай гадзіне клеткі ўжо не могуць знаходзіцца ў стане ўздыму, а ўжо толькі ў стане спаду. У той час у клетак яшчэ застаецца палова жыццяздольнасці. Але гэтая палова жыццяздольнасці ўжо непрымальная для стану спаборніцтваў атлетаў.

Што ж рабіць? Атлеты ўзмацняюць трэніроўку, паскараюць кровазварот, каб новымі клеткамі замяніць старыя. Вось якім шляхам ідуць нашыя спартоўцы. Гэта значыць, клеткі яшчэ не скончылі ўвесь свой жыццёвы працэс, а толькі прайшлі яго палову, як іх ужо выдзяляюць[222]. Таму цела спартоўцаў застаецца моцным, захоўвае стан уздыму. Аднак клеткі чалавека не могуць дзяліцца бясконца. Колькасць дзяленняў клетак абмежаваная. Дапусцім, за ўсё жыццё чалавека яго клеткі могуць дзяліцца сто разоў (насамрэч гэта можа адбыцца больш за адзін мільён разоў). Дапусцім, нармальны чалавек здольны пражыць сто гадоў, калі дзяленне клетак у яго адбываецца сто разоў. Аднак цяпер яго клеткі дажываюць толькі да паловы свайго жыцця, і ён будзе жыць тады ўсяго толькі пяцьдзясят гадоў. Але мы не бачылі спартоўцаў, у якіх бы ўзніклі сур'ёзныя праблемы, бо сучасныя спартоўцы сыходзяць са спорту да трыццаці гадоў. Асабліва цяпер, калі спартовыя спаборніцтвы знаходзяцца на высокім узроўні, назіраецца масавае адсейванне спартоўцаў, таму ў іх ізноў нармалізуецца жыццё. У выніку чаго знешне не бачна, каб заняткі спортам неяк значна на іх паўплывалі. З пункту гледжання тэорыі лад жыцця спартоўцаў, з аднаго боку, захоўвае чалавеку здаровы арганізм, а з іншага — скарачае яго жыццё. На выгляд спартоўцу-падлетку можна даць дваццаць з лішкам гадоў, а спартоўцу, якому больш за дваццаць, можна даць трыццаць з лішкам гадоў. У большасці выпадкаў спартоўцы выглядаюць заўчасна сталымі ды пастарэлымі. У гэтым ёсць і станоўчае, і адмоўнае — мы глядзім на гэта дыялектычна. Вось якім шляхам насамрэч ідуць спартоўцы.

Ціґунскае ўдасканальванне цалкам супрацьлеглае спорту. Яно не патрабуе рэзкіх рухаў. Рухі ў ім павінны быць плаўнымі, павольнымі ды кругападобнымі, вельмі павольнымі; рух нават можа адсутнічаць ажно да стану поўнага спакою. Як мы ведаем, у медытацыі, як у адным з метадаў удасканальвання, чалавек застаецца на месцы ў стане спакою. Медытацыя нават запавольвае сэрцабіццё, кровазварот ды іншыя фізіялагічныя працэсы. Ёсць шмат майстроў ёгі ў Індыі, якія могуць апусціцца пад ваду альбо закапацца ў зямлю на шмат дзён, знаходзячыся ў поўным спакоі; ім нават пад сілу стрымаць сваё сэрцабіццё. Няхай клеткі ў людзей дзеляцца адзін раз у дзень, тады ўдасканальвальнікі прымушаюць свае клеткі дзяліцца адзін раз на працягу двух дзён, цэлага тыдня, паўмесяца або яшчэ большага часу. Такім чынам, яны ўжо падаўжаюць сваё жыццё. Гаворка ідзе толькі пра метады практыкі, па якіх практыкоўцы ўдасканальваюць Сіньсін, а не даўгалецце. Але і такія метады практыкі ўжо падаўжаюць чалавечае жыццё. Іншыя могуць падумаць: «Хіба чалавечае жыццё, хіба ўсё жыццё чалавека не перадвызначанае? Як жа можна быць доўгажыхаром, калі не ўдасканальваць даўгалецце?» Так, гэта магчыма, калі ўзровень удасканальвальніка прарывае Тры сферы, тады можна падоўжыць жыццё. Аднак такі чалавек выглядае надзвычай лядашчым.

У сапраўдных метадах практыкі, па якіх удасканальваюць даўгалецце, сабранае рэчыва высокай энергіі бесперапынна папаўняе запас у клетках чалавечага цела, бесперапынна падвышае сваю гушчыню. Яно паступова зможа стрымліваць клеткі звычайнага чалавека ды паступова замяніць іх. У

такім выпадку адбудуцца якасныя змены, з-за чаго гэты чалавек назаўжды застанецца маладым. Натуральна, самаўдасканальванне з’яўляецца павольным працэсам, які патрабуе каласальнае аддачы. «Стамляе яго цяглiцы ды косткі, гняце яго волю і думкі» — гэта вельмі няпроста. Ці зможаш ты не завагацца ў звязаных з Сіньсін звадах паміж людзьмі? Ці зможаш не завагацца, калі на кану стаяць кроўныя інтарэсы? Дасягнуць гэтага вельмі цяжка, таму для дасягнення такое мэты аднаго жадання мала. Чалавек можа дасягнуць гэтае мэты толькі тады, калі і яго Сіньсін, і яго Дэ падвысяцца шляхам удасканальвання.

Многія атаясамліваюць ціґун і спорт, а насамрэч розніца паміж імі вельмі вялікая, яны зусім не аднолькавыя. Толькі на найніжэйшым узроўні, калі займаюцца практыкаваннямі з ці, звяртаюць шмат увагі на ацаленне ды аздараўленне з мэтай набыцця моцнага здароўя. Мэта ціґун на найніжэйшым узроўні мае нешта агульнае са спортам. А па дасягненні высокага ўзроўню ён не з’яўляецца з ім адным і тым самым. Ачышчэнне чалавечага цела ў ціґун таксама мае мэту. Ды яшчэ патрабуецца, каб практыкоўцы кіраваліся надзвычайнымі прынцыпамі, а не прынцыпамі звычайных людзей. А спорт — усяго толькі занятак звычайных людзей.

**ДУМКІ**

Надышоў час пагаварыць пра думкі, гэта значыць пра нашую чалавечую разумовую дзейнасць. Як ставяцца ў колах удасканальвальнікаў да дзеяння чалавечых думак у галаўным мозгу? Як глядзяць на розныя формы чалавечага мыслення (думак)? Як яны праяўляюцца? У сучаснай медыцыне шмат пытанняў датычна мозга чалавека засталіся нявырашанымі, бо мозг вывучыць не так лёгка, як павярхоўныя рэчы нашага цела. У глыбінных пластах розныя прасторы маюць розныя формы. Але гэта не так, як распавядаюць некаторыя майстры ціґун. Некаторыя з іх самі не ведаюць, у чым справа, таму і не могуць растлумачыць як след. Яны мяркуюць, што калі мозг запрацуе, калі ў іх з'явіцца думка, тады яны могуць выканаць якую-небудзь працу. Вось яны і кажуць, што гэтыя справы выконваюцца іх мысленнем, іх думкай, а насамрэч гэтыя справы выконваюцца зусім не іх думкай.

Перш за ўсё пагаворым пра ўзнікненне чалавечага мыслення. У старажытным Кітаі часта казалі «сэрца думае». Чаму казалі, што сэрца думае? Навука ў старажытным Кітаі была даволі развітай, бо непасрэдна вывучала чалавечае цела, жыццё і Сусвет. Некаторыя цалкам рэальна адчувалі, што думае сэрца, а іншыя адчувалі, што думае мозг. Чаму так атрымалася? Ідэя пра тое, што сэрца думае, таксама слушная. Мы бачым, што душа ў звычайнага чалавека вельмі маленькая. Сапраўдную інфармацыю ад чалавечага мозга дасылае не сам мозг, не мозг адыгрывае гэтую ролю, а душа чалавека. Душа чалавека можа знаходзіцца не толькі ў «палацы нівань». Тое, што ў сістэме Даа называюць

«палацам нівань», акурат і ёсць шышкападобная залоза ў мозгу, пра якую ведае нашая сучасная медыцына. Калі душа знаходзіцца ў «палацы нівань», тады мы і насамрэч адчуваем, што гэта мозг думае і дасылае інфармацыю. Калі душа знаходзіцца ў сэрцы, тады мы сапраўды адчуваем, што гэта сэрца думае.

Цела чалавека — гэта малы сусвет. У практыкоўцаў у ім перамяшчаецца таксама мноства жывых істот. Калі ў выніку такога перамяшчэння душа трапляе ў жывот, тады чалавек адчувае, што думае жывот. Калі трапляе ў лытку альбо пятку, тады чалавек адчувае, што лытка або пятка думае. Гарантую, што так і будзе, хоць гэта можа здавацца неспасціжным. Калі ты яшчэ знаходзішся на параўнальна невысокім узроўні ва ўдасканальванні, дык ужо можаш адчуць наяўнасць такое з'явы. Калі цела чалавека не мае душы, не мае тэмпераменту, прыроджаных схільнасцяў, характару, калі яно не мае ўсяго гэтага, тады без гэтых рэчаў яно ўсяго толькі кавалак плоці. Такога чалавека нельга лічыць суцэльнай індывідуальнай асобай. А якую ролю адыгрывае мозг чалавека? На маю думку, мозг у нашай матэрыяльнай прасторы ўяўляе сабой толькі завод, які займаецца апрацоўкай. Сапраўдную інфармацыю дасылае душа, але не ў выглядзе мовы, а ў выглядзе касмічных інфармацыяў, якія нясуць пэўны сэнс. Атрымаўшы інфармацыю-каманду, наш мозг перапрацоўвае яе на нашую сучасную мову — сродак перадачы думак. А потым з дапамогай жэстыкуляцыі, выразу вачэй ды цэлага шэрагу рухаў мы цалкам выказваем сваю думку. Вось якую ролю адыгрывае мозг у гэтым працэсе. Сапраўдную інфармацыю і сапраўдныя думкі дасылае душа чалавека. Часцей за ўсё людзі лічаць, што гэта непасрэдная і самастойная роля мозга, а насамрэч часам душа знаходзіцца ў сэрцы, і некаторыя сапраўды адчуваюць, што думае сэрца.

Цяпер тыя, хто вывучае чалавечае цела, лічаць, што галаўны мозг чалавека выпраменьвае нешта накшталт электрахваляў. Мы пакуль не будзем казаць, што ён насамрэч выпраменьвае. Але яны прызнаюць гэта матэрыяльным існаваннем, такім чынам, гэта ўжо не забабоны. А якую ролю адыгрывае гэтая рэч, якая выпраменьваецца? Некаторыя майстры ціґун кажуць: «Пры дапамозе думкі я перасоўваю прадметы, адкрываю табе нябеснае вока, вылекваю тваю хваробу», — і гэтак далей і да таго падобнае. Насамрэч, некаторыя майстры ціґун зусім не ведаюць, якія звышздольнасці маюць, яны дрэнна ведаюць саміх сябе. Аднак разумеюць, што калі чагосьці захочуць, дык ім трэба толькі падумаць, і ўсё ўжо адбываецца. Насамрэч справа ў тым, што, калі ў іх з'яўляецца думка, здольнасці атрымліваюць загад ад думкі галаўнога мозга і пад яе кіраўніцтвам выконваюць канкрэтную працу. Сама ж думка зусім не здольная выканаць аніякае працы. У выкананні практыкоўцамі нейкіх канкрэтных спраў ролю адыгрываюць іх звышздольнасці.

Экстрасэнсорныя здольнасці — гэта схаваныя здольнасці чалавечага цела. Але з развіццём нашага чалавечага грамадства мысленне чалавека становіцца ўсё больш складаным, людзі ўсё больш цэняць[223] рэальнасць, людзі ўсё больш і больш залежаць ад так званых сучасных інструментаў, у выніку чаго

прыроджаныя здольнасці паступова рэгрэсуюць. Сістэма Даа прапаведуе вяртанне да вытоку, вяртанне да ісціны. У ходзе ўдасканальвання ты імкнешся да Ісціны ды ўрэшце вернешся да свайго першаснага выгляду, вернешся назад да сваёй першапачатковай прыроды. Толькі тады ты зможаш праявіць гэтыя свае прыроджаныя здольнасці. Тое, што мы зараз называем экстрасэнсорнымі здольнасцямі, фактычна з'яўляецца прыроджанымі здольнасцямі чалавека. Здаецца, што чалавечае грамадства рухаецца наперад, а насамрэч яно адступае назад і ўсё далей адыходзіць ад уласцівасці Сусвету. У той дзень я распавёў пра Джан Ґалаў, які ездзіў верхам на асле спінай наперад, але, магчыма, вы не зразумелі, што гэта азначае. Ён выявіў, што ісці наперад — гэта падавацца назад, і чалавек усё далей адыходзіць ад уласцівасці Сусвету. У эвалюцыйным працэсе Сусвету, асабліва цяпер, пасля наплыву таварнае гаспадаркі, маральнасць у многіх людзей моцна сапсавалася і ўсё далей адыходзіць ад уласцівасці Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне, і людзі, якія плывуць па цячэнні разам з грамадствам, не адчуваюць меры, да якой сапсавалася мараль чалавецтва; некаторыя з іх нават думаюць, што гэта добра. Толькі тыя, у каго Сіньсін падвысіўся дзякуючы ўдасканальванню, азіраючыся назад, могуць усвядоміць, да якога страшэннага стану дэгенеравала маральнасць чалавецтва.

Некаторыя майстры ціґун кажуць: «Я табе разаўю звышздольнасці». Якія звышздольнасці разаўеш? Звышздольнасці не дзейнічаюць без энергіі. Хіба ты можаш іх развіць, калі яны не праявіліся? Хіба ты можаш развіць яго здольнасці, калі яны не сфармаваліся пад уздзеяннем яго энергіі? Наогул не можаш. Пад «развіццём звышздольнасцяў» гэтыя майстры ціґун маюць на ўвазе ўсяго толькі тое, што ён усталёўвае сувязь паміж тваімі ўжо сфармаванымі здольнасцямі ды тваім галаўным мозгам, каб яны дзейнічалі, атрымліваючы каманды ад твайго мозга. І гэта ўжо лічыцца, што ён развіў табе здольнасці. Насамрэч ніякіх здольнасцяў ён табе не развіў, а зрабіў толькі такую дробязь.

Калі казаць пра практыкоўцу, дык чалавечыя думкі працуюць, кіруючы чалавечымі здольнасцямі; калі ж казаць пра звычайнага чалавека, тады думкі працуюць, кіруючы чалавечымі канечнасцямі ды органамі пачуццяў. Гэта нагадвае завод, дзе вытворчы аддзел або канцылярыя дырэктара аддаюць загады, а адпаведныя падраздзяленні выконваюць іх. Гэта таксама нагадвае камандаванне, калі штаб аддае загады ды кіруе войскамі падчас выканання баявых заданняў. Калі я ладзіў курсы ў іншых месцах, тады я часта гутарыў пра гэта з кіраўнікамі мясцовых даследчых таварыстваў ціґун. Яны вельмі здзіўляліся: «Мы да гэтага часу ўсё вывучаем, колькі патэнцыйнай энергіі ды патэнцыйных магчымасцяў хаваецца ў чалавечым мысленні». Насамрэч, гэта не так, у самым пачатку яны ўжо пайшлі па няправільным шляху. На маю думку, у мысленні тых, хто займаецца навукай пра чалавечае цела, павінны адбыцца радыкальныя змены. Нельга пры дапамозе метаду разумовых высноў звычайных людзей ды іх метадаў разумення праблемаў пазнаваць такія звышнатуральныя рэчы.

Датычна думак, існуюць яшчэ іншыя іх віды. Напрыклад, некаторыя кажуць пра патэнцыйную свядомасць, падсвядомасць, натхненне, сон і гэтак далей. Сон — гэта такая з'ява, якую ніхто з майстроў ціґун не хоча тлумачыць. У той самы час, калі ты нарадзіўся, у кожнай з многіх прастораў Сусвету адначасова нарадзіліся па адным тваім «я», і гэтыя «я» складаюць з табой адзінае цэлае, паміж вамі маецца ўзаемасувязь і сувязь па мысленні. З іншага боку, ты сам маеш галоўную душу, дапаможныя душы, а таксама вобразы іншых розных істот унутры твайго цела. Кожная клетка і ўсе ўнутраныя органы маюць твой вобраз ды інфармацыю — такую форму існавання ў іншай прасторы. Таму гэта надзвычай складана. Чаму падчас сну ты сніш тое, потым сёе? Адкуль узялося ўсё гэта? У медыцыне гэта тлумачыцца зменамі ў кары галаўнога мозга. Гэта адлюстраванне, якое праяўляецца ў гэтай матэрыяльнай форме. А насамрэч, гэта ўздзеянне інфармацыяў з іншых прастораў, у выніку чаго, падчас сну ўсё табе падаецца няясным, незразумелым і невыразным — гэта цябе не тычыцца, і на такія сны не звяртай увагі. Аднак ёсць такі від сну, які непасрэдна тычыцца цябе, і мы не можам назваць яго сном. Твая галоўная свядомасць, гэта значыць твая галоўная душа, сасніла, што твая маці прыйшла да цябе, альбо ты сапраўды нешта адчуваў, штосьці ўбачыў альбо чым-небудзь займаўся ў сне. Гэта значыць, што твая галоўная свядомасць сапраўды нешта бачыла і нешта рабіла ў іншай прасторы. Пры гэтым свядомасць ясная ды выразная. Такія выпадкі сапраўды існуюць, хоць адбываюцца ў іншых матэрыяльных прасторах і ў іншых прасторах-часах. Хіба можна назваць гэта сном? Не. Але з прычыны таго, што тваё матэрыяльнае цела сапраўды спіць, прыйшлося назваць гэта сном. Выключна такія сны непасрэдна тычацца цябе.

Такія тэрміны, як «натхненне», «падсвядомасць», «патэнцыйная свядомасць» і да таго падобныя, на маю думку, створаныя не навукоўцамі, а прыдуманыя літаратарамі на падставе стану, звыклага для звычайных людзей, і гэтыя тэрміны ненавуковыя. Што ж, урэшце, маюць на ўвазе людзі пад патэнцыйнай свядомасцю? Цяжка растлумачыць, тэрмін вельмі агульны, бо ў людзей вельмі складаныя разнастайныя інфармацыі. Патэнцыйная свядомасць нагадвае нейкую цьмяную памяць. Што тычыцца падсвядомасці, яе нам лягчэй растлумачыць. Па вызначэнню, пад падсвядомым станам звычайна маецца на ўвазе тое, што чалавек займаецца чымсьці ў туманным стане. У такім выпадку людзі кажуць, што ён гэта зрабіў падсвядома, а не свядома. І гэтая падсвядомасць акурат супадае з дапаможнай свядомасцю, пра якую мы гаворым. Калі галоўная свядомасць чалавека слабее і не кіруе галаўным мозгам, чалавек знаходзіцца ў туманным стане, падобным да сну. У такім стане або ў сне, несвядомым стане чалавеку лёгка трапіць пад кантроль дапаможнае свядомасці, гэта значыць дапаможнае душы. У такім выпадку дапаможная свядомасць здольная што-небудзь зрабіць. Інакш кажучы, ты гэта ўчыніш несвядома. Аднак звычайна гэтыя справы робяцца без адмоўнага выніку, бо дапаможная свядомасць бачыць сутнасць справы ў іншай прасторы і не знаходзіцца ў змане грамадства звычайных людзей. Таму калі чалавек прыйдзе ў сябе, тады бачыць, што ён зрабіў: «Як дрэнна зроблена гэтая справа, у нармальным стане я так не зрабіў бы». Аднак цяпер ты кажаш, што гэта

дрэнна, але праз дзесяць-пятнаццаць дзён скажаш: «Ого! Як цудоўна гэта было зроблена! Як жа мне тады гэта ўдалося?» Звычайна так і бывае, бо дапаможная свядомасць не ўлічвае цяперашнюю сітуацыю, а думае пра будучыню. Бываюць і справы, ад якіх не будзе ніякіх наступстваў, яны значныя толькі ў дадзены час, і, калі дапаможная свядомасць зоймецца гэтымі справамі, яны, магчыма, адразу зробяцца вельмі добра.

Існуе яшчэ адна форма: часта людзі з вельмі добрай маральнай асновай могуць зрабіць нейкі ўчынак, патрапіўшы пад кантроль Вышэйшай істоты. Вядома, гэта ўжо іншая справа, і тут мы пра яе не будзем казаць, бо зараз мы галоўным чынам распавядаем пра віды свядомасці, якія бяруць выток у нашым уласным чалавечым целе.

Што тычыцца натхнення, дык гэта таксама прыдуманы літаратарамі тэрмін. Звычайна лічаць, што натхненне гэта імгненны выбліск іскры ведаў, якія назапашаны чалавекам за ўсё жыццё. Я на гэта сказаў бы, што, з пункту гледжання матэрыялізму, калі казаць пра веды, назапашаныя чалавекам за ўсё яго жыццё, тады чым больш ён назапашваў бы ведаў, чым больш бы карыстаўся галаўным мозгам, тым стаў бы больш кемлівым, і калі б надышоў час скарыстаць свае веды, тады б яны павінны былі прыходзіць у невычэрпнай колькасці і, такім чынам, проста не ўзнікла б пытання нейкага там яшчэ натхнення. Усё, што можна было б назваць натхненнем альбо яго праявай, не адносіцца да такога стану. Часта назіраюцца такія выпадкі, калі чалавек ламае галаву: ён думае, думае, але нічога не можа прыдумаць, нібыта веды вычарпаліся; альбо чалавек піша артыкул: піша, піша і ўрэшце не ведае, што пісаць далей; альбо ў чалавека перарвана нітка думак, калі ён складае нейкую песню; альбо чалавек, выконваючы навукова-даследчую працу, трапляе ў сітуацыю, з якой няма выйсця. У такім выпадку, як правіла, на лбе ў яго выступаюць сінія жылкі, па падлозе раскіданыя недапалкі, яго мучыць галаўны боль, але нічога не прыходзіць у галаву. Урэшце, у якім жа стане з'яўляецца натхненне? Напрыклад, чалавек стаміўся і думае: «Годзе! Ану, адпачну». Пад усё больш энергічным кантролем галоўнае свядомасці над галаўным мозгам іншыя істоты не ў стане ўціснуцца ў мозг. А цяпер чалавек адпачывае, ні пра што не думае і пры паслабленні мыслення можа неспадзявана нешта прыдумаць; такім чынам, у яго галаве з'яўляецца ідэя. Вось як у большасці выпадкаў з’яўляецца натхненне.

Чаму менавіта ў гэты час з'яўляецца натхненне? Галоўная свядомасць трымае галаўны мозг пад кантролем, і чым больш працуе галаўны мозг, тым больш энергічна кантралюе яго галоўная свядомасць, і тым менш магчымасці для дапаможнае свядомасці ўціснуцца ў галаўны мозг. Дапаможная свядомасць як частка чалавечага цела нараджаецца з улоння маці ў адзін час з чалавекам і кіруе часткай чалавечага цела. Калі чалавеку баліць галава ад таго, што ён шмат думае, і чалавек пакутуе ад таго, што нічога не можа прыдумаць, дапаможная свядомасць таксама пачуваецца блага, ёй гэтак жа баліць галава,

моцна баліць. Карыстаючыся выпадкам, калі галоўная свядомасць паслабіла свой кантроль, дапаможная свядомасць змагла адлюстраваць у галаўным мозгу тое, што яна ведае, бо дапаможная свядомасць, знаходзячыся ў іншай прасторы, бачыць сутнасць справы. Такім чынам, чалавек прасунуўся ў праекце, нешта напісаў, нешта склаў.

Некаторыя могуць сказаць: «Тады мы будзем карыстацца дапаможнай душой». Менавіта зараз мне падалі цыдулку з пытаннем: «Як усталяваць кантакт з дапаможнай душой?» Ты не можаш усталяваць такое сувязі, бо ты ўсяго толькі практыкоўца-пачатковец. Ты пакуль яшчэ ні да чаго не здольны, лепш не звязвацца, і калі ты гэта зробіш, тады, несумненна, з-за навязлівай ідэі. Некаторыя, магчыма, думаюць: «Ці можна тады нам з дапамогай дапаможнае свядомасці стварыць яшчэ больш матэрыяльных каштоўнасцяў, каб развіваць чалавечае грамадства?» Нельга! А чаму? Таму, што веды тваёй дапаможнай свядомасці таксама вельмі абмежаваныя. Прасторы складаныя, узроўняў шмат, структура гэтага Сусвету вельмі складаная, дапаможная свядомасць у стане ведаць толькі тое, што ёсць у яе прасторы; таго, што знаходзіцца па-за яе прасторай, дапаможная свядомасць ужо не ведае. Апроч таго, існуе яшчэ шмат розных прастораў у вертыкальным кірунку на розных узроўнях. Толькі вышэйшыя жывыя Істоты на вельмі высокіх узроўнях могуць кантраляваць развіццё чалавецтва. І яно адбываецца ў адпаведнасці з заканамернасцямі развіцця.

Нашае грамадства звычайных людзей развіваецца згодна з гістарычнымі заканамернасцямі. Ты хочаш, каб яно развівалася пэўным шляхам і дасягнула пэўнае мэты, аднак вышэйшыя жывыя Істоты думаюць зусім не так. Хіба старажытныя людзі не думалі вынайсці сённяшнія самалёты, цягнікі ды ровары? Я кажу, што наўрад ці не думалі. Але з прычыны таго, што гісторыя не дайшла да адпаведнага этапу, яны не маглі стварыць іх. Павярхоўна, паводле звыклае для звычайных людзей тэорыі ды з пункту гледжання наяўных ведаў чалавецтва, гэта тлумачыцца тым, што навука не дасягнула такога ўзроўню, таму людзі і не змаглі стварыць падобных рэчаў. Па сутнасці, развіццё навукі чалавецтва таксама ідзе ў кірунку, прадвызначаным гісторыяй. Ты хочаш штучнымі метадамі дасягнуць нейкае мэты, але гэтага зрабіць не атрымаецца. Вядома, у некаторых, магчыма, дапаможная свядомасць дзейнічае лёгка. Нейкі пісьменнік кажа, што можа напісаць дзясяткі тысяч слоў[224] штодня і не адчувае стомленасці; што як толькі захоча напісаць, дык хутка напіша, і калі іншыя прачытаюць, тады пахваляць. Чаму такое магчыма? Таму, што яго галоўная і дапаможная свядомасці працуюць супольна, і апошняя бярэ палову працы на сябе. Аднак не з кожным так бывае, у абсалютнай большасці людзей дапаможная свядомасць зусім не прымае ўдзелу. Калі ты захочаш, каб дапаможная свядомасць працавала, дык будзе дрэнна — атрымаецца акурат наадварот.

**СПАКОЙНАЕ І ЧЫСТАЕ СЭРЦА**

Многія, займаючыся практыкай, не могуць увайсці ў стан спакою. Яны ўсюды запытваюцца ў майстроў ціґун: «Настаўніку! Я не разумею, чаму не магу ўвайсці ў стан спакою, калі займаюся. Як толькі намагаюся гэта зрабіць, дык адразу ж пачынаю думаць пра ўсё на свеце, кідаюся ад адное думкі да іншае. У галаве сапраўды няйнакш той вір[225], у галаву лезе абы-што. Наогул не магу супакоіцца». Чаму ж яны не могуць увайсці ў стан спакою? Некаторыя не разумеюць гэтага і думаюць, нібыта тут існуюць нейкія сакрэты. Яны звяртаюцца да вядомых майстроў з просьбай навучыць іх нейкім найлепшым прыёмам, якія дапамаглі б ім увайсці ў стан спакою. На маю думку, гэта яны ўсё ж такі шукаюць звонку. Калі ты хочаш падвысіць свой узровень, дык павінен шукаць прычыну ў сабе, павінен працаваць над сваімі думкамі. Толькі ў такім выпадку ты зможаш падвысіцца, толькі тады зможаш увайсці ў стан спакою падчас сядзення ў медытацыі. Здольнасць супакоіцца — гэта Ґун, а тое, наколькі глыбока ты здольны ўвайсці ў медытацыю, з'яўляецца ўвасабленнем твайго ўзроўню.

Хіба могуць звычайныя людзі, калі ім проста захочацца, увайсці ў стан спакою? Не, зусім не могуць. Выключэннем з'яўляюцца людзі з вельмі добрай маральнай асновай. Іншымі словамі, карэнная прычына таго, што чалавек не можа супакоіцца, не з'яўляецца пытаннем нейкага прыёму. Яна не ў тым, што існуе нейкая панацэя, а ў тым, што тваё мысленне, тваё сэрца не ачышчанае. Ты знаходзішся сярод звычайных людзей, у супярэчнасцях з людзьмі, змагаешся з іншымі дзеля асабістых інтарэсаў, сямі пачуццяў ды шасці жаданняў, усялякіх выкліканых прывязанасцямі навязлівых ідэяў. Усе гэтыя рэчы цябе хвалююць, і ты не можаш абыякава да іх ставіцца. І ты хочаш увайсці ў стан спакою. Гэта толькі сказаць проста. Хіба не так? Нехта, займаючыся практыкай, кажа: «А я не веру: я зараз увайду ў стан спакою, не буду ні пра што думаць». Не паспеў ён дагаварыць гэтыя словы, як у яго галаве ўсё зноў пачало віраваць. Гэта таму, што твае думкі не ачышчаныя, вось ты і не можаш супакоіцца.

Магчыма, са мной не пагадзяцца ды скажуць: «Хіба асобныя майстры ціґун не вучаць спосабам ды прыёмам? Можна канцэнтравацца на нечым, можна нешта візуалізаваць, а таксама засяродзіць думку на даньт'ень, назіраць за даньт'ень унутры свайго цела або паўтараць імя Буды і гэтак далей». Усё гэта спосабы, але і не проста спосабы, а свайго роду ўвасабленне ґунфу, якое мае прамую сувязь з нашым удасканальваннем Сіньсін, з падвышэннем нашага ўзроўню, але толькі адны спосабы не ўвядуць практыкоўцу ў стан спакою. Не верыш — паспрабуй: у цябе ўсялякія неймаверна моцныя жаданні ды навязлівыя ідэі, і што цябе толькі не хвалюе — паглядзі, ці зможаш ты супакоіцца. Хтосьці кажа, што гадзіцца паўтарэнне імя Буды. Няўжо паўтарэнне імя Буды дапаможа табе ўвайсці ў стан спакою? Хтосьці кажа, што школа Буды Амітабгі — лёгкая для практыкі школа; тут патрабуецца толькі паўтараць імя Буды. Паспрабуй гэта

зрабіць, а там паглядзім. Я сказаў бы, што гэта таксама ґунфу. Ты кажаш, што гэта лёгка, а я кажу, што не, бо аніводная школа не лёгкая.

Як вам вядома, Буда Шак’ямуні прапаведаваў «Медытацыю». А што ён прапаведаваў перад гэтым? «Запаведзь». У медытацыю можна ўвайсці толькі тады, калі цалкам адкінеш усе навязлівыя ідэі ды захапленні, калі не застанецца нічога. Вось у чым логіка. Хіба не так? А «Медытацыя» — гэта таксама ґунфу, адразу табе не дасягнуць поўнага выканання запаведзяў. Паступова, услед за тым, як ты будзеш парываць з усімі дрэннымі рэчамі, твая медытацыя будзе станавіцца ад павярхоўнай да ўсё больш глыбокай. Калі чалавек паўтарае імя Буды, яго думкі павінны засяродзіцца на адным і не разбягацца, ён павінен ні пра што не думаць, дамагаючыся, каб іншыя часткі галаўнога мозга ад чытання анямелі, каб ён ужо нічога не ведаў, каб адна думка замяніла дзесяць тысяч думак, і кожны іерогліф з «Э-мі-то-фо»[226] праявіўся б перад вачыма. Хіба гэта не ґунфу? Хіба магчыма з самага пачатку дасягнуць гэтага? Немагчыма. Калі немагчыма, дык чалавек дакладна не зможа ўвайсці ў стан спакою. Калі не верыш, тады паспрабуй. Чалавек паўтарае раз-пораз імя Буды і ў той жа час думае пра тое-сёе: «Кіраўнік прадпрыемства так незадаволены мной, так мала мне выдаў прэміяльных у гэтым месяцы». Чым больш ён думае пра гэта, тым больш абураецца, ды яшчэ адначасова чытае ўслых імя Буды. Скажыце, хіба можна так практыкаваць? Хіба гэта не праблема ґунфу? Хіба гэта не праблема таго, што твае ўласныя думкі не былі ачышчаныя? Той, у каго нябеснае вока адкрытае, можа ўбачыць унутры сябе даньт’ень. Унізе жывата чалавека збіраецца дань. Чым больш чыстая гэтая энергія ды матэрыя, тым яна святлей, а чым больш нячыстая, тым яна цямней, чарней. Хіба, гледзячы на дань ва ўнутранай частцы даньт’ень, ты зможаш увайсці ў стан спакою? Не зможаш. Значыць, справа не ў самім метадзе, а ў тым, што думкі ў чалавека не пазбаўленыя людское марнасці. Ты назіраеш за даньт’ень, бачыш, што дань празрысты і блішчыць. Але раптам з дань адбываецца метамарфоза — ён ператвараецца ў кватэру. «Гэты пакой выдзелю сыну пасля вяселля, гэты пакой — маёй дачцэ, у гэтым будзем жыць мы з жонкай, а пасярэдзіне будзе гасцёўня. Выдатна! Аднак ці дадуць мне гэтую кватэру? Прыйдзецца адшукаць спосаб, каб дастаць яе. Што ж я для гэтага зраблю?» Людзі прывязаныя да такіх рэчаў. Скажаш, ты зможаш увайсці ў стан спакою? Іншыя кажуць: «Я прыбыў сюды ў грамадства звычайных людзей, нібы спыніўся ў гасцініцы. Пажыву некалькі дзён і таропка пайду». А некаторыя так прывязваюцца да гэтага месца, што забыліся на свой дом.

Калі шчыра ўдасканальваешся, трэба ўдасканальваць сваё сэрца, удасканальвацца ўнутрана, шукаць у сабе. Нельга шукаць звонку. У адной школе кажуць, што Буда — у сэрцы. Гэта таксама небеспадстаўна, але хтосьці гэта зразумеў няправільна. Калі кажуць, што Буда — у сэрцы, нехта разумее гэта так, нібыта ён сам па сабе Буда, быццам Буда сапраўды ў яго сэрцы. Хіба не памыляецца чалавек, калі так разумее?! Гэты выраз азначае, што ты зможаш паспяхова ўдасканаліцца толькі тады, калі будзеш выпраўляць свае

думкі — вось у чым сутнасць. Адкуль у тваім целе можа ўзяцца Буда? Каб паспяхова ўдасканаліцца, трэба ўдасканальвацца.

Ты не можаш увайсці ў стан спакою, таму што не дасягнуў пустаты ў думках, і ты не маеш такога высокага ўзроўню. А гэта робіцца паступова, ад павярхоўнага да глыбокага. Дасягненне пустаты ў думках і падвышэнне ўзроўню ўзаемна дапаўняюць адно аднаго. Вызваліўшыся ад навязлівых ідэяў, ты даб'ешся падвышэння ўзроўню, і твая медытацыя стане глыбей. Я кажу, што жаданне дасягнуць стану спакою з дапамогай нейкіх прыёмаў ды спосабаў азначае пошук звонку. А тое, калі чалавек шукае звонку, акурат і з'яўляецца адхіленнем у практыцы ды ўпадзеннем у ерась. Асабліва ў будызме кажуць: хто шукае звонку, той пайшоў шляхам д'ябла. Калі ты хочаш шчыра ўдасканальвацца, дык трэба выпраўляць свае думкі. Тваё сэрца зможа дасягнуць пазбаўлення ад людскога марнасці, дасягнуць Нядзеяння толькі тады, калі ты падвысіш свой Сіньсін. Тады ты зможаш зліцца з уласцівасцю нашага Сусвету, зможаш адкінуць разнастайныя чалавечыя жаданні, навязлівыя ідэі, дрэнныя рэчы, зможаш выкінуць з сябе благое ды падвысіць свой узровень. Тады ўласцівасць Сусвету перастане цябе абмяжоўваць, і твая матэрыя Дэ пératворыцца ў Ґун. Хіба не праяўляецца тут узаемаабумоўленасць? Менавіта такая логіка рэчаў!

Гэта суб'ектыўная прычына таго, што чалавек не можа дасягнуць крытэраў практыкоўцы, з гэтае прычыны ён не можа ўвайсці ў стан спакою. У цяперашні час існуюць і аб'ектыўныя акалічнасці, якія сур'ёзна перашкаджаюць табе ўдасканальвацца на высокія ўзроўні, сур'ёзна ўплываючы на практыкоўцаў. Як вам вядома, следам за рэформамі ды адкрытасцю ажыўляецца эканоміка, маюць месца і палітычныя паслабленні. Было перанята шмат навукова-тэхнічных навацыяў, падвышаецца і жыццёвы ўзровень нашага народа. Звычайныя людзі лічаць, што гэта добра. Але з пункту гледжання дыялектычнага прынцыпу раздваення адзінага[227] разам з правядзеннем рэформаў адкрытасці ў нашае жыццё ўвайшлі разнастайныя дрэнныя рэчы — на ўсялякі колер ды густ. У літаратуры робяць так, быццам бы кніга не будзе распрададзеная, калі ў ёй няма троху эратычнага зместу, — яны заклапочаныя аб'ёмамі накладаў. У кінематографе і тэлебачанні робяць так, нібыта кінастужкі і ТБ ніхто не будзе глядзець, калі там не будзе трошкі пасцельных сцэнаў, — яны турбуюцца пра рэйтынгі наведвальнасці ды глядацкія рэйтынгі; у творах жывапісу... хто ведае, ці з'яўляецца гэта сапраўды выяўленчым мастацтвам альбо чымсьці іншым. У нашым старажытнакітайскім нацыянальным мастацтве такога не было. Гэтая наша кітайская нацыянальная традыцыя не з'яўляецца тым, што хтосьці вынайшаў, хтосьці стварыў. Чытаючы лекцыі пра дагістарычныя культуры, я ўжо адзначыў, што ўсё мае свае вытокі. Маральныя нормы чалавецтва скрывіліся ды змяніліся, змяніўся нават крытэр ацэнкі дабра і зла — такая сітуацыя ў звычайных людзей. Аднак уласцівасць нашага Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне — адзіны крытэр ацэнкі таго, добры чалавек ці благі — застаецца нязменнай. Ты, як практыкоўца, хочаш вызваліцца адсюль, тады табе трэба ацэньваць усё па гэтым крытэры, а не па нормах звычайных людзей

— вось якія перашкоды аб'ектыўна існуюць вакол нас. Не толькі вышэйсказанае служыць перашкодай, адна за адной з'явіліся такія рэчы, як гомасексуалізм, сексуальнае разняволенне, наркаманія ды іншая брыдота.

Чалавечае грамадства дайшло ў сваім развіцці да сённяшняга этапу, і вы падумайце, калі яно і далей будзе так развівацца, тады да чаго гэта будзе падобна? Ці можна дазволіць яму заўжды так існаваць? Калі чалавек не навядзе парадак, тады яго навядзе Неба. Штораз, калі з чалавецтвам здаралася катастрофа, яно знаходзілася менавіта ў такім стане. У цэлым шэрагу лекцыяў я не закранаў пытанне пра канец свету, хоць пра гэта кажуць у рэлігіях, і многія людзі абмяркоўваюць гэтую актуальную тэму. Я вам скажу вось што: падумайце, у нашым грамадстве звычайных людзей узровень маральнасці ўжо вось як змяніўся! Адносіны паміж людзьмі напружаныя да такое меры! Падумайце самі, хіба не дайшло нашае чалавецтва да надзвычай небяспечнага становішча? Навакольнае асяроддзе, якое цяпер існуе, сур'ёзна перашкаджае нашым практыкоўцам падняцца на высокія ўзроўні. Выявы з аголенымі целамі размяшчаюць проста вось там, вешаюць пасярод праспекту. Як толькі ўзнімеш галаву, дык адразу ўбачыш.

Лаа-цзы ў свой час казаў: «Калі мудры чалавек чуе Даа, ён старанна практыкуе яго». Мудры чалавек чуе Даа і думае: «Як жа няпроста знайсці праведны метад! Калі я сёння не стану ўдасканальвацца, дык колькі ж прыйдзецца чакаць наступнае такое магчымасці?» Складанае асяроддзе, на маю думку, гэта няблага. Чым больш складаная сітуацыя, тым больш магчымасцяў для з’яўлення выбітных людзей! Калі зможаш праявіць сябе нават тут, толькі тады тваё ўдасканальванне будзе самым грунтоўным.

Я сказаў бы, што для таго, хто сапраўды здольны рашуча ўдасканальвацца, наадварот, складанае асяроддзе — рэч добрая. Без супярэчнасцяў, без зручнага выпадку, спрыяльнага для падвышэння твайго Сіньсін, табе не падвысіцца. Ты добры, я таксама добры. Як жа нам удасканальвацца? Той, хто ўдасканальваецца на звычайным узроўні, прыналежыць да «пасрэдных людзей, якія чуюць Даа»: можна практыкаваць, а можна і не практыкаваць. Для такіх людзей, верагодна, гэта будзе проста жах. Нехта з вас слухае тут Настаўніка, і лічыць, што сказанае ім з’яўляецца справядлівым. А калі вернецца ў грамадства звычайных людзей, актуальныя выгады ўсё адно застануцца для яго цалкам рэальнымі. Вядома, яны рэальныя і рэальныя не толькі для вас, а таксама для заходніх багатыроў ды магнатаў, якія пасля смерці выяўляюць, што ў іх няма нічога, акрамя пустаты, а матэрыяльнае багацце немагчыма ані прынесці з нараджэннем, ані забраць, калі паміраеш, што яно з’яўляецца поўнай фікцыяй[228]. Чаму Ґун настолькі каштоўны? Бо яго непасрэдна носіць твая душа, і чалавек можа прынесці яго з нараджэннем і забраць з сабой, калі памірае. Мы кажам, што душа несмяротная, і гэта зусім не забабоны. Калі скідаюцца клеткі нашага матэрыяльнага цела, яшчэ больш дробныя

малекулярныя кампаненты, якія існуюць у іншых матэрыяльных прасторах, не знішчаюцца. Чалавек проста вылупляецца са шкарлупіны.

Усё, пра што я зараз распавёў, тычыцца пытання Сіньсін чалавека. Шак'ямуні ды Бадгідгарма ў свой час сказалі наступнае: «Кітай, Усходняя зямля, — гэта месца, дзе з'яўляюцца людзі вялікага Дэ». Многія манахі розных эпох у Кітаі, многія кітайцы ганарыліся гэтым выказваннем, лічылі, што можна выпрацаваць высокі Ґун. Таму вельмі многія радаваліся, праяўлялі самаздаволенасць: «Мы, кітайцы, малайцы! Кітай — радзіма людзей з вялікай маральнай асновай, радзіма людзей вялікага Дэ. У Кітаі з'яўляюцца людзі з выдатнымі прыроджанымі якасцямі, людзі вялікага Дэ». Насамрэч многія не разумелі ўнутранага зместу гэтага выказвання. Чаму ў Кітаі з'яўляюцца людзі вялікага Дэ? Чаму тут можна выпрацаваць высокі Ґун? Многія не разумеюць ані сапраўднага значэння слоў людзей, якія знаходзіліся на высокіх узроўнях, ані сфераў, на якіх знаходзіліся людзі высокіх узроўняў ды сфераў, ані стану іх мыслення. Вядома, мы ўжо вам казалі не даваць вызначэнняў іх словам. Задумайцеся: толькі ў найскладанейшым натоўпе людзей, у найскладанейшым асяроддзі можна выпрацаваць высокі Ґун. Вось што азначаюць гэтыя словы.

## МАРАЛЬНАЯ АСНОВА

Маральная аснова вызначаецца тым, шмат або мала матэрыі Дэ мае чалавечае цела ў іншай прасторы. Калі Дэ мала, а чорнае матэрыі шмат, тады кармічнае поле вялікае, і такім чынам, гэта азначае дрэнную маральную аснову; калі Дэ шмат, белае матэрыі шмат, тады кармічнае поле малое, і адпаведна гэта азначае добрую маральную аснову. Абодва рэчывы чалавека, белае і чорнае, могуць ператварацца адно ў другое. І як жа ператварацца? Здзяйсненне добрых учынкаў стварае белую матэрыю. Белая матэрыя здабываецца чалавекам, калі ён папакутаваў, ператрываў боль, зрабіў дабро. А чорная матэрыя ствараецца, калі здзяйсняеш благія ўчынкі, робіш нешта благое. Гэта карма. Вось які ў іх працэс пераўтварэння. Адначасова яны маюць і сувязь з носьбітам. Бо яны непасрэдна следуюць за душой чалавека і не з'яўляюцца прадуктамі аднаго жыцця, а накапляюцца з даўніх часоў. Таму людзі і кажуць пра накапленне кармы, накапленне Дэ. Апроч таго, іх могуць накапляць і продкі. Часам я згадваю, як старажытныя кітайцы альбо старыя людзі казалі: «Продкі назапашваюць Дэ» або «збіранне Дэ», «недахоп Дэ»[229]. Як жа слушна яны казалі! Сапраўды, абсалютна дакладна.

Добрая або дрэнная маральная аснова можа вызначаць тое, добрая або дрэнная ў чалавека здольнасць усведамлення. Дрэнная маральная аснова ў чалавека можа прыводзіць да таго, што здольнасць усведамлення ў яго таксама становіцца вельмі слабой. А чаму? Таму што ў чалавека з добрай маральнай асновай шмат белае матэрыі. Такая белая матэрыя гарманічна зліваецца з Сусветам, можа зліцца ў адно з уласцівасцю Ісціна-Дабрыня-

Цярпенне, без прамежкаў. Уласцівасць Сусвету непасрэдна адлюстроўваецца ў тваім целе, непасрэдна злучаецца з тваім целам. А чорную матэрыю, акурат наадварот, чалавек атрымлівае ў выніку здзяйснення благіх учынкаў. Яны з уласцівасцю нашага Сусвету пазбягаюць адно аднаго, таму паміж такой чорнай матэрыяй ды ўласцівасцю нашага Сусвету і ствараецца свайго роду экран. Калі чорнае матэрыі шмат, тады яна ўтварае вакол чалавечага цела поле і атачае чалавека. А чым больш гэтае поле, чым больш гушчыня чорнае матэрыі, чым яна таўсцей, тым горш гэта робіць здольнасць усведамлення чалавека. Гэта таму, што чалавек не можа прыняць уласцівасць Сусвету Ісціна-Дабрыня-Цярпенне, што ў сваю чаргу выклікана тым, што ён рабіў благія ўчынкі і таму стварыў чорную матэрыю. Часта такі чалавек усё больш не верыць у самаўдасканальванне, яго здольнасць усведамлення ўсё пагаршаецца, і ён усё больш адчувае перашкоды ад кармы; чым больш яго пакуты, тым менш ён верыць, з прычыны чаго ўдасканальвацца яму цяжка.

Чалавеку з вялікай колькасцю белае матэрыі ўдасканальвацца лёгка, бо дастаткова толькі, каб у ходзе ўдасканальвання ён асіміляваўся з уласцівасцю Сусвету, і яго Сіньсін змог падвысіцца, як яго Дэ ўжо непасрэдна ператвараецца ў Ґун. А чалавек з вялікай колькасцю чорнае матэрыі — гэта як завод, які вырабляе прадукцыю, і ў якога на адну працэдуру больш. У іншых гатовая сыравіна, а ў яго грубая сыравіна, якую трэба яшчэ раз апрацаваць, прайсці такі працэс. Таму чалавеку спачатку неабходна знесці пакуты, ліквідаваць сваю карму і ператварыць яе ў белую матэрыю. Высокі Ґун у гэтага чалавека можа вырасці толькі пасля ўтварэння матэрыі Дэ. Але часта ў такога чалавека ўжо і так дрэнная здольнасць усведамлення, а ты яшчэ і прымушаеш яго шмат пакутаваць, тады ён тым больш не верыць, тым больш не можа вытрымаць. Такім чынам, тым, у каго шмат чорнага рэчыва, удасканальвацца цяжка. У мінулым у Школе Даа або ў школах, у якіх ажыццяўляецца перадача толькі аднаму вучню, казалі: «Гэта настаўнік шукае вучня, а не вучань настаўніка». У гэтым рашэнне прымалася таксама ў залежнасці ад колькасці гэтых рэчаў, якія мела цела патэнцыйнага вучня.

Маральная аснова вызначае здольнасць усведамлення, але гэта не з'яўляецца абсалютным. У аднаго чалавека маральная аснова вельмі дрэнная, але хатняе асяроддзе вельмі добрае: шмат чальцоў яго сям'і практыкуюць, а іншыя з’яўляюцца свецкімі будыстамі ды цалкам вераць у тое, што звязана з самаўдасканальваннем. Такое асяроддзе таксама можа спрыяць таму, каб ён паверыў, каб палепшылася яго здольнасць усведамлення. Таму гэта не з'яўляецца абсалютным. Некаторыя людзі маюць вельмі добрую маральную аснову. Аднак атрымаўшы адукацыю ў ранейшыя гады, асабліва, калі грамадства з яго ідэалагічна-выхаваўчай работай, для якой характэрна абсалютызацыя, стварала чалавека з вузкім кругаглядам, яны не вераць нічаму, што выходзіць са сферы іх ведаў. Гэта таксама сур’ёзна перашкаджае чалавеку падвысіць сваю здольнасць усведамлення.

Прывяду прыклад. Калі я праводжу курсы, тады на другі дзень тлумачу адкрыццё нябеснага вока. Ёсць такі чалавек, у якога добрая маральная аснова. Я адразу адкрыў яму нябеснае вока на вельмі высокім узроўні. Ён убачыў вельмі шмат такіх карцінаў, якіх іншыя не бачаць. Гэты чалавек сказаў іншым: «Вой! Я бачу, як па ўсёй зале, дзе выкладаецца Закон, нібыта тыя сняжынкі, Фалунь апускаюцца на людзей; бачу сапраўдны вобраз[230] Настаўніка Лі; бачу арэол Настаўніка Лі, бачу, як выглядаюць Фалунь, колькі тут Целаў Закону. Бачу, што Настаўнік Лі выкладае Закон на розных узроўнях, як Фалунь наладжваюць здароўе ўдзельнікам курсаў. Таксама бачу, што, калі Настаўнік чытае лекцыю, узровень за ўзроўнем, паўсюль на розных узроўнях чытаюць лекцыі Целы Ґун Настаўніка. І яшчэ я таксама бачу, як нябесныя феі абсыпаюць усё кветкамі» ды гэтак далей. Гэты ўдзельнік курсаў убачыў настолькі цудоўныя рэчы. Гэта сведчыць пра тое, што яго маральная аснова вельмі нядрэнная. Ён распавядаў-распавядаў, а напрыканцы кінуў фразу: «Я ў гэта не веру». Штосьці з гэтага цяперашняя навука ўжо пацвердзіла, шмат чаму можна знайсці тлумачэнне ў цяперашняй навуцы, некаторыя рэчы мы ўжо апісалі. Пазнанае ж у ціґун і сапраўды пераўзыходзіць пазнанне сучаснае навукі. У гэтым няма сумневаў. Адсюль бачна, што маральная аснова не цалкам вызначае здольнасць усведамлення.

## УСВЕДАМЛЕННЕ

Што такое «ўсведамленне»[231]? «Усведамленне» — гэта тэрмін, які паходзіць з рэлігіі. У будызме пад ім маецца на ўвазе разуменне ўдасканальвальнікам Закону Буды, пазнавальнае ўсведамленне ды канчатковае ўсведамленне — гэта значыць Прабуджэнне-Мудрасць. Але цяпер гэтае слова ўжо стала ўжывальным сярод звычайных людзей. Скажам, чалавек вельмі разумны, ведае, чаго хоча начальнік, адразу можа гэта зразумець і вельмі да яго ліслівы. Тады людзі кажуць, што гэта ў яго добрае ўсведамленне. Вось як яны звычайна гэта разумеюць. Але калі ты перавысіш узровень звычайных людзей і будзеш знаходзіцца на трохі больш высокім узроўні, тады выявіш, што прынцып, які спазнаюць звычайныя людзі, часта хібны. Усведамленне, пра якое гаворым мы, — гэта зусім не такое «ўсведамленне». У выкрутлівага чалавека здольнасць усведамлення, наадварот, дрэнная. Гэта таму, што занадта «разумны» чалавек выконвае працу толькі на паказ, каб заваяваць увагу кіраўніка прадпрыемства альбо свайго непасрэднага кіраўніка. Тады сапраўдную працу будуць вымушаныя выконваць іншыя, хіба не так? Такім чынам, ён завінаваціць іншым; раз ён хітры, значыць, умее падлашчвацца, дзякуючы чаму можа атрымліваць больш выгадаў, тады іншым будзе даставацца больш благога; раз ён хітры, дык не можа несці страты, яму і няпроста панесці страты, такім чынам несці страты будуць вымушаныя іншыя. Ён усё больш цэніць мізэрную актуальную выгаду, а такім чынам яго натура становіцца ўсё больш вузкай, тым больш яму здаецца, што толькі матэрыяльная выгада звычайных людзей — гэта тое, у чым сабе

нельга адмовіць. Ён лічыць сябе практычным чалавекам і не дазволіць сабе аніводнае страты.

А хтосьці нават ім захапляецца! Скажу табе: не захапляйся ім. Ты нават не ведаеш, наколькі стомна ён жыве: дрэнна есць, дрэнна спіць, нават у сне баіцца, каб яго інтарэсам не зашкодзілі. У пытанні асабістых інтарэсаў ён проста «залазіць у кончык бычынага рога». Скажы, хіба не стомна ён жыве? Усё сваё жыццё ён пражывае дзеля гэтага. Мы кажам: перад тварам супярэчнасці адступі на крок назад, і ты адчуеш «наколькі шырокае мора, наколькі бязмежнае неба»[232]. Гарантую, што карціна стане іншай. А такога кшталту чалавек не ідзе на саступкі. Ён жыве больш стомна, чым усе. Ты ў яго не вучыся! У колах удасканальвальнікаў кажуць: «Гэты чалавек зусім згубіўся. Дзеля матэрыяльных выгадаў ён сярод звычайных людзей зусім збіўся са шляху». Наказваеш яму берагчы Дэ — лёгка сказаць! Ты заклікаеш яго практыкаваць, ды дзе ж яму даць веры: «Практыкаваць? Вы, практыкоўцы, не адказваеце ўдарам на ўдар, лаянкай на лаянку. Іншыя з табой жудасна абыходзяцца, а табе нельга нават у думках ставіцца да іх гэтак жа. Наадварот, трэба нават ім дзякаваць. Усе вы ператварыліся ў Ак’ю! Усе вы псіхічна хворыя». Такім людзям немагчыма зразумець самаўдасканальванне. Яны будуць лічыць, што гэта *ты* бязґлузды, што гэта ты дурань. Вось і скажы, хіба лёгка такіх ратаваць?

Усведамленне, пра якое гаворым мы, — гэта не такое «ўсведамленне», а акурат тое, чаму яны называюць нас дурнымі ў асабістых інтарэсах. Вось пра якое ўсведамленне мы гаворым. Вядома, насамрэч мы не дурныя. Мы толькі абыякава ставімся да надзённых інтарэсаў. А ў іншых аспектах мы вельмі кемлівыя. Калі займаемся нейкім навукова-даследчым праектам, калі менеджар дае нам нейкае даручэнне альбо мы выконваем нейкую працу, тады нам усё цалкам зразумела, і мы ўсё здзяйсняем выдатна. А на нашыя дробныя асабістыя інтарэсы, выкліканыя супярэчнасцямі канфлікты з людзьмі мы глядзім абыякава. Хто тады назаве цябе дурнем? Ніхто. Гарантую.

Пагаворым пра сапраўднага дурня. Гэты прынцып на высокім узроўні становіцца цалкам супрацьлеглым. Дурню немагчыма здзейсніць сярод звычайных людзей значны благі ўчынак, немагчыма змагацца дзеля асабістых інтарэсаў, ён не імкнецца да славы і не страчвае Дэ. А вось іншыя даюць яму Дэ. Штораз, калі б'юць, лаюць яго, яны даюць яму Дэ. А гэтая матэрыя вельмі каштоўная. У нашым Сусвеце ёсць прынцып: «Хто не страчвае, той не атрымлівае. Калі атрымліваеш, тады страціш». Усе, хто бачаць таго вялікага дурня, лаюць яго: «Які ж ты вялікі дурань!» Услед за тым, як ты адкрываеш рот і кагосьці лаеш, ты кідаеш яму кавалак Дэ. Ты пажывіўся за чужы рахунак, а значыць, ты — бок, які атрымаў, тады ты мусіш страціць. Хтосьці, праходзячы міма, б'е яго нагой: «Які ж ты вялікі дурань!» Добра, зноў яму кінулі шчодры кавалак Дэ. Хтосьці яго абражае, нехта дае яму выспятка, а ён смяецца: «Давай-давай. Так ці інакш, ты даў мне Дэ. Я нізколькі ад сябе яго не

адштурхну». Задумайцеся: хто ж тады, згодна з прынцыпам высокага ўзроўню, мае востры розум? Ці не ён? Ён найразумнейшы. Ён не страчвае ані трохі Дэ. Калі ты кідаеш яму Дэ, ён ані трохі не адштурхоўвае яго назад, забірае цалкам усё, робіць гэта з усмешкай на твары. У гэтым жыцці дурны, а ў наступным — не. Яго душа не дурная. У рэлігіі кажуць, што калі ў чалавека стала шмат Дэ, тады ў наступным жыцці ён зойме высокую пасаду, страшэнна разбагацее. Усё гэта абменьваецца на Дэ.

Мы кажам, што Дэ можа непасрэдна эвалюцыянаваць у Ґун. Ці не ад эвалюцыі Дэ залежыць тое, наколькі высока ты ўдасканалішся? Яно можа непасрэдна эвалюцыянаваць у Ґун. Хіба не вынікам эвалюцыі гэтае матэрыі з'яўляецца Ґун, які вызначае вышыню ўзроўню чалавека і велічыню яго сілы Ґун? Вось і скажы, каштоўная яна ці не? Яе можна прыносіць з сабой, калі нараджаешся, і забіраць, калі паміраеш. У будызме кажуць: «Тое, наколькі высока ты ўдасканалішся, будзе тваім Рангам дасягнення». Колькі ты аддасі, столькі і атрымаеш — вось у чым логіка. Як гаворыцца ў рэлігіі, маючы Дэ, у наступным жыцці чалавек зойме высокую пасаду, нажыве вялікае багацце. Калі ж Дэ ў яго мала, тады ён нават і міласціну не выпрасіць, таму што не мае Дэ для абмену. Бо не страціш — не атрымаеш! Калі ў чалавека не застаецца ані кроплі Дэ, тады яго чакае поўнае знішчэнне цела і душы. Ён сапраўды памрэ.

Некалі быў адзін майстар ціґун. Калі ён толькі выйшаў на людзі, яго ўзровень быў даволі высокім. Потым гэты майстар ціґун, загразшы ў грошах ды рэпутацыі, упаў. Яго настаўнік адвёў прэч яго дапаможную душу, бо ён прыналежаў да ўсіх тых, у каго ўдасканальваецца дапаможная душа. Калі дапаможная душа таго чалавека яшчэ была з ім, тады чалавек быў пад кантролем дапаможнае душы. Прывяду прыклад. Аднойчы ў яго на працы размяркоўвалі кватэры. Яго кіраўнік сказаў: «У каго няма жылля — падыдзіце. Апішыце, у якіх вы знаходзіцеся жыллёвых умовах, няхай кожны з вас распавядзе, наколькі мае патрэбу ў кватэры». Кожны распавёў пра сябе. А той чалавек — ані слова. Урэшце кіраўнік убачыў, што менавіта ў яго найцяжэйшае становішча сярод усіх, што кватэру трэба даць яму. Іншы кажа: «Не! Кватэру нельга даваць яму. Трэба даць мне. Мне так патрэбна кватэра!» А той чалавек кажа: «Ну дык і забірай». З пункту гледжання звычайных людзей гэты чалавек дурны. Нехта ведаў, што ён практыкоўца, і ён у яго запытаў: «Ты практыкоўца, і табе нічога не патрэбна. А што табе ўсё ж такі патрэбна?» Ён сказаў: «Мне патрэбна тое, што іншым не патрэбна». Насамрэч гэты чалавек быў зусім не дурны, а вельмі разумны. Проста ў яго было такое стаўленне да асабістых інтарэсаў, ён скараўся натуральнай плыні рэчаў. А іншы зноў у яго запытваецца: «А хіба існуе такое, што цяперашнім людзям не патрэбна?» А ён адказвае: «Камяні, якія ляжаць на зямлі. Людзі штурхаюць іх нагамі, і яны нікому не патрэбныя. Вось я і падбяру тыя камяні». Для звычайных людзей гэта неспасціжна. Звычайныя людзі не могуць зразумець практыкоўцаў. Ім немагчыма іх зразумець. Іх ступень мыслення занадта ад іх адстае, іх узровень занадта адрозніваецца ад узроўню практыкоўцаў. Вядома, той чалавек не падбіраў з долу камяні, а толькі выказаў прынцып, які да звычайных людзей не

даходзіць: «Я не імкнуся да рэчаў звычайных людзей». Возьмем гэты камень. Як вы ведаеце, у будыйскіх канонах распавядаецца: «У Свеце Найвышэйшага Шчасця і дрэвы залатыя, і зямля залатая, і птушкі залатыя, і кветкі залатыя, і будынкі залатыя. Нават целы Будаў пераліваюцца залатым ззяннем». Там не знайсці аніводнага каменя. Кажуць, грашыма там з’яўляюцца камяні. Той чалавек усё ж не панясе туды камень, але ён выказаў прынцып, які звычайныя людзі не ў стане зразумець. Цалкам правільна кажуць практыкоўцы: «За тым, за чым звычайныя людзі хціва гоняцца, мы не гонімся; тое, што звычайныя людзі маюць, мы не лічым каштоўным; а тое, што маем мы, звычайныя людзі не атрымаюць, нават калі захочуць».

Насамрэч тое ўсведамленне, пра якое мы толькі што казалі, усё ж такі прыналежыць да ўсведамлення ў ходзе ўдасканальвання ды з'яўляецца цалкам супрацьлеглым усведамленню звычайных людзей. Усведамленне, якое мы сапраўды маем на ўвазе, гэта калі ў ходзе нашае практыкі настаўнік выкладае Закон, настаўнік Школы Даа выкладае Даа, калі ты ў працэсе ўдасканальвання сутыкаешся з бедамі, ці можаш ты ўсвядоміць, што ты ўдасканальвальнік, ці можаш зразумець, ці можаш прыняць, альбо ці можаш у ходзе ўдасканальвання чыніць згодна з гэтым Законам. Некаторыя людзі, проста як ты ім ні распавядаеш, усё адно не даюць веры. Яны застаюцца «практыкамі» звычайных людзей. Іх няздольнасць паверыць выкліканая тым, што яны неадступна трымаюцца ўласцівых ім уяўленняў. Іншыя ж толькі і думаюць пра лекаванне. Як толькі я тут сказаў, што прызначэнне ціґун зусім не ў лекаванні, дык у іх ужо ўзнікла антыпатыя, і ўсяму выкладзенаму пасля таго яны ўжо не давалі веры.

У некаторых людзей здольнасць усведамлення ніяк не падвысіцца. Хтосьці бярэ гэтую маю кнігу і адвольна піша ў ёй усюды свае рэмаркі. Тыя з нас, у каго адкрыта нябеснае вока, бачаць, што гэтая кніга пераліваецца ўсімі колерамі вясёлкі, зіхаціць золатам, што кожнае слова — гэта вобраз майго Цела Закону. Калі б я вам хлусіў, тады б гэта азначала, што я вас падманваю. А напісанае табой чорнае-чорнае. Ты асмельваешся вось так адвольна там пісаць? Што мы тут робім? Хіба не навучаем цябе ўдасканальвацца ўгару? Пра некаторыя рэчы ты павінен задумацца. Гэтая кніга здольная ўказваць табе дарогу ў самаўдасканальванні. Памяркуй: каштоўная яна ці не? Ці можа тваё пакланенне Буду сапраўды дазволіць табе ўдасканальвацца? Ты вельмі пабожны. Ты не наважваешся нават дакрануцца да статуі Буды і штодня паліш для яе фіміям. А вось Вялікі Закон, які сапраўды можа ўказваць табе шлях ва ўдасканальванні, ты, наадварот, смееш псаваць.

Гаворачы пра ўсведамленне, маюць на ўвазе меру, у якой ты разумееш усялякія ўзроўні, якія з'яўляюцца ў ходзе ўдасканальвання, або выкладзены настаўнікам нейкі прадмет, нейкі Закон. Але гэта яшчэ не з'яўляецца тым, што мы называем карэнным усведамленнем. Карэннае ўсведамленне, пра якое мы кажам, азначае, што чалавек усю рэшту свайго жыцця ад самага пачатку

ўдасканальвання ўвесь час няспынна падвышаецца, няспынна пазбаўляецца ад чалавечых навязлівых ідэяў, розных жаданняў. Яго Ґун таксама няўхільна расце ўгару. І так працягваецца да таго моманту, пакуль ён не зробіць апошні крок у сваім удасканальванні. Яго матэрыя Дэ цалкам эвалюцыянуе ў Ґун, чалавек дойдзе да канца запланаванага настаўнікам шляху ўдасканальвання. У гэтае імгненне замкі — «Плясь!» — адразу цалкам адчыняцца ад выбуху. Яго нябеснае вока дасягне найвышэйшае ступені ўзроўню, на якім чалавек знаходзіцца. Ён убачыць сапраўдныя карціны кожнае прасторы таго ўзроўню, на якім будзе знаходзіцца, формы існавання розных істотаў кожнае прасторы-часу, формы існавання матэрыі кожнае прасторы-часу, убачыць ісціну нашага Сусвету. У яго грандыёзна праявіцца цудатворная сіла, і ён зможа кантактаваць з усялякімі істотамі. Калі дасягаеш гэтага стану, хіба ты ўжо не Вялікі Прабуджаны? Хіба ты не будзеш тым, хто, удасканаліўшыся, дасягнуў Прабуджэння? У перакладзе на старажытнаіндыйскую мову гэта «Буда».

Усведамленне, пра якое мы гаворым, тое карэннае ўсведамленне ўсё ж такі адносіцца да раптоўнае формы ўсведамлення[233]. У раптоўным усведамленні чалавек усё астатняе жыццё ўдасканальваецца ў замкнёным стане. Яму невядома, наколькі высокі ў яго Ґун, невядома, якія формы мае выпрацаваны ім Ґун. У яго наогул няма аніякае рэакцыі. Нават клеткі яго цела замкнёныя, увесь выпрацаваны Ґун замкнёны. Так адбываецца, пакуль чалавек не дойдзе да самага канца свайго ўдасканальвання — толькі тады яны адкрываюцца. Выканаць гэта здольны толькі чалавек з выдатнымі прыроджанымі якасцямі. Удасканальванне яго неймаверна пакутлівае. Пачынаючы з таго, каб быць добрым чалавекам, ён толькі і ведае, што падвышаць свой Сіньсін, трываць пакуты ды ўдасканальвацца ўгару. Ён толькі і ведае, што патрабаваць ад сябе падвышэння Сіньсін, але не бачыць уласнага Ґун. Такім людзям удасканальвацца цяжэй за ўсіх. Гэта павінен быць чалавек з выдатнымі прыроджанымі якасцямі. Колькі б гадоў ён ні ўдасканальваўся, яму нічога невядома.

Ёсць яшчэ іншы від усведамлення, які называецца паступовым усведамленнем. З самага пачатку вельмі многія з вас адчуваюць вярчэнне Фалунь. Разам з тым я адкрываю вам нябеснае вока. Некаторыя з вас пяройдуць ад стану, калі з розных прычынаў не бачаць, да такога, калі ў будучыні ўбачаць; ад стану, калі бачаць невыразна, да такога, калі ўбачаць выразна; ад стану, калі нябесным вокам карыстацца не ўмеюць, да такога стану, калі будуць умець гэта рабіць. Ты няспынна падвышаеш свой узровень. Услед за тваім падвышэннем Сіньсін ды пазбаўленнем ад разнастайных навязлівых ідэяў у цябе праявяцца розныя здольнасці. Эвалюцыя на працягу ўсяго працэсу ўдасканальвання, ход пераўтварэння цела будзе адбывацца цалкам ва ўмовах, калі ты сам можаш гэта ўбачыць ці адчуць. Такім чынам, зрабіўшы самы апошні крок, ты цалкам спазнаеш ісціну Сусвету. Твой узровень дасягне вяршыні, да якое табе належала дайсці ва ўдасканальванні. Змены твайго цела ды ўзмацненне здольнасцяў дасягнуць пэўнае ступені. Ты дасягнеш гэтае мэты крок за крокам. Такім з'яўляецца паступовае ўсведамленне. Метад удасканальвання

паступовага ўсведамлення таксама няпросты. Набыўшы здольнасці, некаторыя людзі ніяк не вызваляюцца ад навязлівых ідэяў, таму могуць паказаць сябе, могуць здзейсніць нешта благое. Такім чынам, у цябе ўпадзе Ґун, тваё ўдасканальванне акажацца марным, і ўрэшце ты зламаешся. Некаторыя з тых, хто бачыць, могуць бачыць з'яўленне разнастайных істот розных узроўняў, якія, магчыма, будуць ублытваць цябе ў нешта, каб рабіць тое ды сёе, магчыма, пацягнуць цябе, каб ты ўдасканальваўся па іх рэчах, прымуць цябе ў вучні, аднак яны не здольныя дазволіць табе дабіцца Паўнапраўнага дасягнення, бо яны і самі яго не дабіліся.

Апроч таго, людзі прастораў высокіх узроўняў з’яўляюцца багамі. Яны ператвараюцца ў калосаў, грандыёзна праяўляюць цудатворную сілу. Ці не пойдзеш ты за імі, як толькі твае думкі стануць няправеднымі? Як толькі ты гэта зробіш, тваё ўдасканальванне адразу ж акажацца марным. Нават калі ён з'яўляецца сапраўдным Будам, сапраўдным Даосам, ты ўсё адно будзеш змушаны зноў удасканальвацца спачатку. Хіба людзі столькіх узроўняў Нябёсаў не з'яўляюцца святымі? Цалкам выскачыць адсюль можна толькі тады, калі дойдзеш ва ўдасканальванні да вельмі высокага ўзроўню і дасягнеш сваёй мэты. А вось у вачах простага чалавека тыя жыхары неба сапраўды выглядаюць і высокімі, і вялікімі, і маюць вялікія здольнасці. Але яны зусім не абавязкова з'яўляюцца тымі, хто атрымаў Паўнапраўнае дасягненне. Ці зможаш ты не паддацца перашкодам ад разнастайнае інфармацыі, спакусам ад усялякіх карцін? Таму я і кажу, што ўдасканальвацца з адкрытым нябесным вокам таксама цяжка. Тады цяжэй ручацца за свой Сіньсін. Але добрая рэч у тым, што некаторыя з нас прыналежаць да тых, каму разблакоўваюць здольнасці і дазваляюць увайсці ў стан паступовага ўсведамлення толькі на паўдарозе. Нябеснае вока мы адкрываем кожнаму, а здольнасці вельмі шмат каму з вас не праявім. Пасля таго як твой Сіньсін паступова крок за крокам падвысіцца да пэўнага ўзроўню, душэўны стан стане ўстойлівым, і ты зможаш трымаць сябе ў руках, мы адразу пры дапамозе выбуху цябе адкрыем. Мы дамо табе ўвайсці ў стан паступовага ўсведамлення, калі ты дасягнеш пэўнага ўзроўню. У той час табе стане даволі лёгка сябе кантраляваць, і ў цябе праявяцца розныя здольнасці. Ты будзеш удасканальвацца ўгару і нарэшце дасягнеш стану поўнага адкрыцця. Мы зробім так, каб гэта адбылося на паўшляху твайго ўдасканальвання. Мноства з нас прыналежыць да гэтага тыпу. Таму не імкніся хутчэй дасягнуць відушчага стану.

Вы, верагодна, чулі, што ў Дзэн таксама гавораць пра дзяленне на раптоўнае ды паступовае ўсведамленне. Шосты патрыярх Дзэн Хўэйнэн стаяў за раптоўнае ўсведамленне, а Шэньсю з яго паўночнае плыні быў прыхільнікам паступовага. У гісторыі паміж імі двума ў будыйскай філасофіі ішла вельмі даўгачасная дыскусія. Яны спрачаліся ды спрачаліся. На маю думку, гэта не мае сэнсу. Чаму? Таму што яны мелі на ўвазе ўсяго толькі пазнанне нейкага прынцыпу ў ходзе ўдасканальвання. Гэты прынцып нехта зразумеў адразу ж, а хтосьці ўсвядоміў, зразумеў яго паступова. Хіба не ўсё адно, як ты яго ўсведамляеш?! Лепш зразумець адразу. Паступова ўсвядоміць таксама

гадзіцца. Хіба ў абодвух выпадках гэта не ўсведамленне? Усведамленне. Такім чынам, абодва выпадкі — гэта няблага.

## ЧАЛАВЕК З ВЫДАТНЫМІ ПРЫРОДЖАНЫМІ ЯКАСЦЯМІ

Хто такі чалавек з выдатнымі прыроджанымі якасцямі? Ён усё ж адрозніваецца ад людзей з добрай ці дрэннай маральнай асновай. Такога чалавека з выдатнымі прыроджанымі якасцямі неймаверна цяжка знайсці. За вельмі доўгі гістарычны перыяд можа нарадзіцца толькі адзін такі чалавек. Вядома, чалавек з выдатнымі прыроджанымі якасцямі перадусім павінен мець велізарны Дэ — у яго мусіць быць каласальнае поле белае матэрыі. Гэта абавязкова. Разам з тым ён яшчэ павінен быць здольным трываць пакуты ў пакуце, мець вялікае цярпенне, быць здольным адмаўляцца, умець берагчы Дэ, мець добрую здольнасць усведамлення і гэтак далей.

Што такое пакуты ў пакуце? У будызме лічаць, што быць чалавекам — гэта ўжо пакута. Як толькі ты стаў чалавекам, дык будзеш пакутаваць. Там лічаць, што ніхто з істот усіх прастораў не мае такога, як у нас, цела звычайнага чалавека, а таму не хварэе, таму не стаіць перад праблемай нараджэння-старасці-хваробаў-смерці, таму не мае такіх пакутаў. Людзі іншых прастораў могуць плаваць у паветры, быць бязважкімі, неверагодна цудоўнымі. А ў звычайных людзей менавіта праз наяўнасць гэтага цела ўзнікае праблема: ім блага ад холаду, ад спёкі, ад смагі, ад голаду і ад стомы. Яшчэ яны праходзяць праз нараджэнне-старасць-хваробы-смерць. Так ці інакш, але ў цябе няма камфорту.

Я чытаў адну публікацыю ў прэсе, дзе распавядалася, што, калі быў таншаньскі землятрус[234] і шмат людзей у ім загінула, некаторых пацярпелых выратавалі. Сярод гэтых людзей правялі асаблівую сацыялагічную апытанку: у іх запыталіся пра тое, што яны адчувалі ў стане клінічнае смерці. Але неспадзяваным было тое, што гэтыя людзі распавялі пра адну адмысловую акалічнасць, прычым былі ў гэтым аднадушныя: у момант смерці чалавек не адчувае страху, акурат наадварот, раптам перажывае адчуванне вызвалення, адчуванне ўнутранага ўзрушэння; некаторыя з іх адчулі, як у іх адразу зніклі цялесныя путы, як яны надзвычай прыемна ўзляцелі ды нават убачылі сваё цела; другія нават убачылі істот іншых прастораў; а трэція патрапілі ў нейкія месцы. Усе гэтыя людзі распавялі, што ў той момант зведалі пачуццё ўнутранага ўзрушэння ад вызвалення, пачуццё, калі няма пакутаў. Вось я і кажу, што мець нашае фізічнае цела — гэта ўжо пакуты. Але ўсе з'яўляюцца на свет з улоння маці, а таму ўжо і не ведаюць, што пакутуюць.

Я казаў, што чалавек павінен стрываць пакуты ў пакуце. Як я ўжо ў той дзень распавядаў, у прасторы-часе чалавецтва ды іншай, большай, прасторы-часе рознае паняцце прасторы. У нас на гэтым баку адзін шычэнь — гэта дзве

гадзіны, а ў іх прасторы гэта адзін год. Яны кажуць, што гэты чалавек практыкуе ў такім пакутлівым асяроддзі, ён сапраўды ўражвае; яны кажуць, што ў гэтага чалавека з'явілася жаданне знайсці Даа, ён хоча ўдасканальвацца, што ён проста надзвычай асаблівы. Яму настолькі горка, але, нягледзячы на гэта, яго прырода не знікла[235], ён усё яшчэ жадае ўдасканальвацца і вярнуцца назад. Вось чаму можна безумоўна дапамагаць удасканальвальнікам. Скажам, гэты чалавек у прасторы звычайных людзей усю ноч праседзеў у медытацыі. Убачыўшы гэта, яны кажуць, што чалавек і сапраўды выдатны — ён праседзеў тут ужо шэсць гадоў. Бо адзін наш шычэнь — гэта адзін год на тым баку. У нашага чалавецтва вельмі адмысловая прастора.

Як трываць пакуты ў пакуце? Прывяду прыклад. Аднойчы чалавек пайшоў на працу. На прадпрыемстве стан рэчаў не вельмі добры, сітуацыя кепская — людзей больш, чым працы. Прадпрыемства мусіць рэфармавацца, наняць падрадчыкаў ды звольніць лішніх супрацоўнікаў. Гэты чалавек таксама апынуўся сярод іх. Адразу застаўся без кавалка хлеба. Які ў яго настрой? «Няма дзе браць грошы на выдаткі. Як цяпер жыць? Узяцца за нешта іншае? Але нічога іншага я не ўмею». Прыгнечаны, ён вярнуўся дамоў. Толькі дабраўся дадому, як там захварэў адзін з яго старых бацькоў, ды яшчэ вельмі сур'ёзна. Усхваляваны, чалавек думае: «Трэба тэрмінова даставіць яго ў лякарню!» З вялікай цяжкасцю ён пазычыў грошы, каб пакласці старога чалавека ў лякарню. Вярнуўся дадому, каб сабраць для яго нейкія рэчы. Толькі дабраўся дамоў, як прыйшоў школьны настаўнік і сказаў: «Ваш сын страшэнна збіў іншага. Тэрмінова пайдзіце ды паглядзіце!» Як толькі чалавек, разабраўшыся з гэтым інцыдэнтам, вярнуўся дадому і вось там прысеў, зазваніў тэлефон і яму сказалі: «Вашая жонка вам здраджвае». Вядома, вы не сутыкняцеся з такім выпадкам. Звычайны чалавек не зможа вытрымаць такое пакуты і падумае: «Навошта мне далей жыць? Знайду вяроўку ды павешуся. Лепш я памру! Смерць пакладзе канец усім праблемам[236]!» Я кажу, што чалавек павінен трываць пакуты ў пакуце. Вядома, усё ж такі не абавязкова ў такой форме. Інтрыгі паміж людзьмі, звязаныя з Сіньсін звады, барацьба за асабістыя інтарэсы гэтаму не саступаюць. Колькі людзей жывуць толькі дзеля свайго знешняга прэстыжу, а калі не вытрымліваюць прыніжэння, тады вешаюцца. Такім чынам, мы мусім удасканальвацца ў такім складаным асяроддзі, павінны вытрымаць пакуты ў пакуце. Разам з тым мы таксама павінны мець вялікае цярпенне.

А што такое вялікае цярпенне? Практыкоўцу перадусім патрэбна дабіцца таго, каб не адказваць ударам на ўдар, лаянкай на лаянку. Ён павінен цярпець. Інакш які ты практыкоўца? Хтосьці з вас сказаў: «Такога цярпення вельмі цяжка дасягнуць. У мяне дрэнны характар». Калі характар дрэнны, тады змяняйся. Практыкоўца павінен быць цярплівым. Нехта, выхоўваючы дзіця, таксама выбухае, падымаючы шалёны крык. Калі выхоўваеш дзіця, не трэба быць такім. Табе не трэба злавацца па-сапраўднаму. Дзейнічай больш разумна, калі выхоўваеш дзіця. Толькі тады ты зможаш сапраўды добра яго выхаваць. Ты не можаш перажыць нават дробязяў ды зрываешся. Ды яшчэ хочаш, каб у цябе ўзрос Ґун! Нехта з вас кажа: «Калі я буду ісці вуліцай, хтосьці ўдарыць мяне

нагой, і побач не будзе нікога са знаёмых, тады я змагу стрываць». Я скажу, што гэтага яшчэ не дастаткова. Хто ведае, магчыма, у будучыні зробяць так, што табе дадуць пару аплявух, што ты асаромішся менавіта ў прысутнасці таго, перад кім больш за ўсё баішся страціць аблічча. Як ты да гэтага паставішся? Тады паглядзяць, ці зможаш ты гэта вытрымаць. Калі ты зможаш вытрымаць, але ў душы гэта будзе цябе турбаваць, дык гэта таксама не гадзіцца. Як вам вядома, тыя, хто дасягнуў узроўню Аргата, сутыкнуўшыся з чымсьці, ніколі не хвалююцца, ніякія падзеі звычайных людзей іх зусім не бянтэжаць, яны заўсёды застаюцца вясёлымі. Якіх бы велізарных стратаў яны не зведалі, яны ўсё адно вясёлыя, і ім абыякава. Калі ты сапраўды можаш гэтага дасягнуць, значыць, ты ўжо дайшоў да Пачатковага Рангу дасягнення Аргата.

Хтосьці з вас сказаў: «Калі мы будзем праяўляць цярпенне да такое ступені, тады звычайныя людзі скажуць, што мы занадта слабыя, што нас занадта лёгка пакрыўдзіць». Мой адказ: гэта не слабасць. Падумайце: сярод звычайных людзей нават старыя і высокакультурныя людзі паводзяцца выхавана ды не апускаюцца да ўзроўню іншых. Дык што ж тады казаць пра нас, практыкоўцаў? Якая ж гэта слабасць? Я лічу, што гэта праява вялікага цярпення, праява сілы волі. Выключна практыкоўцы могуць мець такое вялікае цярпенне. Ёсць такі выраз: «мужлан[237], пачуўшы абразу, выцягне меч ды стане біцца». Звычайны чалавек, вядома, так і зробіць: ты аблаяў мяне, я аблаю цябе; ты ўдарыў мяне, я ўдару цябе. Гэта і ёсць звычайны чалавек. Хіба можна сказаць, што гэта практыкоўца? Калі ты, з'яўляючыся ўдасканальвальнікам, не будзеш мець цвёрдае волі ды будзеш не ў стане сябе кантраляваць, тады не зможаш гэтага дасягнуць.

Як вы ведаеце, у старажытнасці была асоба па імені Хань Сінь[238]. Пагаворвалі, што гэты Хань Сінь быў таленавітым. Ён быў галоўнакамандавальнікам арміі Лю Бана[239], апорай дзяржавы. За кошт чаго ж ён быў здольны выконваць настолькі адказную справу? Казалі, што Хань Сінь ужо з дзяцінства быў выдатным чалавекам. Ёсць такі класічны сюжэт: «Хань Сінь зведаў ганьбу, пралезшы ў іншага паміж ног[240]». Хань Сінь з дзяцінства займаўся баявымі мастацтвамі, а людзі, якія імі займаліся, заўсёды насілі з сабой меч. Аднойчы, калі ён ішоў па вуліцы, адзін мясцовы хуліган, упёршы рукі ў бакі, загарадзіў яму дарогу: «Навошта ты носіш меч? Хіба ты адважышся кагосьці забіць? Раз ты адважышся забіць чалавека, дык адсячы мне галаву», — кажучы гэта, ён падставіў яму галаву. Хань Сінь падумаў: «Навошта мне адсякаць табе галаву?» У тыя часы за такое таксама даносілі ўладам ды змушалі заплаціць жыццём за жыццё. Хіба можна адвольна забіваць людзей? Хуліган, убачыўшы, што Хань Сінь не вырашаецца яго забіць, сказаў: «Калі ты не адважваешся мяне забіць, дык прапаўзі ў мяне між ног». І Хань Сінь сапраўды прапоўз у яго паміж ног. Гэта сведчыць пра тое, што Хань Сінь меў выдатнае вялікае цярпенне. Ён не быў такім, як звычайныя людзі і менавіта дзякуючы гэтаму быў у стане несці такую адказную службу. «Людзі змагаюцца за свой знешні прэстыж». Гэта выраз звычайных людзей. Задумайцеся: хіба жыць дзеля гэтага прэстыжу не стомна? Хіба не горка? Хіба варта? Хань Сінь усё ж такі быў

звычайным чалавекам, а мы ўдасканальвальнікі. Мы нашмат мацнейшыя за яго. Нашая мэта — дасягнуць узроўню, які перавышае звычайных людзей, і зрабіць крок у кірунку яшчэ больш высокіх узроўняў. З такім інцыдэнтам мы не сутыкнемся, але калі ўдасканальвальнік сярод звычайных людзей зведвае ганьбу ды прыніжэнні, тады яно не абавязкова гэтаму саступае. Звязаныя з Сіньсін звады з людзьмі, я сказаў бы, гэтаму не саступаюць. І не толькі не саступаюць, але і пераўзыходзяць. Гэта таксама надзвычай цяжка.

Разам з тым удасканальвальнік яшчэ павінен быць здольным адмаўляцца — пазбаўляцца ад разнастайных навязлівых ідэяў звычайнага чалавека, разнастайных жаданняў. Адразу гэтага не дабіцца. Мы можам дасягаць гэтага паступова. Калі б ты ўжо сёння мог гэтага дабіцца, тады ўжо сёння стаў бы Будам. Удасканальванне будзе праходзіць паступова, але ты не расслабляйся. Ты скажаш: «Настаўнік казаў, што ўдасканальванне будзе праходзіць паступова, дык тады і будзем удасканальвацца паступова». Ні ў якім разе! Ты павінен прад'яўляць да сябе суровыя патрабаванні. Ва ўдасканальванні па Законе Буды ты павінен быць адважным і ўвесь час імкнуцца знайсці, у чым яшчэ палепшыцца[241].

Яшчэ неабходна быць здольным берагчы Дэ, патрэбна берагчы Сіньсін. Нельга рабіць бязладдзе. Табе нельга адвольна рабіць што заўгодна, ты павінен быць у стане зберагчы свой Сіньсін. Сярод звычайных людзей вы часта чуеце такія словы: «назапашвайце Дэ, робячы добрыя ўчынкі». Практыкоўцы не назапашваюць Дэ — мы беражом Дэ. А чаму мы беражом Дэ? Бо мы бачым такую сітуацыю: назапашваннем Дэ займаюцца сярод звычайных людзей. Калі яны збяруць Дэ, зробяць дабро, тады ў наступным жыцці ім будзе добра. А ў нас тут больш няма гэтае праблемы. Калі ты паспяхова ўдасканалішся, тады спасцігнеш Даа. У цябе больш не будзе праблемы многіх жыццяў. Захаванне Дэ, пра якое мы тут кажам, мае таксама іншае значэнне: белае і чорнае рэчывы, якія ёсць у нашым целе, сабраныя не за адно жыццё, яны засталіся з даўніх часоў. Ты будзеш гойсаць на ровары па ўсім горадзе і не абавязкова сустрэнеш магчымасць зрабіць добры ўчынак. Ты не абавязкова яе сустрэнеш, нават калі штодня будзеш так рабіць.

Тут ёсць таксама іншае значэнне. Дапусцім, табе дазволяць назапашваць Дэ. Ты сутыкнешся з нейкім выпадкам, які падасца табе добрай справай, але калі ты яе зробіш, тады магчыма такое, што яна акажацца благой; ты сутыкнешся з выпадкам, які падасца табе благім, і калі ты ўмяшаешся ў яго, тады магчыма такое, што насамрэч гэта быў станоўчы выпадак. А чаму? Таму што ты не бачыш іх унутранай прычыннай сувязі. Інцыдэнты звычайных людзей вырашаюцца ў адпаведнасці з законамі[242] — у гэтым няма праблемы. Той, хто з'яўляецца практыкоўцам, ужо звышнатуральны. Такім чынам, ты, як звышнатуральны чалавек, ужо павінен прад'яўляць да сябе патрабаванні па звышнатуральных прынцыпах і ўжо не можаш ацэньваць рэчы па прынцыпах звычайных людзей. Ты не ведаеш прычыннае сувязі нейкага інцыдэнту, а

значыць, можаш зрабіць памылку. Таму мы прытрымліваемся Нядзеяння. Ты не можаш рабіць усё, што табе захочацца. Хтосьці з вас кажа: «А я хачу стрымліваць злых людзей». Я адказваю: дык стань паліцэйскім і годзе. Але гэта не значыць, што мы кажам табе не ўмешвацца, нават калі ты сутыкнешся з забойствам альбо падпалам. Я вам кажу пра тое, што калі паміж людзьмі адбываюцца супярэчнасці, і нехта б'е іншага нагой, б'е іншага кулаком, тады, хто ведае, магчыма, што апошні раней яму завінаваціў, і яны разлічыліся. Калі ты ўмяшаешся, тады разліку паміж імі не атрымаецца, і ім прыйдзецца чакаць наступнага разу, каб гэта зноў паўтарылася. Гэта сведчыць пра тое, што ты не бачыш прычыннае сувязі ды можаш здзейсніць благі ўчынак, а праз гэта страціць Дэ.

Звычайныя людзі ўмешваюцца ў справы звычайных людзей. Гэта не страшна. Яны ацэньваюць рэчы прынцыпамі звычайных людзей. А ты павінен глядзець на рэчы згодна са звышнатуральнымі прынцыпамі. Калі ты ўбачыш забойства ці падпал і нічога не зробіш, тады гэта ўжо будзе праблемай Сіньсін. Інакш як табе праявіць сябе добрым чалавекам? Калі ты не будзеш умешвацца, нават калі кагосьці забіваюць альбо здзяйсняюць падпал, дык калі ж яшчэ ты будзеш умешвацца? Але ёсць вось які момант. Гэтыя рэчы да нас, удасканальвальнікаў, не маюць аніякага дачынення. Наўрад ці табе гэта заплануюць, наўрад ці табе дазволяць з такім сутыкнуцца. Зберагання Дэ, пра якое мы кажам, азначае тое, каб ты пазбягаў здзяйснення благіх учынкаў. Хто ведае, магчыма, нават найменшы твой удзел у чымсьці азначае здзяйсненне благога ўчынку. Тады ты страціш Дэ. Калі ты страціш Дэ, тады як ты падвысіш свой узровень? Як дасягнеш сваёй канчатковай мэты? Вось якая ў гэтым маецца праблема. Апроч таго, трэба яшчэ мець добрую здольнасць усведамлення. Калі маральная аснова добрая, тады, верагодна, здольнасць усведамлення таксама будзе добрай. Ролю адыгрывае і ўплыў асяроддзя.

Мы яшчэ вось што скажам. Калі кожны з нас будзе ўдасканальвацца ўнутры, кожны будзе шукаць у сваім Сіньсін, калі ў чымсьці зробіць дрэнна, сам пашукае ў сабе прычыну, каб наступным разам зрабіць добра, і, робячы нешта, перадусім будзе думаць пра іншых, тады чалавечае грамадства зменіцца да лепшага, зноў падвысіцца маральнасць, палепшыцца і духоўная культура, і стан грамадскага парадку. Хто ведае, магчыма, нават не застанецца паліцыі! Не было б патрэбы дысцыплінаваць людзей, калі б кожны назіраў за самім сабой, шукаў у сваіх думках. Скажы, хіба не было б гэта цудоўна? Як вам вядома, цяпер законы паступова становяцца ўсё больш поўнымі ды ўсё больш дасканалымі. Але чаму некаторыя людзі ўсё адно чыняць зло? Законы ж ёсць, чаму яны іх не прытрымліваюцца? Таму што ты не можаш дысцыплінаваць іх думкі. Калі ніхто не ўбачыць, яны ўсё адно будуць рабіць благія ўчынкі. Калі кожны чалавек будзе ўдасканальвацца ўнутры, тады карціна стане кардынальна іншай. Больш не будзе неабходнасці, каб ты выступаў у абарону справядлівасці.

Закон можна было выкласці толькі да гэтага ўзроўню. Яшчэ больш высокі змест ты зможаш успрыняць толькі за кошт свайго ўласнага ўдасканальвання. Некаторыя з вас задаюць мне ўсе больш канкрэтныя пытанні. Калі я адкажу нават на пытанні, звязаныя з побытам, тады што ж табе застанецца ўдасканальваць?! Ты павінен сам удасканальвацца, сам усведамляць. Калі я ўсё распавяду, тады ўжо не застанецца таго, што ўдасканаліў бы ты. Добра, што Дафа ўжо пашыраецца. Ты можаш чыніць згодна з Дафа.

*          *          *

Думаю, час майго выкладання Закону ў асноўным неўзабаве завершыцца, таму я хацеў пакінуць вам сапраўднае, каб у вашым далейшым удасканальванні ў вас быў Закон, які б вас накіроўваў. Ва ўсім працэсе выкладання Закону я быў адказным перад вамі ды адначасова адказным перад грамадствам. Насамрэч мы рабілі згодна з гэтым прынцыпам. Што ж тычыцца таго, добра ці дрэнна мы гэта рабілі, пра гэта я змаўчу. У вас саміх будзе ў гэтым бесстаронняе меркаванне. Маім жаданнем было выкласці Дафа, каб яшчэ большая колькасць нашых людзей змагла атрымаць карысць, каб тыя, хто сапраўды хоча ўдасканальвацца, маглі на падставе Закону ўдасканальвацца ўгару. Разам з тым у працэсе выкладання Закону мы таксама выказалі сутнасць таго, як быць чалавекам, і спадзяемся, што пасля курсаў, калі вы не зможаце ўдасканальвацца па Дафа, дык, прынамсі, зможаце быць добрымі людзьмі. Такім чынам, гэта прынясе карысць нашаму грамадству. Насамрэч ты ўжо ведаеш, як быць добрым чалавекам. І ў будучыні ты зможаш быць добрым чалавекам.

У працэсе выкладання Закону не заўсёды ўсё праходзіла гладка, таксама былі велізарныя перашкоды з усіх бакоў. Дзякуючы падтрымцы арганізатараў і кіраўніцтва розных сфер, а таксама намаганням працаўнікоў, нашыя курсы былі праведзеныя даволі паспяхова.

Усё тое, што я распавёў на курсах, будзе накіроўваць вас ва ўдасканальванні на высокія ўзроўні. Ніхто з тых, хто выкладаў Закон у мінулым, не закранаў гэтых рэчаў. Мы выклалі ўсё вельмі зразумела, спалучыўшы свае лекцыі з сучаснай навукай ды сённяшнімі навукамі пра чалавечае цела, прычым выклалі ўсё з пункту гледжання вельмі высокіх узроўняў. Я зрабіў гэта галоўным чынам дзеля вас — каб у будучыні вы змаглі сапраўды спасцігнуць Закон, удасканаліцца. Менавіта гэта было маім зыходным пунктам. У працэсе нашага выкладання Закону і навучання практыцы вельмі шмат каму з вас Закон падаецца цудоўным, але вельмі цяжкаажыццяўляльным. Насамрэч я лічу, што цяжка гэта ці не цяжка, залежыць ад таго, пра каго ідзе гаворка. Цалкам звычайненькі

чалавек, які не жадае ўдасканальвацца, палічыць удасканальванне проста-такі неверагодна складаным, неймаверным, такім, у якім немагчыма дасягнуць поспеху. Ён звычайны чалавек, ён не хоча ўдасканальвацца, таму для яго гэта будзе здавацца вельмі складаным. Лаа-цзы казаў: «Калі дабрадзейны чалавек чуе Даа, тады добрасумленна яго прытрымліваецца; калі звычайны чалавек чуе Даа, тады ён часам прытрымліваецца яго, а часам парушае[243]; калі нікчэмны чалавек чуе Даа, тады гучна з яго рагоча; калі ён з яго не будзе рагатаць, дык гэта не заслугоўвае лічыцца Даа»[244]. Для сапраўднага ўдасканальвальніка, я сказаў бы, гэта будзе вельмі простым, а не чымсьці недасягальным. Насамрэч многія дасведчаныя вучні, якія сабраліся тут, або тыя, якія сюды не прыйшлі, ужо дасягнулі ва ўдасканальванні неймаверна высокіх узроўняў. Я табе не распавядаў пра гэта, асцерагаючыся, што ў цябе ўзнікнуць навязлівыя ідэі, самаздаволенне ды іншыя чыннікі, якія паўплываюць на рост тваёй сілы Ґун. Той, хто мае ў сэрцы сапраўдную рашучасць удасканальвацца, зможа стрываць усё, зможа пазбавіцца ад навязлівых ідэяў, калі на кон будуць пастаўлены разнастайныя выгады, зможа глядзець на іх зусім абыякава. Дастаткова таго, каб ён змог гэтага дабіцца, і яму ўжо не будзе цяжка. Справа ў тым, што тых, хто называе гэта цяжкім, уласна, бянтэжаць гэтыя рэчы. Сам метад практыкі, па якім удасканальваюцца, зусім не складаны, у самім падвышэнні твайго ўзроўню няма абсалютна нічога складанага. Проста чалавек не можа вызваліцца ад навязлівых ідэяў — толькі таму ён кажа, што гэта складана. Бо, калі на кон пастаўлены твае актуальныя інтарэсы, вельмі цяжка пра іх не турбавацца. Вось яна, выгада. Вось і скажы, як вызваліцца ад гэтых думак? Складанасць, якую яны маюць на ўвазе, насамрэч у гэтым. Калі ў нас адбываюцца супярэчнасці з людзьмі, і мы не можам стрымаць гнеў, і нават не можам паставіцца да гэтага як практыкоўцы, тады, я сказаў бы, што так нічога не атрымаецца. Раней, калі ўдасканальваўся я, тады шмат высакародных мудрацоў казалі мне такія словы: «Тое, што цяжка сцярпець, можна сцярпець. Тое, што складана здзейсніць, можна здзейсніць». Насамрэч менавіта так яно і ёсць. Не лішнім было б, каб, вярнуўшыся дамоў, вы паспрабавалі. Трапіўшы ў сапраўдную бяду, або падчас праходжання выпрабавання паспрабуй: калі цяжка сцярпець, пацярпі; калі нешта выглядае нездзяйсняльным альбо, скажам, гэта здзейсніць цяжка, паспрабуй ды паглядзі, атрымаецца, урэшце, ці не. Калі ты сапраўды зможаш дабіцца свайго, дык выявіш, што і сапраўды гэта будуць «і вербы цяністыя, і кветкі яскравыя, і зноўку наперадзе бачная вёска»[245].

Паколькі я ўжо сказаў неймаверна шмат, вам будзе вельмі цяжка ўтрымаць усё ў памяці. Я толькі прад'яўлю да вас невялічкае патрабаванне. Спадзяюся, што вы ў сваім далейшым удасканальванні будзеце ставіцца да сябе як да практыкоўцаў, будзеце шчыра ўдасканальвацца далей. Я спадзяюся, што і новыя, і дасведчаныя вучні змогуць удасканальвацца ў Дафа і дасягнуць поспеху ды Поўнае Дасканаласці! Спадзяюся, што па вяртанні дамоў вы, не губляючы часу, будзеце шчыра ўдасканальвацца.

# Зноскі*

* Зноскі зробленыя перакладчыкамі з мэтай даць чытачу даведкавую інфармацыю, а таксама прывесці іншыя магчымыя варыянты перакладу.

[1] Назва кнігі перакладаецца з кітайскае мовы як «Вярчэнне Фалунь». У гэтым канкрэтным выпадку парадак слоў у арыгінале ўказвае на тое, што слова «вярчэнне» ўжыта ў значэнні таго, што над прадметам выконваецца дзеянне, а не ў сэнсе самастойнага дзеяння прадмета: гэта значыць не проста тое, што Фалунь верціцца, а яго верцяць.

[2] кіт. «Фа».

[3] Па-кітайску «бэньт'і».

[4] кіт. «Дафа».

[5] Светы.

[6] кіт. 真、善、忍 («Джэнь, Шань, Жэнь»).

[7] У значэнні філасофскага паняцця, супрацьлеглага «матэрыі».

[8] Ґунфа.

[9] Паняцце «навязлівыя ідэі» таксама можна перакласці як «упартыя імкненні», «упартыя думкі».

[10] «Тыя, хто прабудзіўся».

[11] Даоскі выраз. Іншыя варыянты перакладу — «вярнуцца назад да свайго сапраўднага вобразу», «вярнуцца да свайго першапачатковага выгляду», «вярнуцца да сваіх каранёў, назад да Ісціны».

[12] У кітайскай культуры гэта базавая субстанцыя, якая запаўняе ўвесь Сусвет, а таксама целы жывых істот, забяспечваючы ўсе важныя органы іх арганізма «жыццёвай сілай»; эфір. З'яўляецца неад'емна важнай часткай у кітайскай медыцыне, баявых мастацтвах і ціґун.

[13] Энергія вышэйшага парадку ў параўнанні з ці. У літаральным перакладзе з кітайскае «ґун» азначае «поспех», «дасягненне».

[14] Большасць разнавіднасцяў ціґун заканчваецца на «-ґун». У пачатковы перыяд распаўсюджвання Фалунь Дафа аўтар таксама называў свой метад «Фалуньґун», што можна перакласці як «ціґун Фалунь».

[15] Дзэн-будызм (яп. «Дзэн», кіт. «Чань») — школа махаяна-будызму, якая ўзнікла ў Кітаі ў эпоху дынастыі Тан пад вялікім уплывам даасізму.

[16] Будыйскі манах (паводле розных версіяў, з Індыі альбо з Цэнтральнай Азіі), які прынёс у V стагоддзі ў Кітай дзэн-будызм.

[17] Буда Шак'ямуні (свецкае імя — Сідгартга Ґаўтама) (нарадзіўся каля 563 г. да н.э. або каля 480 г. да н.э. — памёр каля 483 г. да н.э. або каля 400 г. да н.э.) — прапаведаваў сваё арыгінальнае вучэнне, на аснове якога пазней утварыўся будызм. Лічыцца гістарычным заснавальнікам будызму.

[18] Кітайскі ідыяматычны выраз, які азначае, што чалавек, не шкадуючы сіл, закопваецца ў вывучэнне нічога не вартае, дробязнае праблемы або невырашальнае задачы; пайшоўшы па няслушным шляху. Чалавек праяўляе вялікую ўпартасць і ўрэшце заходзіць у тупік.

[19] кіт. «Жулай».

[20] Адзін з асноўных тэкстаў будызму.

[21] кіт. «Юаньшэнь».

[22] кіт. «усі́н». Пяць элементаў, альбо пяць стыхіяў — метал, дрэва, вада, агонь, зямля.

[23] кіт. Ґо вэй.

[24] Самаўдасканальвання.

[25] Больш дакладны пераклад — «нібыта пірамідападобны».

[26] кіт. «Юаньшэнь» — «дасканалая душа», «ідэальная душа».

[27] 德 — кіт. «дэ». Таксама можна перакласці як «мараль», «маральнасць», «дабрадзейнасць».

[28] Лэй Фэн (1940–1962 гг.) — у 60-я гады XX стагоддзя ў Кітаі прапагандаваўся як узор альтруізму, гераізму і адданасці.

[29] 真 (гучыць як «Джэнь» з вымаўленнем у першым тоне). Некаторыя з іншых значэнняў гэтага іерогліфа: праўда; сапраўдны, шчыры, праўдзівы.

[30] 善 (гучыць як «Шань» у чацвёртым тоне). Некаторыя іншыя значэнні: дабро; добры.

[31] Іншы варыянт перакладу — «ён дае клятву (перад Богам)», «ён дае абяцанне».

[32] 忍 (гучыць як «Жэнь» у трэцім тоне). Некаторыя іншыя значэнні: вытрымка; цярпець, трываць, вытрымліваць.

[33] У перакладзе з кітайскай «Вялікі Закон Фалунь», або «Вялікі Закон Кола Закону».

[34] У арыгінале кітайская ідыёма «спадарожны вецер раздзімае ветразі».

[35] Гэтыя тры паняцці ў старажытным Кітаі выкарыстоўвалі і ў ваеннай справе, але ім надавалі іншае значэнне: Нябесны час — спрыяльныя для баявых дзеянняў умовы надвор'я, спрыяльнасць Зямлі — перавагі мясцовасці для ўдалай абароны альбо нападу, згода паміж людзьмі — высокі баявы дух і адзінства войска.

[36] кіт. Хэту — «Схема з ракі Хуанхэ»; кіт. Лошу — «Пасланне з ракі Ло». Старажытныя артэфакты, якія прадстаўляюць сабой схемы з лічбаў.

[37] Джоў-і — кіт. «Джоўская Кніга пераменаў». «Кніга пераменаў», якая была адаптаваная ў перыяд дынастыі Джоў (каля 1046 г. да н.э. — 256 г. да н.э.). Гэта старажытны тэкст па варажбе, які аказаў велізарны ўплыў на ўсю культуру Старажытнага Кітая.

[38] Восем трыграмаў — восем знакаў, кожны з якіх складаецца з трох рысак і азначае нейкую з'яву прыроды, рысу характару, чальца сям'і, частку цела і да таго падобнае.

[39] 佛陀 [фо-то] — кіт. «Буда».

[40] 浮图 [фу-ту] — кіт. «Буда».

[41] 佛 [фо] — кіт. «Буда».

[42] Грамадска-палітычны рух у Кітаі, які цягнуўся з 1966 г. да 1976 г. Падчас «культурнае рэвалюцыі» розны пераслед (публічнае прыніжэнне, неабгрунтаванае заключэнне, катаванне, працяглае цкаванне, канфіскацыя маёмасці і да т.п.) зведалі мільёны людзей ва ўсім Кітаі.

[43] кіт. «Даньдзін» — даоская кніга, прысвечаная тэхніцы вырабу «пілюлі несмяротнасці».

[44] кіт. «Даацзан» — поўны збор рэлігійнае ды філасофскае літаратуры даасізму.

[45] 气功

[46] Слова «самаўдасканальванне» ў кітайскай мове складаецца з двух іерогліфаў: «сю» (修) і «лень» (炼). «Сю» — «удасканальванне» (а таксама іншыя значэнні: выпраўленне, наладка, рамантаванне), «лень» — «практыка» (а таксама: гартаванне, выплаўленне, рафінаванне, ліццё).

[47] 心性. Можна перакласці як «прырода сэрца», «прырода думак», «духоўнасць», «духоўныя якасці».

[48] Кітайская будыйская ідыёма, якая ў цэлым азначае ўсе чалавечыя пачуцці, эмоцыі, жаданні ды прывязанасці.

[49] Таксама можна перакласці як «Ґун, які адказвае за (альбо: які выклікае; прызначаны для) ўзрастанне Ґун».

[50] 业 力 кіт. «é-лі».

[51] У перакладзе «пілюля несмяротнасці».

[52] Буд. выраз «дзесяць злачынстваў, за якія не даюць літасці».

[53] Звышнатуральныя здольнасці, экстрасэнсорныя здольнасці.

[54] Лаа-цзы (па розных версіях, жыў у VI, V або IV ст. да н.э.) — выбітны старажытнакітайскі мысляр, аўтар славутае кнігі «Даа дэ дзін» [Даадэцзін].

[55] У перакладзе з кітайскай «Кола Закону».

[56] «Ці-дзі» — «энергетычныя механізмы», «механізмы ці».

[57] Таксама можна перакласці як «Буды ўсюдыісныя».

[58] Шаньґэнь — кіт. «падножжа гары». Акупунктурная кропка ў пераноссі. Іншая назва — Ex-HN33.

[59] Правым.

[60] Ідыяматычны кітайскі выраз. У арыгінале кіт. «108 000 лі».

[61] Таксама можна перакласці як «слоя».

[62] Знак з выявай інь і ян.

[63] У арыгінале ўжыта слова, якое азначае варажбу на гексаграмах «Кнігі пераменаў» («І-дзін», або «Джоў-і»), усяго маецца 64 гексаграмы.

[64] кіт. «Джэ́н-ґо», адна з разнавіднасцяў Рангу дасягнення (Ґо-вэ́й), пра які заходзіла гаворка ў лекцыі першай. Іншыя варыянты перакладу: «Правамернае дасягненне», «Праведны плод», «Артадаксальны плод», «Сапраўдны плод».

[65] Іншы варыянт перакладу — «Небыццё».

[66] кіт. «у-вэй».

[67] Іншая назва — PE-8, кропка, размешчаная блізка да цэнтра далоні чалавека, паміж указальным ды сярэднім пальцамі. Кропка №8 на парных мерыдыянах перыкардыя.

[68] Апантанасць, усяленне ў чалавека чужароднае істоты; істота, якая ўсяляецца ў чалавека, дух жывёлы.

[69] Гульня слоў. Арыгінальная фраза: «“Мін”, які азначае “быць знакамітым”, — гэта не абавязкова “мін”, які азначае “быць разумным”». Тут «мін» — гэта два розныя іерогліфы, якія маюць рознае значэнне, але гучаць аднолькава і з аднолькавай інтанацыяй, што з'яўляецца звычайнай з'явай для кітайскае мовы.

[70] кіт. «у дзі бі фань» — кітайскі выраз пра цыклічнасць развіцця ўсіх рэчаў. Таксама можна перакласці як «што-небудзь, дасягнуўшы сваёй крайняй праявы, неадменна пачынае развівацца ў супрацьлеглым кірунку», «што-небудзь, дасягнуўшы сваёй крайняй праявы, абавязкова мяняе вектар свайго развіцця на іншы».

[71] Санскрыт. «Шыла, Самадгі, Праджня», кіт. «Дзе, Д’ін, Хўэй».

[72] кіт. ідыёма «твар ды вочы зусім іншыя».

[73] Махаяна-будызм.

[74] Хінаяна-будызм.

[75] Мацерыковы Кітай, землі, дзе пераважае насельніцтва этнічных кітайцаў — ханьцаў [сама назва бярэ пачатак ад дынастыі Хань (206 г. да н.э. — 220 г. н.э.), адной з самых выбітных кітайскіх дынастыяў].

[76] Маецца на ўвазе шматбожжа.

[77] Наґарджуна [кіт. Луншу] (прыбл. 150 г. — прыбл. 250 г.) — выбітны індыйскі мысляр будызму.

[78] Сіньдзян [Сіньцзян], цяпер Сіньдзян-Уйгурскі аўтаномны раён (гістарычна Усходні Туркестан) — рэгіён на паўночным захадзе Кітая з цэнтрам ва Урумчы.

[79] Перыяд праўлення кожнага кітайскага імператара дзяліўся на некалькі дэвізаў праўлення. Дэвіз Хўэйчан (841–847 гг.) абвясціў імператар Уцзун дынастыі Тан, які быў даасістам і пераследваў будызм ды іншыя «некітайскія» рэлігіі.

[80] Дынастыя Тан (618–907 гг.) — дынастыя імператараў Кітая са сталіцай у г. Чан-ань. Лічыцца перыядам уздыму кітайскае цывілізацыі ды залатой эпохай шматнацыянальнай культуры. У эпоху Тан Кітай быў адной з самых магутных і самых развітых краін у свеце.

[81] яп. школа Сінгансю.

[82] Тыбецкі будызм, ламаізм.

[83] Арыгінальная назва — кіт. «Чань». У нас гэты накірунак вядомы пад больш позняй японскай назвай — Дзэн або дзэн-будызм.

[84] XX ст.

[85] Іншы варыянт перакладу — «выклікáць яго эвалюцыю».

[86] У арыгінале «стоячы нагамі на двух чаўнах».

[87] У іншых відах ціґун падчас выканання практыкаванняў дадаюць пэўныя думкі, канцэпцыі.

[88] кіт. «ґун-нэн».

[89] кіт. «ґун-лі».

[90] Джан Ґалаў — адзін з васьмі Несмяротных даоскага пантэона.

[91] кіт. «фут’і».

[92] кіт. «ґўнфу» мае наступныя значэнні (у залежнасці ад сітуацыі ды кантэксту): 1) майстэрства ў чымсьці (уменні, мастацтве, рамястве); 2) майстэрства валодання баявым мастацтвам; 3) звышнатуральная (экстрасэнсорная) здольнасць.

[93] Альбо «ў школу».

[94] кіт. «Ван Му» або «Сі Ван Му», даоская багіня.

[95] кіт. «Юйхўан», адзін з вярхоўных даоскіх багоў.

[96] кіт. «Ніваньґун», даоскі тэрмін для абазначэння шышкападобнага цела (шышкападобная залоза, эпіфіз) галаўнога мозга чалавека.

[97] «Лісіная медытацыя», «медытацыя дзікае лісы» — таксама як крылаты выраз, які часта азначае «займацца ерассю».

[98] Успрыманне на адлегласці без выкарыстання органаў пачуццяў.

[99] Магчыма, гаворка ідзе пра тое, што некаторыя настаўнікі ціґун у Кітаі накіроўвалі сваю інфармацыю на гарбату і потым давалі піць (або прадавалі) яе сваім слухачам курсаў.

[100] «Поле пілюлі», ад кіт. «дань» - «пілюля несмяротнасці», «т’ень» - «поле» (у значэнні «ўчастка зямлі»). Адзін з многіх даоскіх алегарычных тэрмінаў. Абазначае ніжнюю частку жывата.

[101] Больш дакладны пераклад — «трамбоз сасудаў галаўнога мозга».

[102] У перакладзе «Магутнасць і Дабрадзейнасць».

[103] Універсітэт у г. Чанчунь, сталіцы правінцыі Гірын.

[104] Кітайскі дэсерт з зацукраванае садавіны, нанізанае на бамбукавыя шампуры. Традыцыйна рабіўся з кітайскага глогу, але цяпер выкарыстоўваецца амаль любая садавіна. Сваёй формай нагадвае гарбуз-гарлянку, адкуль і атрымаў сваю назву (кіт. Танхулу — «зацукраваныя гарбузы-гарлянкі»).

[105] Аўтар у 1992–1994 гг. праводзіў сістэматычныя платныя курсы, якія звычайна доўжыліся па 8-10 дзён, дзе ён кожны дзень выкладаў лекцыі ды навучаў практычнай частцы (пяці практыкаванням) Фалунь Дафа. Пасля 1994 г. аўтар перастаў праводзіць сістэматычныя курсы і выкладаў толькі асобныя лекцыі некалькі разоў на год, больш ніколі не браўшы плату.

[106] кіт. «Шы́фу».

[107] Таксама можна перакласці як «заводзіць у школу».

[108] Кітайскае выказванне пра фізічныя і духоўныя пакуты, аўтарам якога з'яўляецца філосаф Мэ́нцзы (Менцый).

[109] Другі метад практыкі Фалунь Дафа называецца «Метад слупа Фалунь» («Фалунь джўан фа»), падчас яго неабходна доўга стаяць нерухома з паднятымі рукамі, нібыта ахапляеш рукамі кола, па чарзе: перад галавой, перад жыватом, над галавой і па абодва бакі галавы.

[110] Больш поўны пераклад — «плятуць скрытыя інтрыгі ды займаюцца адкрытым супрацьстаяннем» (тут і ўсюды ў кнізе).

[111] У слове «загартоўка» («мо-лень») замест звычайных для яго іерогліфаў — «мо» (церці, малоць) і «лень» (вываpваць шоўк) аўтар ужыў іерогліфы з такім жа гучаннем, але іншым значэннем — «мо» (д'ябальскі, дэманічны) і «лень» (выплаўляць, рафінаванаць).

[112] Выраз набыў негатыўную афарбоўку толькі ў камуністычным Кітаі, а да гэтага меў прама супрацьлеглае значэнне — «з дзесяці гандляроў — дзевяць насыплюць табе з горкай» (больш чым ты заплаціў).

[113] Ак’ю — персанаж кітайскага пісьменніка XX ст. Лу Сюня. Ак’ю апісаны як малаадукаваны беспрацоўны чалавек сельскага паходжання, які быў вядомы тым, што пераконваў сябе ў сваёй «перамозе» ды «пераваэе» над іншымі, нават зведваючы найбольшыя паразы ды знявагу. Персанаж паводзіўся па-хуліганску са слабейшымі за сябе і баяўся мацнейшых.

[114] Больш літаральны пераклад — «зваліцца ўніз».

[115] Кітайская гульня ў косці для чатырох гульцоў. Яе назва часта няслушна транскрыбуецца як «маджонг».

[116] Праспект у цэнтры Пекіна. Традыцыйна з'яўляецца гандлёвай вуліцай. Прылягае да плошчы Т’ень-а́нь-мэнь (Цяньаньмэнь).

[117] XX стагоддзя.

[118] кіт. «ґуа́ньд’ін».

[119] Аўтарытэтны духоўны лідар тыбецкага будызму.

[120] Тут у арыгінале ўжыта ідыёма «павесці моладзь няправедным шляхам», «затлуміць моладзь», «навучыць дзяцей благому».

[121] Тут у арыгінале ўжыты іерогліф 主 [Джу], які таксама мае значэнні Гаспадар, Уладар.

[122] кіт. «сюэньґўань шэвэ́й»; «сюэньґўань» («таемны ўваход») таксама можна перакласці як «таемны праход» або «таемная акупунктурная кропка».

[123] кіт. «сюэньґўань іцяў» — «цяў таемны ўваход». І іерогліф «цяў» («адтуліна») [з «іцяў»], і іерогліф «ґўань» («уваход») [з «сюэньґўань»] часта ў кітайскай мове ўжываюцца ў значэнні «акупунктурнае кропкі».

[124] кіт. «Сінмін ґу́йджы» — даоская кніга па самаўдасканальванні.

[125] кіт «Юаньін».

[126] Інхар [Інхай] — кіт. «немаўля», «нованароджаны».

[127] Дзе-інь [цзе-інь] — адно з асноўных палажэнняў рук ва ўсіх пяці метадах практыкі Фалунь Дафа.

[128] кіт. «сяўфу́», вобласць жывата ад пупка ўніз.

[129] кіт «т’ень».

[130] кіт. «поле».

[131] У арыгінале вымяральнай адзінкай з'яўляецца цунь. Розныя крыніцы падаюць розную даўжыню цуня. У перакладзе ўжыта значэнне 1 цунь = 3,2 см.

[132] кіт. «бэньт’і».

[133] Ідыяматычны выраз, які звычайна азначае, што любыя справы можна паспяхова вырашыць, калі для гэтага саспеюць умовы; усё трэба рабіць у правільны для гэтага час.

[134] Іншая назва CV-17. Кропка ў цэнтры грудное клеткі, паміж смочкамі, 17-я кропка на мерыдыяне цяжарнасці (жэньмай).

[135] Та́йян — кіт. «сонца» альбо «вялікі ян». Парная акупунктурная кропка на скронях. Назва паводле міжнароднае класіфікацыі — EX-3.

[136] Т’ень-а́нь-мэнь (Цяньаньмэнь) — кіт. «Брама нябеснага спакою». Галоўная плошча Пекіна, найвялікшая плошча ў свеце.

[137] Кропка юйджэнь (у перакладзе — «нефрытавая падушка») з'яўляецца парнай кропкай. Паводле міжнароднае класіфікацыі, яе назва — BL9. Гэта дзявятая кропка на мерыдыяне мачавіка. Паколькі мерыдыян мачавіка з'яўляецца парным (іх два), кропак юйджэнь таксама дзве. Яны размешчаныя на два пальцы ўбок (адна леваруч, другая праваруч) ад лініі спіннога хрыбта, на ўзроўні верхняга краю вушэй.

[138] кіт. «і-цяў» («адтуліна») таксама перакладаецца як «адна адтуліна». Іерогліф «і» азначае «адзін», але часцей за ўсё застаецца без перакладу, проста ўказваючы на адзіночны лік.

[139] Мінмэнь — у перакладзе «брама жыцця», «дзверы лёсу». Назва па міжнароднай класіфікацыі — GV-4. Чацвёртая кропка на вядучым мерыдыяне. Размешчаная на лініі спіннога хрыбта на ўзроўні паясніцы, другога пазванка паяснічнага аддзела.

[140] кіт. «уваходамі» альбо «праходамі».

[141] Іншы варыянт перакладу «ўзроўняў».

[142] Чатыры асноўныя бакі свету і чатыры прамежкавыя — усяго восем.

[143] Больш дакладны пераклад — аркападобная выемка ў цэнтры ступні.

[144] кіт. «па́нмэнь цзада́а» — таксама можна перакласці як «пабочныя школы левага Даа» — абходныя шляхі.

[145] У арыгінале кіт. — «даос вышынёй 1 чы, д'ябал — 1 джан [чжан]» (кітайскія меры даўжыні, 0,33 м і 3,33 м адпаведна).

[146] 841-847 гады, кіраванне імператара Уцзуна. Перыяд, калі будызм у Кітаі зведаў адзін з найбуйнейшых пераследаў у сваёй гісторыі.

[147] кіт. «Ґўаньінь».

[148] Да і падчас «культурнае рэвалюцыі» (1966–1976 гг.) Камуністычная партыя Кітая знішчала храмы, здзекавалася са старшых будыйскіх настаўнікаў і прымушала малодшых манахаў вярнуцца да свецкага жыцця, да шлюбу ды іншага, што парушае запаведзі. У будыйскія суполкі пранікалі агенты кампартыі, якія руйнавалі іх знутры. Тое ж самае рабілі з даосамі ды хрысціянамі.

[149] Палажэнне рук, калі ўсе пальцы накіраваныя ўгару, асновы далоняў злучаныя адна з адной, кончык мезенца адное рукі злучаны з кончыкам мезенца іншае, тое ж самае з кончыкамі вялікіх пальцаў, астатнія пальцы расцягнутыя ў бакі. Усё разам нагадвае кветку.

[150] У перакладзе «Вялікі шлях».

[151] кіт. «джу ю кэ».

[152] Хэґу — парная акупунктурная кропка, размешчаная ў месцы скрыжавання лініі вялікага і ўказальнага пальца, на тыльным баку рукі. Назва па міжнароднай класіфікацыі — LI-4. Чацвёртая кропка на парных мерыдыянах тоўстае кішкі.

[153] Кітайская філасофская сістэма прынцыпаў жыцця.

[154] Форма кітайскае мануальнае тэрапіі.

[155] кіт. «кэ».

[156] Прыгодніцкі жанр у кітайскай літаратуры, кіно, ТБ, у якім акцэнт робіцца на дэманстрацыі баявых мастацтваў.

[157] Іншы варыянт перакладу — «ён не павінен паддавацца спакусам».

[158] Іншы варыянт перакладу — «з якімі іншыя не могуць пагадзіцца».

[159] Іншая назва — «сексуальная рэвалюцыя».

[160] кіт. «Фэй-Т'ень» — у будызме незвычайныя істоты жаночага полу, маладыя і вельмі майстэрскія ў танцах.

[161] Тут у арыгінале па-кітайску ўжыты выраз «пасля таго, як заплюшчыш вочы».

[162] Кітайская ідыёма, што звычайна апісвае велізарную колькасць прыгожага (напрыклад, твораў мастацтва). Асалода для вачэй.

[163] Наложніца апошняга цара дынастыі Шан (1600–1046 гг. да н.э.) Д'і Сіня (кіраваў Кітаем у 1075–1046 гг. да н.э.), якая, паводле павер'я, была апантаная духам лісы.

[164] Амаль усюды ў гэтым абзацы ўжываецца слова, якое звычайна азначае варажбу на гексаграмах «Кнігі пераменаў» — «Джоў-і».

[165] Год, месяц, дзень і гадзіна нараджэння чалавека, запісаныя з дапамогай камбінацыі з двух іерогліфаў.

[166] кіт. «Хўанд'і нэйдзін» [Хуандзі нэйцзін] — старажытнакітайскі медыцынскі тэкст, які ўжо больш за 2000 гадоў лічыцца асноўнай дактрынальнай крыніцай кітайскае медыцыны.

[167] 1992 г.

[168] кіт. «шы» — «майстар», «настаўнік», «адмысловец».

[169] кіт. «кўа́йцзы», палачкі для яды.

[170] кіт. «сюмі́н» — «удасканальванне даўгалецця» з выразу «ўдасканальванне Сіньсін і даўгалецця». Іерогліф «мін» мае вельмі шмат значэнняў, кожнае з якіх у гэтым выпадку можа быць слушным: «жыццё», «доля», «вызначаныя доляй гады жыцця», «даўгалецце» і да таго падобнае.

[171] кіт. ідыёма, якая звычайна азначае, што нехта прыхарошвае, прыбрэхвае, дадае дэталі, якія выдумаў ён сам, адсябяціну.

[172] кіт. ідыёма — «супадаць у асноўным і адрознівацца ў дэталях».

[173] Кітайская ідыёма пра тое, калі хтосьці прагна пажырае сваю здабычу ці ежу.

[174] кіт. «хунь» — ежа, забароненая ў будызме.

[175] Дзі-ґун [Цзі-ґун] (1130–1207 гг.) — манах дзэн-будызму [чань-будызму], які жыў у эпоху дынастыі Паўднёвая Сун і меў магутныя звышнатуральныя здольнасці.

[176] Літаральны пераклад — «нават талерку з ежай («міску для рысу») не могуць узяць.

[177] Пад ужытым у арыгінале словазлучэннем звычайна маецца на ўвазе напісанне кніг, артыкулаў, складанне песняў.

[178] Іншы варыянт перакладу «табе стане агідна».

[179] Іншы варыянт перакладу — «нецярплівасць».

[180] кіт. «Халодныя кпіны, гарачыя насмешкі за вочы».

[181] Таксама пад гэтай фразай у кітайскай мове часта маюць на ўвазе тое, калі хтосьці дае камусьці хабар.

[182] Вучань Юаньшы Т’еньцзуня на гары Куньлунь, малодшы сувучань Дзян Цзыя.

[183] «Пасвячэнне ў Багі» (кіт. «Фэншэнь янь-і») — фантастычна-гістарычны кітайскі раман, напісаны ў эпоху дынастыі Мін у XVI стагоддзі.

[184] Дзян Цзыя [Цзян Цзыя] — ваенны стратэг, які дапамог заснаваць кітайскую дынастыю Джоў. У рамане «Пасвячэнне ў Багі» быў вучнем Юаньшы Т’еньцзуня на гары Куньлунь.

[185] Юаньшы Т’еньцзунь — адзін з вярхоўных багоў даоскага пантэона. У рамане «Пасвячэнне ў Багі» ён апісаны як звышчалавек, уладальнік гары Куньлунь. Ён даслаў свайго вучня Дзян Цзыя ў свет дапамагчы заснаваць вялікую дынастыю Джоў.

[186] Эмэйшань — гара ў правінцыі Сычўань на паўднёвым захадзе Кітая.

[187] Для ежы. Будыйскія манахі звычайна з яе дапамогай збіралі міласціну, выпрошвалі на вуліцы ежу ў мінакоў.

[188] Літаральны пераклад «упадзе на тысячу джанаў» (1 джан = 3,33 м).

[189] Тут ужыта слова, якое звычайна азначала тое, як у камуністычным Кітаі часта звярталіся да прыёму затушоўвання або замоўчвання нязручнае інфармацыі, чыіхсьці заслуг і дасягненняў і г.д.

[190] кіт. ідыёма — «штурхаць хвалі, спрыяючы з'яўленню валоў».

[191] Сунь Сымяў (памёр у 682 г.) — лекар традыцыйнае кітайскае медыцыны ў эпоху дынастыяў Суй і Тан. За вялікі ўнёсак у кітайскую медыцыну ды ўвагу да пацыентаў яго назвалі каралём медыцыны.

[192] Хўа То (прыбл. 140–208 гг.) — выбітны лекар кітайскае медыцыны, які жыў у эпоху дынастыі Хань.

[193] Лі Шыджэнь (1518–1593 гг.) — лекар, даследчык, фармацэўт, траўнік і акупунктурнік дынастыі Мін. Найбольшы яго ўнёсак — кніга «Бэньцаў ґанму» (ці «Кампендыум лекавых рэчываў»).

[194] Б’ень Цюэ [Бянь Цюэ] (прыбл. 401 да н.э. — прыбл. 310 да н.э.) — выбітны лекар эпохі войнаў паміж царствамі (Джанґо).

[195] Горад у правінцыі Хэйлундзян [Хэйлунцзян], што на самай поўначы Кітая.

[196] У будызме — калі чалавек у манастыры ізалюе сябе ад усіх іншых манахаў, каб на працягу нейкага перыяду цалкам прысвяціць сябе медытацыі.

[197] кіт. ідыёма — «калі нехта скажа “тыгр!”, дык у іх ажно твар змяняецца». Пра тое, калі кагосьці ахапляе жах ад адное толькі згадкі пра кагосьці/штосьці; панічны страх.

[198] Кітайскі іерогліф «неба» («т’ень») выглядае так: 天.

[199] Байхўэй.

[200] «Падняцце-ўліванне, падняцце-ўліванне» або, калі перакласці інакш, «прамыванне ўверх — прамыванне ўніз, прамыванне ўверх — прамыванне ўніз». Назва руху ў трэцім метадзе практыкі Фалунь Дафа, калі адна рука ўздоўж аднаго боку цела ідзе ўгару, а іншая адначасова з гэтым уздоўж іншага боку ідзе ўніз.

[201] кіт. «шы́шэнь».

[202] кіт. «юа́ньшэнь».

[203] Тут і ўсюды ў кнізе тэрміны «галоўная душа» і «дапаможная душа» перакладзены скарочана. Поўны пераклад тэрмінаў: «галоўная дасканалая душа» і «дапаможная дасканалая душа».

[204] Люй Дунбінь (нарадзіўся ў 796 г.) — навуковец ды паэт дынастыі Тан, які, як лічыцца, узнёсся да статусу Несмяротнага. Лічыцца галоўным з Васьмі Несмяротных.

[205] Будыйскі выраз, пад якім звычайна маецца на ўвазе сядзенне ў медытацыі.

[206] У арыгінале слова «Школа» (з вялікае літары) — «дзя» — звычайна выкарыстоўваецца толькі для вялікіх дзвюх Школаў — Школы Буды і Школы Даа. Слова «школа» (з маленькай) — «мэнь» або «фа́мэнь» — пазначае больш дробныя ды шматлікія школы, якія ўваходзяць у склад адной з буйных Школаў.

[207] Літаральны пераклад: «Калі я маю нечага на адзін джан [3,33 м], дык распавядаю толькі на адзін чы [0,33 м]».

[208] Словы, з якіх пачынаецца знакамітая кніга Лаа-цзы «Даа дэ дзін» [Даадэцзін] (кіт. «Канон пра Даа і Дэ»). Існуе і зусім іншы варыянт перакладу гэтага выказвання: «Даа, якое можна выказаць, не застаецца ў такім нязменным выглядзе назаўжды».

[209] У кітайскай культуры — жэст, які выказвае павагу, пашану.

[210] кіт. мед. «жэньма́й» — адзін з васьмі няпарных мерыдыянаў чалавечага цела. Праходзіць ад кропкі, крыху ніжэй за ніжнюю губу, уніз роўна пасярэдзіне тулава да палавых органаў.

[211] кіт. мед. «ду́ма́й» — адзін з васьмі няпарных мерыдыянаў чалавечага цела. Праходзіць ад месца крыху ніжэй за хвасцец роўна пасярэдзіне спіны ўздоўж усяго пазваночніка, пасярэдзіне галавы, ілба, носа да верхняе губы.

[212] Унутраны бок рукі. Тут пралягаюць мерыдыяны сэрца, перыкардыя і лёгкіх.

[213] Тыльны бок рукі. Тут пралягаюць мерыдыяны тонкай кішкі, трайнога награвальніка і тоўстай кішкі.

[214] На галаве.

[215] Адпаведна 1-я і 7-я з Зямных галін (12 знакаў шасцідзесяцігадовага цыклу). «Цзы» ў кіт. астраноміі азначае паўночную трацiну паўночнае чвэрці лімба; поўнач. «У», у сваю чаргу, азначае паўднёвую трацiну паўднёвае чвэрці лімба; поўдзень. Разам яны могуць азначаць лінію напрамку поўнач-поўдзень.

[216] Дзве супрацьлеглыя гексаграмы «Кнігі пераменаў», якія з'яўляюцца сімваламі Неба і Зямлі адпаведна; мужчынскі ды жаночы пачатак.

[217] кіт. «Кола Млечнага Шляху».

[218] Тэлекінез.

[219] Звычайна гэтае слова ў кітайскай мове і культуры ў адных сітуацыях можа азначаць проста «ўзлёт угару», а ў іншых — «узнясенне на неба», у апошнім выпадку маецца на ўвазе тое, што практыкоўца, дасягнуўшы поспеху ва ўдасканальванні, узлятае на неба.

[220] Адпаведна 4-я і 10-я з Зямных галін (12 знакаў шасцідзесяцігадовага цыклу). «Мáў» у кіт. астраноміі азначае ўсходнюю траціну ўсходняе чвэрці лімба; усход. «Ёў», у сваю чаргу, азначае заходнюю траціну заходняе чвэрці лімба; захад. Разам яны могуць азначаць лінію напрамку ўсход-захад.

[221] Тэрмін, супрацьлеглы «Нядзеянню».

[222] Маецца на ўвазе экскрэцыя, вывядзенне з арганізма.

[223] Таксама можна перакласці як «пераацэньваюць», «надаюць занадта вялікае значэнне».

[224] У арыгінале: «іерогліфаў». Часта словы ў кітайскай мове складаюцца з двух іерогліфаў.

[225] кіт. ідыёма «перавярнуць дагары дном рэкі ды моры», «пераварочваюцца дагары дном рэкі ды моры». Пра хаос, поўны беспарадак.

[226] кіт. «Э-мі-то-фо» — чатыры іерогліфы, якія перакладаюцца як «Буда Амітабга».

[227] Таксама можна перакласці як «дыхатамія».

[228] Таксама можна перакласці як «зусім пустым».

[229] Таксама можна перакласці як «амаральнасць».

[230] Таксама можна перакласці як «сапраўднае цела».

[231] кіт. «У»: «прабуджэнне», «спасціжэнне», «прачнуцца», «спасцігнуць», «зразумець».

[232] кіт. ідыёма пра нешта нічым не абмежаванае і такое, што далёка распасціраецца, бязмежна. Іншы варыянт перакладу фразы — «адчуеш сябе шырокім, як мора, бязмежным, як неба».

[233] Таксама можна перакласці як «раптоўнае Прабуджэнне», кіт. «Дунь-у».

[234] Вялікі таншаньскі землятрус, які адбыўся 28 ліпеня 1976 г. Лічыцца найбольшым землятрусам у XX стагоддзі па колькасці загінулых.

[235] Таксама можна перакласці як «не згасла».

[236] кіт. ідыёма «канец аднаму азначае канец усяму».

[237] кіт. «Піфа». Часта гэтае слова азначае невука, недавумка альбо таго, хто мае адвагу або дзёрзкасць, але з'яўляецца недалёкім, не мае вынаходлівасці; безразважны, неабдумана смелы.

[238] Хань Сінь (памёр у 196 г. да н.э.) — выбітны генерал у перыяд Чу-Ханьскай вайны, які зрабіў велізарны ўнёсак у заснаванне дынастыі Хань (206 г. да н.э. — 220 г. н.э.).

[239] Лю Бан (Ґаўцзу) (256 г. або 247 г. да н.э. — 195 г. да н.э.) — кітайскі імператар, заснавальнік дынастыі Хань, адной з самых вядомых у кітайскай гісторыі дынастыяў, якая праіснавала каля 400 гадоў. Этнічныя кітайцы і дагэтуль называюць сябе ханьцамі.

[240] Лічылася адным з найвялікшых прыніжэнняў у Старажытным Кітаі. Пасля выраз стаў крылатым і набыў значэнне крайняга прыніжэння, ганьбы.

[241] Літаральны пераклад слова «шліфаваць сябе, каб палепшыцца», «паліраваць сябе, каб дасягнуць прагрэсу».

[242] Тут у арыгінале ўжыта слова, якое азначае юрыдычныя законы.

[243] Гэтую частку выказвання можна перакладаць і па-іншаму: «калі звычайны чалавек чуе Даа, тады альбо выжывае, альбо гіне».

[244] З кнігі «Даа дэ дзін» [Даадэцзін] Лаа-цзы.

[245] З верша «Падарожжа гарамі ў вёску на захадзе» кітайскага паэта Лу Ёў [Лу Ю] (1125–1210 гг.). Як вобразны выраз азначае «святло ў канцы тунэля».